ГРАМАДЗЯНСКІ КОДЭКС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
7 снежня 1998 г. № 218-З

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 28 кастрычніка 1998 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 19 лістапада 1998 года

Змяненні і дапаўненні:

Закон Рэспублікі Беларусь ад 14 ліпеня 2000 г. № 415-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2000 г., № 69, 2/190) <H10000415>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 3 мая 2001 г. № 7-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2001 г., № 46, 2/750) <H10100007>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2002 г. № 79-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2002 г., № 7, 2/828) <H10200079>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 25 мая 2002 г. № 104-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2002 г., № 62, 2/853) <H10200104>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 24 чэрвеня 2002 г. № 113-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2002 г., № 75, 2/862) <H10200113>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2002 г. № 128-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2002 г., № 84, 2/877) <H10200128>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 11 лістапада 2002 г. № 148-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2002 г., № 128, 2/897) <H10200148>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 16 снежня 2002 г. № 159-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 1, 2/908) <H10200159>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2003 г. № 183-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 8, 2/932) <H10300183>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 чэрвеня 2003 г. № 211-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 74, 2/960) <H10300211>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 студзеня 2004 г. № 267-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2004 г., № 4, 2/1016) <H10400267>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 жніўня 2004 г. № 316-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2004 г., № 137, 2/1065) <H10400316>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 мая 2005 г. № 9-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2005 г., № 73, 2/1106) <H10500009>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 19 ліпеня 2005 г. № 44-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2005 г., № 122, 2/1141) <H10500044>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 22 снежня 2005 г. № 76-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 6, 2/1173) <H10500076>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2006 г. № 99-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 18, 2/1196) <H10600099> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 2 жніўня 2006 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 16 мая 2006 г. № 115-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 78, 2/1212) <H10600115>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 чэрвеня 2006 г. № 136-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 106, 2/1234) <H10600136>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 чэрвеня 2006 г. № 137-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 107, 2/1235) <H10600137>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 19 ліпеня 2006 г. № 150-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 114, 2/1247) <H10600150> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 26 верасня 2006 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 ліпеня 2006 г. № 160-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 122, 2/1257) <H10600160> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 3 лістапада 2006 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 ліпеня 2006 г. № 162-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 122, 2/1259) <H10600162>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2006 г. № 193-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 4, 2/1290) <H10600193>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 7 мая 2007 г. № 212-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 118, 2/1309) <H10700212>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 мая 2007 г. № 233-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 132, 2/1330) <H10700233>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 14 жніўня 2007 г. № 278-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 199, 2/1375) <H10700278> - са змяненнямі і дапаўненнямі, якія ўступілі ў сілу 1 студзеня 2008 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2007 г. № 300-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 305, 2/1397) <H10700300> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 8 студзеня 2008 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2007 г. № 301-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 305, 2/1398) <H10700301> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 1 студзеня 2008 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 чэрвеня 2008 г. № 347-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 157, 2/1444) <H10800347>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 ліпеня 2008 г. № 366-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 170, 2/1463) <H10800366> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 16 студзеня 2009 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 г. № 96-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 6, 2/1648) <H10900096>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 г. № 97-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 6, 2/1650) <H10900097>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2010 г. № 167-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 183, 2/1719) <H11000167> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 3 лютага 2011 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 16 ліпеня 2010 г. № 172-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 184, 2/1724) <H11000172>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 студзеня 2011 г. № 241-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 8, 2/1793) <H11100241>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 мая 2011 г. № 262-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 60, 2/1813) <H11100262> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 1 снежня 2011 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 3 ліпеня 2011 г. № 285-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 78, 2/1837) <H11100285>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 2012 г. № 388-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 17.07.2012, 2/1940) <H11200388> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 18 студзеня 2013 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 2012 г. № 389-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 14.07.2012, 2/1941) <H11200389> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 15 студзеня 2013 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 ліпеня 2012 г. № 424-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 26.07.2012, 2/1976) <H11200424> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 27 студзеня 2013 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 ліпеня 2012 г. № 419-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь,

21.07.2012, 2/1971) <H11200419> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 1 студзеня 2013 г.;

Кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 28 жніўня 2012 г. № 428-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 01.09.2012, 2/1980) <Hk1200428> - Кодэкс Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 2 сакавіка 2013 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2013 г. № 16-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 10.01.2013, 2/2014) <H11300016> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 11 ліпеня 2013 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 12 ліпеня 2013 г. № 59-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 23.07.2013, 2/2057) <H11300059> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 24 студзеня 2014 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 лістапада 2013 г. № 71-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 19.11.2013, 2/2069) <H11300071> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 20 лютага 2014 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2013 г. № 96-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 02.01.2014, 2/2094) <H11300096>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2014 г. № 108-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 11.01.2014, 2/2106) <H11400108>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 студзеня 2014 г. № 128-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 21.01.2014, 2/2126) <H11400128>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 11 ліпеня 2014 г. № 191-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 22.07.2014, 2/2189) <H11400191>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2014 г. № 226-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 09.01.2015, 2/2224) <H11400226>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2015 г. № 231-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 10.01.2015, 2/2229) <H11500231> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 1 студзеня 2016 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2015 г. № 305-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 23.07.2015, 2/2303) <H11500305> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 24 студзеня 2016 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2015 г. № 308-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 25.07.2015, 2/2306) <H11500308> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 26 студзеня 2016 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 кастрычніка 2015 г. № 313-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 03.11.2015, 2/2311) <H11500313>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2015 г. № 343-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 01.01.2016, 2/2343) <H11500343>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2016 г. № 352-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 14.01.2016, 2/2350) <H11600352>;

Кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 20 ліпеня 2016 г. № 413-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 02.08.2016, 2/2412) <Hk1600413> - Кодэкс Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 3 лютага 2017 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 24 кастрычніка 2016 г. № 439-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 15.11.2016, 2/2437) <H11600439> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 16 мая 2017 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2017 г. № 14-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 12.01.2017, 2/2452) <H11700014>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2018 г. № 135-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 31.07.2018, 2/2573) <H11800135> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 23 ліпеня 2018 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 жніўня 2018 г., 1 лістапада 2018 г., 1 лютага 2019 г. і 1 жніўня 2020 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2018 г. № 135-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 31.07.2018, 2/2573) <H11800135> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 23 ліпеня 2018 г. і 1 жніўня 2018 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 лістапада 2018 г., 1 лютага 2019 г. і 1 жніўня 2020 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2018 г. № 135-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 31.07.2018, 2/2573) <H11800135> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 23 ліпеня 2018 г., 1 жніўня 2018 г. і 1 лістапада 2018 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 лютага 2019 г. і 1 жніўня 2020 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2018 г. № 135-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 31.07.2018, 2/2573) <H11800135> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 23 ліпеня 2018 г., 1 жніўня 2018 г., 1 лістапада 2018 г. і 1 лютага 2019 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 жніўня 2020 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 снежня 2018 г. № 151-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 27.12.2018, 2/2589) <H11800151>

ЗМЕСТ

РАЗДЕЛ I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

ПАДРАЗДЗЕЛ 1. АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
ГЛАВА 1. Грамадзянскае заканадаўства
ГЛАВА 2. Узнікненне грамадзянскіх правоў і абавязкаў, ажыццяўленне і абарона грамадзянскіх правоў
ПАДРАЗДЗЕЛ 2. АСОБЫ
ГЛАВА 3. Грамадзяне (фізічныя асобы)
ГЛАВА 4. Юрыдычныя асобы
§ 1. Асноўныя палажэнні
§ 2. Гаспадарчыя суполкі і таварыствы
1. Агульныя палажэнні
2. Поўная суполка
3. Камандытнае суполка
4. Таварыства з абмежаванай адказнасцю
5. Таварыства з дадатковай адказнасцю
6. Акцыянернае таварыства
7. Даччыныя і залежныя таварыствы
§ 3. Вытворчыя кааператывы
§ 4. Унітарныя прадпрыемствы
§ 4[1]. Сялянскія (фермерскія) гаспадаркі
§ 5. Некамерцыйныя арганізацыі
§ 6. Дзяржаўныя аб'яднанні
ГЛАВА 5. Удзел Рэспублікі Беларусь і адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак у адносінах, якія рэгулююцца грамадзянскім заканадаўствам
ПАДРАЗДЗЕЛ 3. АБ'ЕКТЫ ГРАМАДЗЯНСКІХ ПРАВОЎ
ГЛАВА 6. Агульныя палажэнні
ГЛАВА 7. Каштоўныя паперы
ГЛАВА 8. Нематэрыяльныя даброты і іх абарона
ПАДРАЗДЗЕЛ 4. ЗДЗЕЛКІ І ПРАДСТАЎНІЦТВА
ГЛАВА 9. Здзелкі
§ 1. Паняцце, віды і формы здзелак
§ 2. Несапраўднасць здзелак
ГЛАВА 10. Прадстаўніцтва. Даверанасць
ПАДРАЗДЗЕЛ 5. ТЭРМІНЫ. ІСКАВАЯ ДАЎНАСЦЬ
ГЛАВА 11. Вылічэнне тэрмінаў
ГЛАВА 12. Іскавая даўнасць
РАЗДЕЛ II. ПРАВА ЎЛАСНАСЦІ І ІНШЫЯ РЭЧАВЫЯ ПРАВЫ
ГЛАВА 13. Агульныя палажэнні
ГЛАВА 14. Набыццё права ўласнасці
ГЛАВА 15. Спыненне права ўласнасці
ГЛАВА 16. Агульная ўласнасць
ГЛАВА 17. Рэчавыя правы на нерухомую маёмасць
ГЛАВА 18. Права ўласнасці і іншыя рэчавыя правы на жылыя памяшканні
ГЛАВА 19. Права гаспадарчага распараджэння, права аператыўнага кіравання
ГЛАВА 20. Абарона права ўласнасці і іншых рэчавых правоў
РАЗДЕЛ III. АГУЛЬНАЯ ЧАСТКА АБАВЯЗАЦЕЛЬНАГА ПРАВА
ПАДРАЗДЗЕЛ 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ АБ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАХ

ГЛАВА 21. Паняцце і бакі абавязацельства
ГЛАВА 22. Выкананне абавязацельстваў
ГЛАВА 23. Забеспячэнне выканання абавязацельстваў
§ 1. Агульныя палажэнні
§ 2. Няўстойка
§ 3. Заклад
§ 4. Утрыманне
§ 5. Паручыцельства
§ 6. Гарантыя
§ 7. Задатак
ГЛАВА 24. Перамена асоб у абавязацельстве
§ 1. Пераход правоў крэдытора да іншай асобы
§ 2. Перавод доўгу
ГЛАВА 25. Адказнасць за парушэнне абавязацельстваў
ГЛАВА 26. Спыненне абавязацельстваў
ПАДРАЗДЗЕЛ 2. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ АБ ДАГАВОРЫ
ГЛАВА 27. Паняцце і ўмовы дагавора
ГЛАВА 28. Заключэнне дагавора
ГЛАВА 29. Змяненне і скасаванне дагавора
РАЗДЕЛ IV. АСОБНЫЯ ВІДЫ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ
ГЛАВА 30. Купля-продаж
§ 1. Агульныя палажэнні аб куплі-продажы
§ 2. Рознічная купля-продаж
§ 3. Пастаўка тавараў
§ 4. Пастаўка тавараў для дзяржаўных патрэб
§ 5. Кантрактацыя
§ 6. Энергазабеспячэнне
§ 7. Продаж нерухомасці
§ 8. Продаж прадпрыемства
ГЛАВА 31. Мена
ГЛАВА 32. Дарэнне
ГЛАВА 33. Рэнта і дажывоцце з утрыманнем
§ 1. Агульныя палажэнні аб рэнце і дажывоцці з утрыманнем
§ 2. Пастаянная рэнта
§ 3. Пажыццёвая рэнта
§ 4. Дажывоцце з утрыманнем
ГЛАВА 34. Арэнда
§ 1. Агульныя палажэнні аб арэндзе
§ 2. Пракат
§ 3. Арэнда транспартных сродкаў
1. Арэнда транспартнага сродку з аказаннем паслуг па кіраванні і тэхнічнай эксплуатацыі (арэнда транспартнага сродку з экіпажам)
2. Арэнда транспартнага сродку без аказання паслуг па кіраванні і тэхнічнай эксплуатацыі (арэнда транспартнага сродку без экіпажа)
§ 4. Арэнда капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), ізаляваных памяшканняў ці машына-месцаў

§ 5. Арэнда прадпрыемства
§ 6. Фінансавая арэнда (лізінг)
ГЛАВА 35. Наём жылога памяшкання
ГЛАВА 36. Бязвыплатнае карыстанне
ГЛАВА 37. Падрад
§ 1. Агульныя палажэнні аб падрадзе
§ 2. Бытавы падрад
§ 3. Будаўнічы падрад
§ 4. Падрад на выкананне праектных і вышукальных работ
§ 5. Выключаны
ГЛАВА 38. Выкананне навукова-даследчых работ, вопытна-канструктарскіх і тэхналагічных работ
ГЛАВА 39. Аплатнае аказанне паслуг
ГЛАВА 40. Перавозка
ГЛАВА 41. Транспартная экспедыцыя
ГЛАВА 42. Пазыка і крэдыт
ГЛАВА 43. Фінансаванне пад уступку грашовага патрабавання (факторынг)
ГЛАВА 44. Банкаўскі ўклад (дэпазіт)
ГЛАВА 45. Бягучы (разліковы) банкаўскі рахунак
ГЛАВА 46. Разлікі
ГЛАВА 47. Захоўванне
§ 1. Агульныя палажэнні аб захоўванні
§ 2. Захоўванне на таварным складзе
§ 3. Спецыяльныя віды захоўвання
ГЛАВА 48. Страхаванне
ГЛАВА 49. Даручэнне
ГЛАВА 50. Дзеянні ў чужым інтарэсе без даручэння
ГЛАВА 51. Камісія
ГЛАВА 52. Давернае кіраванне маёмасцю
ГЛАВА 53. Комплексная прадпрымальніцкая ліцэнзія (франчайзінг)
ГЛАВА 54. Простая суполка
ГЛАВА 55. Публічнае абяцанне ўзнагароды
ГЛАВА 56. Публічны конкурс
ГЛАВА 57. Правядзенне гульняў і закладаў
ГЛАВА 58. Абавязацельствы ў выніку прычынення шкоды
§ 1. Агульныя палажэнні аб пакрыцці шкоды
§ 2. Пакрыццё шкоды, прычыненай жыццю ці здароўю грамадзяніна
§ 3. Пакрыццё шкоды, прычыненай у выніку недахопаў тавару, работы ці паслугі
§ 4. Кампенсацыя маральнай шкоды
ГЛАВА 59. Абавязацельствы ў выніку беспадстаўнага абагачэння
РАЗДЕЛ V. ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЯ ЎЛАСНАСЦЬ
ГЛАВА 60. Агульныя палажэнні
ГЛАВА 61. Аўтарскае права і сумежныя правы
ГЛАВА 62. Агульныя палажэнні аб праве прамысловай уласнасці
ГЛАВА 63. Права на вынаходку, карысную мадэль, прамысловы ўзор

ГЛАВА 64. Правы на сарты раслін і пароды жывёл
ГЛАВА 65. Права на тапалогію інтэгральнай мікрасхемы
ГЛАВА 66. Права на абарону сакрэту вытворчасці (ноу-хау) ад незаконнага выкарыстання
ГЛАВА 67. Сродкі індывідуалізацыі ўдзельнікаў грамадзянскага абароту, тавараў, работ ці паслуг
§ 1. Фірменнае найменне
§ 2. Таварны знак і знак абслугоўвання
§ 3. Геаграфічнае ўказанне
ГЛАВА 68. Нядобрасумленная канкурэнцыя
РАЗДЕЛ VI. СПАДЧЫННАЕ ПРАВА
ГЛАВА 69. Агульныя палажэнні аб успадкаванні
ГЛАВА 70. Атрыманне спадчыны паводле завяшчання
ГЛАВА 71. Атрыманне спадчыны паводле закона
ГЛАВА 72. Набыццё спадчыны
ГЛАВА 73. Асаблівасці ўспадкавання асобных відаў маёмасці
РАЗДЕЛ VII. МІЖНАРОДНАЕ ПРЫВАТНАЕ ПРАВА
ГЛАВА 74. Агульныя палажэнні
ГЛАВА 75. Калізійныя нормы
§ 1. Асобы
§ 2. Права, якое падлягае прымяненню да асабістых немаёмасных правоў
§ 3. Здзелкі, прадстаўніцтва, іскавая даўнасць
§ 4. Права ўласнасці і іншыя рэчавыя правы
§ 5. Дагаворныя абавязацельствы
§ 6. Пазадагаворныя абавязацельствы
§ 7. Інтэлектуальная ўласнасць
§ 8. Спадчыннае права
РАЗДЕЛ VIII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

РАЗДЗЕЛ I
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

ПАДРАЗДЗЕЛ 1
АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

ГЛАВА 1
ГРАМАДЗЯНСКАЕ ЗАКАНАДАЎСТВА

Артыкул 1. Адносіны, якія рэгулююцца грамадзянскім заканадаўствам

1. Грамадзянскае заканадаўства вызначае прававое становішча ўдзельнікаў грамадзянскага абароту, падставы ўзнікнення і парадак ажыццяўлення права ўласнасці і іншых рэчавых правоў, правоў на вынікі інтэлектуальнай дзейнасці, рэгулюе адносіны паміж асобамі, якія вядуць прадпрымальніцкую дзейнасць, ці з іх удзелам, дагаворныя і іншыя абавязацельствы, а таксама іншыя маёмасныя і звязаныя з імі асабістыя немаёмасныя адносіны.

Прадпрымальніцкая дзейнасць – гэта самастойная дзейнасць юрыдычных і фізічных асоб, якая ажыццяўляецца імі ў грамадзянскім абарачэнні ад свайго імя, на сваю рызыку і пад сваю маёмасную адказнасць і накіраваная на сістэматычнае

атрыманне прыбытку ад карыстання маёмасцю, продажу рэчаў, выробленых, перапрацаваных ці набытых указанымі асобамі для продажу, а таксама ад выканання работ ці аказання паслуг, калі гэтыя работы ці паслугі прызначаюцца для рэалізацыі іншым асобам і не выкарыстоўваюцца для ўласнага ўжытку.

Рамесная дзейнасць – гэта дзейнасць фізічных асоб па вырабе і рэалізацыі тавараў, выкананні работ, аказанні паслуг з прымяненнем ручной працы і інструменту, у тым ліку электрычнага, якая ажыццяўляецца самастойна, без прыцягнення іншых фізічных асоб па працоўных і (ці) грамадзянска-прававых дагаворах і накіраваная на задавальненне бытавых патрэбнасцей грамадзян.

Да прадпрымальніцкай дзейнасці не адносяцца:

рамесная дзейнасць;

дзейнасць па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму;

дзейнасць грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія ажыццяўляюць вядзенне асабістых падсобных гаспадарак, па вытворчасці, перапрацоўцы і рэалізацыі выробленай імі сельскагаспадарчай прадукцыі;

адвакацкая дзейнасць;

натарыяльная дзейнасць натарыусаў;

дзейнасць трацейскіх суддзяў;

дзейнасць медыятараў;

дзейнасць, якая ажыццяўляецца ў рамках часовых навуковых калектываў;

дзейнасць фізічных асоб па выкарыстанні ўласных каштоўных папер і банкаўскіх рахункаў у якасці сродку плацяжу ці ў мэтах захавання грашовых сродкаў і атрымання даходу;

наступныя віды дзейнасці, якія ажыццяўляюцца фізічнымі асобамі самастойна без прыцягнення іншых фізічных асоб па працоўных і (ці) грамадзянска-прававых дагаворах:

рэалізацыя замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія часова знаходзяцца і часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, на гандлёвых месцах на рынках і (ці) у іншых устаноўленых мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі месцах не больш за пяць дзён у каляндарным месяцы твораў жывапісу, графікі, скульптуры, вырабаў народных мастацкіх рамёстваў, прадукцыі раслінаводства і пчалярства (далей – разавая рэалізацыя);

рэалізацыя фізічнымі асобамі, за выключэннем асоб, указаных у абзацы дванаццатым гэтай часткі, на гандлёвых месцах на рынках і (ці) у іншых устаноўленых мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі месцах выробленых гэтымі фізічнымі асобамі хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў, гатовай кулінарнай прадукцыі, а таксама створаных імі твораў жывапісу, графікі, скульптуры, вырабаў народных мастацкіх рамёстваў; прадукцыі кветкаводства, дэкаратыўных раслін, іх насення і расады, жывёл (за выключэннем кацянят і шчанят); лекавых раслін, ягад, грыбоў, арэхаў, іншай дзікарослай прадукцыі; прадукцыі, указанай у частцы першай пункта 1^1 артыкула 294 Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь, пры наяўнасці дакументаў, прадугледжаных часткамі другой і трэцяй пункта 1^1 артыкула 294 Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь;

аказанне паслуг па вырошчванні сельскагаспадарчай прадукцыі;

аказанне паслуг па драбленні збожжа;

выпас жывёл;

рэпетытарства (кансультатыўныя паслугі па асобных навучальных прадметах (прадметах), навучальных дысцыплінах (дысцыплінах), адукацыйных галінах, тэмах, у тым ліку дапамога ў падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання);

чыстка і прыбіранне жылых памяшканняў;

догляд за дарослымі і дзяцьмі, мыццё і прасаванне пасцельнай бялізны і іншых рэчаў у хатніх гаспадарках грамадзян, выгул свойскіх жывёл і догляд за імі, закупка прадуктаў, мыццё посуду і прыгатаванне ежы ў хатніх гаспадарках грамадзян, унясенне платы са сродкаў асобы, якая абслугоўваецца, за карыстанне жылым памяшканнем і жыллёва-камунальныя паслугі, кашэнне травы на газонах, прыбіранне азялененай тэрыторыі ад лісця, скошанай травы і смецця;

майнінг, набыццё, адчужэнне лічбавых знакаў (токенаў);

музычна-забаўляльнае абслугоўванне вяселляў, юбілеяў і іншых урачыстых мерапрыемстваў;

дзейнасць акцёраў, танцораў, музыкантаў, выканаўцаў размоўнага жанру, якія выступаюць індывідуальна;

аказанне паслуг тамадой;

фотаздымка, выраб фатаграфій; відэаздымка падзей;

дзейнасць, звязаная з віншаваннем з днём нараджэння, Новым годам і іншымі святамі незалежна ад месца іх правядзення;

рэалізацыя кацянят і шчанят пры ўмове ўтрымання свойскай жывёлы (кошкі, сабакі);

паслугі па ўтрыманні, доглядзе і дрэсіроўцы свойскіх жывёл, акрамя сельскагаспадарчых жывёл;

дзейнасць па капіраванні, падрыхтоўцы дакументаў і іншая спецыялізаваная офісная дзейнасць;

дзейнасць па пісьмовым і вусным перакладзе;

аказанне паслуг, якія аказваюцца пры дапамозе аўтаматаў для вымярэння вагі, росту;

рамонт швейных, трыкатажных вырабаў і галаўных убораў, акрамя рамонту дываноў і дывановых вырабаў;

даванне жылых памяшканняў, садовых домікаў, дач (акрамя давання жылых памяшканняў, садовых домікаў, дач для кароткатэрміновага пражывання ў адпаведнасці з абзацам трыццаць трэцім гэтай часткі);

даванне фізічнымі асобамі, за выключэннем замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія часова знаходзяцца і часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь жылых памяшканняў, садовых домікаў, дач, якія належаць ім на праве ўласнасці, іншым фізічным асобам для кароткатэрміновага пражывання;

наступныя віды дзейнасці, якія ажыццяўляюцца фізічнымі асобамі, за выключэннем замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія часова знаходзяцца і часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, па заказах грамадзян, якія набываюць ці выкарыстоўваюць тавары (работы, паслугі) выключна для асабістых, бытавых, сямейных і іншых патрэб, не звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці:

выкананне работ, аказанне паслуг па дызайне інтэр'ераў, графічным дызайне, афармленні (упрыгажэнні) аўтамабіляў, унутранай прасторы капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), памяшканняў, іншых месцаў, а таксама мадэліраванне прадметаў афармлення інтэр'ера, тэкстыльных вырабаў, мэблі, адзення і абутку, прадметаў асабістага карыстання і бытавых вырабаў;

рамонт гадзіннікаў, абутку;

рамонт і аднаўленне, уключаючы перацяжку, хатняй мэблі з матэрыялаў заказчыка;

зборка мэблі;

настройка музычных інструментаў;

распілоўка і колка дроў, пагрузка і разгрузка грузаў;

вытворчасць адзення (у тым ліку галаўных убораў) і абутку з матэрыялаў заказчыка;

тынкавальныя, малярныя, шкляныя работы, работы па прыладжанні пакрыццяў падлогі і абліцоўцы сцен, абклейванне сцен шпалерамі, мураванне (рамонт) печаў і камінаў;

аказанне паслуг па распрацоўцы вэб-сайтаў, устаноўцы (настройцы) камп'ютараў і праграмнага забеспячэння, аднаўленні камп'ютараў пасля збою, рамонт, тэхнічнае абслугоўванне камп'ютараў і перыферыйнага абсталявання, навучанне працы на персанальным камп'ютары;

цырульніцкія і касметычныя паслугі, а таксама паслугі па манікюры і педыкюры.

Сямейныя, працоўныя, зямельныя адносіны, адносіны па выкарыстанні іншых прыродных рэсурсаў і ахове навакольнага асяроддзя, якія адпавядаюць прыкметам, указаным у частках першай і другой гэтага пункта, рэгулююцца грамадзянскім заканадаўствам, калі заканадаўствам аб шлюбе і сям'і, аб працы і занятасці насельніцтва, аб ахове і выкарыстанні зямель і іншым спецыяльным заканадаўствам не прадугледжана іншае.

2. Адносіны, звязаныя з ажыццяўленнем і абаронай неадчужальных правоў і свабод чалавека і іншых нематэрыяльных даброт (асабістыя немаёмасныя адносіны, не звязаныя з маёмаснымі), рэгулююцца грамадзянскім заканадаўствам, паколькі іншае не вынікае з сутнасці гэтых адносін.

3. Удзельнікамі адносін, якія рэгулююцца грамадзянскім заканадаўствам, з'яўляюцца грамадзяне Рэспублікі Беларусь (далей – грамадзяне), юрыдычныя асобы Рэспублікі Беларусь (далей – юрыдычныя асобы), Рэспубліка Беларусь, адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі Рэспублікі Беларусь (далей – адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі).

Правілы, устаноўленыя грамадзянскім заканадаўствам, прымяняюцца да адносін з удзелам замежных грамадзян, асоб без грамадзянства, замежных і міжнародных юрыдычных асоб (арганізацый, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі), замежных дзяржаў, іх адміністрацыйна-тэрытарыяльных (дзяржаўна-тэрытарыяльных) утварэнняў, якія з'яўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам гэтых дзяржаў удзельнікамі грамадзянскіх адносін, калі іншае не вызначана Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, іншымі заканадаўчымі актамі і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

4. Да маёмасных адносін, заснаваных на ўстаноўленым заканадаўствам адміністрацыйным падпарадкаванні аднаго боку іншаму, уключаючы падатковыя і бюджэтныя адносіны, грамадзянскае заканадаўства не прымяняецца, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам.

Артыкул 2. Асноўныя пачаткі грамадзянскага заканадаўства

Пад асноўнымі пачаткамі грамадзянскага заканадаўства разумеецца сістэма прынцыпаў, якія вызначаюць і рэгламентуюць грамадзянскія адносіны.

Грамадзянскае заканадаўства грунтуецца на наступных прынцыпах:

усе ўдзельнікі грамадзянскіх адносін, у тым ліку дзяржава, яе органы і службовыя асобы, дзейнічаюць у межах Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і прынятых у адпаведнасці з ёй актаў заканадаўства (прынцып вяршэнства права);

накіраванне і каардынацыя дзяржаўнай і прыватнай эканамічнай дзейнасці забяспечваюцца дзяржавай у сацыяльных мэтах (прынцып сацыяльнай накіраванасці рэгулявання эканамічнай дзейнасці);

ажыццяўленне грамадзянскіх правоў не павінна супярэчыць грамадскай карысці і бяспецы, наносіць шкоду навакольнаму асяроддзю, гісторыка-культурным каштоўнасцям, ушчамляць правы і інтарэсы іншых асоб, якія абараняюцца законам (прынцып прыярытэту грамадскіх інтарэсаў);

суб'екты грамадзянскага права ўдзельнічаюць у грамадзянскіх адносінах на аднолькавых правах, роўныя перад законам, не могуць карыстацца перавагамі і прывілеямі, якія супярэчаць закону, і маюць права без усякай дыскрымінацыі на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў (прынцып роўнасці ўдзельнікаў грамадзянскіх адносін);

права ўласнасці, набытай законным спосабам, ахоўваецца законам і абараняецца дзяржавай, яе недатыкальнасць гарантуецца, а прымусовае адчужэнне дапускаецца толькі па матывах грамадскай неабходнасці пры прытрымліванні ўмоў і парадку, вызначаных законам, са своечасовым і поўным кампенсаваннем кошту адчужанай маёмасці або згодна з пастановай суда (прынцып недатыкальнасці ўласнасці);

грамадзяне і юрыдычныя асобы свабодныя ў заключэнні дагавора. Прымус да заключэння дагавора не дапускаецца, за выключэннем выпадкаў, калі абавязак заключыць дагавор прадугледжаны заканадаўствам ці добраахвотна прынятым абавязацельствам (прынцып свабоды дагавора);

добрасумленнасць і разумнасць удзельнікаў грамадзянскіх праваадносін маецца на ўвазе, паколькі не ўстаноўлена іншае (прынцып добрасумленнасці і разумнасці ўдзельнікаў грамадзянскіх праваадносін);

умяшанне ў прыватныя справы не дапускаецца, за выключэннем выпадкаў, калі такое ўмяшанне ажыццяўляецца на падставе прававых нормаў у інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маральнасці, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб (прынцып недапушчальнасці самавольнага ўмяшання ў прыватныя справы);

грамадзяне і юрыдычныя асобы маюць права ажыццяўляць абарону грамадзянскіх правоў у судзе і іншымі спосабамі, прадугледжанымі заканадаўствам, а таксама самаабарону грамадзянскіх правоў з прытрымліваннем межаў, вызначаных у адпаведнасці з грамадзянска-прававымі нормамі (прынцып бесперашкоднага ажыццяўлення грамадзянскіх правоў, забеспячэння аднаўлення парушаных правоў, іх судовай абароны);

іншых прынцыпах, замацаваных у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, іншых актах заканадаўства, а таксама грамадзянска-прававых нормаў, якія вынікаюць са зместу і сэнсу.

Удзельнікі грамадзянскіх праваадносін набываюць і ажыццяўляюць свае грамадзянскія правы сваёй воляй і ў сваіх інтарэсах. Яны свабодныя ва ўстанаўленні сваіх правоў і абавязкаў на аснове дагавора і ў вызначэнні любых умоў дагавора, якія не супярэчаць заканадаўству.

Артыкул 3. Грамадзянскае заканадаўства

1. Грамадзянскае заканадаўства – сістэма нарматыўных прававых актаў, што ўключае ў сябе прававыя акты, якія ўтрымліваюць нормы грамадзянскага права:

заканадаўчыя акты (Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, гэты Кодэкс і законы Рэспублікі Беларусь, дэкрэты і ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь);

распараджэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

пастановы Урада Рэспублікі Беларусь, выдадзеныя ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі;

акты Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, выдадзеныя ў межах іх кампетэнцыі па рэгуляванні грамадзянскіх адносін, устаноўленай Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і прынятымі ў адпаведнасці з ёй іншымі заканадаўчымі актамі;

акты міністэрстваў, іншых рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых органаў кіравання і самакіравання, выдадзеныя ў выпадках і межах, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, распараджэннямі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і пастановамі Урада Рэспублікі Беларусь.

2. У выпадку разыходжання акта заканадаўства з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь дзейнічае Канстытуцыя.

У выпадку разыходжання дэкрэта ці ўказа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з гэтым Кодэксам ці іншым законам гэты Кодэкс ці іншы закон маюць вяршэнства толькі тады, калі паўнамоцтвы на выданне дэкрэта ці ўказа былі дадзены законам.

Нормы грамадзянскага права, якія ўтрымліваюцца ў іншых законах, павінны адпавядаць гэтаму Кодэксу. У выпадку разыходжання ўказаных актаў з гэтым Кодэксам дзейнічае апошні.

У выпадку калізіі (разыходжання) іншых актаў грамадзянскага заканадаўства прымяняюцца правілы, устаноўленыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб нарматыўных прававых актах.

Артыкул 4. Дзеянне грамадзянскага заканадаўства ў часе

Калі іншае не прадугледжана Канстытуцыяй і прынятымі ў адпаведнасці з ёй іншымі заканадаўчымі актамі, акты грамадзянскага заканадаўства не маюць зваротнай сілы і прымяняюцца да адносін, якія ўзніклі:

пасля ўвядзення іх у дзеянне;

да ўвядзення іх у дзеянне ў частцы правоў і абавязкаў, якія ўзніклі пасля ўвядзення іх у дзеянне.

Адносіны бакоў паводле дагавора, заключанага да ўвядзення ў дзеянне акта грамадзянскага заканадаўства, рэгулююцца ў адпаведнасці з артыкулам 392 гэтага Кодэкса.

Артыкул 5. Прымяненне грамадзянскага заканадаўства па аналогіі

1. У выпадках, калі прадугледжаныя артыкулам 1 гэтага Кодэкса адносіны прама не ўрэгуляваны актамі заканадаўства ці пагадненнем бакоў, да такіх адносін, паколькі гэта не супярэчыць іх сутнасці, прымяняецца норма грамадзянскага заканадаўства, якая рэгулюе падобныя адносіны (аналогія закона).

2. Пры немагчымасці выкарыстання ва ўказаных выпадках аналогіі закона правы і абавязкі бакоў вызначаюцца зыходзячы з асноўных пачаткаў і сэнсу грамадзянскага заканадаўства (аналогія права).

3. Не дапускаецца прымяненне па аналогіі нормаў, якія абмяжоўваюць грамадзянскія правы і ўстанаўліваюць адказнасць.

Артыкул 6. Грамадзянскае заканадаўства і нормы міжнароднага права

Рэспубліка Беларусь прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім грамадзянскага заканадаўства.

Нормы грамадзянскага права, якія ўтрымліваюцца ў міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь, што ўступілі ў сілу, з'яўляюцца часткай дзеючага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь грамадзянскага заканадаўства, падлягаюць непасрэднаму прымяненню, акрамя выпадкаў, калі з міжнароднага дагавора вынікае, што для прымянення такіх нормаў патрабуецца выданне ўнутрыдзяржаўнага акта, і маюць сілу таго прававога акта, якім выказана згода Рэспублікі Беларусь на абавязковасць для яе адпаведнага міжнароднага дагавора.

Нормы грамадзянскага права, якія ўтрымліваюцца ў міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь, што не ўступілі ў сілу, могуць прымяняцца Рэспублікай Беларусь часова ў парадку, устаноўленым заканадаўствам аб міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь.

ГЛАВА 2
УЗНІКНЕННЕ ГРАМАДЗЯНСКІХ ПРАВОЎ І АБАВЯЗКАЎ, АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ І АБАРОНА ГРАМАДЗЯНСКІХ ПРАВОЎ

Артыкул 7. Падставы ўзнікнення грамадзянскіх правоў і абавязкаў

1. Грамадзянскія правы і абавязкі ўзнікаюць з падстаў, прадугледжаных заканадаўствам, а таксама з дзеянняў грамадзян і юрыдычных асоб, якія хоць і не прадугледжаны ім, але паводле асноўных пачаткаў і сэнсу грамадзянскага заканадаўства параджаюць грамадзянскія правы і абавязкі.

У адпаведнасці з гэтым грамадзянскія правы і абавязкі ўзнікаюць:

1) з дагавораў і іншых здзелак, прадугледжаных заканадаўствам, а таксама з дагавораў і іншых здзелак, якія хоць і не прадугледжаны заканадаўствам, але не супярэчаць яму;

2) з актаў дзяржаўных органаў і органаў мясцовага кіравання і самакіравання, якія прадугледжаны заканадаўствам у якасці падставы ўзнікнення грамадзянскіх правоў і абавязкаў;

3) з судовага рашэння, якое ўстанавіла грамадзянскія правы і абавязкі;

4) у выніку стварэння і набыцця маёмасці на падставах, не забароненых заканадаўствам;

5) у выніку стварэння твораў навукі, літаратуры, мастацтва, вынаходак і іншых вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці;

6) у выніку прычынення шкоды іншай асобе;

7) у выніку беспадстаўнага абагачэння;

8) у выніку іншых дзеянняў грамадзян і юрыдычных асоб;

9) у выніку падзей, з якімі заканадаўства звязвае надыход грамадзянска-прававых наступстваў.

2. Правы на маёмасць, якая падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі, узнікаюць з моманту рэгістрацыі гэтай маёмасці ці адпаведных правоў на яе, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

Артыкул 8. Ажыццяўленне грамадзянскіх правоў

1. Грамадзяне і юрыдычныя асобы па сваім меркаванні ажыццяўляюць прыналежныя ім грамадзянскія правы.

2. Адмова грамадзян і юрыдычных асоб ад ажыццяўлення прыналежных ім правоў не цягне за сабой спынення гэтых правоў, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

Артыкул 9. Межы ажыццяўлення грамадзянскіх правоў

1. Не дапускаюцца дзеянні грамадзян і юрыдычных асоб, якія ажыццяўляюцца выключна з намерам зрабіць шкоду іншай асобе, а таксама злоўжыванне правам у іншых формах.

Не дапускаецца выкарыстанне грамадзянскіх правоў у мэтах абмежавання канкурэнцыі, а таксама злоўжыванне сваім дамінуючым становішчам на рынку.

2. У выпадку незахавання патрабаванняў, прадугледжаных пунктам 1 гэтага артыкула, суд агульнай юрысдыкцыі ці трацейскі суд могуць адмовіць асобе ў абароне прыналежнага яму права.

3. Асоба, якая злоўжывае правам, абавязана аднавіць становішча асобы, пацярпелай ад злоўжывання, кампенсаваць прычынены ўрон.

4. У выпадках, калі заканадаўства ставіць абарону грамадзянскіх правоў у залежнасць ад таго, ці ажыццяўляліся гэтыя правы добрасумленна і разумна, добрасумленнасць і разумнасць удзельнікаў грамадзянскіх праваадносін маецца на ўвазе.

Артыкул 10. Судовая абарона грамадзянскіх правоў

1. Абарону парушаных ці аспрэчаных грамадзянскіх правоў ажыццяўляе суд агульнай юрысдыкцыі, трацейскі суд (далей – суд) у адпаведнасці з падведамнасцю, устаноўленай працэсуальным заканадаўствам, а ў прадугледжаных заканадаўствам выпадках – у адпаведнасці з дагаворам.

2. Заканадаўствам ці дагаворам (калі гэта не супярэчыць заканадаўству) можа быць прадугледжана ўрэгуляванне спрэчкі паміж бакамі да звароту ў суд.

Да звароту ў суд з іскам па спрэчках, якія ўзнікаюць паміж юрыдычнымі асобамі і (ці) індывідуальнымі прадпрымальнікамі, абавязковым з'яўляецца прад'яўленне прэтэнзіі (пісьмовай прапановы аб добраахвотным урэгуляванні спрэчкі), калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам, іншымі заканадаўчымі актамі ці дагаворам. Парадак прад'яўлення прэтэнзіі ўстанаўліваецца заканадаўствам ці дагаворам.

3. Абарона грамадзянскіх правоў у адміністрацыйным парадку ажыццяўляецца толькі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам. Рашэнне, прынятае ў адміністрацыйным парадку, можа быць абскарджана ў суд.

Артыкул 11. Спосабы абароны грамадзянскіх правоў

Абарона грамадзянскіх правоў ажыццяўляецца шляхам:

1) прызнання права;

2) аднаўлення становішча, якое існавала да парушэння права;

3) спыненне дзеянняў, якія парушаюць права ці ствараюць пагрозу яго парушэння;

4) прызнання спрэчнай здзелкі несапраўднай і прымянення наступстваў яе несапраўднасці, устанаўлення факта нікчэмнай здзелкі і прымянення наступстваў яе несапраўднасці;

5) прызнання несапраўдным акта дзяржаўнага органа ці органа мясцовага кіравання і самакіравання;

6) самаабароны права;

7) прысуджэння да выканання абавязку ў натуры;

8) пакрыцця страт;

9) спагнання няўстойкі;

10) кампенсацыі маральнай шкоды;

11) спынення ці змянення праваадносін;

12) непрымянення судом акта дзяржаўнага органа ці органа мясцовага кіравання і самакіравання, які супярэчыць заканадаўству;

13) іншымі спосабамі, прадугледжанымі заканадаўствам.

Артыкул 12. Прызнанне несапраўдным акта дзяржаўнага органа ці органа мясцовага кіравання і самакіравання

Ненарматыўны акт дзяржаўнага органа ці органа мясцовага кіравання і самакіравання, а таксама акт заканадаўства, які не адпавядае іншаму заканадаўчаму акту і парушае грамадзянскія правы і інтарэсы грамадзяніна і (ці) юрыдычнай асобы, якія ахоўваюцца заканадаўчымі актамі, прызнаецца судом несапраўдным па патрабаванні асобы, чые правы парушаны, а ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, – па патрабаванні іншых асоб. У выпадку прызнання судом акта несапраўдным парушанае права падлягае аднаўленню або абароне іншымі спосабамі, прадугледжанымі артыкулам 11 гэтага Кодэкса.

Артыкул 13. Самаабарона грамадзянскіх правоў

Дапускаецца абарона грамадзянскіх правоў непасрэднымі дзеяннямі асобы, правы якой парушаюцца, калі такія дзеянні не звязаны з парушэннем заканадаўства.

Не з'яўляецца парушэннем заканадаўства самаабарона грамадзянскіх правоў, ажыццёўленая з прычыненнем шкоды ў стане крайняй неабходнасці ці неабходнай абароны, калі дзеянні асобы, якая абараняецца, былі суразмерныя характару і небяспецы парушэння і не выйшлі за межы яго папярэджання ці спынення.

Артыкул 14. Пакрыццё страт

1. Асоба, права якой парушана, можа патрабаваць поўнага пакрыцця прычыненых ёй страт, калі заканадаўствам ці адпаведным заканадаўству дагаворам не прадугледжана іншае.

2. Пад стратамі разумеюцца расходы, якія асоба, чыё права парушана, зрабіла ці павінна будзе зрабіць для аднаўлення парушанага права, згуба ці пашкоджанне маёмасці (рэальны ўрон), а таксама неатрыманыя даходы, якія гэта асоба атрымала б пры звычайных умовах грамадзянскага абароту, калі б яе права не было парушана (упушчаная выгада).

Калі асоба, якая парушыла права, атрымала ў выніку гэтага даходы, асоба, права якой парушана, мае права патрабаваць пакрыцця нароўні з іншымі стратамі ўпушчанай выгады ў памеры, не меншым за такія даходы.

Артыкул 15. Пакрыццё страт, прычыненых дзяржаўнымі органамі, органамі мясцовага кіравання і самакіравання

Страты, прычыненыя грамадзяніну ці юрыдычнай асобе ў выніку незаконных дзеянняў (бяздзейнасці) дзяржаўных органаў ці службовых асоб гэтых органаў, органаў мясцовага кіравання і самакіравання ці службовых асоб гэтых органаў, у тым ліку выдання не адпаведнага заканадаўству акта дзяржаўнага органа ці органа мясцовага кіравання і самакіравання, падлягаюць пакрыццю Рэспублікай Беларусь ці адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай у парадку, прадугледжаным заканадаўствам.

ПАДРАЗДЗЕЛ 2
АСОБЫ

ГЛАВА 3
ГРАМАДЗЯНЕ (ФІЗІЧНЫЯ АСОБЫ)

Артыкул 16. Праваздольнасць грамадзян

1. Здольнасць мець грамадзянскія правы і несці абавязкі (грамадзянская праваздольнасць) прызнаецца ў роўнай меры за ўсімі грамадзянамі.

2. Праваздольнасць грамадзяніна ўзнікае ў момант яго нараджэння і спыняецца яго смерцю.

Артыкул 17. Змест праваздольнасці грамадзян

Грамадзяне могуць у адпаведнасці з заканадаўствам мець маёмасць на праве ўласнасці; атрымліваць у спадчыну і завяшчаць маёмасць; займацца прадпрымальніцкай і любой іншай не забароненай заканадаўчымі актамі дзейнасцю; ствараць юрыдычныя асобы самастойна ці сумесна з іншымі грамадзянамі і юрыдычнымі асобамі; заключаць здзелкі, якія не супярэчаць заканадаўству, і ўдзельнічаць у абавязацельствах; выбіраць месца жыхарства; мець правы аўтараў твораў навукі, літаратуры ці мастацтва, вынаходак ці іншых вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці, якія ахоўваюцца заканадаўствам; мець іншыя маёмасныя і асабістыя немаёмасныя правы.

Артыкул 18. Імя грамадзяніна

1. Грамадзянін набывае і ажыццяўляе правы і абавязкі пад сваім іменем, якое ўключае прозвішча, уласнае імя і імя па бацьку (калі такое маецца), калі іншае не вынікае з заканадаўства.

У выпадках і парадку, прадугледжаных заканадаўствам, грамадзянін можа выкарыстоўваць псеўданім (выдуманае імя).

2. Грамадзянін мае права перамяніць сваё імя ў парадку, устаноўленым заканадаўствам. Перамена грамадзянінам імя не з'яўляецца падставай для спынення ці змянення яго правоў і абавязкаў, набытых пад ранейшым іменем.

Грамадзянін абавязаны прымаць неабходныя меры для паведамлення сваім даўжнікам і крэдыторам аб перамене яго імя і нясе рызыку наступстваў, выкліканых адсутнасцю ў гэтых асоб звестак аб перамене яго імя.

Грамадзянін, які перамяніў імя, мае права патрабаваць унясення за свой кошт адпаведных змяненняў у дакументы, афармленыя на яго ранейшае імя.

3. Імя, атрыманае грамадзянінам пры нараджэнні, а таксама перамена імя падлягаюць рэгістрацыі ў парадку, устаноўленым для рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану.

4. Набыццё правоў і абавязкаў пад іменем іншай асобы не дапускаецца.

5. Шкода, прычыненая грамадзяніну ў выніку неправамернага выкарыстання яго імя, падлягае пакрыццю ў адпаведнасці з законам.

Пры скажэнні або выкарыстанні імя грамадзяніна спосабамі ці ў форме, якія закранаюць яго гонар, годнасць ці дзелавую рэпутацыю, прымяняюцца правілы, прадугледжаныя артыкулам 153 гэтага Кодэкса.

Артыкул 19. Месца жыхарства грамадзяніна

1. Месцам жыхарства грамадзяніна прызнаецца месца знаходжання (адрас) жылога памяшкання, права валодання, распараджэння і (ці) карыстання якім узнікла ў грамадзяніна на падставах, устаноўленых заканадаўчымі актамі, або населены пункт, дзе гэты грамадзянін пастаянна ці пераважна пражывае, а пры немагчымасці выявіць такое месца – месца жыхарства (пры яго адсутнасці – месца знаходжання), указанае ў дакуменце, які сведчыць асобу, або іншым дакуменце аб рэгістрацыі, або месца знаходжання маёмасці гэтай асобы.

2. Месцам жыхарства непаўналетніх ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў ці грамадзян, якія знаходзяцца пад апекай, прызнаецца месца жыхарства іх бацькоў, усынавіцеляў ці апекуноў.

Артыкул 20. Дзеяздольнасць грамадзян

1. Здольнасць грамадзяніна сваімі дзеяннямі набываць і ажыццяўляць грамадзянскія правы, ствараць для сябе грамадзянскія абавязкі і выконваць іх (грамадзянская дзеяздольнасць) узнікае ў поўным аб'ёме з надыходам паўналецця, гэта значыць пасля дасягнення васямнаццацігадовага ўзросту.

2. У выпадку, калі заканадаўствам дапускаецца эмансіпацыя (артыкул 26 гэтага Кодэкса) ці ўступленне ў шлюб да дасягнення васямнаццаці гадоў, грамадзянін, які не дасягнуў васямнаццацігадовага ўзросту, набывае дзеяздольнасць у поўным аб'ёме адпаведна з моманту прыняцця рашэння аб эмансіпацыі ці з часу ўступлення ў шлюб.

Набытая ў выніку заключэння шлюбу дзеяздольнасць захоўваецца ў поўным аб'ёме і ў выпадку скасавання шлюбу.

Пры прызнанні шлюбу несапраўдным суд можа прыняць рашэнне аб страце непаўналетнім сужэнцам поўнай дзеяздольнасці з моманту, які вызначаецца судом.

3. Усе грамадзяне маюць роўную дзеяздольнасць, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

Артыкул 21. Недапушчальнасць пазбаўлення ці абмежавання праваздольнасці і дзеяздольнасці грамадзян

1. Ніхто не можа быць абмежаваны ў праваздольнасці і дзеяздольнасці інакш як у выпадках і парадку, устаноўленых законам.

2. Поўная ці частковая адмова грамадзяніна ад праваздольнасці ці дзеяздольнасці і іншыя здзелкі, накіраваныя на абмежаванне праваздольнасці ці дзеяздольнасці, нікчэмныя, за выключэннем выпадкаў, калі такія здзелкі дапускаюцца законам.

Артыкул 22. Прадпрымальніцкая дзейнасць грамадзяніна

1. Грамадзянін мае права займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю без утварэння юрыдычнай асобы з моманту дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. Колькасць фізічных асоб, якія прыцягваюцца індывідуальным прадпрымальнікам на падставе грамадзянска-прававых і (ці) працоўных дагавораў для ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, а таксама колькасць маёмасці, якая выкарыстоўваецца для гэтых мэт, можа быць абмежавана заканадаўчымі актамі.

2. Да прадпрымальніцкай дзейнасці грамадзян, якая ажыццяўляецца без утварэння юрыдычнай асобы, адпаведна прымяняюцца правілы гэтага Кодэкса, якія рэгулююць дзейнасць юрыдычных асоб, якія з'яўляюцца камерцыйнымі арганізацыямі, калі іншае не вынікае з заканадаўства ці сутнасці праваадносін.

3. Грамадзянін, які ажыццяўляе прадпрымальніцкую дзейнасць без утварэння юрыдычнай асобы з парушэннем патрабаванняў пункта 1 гэтага артыкула, не мае права спасылацца ў адносінах да заключаных ім пры гэтым здзелак на тое, што ён не з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам. Да такіх здзелак прымяняюцца правілы, устаноўленыя заканадаўствам для прадпрымальніцкай дзейнасці.

Артыкул 23. Маёмасная адказнасць грамадзяніна

Грамадзянін адказвае па сваіх абавязацельствах усёй прыналежнай яму маёмасцю, за выключэннем маёмасці, на якую ў адпаведнасці з заканадаўствам не можа быць звернута спагнанне.

Пералік маёмасці грамадзян, на якую не можа быць звернута спагнанне, устанаўліваецца заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні.

Артыкул 24. Эканамічная неплацежаздольнасць (банкруцтва) індывідуальнага прадпрымальніка

1. Індывідуальны прадпрымальнік, які не ў стане задаволіць патрабаванні крэдытораў, звязаныя з ажыццяўленнем ім прадпрымальніцкай дзейнасці, можа быць прызнаны эканамічна неплацежаздольным (банкрутам) у судовым парадку.

2. Пры ажыццяўленні працэдуры прызнання эканамічна неплацежаздольным (банкрутам) індывідуальнага прадпрымальніка яго крэдыторы па абавязацельствах, не звязаных з ажыццяўленнем ім прадпрымальніцкай дзейнасці, таксама маюць права прад'явіць свае патрабаванні. Патрабаванні ўказаных крэдытораў, не заяўленыя імі ў такім парадку, захоўваюць сілу пасля завяршэння працэдуры банкруцтва індывідуальнага прадпрымальніка.

3. Патрабаванні крэдытораў індывідуальнага прадпрымальніка ў выпадку прызнання яго банкрутам задавальняюцца за кошт прыналежнай яму маёмасці, на якую можа быць звернута спагнанне.

4. Пасля завяршэння разлікаў з крэдыторамі індывідуальны прадпрымальнік, прызнаны банкрутам, вызваляецца ад выканання астатніх абавязацельстваў, , звязаных з яго прадпрымальніцкай дзейнасцю, і іншых патрабаванняў, прад'яўленых да выканання і ўлічаных пры прызнанні прадпрымальніка банкрутам.

Захоўваюць сілу патрабаванні грамадзян, перад якімі індывідуальны прадпрымальнік, прызнаны банкрутам або які аб’явіў ім аб сваім банкруцтве, нясе адказнасць за прычыненне шкоды іх жыццю ці здароўю, а таксама іншыя патрабаванні асабістага характару.

5. Падставы, парадак прызнання судом індывідуальнага прадпрымальніка эканамічна неплацежаздольным (банкрутам) або аб’яўлення ім аб сваім банкруцтве, чарговасць задавальнення патрабаванняў крэдытораў устанаўліваюцца гэтым Кодэксам і іншым заканадаўствам.

Артыкул 25. Дзеяздольнасць непаўналетніх ва ўзросце ад чатырнаццаці да васямнаццаці гадоў

1. Непаўналетнія ва ўзросце ад чатырнаццаці да васямнаццаці гадоў афармляюць здзелкі, за выключэннем указаных у пункце 2 гэтага артыкула, з пісьмовай згоды сваіх законных прадстаўнікоў – бацькоў, усынавіцеляў ці папячыцеляў.

Здзелка, заключаная такім непаўналетнім, сапраўдная таксама пры наступным пісьмовым адабрэнні яго бацькоў, усынавіцеляў ці папячыцеля.

2. Непаўналетнія ва ўзросце ад чатырнаццаці да васямнаццаці гадоў маюць права самастойна, без згоды сваіх законных прадстаўнікоў:

1) распараджацца сваімі заробкам, стыпендыяй і іншымі ўласнымі даходамі;

2) ажыццяўляць правы аўтара твора навукі, літаратуры ці мастацтва, вынаходкі ці іншага выніку сваёй інтэлектуальнай дзейнасці, які ахоўваецца заканадаўствам;

3) уносіць грашовыя сродкі ў банкі ці нябанкаўскія крэдытна-фінансавыя арганізацыі і распараджацца імі ў адпаведнасці з заканадаўствам;

4) заключаць дробныя бытавыя здзелкі і іншыя здзелкі, прадугледжаныя пунктам 2 артыкула 27 гэтага Кодэкса.

Пасля дасягнення шаснаццаці гадоў непаўналетнія таксама маюць права быць членамі кааператываў у адпаведнасці з актамі заканадаўства аб кааператывах.

3. Маёмасную адказнасць па здзелках, заключаных у адпаведнасці з пунктам 1 гэтага артыкула непаўналетнімі ва ўзросце ад чатырнаццаці да васямнаццаці

гадоў, нясе непаўналетні, а субсідыярную адказнасць – асоба, якая дала пісьмовую згоду на заключэнне адпаведнай здзелкі.

Непаўналетнія ва ўзросце ад чатырнаццаці да васямнаццаці гадоў самастойна нясуць маёмасную адказнасць па здзелках, заключаных імі ў адпаведнасці з пунктам 2 гэтага артыкула.

За прычыненую імі шкоду такія непаўналетнія нясуць адказнасць у адпаведнасці з главой 58 гэтага Кодэкса.

4. Пры наяўнасці дастатковых падстаў суд па хадайніцтве бацькоў, усынавіцеляў ці папячыцеля або органа апекі і папячыцельства можа абмежаваць ці пазбавіць непаўналетняга ва ўзросце ад чатырнаццаці да васямнаццаці гадоў права самастойна распараджацца сваімі заробкам, стыпендыяй ці іншымі даходамі, за выключэннем выпадкаў, калі такі непаўналетні набыў дзеяздольнасць у поўным аб'ёме ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 20 гэтага Кодэкса.

Артыкул 26. Эмансіпацыя

1. Непаўналетні, які дасягнуў шаснаццаці гадоў, можа быць аб'яўлены поўнасцю дзеяздольным, калі ён працуе па працоўным дагаворы (кантракце) або са згоды бацькоў, усынавіцеляў ці папячыцеля займаецца прадпрымальніцкай дзейнасцю.

Аб’яўленне непаўналетняга поўнасцю дзеяздольным (эмансіпацыя) праводзіцца паводле рашэння органаў апекі і папячыцельства са згоды абодвух бацькоў, усынавіцеляў ці папячыцеля, а пры адсутнасці такой згоды – паводле рашэння суда.

2. Бацькі, усынавіцелі і папячыцель не нясуць адказнасці па абавязацельствах эмансіпіраванага непаўналетняга, у тым ліку па абавязацельствах, якія ўзніклі ў выніку прычынення ім шкоды.

Артыкул 27. Дзеяздольнасць непаўналетніх ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў (малалетніх)

1. За непаўналетніх ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў (малалетніх) здзелкі, за выключэннем указаных у пункце 2 гэтага артыкула, могуць заключаць ад іх імя толькі іх законныя прадстаўнікі – бацькі, усынавіцелі ці апекуны.

Да здзелак законных прадстаўнікоў такога непаўналетняга з яго маёмасцю прымяняюцца правілы, прадугледжаныя пунктамі 2 і 3 артыкула 35 гэтага Кодэкса, калі іншае не ўстаноўлена Жыллёвым кодэксам Рэспублікі Беларусь.

2. Непаўналетнія ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў маюць права самастойна заключаць:

1) дробныя бытавыя здзелкі;

2) здзелкі, накіраваныя на бязвыплатнае атрыманне выгад, якія не патрабуюць натарыяльнага засведчання або дзяржаўнай рэгістрацыі;

3) здзелкі па распараджэнні сродкамі, дадзенымі законным прадстаўніком ці са згоды апошняга трэцяй асобай для пэўнай мэты ці свабоднага распараджэння.

3. Маёмасную адказнасць па здзелках непаўналетняга ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў, у тым ліку па здзелках, заключаных ім самастойна, нясуць яго бацькі, усынавіцелі ці апякун. Адказнасць за шкоду, прычыненую непаўналетнім ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў, вызначаецца ў адпаведнасці з правіламі главы 58 гэтага Кодэкса.

Артыкул 28. Права распараджэння банкаўскімі ўкладамі (дэпазітамі) на імя малалетніх

Банкаўскімі ўкладамі (дэпазітамі), унесенымі кім-небудзь на імя малалетніх, распараджаюцца іх бацькі, усынавіцелі ці апекуны з прытрымліваннем правілаў, прадугледжаных артыкулам 35 гэтага Кодэкса, а таксама ўкладчык (у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам ці дагаворам).

Артыкул 29. Прызнанне грамадзяніна недзеяздольным

1. Грамадзянін, які ў выніку псіхічнага расстройства (душэўнай хваробы ці прыдуркаватасці) не можа разумець значэння сваіх дзеянняў ці кіраваць імі, можа быць прызнаны судом недзеяздольным у парадку, устаноўленым грамадзянскім працэсуальным заканадаўствам. Над ім устанаўліваецца апека.

2. Ад імя грамадзяніна, прызнанага недзеяздольным, здзелкі заключае яго апякун.

3. Калі падставы, з прычыны якіх грамадзянін быў прызнаны недзеяздольным, зніклі, суд прызнае яго дзеяздольным. На падставе рашэння суда адмяняецца ўстаноўленая над ім апека.

Артыкул 30. Абмежаванне дзеяздольнасці грамадзян

1. Грамадзянін, які ў выніку злоўжывання спіртнымі напіткамі, наркатычнымі сродкамі, псіхатропнымі рэчывамі, іх аналагамі ставіць сваю сям'ю ў цяжкае матэрыяльнае становішча, можа быць абмежаваны ў дзеяздольнасці судом у парадку, устаноўленым грамадзянскім працэсуальным заканадаўствам. Над ім устанаўліваецца папячыцельства.

Такі грамадзянін мае права самастойна заключаць дробныя бытавыя здзелкі.

Заключаць іншыя здзелкі, а таксама атрымліваць заробак, пенсію і іншыя даходы і распараджацца імі ён можа толькі са згоды папячыцеля. Аднак ён самастойна нясе маёмасную адказнасць па заключаных ім здзелках і за прычыненую ім шкоду.

2. Калі падставы, з прычыны якіх грамадзянін быў абмежаваны ў дзеяздольнасці, зніклі, суд адмяняе абмежаванне яго дзеяздольнасці. На падставе рашэння суда адмяняецца ўстаноўленае над грамадзянінам папячыцельства.

Артыкул 31. Абмежаванне прадпрымальніцкай дзейнасці грамадзяніна

У выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, прадпрымальніцкая дзейнасць грамадзяніна (індывідуальнага прадпрымальніка, заснавальніка, удзельніка, уласніка маёмасці ці кіраўніка юрыдычнай асобы і інш.) можа быць абмежавана ў судовым парадку на тэрмін да трох гадоў.

Грамадзянін, прадпрымальніцкая дзейнасць якога абмежавана, на працягу ўсяго тэрміну дзеяння абмежавання не можа:

ажыццяўляць прадпрымальніцкую дзейнасць без утварэння юрыдычнай асобы;

сваімі дзеяннямі набываць і ажыццяўляць правы, ствараць для сябе і выконваць абавязкі ўласніка маёмасці (заснавальніка, удзельніка) юрыдычнай асобы;

займаць пасады ў выканаўчых органах юрыдычных асоб;

выступаць у якасці кіраўніка прадпрыемствамі і іншай маёмасці, якая выкарыстоўваецца для прадпрымальніцкай дзейнасці.

Прадпрыемства і іншая маёмасць, якая знаходзіцца ва ўласнасці ўказанага грамадзяніна, можа быць выкарыстана ім у перыяд дзеяння абмежавання для прадпрымальніцкай дзейнасці выключна шляхам перадачы гэтай маёмасці ў давернае кіраванне.

Артыкул 32. Апека

1. Апека ўстанаўліваецца над малалетнімі, а таксама над грамадзянамі, прызнанымі судом недзеяздольнымі.

2. Апекуны з'яўляюцца прадстаўнікамі падапечных паводле закона (законнымі прадстаўнікамі) і заключаюць ад іх імя і ў іх інтарэсах усе неабходныя здзелкі.

Артыкул 33. Папячыцельства

1. Папячыцельства ўстанаўліваецца над непаўналетнімі ва ўзросце ад чатырнаццаці да васямнаццаці гадоў, а таксама над грамадзянамі, абмежаванымі судом у дзеяздольнасці ў выніку злоўжывання спіртнымі напіткамі, наркатычнымі сродкамі, псіхатропнымі рэчывамі, іх аналагамі.

2. Папячыцелі даюць згоду на заключэнне тых здзелак, якія грамадзяне, што знаходзяцца пад папячыцельствам, не маюць права заключаць самастойна.

Папячыцелі аказваюць падапечным садзейнічанне ў ажыццяўленні імі сваіх правоў і выкананні абавязкаў, а таксама ахоўваюць іх ад злоўжыванняў з боку трэціх асоб.

Артыкул 34. Апекуны і папячыцелі як прадстаўнікі падапечных

1. Апекуны і папячыцелі прызначаюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, і выступаюць у абарону правоў і інтарэсаў падапечных у адносінах з любымі асобамі і арганізацыямі, у тым ліку ў судах, без спецыяльнага паўнамоцтва.

2. Калі асобе, якая адчувае патрэбу ў апецы ці папячыцельстве, на працягу месяца з дня, калі органу апекі і папячыцельства стала вядома аб неабходнасці ўстанаўлення апекі ці папячыцельства, не прызначаны апякун ці папячыцель, выкананне абавязкаў апекуна ці папячыцеля часова (да прызначэння апекуна ці папячыцеля) ускладаецца на кіраўніка органа апекі і папячыцельства.

Артыкул 35. Распараджэнне маёмасцю падапечнага

1. Даходы падапечнага, у тым ліку належныя яму ад кіравання яго маёмасцю, за выключэннем даходаў, якімі падапечны мае права распараджацца самастойна, расходуюцца апекуном ці папячыцелем выключна ў інтарэсах падапечнага і з папярэдняга дазволу органа апекі і папячыцельства.

Без папярэдняга дазволу органа апекі і папячыцельства апякун ці папячыцель мае права рабіць неабходныя для ўтрымання падапечнага расходы за кошт сум, належных падапечнаму ў якасці яго даходу.

2. Апякун не мае права без папярэдняга дазволу органа апекі і папячыцельства заключаць, а папячыцель – даваць згоду на заключэнне здзелак па адчужэнні, у тым ліку па абмене ці дарэнні маёмасці падапечнага, здачы яго ў арэнду (у наём), бязвыплатнае карыстанне ці ў заклад; здзелак, якія цягнуць за сабой адмову ад прыналежных падапечнаму правоў, падзел яго маёмасці ці выдзел з яго долей, а таксама любых іншых здзелак, якія цягнуць за сабой змяншэнне маёмасці падапечнага.

Парадак кіравання маёмасцю падапечнага вызначаецца заканадаўствам.

3. Апякун, папячыцель, іх сужэнцы і блізкія сваякі не маюць права заключаць здзелкі з падапечным, за выключэннем перадачы маёмасці падапечнаму ў якасці дару ці ў бязвыплатнае карыстанне, а таксама прадстаўляць падапечнага пры заключэнні здзелак ці вядзенні судовых спраў паміж падапечным і сужэнцам апекуна ці папячыцеля і іх блізкімі сваякамі.

Артыкул 36. Давернае кіраванне маёмасцю падапечнага

1. Пры неабходнасці пастаяннага кіравання нерухомай і каштоўнай рухомай маёмасцю падапечнага орган апекі і папячыцельства заключае з даверным кіраўніком, вызначаным гэтым органам, дагавор аб даверным кіраванні такой маёмасцю (глава 52 гэтага Кодэкса). У гэтым выпадку апякун ці папячыцель захоўвае свае паўнамоцтвы ў адносінах да той маёмасці падапечнага, якая не перададзена ў давернае кіраванне.

Пры ажыццяўленні кіраўніком правамоцтваў па кіраванні маёмасцю падапечнага на кіраўніка распаўсюджваецца дзеянне правілаў, прадугледжаных пунктамі 2 і 3 артыкула 35 гэтага Кодэкса.

2. Давернае кіраванне маёмасцю падапечнага спыняецца ў сувязі са спыненнем дагавора давернага кіравання маёмасцю на падставах, прадугледжаных пунктам 1 артыкула 907 гэтага Кодэкса.

Артыкул 37. Патранаж над дзеяздольнымі грамадзянамі

1. Па просьбе дарослага дзеяздольнага грамадзяніна, які з-за стану здароўя не можа самастойна ажыццяўляць і абараняць свае правы і выконваць абавязкі, над ім можа быць устаноўлены патранаж.

Устанаўленне патранажу не цягне за сабой абмежавання правоў грамадзяніна, над якім устаноўлены патранаж.

2. Памочнік (асоба, якая ажыццяўляе патранаж) дарослага дзеяздольнага грамадзяніна можа быць прызначаны органам апекі і папячыцельства толькі са згоды такога грамадзяніна.

3. Распараджэнне маёмасцю, што належыць грамадзяніну, над якім устаноўлены патранаж, ажыццяўляецца памочнікам на падставе дагавора даручэння ці давернага кіравання, заключанага з гэтым грамадзянінам. Заключэнне бытавых і аналагічных ім здзелак, накіраваных на ўтрыманне і задавальненне бытавых патрэбнасцей грамадзяніна, над якім устаноўлены патранаж, ажыццяўляецца яго памочнікам са згоды гэтага грамадзяніна.

4. Патранаж, устаноўлены ў адпаведнасці з пунктам 1 гэтага артыкула, спыняецца па патрабаванні грамадзяніна, над якім устаноўлены патранаж.

Артыкул 38. Прызнанне грамадзяніна адсутным без вестак

Грамадзянін па заяве зацікаўленых асоб можа быць прызнаны судом адсутным без вестак, калі на працягу аднаго года па месцы яго жыхарства няма звестак аб месцы яго знаходжання. Пры немагчымасці выявіць дзень атрымання апошніх звестак аб адсутным пачаткам падліку тэрміну для прызнання адсутнасці без вестак лічыцца першая лічба месяца, які ідзе следам за тым, у якім былі атрыманы апошнія звесткі аб адсутным, а пры немагчымасці выявіць гэты месяц – першае студзеня наступнага года.

Артыкул 39. Наступствы прызнання грамадзяніна адсутным без вестак

1. Маёмасць грамадзяніна, прызнанага адсутным без вестак, пры неабходнасці пастаяннага кіравання ім перадаецца на падставе рашэння суда асобе, якая вызначаецца органам апекі і папячыцельства і дзейнічае на падставе дагавора аб даверным кіраванні, які заключаецца з гэтым органам.

2. Даверны кіраўнік маёмасцю грамадзяніна, прызнанага адсутным без вестак, прымае выкананне яго абавязацельстваў, пагашае за кошт маёмасці адсутнага яго

даўгі, кіруе гэтай маёмасцю ў яго інтарэсах. Па заяве зацікаўленых асоб выдаецца ўтрыманне грамадзянам, якіх адсутны без вестак абавязаны быў утрымліваць.

3. Орган апекі і папячыцельства можа і да сканчэння аднаго года з дня атрымання звестак аб месцы знаходжання адсутнага грамадзяніна прызначыць кіраўніка яго маёмасцю.

4. Наступствы прызнання асобы адсутнай без вестак, не прадугледжаныя гэтым артыкулам, вызначаюцца заканадаўствам.

Артыкул 40. Адмена рашэння аб прызнанні грамадзяніна адсутным без вестак

1. У выпадку яўкі ці выяўлення месца знаходжання грамадзяніна, прызнанага адсутным без вестак, суд адмяняе рашэнне аб прызнанні яго адсутным без вестак. На падставе рашэння суда адмяняецца давернае кіраванне маёмасцю гэтага грамадзяніна.

2. Калі пасля сканчэння трох гадоў з дня прызначэння давернага кіраўніка рашэнне аб прызнанні грамадзяніна адсутным без вестак не было адменена і не было звароту ў суд аб аб’яўленні грамадзяніна памерлым, орган апекі і папячыцельства абавязаны звярнуцца ў суд з заявай аб аб’яўленні грамадзяніна памерлым.

Артыкул 41. Аб’яўленне грамадзяніна памерлым

1. Грамадзянін можа быць аб'яўлены судом памерлым, калі па месцы яго жыхарства няма звестак аб месцы яго знаходжання на працягу трох гадоў, а калі ён прапаў без вестак пры абставінах, якія пагражалі смерцю ці даюць падставу дапускаць яго гібель ад пэўнага няшчаснага выпадку, – на працягу шасці месяцаў.

2. Ваеннаслужачы ці іншы грамадзянін, які прапаў без вестак у сувязі з ваеннымі дзеяннямі, можа быць аб'яўлены судом памерлым не раней чым пасля сканчэння двух гадоў з дня заканчэння ваенных дзеянняў.

3. Днём смерці грамадзяніна, аб'яўленага памерлым, лічыцца дзень уступлення ў законную сілу рашэння суда аб аб’яўленні яго памерлым. У выпадку аб’яўлення памерлым грамадзяніна, які прапаў без вестак пры абставінах, якія пагражалі смерцю ці якія даюць падставу дапускаць яго гібель ад пэўнага няшчаснага выпадку, суд можа прызнаць днём смерці гэтага грамадзяніна дзень яго меркаванай гібелі.

4. Аб’яўленне грамадзяніна памерлым цягне за сабой у дачыненні да правоў і абавязкаў такога грамадзяніна тыя ж наступствы, якія пацягнула б за сабой яго смерць.

Артыкул 42. Наступствы яўкі грамадзяніна, аб'яўленага памерлым

1. У выпадку яўкі ці выяўлення месца знаходжання грамадзяніна, аб'яўленага памерлым, суд адмяняе рашэнне аб аб’яўленні яго памерлым.

2. Незалежна ад часу сваёй яўкі грамадзянін можа запатрабаваць ад любой асобы вяртання захаванай маёмасці, якая з бязвыплатна перайшла да гэтай асобы пасля аб’яўлення грамадзяніна памерлым, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктам 3 артыкула 283 гэтага Кодэкса.

Асобы, да якіх маёмасць грамадзяніна, аб'яўленага памерлым, перайшла па аплатных здзелках, абавязаны вярнуць яму гэту маёмасць, калі даказана, што, набываючы маёмасць, яны ведалі, што грамадзянін, аб'яўлены памерлым, знаходзіцца ў жывых. Пры немагчымасці вяртання такой маёмасці ў натуры кампенсуецца яе кошт. Калі маёмасць грамадзяніна, аб'яўленага памерлым, перайшла да дзяржавы як вымарачная і была рэалізавана ёй з прытрымліваннем

умоў, прадугледжаных гэтым артыкулам, то пасля адмены рашэння аб аб’яўленні грамадзяніна памерлым яму вяртаецца сума, выручаная ад рэалізацыі маёмасці.

Артыкул 43. Рэгістрацыя актаў грамадзянскага стану

1. Рэгістрацыі падлягаюць наступныя акты грамадзянскага стану:

1) нараджэнне;

2) заключэнне шлюбу;

3) устанаўленне мацярынства і (ці) бацькоўства;

4) усынаўленне (удачарэнне);

5) смерць;

6) перамена прозвішча, уласнага імя, імя па бацьку;

7) скасаванне шлюбу ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам аб шлюбе і сям'і.

2. Органы, якія рэгіструюць акты грамадзянскага стану, і парадак рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану вызначаюцца заканадаўствам.

ГЛАВА 4
ЮРЫДЫЧНЫЯ АСОБЫ

§ 1. Асноўныя палажэнні

Артыкул 44. Паняцце юрыдычнай асобы

1. Юрыдычнай асобай прызнаецца арганізацыя, якая мае ва ўласнасці, гаспадарчым распараджэнні ці аператыўным кіраванні адасобленую маёмасць, нясе самастойную адказнасць па сваіх абавязацельствах, можа ад свайго імя набываць і ажыццяўляць маёмасныя і асабістыя немаёмасныя правы, выконваць абавязкі, быць істцом і адказчыкам у судзе, якая прайшла ва ўстаноўленым парадку дзяржаўную рэгістрацыю ў якасці юрыдычнай асобы або прызнаная гэтакай заканадаўчым актам.

2. У сувязі з удзелам у стварэнні маёмасці юрыдычнай асобы яго заснавальнікі (удзельнікі) могуць мець абавязацельныя правы ў адносінах да гэтай юрыдычнай асобы або рэчавыя правы на яе маёмасць.

Да юрыдычных асоб, у адносінах да якіх іх удзельнікі маюць абавязацельныя правы, адносяцца гаспадарчыя суполкі і таварыствы, вытворчыя і спажывецкія кааператывы, сялянскія (фермерскія) гаспадаркі. Удзельнікі такіх юрыдычных асоб могуць мець рэчавыя правы толькі на маёмасць, якую яны перадалі юрыдычным асобам у карыстанне ў якасці ўкладу ў статутны фонд.

Да юрыдычных асоб, на маёмасць якіх іх заснавальнікі маюць права ўласнасці ці іншае рэчавае права, адносяцца ўнітарныя прадпрыемствы, у тым ліку даччыныя, а таксама дзяржаўныя аб'яднанні і ўстановы, якія фінансуюцца ўласнікам.

3. Да юрыдычных асоб, у адносінах да якіх іх заснавальнікі (удзельнікі) не маюць маёмасных правоў, адносяцца грамадскія і рэлігійныя арганізацыі (аб'яднанні), дабрачынныя і іншыя фонды, аб'яднанні юрыдычных асоб і (ці) індывідуальных прадпрымальнікаў (асацыяцыі і саюзы), а таксама іншыя некамерцыйныя арганізацыі, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам, іншымі законамі ці актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У выпадках, прадугледжаных законамі ці актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Рэспубліка Беларусь, адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі могуць мець маёмасныя правы ў адносінах да некамерцыйных арганізацый, у тым ліку не з'яўляючыся іх заснавальнікамі (удзельнікамі).

4. Асаблівасці ўтварэння (стварэння), рэарганізацыі і скасавання (ліквідацыі) дзяржаўных органаў, а таксама дзяржаўных юрыдычных асоб, палажэнні аб якіх устаноўлены актамі заканадаўства, могуць устанаўлівацца іншымі актамі заканадаўства, якія вызначаюць асаблівасці прававога статусу такіх органаў і юрыдычных асоб.

Артыкул 45. Праваздольнасць юрыдычнай асобы

1. Юрыдычная асоба можа мець грамадзянскія правы, якія адпавядаюць мэтам дзейнасці, прадугледжаным у яе ўстаноўчых дакументах, а таксама прадмету дзейнасці, калі ён указаны ва ўстаноўчых дакументах, і несці звязаныя з гэтай дзейнасцю абавязкі. Асобнымі відамі дзейнасці, пералік якіх вызначаецца заканадаўчымі актамі, юрыдычная асоба можа займацца толькі на падставе спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі).

2. Юрыдычная асоба можа быць абмежавана ў правах толькі ў выпадках і парадку, прадугледжаных заканадаўчымі актамі. Рашэнне аб абмежаванні правоў можа быць абскарджана юрыдычнай асобай у суд.

3. Праваздольнасць юрыдычнай асобы ўзнікае ў момант яе стварэння (пункт 2 артыкула 47) і спыняецца ў момант завяршэння яе ліквідацыі (пункт 8 артыкула 59).

Права юрыдычнай асобы ажыццяўляць дзейнасць, на займанне якой неабходна атрыманне спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), узнікае з моманту атрымання такога спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) і спыняецца пры спыненні дзеяння, ануляванні (адкліканні) гэтага спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) у выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

Праваздольнасць дзяржаўнага органа, а таксама дзяржаўнай юрыдычнай асобы, палажэнне аб якой зацверджана актам заканадаўства, узнікае з моманту ўступлення ў сілу акта заканадаўства, які прадугледжвае ўтварэнне (стварэнне) такога органа ці юрыдычнай асобы, калі іншае не прадугледжана гэтым актам, і спыняецца з моманту ўступлення ў сілу акта заканадаўства, які прадугледжвае скасаванне (ліквідацыю) такога органа ці юрыдычнай асобы, калі гэтым актам не прадугледжана іншае.

Дзяржаўныя органы, а таксама дзяржаўныя юрыдычныя асобы, палажэнні аб якіх зацверджаны актамі заканадаўства, падлягаюць уключэнню ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў. Парадак уключэння такіх органаў і юрыдычных асоб у Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў з улікам асаблівасцей іх утварэння (стварэння) вызначае Урад Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 46. Камерцыйныя і некамерцыйныя арганізацыі

1. Юрыдычнымі асобамі могуць быць арганізацыі, якія маюць атрыманне прыбытку ў якасці асноўнай мэты сваёй дзейнасці і (ці) размяркоўваюць атрыманы прыбытак паміж удзельнікамі (камерцыйныя арганізацыі) або не маюць атрыманне прыбытку ў якасці такой мэты і не размяркоўваюць атрыманы прыбытак паміж удзельнікамі (некамерцыйныя арганізацыі).

2. Юрыдычныя асобы, якія з'яўляюцца камерцыйнымі арганізацыямі, могуць ствараца ў форме гаспадарчых суполак і таварыстваў , вытворчых кааператываў, унітарных прадпрыемстваў, сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак і іншых формах, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

3. Юрыдычныя асобы, якія з'яўляюцца некамерцыйнымі арганізацыямі, могуць ствараца ў форме спажывецкіх кааператываў, грамадскіх ці рэлігійных

арганізацый (аб'яднанняў), якія фінансуюцца ўласнікам устаноў, дабрачынных і іншых фондаў, а таксама ў іншых формах, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

Некамерцыйныя арганізацыі могуць ствараццa для дасягнення сацыяльных, прыродаахоўных, дабрачынных, культурных, адукацыйных, навуковых і кіраўніцкіх мэт, аховы здароўя грамадзян, развіцця фізічнай культуры і спорту, задавальнення духоўных і іншых нематэрыяльных патрэбнасцей грамадзян, абароны правоў, законных інтарэсаў грамадзян і юрыдычных асоб, вырашэння спрэчак і канфліктаў, аказання юрыдычнай дапамогі ў адпаведнасці з заканадаўствам, а таксама ў іншых мэтах, накіраваных на дасягненне грамадскіх даброт.

Некамерцыйныя арганізацыі могуць ствараццa для задавальнення матэрыяльных (маёмасных) патрэбнасцей грамадзян або грамадзян і юрыдычных асоб у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

Некамерцыйныя арганізацыі могуць ажыццяўляць прадпрымальніцкую дзейнасць толькі пастолькі, паколькі яна неабходная для іх статутных мэт, дзеля якіх яны створаны, адпавядае гэтым мэтам і адпавядае прадмету дзейнасці некамерцыйных арганізацый, або паколькі яна неабходная для выканання дзяржаўна значных задач, прадугледжаных у іх устаноўчых дакументах, адпавядае гэтым задачам і адпавядае прадмету дзейнасці гэтых арганізацый. Для асобных формаў некамерцыйных арганізацый заканадаўчымі актамі могуць быць устаноўлены патрабаванні, якія прадугледжваюць іх права на займанне прадпрымальніцкай дзейнасцю толькі пры дапамозе стварэння камерцыйных арганізацый і (ці) удзелу ў іх.

4. Дапускаецца стварэнне аб'яднанняў камерцыйных арганізацый і (ці) індывідуальных прадпрымальнікаў, а таксама аб'яднанняў камерцыйных і (ці) некамерцыйных арганізацый у форме асацыяцый і саюзаў, аб'яднанняў камерцыйных, некамерцыйных арганізацый і (ці) індывідуальных прадпрымальнікаў у форме дзяржаўных аб'яднанняў.

У выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, аб'яднанні камерцыйных, некамерцыйных арганізацый і (ці) фізічных асоб могуць ствараццa і ў іншых формах.

Артыкул 47. Дзяржаўная рэгістрацыя юрыдычных асоб

1. Юрыдычная асоба падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі, за выключэннем дзяржаўных органаў, а таксама дзяржаўных юрыдычных асоб, палажэнні аб якіх устаноўлены актамі заканадаўства. Даныя дзяржаўнай рэгістрацыі ўключаюцца ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

Неажыццяўленне або адмова ў якой-небудзь форме на падставах, не прадугледжаных заканадаўчымі актамі, у дзяржаўнай рэгістрацыі юрыдычнай асобы, змяненняў і (ці) дапаўненняў, якія ўносяцца ва ўстаноўчыя дакументы юрыдычных асоб, не дапускаюцца.

Ажыццяўленне, неажыццяўленне рэгіструючым органам дзяржаўнай рэгістрацыі юрыдычнай асобы або адмова ў дзяржаўнай рэгістрацыі юрыдычнай асобы, змяненняў і (ці) дапаўненняў, якія ўносяцца ва ўстаноўчыя дакументы юрыдычных асоб, могуць быць абскарджаны ў судовым парадку.

2. Юрыдычная асоба лічыцца створанай з моманту яе дзяржаўнай рэгістрацыі, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Дзяржаўны орган, а таксама дзяржаўная юрыдычная асоба, палажэнне аб якой зацверджана актам заканадаўства, лічацца ўтворанымі (створанымі) з моманту ўступлення ў сілу акта заканадаўства, які прадугледжвае ўтварэнне (стварэнне) такога органа ці юрыдычнай асобы, калі іншае не прадугледжана гэтым актам.

3. Юрыдычная асоба падлягае перарэгістрацыі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

4. Фізічная ці юрыдычная асоба мае права атрымаць інфармацыю, якая ўтрымліваецца ў Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, у парадку, які вызначаецца заканадаўствам.

Артыкул 47[1]. Статутны фонд камерцыйнай арганізацыі

1. Пры стварэнні камерцыйнай арганізацыі фарміруецца статутны фонд гэтай арганізацыі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам. Камерцыйная арганізацыя самастойна вызначае памер статутнага фонду, за выключэннем камерцыйных арганізацый, для якіх заканадаўствам устанаўліваюцца мінімальныя памеры статутных фондаў.

2. Укладам у статутны фонд камерцыйнай арганізацыі могуць быць рэчы, уключаючы грошы і каштоўныя паперы, іншая маёмасць, у тым ліку маёмасныя правы, або іншыя адчужальныя правы, якія маюць ацэнку іх кошту.

Ацэнка кошту неграшовага ўкладу ў статутны фонд камерцыйнай арганізацыі падлягае экспертызе дакладнасці такой ацэнкі ў выпадках і парадку, прадугледжаных заканадаўствам.

У статутны фонд камерцыйнай арганізацыі не можа быць унесена маёмасць, калі права на адчужэнне гэтай маёмасці абмежавана ўласнікам, заканадаўствам ці дагаворам.

Заканадаўчымі актамі могуць быць устаноўлены і іншыя абмежаванні ў адносінах да маёмасці, якая ўносіцца ў якасці ўкладу ў статутны фонд камерцыйнай арганізацыі.

3. Калі пасля заканчэння другога і кожнага наступнага фінансавага года кошт чыстых актываў камерцыйнай арганізацыі акажацца меншым за статутны фонд, такая арганізацыя абавязана ва ўстаноўленым парадку зменшыць свой статутны фонд да памеру, які не перавышае кошту яе чыстых актываў. У выпадку змяншэння кошту чыстых актываў камерцыйнай арганізацыі, для якой заканадаўствам устаноўлены мінімальны памер статутнага фонду, па выніках другога і кожнага наступнага фінансавага года ніжэй за мінімальны памер статутнага фонду такая арганізацыя падлягае ліквідацыі ва ўстаноўленым парадку.

Артыкул 48. Устаноўчыя дакументы юрыдычнай асобы

1. Юрыдычная асоба дзейнічае на падставе статута ці ўстаноўчага дагавора. Устаноўчы дагавор юрыдычнай асобы заключаецца, а статут зацвярджаецца ўласнікам маёмасці (заснавальнікамі, удзельнікамі). Гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі можа ўстанаўлівацца іншы парадак зацвярджэння статутаў юрыдычных асоб. Актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь можа быць прадугледжана зацвярджэнне палажэнняў, на падставе якіх дзейнічаюць адпаведныя юрыдычныя асобы.

2. У статуце, устаноўчым дагаворы юрыдычнай асобы павінны вызначацца найменне юрыдычнай асобы, месца яе знаходжання, мэты дзейнасці, парадак кіравання дзейнасцю юрыдычнай асобы, а таксама ўтрымлівацца іншыя звесткі, прадугледжаныя гэтым Кодэксам і заканадаўствам аб юрыдычных асобах адпаведнага віду.

Ва ўстаноўчым дагаворы заснавальнікі (удзельнікі) абавязваюцца стварыць юрыдычную асобу, вызначаюць парадак сумеснай дзейнасці па яе стварэнні, умовы перадачы ёй сваёй маёмасці і ўдзелу ў яе дзейнасці. Акрамя звестак, указаных у частцы першай гэтага пункта, ва ўстаноўчым дагаворы павінны вызначацца таксама ўмовы і парадак размеркавання паміж удзельнікамі прыбытку і страт, выхаду ўдзельнікаў з яе складу і іншыя звесткі, прадугледжаныя заканадаўствам аб юрыдычных асобах адпаведнага віду. Па згодзе заснавальнікаў (удзельнікаў) ва ўстаноўчы дагавор могуць быць уключаны і іншыя ўмовы.

Ва ўстаноўчых дакументах некамерцыйных арганізацый, а таксама ў прадугледжаных заканадаўчымі актамі выпадках ва ўстаноўчых дакументах камерцыйных арганізацый павінен быць вызначаны прадмет дзейнасці юрыдычнай асобы. Устаноўчымі дакументамі камерцыйных арганізацый можа быць прадугледжаны прадмет іх дзейнасці і ў выпадках, калі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі гэта не з'яўляецца абавязковым.

3. Змяненні ўстаноўчых дакументаў набываюць сілу для трэціх асоб з моманту іх дзяржаўнай рэгістрацыі, а ў выпадках, устаноўленых заканадаўчымі актамі, – з моманту паведамлення органу, які ажыццяўляе дзяржаўную рэгістрацыю, аб такіх змяненнях. Аднак юрыдычныя асобы і іх заснавальнікі (удзельнікі) не маюць права спасылацца на адсутнасць рэгістрацыі такіх змяненняў у адносінах з трэцімі асобамі, якія дзейнічалі з улікам гэтых змяненняў.

Змяненні ўстаноўчых дакументаў рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадскіх аб'яднанняў набываюць сілу для трэціх асоб з моманту ўступлення ў сілу прававых актаў, якія зацвярджаюць такія змяненні.

Артыкул 49. Органы юрыдычнай асобы

1. Юрыдычная асоба набывае грамадзянскія правы і прымае на сябе грамадзянскія абавязкі праз свае органы, якія дзейнічаюць у адпаведнасці з заканадаўствам і ўстаноўчымі дакументамі. Парадак прызначэння ці выбрання органаў юрыдычнай асобы вызначаецца заканадаўчымі актамі і ўстаноўчымі дакументамі.

2. У прадугледжаных заканадаўчымі актамі выпадках юрыдычная асоба можа набываць грамадзянскія правы і прымаць на сябе грамадзянскія абавязкі праз уласніка маёмасці (заснавальнікаў, удзельнікаў).

3. Асоба, якая паводле акта заканадаўства ці ўстаноўчых дакументаў юрыдычнай асобы выступае ад яго імя, павінна дзейнічаць у інтарэсах юрыдычнай асобы, якую яна прадстаўляе, добрасумленна і разумна. Яна абавязана па патрабаванні ўласніка маёмасці (заснавальнікаў, удзельнікаў) юрыдычнай асобы, паколькі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі ці дагаворам, кампенсаваць страты, прычыненыя ёй юрыдычнай асобе.

Артыкул 50. Найменне і месца знаходжання юрыдычнай асобы

1. Юрыдычная асоба мае сваё найменне, якое ўтрымлівае ўказанне на яго арганізацыйна-прававую форму. Найменні некамерцыйных арганізацый і ў прадугледжаных заканадаўчымі актамі выпадках найменні камерцыйных арганізацый павінны ўтрымліваць указанне на характар дзейнасці юрыдычнай асобы.

Уключэнне ў найменне юрыдычнай асобы ўказанняў на афіцыйную поўную ці скарочаную назву Рэспублікі Беларусь, слоў «нацыянальны» і «беларускі», уключэнне такой назвы або элементаў дзяржаўнай сімволікі ў рэквізіты дакументаў

ці рэкламныя матэрыялы юрыдычнай асобы дапускаюцца ў парадку, які вызначае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

2. Месца знаходжання юрыдычнай асобы вызначаецца месцам знаходжання яго пастаянна дзейнага выканаўчага органа (адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, населены пункт, а таксама дом, кватэра ці іншае памяшканне, калі яны маюцца), а ў выпадку адсутнасці пастаянна дзеючага выканаўчага органа – іншага органа ці асобы, якая мае права дзейнічаць ад імя юрыдычнай асобы без даверанасці.

3. Найменне і месца знаходжання юрыдычнай асобы ўказваюцца ў яе ўстаноўчых дакументах.

У выпадку змянення месца знаходжання юрыдычнай асобы такая юрыдычная асоба ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі, абавязана накіраваць у рэгіструючы орган адпаведнае паведамленне, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

4. Выключаны.

Артыкул 51. Прадстаўніцтвы і філіялы

1. Прадстаўніцтвам з'яўляецца адасобленае падраздзяленне юрыдычнай асобы, размешчанае па-за месцам яе знаходжання, якое ажыццяўляе абарону і прадстаўніцтва інтарэсаў юрыдычнай асобы, здзяйсняе ад яе імя здзелкі і іншыя юрыдычныя дзеянні.

2. Філіялам з'яўляецца адасобленае падраздзяленне юрыдычнай асобы, якое размешчана па-за месцам яе знаходжання і ажыццяўляе ўсе ці частку яе функцый, у тым ліку функцыі прадстаўніцтва.

3. Прадстаўніцтвы і філіялы не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі. Яны надзяляюцца маёмасцю юрыдычнай асобай, якая стварыла іх, і дзейнічаюць на падставе зацверджаных ёй палажэнняў.

Маёмасць прадстаўніцтва і філіяла юрыдычнай асобы ўлічваецца асобна на балансе юрыдычнай асобы, якая стварыла іх, (асобна ў кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання).

Кіраўнікі прадстаўніцтваў і філіялаў прызначаюцца юрыдычнай асобай і дзейнічаюць на падставе яе даверанасці.

Прадстаўніцтвы і філіялы павінны быць указаны ў статуце юрыдычнай асобы, якая стварыла іх.

4. Прававое становішча прадстаўніцтваў і філіялаў банкаў і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый, арганізацыйных структур грамадскіх арганізацый (аб'яднанняў) і рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадскіх аб'яднанняў вызначаецца з улікам асаблівасцей, устаноўленых заканадаўствам.

Артыкул 51[1]. Прадстаўніцтва замежнай арганізацыі

1. Прадстаўніцтвам замежнай арганізацыі з'яўляецца яе адасобленае падраздзяленне, размешчанае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, якое ажыццяўляе абарону і прадстаўніцтва інтарэсаў замежнай арганізацыі і іншыя функцыі, якія не супярэчаць заканадаўству.

Не дапускаецца стварэнне прадстаўніцтваў замежных арганізацый, дзейнасць якіх накіравана на звяржэнне або гвалтоўнае змяненне канстытуцыйнага ладу, парушэнне цэласнасці і бяспекі дзяржавы, прапаганду вайны, насілля, распальванне нацыянальнай, рэлігійнай і расавай варожасці, а таксама дзейнасць якіх можа прычыніць урон правам і законным інтарэсам грамадзян.

2. Прадстаўніцтва замежнай арганізацыі лічыцца створаным на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з моманту атрымання дазволу на яго адкрыццё ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

Заканадаўствам могуць устанаўлівацца абмежаванні на прадпрымальніцкую і іншую дзейнасць прадстаўніцтваў замежных арганізацый.

3. Прадстаўніцтва замежнай арганізацыі мае найменне, якое ўтрымлівае ўказанне на замежную арганізацыю, якая стварыла яго.

Артыкул 52. Адказнасць юрыдычнай асобы

1. Юрыдычныя асобы, акрамя ўстаноў, якія фінансуюцца ўласнікам, адказваюць па сваіх абавязацельствах усёй сваёй маёмасцю.

2. Казённае прадпрыемства і ўстанова, якая фінансуецца ўласнікам, адказваюць па сваіх абавязацельствах у парадку і на ўмовах, прадугледжаных пунктам 8 артыкула 113, артыкуламі 115 і 120 гэтага Кодэкса.

3. Заснавальнік (удзельнік) юрыдычнай асобы ці ўласнік яе маёмасці не адказваюць па абавязацельствах юрыдычнай асобы, а юрыдычная асоба не адказвае па абавязацельствах заснавальніка (удзельніка) ці ўласніка, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі або ўстаноўчымі дакументамі юрыдычнай асобы.

Уласнік маёмасці юрыдычнай асобы, прызнанай эканамічна неплацежаздольнай (банкрутам), яе заснавальнікі (удзельнікі) ці іншыя асобы, у тым ліку кіраўнік юрыдычнай асобы, які мае права даваць абавязковыя для гэтай юрыдычнай асобы ўказанні або магчымасць іншым чынам вызначаць яе дзеянні, нясуць субсідыярную адказнасць пры недастатковасці маёмасці юрыдычнай асобы толькі ў выпадку, калі эканамічная неплацежаздольнасць (банкруцтва) юрыдычнай асобы была выклікана вінаватымі (наўмыснымі) дзеяннямі такіх асоб, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

Артыкул 53. Рэарганізацыя юрыдычнай асобы

1. Рэарганізацыя юрыдычнай асобы (зліццё, далучэнне, раздзяленне, вылучэнне, пераўтварэнне) можа быць ажыццёўлена паводле рашэння ўласніка яе маёмасці (заснавальнікаў, удзельнікаў) або органа юрыдычнай асобы, упаўнаважанага на тое ўстаноўчымі дакументамі, а ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, – паводле рашэння ўпаўнаважаных дзяржаўных органаў, у тым ліку суда.

2. Калі ўласнік маёмасці (заснавальнікі, удзельнікі) юрыдычнай асобы, упаўнаважаны імі орган юрыдычнай асобы ці орган юрыдычнай асобы, упаўнаважаны на рэарганізацыю яе ўстаноўчымі дакументамі, не ажыццявяць рэарганізацыю юрыдычнай асобы ў тэрмін, вызначаны ў рашэнні ўпаўнаважанага дзяржаўнага органа, суд па іску ўказанага дзяржаўнага органа прызначае знешняга кіраўніка юрыдычнай асобай і даручае яму ажыццявіць рэарганізацыю гэтай юрыдычнай асобы. З моманту прызначэння знешняга кіраўніка да яго пераходзяць паўнамоцтвы па кіраванні справамі юрыдычнай асобы. Знешні кіраўнік выступае ад імя юрыдычнай асобы ў судзе, складае раздзяляльны баланс ці перадатачны акт і перадае іх на разгляд суда разам з устаноўчымі дакументамі юрыдычных асоб, якія ўзнікаюць у выніку рэарганізацыі. Зацвярджэнне судом указаных дакументаў з'яўляецца падставай для дзяржаўнай рэгістрацыі юрыдычных асоб, якія нанава ўзнікаюць.

3. У выпадках, устаноўленых заканадаўчымі актамі, рэарганізацыя юрыдычных асоб можа быць ажыццёўлена толькі са згоды ўпаўнаважаных дзяржаўных органаў.

4. Юрыдычная асоба лічыцца рэарганізаванай, за выключэннем выпадкаў рэарганізацыі ў форме далучэння, з моманту дзяржаўнай рэгістрацыі нанава ўзнікшых юрыдычных асоб.

Пры рэарганізацыі юрыдычнай асобы ў форме далучэння да яе іншай юрыдычнай асобы першая з іх лічыцца рэарганізаванай з моманту ўнясення ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў запісу аб спыненні дзейнасці далучанай юрыдычнай асобы.

5. Заканадаўчымі актамі могуць устанаўлівацца асаблівасці рэарганізацыі юрыдычных асоб у пэўных сферах дзейнасці.

Артыкул 54. Праваперaемства пры рэарганізацыі юрыдычных асоб

1. Пры зліцці юрыдычных асоб правы і абавязкі кожнай з іх пераходзяць да нанава ўзнікшай юрыдычнай асобы ў адпаведнасці з перадатачным актам.

2. Пры далучэнні юрыдычнай асобы да іншай юрыдычнай асобы да апошняй пераходзяць правы і абавязкі далучанай юрыдычнай асобы ў адпаведнасці з перадатачным актам.

3. Пры раздзяленні юрыдычнай асобы яе правы і абавязкі пераходзяць да нанава ўзнікшых юрыдычных асоб у адпаведнасці з раздзяляльным балансам.

4. Пры вылучэнні са складу юрыдычнай асобы адной ці некалькіх юрыдычных асоб да кожнай з іх у адпаведнасці з раздзяляльным балансам пераходзяць правы і абавязкі рэарганізаванай юрыдычнай асобы.

5. Пры пераўтварэнні юрыдычнай асобы аднаго віду ў юрыдычную асобу іншага віду (змяненне арганізацыйна-прававой формы) да нанава ўзнікшай юрыдычнай асобы пераходзяць правы і абавязкі рэарганізаванай юрыдычнай асобы ў адпаведнасці з перадатачным актам, за выключэннем правоў і абавязкаў, якія не могуць належаць узнікшай юрыдычнай асобе.

Артыкул 55. Перадатачны акт і раздзяляльны баланс

1. Перадатачны акт і раздзяляльны баланс павінен утрымліваць палажэнні аб праваперaемстве па ўсіх абавязацельствах рэарганізаванай юрыдычнай асобы ў адносінах да ўсіх яе крэдытораў і даўжнікоў, уключаючы і абавязацельствы, якія аспрэчваюцца бакамі.

2. Перадатачны акт і раздзяляльны баланс зацвярджаюцца ўласнікам маёмасці (заснавальнікамі, удзельнікамі) юрыдычнай асобы ці органам, які прыняў рашэнне аб рэарганізацыі юрыдычнай асобы, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 56. Гарантыі правоў крэдытораў юрыдычнай асобы пры яе рэарганізацыі

1. Юрыдычная асоба, якая рэарганізуецца, ці орган, які прыняў рашэнне аб рэарганізацыі юрыдычнай асобы, абавязаны пісьмова паведаміць аб гэтым крэдыторам юрыдычнай асобы, якая рэарганізуецца.

2. Крэдытор юрыдычнай асобы, якая рэарганізуецца, мае права запатрабаваць спынення ці датэрміновага выканання абавязацельства, даўжніком па якім з'яўляецца гэта юрыдычная асоба, і пакрыцця страт.

3. Калі раздзяляльны баланс не дае магчымасці вызначыць праваперaемніка рэарганізаванай юрыдычнай асобы, нанава ўзніклыя юрыдычныя асобы нясуць

салідарную адказнасць па абавязацельствах рэарганізаванай юрыдычнай асобы перад яго крэдыторамі.

Артыкул 57. Ліквідацыя юрыдычнай асобы

1. Ліквідацыя юрыдычнай асобы цягне за сабой спыненне яе дзейнасці без пераходу правоў і абавязкаў у парадку праваперaемства да іншых асоб, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі.

2. Юрыдычная асоба можа быць ліквідавана паводле рашэння:

1) уласніка маёмасці (заснавальнікаў, удзельнікаў) або органа юрыдычнай асобы, упаўнаважанай на тое ўстаноўчымі дакументамі, у тым ліку ў сувязі са сканчэннем тэрміну, на які створана гэта юрыдычная асоба, дасягненнем мэты, дзеля якой яна створана, парушэннем камерцыйнай арганізацыяй парадку фарміравання статутнага фонду, устаноўленага заканадаўствам, прызнаннем судом дзяржаўнай рэгістрацыі юрыдычнай асобы несапраўднай;

2) суда ў выпадку:

непрыняцця рашэння аб ліквідацыі ў адпаведнасці з падпунктам 1 гэтага пункта ў сувязі са сканчэннем тэрміну, на які створана гэта юрыдычная асоба, дасягненнем мэты, дзеля якой яна створана, парушэннем камерцыйнай арганізацыяй парадку фарміравання статутнага фонду, устаноўленага заканадаўствам, прызнаннем судом дзяржаўнай рэгістрацыі юрыдычнай асобы несапраўднай;

ажыццяўлення дзейнасці без спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), або забароненай заканадаўчымі актамі, або з іншымі неаднаразовымі ці грубымі парушэннямі заканадаўчых актаў;

эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтва) юрыдычнай асобы;

змяншэння кошту чыстых актываў камерцыйных арганізацый, для якіх заканадаўствам устаноўлены мінімальныя памеры статутных фондаў, па выніках другога і кожнага наступнага фінансавага года ніжэй за мінімальны памер статутнага фонду, вызначанага заканадаўствам;

парушэння ўстаноўленых заканадаўствам парадку і тэрмінаў ліквідацыі;

у іншых выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

Пры выяўленні падстаў для ліквідацыі юрыдычнай асобы, прадугледжаных абзацамі другім, трэцім, пятым і шостым часткі першай гэтага падпункта, упаўнаважаныя дзяржаўныя органы ў межах сваёй кампетэнцыі звяртаюцца ў суд з іскам аб ліквідацыі такой юрыдычнай асобы, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

Пры выяўленні падставы для ліквідацыі юрыдычнай асобы, прадугледжанай абзацам шостым часткі першай гэтага падпункта, крэдыторы юрыдычнай асобы, якая ліквідуецца, маюць права звярнуцца ў суд з іскам аб ліквідацыі такой юрыдычнай асобы;

3) іншых органаў у выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

3. Рашэннем суда аб ліквідацыі юрыдычнай асобы на ўласніка яе маёмасці (заснавальнікаў, удзельнікаў) або орган, упаўнаважаны на ліквідацыю юрыдычнай асобы яе ўстаноўчымі дакументамі, могуць быць ускладзены абавязкі па ажыццяўленні ліквідацыі юрыдычнай асобы.

4. Юрыдычная асоба, якая з'яўляецца камерцыйнай арганізацыяй або дзейнічае ў форме спажывецкага кааператыва, дабрачыннага ці іншага фонду, ліквідуецца ў

адпаведнасці з артыкулам 61 гэтага Кодэкса ў выніку прызнання яе эканамічна неплацежаздольнай (банкрутам).

Калі кошт маёмасці такой юрыдычнай асобы недастатковы для задавальнення патрабаванняў крэдытораў, яна можа быць ліквідавана толькі ў парадку, устаноўленым артыкулам 61 гэтага Кодэкса.

Палажэнні аб ліквідацыі юрыдычных асоб у выніку эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтва) не распаўсюджваюцца на казённыя прадпрыемствы.

5. У выпадках, устаноўленых заканадаўствам, ліквідацыя юрыдычных асоб можа быць ажыццёўлена толькі са згоды ўпаўнаважаных дзяржаўных органаў.

6. Заканадаўчымі актамі могуць устанаўлівацца асаблівасці ліквідацыі юрыдычных асоб у пэўных сферах дзейнасці.

Артыкул 58. Абавязкі асобы, якая прыняла рашэнне аб ліквідацыі юрыдычнай асобы

1. Уласнік маёмасці (заснавальнікі, удзельнікі) або орган юрыдычнай асобы, упаўнаважаны ўстаноўчымі дакументамі, якія прынялі рашэнне аб ліквідацыі юрыдычнай асобы, прызначаюць ліквідацыйную камісію (ліквідатара), размяркоўваюць абавязкі паміж старшынёй і членамі ліквідацыйнай камісіі (у выпадку прызначэння ліквідацыйнай камісіі), устанаўліваюць парадак і тэрміны ліквідацыі, калі іншае не ўстаноўлена актамі заканадаўства. Заканадаўчымі актамі могуць устанаўлівацца максімальныя (гранічныя) тэрміны ліквідацыі юрыдычнай асобы.

2. Пры наяўнасці ў юрыдычнай асобы, якая ліквідуецца, запазычанасці перад крэдыторамі старшынёй ліквідацыйнай камісіі (ліквідатарам) прызначаецца асоба, якая адпавядае ўстаноўленым заканадаўствам патрабаванням і не з'яўляецца ўласнікам маёмасці (заснавальнікам, удзельнікам), кіраўніком гэтай юрыдычнай асобы.

3. З дня прызначэння ліквідацыйнай камісіі (ліквідатара) да яе пераходзяць паўнамоцтвы па кіраванні справамі юрыдычнай асобы. Ліквідацыйная камісія (ліквідатар) ад імя юрыдычнай асобы, якая ліквідуецца, выступае ў судзе.

Артыкул 59. Парадак ліквідацыі юрыдычнай асобы

1. Старшыня ліквідацыйнай камісіі (ліквідатар) на працягу дзесяці рабочых дзён пасля даты прыняцця рашэння аб ліквідацыі юрыдычнай асобы абавязаны паведаміць у пісьмовай форме аб гэтым рэгіструючаму органу для ўключэння ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў звестак аб тым, што юрыдычная асоба знаходзіцца ў працэсе ліквідацыі.

У выпадках і парадку, устаноўленых заканадаўствам, звесткі аб тым, што юрыдычная асоба знаходзіцца ў працэсе ліквідацыі, аб парадку і тэрміне заявы патрабаванняў яе крэдыторамі размяшчаюцца ў глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт з наступным апублікаваннем у друкаваных сродках масавай інфармацыі. Пры гэтым тэрмін для заявы патрабаванняў крэдыторамі юрыдычнай асобы, якая ліквідуецца, не можа быць меншым за два месяцы з даты размяшчэння звестак аб тым, што юрыдычная асоба знаходзіцца ў працэсе ліквідацыі, у глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт, калі іншы момант пачатку цячэння ўказанага тэрміну не ўстаноўлены заканадаўчымі актамі.

Ліквідацыйная камісія (ліквідатар) прымае ўсе магчымыя меры да выяўлення крэдыторaў і атрымання дэбіторскай запазычанасці, а таксама пісьмова паведамляе крэдыторам аб ліквідацыі юрыдычнай асобы.

Ліквідацыйная камісія (ліквідатар) устанаўлівае памер патрабаванняў крэдыторaў першай і другой чаргі, устаноўленых артыкулам 60 гэтага Кодэкса, на падставе даных бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці юрыдычнай асобы, якая ліквідуецца, а таксама іншых дакументаў, якія пацвярджаюць наяўнасць запазычанасці перад указанымі крэдыторамі.

Ажыццяўленне аперацый па рахунках юрыдычнай асобы, заключэнне ёю здзелак, не звязаных з ліквідацыяй, забараняюцца.

2. Пасля заканчэння тэрміну для прад'яўлення патрабаванняў крэдыторамі ліквідацыйная камісія (ліквідатар) складае прамежкавы ліквідацыйны баланс, які ўтрымлівае звесткі аб складзе маёмасці юрыдычнай асобы, якая ліквідуецца, пераліку прад'яўленых крэдыторамі патрабаванняў, а таксама аб выніках іх разгляду.

Прамежкавы ліквідацыйны баланс зацвярджаецца ўласнікам маёмасці (заснавальнікамі, удзельнікамі) юрыдычнай асобы ці органам, які прыняў рашэнне аб ліквідацыі юрыдычнай асобы, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

3. Калі грашовыя сродкі, што маюцца ў юрыдычнай асобы (акрамя ўстаноў), якая ліквідуецца, недастатковыя для задавальнення патрабаванняў крэдыторaў, ліквідацыйная камісія (ліквідатар) прадае маёмасць юрыдычнай асобы з публічных таргоў у парадку, устаноўленым актамі заканадаўства.

4. Ліквідацыйная камісія (ліквідатар) выплачвае грашовыя сумы крэдыторам юрыдычнай асобы, якая ліквідуецца, у парадку чарговасці, устаноўленай артыкулам 60 гэтага Кодэкса, у адпаведнасці з прамежкавым ліквідацыйным балансам пачынаючы з дня яго зацвярджэння, за выключэннем крэдыторaў чацвёртай чаргі, выплаты якім праводзяцца пасля сканчэння месяца з дня зацвярджэння прамежкавага ліквідацыйнага балансу.

5. Пасля завяршэння разлікаў з крэдыторамі ліквідацыйная камісія (ліквідатар) складае ліквідацыйны баланс, які зацвярджаецца ўласнікам маёмасці (заснавальнікамі, удзельнікамі) юрыдычнай асобы ці органам, які прыняў рашэнне аб ліквідацыі юрыдычнай асобы, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

6. Пры недастатковасці ў казённага прадпрыемства, якое ліквідуецца, маёмасці, а ў установы, якая ліквідуецца, – грашовых сродкаў для задавальнення патрабаванняў крэдыторaў апошнія маюць права звярнуцца ў суд з іскам аб задавальненні астатняй часткі патрабаванняў за кошт уласніка маёмасці гэтага прадпрыемства ці ўстановы.

7. Маёмасць юрыдычнай асобы, якая засталася пасля задавальнення патрабаванняў крэдыторaў, перадаецца ўласніку яе маёмасці (заснавальнікам, удзельнікам), які мае (якія маюць) рэчавыя правы на гэту маёмасць ці абавязацельныя правы ў адносінах да гэтай юрыдычнай асобы, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі ці ўстаноўчымі дакументамі юрыдычнай асобы.

8. Ліквідацыя юрыдычнай асобы лічыцца завершанай, а юрыдычная асоба – ліквідаванай з даты прыняцця рэгіструючым органам рашэння аб унясенні запісу ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў аб выключэнні юрыдычнай асобы з гэтага рэгістра.

Артыкул 60. Задавальненне патрабаванняў крэдыторaў

1. Пры ліквідацыі юрыдычнай асобы патрабаванні яе крэдыторaў задавальняюцца ў наступнай чарговасці:

1) у першую чаргу шляхам капіталізацыі адпаведных пачасовых выплат задавальняюцца патрабаванні грамадзян, перад якімі юрыдычная асоба, якая ліквідуецца, нясе адказнасць за прычыненне шкоды жыццю ці здароўю;

2) у другую чаргу праводзяцца разлікі для выплаты выхадных дапамог, узнагарод паводле аўтарскіх дагавораў, аплаты працы асоб, якія працуюць паводле працоўных і (ці) грамадзянска-прававых дагавораў;

3) у трэцюю чаргу пагашаецца запазычанасць па выплатах у бюджэт і дзяржаўныя пазабюджэтныя фонды, а таксама задавальняюцца патрабаванні крэдыторaў па абавязацельствах, забяспечаных закладам маёмасці юрыдычнай асобы, якая ліквідуецца, за кошт і ў межах сродкаў, атрыманых ад рэалізацыі закладзенай маёмасці;

4) у чацвёртую чаргу праводзяцца разлікі з іншымі крэдыторамі юрыдычнай асобы, якая ліквідуецца.

Чарговасць задавальнення патрабаванняў крэдыторaў пры ліквідацыі банкаў, нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый і страхавых арганізацый вызначаецца з улікам асаблівасцей, прадугледжаных заканадаўствам.

Задавальненне патрабаванняў крэдыторaў пры ліквідацыі юрыдычнай асобы ў выніку эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтва) праводзіцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве).

2. Патрабаванні кожнай наступнай чаргі задавальняюцца пасля поўнага задавальнення патрабаванняў папярэдняй чаргі.

3. Пры недастатковасці маёмасці юрыдычнай асобы, якая ліквідуецца, гэта маёмасць размяркоўваецца паміж крэдыторамі адпаведнай чаргі прапарцыянальна сумам патрабаванняў, якія падлягаюць задавальненню, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

4. У выпадку адмовы ліквідацыйнай камісіі (ліквідатара) у задавальненні патрабаванняў крэдытора або ўхілення ад іх разгляду крэдытор мае права да зацвярджэння ліквідацыйнага балансу юрыдычнай асобы звярнуцца ў суд з іскам да юрыдычнай асобы, якая ліквідуецца. Паводле рашэння суда патрабаванні крэдытора могуць быць задаволены за кошт астатняй маёмасці ліквідаванай юрыдычнай асобы.

5. Патрабаванні крэдытора, заяўленыя пасля сканчэння тэрміну, устаноўленага ліквідацыйнай камісіяй (ліквідатарам) для іх прад'яўлення, задавальняюцца з маёмасці даўжніка, якая засталася пасля задавальнення патрабаванняў крэдыторaў, заяўленых у тэрмін.

6. Патрабаванні крэдыторaў, не задаволеныя з-за недастатковасці маёмасці юрыдычнай асобы, якая ліквідуецца, лічацца пагашанымі, за выключэннем выпадку, прадугледжанага артыкулам 62 гэтага Кодэкса. Пагашанымі лічацца таксама патрабаванні крэдыторaў, не прызнаныя ліквідацыйнай камісіяй (ліквідатарам), калі крэдытор не звяртаўся з іскам у суд, а таксама патрабаванні, у задавальненні якіх рашэннем суда крэдытору адмоўлена.

Артыкул 61. Эканамічная неплацежаздольнасць (банкруцтва) юрыдычнай асобы

1. Юрыдычная асоба, якая з'яўляецца камерцыйнай арганізацыяй, за выключэннем казённага прадпрыемства, а таксама юрыдычная асоба, якая дзейнічае ў форме спажывецкага кааператыва або дабрачыннага ці іншага фонду, у судовым парадку можа быць прызнана эканамічна неплацежаздольнай (банкрутам), калі яна не ў стане забяспечыць патрабаванні крэдыторaў.

Прызнанне юрыдычнай асобы эканамічна неплацежаздольнай (банкрутам) цягне за сабой яе санацыю, а пры немагчымасці ці адсутнасці падстаў працягвання дзейнасці – ліквідацыю.

2. Падставы прызнання судом юрыдычнай асобы эканамічна неплацежаздольнай (банкрутам), парадак яе санацыі ці ліквідацыі ўстанаўліваюцца заканадаўствам аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве).

Артыкул 62. Накіраванне спагнання на маёмасць, якая належала юрыдычнай асобе, пасля ліквідацыі гэтай асобы

У выпадку, калі пасля ліквідацыі юрыдычнай асобы будзе даказана, што яна ў мэтах адхілення адказнасці перад сваімі крэдыторамі перадала іншай асобе ці іншым чынам наўмысна ўтаіла хаця б частку сваёй маёмасці, крэдыторы, якія не атрымалі поўнага задавальнення сваіх патрабаванняў у рамках ліквідацыйнай вытворчасці, маюць права звярнуць спагнанне на гэту маёмасць у непагашанай частцы доўгу. Пры гэтым адпаведна прымяняюцца правілы артыкула 284 гэтага Кодэкса. Асоба, якой была перададзена маёмасць, лічыцца нядобрасумленнай, калі яна ведала ці павінна была ведаць аб намеры юрыдычнай асобы ўтаіць гэту маёмасць ад крэдытораў.

§ 2. Гаспадарчыя суполкі і таварыствы

1. Агульныя палажэнні

Артыкул 63. Асноўныя палажэнні аб гаспадарчых суполках і таварыствах

1. Гаспадарчымі суполкамі і таварыствамі прызнаюцца камерцыйныя арганізацыі з падзеленым на долі (акцыі) заснавальнікаў (удзельнікаў) статутным фондам. Маёмасць, створаная за кошт укладаў заснавальнікаў (удзельнікаў), а таксама выробленая і набытая гаспадарчым таварыствам ці суполкай у працэсе яго (яе) дзейнасці, належыць яму (ёй) на праве ўласнасці.

Гаспадарчае таварыства можа быць заснавана адной асобай ці можа складацца з аднаго ўдзельніка. Асаблівасці прававога становішча, стварэння, дзейнасці, рэарганізацыі і ліквідацыі гаспадарчага таварыства, якое складаецца з аднаго ўдзельніка, вызначаюцца заканадаўствам аб гаспадарчых таварыствах.

2. Гаспадарчыя суполкі могуць ствараццa ў форме поўнай суполкі і камандытнай суполкі.

3. Гаспадарчыя таварыствы могуць ствараццa ў форме акцыянернага таварыства, таварыства з абмежаванай адказнасцю ці таварыства з дадатковай адказнасцю.

4. Удзельнікамі поўных суполак і поўнымі супольнікамі ў камандытных суполках могуць быць індывідуальныя прадпрымальнікі і (ці) камерцыйныя арганізацыі.

Удзельнікамі гаспадарчых таварыстваў і ўкладчыкамі ў камандытных суполках могуць быць грамадзяне і (ці) юрыдычныя асобы.

Дзяржаўныя органы і органы мясцовага кіравання і самакіравання не маюць права выступаць удзельнікамі гаспадарчых таварыстваў і ўкладчыкамі ў камандытных суполках, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

Унітарныя прадпрыемствы, дзяржаўныя аб'яднанні, а таксама ўстановы, якія фінансуюцца ўласнікамі, могуць быць удзельнікамі гаспадарчых таварыстваў і ўкладчыкамі ў камандытных суполках з дазволу ўласніка (упаўнаважанага ўласнікам органа), калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

Законам можа быць забаронены ці абмежаваны ўдзел асобных катэгорый грамадзян у гаспадарчых суполках і таварыствах.

5. Гаспадарчыя суполкі і таварыствы могуць быць заснавальнікамі (удзельнікамі) іншых гаспадарчых суполак і таварыстваў , за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства.

6. Ацэнка кошту неграшовага ўкладу ўдзельніка гаспадарчай таварыства праводзіцца па пагадненні паміж заснавальнікамі (удзельнікамі) таварыства і ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, падлягае экспертызе дакладнасці такой ацэнкі.

7. Выключаны.

Артыкул 64. Правы і абавязкі ўдзельнікаў гаспадарчай суполкі ці таварыства

1. Удзельнікі гаспадарчага гаспадарчай суполкі ці таварыства маюць права:

1) удзельнічаць у кіраванні справамі суполкі ці таварыства, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктам 2 артыкула 83 гэтага Кодэкса і заканадаўчымі актамі;

2) атрымліваць інфармацыю аб дзейнасці суполкі ці таварыства і знаёміцца з яго (яе) дакументацыяй у аб'ёме і парадку, устаноўленых устаноўчымі дакументамі;

3) прымаць удзел у размеркаванні прыбытку;

4) атрымліваць у выпадку ліквідацыі суполкі ці таварыства частку маёмасці, якая засталася пасля разлікаў з крэдыторамі, ці яе кошт.

Удзельнікі гаспадарчай суполкі ці таварыства могуць мець і іншыя правы, прадугледжаныя заканадаўствам аб гаспадарчых суполках і таварыствах, устаноўчымі дакументамі суполкі ці таварыства .

2. У выпадку выхаду і выключэння ўдзельніка гаспадарчай суполкі ці таварыства са складу ўдзельнікаў, акрамя ўдзельніка акцыянернага таварыства, яму выплачваецца кошт часткі чыстых актываў гаспадарчага таварыства ці суполкі, які адпавядае долі гэтага ўдзельніка ў статутным фондзе, калі іншае не прадугледжана ўстаноўчымі дакументамі, а таксама частка прыбытку, якая прыпадае на яго долю, атрыманага гаспадарчым таварыствам ці суполкай з моманту выбыцця гэтага ўдзельніка да моманту разліку. Па пагадненні ўдзельніка, які выбывае, з удзельнікамі гаспадарчага таварыства ці суполкі, якія засталіся, выплата яму кошту чыстых актываў можа быць заменена выдачай маёмасці ў натуры.

Належная ўдзельніку, які выходзіць (выключаецца), частка чыстых актываў гаспадарчага таварыства ці суполкі ці яе кошт вызначаюцца па бухгалтарскім балансе (кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання), які складаецца на момант яго выбыцця, а належная яму частка прыбытку – на момант разліку.

Выплата кошту долі ці выдача іншай маёмасці ўдзельніку, які выходзіць (выключаецца), праводзіцца пасля заканчэння фінансавага года і пасля зацвярджэння справаздачы за год, у якім ён выйшаў ці выключаны з гаспадарчага таварыства ці суполкі, у тэрмін да 12 месяцаў з дня падачы заявы аб выхадзе ці прыняцці рашэння аб выключэнні, калі іншае не прадугледжана ва ўстаноўчых дакументах.

3. Удзельнікі гаспадарчага таварыства ці суполкі абавязаны:

1) уносіць уклады ў парадку, памерах, спосабамі і ў тэрміны, прадугледжаныя заканадаўчымі актамі і ўстаноўчымі дакументамі;

2) не выдаваць канфідэнцыяльную інфармацыю аб дзейнасці таварыства ці суполкі, атрыманую ў сувязі з удзелам у гаспадарчым таварыстве ці суполцы;

3) выконваць іншыя абавязкі, ускладзеныя на іх заканадаўчымі актамі.

Удзельнікі гаспадарчага таварыства ці суполкі могуць несці і іншыя абавязкі, прадугледжаныя яго (яе) устаноўчымі дакументамі.

Артыкул 65. Пераўтварэнне гаспадарчых суполак і таварыстваў

1. Гаспадарчыя таварыствы і суполкі адной формы ці аднаго віду могуць пераўтварацца ў гаспадарчыя суполкі іншай формы ці іншага віду або ў гаспадарчыя суполкі, вытворчыя кааператывы ці ўнітарныя прадпрыемствы паводле рашэння агульнага сходу ўдзельнікаў у выпадках і парадку, устаноўленых заканадаўчымі актамі, за выключэннем гаспадарчых суполак, якія складаюцца з аднаго ўдзельніка, яны могуць быць пераўтвораны ў гаспадарчыя суполкі іншай формы ці іншага віду або ва ўнітарныя прадпрыемствы.

2. Пры пераўтварэнні суполкі ў таварыства кожны поўны супольнік, які стаў удзельнікам (акцыянерам) суполкі, на працягу двух гадоў нясе субсідыярную адказнасць усёй сваёй маёмасцю па абавязацельствах, якія перайшлі да таварыства ад суполкі . Адчужэнне былым супольнікам долей (акцый), што належалі яму, не вызваляе яго ад такой адказнасці. Правілы, выкладзеныя ў гэтым пункце, адпаведна прымяняюцца пры пераўтварэнні суполкі ў вытворчы кааператыў і ўнітарнае прадпрыемства.

2. Поўная суполка

Артыкул 66. Асноўныя палажэнні аб поўнай суполцы

1. Поўным прызнаецца суполка, удзельнікі якой (поўныя супольнікі) у адпаведнасці з заключаным паміж імі дагаворам займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю ад імя суполкі і салідарна адзін з адным нясуць субсідыярную адказнасць сваёй маёмасцю паводле абавязацельстваў суполкі.

2. Асоба можа быць удзельнікам толькі адной поўнай суполкі.

3. Фірменнае найменне поўнай суполкі павінна ўтрымліваць імёны (найменні) усіх яго ўдзельнікаў, а таксама словы «поўная суполка» або імя (найменне) аднаго ці некалькіх удзельнікаў з дадаваннем слоў «і кампанія» і «поўная суполка».

4. Выключаны.

Артыкул 67. Устаноўчы дагавор поўнай суполкі

1. Поўная суполка ствараецца і дзейнічае на падставе ўстаноўчага дагавора. Устаноўчы дагавор падпісваюць усе яе ўдзельнікі.

2. Устаноўчы дагавор поўнай суполкі павінен утрымліваць, апрача звестак, указаных у пункце 2 артыкула 48 гэтага Кодэкса, умовы аб памеры і складзе статутнага фонду суполкі; аб памеры і парадку змянення долей кожнага з удзельнікаў у статутным фондзе; аб памеры, складзе, тэрмінах і парадку ўнясення імі ўкладаў; аб адказнасці ўдзельнікаў за парушэнне абавязкаў па ўнясенні ўкладаў.

Артыкул 68. Кіраванне ў поўнай суполцы

1. Кіраванне дзейнасцю поўнай суполкі ажыццяўляецца па агульнай згодзе ўсіх удзельнікаў. Устаноўчым дагаворам суполкі могуць быць прадугледжаны выпадкі, калі рашэнне прымаецца большасцю галасоў удзельнікаў.

2. Кожны ўдзельнік поўнай суполкі мае адзін голас, калі ўстаноўчым дагаворам не прадугледжаны іншы парадак вызначэння колькасці галасоў яго ўдзельнікаў.

3. Кожны ўдзельнік суполкі незалежна ад таго, ці ўпаўнаважаны ён весці агульныя справы, мае права асабіста знаёміцца з усёй дакументацыяй аб вядзенні спраў суполкі. Адмова ад гэтага права ці яго абмежаванне, у тым ліку па пагадненні ўдзельнікаў суполкі, нікчэмныя.

Артыкул 69. Вядзенне спраў поўнай суполкі

1. Кожны ўдзельнік поўнай суполкі мае права дзейнічаць ад імя суполкі, калі ўстаноўчым дагаворам не ўстаноўлена, што ўсе яго ўдзельнікі вядуць справы сумесна або вядзенне спраў даручана асобным удзельнікам.

Пры сумесным вядзенні спраў суполкі яе ўдзельнікамі для заключэння кожнай здзелкі патрабуецца згода ўсіх удзельнікаў суполкі.

Калі вядзенне спраў суполкі даручаецца яе ўдзельнікамі аднаму ці некалькім з іх, астатнія ўдзельнікі для заключэння здзелак ад імя суполкі павінны мець даверанасць ад удзельніка (удзельнікаў), на якога ўскладзена вядзенне спраў суполкі.

У адносінах з трэцімі асобамі суполка не мае права спасылацца на палажэнні ўстаноўчага дагавора, якія абмяжоўваюць паўнамоцтвы ўдзельнікаў суполкі, за выключэннем выпадкаў, калі суполка дакажа, што трэцяя асоба ў момант заключэння здзелкі ведала ці заведама павінна была ведаць аб адсутнасці ва ўдзельніка суполкі права дзейнічаць ад імя суполкі.

2. Паўнамоцтвы на вядзенне спраў суполкі, дадзеныя аднаму ці некалькім удзельнікам, могуць быць спынены судом па патрабаванні аднаго ці некалькіх іншых удзельнікаў суполкі пры наяўнасці для таго сур'ёзных падстаў, у прыватнасці ў выніку грубага парушэння ўпаўнаважанай асобай (асобамі) сваіх абавязкаў ці выяўленай няздольнасці яе да разумнага вядзення спраў. На падставе судовага рашэння ва ўстаноўчы дагавор суполкі ўносяцца неабходныя змяненні.

Артыкул 70. Абавязкі ўдзельніка поўнай суполкі

1. Удзельнік поўнай суполкі абавязаны ўдзельнічаць у яе дзейнасці ў адпаведнасці з умовамі ўстаноўчага дагавора.

2. Выключаны.

3. Удзельнік поўнай суполкі не мае права без згоды астатніх удзельнікаў заключаць ад свайго імя ў сваіх інтарэсах ці ў інтарэсах трэціх асоб здзелкі, аднародныя з тымі, якія складаюць прадмет дзейнасці суполкі.

Пры парушэнні гэтага правіла суполка мае права па сваім выбары запатрабаваць ад такога ўдзельніка пакрыцця прычыненых суполцы страт або перадачы суполцы ўсёй набытай у такіх здзелках выгады.

Артыкул 71. Размеркаванне прыбытку і страт поўнай суполкі

1. Прыбытак і страты поўнай суполкі размяркоўваюцца паміж яго ўдзельнікамі прапарцыянальна іх долям у статутным фондзе, калі іншае не прадугледжана ўстаноўчым дагаворам ці іншым пагадненнем удзельнікаў. Не дапускаецца

пагадненне аб устараненні каго-небудзь з удзельнікаў суполкі ад удзелу ў прыбытку ці стратах.

2. Калі ў выніку панесеных суполкай страт кошт яго чыстых актываў, якія вызначаюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, стане меншым за памер яго статутнага фонду, атрыманы суполкай прыбытак не размяркоўваецца паміж удзельнікамі да таго часу, пакуль кошт чыстых актываў не перавысіць памер статутнага фонду.

Артыкул 72. Адказнасць удзельнікаў поўнай суполкі па яе абавязацельствах

1. Удзельнікі поўнай суполкі салідарна паміж сабою нясуць субсідыярную адказнасць сваёй маёмасцю па абавязацельствах суполкі.

2. Удзельнік поўнай суполкі, які не з'яўляецца яе заснавальнікам, адказвае нароўні з іншымі ўдзельнікамі і па абавязацельствах, якія ўзніклі да яго ўступлення ў суполку.

3. Удзельнік, які выбыў з суполкі, адказвае па абавязацельствах суполкі, якія ўзніклі да моманту яго выбыцця, нароўні з удзельнікамі, якія засталіся, на працягу двух гадоў з дня зацвярджэння справаздачы аб дзейнасці суполкі за год, у якім ён выбыў з суполкі.

4. Пагадненне ўдзельнікаў суполкі аб абмежаванні ці ліквідацыі адказнасці, прадугледжанай гэтым артыкулам, нікчэмнае.

Артыкул 73. Змяненне складу ўдзельнікаў поўнай суполкі

1. Змяненне складу ўдзельнікаў поўнай суполкі не цягне за сабой ліквідацыю поўнай суполкі, калі іншае не ўстаноўлена ўстаноўчым дагаворам поўнай суполкі.

2. Змяненне складу ўдзельнікаў поўнай суполкі можа ажыццяўляцца ў выніку:

1) выхаду ўдзельніка;

2) выключэння ўдзельніка;

3) уступкі долі ўдзельніка іншай асобе;

4) прыняцця новага ўдзельніка;

5) прызнання ўдзельніка банкрутам;

6) смерці ўдзельніка, аб’яўлення яго памерлым або прызнання яго адсутным без вестак, недзеяздольным ці абмежавана дзеяздольным, а таксама ліквідацыі ўдзельніка – юрыдычнай асобы.

3. Калі адзін з удзельнікаў выбыў з поўнай суполкі, долі астатніх удзельнікаў у статутным фондзе поўнай суполкі мяняюцца прапарцыянальна памерам іх укладаў у статутны фонд, калі іншае не прадугледжана ўстаноўчым дагаворам ці іншым пагадненнем удзельнікаў.

Артыкул 74. Выхад удзельніка з поўнай суполкі

1. Удзельнік поўнай суполкі, створанай на нявызначаны тэрмін, мае права выйсці з яе, заявіўшы аб гэтым ва ўстаноўлены ўстаноўчым дагаворам тэрмін, але не менш чым за шэсць месяцаў.

Датэрміновая адмова ад удзелу ў поўнай суполцы, заснаванай на пэўны тэрмін, дапускаецца ў выпадках, указаных ва ўстаноўчым дагаворы, а пры адсутнасці такога ўказання – толькі з-за ўважлівай прычыны. Пры наяўнасці спрэчкі пытанне аб выхадзе вырашаецца ў судовым парадку.

2. Пагадненне паміж удзельнікамі поўнай суполкі аб адмове ад права выйсці з поўнай суполкі нікчэмнае.

Артыкул 75. Выключэнне ўдзельніка поўнай суполкі

1. У выпадку невыканання ці неналежнага выканання ўдзельнікам поўнай суполкі сваіх абавязкаў удзельнікі поўнай суполкі маюць права патрабаваць у судовым парадку выключэння такога ўдзельніка з поўнай суполкі.

2. Выключэнне ўдзельніка з поўнай суполкі адбываецца таксама ў выпадку накіравання спагнання на ўсю долю ўдзельніка поўнай суполкі. У гэтым выпадку судовае рашэнне аб выключэнні не патрабуецца.

Артыкул 76. Уступка долі ўдзельніка поўнай суполкі іншай асобе

1. Удзельнік поўнай суполкі мае права са згоды астатніх яго ўдзельнікаў перадаць сваю долю ў статутным фондзе ці яе частку іншаму ўдзельніку поўнай суполкі або трэцяй асобе.

Пры гэтым іншыя ўдзельнікі поўнай суполкі ў парадку, які вызначаецца ўстаноўчым дагаворам, маюць права пераважнай куплі долі (яе часткі) у параўнанні з іншымі асобамі.

2. Пры перадачы долі (часткі долі) іншай асобе да яе пераходзяць поўнасцю (ці ў адпаведнай частцы) абавязацельствы, прыналежныя ўдзельніку, які перадаў долю (частку долі).

Перадача ўсёй долі іншай асобе ўдзельнікам суполкі спыняе яго ўдзел у суполцы.

Артыкул 77. Прыняцце новага ўдзельніка поўнай суполкі

Асоба мае права стаць удзельнікам поўнай суполкі пры ўмове згоды на гэта іншых удзельнікаў поўнай суполкі і ўнясення ўкладу ў статутны фонд поўнай суполкі ў адпаведнасці з устаноўчым дагаворам поўнай суполкі.

Артыкул 78. Змяненне складу поўнай суполкі ў выніку смерці ўдзельніка, аб'яўлення яго памерлым, прызнання адсутным без вестак, недзеяздольным ці абмежавана дзеяздольным, а таксама ліквідацыі ўдзельніка – юрыдычнай асобы

1. У выпадку смерці ўдзельніка поўнай суполкі або аб'яўлення яго памерлым яго спадчыннік мае права (але не абавязаны) уступіць у поўную суполку са згоды іншых удзельнікаў.

Разлікі са спадчыннікам, які не ўступіў у поўную суполку, праводзяцца ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 64 гэтага Кодэкса.

2. У выпадку ліквідацыі юрыдычнай асобы – удзельніка поўнай суполкі, прызнання ўдзельніка адсутным без вестак, недзеяздольным ці абмежавана дзеяздольным яго доля ў поўнай суполцы выдзяляецца ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 64 гэтага Кодэкса.

Артыкул 79. Накіраванне спагнання на долю ўдзельніка ў поўнай суполцы

Накіраванне спагнання на долю ўдзельніка ў поўнай суполцы па ўласных даўгах удзельніка дапускаецца толькі пры недахопе іншай яго маёмасці для пакрыцця даўгоў. Крэдыторы такога ўдзельніка маюць права запатрабаваць ад поўнай суполкі выдзелу часткі маёмасці поўнай суполкі, якая адпавядае долі даўжніка ў статутным фондзе, з мэтай накіравання спагнання на гэту маёмасць.

Падлеглая выдзелу частка маёмасці поўнай суполкі ці яе кошт вызначаецца па бухгалтарскім балансе (кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання), складзеным на момант прад'яўлення крэдыторамі патрабавання аб выдзеле.

Артыкул 80. Ліквідацыя поўнай суполкі

Поўная суполка ліквідуецца на падставах, указаных у артыкуле 57 гэтага Кодэкса, а таксама ў выпадку, калі ў суполцы застаецца адзіны ўдзельнік. Апошні мае права на працягу трох месяцаў з дня, калі ён стаў адзіным удзельнікам суполкі, пераўтварыць такую суполку ва ўнітарнае прадпрыемства ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

3. Камандытная суполка

Артыкул 81. Асноўныя палажэнні аб камандытнай суполцы

1. Камандытнай суполкай прызнаецца суполка, у якой нароўні з удзельнікамі, што ажыццяўляюць ад імя суполкі прадпрымальніцкую дзейнасць і адказваюць па абавязацельствах суполкі ўсёй сваёй маёмасцю (поўнымі супольнікамі), маецца адзін ці некалькі ўдзельнікаў (укладчыкаў, камандытаў), якія нясуць рызыку страт, звязаных з дзейнасцю суполкі, у межах сум унесеных імі ўкладаў і не прымаюць удзелу ў ажыццяўленні суполкай прадпрымальніцкай дзейнасці.

2. Становішча поўных супольнікаў, удзельнікаў у камандытнай суполцы, і іх адказнасць па абавязацельствах суполкі вызначаюцца заканадаўствам аб удзельніках поўнай суполкі.

3. Асоба можа быць поўным супольнікам толькі ў адной камандытнай суполцы.

Удзельнік поўнай суполкі не можа быць поўным супольнікам у камандытнай суполцы.

Поўны супольнік у камандытнай суполцы не можа быць удзельнікам поўнай суполкі.

4. Фірменнае найменне камандытнай суполкі павінна ўтрымліваць або імёны (найменні) усіх поўных супольнікаў і словы «камандытная суполка», або імя (найменне) не менш чым аднаго поўнага супольніка з дадаваннем слоў «і кампанія» і «камандытная суполка». Калі ў фірменнае найменне камандытнай суполкі ўключана з яго згоды імя ўкладчыка, такі ўкладчык становіцца поўным супольнікам.

5. Да камандытнай суполкі прымяняюцца правілы гэтага Кодэкса аб поўнай суполцы, паколькі гэта не супярэчыць заканадаўству аб камандытнай суполцы.

Артыкул 82. Устаноўчы дагавор камандытнай суполкі

1. Камандытная суполка ствараецца і дзейнічае на падставе ўстаноўчага дагавора. Устаноўчы дагавор падпісваюць усе поўныя супольнікі.

2. Устаноўчы дагавор камандытнай суполкі павінен утрымліваць, апрача звестак, указаных у пункце 2 артыкула 48 гэтага Кодэкса, умовы аб памеры і складзе статутнага фонду суполкі; аб памеры і парадку змянення долей кожнага з поўных супольнікаў супольнікаў у статутным фондзе; аб памеры, складзе, тэрмінах і парадку ўнясення імі ўкладаў, іх адказнасці за парушэнне абавязкаў па ўнясенні ўкладаў; аб сумесным памеры ўкладаў, якія ўносяць кладчыкі.

Артыкул 83. Кіраванне ў камандытнай суполцы і вядзенне яе спраў

1. Дзейнасцю камандытнай суполкі кіруюць поўныя супольнікі. Парадак кіравання і вядзення спраў такой суполкі яе поўнымі супольнікамі яны ўстанаўліваюць у адпаведнасці з заканадаўствам аб поўнай суполцы.

2. Укладчыкі не маюць права ўдзельнічаць у кіраванні справамі камандытнай суполкі. Яны могуць выступаць ад яго імя няйнакш як па даверанасці. Яны не маюць права аспрэчваць дзеянні поўных супольнікаў па кіраванні і вядзенні спраў суполкі.

Артыкул 84. Правы і абавязкі ўкладчыка камандытнай суполкі

1. Укладчык камандытнай суполкі абавязаны ўнесці ўклад у статутны фонд. Унясенне ўкладу сведчыцца пасведчаннем аб удзеле, якое выдаецца ўкладчыку суполкі.

2. Укладчык камандытнай суполкі мае права:

1) атрымліваць частку прыбытку суполкі, належную на яго долю ў статутным фондзе, у парадку, прадугледжаным устаноўчым дагаворам;

2) знаёміцца з гадавымі справаздачамі і гадавой бухгалтарскай (фінансавай) справаздачнасцю суполкі (кнігай уліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання);

3) пасля заканчэння фінансавага года выйсці з суполкі і атрымаць свой уклад у парадку, прадугледжаным устаноўчым дагаворам;

4) перадаць сваю долю ў статутным фондзе ці яе частку іншаму ўкладчыку ці трэцяй асобе. Укладчыкі карыстаюцца пераважным перад трэцімі асобамі правам куплі долі (яе часткі) прымяняльна да ўмоў і парадку, прадугледжаных пунктам 2 артыкула 92 гэтага Кодэкса. Перадача ўсёй долі іншай асобе ўкладчыкам спыняе яго ўдзел у суполцы.

Устаноўчым дагаворам камандытнай суполкі могуць прадугледжвацца і іншыя правы ўкладчыка.

Артыкул 85. Ліквідацыя камандытнай суполкі

1. Камандытная суполка ліквідуецца пры выбыцці ўсіх укладчыкаў, якія ўдзельнічалі ў ім. Аднак поўныя супольнікі маюць права замест ліквідацыі пераўтварыць камандытную суполку ў поўную суполку , а таксама ва ўнітарнае прадпрыемства ў выпадках, калі ў складзе таварыства застаўся адзін удзельнік.

Камандытная суполка ліквідуецца таксама на падставах ліквідацыі поўнай суполкі (артыкул 80). Аднак камандытная суполка захоўваецца, калі ў ёй застаюцца прынамсі адзін поўны супольнікі адзін укладчык.

2. Пры ліквідацыі камандытнай суполкі, у тым ліку ў выпадку эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтва), укладчыкі маюць пераважнае перад поўнымі супольнікамі права на атрыманне ўкладаў з маёмасці суполкі, якая засталася пасля задавальнення патрабаванняў яе крэдытораў.

Маёмасць суполкі, якая засталася пасля гэтага, размяркоўваецца паміж поўнымі супольнікамі і ўкладчыкамі прапарцыянальна іх долям у статутным фондзе, калі іншы парадак не ўстаноўлены ўстаноўчым дагаворам ці пагадненнем поўных супольнікаў і ўкладчыкаў.

4. Таварыства з абмежаванай адказнасцю

Артыкул 86. Асноўныя палажэнні аб таварыстве з абмежаванай адказнасцю

1. Таварыствам з абмежаванай адказнасцю прызнаецца таварыства, статутны фонд якога падзелены на долі вызначаных статутам памераў. Удзельнікі таварыства з абмежаванай адказнасцю не адказваюць па яго абавязацельствах і нясуць рызыку страт, звязаных з дзейнасцю таварыства, у межах кошту ўнесеных імі ўкладаў.

Удзельнікі таварыства, якія ўнеслі ўклады не поўнасцю, нясуць салідарную адказнасць па яго абавязацельствах у межах кошту неаплачанай часткі ўкладу кожнага з удзельнікаў.

2. Фірменнае найменне таварыства з абмежаванай адказнасцю павінна ўтрымліваць найменне таварыства і словы «з абмежаванай адказнасцю».

3. Прававое становішча таварыства з абмежаванай адказнасцю, правы і абавязкі яго ўдзельнікаў вызначаюцца заканадаўствам аб таварыствах з абмежаванай адказнасцю.

Артыкул 87. Удзельнікі таварыства з абмежаванай адказнасцю

1. Колькасць удзельнікаў таварыства з абмежаванай адказнасцю не павінна перавышаць мяжы, устаноўленай заканадаўчымі актамі. У адваротным выпадку таварыства з абмежаванай адказнасцю падлягае рэарганізацыі на працягу года, а пасля сканчэння гэтага тэрміну – ліквідацыі ў судовым парадку, калі колькасць яго ўдзельнікаў не зменшыцца да ўстаноўленай заканадаўчымі актамі мяжы.

2. Таварыства з абмежаванай адказнасцю можа быць заснавана адной асобай ці можа складацца з аднаго ўдзельніка, у тым ліку пры стварэнні ў выніку рэарганізацыі юрыдычнай асобы.

Артыкул 88. Устаноўчы дакумент таварыства з абмежаванай адказнасцю

1. Устаноўчым дакументам таварыства з абмежаванай адказнасцю з'яўляецца статут, зацверджаны яго заснавальнікамі.

2. Статут таварыства з абмежаванай адказнасцю павінен утрымліваць апрача звестак, указаных у пункте 2 артыкула 48 гэтага Кодэкса, умовы аб памеры статутнага фонду таварыства; аб памеры долей кожнага з удзельнікаў; аб памеры і складзе ўкладаў удзельнікаў; аб складзе і кампетэнцыі органаў кіравання таварыствам і парадку прыняцця імі рашэнняў, у тым ліку па пытаннях, рашэнні па якіх прымаюцца аднагалосна ці кваліфікаванай большасцю галасоў, а таксама іншыя звесткі, прадугледжаныя заканадаўствам аб таварыствах з абмежаванай адказнасцю.

Артыкул 89. Статутны фонд таварыства з абмежаванай адказнасцю

1. Статутны фонд таварыства з абмежаванай адказнасцю складаецца з кошту ўкладаў яго ўдзельнікаў.

Статутны фонд вызначае мінімальны памер маёмасці таварыства, якое гарантуе інтарэсы яго крэдытораў.

2. Не дапускаецца вызваленне ўдзельніка таварыства з абмежаванай адказнасцю ад абавязку ўнясення ўкладу ў статутны фонд таварыства, у тым ліку шляхам заліку патрабаванняў да таварыства, за выключэннем выпадкаў, устаноўленых заканадаўчымі актамі.

3. Выключаны.

4. Выключаны.

5. Змяншэнне статутнага фонду таварыства з абмежаванай адказнасцю дапускаецца пасля паведамлення ўсім яго крэдыторам. Апошнія маюць права ў гэтым выпадку запатрабаваць датэрміновага спынення ці выканання адпаведных абавязацельстваў таварыства і пакрыцця ім страт.

6. Выключаны.

Артыкул 90. Кіраванне ў таварыстве з абмежаванай адказнасцю

1. Найвышэйшым органам кіравання таварыствам з абмежаванай адказнасцю з'яўляецца агульны сход яго ўдзельнікаў.

У таварыстве з абмежаванай адказнасцю ствараецца выканаўчы орган (калегіяльны і (ці) аднаасобны), які ажыццяўляе бягучае кіраўніцтва яго дзейнасцю і падсправаздачны агульнаму сходу яго ўдзельнікаў. Аднаасобны орган кіравання таварыствам можа быць выбраны таксама і не з ліку яго ўдзельнікаў.

У таварыстве з абмежаванай адказнасцю паводле рашэння яго заснавальнікаў (удзельнікаў) у адпаведнасці са статутам можа стварацца савет дырэктараў (наглядальны савет).

2. Кампетэнцыя органаў кіравання таварыствам, а таксама парадак прыняцця імі рашэнняў і выступлення ад імя таварыства вызначаюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб таварыствах з абмежаванай адказнасцю і статутам таварыства.

3. Да выключнай кампетэнцыі агульнага схода ўдзельнікаў таварыства з абмежаванай адказнасцю адносяцца:

1) змяненне статута таварыства і памеру яго статутнага фонду;

2) стварэнне выканаўчых органаў таварыства і датэрміновае спыненне іх паўнамоцтваў;

3) зацвярджэнне гадавых справаздач і гадавой бухгалтарскай (фінансавай) справаздачнасці таварыства (даных кнігі ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання) і размеркаванне яго прыбытку і страт;

4) рашэнне аб рэарганізацыі ці ліквідацыі таварыства;

5) выбранне рэвізійнай камісіі (рэвізора) таварыства.

Заканадаўствам аб таварыствах з абмежаванай адказнасцю і статутам таварыства з абмежаванай адказнасцю да выключнай кампетэнцыі агульнага сходу можа быць таксама аднесена рашэнне іншых пытанняў.

Пытанні, аднесеныя да выключнай кампетэнцыі агульнага сходу ўдзельнікаў таварыства, не могуць быць перададзены ім на рашэнне выканаўчага органа таварыства.

4. Для правядзення аўдыту бухгалтарскай (фінансавай) справаздачнасці таварыства з абмежаванай адказнасцю, аказання іншых аўдытарскіх паслуг, у тым ліку ў адносінах да філіялаў і прадстаўніцтваў таварыства з абмежаванай адказнасцю, яно мае права, а ў выпадках і парадку, устаноўленых заканадаўчымі актамі, абавязана прыцягваць аўдытарскую арганізацыю, аўдытара, які ажыццяўляе дзейнасць у якасці індывідуальнага прадпрымальніка (далей – аўдытар – індывідуальны прадпрымальнік). Аўдыт бухгалтарскай (фінансавай) справаздачнасці таварыства (даных кнігі ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання) можа быць таксама праведзены па патрабаванні любога з яго ўдзельнікаў.

5. Таварыства публікуе гадавую бухгалтарскую (фінансавую) справаздачнасць у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

Артыкул 91. Рэарганізацыя і ліквідацыя таварыства з абмежаванай адказнасцю

1. Таварыства з абмежаванай адказнасцю можа быць рэарганізавана ці ліквідавана добраахвотна па аднагалосным рашэнні яго ўдзельнікаў.

Іншыя падставы рэарганізацыі і ліквідацыі таварыства, а таксама парадак яго рэарганізацыі і ліквідацыі вызначаюцца заканадаўчымі актамі.

2. Таварыства з абмежаванай адказнасцю мае права пераўтварыцца ў акцыянернае таварыства, таварыства з дадатковай адказнасцю, гаспадарчую суполку, вытворчы кааператыў ці ўнітарнае прадпрыемства.

Артыкул 92. Пераход долі ў статутным фондзе таварыства з абмежаванай адказнасцю да іншай асобы

1. Удзельнік таварыства з абмежаванай адказнасцю мае права прадаць ці іншым чынам правесці адчужэнне сваёй долі (часткі долі) у статутным фондзе таварыства аднаму ці некалькім удзельнікам гэтага таварыства ці самому таварыству.

2. Адчужэнне ўдзельнікам таварыства сваёй долі (часткі долі) трэцім асобам дапускаецца, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі ці статутам таварыства.

Удзельнікі таварыства карыстаюцца пераважным правам куплі долі (часткі долі) удзельніка прапарцыянальна памерам сваіх долей, калі статутам таварыства не прадугледжаны іншы парадак ажыццяўлення гэтага права або калі іншае не ўстаноўлена законамі ці актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У выпадку, калі ўдзельнікі таварыства адмовяцца ад свайго пераважнага права або не скарыстаюцца сваім пераважным правам у тэрмін, вызначаны статутам таварыства, але не большы за трыццаць дзён з дня накіравання ўдзельнікам паведамлення аб яе продажы, доля (частка долі) удзельніка можа быць адчужана самому таварыству. У выпадку, калі ўдзельнікі таварыства не скарысталіся пераважным правам куплі долі (часткі долі) удзельніка ў статутным фондзе таварыства або само таварыства не скарысталася правам куплі долі (часткі долі) удзельніка ў статутным фондзе таварыства, доля (частка долі) удзельніка ў статутным фондзе таварыства можа быць адчужана трэцяй асобе.

3. Калі ў адпаведнасці са статутам таварыства з абмежаванай адказнасцю адчужэнне долі (часткі долі) удзельніка трэцім асобам немагчымае, а іншыя ўдзельнікі таварыства ад яе куплі адмаўляюцца, таварыства абавязана выплаціць удзельніку яе сапраўдны кошт або выдаць яму ў натуры маёмасць, якая адпавядае такому кошту.

4. Доля ўдзельніка таварыства з абмежаванай адказнасцю можа быць адчужана да поўнай яе аплаты толькі ў той частцы, у якой яна ўжо аплачана.

5. У выпадку набыцця долі (часткі долі) удзельніка самім таварыствам з абмежаванай адказнасцю яно абавязана або размеркаваць выкупленую ім за кошт уласных сродкаў долю (частку долі) удзельніка паміж іншымі ўдзельнікамі прапарцыянальна памерам іх долей, або рэалізаваць яе іншым удзельнікам ці трэцім асобам у тэрміны і парадку, прадугледжаныя заканадаўствам аб таварыствах з абмежаванай адказнасцю і статутам таварыства, або зменшыць свой статутны фонд у адпаведнасці з пунктам 5 артыкула 89 гэтага Кодэкса.

6. Долі ў статутным фондзе таварыства з абмежаванай адказнасцю пераходзяць да спадчыннікаў грамадзян і да праваперaемнікаў юрыдычных асоб, якія з'яўляліся ўдзельнікамі таварыства, калі статутам таварыства не прадугледжана, што такі пераход дапускаецца толькі са згоды астатніх удзельнікаў таварыства. Адмова ў згодзе на пераход долі цягне за сабой абавязак таварыства выплаціць спадчыннікам (праваперaемнікам) удзельніка яе сапраўдны кошт ці выдаць ім у натуры маёмасць на такі кошт у парадку і на ўмовах, прадугледжаных заканадаўствам аб таварыствах з абмежаванай адказнасцю і статутам таварыства.

Артыкул 93. Выхад удзельніка таварыства з абмежаванай адказнасцю з таварыства

Удзельнік таварыства з абмежаванай адказнасцю мае права ў любы час выйсці з таварыства незалежна ад згоды іншых яго ўдзельнікаў.

Выхад удзельнікаў таварыства з абмежаванай адказнасцю з таварыства, у выніку якога ў таварыстве не застаецца ні аднаго ўдзельніка, у тым ліку выхад

адзінага ўдзельніка таварыства з абмежаванай адказнасцю з таварыства, не дапускаецца.

5. Таварыства з дадатковай адказнасцю

Артыкул 94. Асноўныя палажэнні аб таварыстве з дадатковай адказнасцю

1. Таварыствам з дадатковай адказнасцю прызнаецца таварыства, статутны фонд якога падзелены на долі вызначаных статутам памераў. Удзельнікі такога таварыства салідарна нясуць субсідыярную адказнасць па яго абавязацельствах сваёй маёмасцю ў межах, якія вызначаюцца статутам таварыства, але не менш за памер, устаноўлены заканадаўчымі актамі. Пры эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве) аднаго з удзельнікаў яго адказнасць па абавязацельствах таварыства размяркоўваецца паміж астатнімі ўдзельнікамі прапарцыянальна іх укладам, калі іншы парадак размеркавання адказнасці не прадугледжаны статутам таварыства.

2. Фірменнае найменне таварыства з дадатковай адказнасцю павінна ўтрымліваць найменне таварыства і словы «з дадатковай адказнасцю».

3. Да таварыства з дадатковай адказнасцю прымяняюцца правілы гэтага Кодэкса аб таварыстве з абмежаванай адказнасцю пастолькі, паколькі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі.

Артыкул 95. Змяненне памеру дадатковай адказнасці

Таварыства з дадатковай адказнасцю мае права пасля паведамлення крэдыторaў зменшыць, але не менш за памер, устаноўлены заканадаўчымі актамі, ці павялічыць памер дадатковай адказнасці сваіх удзельнікаў.

Крэдыторы таварыства з дадатковай адказнасцю маюць права пры змяншэнні памеру дадатковай адказнасці ўдзельнікаў таварыства запатрабаваць датэрміновага спынення ці выканання адпаведных абавязацельстваў таварыства і пакрыцця ім страт.

6. Акцыянернае таварыства

Артыкул 96. Асноўныя палажэнні аб акцыянерным таварыстве

1. Акцыянерным таварыствам прызнаецца таварыства, статутны фонд якога падзелены на пэўную колькасць акцый, якія маюць аднолькавы намінальны кошт. Удзельнікі акцыянернага таварыства (акцыянеры) не адказваюць па яго абавязацельствах і нясуць рызыку страт, звязаных з дзейнасцю таварыства, у межах кошту прыналежных ім акцый.

Акцыянеры, якія поўнасцю не аплацілі акцыі, нясуць салідарную адказнасць па абавязацельствах акцыянернага таварыства ў межах неаплачанай часткі кошту прыналежных ім акцый.

2. Фірменнае найменне акцыянернага таварыства павінна ўтрымліваць яго найменне і ўказанне на тое, што таварыства з'яўляецца акцыянерным.

3. Прававое становішча акцыянернага таварыства, правы і абавязкі акцыянераў вызначаюцца заканадаўствам аб акцыянерных таварыствах.

Артыкул 97. Адкрытыя і закрытыя акцыянерныя таварыствы

1. Акцыянернае таварыства, акцыі якога могуць размяшчацца і абарочвацца сярод неабмежаванага кола асоб, з'яўляецца адкрытым акцыянерным таварыствам. Такое акцыянернае таварыства мае права правесці адкрытую падпіску на акцыі, якія яно эмітуе, або адкрыты продаж акцый дадатковага выпуску на ўмовах, якія ўстанаўлівае заканадаўства аб каштоўных паперах, а ў выпадку размяшчэння акцый дадатковага выпуску за кошт уласнага капіталу гэтага таварыства і (ці) сродкаў яго

акцыянераў, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, – закрытае размяшчэнне акцый дадатковага выпуску сярод акцыянераў.

Адкрытае акцыянернае таварыства абавязана раскрываць інфармацыю аб акцыянерным таварыстве ў аб'ёме і парадку, вызначаных заканадаўствам аб каштоўных паперах.

2. Акцыянернае таварыства, акцыі якога размяшчаюцца і абарочваюцца толькі сярод акцыянераў гэтага таварыства і (ці) вызначанага ў адпаведнасці з заканадаўствам аб акцыянерных таварыствах абмежаванага круга асоб, з'яўляецца закрытым акцыянерным таварыствам. Закрытае акцыянернае таварыства мае права ажыццяўляць толькі закрытае (сярод абмежаванага кола асоб) размяшчэнне акцый дадатковага выпуску.

3. Колькасць удзельнікаў закрытага акцыянернага таварыства не павінна перавышаць колькасці, устаноўленай заканадаўчымі актамі. У адваротным выпадку яно падлягае рэарганізацыі на працягу года, а пасля сканчэння гэтага тэрміну – ліквідацыі ў судовым парадку, калі колькасць удзельнікаў не зменшыцца да ўстаноўленай заканадаўчымі актамі мяжы.

4. Закрытае акцыянернае таварыства можа, а ў выпадках, устаноўленых заканадаўствам, абавязана раскрываць інфармацыю аб акцыянерным таварыстве ў аб'ёме і парадку, вызначаных заканадаўствам аб каштоўных паперах.

5. Акцыянеры закрытага акцыянернага таварыства маюць пераважнае права куплі акцый, якія прадаюцца іншымі акцыянерамі гэтага таварыства. Калі ў выніку рэалізацыі акцыянерамі пераважнага права акцыі не могуць быць набыты ў прапанаванай колькасці або ніхто з акцыянераў не выкажа жадання набыць прапанаваныя да рэалізацыі акцыі, таварыства мае права само набыць адпаведна незапатрабаваныя акцыянерамі акцыі або прапанаваныя да рэалізацыі акцыі па ўзгодненай з іх уладальнікам цане і (ці) прапанаваць набыць гэтыя акцыі трэцяй асобе па цане, не ніжэйшай за цану, прапанаваную акцыянерам закрытага акцыянернага таварыства.

Калі прапанаваныя да рэалізацыі акцыі не могуць быць набыты ў адпаведнасці з часткай першай гэтага пункта ў поўным аб'ёме, з акцыянерам можа быць дасягнута пагадненне аб частковым продажы акцыянерам, і (ці) таварыству, і (ці) трэцяй асобе, вызначанай у адпаведнасці з часткай першай гэтага пункта, прапанаваных да рэалізацыі акцый. У гэтым выпадку акцыянер можа рэалізаваць сваё права на частковы продаж акцый пры ўмове продажу прапанаваных да рэалізацыі акцый усім акцыянерам, і (ці) таварыству, і (ці) трэцяй асобе, вызначанай у адпаведнасці з часткай першай гэтага пункта, якая выказала жаданне аб частковым набыцці гэтых акцый. Акцыі, якія засталіся пасля частковага продажу, могуць быць прададзены любой трэцяй асобе па цане, не ніжэйшай за цану іх продажу акцыянерам закрытага акцыянернага таварыства.

У выпадку, калі пагадненне аб частковым продажы акцыянерам, і (ці) таварыству, і (ці) трэцяй асобе, вызначанай у адпаведнасці з часткай першай гэтага пункта, прапанаваных да рэалізацыі акцый не дасягнута, гэтыя акцыі могуць быць прададзены любой трэцяй асобе па цане, не ніжэйшай за цану, прапанаваную акцыянерам закрытага акцыянернага таварыства.

Парадак продажу, мены, дарэння акцыянерамі закрытага акцыянернага таварыства сваіх акцый вызначаецца заканадаўствам аб акцыянерных таварыствах.

Статутам закрытага акцыянернага таварыства або рашэннем агульнага сходу акцыянераў, прынятым большасцю не менш чым трох чвэрцяў галасоў асоб, якія

прынялі ўдзел у гэтым агульным сходзе, можа быць абмежавана кола трэціх асоб, якім акцыянерамі гэтага таварыства могуць быць прададзены ці адчужаны іншым чынам, чым продаж, акцыі гэтага таварыства.

6. Пры закладзе акцый закрытага акцыянернага таварыства і наступным накіраванні на іх спагнання закладатрымальнікам адпаведна прымяняюцца правілы пункта 5 гэтага артыкула. Аднак закладатрымальнік мае права замест адчужэння акцый трэцяй асобе пакінуць іх сабе.

7. Акцыі закрытага акцыянернага таварыства пераходзяць да спадчыннікаў грамадзяніна ці праваперaемнікаў юрыдычнай асобы, якая з'яўлялася акцыянерам, калі статутам таварыства не прадугледжана, што такі пераход дапускаецца толькі са згоды таварыства. У апошнім выпадку пры адмове ў згодзе на пераход акцый яны павінны быць набыты іншымі акцыянерамі ці самім таварыствам у адпаведнасці з правіламі пункта 5 гэтага артыкула. Аднак спадчыннікі (праваперaемнікі) маюць права замест адчужэння акцый трэцім асобам пакінуць іх сабе.

Артыкул 98. Стварэнне акцыянернага таварыства

1. Заснавальнікі акцыянернага таварыства заключаюць паміж сабой дагавор, які вызначае парадак ажыццяўлення імі сумеснай дзейнасці па стварэнні таварыства, памер статутнага фонду таварыства, катэгорыі акцый, якія эмітуюцца, і парадак размяшчэння, а таксама іншыя ўмовы, прадугледжаныя заканадаўствам аб акцыянерных таварыствах.

Дагавор аб стварэнні акцыянернага таварыства заключаецца ў пісьмовай форме.

2. Заснавальнікі акцыянернага таварыства нясуць салідарную адказнасць па абавязацельствах, якія ўзніклі да рэгістрацыі таварыства.

Таварыства прымае на сябе адказнасць па абавязацельствах заснавальнікаў, звязаных з яго стварэннем, у выпадку наступнага адабрэння іх дзеянняў агульным сходам акцыянераў.

3. Устаноўчым дакументам акцыянернага таварыства з'яўляецца яго статут, зацверджаны заснавальнікамі.

Статут акцыянернага таварыства апрача звестак, указаных у пункце 2 артыкула 48 гэтага Кодэкса, павінен утрымліваць звесткі аб катэгорыях акцый, якія эмітуюцца таварыствам, іх намінальным кошце і колькасці; аб памеры статутнага фонду таварыства; аб правах акцыянераў; аб складзе і кампетэнцыі органаў кіравання таварыствам і парадку прыняцця рашэнняў, у тым ліку па пытаннях, рашэнні па якіх прымаюцца аднагалосна ці кваліфікаванай большасцю галасоў. У статуце акцыянернага таварыства павінны таксама ўтрымлівацца іншыя звесткі, калі неабходнасць іх уключэння ў статут прадугледжана заканадаўствам аб акцыянерных таварыствах.

4. Парадак здзяйснення іншых дзеянняў па стварэнні акцыянернага таварыства, у тым ліку кампетэнцыю ўстаноўчага сходу, вызначае заканадаўства аб акцыянерных таварыствах.

5. Асаблівасці стварэння акцыянерных таварыстваў у працэсе прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці вызначае заканадаўства аб прыватызацыі.

6. Акцыянернае таварыства можа быць створана адной асобай ці можа складацца з аднаго акцыянера, у тым ліку пры стварэнні ў выніку рэарганізацыі юрыдычнай асобы.

Артыкул 99. Статутны фонд акцыянернага таварыства

1. Статутны фонд акцыянернага таварыства складаецца з намінальнага кошту акцый таварыства. Статутны фонд таварыства вызначае мінімальны памер маёмасці таварыства, які гарантуе інтарэсы яго крэдытораў.

2. Не дапускаецца вызваленне акцыянера ад абавязку аплаты акцый таварыства, у тым ліку вызваленне яго ад гэтага абавязку шляхам заліку патрабаванняў да таварыства, за выключэннем выпадкаў, устаноўленых заканадаўчымі актамі.

3. Адкрытая падпіска на акцыі акцыянернага таварыства не дапускаецца да поўнай аплаты статутнага фонду. Пры заснаванні акцыянернага таварыства ўсе яго акцыі павінны быць размеркаваны сярод заснавальнікаў.

4. Выключаны.

5. Заканадаўчыя акты ці статут акцыянернага таварыства могуць устанаўліваць абмежаванні сумарнага намінальнага кошту ці колькасці простых (звычайных) і (ці) прывілеяваных акцый, якія належаць аднаму акцыянеру, або долі прыналежных яму такіх акцый у агульным аб'ёме статутнага фонду акцыянернага таварыства.

Артыкул 100. Павелічэнне статутнага фонду акцыянернага таварыства

1. Акцыянернае таварыства мае права пасля рашэння агульнага сходу акцыянераў павялічыць статутны фонд шляхам павелічэння намінальнага кошту акцый ці эмісіі акцый дадатковага выпуску.

2. Павелічэнне статутнага фонду акцыянернага таварыства дапускаецца пасля яго поўнай аплаты.

3. У выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, статутам таварыства можа быць устаноўлена пераважнае права акцыянераў, якія валодаюць простымі (звычайнымі) ці іншымі галасуючымі акцыямі, на набыццё акцый дадатковага выпуску гэтага таварыства.

Артыкул 101. Змяншэнне статутнага фонду акцыянернага таварыства

1. Акцыянернае таварыства мае права паводле рашэння агульнага сходу акцыянераў зменшыць статутны фонд шляхам змяншэння намінальнага кошту акцый або набыцця часткі акцый у мэтах скарачэння іх агульнай колькасці.

Змяншэнне статутнага фонду таварыства дапускаецца пасля паведамлення ўсім яго крэдыторам у парадку, які вызначаецца заканадаўствам аб акцыянерных таварыствах. Пры гэтым крэдыторы таварыства маюць права запатрабаваць датэрміновага спынення ці выканання адпаведных абавязацельстваў таварыства і пакрыцця ім страт.

2. Змяншэнне статутнага фонду акцыянернага таварыства шляхам набыцця гэтым таварыствам часткі акцый у мэтах скарачэння іх агульнай колькасці дапускаецца, калі такая магчымасць прадугледжана статутам гэтага таварыства.

Артыкул 102. Абмежаванні на эмісію каштоўных папер і выплату дывідэндаў акцыянернага таварыства

1. Доля прывілеяваных акцый у агульным аб'ёме статутнага фонду акцыянернага таварыства не павінна перавышаць дваццаць пяць працэнтаў.

2. Абмежаванні на эмісію акцыянернымі таварыствамі аблігацый могуць быць устаноўлены заканадаўчымі актамі.

3. Акцыянернае таварыства не мае права прымаць рашэнні аб аб’яўленні і выплаце дывідэндаў, а таксама выплачваць дывідэнды:

1) да поўнай аплаты ўсяго статутнага фонду;

2) калі кошт чыстых актываў акцыянернага таварыства меншы за яго статутны фонд і рэзервовы фонд або стане меншы за іх памер у выніку выплаты дывідэндаў;

3) у іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

Артыкул 103. Кіраванне ў акцыянерным таварыстве

1. Найвышэйшым органам кіравання ў акцыянерным таварыствам з'яўляецца агульны сход яго акцыянераў.

Да выключнай кампетэнцыі агульнага схода акцыянераў адносяцца:

1) змяненне статута таварыства, у тым ліку змяненне памеру яго статутнага фонду;

2) выбранне членаў савета дырэктараў (наглядальнага савета) і рэвізійнай камісіі (рэвізора) таварыства і датэрміновае спыненне іх паўнамоцтваў;

3) выключаны;

4) зацвярджэнне гадавых справаздач, гадавой бухгалтарскай (фінансавай) справаздачнасці таварыства (даных кнігі ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання) і размеркаванне яго прыбытку і страт;

5) рашэнне аб рэарганізацыі ці ліквідацыі таварыства.

Заканадаўчымі актамі і статутам акцыянернага таварыства да выключнай кампетэнцыі агульнага сходу акцыянераў можа быць таксама аднесена рашэнне іншых пытанняў.

Пытанні, аднесеныя заканадаўчымі актамі і статутам акцыянернага таварыства да выключнай кампетэнцыі агульнага сходу акцыянераў, не могуць быць перададзены ім на рашэнне іншых органаў кіравання таварыствам.

2. У таварыстве з колькасцю акцыянераў большай за пяцьдзясят ствараецца савет дырэктараў (наглядальны савет).

У выпадку стварэння савета дырэктараў (наглядальнага савета) статутам таварыства ў адпаведнасці з заканадаўствам аб акцыянерных таварыствах павінна быць вызначана яго выключная кампетэнцыя. Пытанні, аднесеныя статутам да выключнай кампетэнцыі савета дырэктараў (наглядальнага савета), не могуць быць перададзены ім на рашэнне выканаўчых органаў таварыства.

3. Выканаўчы орган таварыства можа быць калегіяльным (праўленне, дырэкцыя) і (ці) аднаасобным (дырэктар, генеральны дырэктар). Ён ажыццяўляе бягучае кіраўніцтва дзейнасцю таварыства і падсправаздачны савету дырэктараў (наглядальнаму савету) і агульнаму сходу акцыянераў.

Да кампетэнцыі выканаўчага органа таварыства адносіцца рашэнне ўсіх пытанняў, якія не складаюць выключную кампетэнцыю іншых органаў кіравання таварыствам, вызначаную заканадаўчымі актамі ці статутам таварыства.

Паводле рашэння агульнага сходу акцыянераў паўнамоцтвы выканаўчага органа таварыства могуць быць перададзены паводле дагавора іншай камерцыйнай арганізацыі ці індывідуальнаму прадпрымальніку (кіраўніку).

4. Кампетэнцыя органаў кіравання акцыянерным таварыствам, а таксама парадак прыняцця імі рашэнняў і выступлення ад імя таварыства вызначаюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб акцыянерных таварыствах і статутам таварыства.

5. Акцыянернае таварыства, абавязанае ў адпаведнасці з заканадаўствам аб каштоўных паперах раскрываць інфармацыю аб акцыянерным таварыстве, павінна штогадова праводзіць аўдыт гадавой бухгалтарскай (фінансавай) справаздачнасці.

Аўдыт бухгалтарскай (фінансавай) справаздачнасці (даных кнігі ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць

спрошчаную сістэму падаткаабкладання) акцыянернага таварыства, у тым ліку не абавязанага раскрываць інфармацыю аб акцыянерным таварыстве ў адпаведнасці з заканадаўствам аб каштоўных паперах, павінен быць праведзены ў любы час па патрабаванні акцыянераў, якія з'яўляюцца ў сукупнасці ўладальнікамі дзесяці ці больш працэнтаў акцый гэтага таварыства.

Артыкул 104. Рэарганізацыя і ліквідацыя акцыянернага таварыства

1. Акцыянернае таварыства можа быць рэарганізавана ці ліквідавана добраахвотна паводле рашэння агульнага сходу акцыянераў.

Іншыя падставы і парадак рэарганізацыі ці ліквідацыі акцыянернага таварыства вызначаюцца заканадаўчымі актамі.

2. Акцыянернае таварыства мае права пераўтварыцца ў таварыства з абмежаванай адказнасцю, таварыства з дадатковай адказнасцю, гаспадарчую суполку, вытворчы кааператыў ці ўнітарнае прадпрыемства.

7. Даччыныя і залежныя таварыствы

Артыкул 105. Даччынае гаспадарчае таварыства

1. Гаспадарчае таварыства прызнаецца даччыным, калі іншае (асноўнае) гаспадарчае таварыства ці суполка з прычыны пераважнага ўдзелу ў яго статутным фондзе, або ў адпаведнасці з заключаным паміж імі дагаворам, або іншым чынам мае магчымасць вызначаць рашэнні, якія прымаюцца такім таварыствам .

2. Даччынае таварыства не адказвае па даўгах асноўнага таварыства (суполкі).

Асноўнае таварыства (суполка), якое мае права даваць даччынаму таварыству, у тым ліку паводле дагавора з ім, абавязковыя для яго ўказанні, адказвае салідарна з даччыным таварыствам па здзелках, заключаных апошнім у мэтах выканання такіх указанняў.

У выпадку эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтва) даччынага таварыства з-за віны асноўнага таварыства (суполкі) апошняе нясе субсідыярную адказнасць па яго даўгах.

3. Удзельнікі (акцыянеры) даччынага таварыства маюць права патрабаваць пакрыцця асноўным таварыствам (суполкай) страт, прычыненых з-за яго віны даччынаму таварыству, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам аб гаспадарчых таварыствах.

Артыкул 106. Залежнае гаспадарчае таварыства

1. Гаспадарчае таварыства прызнаецца залежным, калі іншае гаспадарчае таварыства мае долю ў статутным фондзе (акцыі) гэтага таварыства ў памеры, які адпавядае дваццаці і больш працэнтам галасоў ад агульнай колькасці галасоў, якімі яна можа карыстацца на агульным сходзе ўдзельнікаў такога таварыства.

2. Межы ўзаемнага ўдзелу гаспадарчых таварыстваў у статутных фондах адно аднаго і колькасць галасоў, якімі адно з такіх таварыстваў можа карыстацца на агульным сходзе ўдзельнікаў ці акцыянераў іншага таварыства, вызначаюцца заканадаўчымі актамі.

§ 3. Вытворчыя кааператывы

Артыкул 107. Паняцце вытворчага кааператыва

1. Вытворчым кааператывам (арцеллю) прызнаецца камерцыйная арганізацыя, удзельнікі якой абавязаны ўнесці маёмасны паявы ўзнос, прымаць асабісты працоўны ўдзел у яго дзейнасці і несці субсідыярную адказнасць па

абавязацельствах вытворчага кааператыва ў роўных долях, калі іншае не вызначана ў статуце, у межах, устаноўленых статутам, але не менш за велічыню атрыманага гадавога даходу ў вытворчым кааператыве.

2. Фірменнае найменне кааператыва павінна ўтрымліваць яго найменне і словы «вытворчы кааператыў» ці слова «арцель».

3. Прававое становішча вытворчых кааператываў, правы і абавязкі іх членаў вызначаюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб вытворчых кааператывах.

Артыкул 108. Стварэнне вытворчых кааператываў

1. Устаноўчым дакументам вытворчага кааператыва з'яўляецца статут, які зацвярджаецца агульным сходам яго членаў.

2. Статут кааператыва павінен утрымліваць апрача звестак, указаных у пункце 2 артыкула 48 гэтага Кодэкса, умовы аб памеры статутнага фонду, аб памеры паявых узносаў членаў кааператыва; аб складзе і парадку ўнясення паявых узносаў членамі кааператыва і іх адказнасці за парушэнне абавязацельства па ўнясенні паявых узносаў; аб характары і парадку працоўнага ўдзелу яго членаў у дзейнасці кааператыва і іх адказнасці за парушэнне абавязацельства па асабістым працоўным удзеле; аб парадку размеркавання прыбытку і страт кааператыва; аб памеры і ўмовах субсідыярнай адказнасці яго членаў па даўгах кааператыва; аб складзе і кампетэнцыі органаў кіравання кааператывам і парадку прыняцця імі рашэнняў, у тым ліку па пытаннях, рашэнні па якіх прымаюцца аднагалосна ці кваліфікаванай большасцю галасоў.

3. Колькасць членаў кааператыва не павінна быць меншай за тры.

Артыкул 109. Маёмасць вытворчага кааператыва

1. Маёмасць, якая знаходзіцца ва ўласнасці вытворчага кааператыва, дзеліцца на паі яго членаў у адпаведнасці са статутам кааператыва.

Статутам кааператыва можа быць устаноўлена, што пэўная частка прыналежнай кааператыву маёмасці складае непадзельныя фонды, якія выкарыстоўваюцца на мэты, што вызначаюцца статутам.

Рашэнне аб стварэнні непадзельных фондаў прымаецца членамі кааператыва аднагалосна, калі іншае не прадугледжана статутам кааператыва.

2. Выключаны.

3. Прыбытак кааператыва размяркоўваецца паміж яго членамі ў адпаведнасці з іх працоўным удзелам, калі іншы парадак не прадугледжаны статутам кааператыва.

У такім жа парадку размяркоўваецца маёмасць, якая засталася пасля ліквідацыі кааператыва і задавальнення патрабаванняў яго крэдытораў.

Артыкул 110. Кіраванне ў вытворчым кааператыве

1. Найвышэйшым органам кіравання кааператывам з'яўляецца агульны сход яго членаў.

Выканаўчымі органамі кааператыва з'яўляюцца праўленне і (ці) яго старшыня. Яны ажыццяўляюць бягучае кіраўніцтва дзейнасцю кааператыва і падсправаздачныя наглядальнаму савету і агульнаму сходу членаў кааператыва.

Членамі наглядальнага савета і праўлення кааператыва, а таксама старшынёй кааператыва могуць быць толькі члены кааператыва. Член кааператыва не можа адначасова быць членам наглядальнага савета і членам праўлення або старшынёй кааператыва.

2. Кампетэнцыя органаў кіравання кааператывам і парадак прыняцця імі рашэнняў вызначаюцца заканадаўствам і статутам кааператыва.

3. Да выключнай кампетэнцыі агульнага сходу членаў кааператыва адносяцца:

1) змяненне статута кааператыва;

2) стварэнне наглядальнага савета і спыненне паўнамоцтваў яго членаў, а таксама стварэнне і спыненне паўнамоцтваў выканаўчых органаў кааператыва, калі гэта права па статуце кааператыва не перададзена яго наглядальнаму савету;

3) прыём і выключэнне членаў кааператыва;

4) зацвярджэнне гадавых справаздач і гадавой бухгалтарскай (фінансавай) справаздачнасці кааператыва (даных кнігі ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання) і размеркаванне яго прыбытку і страт;

5) рашэнне аб рэарганізацыі і ліквідацыі кааператыва.

Заканадаўствам аб вытворчых кааператывах і статутам кааператыва да выключнай кампетэнцыі агульнага сходу можа быць таксама аднесена рашэнне іншых пытанняў.

Пытанні, аднесеныя да выключнай кампетэнцыі агульнага сходу ці наглядальнага савету кааператыва, не могуць быць перададзены імі на рашэнне выканаўчых органаў кааператыва.

4. Член кааператыва мае адзін голас пры прыняцці рашэнняў агульным сходам.

Артыкул 111. Спыненне членства ў вытворчым кааператыве і пераход паю

1. Член кааператыва мае права паводле свайго меркавання выйсці з кааператыва. У гэтым выпадку яму павінен быць выплачаны кошт паю ці выдадзена маёмасць, якая адпавядае яго паю, а таксама ажыццёўлены іншыя выплаты, прадугледжаныя статутам кааператыва.

Выплата кошту паю ці выдача іншай маёмасці члену кааператыва, які выходзіць з яго, праводзіцца пасля заканчэння фінансавага года і пасля зацвярджэння гадавой бухгалтарскай (фінансавай) справаздачнасці кааператыва, калі іншае не прадугледжана статутам кааператыва. Выплата кошту паю ці выдача іншай маёмасці члену, які выходзіць са складу вытворчага кааператыва, што выкарыстоўвае спрошчаную сістэму падаткаабкладання без вядзення бухгалтарскага ўліку, праводзяцца пасля заканчэння фінансавага года без зацвярджэння гадавой бухгалтарскай (фінансавай) справаздачнасці гэтага кааператыва.

2. Член кааператыва можа быць выключаны з кааператыва паводле рашэння агульнага сходу ў выпадку невыканання ці неналежнага выканання абавязкаў, ускладзеных на яго статутам кааператыва, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам аб вытворчых кааператывах і статутам кааператыва.

Член наглядальнага савета ці выканаўчага органа можа быць выключаны з кааператыва паводле рашэння агульнага сходу ў сувязі з яго членствам у аналагічным кааператыве.

Член кааператыва, выключаны з яго, мае права на атрыманне паю і іншых выплат, прадугледжаных статутам кааператыва, у адпаведнасці з пунктам 1 гэтага артыкула.

3. Член кааператыва мае права перадаць свой пай ці яго частку іншаму члену кааператыва, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам і статутам кааператыва.

Перадача паю (яго часткі) грамадзяніну, які не з'яўляецца членам кааператыва, дапускаецца толькі са згоды кааператыва. У гэтым выпадку іншыя члены кааператыва карыстаюцца пераважным правам куплі такога паю (яго часткі).

4. У выпадку смерці члена вытворчага кааператыва яго спадчыннікі могуць быць прыняты ў члены кааператыва, калі іншае не прадугледжана статутам кааператыва. У адваротным выпадку кааператыў выплачвае спадчыннікам кошт паю памерлага члена кааператыва.

5. Накіраванне спагнання на пай члена вытворчага кааператыва па ўласных даўгах члена кааператыва дапускаецца пры недахопе іншай яго маёмасці для пакрыцця такіх даўгоў у парадку, прадугледжаным заканадаўствам і статутам кааператыва. Спагнанне па даўгах члена кааператыва не можа быць звернута на непадзельныя фонды кааператыва.

Артыкул 112. Рэарганізацыя і ліквідацыя вытворчых кааператываў

1. Вытворчы кааператыў можа быць добраахвотна рэарганізаваны ці ліквідаваны паводле рашэння агульнага сходу яго членаў.

Іншыя падставы і парадак рэарганізацыі і ліквідацыі кааператыва вызначаюцца заканадаўствам.

2. Вытворчы кааператыў па аднагалосным рашэнні яго членаў можа пераўтварыцца ў гаспадарчае таварыства ці суполку ў выпадку, калі ў складзе кааператыва засталося менш за тры члены, а таксама ва ўнітарнае прадпрыемства ў выпадку, калі ў складзе кааператыва застаўся адзін член.

§ 4. Унітарныя прадпрыемствы

Артыкул 113. Унітарнае прадпрыемства

1. Унітарным прадпрыемствам прызнаецца камерцыйная арганізацыя, не надзеленая правам уласнасці на замацаваную за ёй уласнікам маёмасць. Маёмасць унітарнага прадпрыемства з'яўляецца непадзельнай і не можа быць размеркавана па ўкладах (долях, паях), у тым ліку паміж работнікамі прадпрыемства.

Унітарнае прадпрыемства ствараецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства шляхам яго заснавання ці рэарганізацыі юрыдычных асоб.

2. Устаноўчым дакументам унітарнага прадпрыемства з'яўляецца статут.

Статут унітарнага прадпрыемства павінен утрымліваць, апрача звестак, указаных у пункте 2 артыкула 48 гэтага Кодэкса, звесткі аб памеры статутнага фонду прадпрыемства, парадку і крыніцах яго фарміравання.

У форме ўнітарных прадпрыемстваў могуць быць створаны дзяржаўныя (рэспубліканскія ці камунальныя) унітарныя прадпрыемствы або прыватныя ўнітарныя прадпрыемствы.

Маёмасць рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства знаходзіцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь і належыць такому прадпрыемству на праве гаспадарчага распараджэння ці аператыўнага кіравання.

Маёмасць камунальнага ўнітарнага прадпрыемства знаходзіцца ва ўласнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі і належыць такому прадпрыемству на праве гаспадарчага распараджэння.

Маёмасць прыватнага ўнітарнага прадпрыемства знаходзіцца ў прыватнай уласнасці фізічнай асобы (сумеснай уласнасці сужэнцаў) або юрыдычнай асобы і належыць такому прадпрыемству на праве гаспадарчага распараджэння.

Маёмасць даччынага ўнітарнага прадпрыемства знаходзіцца ва ўласнасці ўласніка маёмасці прадпрыемства-заснавальніка і належыць даччынаму прадпрыемству на праве гаспадарчага вядзення.

3. Фірменнае найменне ўнітарнага прадпрыемства павінна ўтрымліваць указанне на форму ўласнасці, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі. Фірменнае найменне даччынага прадпрыемства таксама павінна ўтрымліваць слова «даччынае».

4. Органам унітарнага прадпрыемства з'яўляецца кіраўнік, які прызначаецца ўласнікам маёмасці і яму падсправаздачны. Уласнік маёмасці ўнітарнага прадпрыемства – фізічная асоба мае права непасрэдна ажыццяўляць функцыі кіраўніка.

Паўнамоцтвы кіраўніка ўнітарнага прадпрыемства паводле рашэння ўласніка маёмасці могуць быць перададзены паводле дагавора іншай камерцыйнай арганізацыі (кіруючай арганізацыі) або індывідуальнаму прадпрымальніку (кіраўніку).

У статутах юрыдычных асоб, якія заснавалі ўнітарныя прадпрыемствы, можа быць устаноўлены парадак прызначэння кіраўнікоў такіх прадпрыемстваў.

5. Ад імя Рэспублікі Беларусь права ўласніка маёмасці рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляюць:

Урад Рэспублікі Беларусь, а таксама ў межах, устаноўленых заканадаўствам, рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя дзяржаўныя органы і арганізацыі, упаўнаважаныя кіраваць маёмасцю, якая знаходзіцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь, – у адносінах да рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства, заснаванага на праве гаспадарчага распараджэння;

Урад Рэспублікі Беларусь, а таксама ў межах, устаноўленых заканадаўствам, рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя дзяржаўныя органы – у адносінах да казённага прадпрыемства.

Ад імя адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі права ўласніка маёмасці камунальнага ўнітарнага прадпрыемства, заснаванага на праве гаспадарчага распараджэння, ажыццяўляюць адпаведныя органы мясцовага кіравання і самакіравання, а таксама ў межах, устаноўленых заканадаўствам, упаўнаважаныя імі дзяржаўныя арганізацыі.

Уласнік маёмасці прыватнага ўнітарнага прадпрыемства свае паўнамоцтвы ажыццяўляе непасрэдна і (ці) праз упаўнаважаных ім асоб.

6. Уласнік маёмасці ўнітарнага прадпрыемства, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, гэтым Кодэксам ці рашэннем уласніка, прынятым у адносінах да даччынага прадпрыемства:

прымае рашэнне аб стварэнні ўнітарнага прадпрыемства;

вызначае мэты дзейнасці ўнітарнага прадпрыемства, дае пісьмовую згоду на ўдзел унітарнага прадпрыемства ў камерцыйных і некамерцыйных арганізацыях, у тым ліку дзяржаўных аб'яднаннях;

зацвярджае статут унітарнага прадпрыемства і змяненні і (ці) дапаўненні, якія ўносяцца ў яго;

фарміруе статутны фонд унітарнага прадпрыемства, прымае рашэнне аб яго змяненні;

прызначае на пасаду кіраўніка ўнітарнага прадпрыемства, заключае, змяняе і спыняе з ім працоўны дагавор (кантракт) ці грамадзянска-прававы дагавор у адпаведнасці з заканадаўствам, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам;

прымае рашэнне аб адабранні маёмасці ва ўнітарнага прадпрыемства ў парадку і выпадках, прадугледжаных заканадаўствам або статутам;

кантралюе дзейнасць унітарнага прадпрыемства, выкарыстанне па прызначэнні і захаванасць маёмасці, прыналежнай унітарнаму прадпрыемству;

дае пісьмовую згоду на стварэнне, рэарганізацыю і ліквідацыю даччыных прадпрыемстваў, стварэнне і ліквідацыю прадстаўніцтваў і філіялаў;

прымае рашэнне аб рэарганізацыі ці ліквідацыі ўнітарнага прадпрыемства ў адпаведнасці з заканадаўствам;

мае іншыя правы і нясе іншыя абавязкі ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам, іншымі заканадаўчымі актамі і статутам.

7. На момант ажыццяўлення дзяржаўнай рэгістрацыі ўнітарнага прадпрыемства яго статутны фонд павінен быць поўнасцю сфарміраваны ўласнікам маёмасці прадпрыемства, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі.

У выпадку прыняцця заснавальнікам унітарнага прадпрыемства рашэння аб змяншэнні статутнага фонду ўнітарнае прадпрыемства абавязана пісьмова паведаміць аб гэтым сваім крэдыторам. Крэдытор унітарнага прадпрыемства мае права запатрабаваць спынення ці датэрміновага выканання абавязацельства, даўжніком па якім з'яўляецца гэта прадпрыемства, і пакрыцця страт.

8. Унітарнае прадпрыемства адказвае па сваіх абавязацельствах усёй прыналежнай яму маёмасцю.

Унітарнае прадпрыемства не нясе адказнасці па абавязацельствах уласніка яго маёмасці, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

9. Долевая ўласнасць на маёмасць унітарнага прадпрыемства не дапускаецца.

У выпадку падзелу маёмасці, якая знаходзіцца ў сумеснай уласнасці сужэнцаў, а таксама пераходу права ўласнасці на маёмасць унітарнага прадпрыемства ў парадку атрымання ў спадчыну, праваперaемства або іншымі спосабамі, якія не супярэчаць заканадаўству, да дзвюх і болей асоб:

унітарнае прадпрыемства можа быць рэарганізавана шляхам раздзялення (вылучэння) або пераўтварэння ў гаспадарчае таварыства ці суполку, а таксама ў вытворчы кааператыў у парадку, устаноўленым заканадаўствам і пагадненнем бакоў;

прадпрыемства ў цэлым як маёмасны комплекс можа быць прададзена асобе, якая не з'яўляецца ўдзельнікам долевай уласнасці на маёмасць унітарнага прадпрыемства;

маёмасць унітарнага прадпрыемства пераходзіць ва ўласнасць адной юрыдычнай ці фізічнай асобы з выплатай іншым асобам кампенсацыі адпаведна іх долі ў агульнай уласнасці, вызначанай па правілах, устаноўленых для маёмасці, у адносінах да якой долевая ўласнасць дапускаецца;

унітарнае прадпрыемства падлягае ліквідацыі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, калі рэарганізацыя ці пераход маёмасці ва ўласнасць адной асобы супярэчаць заканадаўству або немагчымыя з-за іншых прычын.

10. Пры рэарганізацыі дзяржаўных унітарных прадпрыемстваў прадугледжаныя гэтым Кодэксам палажэнні аб рэарганізацыі юрыдычных асоб прымяняюцца, калі заканадаўствам аб прыватызацыі не прадугледжана іншае.

Артыкул 114. Унітарнае прадпрыемства, заснаванае на праве гаспадарчага распараджэння

1. Унітарнае прадпрыемства, заснаванае на праве гаспадарчага распараджэння, засноўваецца паводле рашэння ўласніка яго маёмасці, унітарнага прадпрыемства, заснаванага на праве гаспадарчага распараджэння, іншых суб'ектаў грамадзянскага права.

2. Статут унітарнага прадпрыемства, заснаванага на праве гаспадарчага распараджэння, зацвярджае заснавальнік унітарнага прадпрыемства.

3. Унітарнае прадпрыемства, заснаванае на праве гаспадарчага распараджэння, можа са згоды ўласніка маёмасці стварыць у якасці юрыдычнай асобы іншае ўнітарнае прадпрыемства шляхам перадачы яму ва ўстаноўленым парадку часткі сваёй маёмасці ў гаспадарчае распараджэнне (даччынае прадпрыемства). Даччынае прадпрыемства не мае права ствараць унітарныя прадпрыемствы. Іншы парадак стварэння даччынага прадпрыемства можа быць вызначаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнік зацвярджае статут даччынага прадпрыемства, прызначае яго кіраўніка, ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з рашэннем уласніка маёмасці.

4. Уласнік маёмасці ўнітарнага прадпрыемства, заснаванага на праве гаспадарчага распараджэння, не адказвае па абавязацельствах прадпрыемства, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктам 3 артыкула 52 гэтага Кодэкса.

Артыкул 115. Унітарнае прадпрыемства, заснаванае на праве аператыўнага кіравання (казённае прадпрыемства)

1. Унітарнае прадпрыемства, заснаванае на праве аператыўнага кіравання (казённае прадпрыемства), засноўваецца, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, паводле рашэння Урада Рэспублікі Беларусь на базе маёмасці, якая знаходзіцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь.

2. Статут казённага прадпрыемства зацвярджае Урад Рэспублікі Беларусь.

3. Фірменнае найменне прадпрыемства, заснаванага на праве аператыўнага кіравання, павінна ўтрымліваць указанне на тое, што прадпрыемства з'яўляецца казённым.

4. Правы казённага прадпрыемства на замацаваную за ім маёмасць вызначаюцца ў адпаведнасці з артыкуламі 277 і 278 гэтага Кодэкса.

5. Рэспубліка Беларусь нясе субсідыярную адказнасць па абавязацельствах казённага прадпрыемства пры недастатковасці яго маёмасці.

§ 4[1]. Сялянскія (фермерскія) гаспадаркі

Артыкул 115[1]. Сялянская (фермерская) гаспадарка

1. Сялянскай (фермерскай) гаспадаркай прызнаецца камерцыйная арганізацыя, створаная адным грамадзянінам (членамі адной сям'і), які ўнёс (унеслі) маёмасныя ўклады, для ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці па вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, а таксама па яе перапрацоўцы, захоўванні, транспарціроўцы і рэалізацыі, заснаванай на яго (іх) асабістым працоўным удзеле і выкарыстанні зямельнага ўчастка, дадзенага для гэтых мэт у адпаведнасці з заканадаўствам аб ахове і выкарыстанні зямель.

Для мэт гэтага параграфа членамі сям'і прызнаюцца сужэнцы, іх бацькі (усынавіцелі), дзеці (у тым ліку ўсыноўленыя), браты і сёстры, сужэнцы і дзеці ўказаных асоб, а таксама іншыя асобы, прызнаныя членамі сям'і ў адпаведнасці з заканадаўствам аб шлюбе і сям'і.

2. Сялянская (фермерская) гаспадарка адказвае па сваіх абавязацельствах усёй прыналежнай ёй маёмасцю.

Члены сялянскай (фермерскай) гаспадаркі не адказваюць па абавязацельствах сялянскай (фермерскай) гаспадаркі, а сялянская (фермерская) гаспадарка не адказвае па абавязацельствах членаў сялянскай (фермерскай) гаспадаркі, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам.

3. Прававое становішча сялянскай (фермерскай) гаспадаркі вызначаецца гэтым Кодэксам і заканадаўствам аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы.

Артыкул 115[2]. Маёмасць сялянскай (фермерскай) гаспадаркі

Маёмасць сялянскай (фермерскай) гаспадаркі належыць ёй на праве ўласнасці. У склад маёмасці сялянскай (фермерскай) гаспадаркі ўваходзяць маёмасць, перададзеная ў якасці ўкладу ў статутны фонд сялянскай (фермерскай) гаспадаркі яе заснавальнікамі (членамі), а таксама маёмасць, вырабленая і набытая сялянскай (фермерскай) гаспадаркай у працэсе яе дзейнасці.

§ 5. Некамерцыйныя арганізацыі

Артыкул 116. Спажывецкі кааператыў

1. Спажывецкім кааператывам прызнаецца добраахвотнае аб'яднанне грамадзян або грамадзян і юрыдычных асоб на падставе членства з мэтай задавальнення матэрыяльных (маёмасных) і іншых патрэбнасцей удзельнікаў, якое ажыццяўляецца шляхам аб'яднання яго членамі маёмасных паявых узносаў.

2. Статут спажывецкага кааператыва павінен утрымліваць апрача звестак, указаных у пункце 2 артыкула 48 гэтага Кодэкса, умовы і парадак прыёму ў члены кааператыва і спынення членства ў ім; правы і абавязкі членаў кааператыва; умовы аб памеры паявых узносаў членаў кааператыва; аб складзе і парадку ўнясення паявых узносаў членамі кааператыва і аб іх адказнасці за парушэнне абавязацельства па ўнясенні паявых узносаў; аб складзе і кампетэнцыі органаў кіравання кааператывам і парадку прыняцця імі рашэнняў, у тым ліку па пытаннях, рашэнні па якіх прымаюцца аднагалосна ці кваліфікаванай большасцю галасоў, аб парадку пакрыцця членамі кааператыва панесеных ім страт.

3. Найменне спажывецкага кааператыва павінна ўтрымліваць указанне на асноўную мэту яго дзейнасці, а таксама слова «кааператыў» ці словы «спажывецкі саюз» або «спажывецкае таварыства».

4. Члены спажывецкага кааператыва абавязаны на працягу трох месяцаў пасля зацвярджэння гадавой бухгалтарскай (фінансавай) справаздачнасці (пры вядзенні ўліку ў кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання, – на працягу трох месяцаў з дня заканчэння фінансавага года) пакрыць страты, якія ўтварыліся, шляхам дадатковых узносаў. У выпадку невыканання гэтага абавязку кааператыў можа быць ліквідаваны ў судовым парадку па патрабаванні крэдыторaў.

Члены спажывецкага кааператыва нясуць субсідыярную адказнасць па яго абавязацельствах у межах няўнесенай часткі дадатковага ўзносу кожнага з членаў кааператыва.

5. Даходы і прыбытак, атрыманыя спажывецкім кааператывам, не могуць размяркоўвацца паміж яго членамі.

6. Прававое становішча спажывецкай кааперацыі (спажывецкіх таварыстваў, іх саюзаў) вызначаецца гэтым Кодэксам і іншым заканадаўствам аб спажывецкай кааперацыі.

Прававое становішча іншых спажывецкіх кааператываў (жыллёвых, жыллёва-будаўнічых кааператываў, гаражных кааператываў і інш.) вызначаецца гэтым Кодэксам і іншым заканадаўствам.

Артыкул 117. Грамадскія і рэлігійныя арганізацыі (аб'яднанні)

1. Грамадскімі і рэлігійнымі арганізацыямі (аб'яднаннямі) прызнаюцца добраахвотныя аб'яднанні грамадзян, якія ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку аб'ядналіся на падставе агульнасці іх інтарэсаў для задавальнення духоўных ці іншых нематэрыяльных патрэбнасцей.

Грамадскія і рэлігійныя арганізацыі з'яўляюцца некамерцыйнымі арганізацыямі. Яны маюць права ажыццяўляць прадпрымальніцкую дзейнасць толькі для дасягнення мэт, дзеля якіх яны створаны, і адпаведную гэтым мэтам.

2. Удзельнікі (члены) грамадскіх і рэлігійных арганізацый не захоўваюць правоў на перададзеную імі гэтым арганізацыям ва ўласнасць маёмасць, у тым ліку на членскія ўзносы. Яны не адказваюць па абавязацельствах грамадскіх і рэлігійных арганізацый, у якіх удзельнічаюць у якасці іх членаў, а ўказаныя арганізацыі не адказваюць па абавязацельствах сваіх членаў.

3. Асаблівасці прававога становішча грамадскіх і рэлігійных арганізацый як удзельнікаў грамадзянскіх адносін вызначаюцца заканадаўствам.

Артыкул 117[1]. Рэспубліканскія дзяржаўна-грамадскія аб'яднанні

1. Рэспубліканскімі дзяржаўна-грамадскімі аб'яднаннямі прызнаюцца заснаваныя на членстве некамерцыйныя арганізацыі, мэтай дзейнасці якіх з'яўляецца выкананне ўскладзеных на іх дзяржаўна значных задач.

2. Заснавальнікамі рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання і яго членамі могуць з'яўляцца фізічныя і юрыдычныя асобы, а таксама Рэспубліка Беларусь у асобе ўпаўнаважаных дзяржаўных органаў і юрыдычных асоб, якія дзейнічаюць ад яе імя.

3. Статут рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання прымаецца яго заснавальнікамі або найвышэйшым органам гэтага аб'яднання і зацвярджаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь або па яго даручэнні Урадам Рэспублікі Беларусь.

4. Рэспубліканскае дзяржаўна-грамадскае аб'яднанне ствараецца паводле рашэння заснавальнікаў або ў выніку рэарганізацыі існуючай некамерцыйнай арганізацыі ў форме грамадскага аб'яднання на ўмовах, якія вызначае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь або па яго даручэнні Урад Рэспублікі Беларусь.

5. Рэспубліканскае дзяржаўна-грамадскае аб'яднанне можа ва ўстаноўленым парадку ствараць свае арганізацыйныя структуры, у тым ліку ў выглядзе юрыдычных асоб, а таксама ствараць іншыя юрыдычныя асобы ці ўдзельнічаць у іх у адпаведнасці са статутам рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання і іншым заканадаўствам.

6. Прававое становішча рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадскіх аб'яднанняў вызначае гэты Кодэкс і іншае заканадаўства аб рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадскіх аб'яднаннях.

Артыкул 118. Фонды

1. Пад фондам для мэт гэтага Кодэкса разумеецца некамерцыйная арганізацыя, якая не мае членства, заснаваная грамадзянамі (грамадзянінам) і (ці) юрыдычнымі асобамі (юрыдычнай асобай) на падставе добраахвотных маёмасных узносаў, мае сацыяльныя, дабрачынныя, культурныя, адукацыйныя, мэты, якія садзейнічаюць развіццю фізкультуры і спорту, навуковыя ці іншыя калектыўна карысныя мэты, указаныя ў статуце фонду.

Найменне фонду павінна ўтрымліваць слова «фонд» і ўказанне на характар дзейнасці і від фонду.

Маёмасць, якая перадаецца фонду яго заснавальнікамі (заснавальнікам), павінна належаць заснавальнікам (заснавальніку) на праве ўласнасці (праве гаспадарчага распараджэння, аператыўнага кіравання), быць неабходнай і прыдатнай для выкарыстання ў дзейнасці фонду.

Крыніцамі фарміравання маёмасці фонду з'яўляюцца маёмасць, якая перадаецца фонду яго заснавальнікамі (заснавальнікам), паступленні ад мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў адпаведнасці са статутам фонду, даходы, якія атрымліваюцца ад прадпрымальніцкай дзейнасці, што ажыццяўляецца ў адпаведнасці са статутам, і іншыя не забароненыя заканадаўствам паступленні.

Маёмасць, перададзеная фонду яго заснавальнікамі (заснавальнікам), з'яўляецца ўласнасцю фонду. Заснавальнікі (заснавальнік) фонду не адказваюць па абавязацельствах створанага фонду, а фонд не адказвае па абавязацельствах сваіх заснавальнікаў (заснавальніка).

Правілы, якія дзейнічаюць у адносінах да стварэння, дзейнасці, рэарганізацыі і ліквідацыі фондаў, устаноўленыя гэтым Кодэксам, не распаўсюджваюцца на фонды, створаныя ці якія ствараюцца паводле рашэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Парламента Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, калі ў актах заканадаўства аб стварэнні такіх фондаў не ўстаноўлена іншае.

2. Фонд выкарыстоўвае маёмасць для мэт, вызначаных яго статутам.

Для ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці фонды маюць права ствараць унітарныя прадпрыемствы, гаспадарчыя суполкі ці ўдзельнічаць у іх, за выключэннем таварыстваў з дадатковай адказнасцю.

Фонд абавязаны штогадова публікаваць справаздачы аб выкарыстанні сваёй маёмасці. Парадак апублікавання і склад звестак справаздачы ўстанаўлівае заканадаўства.

3. Органамі фонду з'яўляюцца праўленне (савет), дырэкцыя (дырэктар) і папячыцельскі савет.

Статут фонду можа прадугледжваць іншыя органы, неабходныя для ажыццяўлення яго дзейнасці.

Праўленне (савет) фонду з'яўляецца найвышэйшым калегіяльным органам фонду, які фарміруюць яго заснавальнікі (заснавальнік). Асноўная функцыя праўлення (савета) фонду – забеспячэнне прытрымлівання фондам мэт, для дасягнення якіх ён створаны.

Да выключнай кампетэнцыі праўлення (савета) фонду адносяцца:

змяненне і (ці) дапаўненне статута фонду;

стварэнне (прызначэнне) выканаўчага органа фонду – дырэкцыі (дырэктара) і датэрміновае спыненне яго паўнамоцтваў;

стварэнне і ліквідацыя прадстаўніцтваў, філіялаў фонду, вызначэнне іх кампетэнцыі;

зацвярджэнне гадавой справаздачы і гадавой бухгалтарскай (фінансавай) справаздачнасці фонду (даных кнігі ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання);

рэарганізацыя фонду, калі магчымасць рэарганізацыі прадугледжана яго статутам.

Дырэкцыя (дырэктар) фонду з'яўляецца выканаўчым органам фонду, які ажыццяўляе бягучае кіраўніцтва яго дзейнасцю. Дырэкцыя (дырэктар) фонду ў сваёй дзейнасці падсправаздачны праўленню (савету) фонду.

Папячыцельскі савет фонду – орган, які ажыццяўляе кантроль за дзейнасцю фонду, фарміруецца яго заснавальнікамі (заснавальнікам) пры заснаванні фонду, а ў далейшым, калі гэта прадугледжана статутам фонду, – праўленнем (саветам) фонду.

Да выключнай кампетэнцыі папячыцельскага савета фонду адносяцца:

кантроль за адпаведнасцю дзейнасці фонду заканадаўству і статуту фонду;

кантроль за выкананнем рашэнняў найвышэйшага калегіяльнага органа фонду, выканаўчага органа фонду;

кантроль за выкарыстаннем грашовых сродкаў і іншай маёмасці фонду ў адпаведнасці з яго статутнымі мэтамі;

папярэдні разгляд і ўзгадненне гадавой справаздачы фонду.

4. Фонд дзейнічае на падставе статута, які зацвярджаюць заснавальнікі (заснавальнік) фонду.

Статут фонду апрача звестак, указаных у пункте 2 артыкула 48 гэтага Кодэкса, павінен утрымліваць:

звесткі аб заснавальніках (заснавальніку) фонду;

задачы і метады дзейнасці фонду;

склад і парадак фарміравання органаў фонду;

парадак фарміравання, паўнамоцтвы і тэрміны паўнамоцтваў папячыцельскага савета фонду;

парадак прызначэння і вызвалення службовых асоб фонду;

парадак унясення змяненняў і (ці) дапаўненняў у статут фонду;

крыніцы і парадак фарміравання маёмасці фонду;

тэрмін, на які ствараецца фонд, ці ўказанне на яго бестэрміновую дзейнасць;

звесткі аб створаных фондам прадстаўніцтвах і (ці) філіялах, якія ўключаюць найменні прадстаўніцтваў, філіялаў і месца іх знаходжання (кіруючых органаў прадстаўніцтваў, філіялаў);

звесткі аб лёсе маёмасці фонду ў выпадку яго ліквідацыі. Пры гэтым такая маёмасць павінна накіроўвацца на мэты, для дасягнення якіх быў створаны фонд;

іншыя палажэнні, прадугледжаныя заканадаўствам і якія не супярэчаць гэтаму Кодэксу.

5. Іншыя палажэнні, звязаныя са стварэннем, дзейнасцю, рэарганізацыяй і ліквідацыяй фонду, не прадугледжаныя гэтым артыкулам і артыкулам 119 гэтага Кодэкса, вызначаюцца заканадаўчымі актамі.

Артыкул 119. Змяненне статута, рэарганізацыя і ліквідацыя фонду

1. Статут фонду можа быць зменены праўленнем (саветам) фонду ў парадку, прадугледжаным статутам фонду.

Адпаведныя змяненні і (ці) дапаўненні ў статут фонду павінны быць унесены і пададзены ва ўстаноўленым парадку для дзяржаўнай рэгістрацыі ў месячны тэрмін у выпадку:

змянення мэт фонду;

змянення наймення фонду;

змянення віду фонду;

змянення месца знаходжання фонду (кіруючага органа фонду);

стварэння ці ліквідацыі прадстаўніцтваў і (ці) філіялаў фонду;

змянення звестак аб органах фонду, у тым ліку аб папячыцельскім савеце, парадку прызначэння і вызвалення службовых асоб фонду, парадку фарміравання маёмасці фонду, а таксама аб іншых фактычных абставінах, звесткі аб якіх у адпаведнасці з заканадаўствам павінны ўтрымлівацца ў статуце фонду;

змянення заканадаўства, у адпаведнасці з якім патрабуецца ўнясенне змяненняў і (ці) дапаўненняў у статут фонду, калі іншыя тэрміны не ўстаноўлены гэтым заканадаўствам.

2. Рэарганізацыя фонду, калі яе магчымасць прадугледжана статутам фонду, можа быць ажыццёўлена ў форме:

зліцця з іншым фондам;

далучэння да іншага фонду;

далучэння да яго іншага фонду;

вылучэння з фонду юрыдычнай асобы любой арганізацыйна-прававой формы;

раздзялення на два і больш фондаў.

Фонд не можа быць рэарганізаваны ў форме пераўтварэння.

Кошт астатняй маёмасці рэарганізаванага ў форме вылучэння фонду павінны быць не меншым за мінімальны памер, неабходны для стварэння і дзейнасці фонду.

3. Фонд можа быць ліквідаваны па заяве зацікаўленых асоб паводле рашэння суда:

у выпадку непадачы ў рэгіструючы орган на працягу трох месяцаў пасля дзяржаўнай рэгістрацыі фонду дакументаў аб перадачы заснавальнікамі (заснавальнікам) ва ўласнасць фонду маёмасці ў выглядзе неграшовых узносаў пры фарміраванні маёмасці фонду не менш за мінімальны памер, неабходны для стварэння і дзейнасці фонду, у поўным аб'ёме ці ў частцы ў выглядзе неграшовых узносаў;

у выпадку нездзяйснення абавязку па стварэнні ва ўстаноўлены тэрмін пасля дзяржаўнай рэгістрацыі фонду прадстаўніцтваў і (ці) філіялаў і непадачы для дзяржаўнай рэгістрацыі змяненняў і (ці) дапаўненняў, якія ўносяцца ў статут фонду ў сувязі са змяненнем яго віду;

калі пасля заканчэння каляндарнага года кошт маёмасці фонду стане меншы за мінімальны памер, неабходны для стварэння і дзейнасці фонду, і ва ўказаны рэгіструючым органам у пісьмовым папярэджанні тэрмін гэты кошт не даведзены да мінімальнага памеру, неабходнага для яго стварэння і дзейнасці;

калі мэты фонду не могуць быць дасягнуты, а неабходныя змяненні гэтых мэт не могуць быць праведзены;

у выпадку ўхілення фонду ў сваёй дзейнасці ад мэт, прадугледжаных статутам;

у выпадку ажыццяўлення дзейнасці, забароненай заканадаўствам, або дзейнасці з іншымі неаднаразовымі ці грубымі парушэннямі заканадаўства і статута фонду;

у іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

4. Маёмасць, якая засталася пасля ліквідацыі фонду, у тым ліку пасля задавальнення патрабаванняў крэдыторaў, накіроўваецца на мэты, для дасягнення якіх быў створаны фонд. У выпадку немагчымасці такога накіравання маёмасці яна перадаецца ў роўных долях фондам, створаным для дасягнення аналагічных мэт, пры наяўнасці іх пісьмовага звароту ў суд, які прыняў рашэнне аб ліквідацыі фонду.

У выпадку адсутнасці ўказаных зваротаў маёмасць, якая засталася пасля ліквідацыі фонду, перадаецца ў даход Рэспублікі Беларусь і накіроўваецца на мэты, для дасягнення якіх быў створаны фонд.

Артыкул 120. Установы

1. Установай прызнаецца арганізацыя, якую стварыў уласнік для ажыццяўлення кіраўніцкіх, сацыяльна-культурных ці іншых функцый некамерцыйнага характару і якую ён фінансуе поўнасцю ці часткова.

Правы ўстановы на замацаваную за ёй маёмасць вызначаюцца ў адпаведнасці з артыкулам 279 гэтага Кодэкса.

2. Установа адказвае па сваіх абавязацельствах грашовымі сродкамі, якія знаходзяцца ў яе распараджэнні. Пры іх недастатковасці субсідыярную адказнасць па яе абавязацельствах нясе ўласнік адпаведнай маёмасці.

3. Асаблівасці прававога становішча асобных відаў дзяржаўных і іншых устаноў вызначаюцца заканадаўствам.

Артыкул 121. Аб'яднанні юрыдычных асоб і (ці) індывідуальных прадпрымальнікаў (асацыяцыі і саюзы)

1. Камерцыйныя арганізацыі і (ці) індывідуальныя прадпрымальнікі, а таксама камерцыйныя і (ці) некамерцыйныя арганізацыі ў мэтах каардынацыі іх дзейнасці, прадстаўлення і абароны агульных інтарэсаў могуць ствараць аб'яднанні ў форме асацыяцый ці саюзаў, якія з'яўляюцца некамерцыйнымі арганізацыямі.

2. Калі паводле рашэння ўдзельнікаў на асацыяцыю (саюз) ускладаецца вядзенне прадпрымальніцкай дзейнасці, такая асацыяцыя (саюз) пераўтвараецца ў гаспадарчую суполку ці таварыства ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам, або можа займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю толькі пры дапамозе стварэння камерцыйных арганізацый і (ці) удзелу ў іх, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

3. Асацыяцыя (саюз) з'яўляецца юрыдычнай асобай.

Члены асацыяцыі (саюза) захоўваюць сваю самастойнасць і правы юрыдычнай асобы, індывідуальнага прадпрымальніка.

4. Асацыяцыя (саюз) не адказвае па абавязацельствах сваіх членаў. Члены асацыяцыі (саюза) нясуць субсідыярную адказнасць па яе абавязацельствах у памеры і парадку, прадугледжаных статутам асацыяцыі (саюза).

Артыкул 122. Устаноўчы дакумент асацыяцыі (саюза)

1. Устаноўчым дакументам асацыяцыі (саюза) з'яўляецца статут, зацверджаны яе членамі.

2. Статут асацыяцыі (саюза) павінен утрымліваць апрача звестак, указаных у пункце 2 артыкула 48 гэтага Кодэкса, парадак фарміравання маёмасці асацыяцыі (саюза), унясення змяненняў і (ці) дапаўненняў у статут асацыяцыі (саюза), умовы аб складзе і кампетэнцыі органаў кіравання асацыяцыяй (саюзам) і парадку прыняцця імі рашэнняў, у тым ліку па пытаннях, рашэнні па якіх прымаюцца аднагалосна ці кваліфікаванай большасцю галасоў членаў асацыяцыі (саюза), і аб парадку размеркавання маёмасці, якая застаецца пасля ліквідацыі асацыяцыі (саюза).

Артыкул 123. Правы і абавязкі членаў асацыяцый і саюзаў

1. Член асацыяцыі (саюза) мае права бязвыплатна карыстацца яе паслугамі.

2. Член асацыяцыі (саюза) мае права паводле свайго меркавання выйсці з асацыяцыі (саюза) у любы час. У гэтым выпадку ён нясе субсідыярную адказнасць па абавязацельствах асацыяцыі (саюза) прапарцыянальна свайму ўзносу на працягу двух гадоў з моманту выхаду, калі гэтыя абавязацельствы ўзніклі ў час яго членства ў асацыяцыі.

Член асацыяцыі (саюза) можа быць выключаны з яе паводле рашэння астатніх удзельнікаў у выпадках і парадку, устаноўленых статутам асацыяцыі (саюза). У адносінах да маёмаснага ўзносу і адказнасці выключанага члена асацыяцыі (саюза) прымяняюцца правілы, якія адносяцца да выхаду з асацыяцыі (саюза).

3. Са згоды членаў асацыяцыі (саюза) у яе можа ўвайсці новы ўдзельнік. Уступленне ў асацыяцыю (саюз) новага ўдзельніка можа быць абумоўлена яго субсідыярнай адказнасцю па абавязацельствах асацыяцыі (саюза), якія ўзніклі да яго ўступлення.

§ 6. Дзяржаўныя аб'яднанні

Артыкул 123[1]. Асноўныя палажэнні аб дзяржаўным аб'яднанні

1. Дзяржаўным аб'яднаннем (канцэрнам, вытворчым, навукова-вытворчым ці іншым аб'яднаннем) прызнаецца аб'яднанне дзяржаўных юрыдычных асоб, дзяржаўных і іншых юрыдычных асоб, а таксама дзяржаўных і іншых юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якое ствараецца паводле рашэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Урада Рэспублікі Беларусь, а таксама па яго даручэнні (дазволе) рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання або паводле рашэння органаў мясцовага кіравання і самакіравання.

2. Дзяржаўнае аб'яднанне ствараецца, як правіла, па галіновым прынцыпе ў мэтах ажыццяўлення агульнага кіраўніцтва, агульнага кіравання дзейнасцю, каардынацыі дзейнасці і прадстаўлення інтарэсаў юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ўваходзяць у склад аб'яднання.

3. Дзяржаўнае аб'яднанне знаходзіцца ў падпарадкаванні Урада Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання, органа мясцовага кіравання і самакіравання ці дзяржаўнай арганізацыі, якая выконвае асобныя функцыі рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання.

4. Дзяржаўныя аб'яднанні з'яўляюцца некамерцыйнымі арганізацыямі, за выключэннем выпадкаў прыняцця ў адпаведнасці з заканадаўствам рашэнняў аб прызнанні іх камерцыйнымі арганізацыямі.

5. Уласнік маёмасці дзяржаўнага аб'яднання не адказвае па абавязацельствах дзяржаўнага аб'яднання, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

6. Прававое становішча дзяржаўных аб'яднанняў, правы і абавязкі юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ўваходзяць у іх склад, вызначаюцца гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства аб такіх аб'яднаннях, а таксама іх статутамі.

Артыкул 123[2]. Удзельнікі дзяржаўнага аб'яднання

1. У склад дзяржаўнага аб'яднання могуць уваходзіць дзяржаўныя ўнітарныя прадпрыемствы і (ці) дзяржаўныя ўстановы паводле рашэння дзяржаўнага органа (службовай асобы), які прыняў рашэнне аб стварэнні дзяржаўнага аб'яднання, ці ўпаўнаважанага ім органа, а таксама іншыя арганізацыі, індывідуальныя

прадпрымальнікі добраахвотна на ўмовах і ў парадку, вызначаных статутам дзяржаўнага аб'яднання. Юрыдычныя асобы могуць уваходзіць у склад дзяржаўнага аб'яднання ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Рашэнне аб магчымасці ўваходжання ў склад дзяржаўнага аб'яднання індывідуальных прадпрымальнікаў і недзяржаўных юрыдычных асоб прымае дзяржаўны орган (службовая асоба), які прыняў рашэнне аб стварэнні дзяржаўнага аб'яднання, ці ўпаўнаважаны ім орган.

2. Удзельнікі дзяржаўных аб'яднанняў захоўваюць правы юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія могуць быць абмежаваны ці іншым чынам зменены ў адпаведнасці з заканадаўствам.

3. Дзяржаўныя ўнітарныя прадпрыемствы і дзяржаўныя ўстановы, якія ўваходзяць у склад дзяржаўнага аб'яднання паводле рашэння дзяржаўнага органа (службовай асобы), які прыняў рашэнне аб стварэнні дзяржаўнага аб'яднання, ці ўпаўнаважанага ім органа, могуць быць выключаны з яго складу паводле рашэння гэтага органа (службовай асобы).

Іншыя ўдзельнікі дзяржаўнага аб'яднання, якія ўваходзяць у яго склад добраахвотна, маюць права выйсці са складу дзяржаўнага аб'яднання ці могуць быць выключаны з гэтага складу ў парадку, устаноўленым статутам адпаведнага дзяржаўнага аб'яднання.

4. Рашэнні дзяржаўных аб'яднанняў па пытаннях, прадугледжаных статутамі дзяржаўных аб'яднанняў і актамі заканадаўства аб такіх аб'яднаннях, з'яўляюцца абавязковымі для іх удзельнікаў.

5. Дзяржаўнае аб'яднанне не адказвае па абавязацельствах яго ўдзельнікаў, а ўдзельнікі дзяржаўнага аб'яднання не адказваюць па абавязацельствах гэтага дзяржаўнага аб'яднання, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

Артыкул 123[3]. Маёмасць дзяржаўнага аб'яднання

1. Маёмасць дзяржаўнага аб'яднання знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці і належыць яму на праве гаспадарчага распараджэння або на праве аператыўнага кіравання. Дзяржаўным органам (службовай асобай), які прыняў рашэнне аб стварэнні дзяржаўнага аб'яднання, ці ўпаўнаважаным ім органам, а таксама статутам дзяржаўнага аб'яднання павінна быць вызначана, на якім праве належыць маёмасць дзяржаўнаму аб'яднанню.

2. Маёмасць удзельнікаў дзяржаўнага аб'яднання не ўваходзіць у склад маёмасці дзяржаўнага аб'яднання.

Артыкул 123[4]. Статут дзяржаўнага аб'яднання

1. Статут дзяржаўнага аб'яднання зацвярджаецца дзяржаўным органам (службовай асобай), які прыняў рашэнне аб яго стварэнні, або ўпаўнаважаным ім органам і з'яўляецца ўстаноўчым дакументам гэтага аб'яднання.

2. У статуце дзяржаўнага аб'яднання павінны быць вызначаны парадак і крыніцы фарміравання маёмасці дзяржаўнага аб'яднання.

3. У статуце дзяржаўнага аб'яднання, якое з'яўляецца камерцыйнай арганізацыяй, апрача звестак, указаных у пункте 2 артыкула 48 гэтага Кодэкса і пункце 2 гэтага артыкула, павінны ўтрымлівацца звесткі аб прадмеце дзейнасці дзяржаўнага аб'яднання.

ГЛАВА 5
УДЗЕЛ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ І АДМІНІСТРАЦЫЙНА-

ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫХ АДЗІНАК У АДНОСІНАХ, ЯКІЯ РЭГУЛЮЮЦЦА ГРАМАДЗЯНСКІМ ЗАКАНАДАЎСТВАМ

Артыкул 124. Рэспубліка Беларусь, адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі – суб'екты грамадзянскага права

1. Рэспубліка Беларусь, адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі ўдзельнічаюць у адносінах, якія рэгулююцца грамадзянскім заканадаўствам, на аднолькавых правах з іншымі ўдзельнікамі гэтых адносін – фізічнымі і юрыдычнымі асобамі.

2. Да суб'ектаў грамадзянскага права, указаных у пункце 1 гэтага артыкула, прымяняюцца нормы, якія вызначаюць удзел юрыдычных асоб у адносінах, што рэгулююцца грамадзянскім заканадаўствам, калі іншае не вынікае з заканадаўства ці асаблівасцей гэтых суб'ектаў.

Артыкул 125. Парадак удзелу Рэспублікі Беларусь і адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак у адносінах, якія рэгулююцца грамадзянскім заканадаўствам

1. Ад імя Рэспублікі Беларусь могуць сваімі дзеяннямі набываць і ажыццяўляць маёмасныя і асабістыя немаёмасныя правы і абавязкі, выступаць у судзе дзяржаўныя органы ў рамках іх кампетэнцыі, устаноўленай актамі, якія вызначаюць статус гэтых органаў.

2. Ад імя адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак могуць сваімі дзеяннямі набываць і ажыццяўляць правы і абавязкі, указаныя ў пункце 1 гэтага артыкула, органы мясцовага кіравання і самакіравання ў рамках іх кампетэнцыі, устаноўленай актамі, якія вызначаюць статус гэтых органаў.

3. У выпадках і парадку, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, ад імя Рэспублікі Беларусь і адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак па іх спецыяльным даручэнні могуць выступаць іншыя дзяржаўныя органы, не згаданыя ў гэтым артыкуле, а таксама юрыдычныя асобы і грамадзяне.

Артыкул 126. Адказнасць па абавязацельствах Рэспублікі Беларусь і адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак

1. Рэспубліка Беларусь, яе адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі адказваюць па сваіх абавязацельствах прыналежнай ім на праве ўласнасці маёмасцю, акрамя маёмасці, якая можа знаходзіцца толькі ў рэспубліканскай ці камунальнай уласнасці.

2. Рэспубліка Беларусь, яе адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі не адказваюць па абавязацельствах створаных імі юрыдычных асоб, акрамя выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

3. Рэспубліка Беларусь не адказвае па абавязацельствах адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак.

4. Адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі не адказваюць па абавязацельствах адна адной, а таксама па абавязацельствах Рэспублікі Беларусь.

5. Правілы пунктаў 2-4 гэтага артыкула не распаўсюджваюцца на выпадкі, калі Рэспубліка Беларусь прыняла на сябе гарантыю (паручыцельства) па абавязацельствах адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ці юрыдычнай асобы або ўказаныя суб'екты прынялі на сябе гарантыю (паручыцельства) па абавязацельствах Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 127. Асаблівасці адказнасці Рэспублікі Беларусь і адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак у адносінах, якія

рэгулююцца грамадзянскім заканадаўствам, з удзелам замежных юрыдычных асоб, грамадзян і дзяржаў

Асаблівасці адказнасці Рэспублікі Беларусь і адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак у адносінах, якія рэгулююцца грамадзянскім заканадаўствам, з удзелам замежных юрыдычных асоб, грамадзян і дзяржаў вызначаюцца заканадаўчымі актамі.

ПАДРАЗДЗЕЛ 3
АБ'ЕКТЫ ГРАМАДЗЯНСКІХ ПРАВОЎ

ГЛАВА 6
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 128. Віды аб'ектаў грамадзянскіх правоў

Да аб'ектаў грамадзянскіх правоў адносяцца:

рэчы, уключаючы грошы і каштоўныя паперы, іншая маёмасць, у тым ліку маёмасныя правы;

работы і паслугі;

нераскрытая інфармацыя;

выключныя правы на вынікі інтэлектуальнай дзейнасці і сродкі індывідуалізацыі ўдзельнікаў грамадзянскага абароту, тавараў, работ ці паслуг;

нематэрыяльныя даброты.

Артыкул 129. Абарачальная здольнасць аб'ектаў грамадзянскіх правоў

1. Аб'екты грамадзянскіх правоў могуць лёгка адчужацца ці пераходзіць ад адной асобы да іншай у парадку ўніверсальнага праваперaемства (успадкаванне, рэарганізацыя юрыдычнай асобы) або іншым спосабам, калі яны не зняты з абароту ці не абмежаваны ў абарачэнні.

2. Віды аб'ектаў грамадзянскіх правоў, знаходжанне якіх у абарачэнні не дапускаецца (аб'екты, знятыя з абароту), павінны быць указаны ў законе.

Віды аб'ектаў грамадзянскіх правоў, якія могуць належаць толькі пэўным удзельнікам абароту або знаходжанне якіх у абарачэнні дапускаецца па спецыяльным дазволе (аб'екты, абмежавана здольныя да абарачэння), вызначаюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

3. Зямля і іншыя прыродныя рэсурсы могуць адчужацца ці пераходзіць ад адной асобы да іншай іншымі спосабамі ў той меры, у якой іх абарот дапускаецца заканадаўствам аб ахове і выкарыстанні зямель і іншым заканадаўствам аб ахове навакольнага асяроддзя і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў.

Артыкул 130. Нерухомыя і рухомыя рэчы

1. Да нерухомых рэчаў (нерухомая маёмасць, нерухомасць) адносяцца зямельныя ўчасткі, участкі нетраў, паверхневыя водныя аб'екты і ўсё, што трывала звязана з зямлёй, гэта значыць аб'екты, перамяшчэнне якіх без несуразмернага ўрону іх прызначэнню немагчыма, у тым ліку лясы, шматгадовыя насаджэнні, капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), незавершаныя закансерваваныя капітальныя пабудовы, ізаляваныя памяшканні, машына-месцы.

Да нерухомых рэчаў таксама прыраўноўваюцца прадпрыемства ў цэлым як маёмасны комплекс, падлеглыя дзяржаўнай рэгістрацыі паветраныя і марскія судны, судны ўнутранага плавання, судны плавання «рака — мора», касмічныя аб'екты. Заканадаўчымі актамі да нерухомых рэчаў можа быць аднесена і іншая маёмасць.

2. Рэчы, якія не адносяцца да нерухомасці, уключаючы грошы і каштоўныя паперы, прызнаюцца рухомай маёмасцю. Рэгістрацыя правоў на рухомыя рэчы не патрабуецца, акрамя выпадкаў, указаных у законе.

Артыкул 131. Дзяржаўная рэгістрацыя нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй

1. Дзяржаўнай рэгістрацыі падлягаюць нерухомая маёмасць, правы на яе і здзелкі з ёй у выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

2. У выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, нароўні з дзяржаўнай рэгістрацыяй могуць ажыццяўляцца спецыяльная рэгістрацыя ці ўлік асобных відаў нерухомай маёмасці.

3. Арганізацыі па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй абавязаны засведчыць праведзеную рэгістрацыю шляхам выдачы заяўніку пасведчання (сведчання) аб дзяржаўнай рэгістрацыі або шляхам выканання рэгістрацыйнага надпісу на арыгінале дакумента, які перадае змест зарэгістраванай здзелкі.

4. Дзяржаўная рэгістрацыя нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй з'яўляецца публічнай. Арганізацыі па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй абавязаны даваць любой асобе неабходную інфармацыю толькі аб існуючых на момант выдачы інфармацыі правах і абмежаваннях (абцяжарваннях) правоў на канкрэтны аб'ект нерухомай маёмасці. Абагульненая інфармацыя аб прыналежных фізічнай ці юрыдычнай асобе правах на аб'екты нерухомай маёмасці даецца толькі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

5. Адмова або ўхіленне ад дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй могуць быць абскарджаны ў суд.

6. Парадак дзяржаўнай рэгістрацыі і падставы для адмовы ў рэгістрацыі ўстанаўліваюцца заканадаўствам аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй.

Артыкул 132. Прадпрыемства

1. Прадпрыемствам як аб'ектам правоў прызнаецца маёмасны комплекс, які выкарыстоўваецца для ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці.

У склад прадпрыемства як маёмаснага комплексу ўваходзяць усе віды маёмасці, прызначаныя для яго дзейнасці, уключаючы зямельныя ўчасткі, капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), незавершаныя закансерваваныя капітальныя пабудовы, ізаляваныя памяшканні, машына-месцы, абсталяванне, інвентар, сыравіна, прадукцыя, правы патрабавання, даўгі, а таксама правы на знакі, якія індывідуалізуюць прадпрыемства, яго прадукцыю, работы і паслугі (фірменнае найменне, таварныя знакі, знакі абслугоўвання), і іншыя выключныя правы, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам.

2. Прадпрыемства ў цэлым ці яго частка могуць быць аб'ектам куплі-продажу, закладу, арэнды і іншых здзелак, звязаных з устанаўленнем, змяненнем і спыненнем рэчавых правоў.

Артыкул 133. Непадзельныя рэчы

Рэч, падзел якой у натуры немагчымы без змянення яе прызначэння, прызнаецца непадзельнай.

Асаблівасці выдзелу долі ў праве ўласнасці на непадзельную рэч вызначаюцца правіламі артыкула 255 гэтага Кодэкса.

Артыкул 134. Складаныя рэчы

Калі разнастайныя рэчы ўтвараюць адзінае цэлае, якое прадугледжвае выкарыстанне іх па агульным прызначэнні, яны разглядаюцца як адна рэч (складаная рэч).

Дзеянне здзелкі, заключанай наконт складанай рэчы, распаўсюджваецца на ўсе яе складаныя часткі, калі дагаворам не прадугледжана іншае.

Артыкул 135. Галоўная рэч і прыналежнасць

Рэч, прызначаная для абслугоўвання іншай (галоўнай) рэчы і звязаная з ёй агульным прызначэннем (прыналежнасцю), мае той жа лёс, што і галоўная рэч, калі дагаворам не прадугледжана іншае.

Артыкул 136. Набыткі, прадукцыя і даходы

Паступленні, атрыманыя ў выніку выкарыстання маёмасці (набыткі, прадукцыя, даходы), належаць асобе, якая выкарыстоўвае гэту маёмасць на законнай падставе, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам аб выкарыстанні гэтай маёмасці.

Артыкул 137. Жывёлы

Да жывёл прымяняюцца правілы аб маёмасці пастолькі, паколькі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам і не вынікае з асаблівасцей гэтага аб'екта.

Пры ажыццяўленні правоў не дапускаецца жорсткае абыходжанне з жывёламі, якое супярэчыць прынцыпам гуманнасці.

Артыкул 138. Індывідуальна-вызначаныя рэчы і рэчы, якія вызначаюцца радавымі прыкметамі

1. Індывідуальна-вызначанай прызнаецца рэч, выдзеленая з іншых рэчаў па ўласцівых толькі ёй прыкметах. Індывідуальна-вызначаныя рэчы з'яўляюцца незаменнымі.

2. Рэчамі, якія вызначаюцца радавымі прыкметамі, прызнаюцца рэчы, якія валодаюць прыкметамі, уласцівымі ўсім рэчам таго ж роду, і вызначаюцца колькасцю, вагой, мерай. Рэчы, якія вызначаюцца радавымі прыкметамі, з'яўляюцца замяняльнымі.

Артыкул 139. Вынікі інтэлектуальнай дзейнасці, якія ахоўваюцца

У выпадках і парадку, устаноўленых гэтым Кодэксам і іншым заканадаўствам, прызнаецца выключнае права (інтэлектуальная ўласнасць) грамадзяніна ці юрыдычнай асобы на вынікі інтэлектуальнай дзейнасці, якія ахоўваюцца, і прыраўнаваныя да іх сродкі індывідуалізацыі юрыдычнай асобы, індывідуалізацыі прадукцыі, работ і паслуг, якія выконваюцца (фірменнае найменне, таварны знак, знак абслугоўвання і да т.п.).

Трэція асобы могуць выкарыстоўваць вынікі інтэлектуальнай уласнасці і сродкаў індывідуалізацыі, якія з'яўляюцца аб'ектам выключных правоў, толькі са згоды праваўладальніка.

Артыкул 140. Нераскрытая інфармацыя

1. Інфармацыя (звесткі аб асобах, прадметах, фактах, падзеях, з'явах і працэсах) ахоўваецца ў якасці нераскрытай інфармацыі, калі яна складае службовую тайну ці камерцыйную тайну.

2. У адносінах да інфармацыі можа быць устаноўлены рэжым камерцыйнай тайны пры ўмове, што звесткі, якія складаюць яе, не з'яўляюцца агульнавядомымі ці лёгкадаступнымі трэцім асобам у тых колах, якія звычайна маюць справу з падобнага роду звесткамі, маюць камерцыйную каштоўнасць для іх уладальніка з прычыны невядомасці трэцім асобам, не з'яўляюцца аб'ектамі выключных правоў на вынікі інтэлектуальнай дзейнасці і не аднесены ва ўстаноўленым парадку да дзяржаўных сакрэтаў. Рэжым камерцыйнай тайны лічыцца ўстаноўленым пасля вызначэння складу звестак, якія падлягаюць ахове ў рэжыме камерцыйнай тайны, і прыняцця асобай, якая правамерна валодае такімі звесткамі, сукупнасці мер, неабходных для забеспячэння іх канфідэнцыяльнасці.

Звесткі, у адносінах да якіх не можа быць устаноўлены рэжым камерцыйнай тайны, вызначаюцца заканадаўчымі актамі.

3. Умовы і парадак аднясення інфармацыі да службовай тайны вызначаюцца заканадаўствам.

4. Інфармацыя, якая складае службовую тайну ці камерцыйную тайну, абараняецца спосабамі, прадугледжанымі заканадаўствам.

У выпадку незаконнага азнаямлення ці незаконнага выкарыстання, а таксама выдавання інфармацыі, якая складае службовую тайну ці камерцыйную тайну, фізічныя і юрыдычныя асобы, дзяржаўныя органы і іх службовыя асобы абавязаны кампенсаваць яе ўладальніку прычыненыя страты. Такі ж абавязак ускладаецца на работнікаў, якія выдалі службовую тайну ці камерцыйную тайну насуперак абавязацельству аб невыдаванні камерцыйнай тайны, працоўнаму дагавору (кантракту), і на контрагентаў, якія зрабілі гэта насуперак грамадзянска-прававому дагавору.

Артыкул 141. Грошы (валюта)

1. Беларускі рубель з'яўляецца законным плацежным сродкам, абавязковым да прыёму па намінальным кошце на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Плацяжы на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ажыццяўляюцца шляхам наяўных і безнаяўных разлікаў.

2. Выпадкі, парадак і ўмовы выкарыстання замежнай валюты на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь вызначаюцца заканадаўствам.

Артыкул 142. Валютныя каштоўнасці

Віды маёмасці, якая прызнаецца валютнымі каштоўнасцямі, і парадак заключэння здзелак з імі вызначаюцца заканадаўствам.

Права ўласнасці на валютныя каштоўнасці абараняецца ў Рэспубліцы Беларусь на агульных падставах.

ГЛАВА 7
КАШТОЎНЫЯ ПАПЕРЫ

Артыкул 143. Каштоўная папера

Каштоўнай паперай з'яўляюцца дакумент або сукупнасць пэўных запісаў, якія сведчаць з прытрымліваннем устаноўленай формы і (ці) абавязковых рэквізітаў маёмасныя і немаёмасныя правы. З перадачай каштоўнай паперы пераходзяць усе правы, якія сведчацца ёю, у сукупнасці.

Артыкул 144. Віды і формы каштоўных папер

Да каштоўных папер адносяцца дзяржаўная аблігацыя, аблігацыя, вэксаль, чэк, дэпазітны і ашчадны сертыфікаты, банкаўская ашчадная кніжка на прад'яўніка, канасамент, акцыя, прыватызацыйныя каштоўныя паперы і іншыя дакументы, якія заканадаўствам аб каштоўных паперах ці ва ўстаноўленым ім парадку аднесены да ліку каштоўных папер.

Каштоўныя паперы могуць быць эмісійнымі і неэмісійнымі.

Эмісійнымі каштоўнымі паперамі з'яўляюцца аблігацыі, акцыі і іншыя каштоўныя паперы, аднесеныя да гэтакіх заканадаўствам.

Каштоўныя паперы могуць эмітавацца (выдавацца) у дакументарнай ці бездакументарнай формах. Заканадаўчымі актамі можа быць выключана магчымасць эмісіі (выдачы) каштоўных папер пэўнага віду ў дакументарнай або бездакументарнай форме.

Да адносін, звязаных з простымі і пераводнымі вэксалямі, гэты Кодэкс прымяняецца ў частцы, не ўрэгуляванай нормамі заканадаўчых актаў аб абарачэнні простых і пераводных вэксаляў.

Артыкул 145. Патрабаванні да каштоўнай паперы

1. Віды правоў, якія сведчацца каштоўнымі паперамі, абавязковыя рэквізіты каштоўных папер, патрабаванні да формы каштоўнай паперы і іншыя неабходныя патрабаванні вызначаюцца заканадаўствам ці ва ўстаноўленым ім парадку.

2. Адсутнасць абавязковых рэквізітаў каштоўнай паперы ці неадпаведнасць каштоўнай паперы ўстаноўленай для яе форме цягне за сабой яе нікчэмнасць.

Артыкул 146. Суб'екты правоў, пасведчаных каштоўнай паперай

1. Правы, пасведчаныя каштоўнай паперай, могуць належаць:

1) прад'яўніку каштоўнай паперы (каштоўная папера на прад'яўніка);

2) названай у каштоўнай паперы асобе (імянная каштоўная папера);

3) названай у каштоўнай паперы асобе, якая можа сама ажыццявіць гэтыя правы ці прызначыць сваім распараджэннем (загадам) іншую ўпаўнаважаную асобу (ордэрная каштоўная папера).

2. Заканадаўчымі актамі можа быць выключана магчымасць эмісіі (выдачы) каштоўных папер пэўнага віду ў якасці імянных, або (і) у якасці ордэрных, або (і) у якасці папер на прад'яўніка.

Артыкул 146[1]. Пацвярджэнне правоў на каштоўную паперу

1. Пацвярджэннем права на дакументарную каштоўную паперу з'яўляецца сама каштоўная папера. У выпадку перадачы дакументарнай каштоўнай паперы на захоўванне прафесійнаму ўдзельніку рынку каштоўных папер, які мае права ажыццяўляць такое захоўванне ў адпаведнасці з выдадзеным яму спецыяльным дазволам (ліцэнзіяй) ці заканадаўчымі актамі, пацвярджэннем права на гэту каштоўную паперу з'яўляецца выпіска аб стане рахунку, адкрытага гэтым прафесійным удзельнікам рынку каштоўных папер для ўліку гэтай каштоўнай паперы. Пры наяўнасці разыходжанняў паміж дакументарнай каштоўнай паперай і выпіскай аб стане ўказанага рахунку прыярытэт мае выпіска.

2. Пацвярджэннем права на бездакументарную каштоўную паперу з'яўляецца выпіска аб стане рахунку, адкрытага для ўліку гэтай каштоўнай паперы.

3. Парадак адкрыцця і вядзення рахункаў для ўліку каштоўных папер, а таксама патрабаванні да зместу і афармлення выпісак аб стане такіх рахункаў вызначаюцца заканадаўствам.

4. Асаблівасці пацвярджэння правоў на эмісійную каштоўную паперу вызначаюцца заканадаўчымі актамі аб каштоўных паперах.

Артыкул 146[2]. Ажыццяўленне правоў па каштоўнай паперы

Ажыццяўленне правоў, якія сведчацца каштоўнай паперай, магчымае пры прад'яўленні каштоўнай паперы, а ў прадугледжаных заканадаўствам выпадках, — пры прад'яўленні выпіскі аб стане рахунку, адкрытага для ўліку гэтай каштоўнай паперы, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

Артыкул 147. Перадача правоў, пасведчаных каштоўнай паперай

1. Для перадачы іншай асобе правоў, пасведчаных каштоўнай паперай на прад'яўніка, дастаткова ўручэння каштоўнай паперы гэтай асобе.

2. Правы, пасведчаныя імянной каштоўнай паперай, перадаюцца ў парадку, устаноўленым для ўступкі патрабаванняў (цэсіі). У адпаведнасці з артыкулам 361 гэтага Кодэкса асоба, якая перадае правы, пасведчаныя каштоўнай паперай, нясе адказнасць за несапраўднасць адпаведнага патрабавання, але не за яго невыкананне.

3. Правы, пасведчаныя ордэрнай каштоўнай паперай, перадаюцца шляхам выканання на гэтай паперы перадатачнага надпісу – індасамента. Індасант нясе адказнасць не толькі за існаванне права, але і за яго ажыццяўленне.

Індасамент, выкананы на каштоўнай паперы, пераносіць усе правы, пасведчаныя каштоўнай паперай, на асобу, якой ці загаду якой перадаюцца правы, пасведчаныя каштоўнай паперай, – індасата. Індасамент можа быць бланкавым (без указання асобы, якой павінна быць праведзена выкананне) ці ордэрным (з указаннем асобы, якой ці па загаду якой павінна быць праведзена выкананне).

Індасамент можа быць абмежаваны толькі даручэннем ажыццяўляць правы, пасведчаныя каштоўнай паперай, без перадачы гэтых правоў індасату (даручаны індасамент). У гэтым выпадку індасат выступае ў якасці прадстаўніка.

4. Асаблівасці перадачы правоў па эмісійных каштоўных паперах вызначаюцца заканадаўчымі актамі аб каштоўных паперах.

Артыкул 148. Выкананне па каштоўнай паперы

1. Асоба, якая выдала каштоўную паперу, і ўсе асобы, якія індасавалі яе, адказваюць перад яе законным уладальнікам салідарна. У выпадку задавальнення патрабаванняў законнага ўладальніка каштоўнай паперы аб выкананні пасведчанага ёй абавязацельства адной ці некалькімі асобамі з ліку асоб, якія абавязаліся да яго па каштоўнай паперы, яны набываюць права адваротнага патрабавання (рэгрэсу) да астатніх асоб, якія абавязаліся па каштоўнай паперы.

2. Адмова ад выканання абавязацельства, пасведчанага каштоўнай паперай, са спасылкай на адсутнасць падставы абавязацельства або на яго несапраўднасць не дапускаецца. Уладальнік каштоўнай паперы, які выявіў падлог ці падробку каштоўнай паперы, мае права прад'явіць да асобы, якая перадала яму паперу, патрабаванне аб належным выкананні абавязацельства, пасведчанага каштоўнай паперай, і пакрыцця страт.

Артыкул 149. Аднаўленне правоў на каштоўныя паперы

Аднаўленне правоў па страчаных каштоўных паперах на прад'яўніка і ордэрных каштоўных паперах праводзіцца судом у парадку, прадугледжаным працэсуальным заканадаўствам.

Артыкул 150. Бездакументарныя каштоўныя паперы

1. Правы на бездакументарныя каштоўныя паперы ўзнікаюць з моманту залічэння гэтых каштоўных папер на рахунак пакупніка, адкрыты для ўліку каштоўных папер.

2. У выпадках, вызначаных заканадаўчымі актамі, ці ў парадку, устаноўленым у адпаведнасці з імі, адлюстраванню на рахунку (фіксацыі), адкрытым для ўліку бездакументарных каштоўных папер, падлягаюць узнікненне, пераход (перадача), змяненне і спыненне правоў на бездакументарныя каштоўныя паперы, а таксама абцяжарванне (абмежаванне) гэтых правоў.

ГЛАВА 8
НЕМАТЭРЫЯЛЬНЫЯ ДАБРОТЫ І ІХ АБАРОНА

Артыкул 151. Нематэрыяльныя даброты

1. Жыццё і здароўе, годнасць асобы, асабістая недатыкальнасць, гонар і добрае імя, дзелавая рэпутацыя, недатыкальнасць прыватнага жыцця, асабістая і сямейная тайна, права свабоднага перамяшчэння, выбару месца знаходжання і жыхарства, права на імя, права аўтарства, іншыя асабістыя немаёмасныя правы і іншыя нематэрыяльныя даброты, якія належаць грамадзяніну ад нараджэння ці паводле акта заканадаўства, з’яўляюцца неадчужальнымі і неперадавальнымі іншым спосабам. У выпадках і парадку, прадугледжаных заканадаўствам, асабістыя немаёмасныя правы і іншыя нематэрыяльныя даброты, якія належалі памерламу, могуць ажыццяўляцца і абараняцца іншымі асобамі, у тым ліку спадчыннікамі праваўладальніка.

2. Нематэрыяльныя даброты абараняюцца ў адпаведнасці з грамадзянскім заканадаўствам у выпадках і парадку, прадугледжаных гэтым заканадаўствам, а таксама ў тых выпадках і межах, у якіх выкарыстанне спосабаў абароны грамадзянскіх правоў (артыкул 11) вынікае з сутнасці парушанага нематэрыяльнага права і характару наступстваў гэтага парушэння.

Артыкул 152. Кампенсацыя маральнай шкоды

Калі грамадзяніну прычынена маральная шкода (фізічныя ці маральныя пакуты) дзеяннямі, якія парушаюць яго асабістыя немаёмасныя правы або замахваюцца на прыналежныя грамадзяніну іншыя нематэрыяльныя даброты, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, грамадзянін мае права запатрабаваць ад парушальніка грашовую кампенсацыю ўказанай шкоды.

Пры вызначэнні памераў кампенсацыі маральнай шкоды суд прымае пад увагу ступень віны парушальніка і іншыя абставіны, якія заслугоўваюць увагі. Суд павінен таксама ўлічваць ступень фізічных і маральных пакут, звязаных з індывідуальнымі асаблівасцямі асобы, якой прычынена шкода.

Артыкул 153. Абарона гонару, годнасці і дзелавой рэпутацыі

1. Грамадзянін мае права запатрабаваць па судзе абвяржэння звестак, якія няславяць яго гонар, годнасць ці дзелавую рэпутацыю, калі асоба, якая распаўсюдзіла такія звесткі, не дакажа, што яны адпавядаюць рэчаіснасці.

Па патрабаванні зацікаўленых асоб дапускаецца абарона гонару і годнасці грамадзяніна і пасля яго смерці.

2. Калі звесткі, якія няславяць гонар, годнасць ці дзелавую рэпутацыю грамадзяніна, распаўсюджаны ў сродках масавай інфармацыі, яны павінны быць абвергнуты ў тых жа сродках масавай інфармацыі.

Калі ўказаныя звесткі ўтрымліваюцца ў дакуменце, які зыходзіць з арганізацыі, такі дакумент падлягае замене ці адкліканню.

Парадак абвяржэння ў іншых выпадках устанаўліваецца судом.

3. Грамадзянін, у адносінах да якога сродкі масавай інфармацыі апублікавалі звесткі, што ўшчамляюць яго правы ці інтарэсы, якія ахоўваюцца заканадаўствам, мае права на апублікаванне свайго адказу ў тых жа сродках масавай інфармацыі.

4. Выключаны.

5. Грамадзянін, у адносінах да якога распаўсюджаны звесткі, што няславяць яго гонар, годнасць ці дзелавую рэпутацыю, мае права нароўні з абвяржэннем такіх звестак патрабаваць пакрыцця страт і маральнай шкоды, прычыненых іх распаўсюджваннем.

6. Калі выявіць асобу, якая распаўсюдзіла звесткі, што няславяць гонар, годнасць ці дзелавую рэпутацыю грамадзяніна, немагчыма, грамадзянін, у адносінах да якога такія звесткі распаўсюджаны, мае права звярнуцца ў суд з заявай аб прызнанні распаўсюджаных звестак не адпаведных рэчаіснасці.

7. Правілы гэтага артыкула аб абароне дзелавой рэпутацыі грамадзяніна адпаведна прымяняюцца да абароны дзелавой рэпутацыі юрыдычнай асобы, акрамя пакрыцця маральнай шкоды.

ПАДРАЗДЗЕЛ 4
ЗДЗЕЛКІ І ПРАДСТАЎНІЦТВА
ГЛАВА 9
ЗДЗЕЛКІ

§ 1. Паняцце, віды і формы здзелак

Артыкул 154. Паняцце здзелкі

Здзелкамі прызнаюцца дзеянні грамадзян і юрыдычных асоб, накіраваныя на ўстанаўленне, змяненне ці спыненне грамадзянскіх правоў і абавязкаў.

Артыкул 155. Дагаворы і аднабаковыя здзелкі

1. Здзелкі могуць быць двух- ці шматбаковымі (дагаворы) і аднабаковымі.

2. Аднабаковай лічыцца здзелка, для заключэння якой у адпаведнасці з заканадаўствам ці пагадненнем бакоў неабходна і дастаткова выяўлення волі (дзеяння) аднаго боку.

3. Для заключэння дагавора неабходна выяўленне ўзгодненай волі (дзеянняў) двух бакоў (двухбаковая здзелка) або трох ці болей бакоў (шматбаковая здзелка).

Артыкул 156. Абавязкі па аднабаковай здзелцы

Аднабаковая здзелка стварае абавязкі для асобы, якая заключыла здзелку. Яна можа ствараць абавязкі для іншых асоб толькі ў выпадках, устаноўленых заканадаўчымі актамі або пагадненнем з гэтымі асобамі.

Артыкул 157. Прававое рэгуляванне аднабаковых здзелак

Да аднабаковых здзелак адпаведна прымяняюцца агульныя палажэнні аб абавязацельствах і аб дагаворах, калі гэта не супярэчыць заканадаўству, аднабаковаму характару і сутнасці здзелкі.

Артыкул 158. Здзелкі, заключаныя пад умовай

1. Здзелка лічыцца заключанай пад адкладальнай умовай, калі бакі паставілі ўзнікненне правоў і абавязкаў у залежнасць ад акалічнасці, адносна якой невядома, настане яна ці не настане.

2. Здзелка лічыцца заключанай пад скасавальнай умовай, калі бакі паставілі спыненне правоў і абавязкаў у залежнасць ад акалічнасці, адносна якой невядома, настане яна ці не настане.

3. Калі надыходу ўмовы нядобрасумленна перашкодзіў бок, якому надыход умовы нявыгадны, то прызнаецца, што ўмова надышла.

Калі надыходу ўмовы нядобрасумленна садзейнічаў бок, якому надыход умовы выгадны, то прызнаецца, што ўмова не надышла.

Артыкул 159. Форма здзелак

1. Здзелкі адбываюцца вусна ці ў пісьмовай форме (простай ці натарыяльнай).

2. Здзелка, якая можа быць заключана вусна, лічыцца заключанай і ў тым выпадку, калі з паводзін асобы відаць яе воля заключыць здзелку.

3. Маўчанне прызнаецца выяўленнем волі заключыць здзелку ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам ці пагадненнем бакоў.

Артыкул 160. Вусныя здзелкі

1. Здзелка, для якой заканадаўчымі актамі не ўстаноўлена пісьмовая (простая ці натарыяльная) форма, можа быць заключана вусна.

2. Калі іншае не ўстаноўлена пагадненнем бакоў, могуць заключацца вусна ўсе здзелкі, якія выконваюцца пры самім іх заключэнні, за выключэннем здзелак, для якіх устаноўлена натарыяльная форма, і здзелак, незахаванне простай пісьмовай формы якіх цягне за сабой іх несапраўднасць.

3. Здзелкі ў мэтах выканання дагавора, заключанага ў пісьмовай форме, паводле пагаднення бакоў могуць заключацца вусна, калі гэта не супярэчыць заканадаўству і дагавору.

Артыкул 161. Пісьмовая форма здзелкі

1. Здзелка ў простай пісьмовай форме павінна быць заключана шляхам складання тэкставага дакумента, уключаючы дакумент у электронным выглядзе (у тым ліку электронны дакумент), які перадае яе змест, падпісаны асобай ці асобамі, якія заключаюць здзелку, або належным чынам упаўнаважанымі імі асобамі ўласнаручна або з выкарыстаннем сродкаў сувязі і іншых тэхнічных сродкаў, камп'ютарных праграм, інфармацыйных сістэм ці інфармацыйных сетак, калі такі спосаб падпісання дазваляе дакладна ўстанавіць, што адпаведны тэкставы дакумент падпісаны асобай ці асобамі, якія заключаюць здзелку, або належным чынам упаўнаважанымі імі асобамі (факсімільнае ўзнаўленне ўласнаручнага подпісу з дапамогай сродкаў механічнага ці іншага капіравання, электронны лічбавы подпіс ці іншы аналаг уласнаручнага подпісу, які забяспечвае ідэнтыфікацыю адпаведных асобы ці асоб), і не супярэчыць заканадаўству і пагадненню бакоў.

Двухбаковыя (шматбаковыя) здзелкі могуць заключацца спосабамі, устаноўленымі пунктамі 2 і 3 артыкула 404 гэтага Кодэкса.

У выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, дапускаюцца толькі вызначаныя імі спосабы заключэння здзелак у простай пісьмовай форме.

Заканадаўствам і пагадненнем бакоў могуць устанаўлівацца дадатковыя патрабаванні, якім павінна адпавядаць форма здзелкі (заключэнне на бланку пэўнай формы і інш.) і прадугледжвацца наступствы незахавання гэтых патрабаванняў. Калі такія наступствы не прадугледжаны, прымяняюцца наступствы незахавання простай пісьмовай формы здзелкі (пункт 1 артыкула 163).

2. Выключаны.

3. Калі грамадзянін у выніку фізічнага недахопу, хваробы ці непісьменнасці не можа ўласнаручна падпісацца, то па яго просьбе дакумент, які перадае змест здзелкі, можа падпісаць іншы грамадзянін.

Подпіс таго, хто падпісвае дакумент, які перадае змест здзелкі, павінны быць засведчаны натарыусам або іншай службовай асобай, якая мае права заключаць

такое натарыяльнае дзеянне, з указаннем прычын, паводле якіх грамадзянін, які здзяйсняе здзелку, не мог уласнаручна падпісаць дакумент, які перадае змест здзелкі.

Подпіс таго, хто падпісвае дакумент, які перадае змест здзелкі, што не патрабуе натарыяльнай формы пасведчання, ці таго, хто падпісвае даверанасць на яе заключэнне, можа быць засведчаны таксама арганізацыяй, дзе працуе ці вучыцца грамадзянін, які не можа ўласнаручна падпісацца, арганізацыяй, якая ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду і (ці) аказвае жыллёва-камунальныя паслугі, па месцы яго жыхарства ці арганізацыяй аховы здароўя, якая аказвае медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах, у якой ён знаходзіцца на лячэнні. Указаныя арганізацыі не маюць права адмовіць грамадзяніну, які не можа ўласнаручна падпісацца, у просьбе засведчыць подпіс таго, хто падпісвае дакумент, які перадае змест здзелкі, што не патрабуе натарыяльнай формы пасведчання, ці таго, хто падпісвае даверанасць на яе заключэнне.

Артыкул 162. Здзелкі, якія заключаюцца ў простай пісьмовай форме

У простай пісьмовай форме павінны заключацца здзелкі (за выключэннем здзелак, якія патрабуюць натарыяльнага пасведчання):

1) юрыдычных асоб паміж сабой і з грамадзянамі;

2) грамадзян паміж сабой на суму, якая перавышае не менш чым у дзесяць разоў устаноўлены заканадаўствам памер базавай велічыні, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам.

Прытрымліванне простай пісьмовай формы не патрабуецца для здзелак, якія ў адпаведнасці з артыкулам 160 гэтага Кодэкса могуць быць заключаны вусна.

Артыкул 163. Наступствы незахавання простай пісьмовай формы здзелкі

1. Незахаванне простай пісьмовай формы здзелкі пазбаўляе бакі права ў выпадку спрэчкі спасылацца ў пацвярджэнне здзелкі і яе ўмоў на паказанні сведак, але не пазбаўляе іх права прыводзіць пісьмовыя і іншыя доказы, якія не з'яўляюцца паказаннямі сведак.

2. У выпадках, прама ўказаных заканадаўчымі актамі ці ў пагадненні бакоў, незахаванне простай пісьмовай формы здзелкі цягне за сабой яе несапраўднасць.

3. Незахаванне простай пісьмовай формы знешнеэканамічнай здзелкі цягне за сабой несапраўднасць здзелкі.

Артыкул 164. Натарыяльна пасведчаныя здзелкі

1. Натарыяльнае пасведчанне здзелак ажыццяўляецца шляхам выканання на дакуменце, які адпавядае патрабаванням артыкула 161 гэтага Кодэкса, пасведчага надпісу натарыусам ці іншай службовай асобай, якая мае права здзяйсняць такое натарыяльнае дзеянне.

2. Натарыяльнае пасведчанне здзелак абавязковае ў выпадках:

1) указаных у заканадаўчых актах;

2) прадугледжаных пагадненнем бакоў, хаця б па заканадаўству для здзелак такога віду гэта форма не патрабавалася.

Артыкул 165. Дзяржаўная рэгістрацыя здзелак

1. Здзелкі з нерухомай маёмасцю падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі ў парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам і заканадаўствам аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

2. Заканадаўствам можа быць устаноўлена рэгістрацыя здзелак з рухомай маёмасцю пэўных відаў.

Артыкул 166. Наступствы незахавання натарыяльнай формы здзелкі і патрабавання аб яе рэгістрацыі

1. Незахаванне натарыяльнай формы ці патрабавання аб дзяржаўнай рэгістрацыі здзелкі цягне за сабой яе несапраўднасць. Такая здзелка лічыцца нікчэмнай.

2. Калі адзін з бакоў поўнасцю ці часткова выканаў здзелку, якая патрабуе натарыяльнага пасведчання, а другі бок ухіляецца ад такога пасведчання, суд мае права па патрабаванні боку, які выканаў здзелку, прызнаць здзелку сапраўднай. У гэтым выпадку наступнае натарыяльнае пасведчанне здзелкі не патрабуецца.

3. Калі здзелка, якая патрабуе дзяржаўнай рэгістрацыі, заключана ў належнай форме, але адзін з бакоў ухіляецца ад яе рэгістрацыі, суд мае права па патрабаванні другога боку вынесці рашэнне аб рэгістрацыі здзелкі. У гэтым выпадку здзелка рэгіструецца ў адпаведнасці з рашэннем суда.

4. У выпадках, прадугледжаных пунктамі 2 і 3 гэтага артыкула, бок, які неабгрунтавана ўхіляецца ад натарыяльнага пасведчання ці дзяржаўнай рэгістрацыі здзелкі, павінен кампенсаваць другому боку страты, выкліканыя затрымкай у заключэнні ці рэгістрацыі здзелкі.

§ 2. Несапраўднасць здзелак

Артыкул 167. Здзелкі, якія аспрэчваюцца, і нікчэмныя здзелкі

1. Здзелка з'яўляецца несапраўднай на падставах, устаноўленых гэтым Кодэксам або іншымі заканадаўчымі актамі, з прычыны прызнання яе гэтакай судом (здзелка, якая аспрэчваецца) або незалежна ад такога прызнання (нікчэмная здзелка).

2. Патрабаванні аб устанаўленні факта нікчэмнасці здзелкі і аб прымяненні наступстваў яе несапраўднасці могуць быць прад'яўлены любой зацікаўленай асобай. Суд мае права ўстанавіць факт нікчэмнасці здзелкі і па сваёй ініцыятыве. У гэтым выпадку суд прымяняе наступствы несапраўднасці нікчэмнай здзелкі.

3. Патрабаванні аб прызнанні здзелкі, якая аспрэчваецца, несапраўднай могуць быць прад'яўлены асобамі, указанымі ў гэтым Кодэксе або ў іншым заканадаўчым акце, які ўстанаўлівае спрэчнасць здзелкі.

Артыкул 168. Агульныя палажэнні аб наступствах несапраўднасці здзелак

1. Несапраўдная здзелка не цягне за сабой юрыдычных наступстваў, за выключэннем тых, якія звязаны з яе несапраўднасцю, і несапраўдная з моманту яе заключэння. Аднак калі са зместу здзелкі вынікае, што яна можа быць толькі спынена на будучы час, суд, прызнаючы здзелку несапраўднай, спыняе яе дзеянне на будучы час.

2. Пры несапраўднасці здзелкі кожны з бакоў абавязаны вярнуць іншаму ўсё атрыманае па здзелцы, а ў выпадку немагчымасці вярнуць атрыманае ў натуры (у тым ліку тады, калі атрыманае выражаецца ў карыстанні маёмасцю, выкананай рабоце ці аказанай паслузе) – кампенсаваць яго кошт у грашах, калі іншыя наступствы несапраўднасці здзелкі не прадугледжаны гэтым Кодэксам або іншымі заканадаўчымі актамі.

Артыкул 169. Несапраўднасць здзелкі, якая не адпавядае заканадаўству

Здзелка, якая не адпавядае патрабаванням заканадаўства, нікчэмная, калі заканадаўчы акт не ўстанаўлівае, што такая здзелка можа быць аспрэчана, ці не прадугледжвае іншых наступстваў парушэння.

Артыкул 170. Несапраўднасць здзелкі, заключэнне якой забаронена заканадаўствам

Здзелка, заключэнне якой забаронена заканадаўствам, нікчэмная.

Пры наяўнасці намеру ў абаіх бакоў такой здзелкі – у выпадку выканання здзелкі абодвума бакамі – у даход Рэспублікі Беларусь спаганяецца ўсё атрыманае імі па здзелцы, а ў выпадку выканання здзелкі адным бокам з іншага спаганяецца ў даход Рэспублікі Беларусь усё атрыманае ім і ўсё належнае з яго першаму боку (як пакрыццё атрыманага).

Пры наяўнасці намеру толькі ў аднаго з бакоў такой здзелкі ўсё атрыманае ім па здзелцы павінна быць вернута іншаму боку, а атрыманае апошнім або тое, што належала яму як пакрыццё выкананага спаганяецца ў даход Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 171. Несапраўднасць уяўнай і прытворнай здзелак

1. Уяўная здзелка, гэта значыць здзелка, заключаная толькі для выгляду, без намеру стварыць адпаведныя ёй юрыдычныя наступствы, нікчэмная.

2. Прытворная здзелка, гэта значыць здзелка, якая заключана з мэтай утаіць іншую здзелку, нікчэмная. Да здзелкі, якую бакі сапраўды мелі на ўвазе, з улікам сутнасці здзелкі прымяняюцца правілы, якія адносяцца да яе.

Артыкул 172. Несапраўднасць здзелкі, заключанай грамадзянінам, прызнаным недзеяздольным

1. Здзелка, заключаная грамадзянінам, прызнаным недзеяздольным у выніку псіхічнага расстройства (захворвання), нікчэмная.

Кожны з бакоў такой здзелкі абавязаны вярнуць іншаму ўсё атрыманае ў натуры, а пры немагчымасці вярнуць атрыманае ў натуры – кампенсаваць яго кошт у грашах.

Дзеяздольны бок абавязаны, акрамя таго, кампенсаваць іншаму боку панесены ім рэальны ўрон, калі дзеяздольны бок ведаў ці павінен быў ведаць аб недзеяздольнасці другога боку.

2. У інтарэсах грамадзяніна, прызнанага недзеяздольным у выніку псіхічнага расстройства (захворвання), заключаная ім здзелка можа быць па патрабаванні яго апекуна прызнана судом сапраўднай, калі яна заключана з выгадай для гэтага грамадзяніна.

Артыкул 173. Несапраўднасць здзелкі, заключанай непаўналетнім, які не дасягнуў чатырнаццаці гадоў

1. Здзелка, заключаная непаўналетнім, які не дасягнуў чатырнаццаці гадоў (малалетнім), нікчэмная. Да такой здзелкі прымяняюцца правілы, прадугледжаныя часткамі другой і трэцяй пункта 1 артыкула 172 гэтага Кодэкса.

2. У інтарэсах малалетняга заключаная ім здзелка можа быць па патрабаванні яго бацькоў, усынавіцеляў ці апекуна прызнана судом сапраўднай, калі яна заключана з выгадай для малалетняга.

3. Правілы гэтага артыкула не распаўсюджваюцца на дробныя бытавыя і іншыя здзелкі, якія яны маюць права заключаць самастойна ў адпаведнасці з артыкулам 27 гэтага Кодэкса.

Артыкул 174. Несапраўднасць здзелкі юрыдычнай асобы, якая выходзіць за межы яе праваздольнасці

Здзелка, заключаная юрыдычнай асобай у супярэчнасці з мэтамі яе дзейнасці або юрыдычнай асобай, якая не мае спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на займанне адпаведнай дзейнасцю, можа быць прызнана судом несапраўднай па іску ўласніка

маёмасці (заснавальніка, удзельніка) гэтай юрыдычнай асобы ці дзяржаўнага органа, які ажыццяўляе кантроль ці нагляд за дзейнасцю юрыдычнай асобы, калі іншы бок у здзелцы ведаў ці паводле акта заканадаўства абавязаны быў ведаць аб яе неправамернасці, але заключыў такую здзелку наўмысна ці па неасцярожнасці.

Артыкул 175. Наступствы абмежавання паўнамоцтваў на заключэнне здзелкі

Калі паўнамоцтвы асобы на заключэнне здзелкі абмежаваны дагаворам або паўнамоцтвы органа юрыдычнай асобы – яго ўстаноўчымі дакументамі ў параўнанні з тым, як яны вызначаны ў даверанасці, у заканадаўстве або як яны могуць лічыцца відавочнымі з абстаноўкі, у якой адбываецца здзелка, і пры яе заключэнні такая асоба ці орган выйшлі за межы гэтых абмежаванняў, здзелка можа быць прызнана судом несапраўднай па іску асобы, у інтарэсах якой устаноўлены абмежаванні.

Артыкул 176. Несапраўднасць здзелкі, заключанай непаўналетнім ва ўзросце ад чатырнаццаці да васямнаццаці гадоў

Здзелка, заключаная непаўналетнім ва ўзросце ад чатырнаццаці да васямнаццаці гадоў (акрамя поўнасцю дзеяздольнага) без згоды яго бацькоў, усынавіцеляў ці папячыцеля, у выпадках, калі такая згода патрабуецца ў адпаведнасці з артыкулам 25 гэтага Кодэкса, можа быць прызнана судом несапраўднай па іску бацькоў, усынавіцеляў ці папячыцеля. Калі такая здзелка прызнана несапраўднай, адпаведна прымяняюцца наступствы, прадугледжаныя часткамі другой і трэцяй пункта 1 артыкула 172 гэтага Кодэкса.

Артыкул 177. Несапраўднасць здзелкі, заключанай грамадзянінам, не здольным разумець значэнне сваіх дзеянняў і кіраваць імі

1. Здзелка, заключаная грамадзянінам, хоць і дзеяздольным, але які знаходзіцца ў момант яе заключэння ў такім стане, калі ён не быў здольны разумець значэнне сваіх дзеянняў ці кіраваць імі, можа быць прызнана судом несапраўднай па іску гэтага грамадзяніна або іншых асоб, чые правы ці інтарэсы, якія ахоўваюцца заканадаўствам, парушаны ў выніку яе заключэння.

2. Здзелка, заключаная грамадзянінам, які пасля быў прызнаны недзеяздольным, можа быць прызнана судом несапраўднай па іску яго апекуна, калі даказана, што ў момант заключэння здзелкі грамадзянін не быў здольны разумець значэнне сваіх дзеянняў ці кіраваць імі.

3. Калі здзелка прызнана несапраўднай на падставе гэтага артыкула, адпаведна прымяняюцца правілы, прадугледжаныя часткамі другой і трэцяй пункта 1 артыкула 172 гэтага Кодэкса.

Артыкул 178. Несапраўднасць здзелкі, заключанай грамадзянінам, абмежаваным судом у дзеяздольнасці

1. Здзелка па распараджэнні маёмасцю, заключаная без згоды папячыцеля грамадзянінам, абмежаваным судом у дзеяздольнасці ў выніку злоўжывання спіртнымі напіткамі, наркатычнымі сродкамі, псіхатропнымі рэчывамі, іх аналагамі, можа быць прызнана судом несапраўднай па іску папячыцеля. Калі такая здзелка прызнана несапраўднай, прымяняюцца наступствы, прадугледжаныя часткамі другой і трэцяй пункта 1 артыкула 172 гэтага Кодэкса.

2. Правілы гэтага артыкула не распаўсюджваюцца на дробныя бытавыя здзелкі, якія грамадзянін, абмежаваны ў дзеяздольнасці, мае права заключаць самастойна ў адпаведнасці з артыкулам 30 гэтага Кодэкса.

Артыкул 179. Несапраўднасць здзелкі, заключанай пад уплывам памылкі

1. Здзелка, заключаная пад уплывам памылкі, якая мае істотнае значэнне, можа быць прызнана судом несапраўднай па іску боку, які дзейнічаў пад уплывам памылкі.

Істотнае значэнне мае памылка адносна прыроды здзелкі, тоеснасці ці такіх якасцей яе прадмета, якія значна зніжаюць магчымасці яго выкарыстання па прызначэнні. Памылка адносна матываў здзелкі не мае істотнага значэння.

2. Калі здзелка прызнана несапраўднай як заключаная пад уплывам памылкі, адпаведна прымяняюцца правілы, прадугледжаныя пунктам 2 артыкула 168 гэтага Кодэкса.

Акрамя таго, бок, па іску якога здзелка прызнана несапраўднай, мае права патрабаваць ад другога боку пакрыцця прычыненага яму рэальнага ўрону, калі дакажа, што памылка ўзнікла па віне іншага боку. Калі гэта не будзе даказана, бок, па іску якога здзелка прызнана несапраўднай, абавязаны кампенсаваць іншаму боку па яго патрабаванні прычынены яму рэальны ўрон, нават калі памылка ўзнікла з-за абставін, якія не залежаць ад боку, які памыляўся.

Артыкул 180. Несапраўднасць здзелкі, заключанай пад уплывам падману, насілля, пагрозы, зламыснага пагаднення прадстаўніка аднаго боку з іншым бокам ці ў выніку збегу цяжкіх абставін

1. Здзелка, заключаная пад уплывам падману, насілля, пагрозы, зламыснага пагаднення прадстаўніка аднаго боку з іншым бокам, а таксама здзелка, якую асоба была вымушана заключыць у выніку збегу цяжкіх абставін на надзвычай не выгадных для сябе ўмовах, чым іншы бок скарыстаўся (кабальная здзелка), можа быць прызнана судом несапраўднай па іску любой зацікаўленай асобы.

2. Калі здзелка прызнана несапраўднай на адной з падстаў, указаных у пункце 1 гэтага артыкула, то пацярпеламу вяртаецца іншым бокам усё атрыманае ім па здзелцы, а пры немагчымасці вярнуць атрыманае ў натуры кампенсуецца кошт у грашах. Маёмасць, атрыманая па здзелцы пацярпелым ад іншага боку, а таксама таго, што належала яму як пакрыццё перададзенага іншаму боку, звяртаецца ў даход Рэспублікі Беларусь. Пры немагчымасці перадаць маёмасць у даход Рэспублікі Беларусь у натуры спаганяецца яе кошт у грашах. Акрамя таго, пацярпеламу кампенсуецца іншым бокам прычынены яму рэальны ўрон.

Артыкул 181. Наступствы несапраўднасці часткі здзелкі

Несапраўднасць часткі здзелкі не цягне за сабой несапраўднасці іншых яе частак, калі можна дапусціць, што здзелка была б заключана і без уключэння несапраўднай яе часткі.

Артыкул 182. Тэрміны іскавай даўнасці па несапраўдных здзелках

1. Іск аб устанаўленні факта нікчэмнасці здзелкі і аб прымяненні наступстваў яе несапраўднасці можа быць прад'яўлены на працягу дзесяці гадоў з дня, калі пачалося яе выкананне.

Заканадаўчымі актамі могуць быць устаноўлены іншыя тэрміны прад'яўлення іскаў аб устанаўленні факта нікчэмнасці асобных відаў здзелак і аб прымяненні наступстваў несапраўднасці такіх здзелак.

2. Іск аб прызнанні здзелкі, якая аспрэчваецца, несапраўднай ці аб прымяненні наступстваў яе несапраўднасці можа быць прад'яўлены на працягу трох гадоў з дня спынення насілля ці пагрозы, пад уплывам якіх была заключана здзелка (пункт 1 артыкула 180), або з дня, калі ісцец даведаўся ці павінен быў даведацца аб іншых абставінах, якія з'яўляюцца падставай для прызнання здзелкі несапраўднай.

ГЛАВА 10
ПРАДСТАЎНІЦТВА. ДАВЕРАНАСЦЬ

Артыкул 183. Прадстаўніцтва

1. Здзелка, заключаная адной асобай (прадстаўніком) ад імя іншай асобы (якая прадстаўляецца) паводле паўнамоцтва, заснаванага на даверанасці, заканадаўстве або акце ўпаўнаважанага на тое дзяржаўнага органа ці органа мясцовага кіравання і самакіравання, непасрэдна стварае, змяняе і спыняе грамадзянскія правы і абавязкі асобы, якая прадстаўляецца.

Паўнамоцтва можа таксама вынікаць з абстаноўкі, у якой дзейнічае прадстаўнік (прадавец у рознічным гандлі, касір і да т.п.).

2. Не з'яўляюцца прадстаўнікамі асобы, якія дзейнічаюць хоць і ў чужых інтарэсах, але ад уласнага імя (душапрыказчыкі пры атрыманні ў спадчыну і да т. п.), асобы, упаўнаважаныя на ўступленне ў перагаворы адносна магчымых у будучыні здзелак, а таксама часовыя (антыкрызісныя) кіраўнікі ў працэдуры банкруцтва, якія дзейнічаюць ад імя даўжніка.

3. Прадстаўнік не можа заключаць здзелкі ад імя асобы, якая прадстаўляецца, у адносінах да сябе асабіста. Ён не можа таксама заключаць здзелкі ў адносінах да іншай асобы, прадстаўніком якой ён адначасова з'яўляецца, за выключэннем выпадкаў камерцыйнага прадстаўніцтва.

4. Не дапускаецца заключэнне праз прадстаўніка здзелкі, якая па сваім характары можа быць заключана толькі асабіста, а таксама іншых здзелак, указаных у законе.

Артыкул 184. Заключэнне здзелкі неўпаўнаважанай асобай

1. Пры адсутнасці паўнамоцтваў дзейнічаць ад імя іншай асобы ці пры перавышэнні такіх паўнамоцтваў здзелка лічыцца заключанай ад імя і ў інтарэсах асобы, якая заключыла яе, калі толькі іншая асоба (якая прадстаўляецца) пасля прама не адобрыць гэту здзелку.

2. Далейшае адабрэнне здзелкі асобай, якая прадстаўляецца, стварае, змяняе і спыняе для яе грамадзянскія правы і абавязкі паводле гэтай здзелкі з моманту яе заключэння.

Артыкул 185. Камерцыйнае прадстаўніцтва

1. Камерцыйным прадстаўніком з'яўляецца асоба, якая пастаянна і самастойна з’яўляецца прадстаўніком ад імя прадпрымальнікаў пры заключэнні імі дагавораў у сферы прадпрымальніцкай дзейнасці.

2. Адначасова камерцыйнае прадстаўніцтва розных бакоў у здзелцы дапускаецца са згоды гэтых бакоў і ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам. Пры гэтым камерцыйны прадстаўнік абавязаны выконваць дадзенае яму даручэнне з клапатлівасцю звычайнага прадпрымальніка.

Камерцыйны прадстаўнік мае права патрабаваць выплаты абумоўленай узнагароды і пакрыцця панесеных ім пры выкананні даручэння выдаткаў ад бакоў дагавора ў роўных долях, калі іншае не прадугледжана пагадненнем паміж імі.

3. Камерцыйнае прадстаўніцтва ажыццяўляецца на падставе дагавора, які заключаны ў пісьмовай форме і ўтрымлівае ўказанні на паўнамоцтвы прадстаўніка, а пры адсутнасці такіх указанняў – таксама і даверанасці.

Камерцыйны прадстаўнік абавязаны захоўваць у тайне звесткі аб гандлёвых здзелках, якія сталі яму вядомымі, і пасля выканання дадзенага яму даручэння.

4. Асаблівасці камерцыйнага прадстаўніцтва ў асобных сферах прадпрымальніцкай дзейнасці ўстанаўлівае заканадаўства.

Артыкул 186. Даверанасць

1. Даверанасцю прызнаецца пісьмовае ўпаўнаважанне, якое выдае з улікам патрабаванняў гэтага артыкула адна асоба іншай для прадстаўніцтва перад трэцімі асобамі. Пісьмовае ўпаўнаважанне на заключэнне здзелкі прадстаўніком можа быць прад'яўлена асобай, якая прадстаўляецца, непасрэдна адпаведнай трэцяй асобе.

2. Даверанасць на заключэнне здзелак, якія патрабуюць натарыяльнай формы, павінна быць засведчана натарыяльна або ў адпаведнасці з пунктам 3 гэтага артыкула, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

3. Да натарыяльна пасведчаных даверанасцей прыраўноўваюцца:

1) даверанасці ваеннаслужачых і іншых асоб, якія знаходзяцца на лячэнні ў шпіталях, санаторыях і іншых ваенна-лячэбных установах, пасведчаныя начальнікамі такіх устаноў, іх намеснікамі па медыцынскай частцы, старэйшымі ці дзяжурнымі ўрачамі;

2) даверанасці ваеннаслужачых, а ў пунктах дыслакацыі воінскіх часцей, злучэнняў, устаноў і ўстаноў адукацыі, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку кадраў па спецыяльнасцях (напрамках спецыяльнасцей, спецыялізацыях) для Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў Рэспублікі Беларусь, у якіх няма натарыяльных кантор, натарыяльных бюро і іншых органаў, якія здзяйсняюць натарыяльныя дзеянні, таксама даверанасці працоўных у гэтых частках, злучэннях, установах грамадзянскіх асоб, членаў іх сямей і членаў сямей ваеннаслужачых, пасведчаныя камандзірамі (начальнікамі) гэтых частак, злучэнняў ці ўстаноў;

3) даверанасці асоб, якія знаходзяцца ва ўстановах, якія выконваюць пакаранне ў выглядзе арышту, абмежавання свабоды, пазбаўлення свабоды, пажыццёвага заключэння, ці месцах утрымання пад вартай, пасведчаныя начальнікамі адпаведных устаноў, якія выконваюць пакаранне, ці кіраўнікамі адміністрацый месцаў утрымання пад вартай;

4) выключаны;

5) даверанасці грамадзян, якія знаходзяцца на лячэнні ў бальніцах, шпіталях, іншых арганізацыях аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах, ці якія пражываюць ва ўстановах сацыяльнага абслугоўвання, якія ажыццяўляюць стацыянарнае сацыяльнае абслугоўванне, пасведчаныя галоўнымі ўрачамі, іх намеснікамі па медыцынскай частцы ці дзяжурнымі ўрачамі гэтых бальніц, шпіталяў і іншых арганізацый аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах, а таксама начальнікамі шпіталяў, кіраўнікамі (іх намеснікамі) устаноў сацыяльнага абслугоўвання, якія ажыццяўляюць стацыянарнае сацыяльнае абслугоўванне, кіраўнікамі (іх намеснікамі) адпаведных органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

4. Даверанасці на атрыманне грамадзянамі заработнай платы і іншых плацяжоў, звязаных з працоўнымі адносінамі, на атрыманне ўзнагароды аўтараў і вынаходнікаў, пенсій, дапамог і стыпендый, выплат грамадзянам у банках ці нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацыях і на атрыманне карэспандэнцыі, у тым ліку грашовай і пасылачнай, на ўчыненне іншых дзеянняў, якія не патрабуюць натарыяльнай формы пасведчання, па выбары грамадзяніна сведчацца натарыяльна ці ў адпаведнасці з пунктам 3 гэтага артыкула або арганізацыяй, у якой давернік працуе ці вучыцца, арганізацыяй, якая ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду і (ці) прадастаўляе жыллёва-камунальныя паслугі, па месцы яго жыхарства.

Даверанасці на атрыманне грамадзянамі выплат у банках ці нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацыях, а таксама на распараджэнне грашовымі сродкамі грамадзян, якія знаходзяцца на іх банкаўскіх рахунках ці размешчанымі на іх банкаўскія ўклады (дэпазіты), могуць быць пасведчаны таксама банкам ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыяй, у якіх адкрыты банкаўскі рахунак ці размешчаны банкаўскі ўклад (дэпазіт).

У выпадку звароту грамадзяніна за пасведчаннем даверанасці, указанай у частках першай і другой гэтага пункта, арганізацыя, у якой давернік працуе ці вучыцца, арганізацыя, якая ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду і (ці) прадастаўляе жыллёва-камунальныя паслугі, па месцы яго жыхарства, банк ці нябанкаўская крэдытна-фінансавая арганізацыя, у якіх адкрыты яго банкаўскі рахунак або размешчаны яго банкаўскі ўклад (дэпазіт), абавязаны засведчыць такую даверанасць, калі яе змест не супярэчыць патрабаванням гэтага Кодэкса і іншых заканадаўчых актаў.

5. Даверанасць ад імя юрыдычнай асобы выдаецца за подпісам яе кіраўніка ці іншай асобы, упаўнаважанай на гэта ўстаноўчым дакументам гэтай арганізацыі. Кіраўнік юрыдычнай асобы ў межах сваёй кампетэнцыі дзейнічае ад яе імя без даверанасці.

Даверанасць ад імя юрыдычнай асобы, заснаванай на ўласнасці Рэспублікі Беларусь ці ўласнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, на атрыманне ці выдачу грошай і іншых маёмасных каштоўнасцей павінна быць падпісана таксама галоўным бухгалтарам гэтай арганізацыі, кіраўніком арганізацыі ці індывідуальным прадпрымальнікам, які аказвае паслугі па вядзенні бухгалтарскага ўліку і складанні справаздачнасці, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі.

6. Даверанасць уступае ў сілу з дня яе заключэння ў неабходнай форме, калі пасведчання гэтай даверанасці не патрабуецца, або з дня яе пасведчання, калі яно патрабуецца, калі больш позні тэрмін уступлення ў сілу не прадугледжаны даверанасцю.

Артыкул 187. Тэрмін дзеяння даверанасці

1. Тэрмін дзеяння даверанасці не можа перавышаць трох гадоў. Калі тэрмін дзеяння ў даверанасці не ўказаны, яна захоўвае сілу на працягу аднаго года з дня яе заключэння. Даверанасць, у якой не ўказана дата яе заключэння, нікчэмная.

2. Пасведчаная натарыусам даверанасць, якая прызначана для выканання дзеянняў за мяжой і не ўтрымлівае ўказання аб тэрміне яе дзеяння, захоўвае сілу да яе адмены асобай, якая выдала даверанасць.

Артыкул 188. Перадавер'е

1. Асоба, якой выдадзена даверанасць, павінна асабіста здзяйсняць тыя дзеянні, на якія яна ўпаўнаважана. Яна можа перадаверыць іх здзяйсненне іншай асобе, калі ўпаўнаважана на гэта даверанасцю або вымушана да гэтага сілаю абставін для аховы інтарэсаў асобы, якая выдала даверанасць.

2. Даверанасць, якая выдаецца ў парадку перадавер'я, павінна быць натарыяльна засведчана, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктам 4 артыкула 186 гэтага Кодэкса.

3. Тэрмін дзеяння даверанасці, выдадзенай у парадку перадавер'я, не можа перавышаць тэрміну дзеяння даверанасці, на падставе якой яна выдадзена.

4. Асоба, якая перадала паўнамоцтвы іншай асобе, павінна паведаміць аб гэтым асобе, якая выдала даверанасць, і паведаміць ёй неабходныя звесткі аб асобе, якой перададзены паўнамоцтвы. Невыкананне гэтага абавязку ўскладае на асобу,

якая перадала паўнамоцтвы, адказнасць за дзеянні асобы, якой яна перадала паўнамоцтвы, як за свае ўласныя.

Артыкул 189. Спыненне даверанасці

1. Дзеянне даверанасці спыняецца ў выніку:

1) сканчэння тэрміну дзеяння даверанасці;

2) адмены даверанасці асобай, якая выдала яе;

3) адмовы асобы, якой выдадзена даверанасць;

4) спынення юрыдычнай асобы, ад імя якой выдадзена даверанасць;

5) спынення юрыдычнай асобы, якой выдадзена даверанасць;

6) смерці грамадзяніна, які выдаў даверанасць, аб'яўленні яго памерлым, прызнання яго недзеяздольным, абмежавана дзеяздольным ці адсутным без вестак;

7) смерці грамадзяніна, якому выдадзена даверанасць, аб'яўлення яго памерлым, прызнання яго недзеяздольным, абмежавана дзеяздольным ці адсутным без вестак.

2. Асоба, якая выдала даверанасць, можа ў любы час адмяніць даверанасць ці перадавер'е, а асоба, якой даверанасць выдадзена, – адмовіцца ад яе. Пагадненне аб адмове ад гэтых правоў нікчэмнае.

3. Са спыненнем даверанасці губляе сілу перадавер'е.

Артыкул 190. Наступствы спынення даверанасці

1. Асоба, якая выдала даверанасць і пасля адмяніла яе, абавязана паведаміць аб яе адмене асобе, якой даверанасць выдадзена, а таксама вядомым ёй трэцім асобам, для прадстаўніцтва перад якімі дадзена даверанасць. Такі ж абавязак ускладаецца на праваперaемнікаў асобы, якая выдала даверанасць, у выпадках яе спынення на падставах, прадугледжаных падпунктамі 4 і 6 пункта 1 артыкула 189 гэтага Кодэкса.

2. Правы і абавязкі, якія ўзніклі ў выніку дзеянняў асобы, якой выдадзена даверанасць, да таго, як гэта асоба даведалася ці павінна была даведацца аб яе спыненні, захоўваюць сілу для асобы, якая выдала даверанасць і яе праваперaемнікаў у адносінах да трэціх асоб. Гэта правіла не прымяняецца, калі трэцяя асоба ведала ці павінна была ведаць, што дзеянне даверанасці спынілася.

3. Пасля спынення даверанасці асоба, якой яна выдадзена, ці яе праваперaемнікі абавязаны неадкладна вярнуць даверанасць.

ПАДРАЗДЗЕЛ 5
ТЭРМІНЫ. ІСКАВАЯ ДАЎНАСЦЬ
ГЛАВА 11
ПАДЛІК ТЭРМІНАЎ

Артыкул 191. Вызначэнне тэрміну

1. Тэрмін, які ўстаноўлены заканадаўствам, здзелкай ці прызначаны судом, вызначаецца каляндарнай датай ці сканчэннем перыяду часу, які вылічаецца гадамі, месяцамі, тыднямі, днямі ці гадзінамі.

2. Тэрмін можа вызначацца таксама ўказаннем на падзею, якая павінна няўхільна надысці.

Артыкул 192. Пачатак тэрміну, вызначанага перыядам часу

Цячэнне тэрміну, вызначанага перыядам часу, пачынаецца на наступны дзень пасля каляндарнай даты ці надыходу падзеі, якімі вызначаны яго пачатак.

Артыкул 193. Заканчэнне тэрміну, вызначанага перыядам часу

1. Тэрмін, які вылічаецца гадамі, канчаецца ў адпаведныя месяц і дзень апошняга года тэрміну.

Да тэрміну, вызначанаму ў паўгода, прымяняюцца правілы для тэрмінаў, якія вылічаюцца месяцамі. Пры гэтым паўгода лічацца роўнымі адпаведным шасці месяцам.

2. Да тэрміну, які вылічаецца кварталамі года, прымяняюцца правілы для тэрмінаў, якія вылічаюцца месяцамі. Пры гэтым квартал лічыцца роўным тром месяцам, а адлік кварталаў вядзецца з пачатку года.

3. Тэрмін, які вылічаецца месяцамі, канчаецца ў адпаведны дзень апошняга месяца тэрміну.

Калі заканчэнне тэрміну, які вылічаецца месяцамі, прыпадае на такі месяц, у якім няма адпаведнай лічбы, то тэрмін канчаецца ў апошні дзень гэтага месяца.

Тэрмін, вызначаны ў паўмесяца, разглядаецца як тэрмін, які вылічаецца днямі, і лічыцца роўным пятнаццаці дням.

4. Тэрмін, які вылічаецца тыднямі, канчаецца ў адпаведны дзень апошняга тыдня тэрміну.

Артыкул 194. Заканчэнне тэрміну ў нерабочы дзень

Калі апошні дзень тэрміну прыпадае на нерабочы дзень, днём заканчэння тэрміну лічыцца найбліжэйшы наступны за ім рабочы дзень.

Артыкул 195. Парадак выканання дзеянняў у апошні дзень тэрміну

1. Калі тэрмін устаноўлены для выканання якога-небудзь дзеяння, яно можа быць выканана да дваццаці чатырох гадзін апошняга дня тэрміну.

Аднак калі гэта дзеянне павінна быць выканана ў арганізацыі, то тэрмін канчаецца ў тую гадзіну, калі ў гэтай арганізацыі па ўстаноўленых правілах спыняюцца адпаведныя аперацыі.

2. Пісьмовыя заявы і паведамленні, здадзеныя на пошту, тэлеграф ці ў іншую ўстанову сувязі да дваццаці чатырох гадзін апошняга дня тэрміну, лічацца зробленымі ў тэрмін.

ГЛАВА 12
ІСКАВАЯ ДАЎНАСЦЬ

Артыкул 196. Паняцце іскавай даўнасці

Іскавай даўнасцю прызнаецца тэрмін для абароны права па іску асобы, права якой парушана.

Артыкул 197. Агульны тэрмін іскавай даўнасці

Агульны тэрмін іскавай даўнасці ўстанаўліваецца ў тры гады.

Артыкул 198. Спецыяльныя тэрміны іскавай даўнасці

1. Для асобных відаў патрабаванняў гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі могуць устанаўлівацца спецыяльныя тэрміны іскавай даўнасці, скарочаныя ці больш працяглыя ў параўнанні з агульным тэрмінам.

2. Правілы артыкулаў 199–208 гэтага Кодэкса распаўсюджваюцца таксама на спецыяльныя тэрміны даўнасці, калі гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі не ўстаноўлена іншае.

Артыкул 199. Несапраўднасць пагаднення аб змяненні тэрмінаў іскавай даўнасці

Тэрміны іскавай даўнасці і парадак іх вылічэння не могуць быць зменены пагадненнем бакоў.

Падставы прыпынення і перапынку цячэння тэрмінаў іскавай даўнасці ўстанаўліваюцца заканадаўчымі актамі.

Артыкул 200. Прымяненне іскавай даўнасці

1. Патрабаванне аб абароне парушанага права суд прымае да разгляду незалежна ад сканчэння тэрміну іскавай даўнасці.

2. Іскавая даўнасць прымяняецца судом толькі па заяве боку ў спрэчцы, зробленай да вынясення судом рашэння.

Сканчэнне тэрміну іскавай даўнасці, аб прымяненні якой заяўлена бокам у спрэчцы, з'яўляецца падставай да вынясення судом рашэння аб адмове ў іску.

Артыкул 201. Пачатак цячэння тэрміну іскавай даўнасці

1. Цячэнне тэрміну іскавай даўнасці пачынаецца з дня, калі асоба даведалася ці павінна была даведацца аб парушэнні свайго права. Выключэнні з гэтага правіла ўстанаўліваюцца заканадаўчымі актамі.

2. Па абавязацельствах з пэўным тэрмінам выканання цячэнне іскавай даўнасці пачынаецца пасля заканчэння тэрміну выканання.

Па абавязацельствах, тэрмін выканання якіх не вызначаны або вызначаны момантам запатрабавання, цячэнне тэрміну іскавай даўнасці пачынаецца, калі ў крэдытора ўзнікае права прад'явіць патрабаванне аб выкананні абавязацельства, а калі даўжніку даецца льготны тэрмін для выканання такога патрабавання, вылічэнне тэрміну іскавай даўнасці пачынаецца пасля заканчэння ўказанага тэрміну.

3. Па рэгрэсных абавязацельствах цячэнне тэрміну іскавай даўнасці пачынаецца з моманту выканання асноўнага абавязацельства.

Артыкул 202. Тэрмін іскавай даўнасці пры перамене асоб у абавязацельстве

Перамена асоб у абавязацельстве не цягне за сабой змянення тэрміну іскавай даўнасці і парадку яго вылічэння.

Артыкул 203. Прыпыненне цячэння тэрміну іскавай даўнасці

1. Цячэнне тэрміну іскавай даўнасці прыпыняецца:

1) калі прад'яўленню іску перашкаджала надзвычайная і непазбежная пры гэтых умовах акалічнасць (непераадольная сіла);

2) калі ісцец ці адказчык знаходзіцца ў складзе Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, пераведзеных на ваенны стан;

3) з прычыны ўстаноўленай на падставе заканадаўчага акта Урадам Рэспублікі Беларусь адтэрміноўкі выканання абавязацельстваў (мараторый);

4) з прычыны прыпынення дзеяння акта заканадаўства, які рэгулюе адпаведныя адносіны;

5) калі прад'яўлена прэтэнзія;

6) калі заключана пагадненне аб прымяненні медыяцыі.

2. Цячэнне тэрміну іскавай даўнасці прыпыняецца пры ўмове, калі ўказаныя ў гэтым артыкуле акалічнасці ўзніклі ці працягвалі існаваць у апошнія шэсць месяцаў тэрміну даўнасці, а калі гэты тэрмін роўны шасці месяцам ці меншы за шэсць месяцаў, – на працягу тэрміну даўнасці.

3. З дня спынення акалічнасці, якая паслужыла падставай прыпынення даўнасці, цячэнне яе тэрміну працягваецца. Частка тэрміну, якая засталася, падаўжаецца да шасці месяцаў, а калі тэрмін іскавай даўнасці роўны шасці месяцам ці меншы за шэсць месяцаў, – да тэрміну даўнасці.

Пры прад'яўленні прэтэнзіі цячэнне тэрміну іскавай даўнасці прыпыняецца з дня накіравання прэтэнзіі да атрымання адказу на прэтэнзію ці сканчэння тэрміну для адказу, устаноўленага заканадаўствам ці дагаворам.

У выпадку заключэння пагаднення аб прымяненні медыяцыі цячэнне тэрміну іскавай даўнасці прыпыняецца з дня заключэння такога пагаднення да дня спынення медыяцыі.

Артыкул 204. Перапынак цячэння тэрміну іскавай даўнасці

Цячэнне тэрміну іскавай даўнасці перапыняецца прад'яўленнем іску ва ўстаноўленым парадку, а таксама выкананнем абавязанай асобай дзеянняў, якія сведчаць аб прызнанні доўгу.

Пасля перапынку цячэнне тэрміну іскавай даўнасці пачынаецца нанава. Час, які скончыўся да перапынку, не залічваецца ў новы тэрмін.

Артыкул 205. Цячэнне тэрміну іскавай даўнасці ў выпадку пакідання іску без разгляду

Калі іск пакінуты судом без разгляду, то цячэнне тэрміну іскавай даўнасці, якое пачалося да прад'яўлення іску, працягваецца ў агульным парадку.

Калі судом пакінуты без разгляду іск, прад'яўлены ў крымінальнай справе, то цячэнне тэрміну іскавай даўнасці, якое пачалося да прад'яўлення іску, прыпыняецца да ўступлення ў законную сілу прыгавору, якім іск пакінуты без разгляду. Час, на працягу якога даўнасць была прыпынена, не залічваецца ў тэрмін іскавай даўнасці. Пры гэтым калі частка тэрміну, якая засталася, меншая за шэсць месяцаў, яна падаўжаецца да шасці месяцаў.

Артыкул 206. Аднаўленне тэрміну іскавай даўнасці

У выключных выпадках, калі суд прызнае ўважлівай прычыну пропуску тэрміну іскавай даўнасці з-за абставін, звязаных з асобай істца (цяжкая хвароба, бездапаможны стан, непісьменнасць і да т. п.), парушанае права грамадзяніна падлягае абароне. Прычыны пропуску тэрміну іскавай даўнасці могуць прызнавацца ўважлівымі, калі яны мелі месца ў апошнія шэсць месяцаў тэрміну даўнасці, а калі гэты тэрмін роўны шасці месяцам ці меншы за шэсць месяцаў, – на працягу тэрміну даўнасці.

Артыкул 207. Выкананне абавязку пасля сканчэння тэрміну іскавай даўнасці

У выпадку выканання абавязку даўжніком ці іншай абавязанай асобай пасля сканчэння тэрміну іскавай даўнасці гэтыя асобы не маюць права патрабаваць выкананае назад, хоць бы ў момант выканання яны і не ведалі аб сканчэнні тэрміну даўнасці.

Артыкул 208. Прымяненне іскавай даўнасці да дадатковых патрабаванняў

Са сканчэннем тэрміну іскавай даўнасці па галоўным патрабаванні заканчваецца тэрмін іскавай даўнасці і па дадатковых патрабаваннях (няўстойка, заклад, паручыцельства і да т. п.).

Артыкул 209. Патрабаванні, на якія іскавая даўнасць не распаўсюджваецца

Іскавая даўнасць не распаўсюджваецца на:

1) патрабаванні, якія вынікаюць з парушэння асабістых немаёмасных правоў і іншых нематэрыяльных даброт, акрамя выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі;

2) патрабаванні ўкладчыкаў да банку ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі аб вяртанні банкаўскіх укладаў (дэпазітаў);

3) патрабаванні аб пакрыцці шкоды, прычыненай жыццю ці здароўю грамадзяніна. Аднак патрабаванні, прад'яўленыя пасля сканчэння трох гадоў з моманту ўзнікнення права на пакрыццё шкоды, задавальняюцца не больш чым за тры гады, якія папярэднічалі прад'яўленню іска;

4) патрабаванні ўласніка ці іншага законнага ўладальніка аб ліквідацыі ўсякіх парушэнняў яго права, хоць бы гэтыя парушэнні і не былі злучаны з пазбаўленнем валодання (артыкул 285);

5) іншыя патрабаванні ў выпадках, устаноўленых заканадаўчымі актамі.

РАЗДЗЕЛ II
ПРАВА ЎЛАСНАСЦІ І ІНШЫЯ РЭЧАВЫЯ ПРАВЫ

ГЛАВА 13
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 210. Змест права ўласнасці

1. Уласніку належаць правы валодання, карыстання і распараджэння сваёй маёмасцю.

2. Уласнік мае права па сваім меркаванні выконваць у адносінах да прыналежнай яму маёмасці любыя дзеянні, якія не супярэчаць заканадаўству, грамадскай карысці і бяспецы, якія не наносяць шкоды навакольнаму асяроддзю, гісторыка-культурным каштоўнасцям і не ўшчамляюць правоў і інтарэсаў іншых асоб, якія абараняюцца законам, у тым ліку адчужаць сваю маёмасць ва ўласнасць іншым асобам, перадаваць ім, застаючыся ўласнікам, правы валодання, карыстання і распараджэння маёмасцю, аддаваць маёмасць у заклад і абцяжарваць яе іншымі спосабамі, а таксама распараджацца ёй іншым чынам.

Права ўласнасці на маёмасць, набытую ўнітарным прадпрыемствам, дзяржаўным аб'яднаннем ці ўстановай паводле дагавораў ці іншых падстаў, набывае ўласнік маёмасці гэтага ўнітарнага прадпрыемства, дзяржаўнага аб'яднання ці ўстановы.

3. Валоданне, карыстанне і распараджэнне зямлёй і іншымі прыроднымі рэсурсамі ў той меры, у якой іх абарачэнне дапускаецца заканадаўствам, ажыццяўляе іх уласнік свабодна, калі гэта не наносіць урону навакольнаму асяроддзю і не парушае правы і інтарэсы іншых асоб, якія абараняюцца законам.

4. Уласнік можа перадаць сваю маёмасць у давернае кіраванне іншай асобе (давернаму кіраўніку). Перадача маёмасці ў давернае кіраванне не цягне за сабой пераходу права ўласнасці да давернага кіраўніка, які абавязаны ажыццяўляць кіраванне маёмасцю ў інтарэсах уласніка ці ўказанай ім трэцяй асобы.

5. Права ўласнасці бестэрміновае.

Артыкул 211. Цяжар утрымання маёмасці

Уласнік нясе цяжар утрымання прыналежнай яму маёмасці, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам.

Артыкул 212. Рызыка выпадковай гібелі маёмасці

Рызыку выпадковай гібелі, выпадковага псавання ці выпадковага пашкоджання маёмасці нясе яе ўласнік, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам.

Артыкул 213. Формы і суб'екты права ўласнасці

1. Уласнасць можа быць дзяржаўнай і прыватнай.

2. Суб'ектамі права дзяржаўнай уласнасці з'яўляюцца Рэспубліка Беларусь і адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі.

3. Суб'ектамі права прыватнай уласнасці з'яўляюцца фізічныя і недзяржаўныя юрыдычныя асобы.

4. Асаблівасці набыцця і спынення права ўласнасці на маёмасць, валодання, карыстання і распараджэння ёй у залежнасці ад таго, знаходзіцца маёмасць ва ўласнасці грамадзяніна ці юрыдычнай асобы, ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь ці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, могуць устанаўлівацца заканадаўствам, а ў выпадках, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, – толькі законам.

5. Правы ўсіх уласнікаў абараняюцца роўным чынам.

Артыкул 214. Права ўласнасці грамадзян і юрыдычных асоб

1. Ва ўласнасці грамадзян і юрыдычных асоб можа знаходзіцца любая маёмасць, за выключэннем асобных відаў маёмасці, якая ў адпаведнасці з законам не можа знаходзіцца ва ўласнасці грамадзян ці юрыдычных асоб.

2. Колькасць і кошт маёмасці, якая знаходзіцца ва ўласнасці грамадзян, не абмяжоўваюцца, за выключэннем выпадкаў, калі такія абмежаванні ўстаноўлены законам у інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маральнасці, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб. Для юрыдычных асоб такія абмежаванні могуць быць устаноўлены заканадаўчымі актамі.

3. Маёмасць, перададзеная ў якасці ўкладаў (узносаў) заснавальнікамі (удзельнікамі, членамі) камерцыйным і некамерцыйным арганізацыям (акрамя перададзенай унітарным прадпрыемствам, дзяржаўным аб'яднанням або ўстановам, якія фінансуюцца ўласнікам), а таксама маёмасць, набытая гэтымі юрыдычнымі асобамі, знаходзіцца ва ўласнасці гэтых юрыдычных асоб.

4. Заснавальнікі (удзельнікі, члены) камерцыйнай арганізацыі ў адносінах да маёмасці, якая знаходзіцца ва ўласнасці гэтай арганізацыі, маюць абавязацельныя правы, якія вызначаюцца ў яе ўстаноўчых дакументах.

5. Маёмасць, набытая грамадскімі і рэлігійнымі арганізацыямі, дабрачыннымі і іншымі фондамі, знаходзіцца ў іх уласнасці і можа выкарыстоўвацца толькі для дасягнення мэт, прадугледжаных іх устаноўчымі дакументамі.

Заснавальнікі (удзельнікі, члены) гэтых арганізацый губляюць права на маёмасць, перададзеную імі ва ўласнасць адпаведнай арганізацыі. У выпадку ліквідацыі такой арганізацыі яе маёмасць, якая засталася пасля задавальнення патрабаванняў крэдытораў, выкарыстоўваецца ў мэтах, указаных у яе ўстаноўчых дакументах.

Артыкул 215. Права дзяржаўнай уласнасці

1. Дзяржаўная ўласнасць выступае ў выглядзе рэспубліканскай уласнасці (уласнасць Рэспублікі Беларусь) і камунальнай уласнасці (уласнасць адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак).

2. Рэспубліканская ўласнасць складаецца з казны Рэспублікі Беларусь і маёмасці, замацаванай за рэспубліканскімі юрыдычнымі асобамі ў адпаведнасці з актамі заканадаўства.

Сродкі рэспубліканскага бюджэту, золатавалютныя рэзервы, іншыя аб'екты, якія знаходзяцца толькі ва ўласнасці дзяржавы, і іншая дзяржаўная маёмасць, не замацаваныя за рэспубліканскімі юрыдычнымі асобамі, складаюць казну Рэспублікі Беларусь.

3. Камунальная ўласнасць складаецца з казны адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі і маёмасці, замацаванай за камунальнымі юрыдычнымі асобамі ў адпаведнасці з актамі заканадаўства. Сродкі мясцовага бюджэту і іншая

камунальная маёмасць, не замацаваная за камунальнымі юрыдычнымі асобамі, складаюць казну адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі.

Артыкул 216. Маёмасць дзяржаўных юрыдычных асоб

Маёмасць, якая знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці, можа замацоўвацца за дзяржаўнымі юрыдычнымі асобамі на праве гаспадарчага распараджэння ці аператыўнага кіравання.

Артыкул 217. Рэчавыя правы асоб, якія не з'яўляюцца ўласнікамі

1. Рэчавымі правамі нароўні з правам уласнасці, у прыватнасці, з'яўляюцца:

1) права гаспадарчага распараджэння і права аператыўнага кіравання (артыкулы 276 і 277);

2) права пажыццёвага валодання зямельным участкам, якое атрымліваецца ў спадчыну;

3) права пастаяннага карыстання зямельным участкам і права часовага карыстання зямельным участкам;

4) сервітуты (артыкул 268).

2. Пераход права ўласнасці на маёмасць да іншай асобы не з'яўляецца падставай для спынення іншых рэчавых правоў на гэту маёмасць.

3. Рэчавыя правы асобы, якая не з'яўляецца ўласнікам, абараняюцца ад іх парушэння ў парадку, прадугледжаным артыкулам 286 гэтага Кодэкса.

Артыкул 218. Прыватызацыя дзяржаўнай маёмасці

Прыватызацыя маёмасці, якая знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці, ажыццяўляецца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам аб прыватызацыі.

Пры прыватызацыі маёмасці, якая знаходзіцца ў рэспубліканскай і камунальнай уласнасці, прадугледжаныя гэтым Кодэксам палажэнні, якія рэгулююць парадак набыцця і спынення права ўласнасці, прымяняюцца, калі заканадаўствам аб прыватызацыі не прадугледжана іншае.

ГЛАВА 14
НАБЫЦЦЁ ПРАВА ЎЛАСНАСЦІ

Артыкул 219. Падставы набыцця права ўласнасці

1. Права ўласнасці на новую рэч, выробленую ці створаную асобай для сябе з прытрымліваннем заканадаўства, набывае гэта асоба.

Права ўласнасці на набыткі, прадукцыю, даходы, атрыманыя ў выніку выкарыстання маёмасці, набываецца на падставах, прадугледжаных артыкулам 136 гэтага Кодэкса.

2. Права ўласнасці на маёмасць, якая мае ўласніка, можа быць набыта іншай асобай на падставе дагавора куплі-продажу, мены, дарэння ці іншай здзелкі аб адчужэнні гэтай маёмасці.

У выпадку смерці грамадзяніна права ўласнасці на яго маёмасць атрымліваецца ў спадчыну ў адпаведнасці з завяшчаннем ці законам.

У выпадку рэарганізацыі юрыдычнай асобы права ўласнасці на прыналежную яму маёмасць пераходзіць да юрыдычных асоб – праваперaемнікаў рэарганізаванай юрыдычнай асобы (артыкул 54).

Адчужэнне маёмасці іншай асобе без волі ўласніка не дапускаецца, акрамя выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам.

3. У выпадках і парадку, прадугледжаных заканадаўствам, асоба можа набыць права ўласнасці на маёмасць, якая не мае ўласніка, на маёмасць, уласнік якой невядомы, або на маёмасць, ад якой уласнік адмовіўся ці на якую ён страціў права ўласнасці на іншых падставах, прадугледжаных заканадаўствам.

4. Члены жыллёвага, жыллёва-будаўнічага, дачнага, гаражнага ці іншага спажывецкага кааператыва, іншыя асобы, якія маюць права на паенакапленні, якія поўнасцю ўнеслі свой паявы ўзнос за кватэру, дачу, гараж, іншае памяшканне, машына-месца, дадзеныя гэтым асобам кааператывам у карыстанне, набываюць права ўласнасці на ўказаную маёмасць з моманту рэгістрацыі гэтага права ва ўстаноўленым парадку.

Артыкул 220. Узнікненне права ўласнасці на нерухомую маёмасць, якая нанава ствараецца

1. Права ўласнасці на капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), якія будуюцца, і іншую нерухомую маёмасць, якая нанава ствараецца, узнікае з моманту завяршэння стварэння гэтай маёмасці, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам.

2. У выпадках, калі нерухомая маёмасць, якая нанава ствараецца, падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі, права ўласнасці на яе ўзнікае з моманту такой рэгістрацыі, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам.

3. Да завяршэння стварэння нерухомай маёмасці, а ў адпаведных выпадках – да яе дзяржаўнай рэгістрацыі, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам, да маёмасці прымяняюцца правілы аб праве ўласнасці на матэрыялы і іншую маёмасць, з якой нерухомая маёмасць ствараецца.

Артыкул 221. Перапрацоўка

1. Паколькі іншае не прадугледжана дагаворам, права ўласнасці на новую рухомую рэч, якую асоба вырабіла шляхам перапрацоўкі неналежных ёй матэрыялаў, набывае ўласнік матэрыялаў. Аднак калі кошт перапрацоўкі істотна перавышае кошт матэрыялаў, права ўласнасці на новую рэч набывае асоба, якая, дзейнічаючы добрасумленна, ажыццявіла перапрацоўку для сябе.

2. Калі іншае не прадугледжана дагаворам, уласнік матэрыялаў, які набыў права ўласнасці на выробленую з іх рэч, абавязаны кампенсаваць кошт перапрацоўкі асобе, якая ажыццявіла яе, а ў выпадку набыцця права ўласнасці на новую рэч гэтай асобай апошняя абавязана кампенсаваць уласніку матэрыялаў іх кошт.

3. Уласнік матэрыялаў, які страціў іх у выніку нядобрасумленных дзеянняў асобы, якая ажыццявіла перапрацоўку, мае права патрабаваць перадачы новай рэчы ў яго ўласнасць і пакрыцця прычыненых яму страт.

Артыкул 222. Накіраванне ва ўласнасць агульнадаступных для збору рэчаў

У выпадках, калі ў адпаведнасці з заканадаўствам, агульным дазволам, дадзеным уласнікам, ці ў адпаведнасці з мясцовым звычаем у лясах, вадаёмах ці на іншай тэрыторыі дапускаецца збор ягад, лоўля рыбы, збор ці здабыча іншых агульнадаступных рэчаў і жывёл, права ўласнасці на адпаведныя рэчы набывае асоба, якая ажыццявіла іх збор ці здабычу.

Артыкул 223. Самавольнае будаўніцтва і яго наступствы

1. Самавольнае будаўніцтва – дзейнасць асобы па стварэнні ці змяненні нерухомай маёмасці шляхам будаўніцтва, рэканструкцыі (прыбудовы, надбудовы, перабудовы) капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), калі яна ажыццёўлена:

1) на самавольна занятым зямельным участку;

2) на зямельным участку, які выкарыстоўваецца не па мэтавым прызначэнні або дадзеным дзяржаўным органам, які не мае паўнамоцтваў на прыняцце адпаведнага рашэння, і (ці) без правядзення аўкцыёну, калі даванне зямельнага ўчастка магчымае толькі па выніках аўкцыёну, і (ці) дадзеным з парушэннем

устаноўленай чарговасці давання зямельных участкаў, і (ці) без папярэдняга ўзгаднення месца размяшчэння зямельнага ўчастка, калі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі патрабуецца яго правядзенне;

3) без атрымання неабходных дазволаў на будаўніцтва, рэканструкцыю або без праектнай дакументацыі ў выпадках, калі неабходнасць яе падрыхтоўкі прадугледжана заканадаўствам, або з істотнымі парушэннямі горадабудаўнічых і будаўнічых нормаў і правілаўкалі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Нерухомая маёмасць, створаная ў выніку самавольнага будаўніцтва, з'яўляецца самавольнай пабудовай.

Самавольнае будаўніцтва павінна быць неадкладна прыпынена.

---

*Пад істотнымі парушэннямі горадабудаўнічых і будаўнічых нормаў і правілаў для мэт гэтага Кодэкса разумеюцца парушэнні, якія могуць стварыць патэнцыяльную пагрозу парушэння правоў і інтарэсаў іншых асоб, якія ахоўваюцца заканадаўствам, жыццю ці здароўю грамадзян, маёмасці грамадзян і юрыдычных асоб, парушыць устаноўленыя зацверджанай горадабудаўнічай дакументацыяй рэгламенты выкарыстання тэрыторыі, а таксама прычыніць шкоду навакольнаму асяроддзю, знізіць эксплуатацыйную прыгоднасць аб'екта.

2. Асоба, якая ажыццявіла самавольнае будаўніцтва, не набывае права ўласнасці на самавольную пабудову ў адпаведнасці з пунктамі 1 і 2 артыкула 220 гэтага Кодэкса і не мае права карыстацца і распараджацца самавольнай пабудовай – прадаваць, дарыць, здаваць у арэнду, заключаць іншыя здзелкі.

3. Пры самавольным будаўніцтве ў выпадку, прадугледжаным падпунктам 1 часткі першай пункта 1 гэтага артыкула, мясцовы выканаўчы і распарадчы орган прымае, калі іншае не ўстанавіў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, рашэнне аб вяртанні самавольна занятага зямельнага ўчастка, зносе самавольнай пабудовы і прывядзенні зямельнага ўчастка ў прыдатны для выкарыстання па мэтавым прызначэнні стан у парадку, прадугледжаным заканадаўствам аб ахове і выкарыстанні зямель.

4. Пры самавольным будаўніцтве, у тым ліку пры набыцці асобай зямельнага ўчастка з размешчанай на ім самавольнай пабудовай (далей у гэтым артыкуле – законны пакупнік), у выпадках, прадугледжаных падпунктам 2 часткі першай пункта 1 гэтага артыкула, абласны (Мінскі гарадскі) выканаўчы камітэт прымае ў адносінах да зямельнага ўчастка рашэнне ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам аб ахове і выкарыстанні зямель, а таксама, калі іншае не ўстанавіў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, адно з наступных рашэнняў:

1) аб зносе самавольнай пабудовы і прывядзенні зямельнага ўчастка ў прыдатны для выкарыстання па мэтавым прызначэнні стан з вызначэннем у такім рашэнні тэрмінаў выканання гэтых дзеянняў;

2) аб прывядзенні самавольнай пабудовы ў ранейшы, да ажыццяўлення самавольнага будаўніцтва, стан з вызначэннем у такім рашэнні тэрмінаў выканання гэтых дзеянняў.

За асобай, якая ажыццявіла на зямельным участку, дадзеным у прыватную ўласнасць або пажыццёвае валоданне, якое атрымліваецца ў спадчыну, самавольнае будаўніцтва (у тым ліку за законным пакупнікам) у выпадках, прадугледжаных падпунктам 2 часткі першай пункта 1 гэтага артыкула, паводле рашэння суда можа быць прызнана права ўласнасці на самавольную пабудову, калі захаванне

самавольнай пабудовы не цягне за сабой істотных парушэнняў горадабудаўнічых і будаўнічых нормаў і правілаў.

Прызнанне судом права ўласнасці на самавольную пабудову з'яўляецца падставай для прыняцця мясцовым выканаўчым і распарадчым органам рашэння аб працягу будаўніцтва (прыняцці самавольнай пабудовы ў эксплуатацыю і яе дзяржаўнай рэгістрацыі ва ўстаноўленым парадку) і аб даванні зямельнага ўчастка ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам аб ахове і выкарыстанні зямель.

Падача ў суд заявы аб прызнанні права ўласнасці на самавольную пабудову на працягу тэрмінаў, указаных у рашэнні абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, або абскарджанне ва ўстаноўленым парадку такога рашэння прыпыняе яго выкананне.

5. Пры самавольным будаўніцтве, у тым ліку ў адносінах да законнага пакупніка, у выпадках парушэння заканадаўства на падставах, указаных у падпункце 3 часткі першай пункта 1 гэтага артыкула, мясцовы выканаўчы і распарадчы орган прымае, калі іншае не ўстанавіў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, адно з наступных рашэнняў:

1) аб працягу будаўніцтва (прыняцці самавольнай пабудовы ў эксплуатацыю і яе дзяржаўнай рэгістрацыі ва ўстаноўленым парадку) – калі захаванне пабудовы не цягне за сабой істотных парушэнняў горадабудаўнічых і будаўнічых нормаў і правілаў;

2) аб зносе самавольнай пабудовы і прывядзенні зямельнага ўчастка ў прыдатны для выкарыстання па мэтавым прызначэнні стан з вызначэннем у такім рашэнні тэрмінаў выканання гэтых дзеянняў – калі захаванне пабудовы цягне за сабой істотныя парушэнні горадабудаўнічых і будаўнічых нормаў і правілаў;

3) аб прывядзенні самавольнай пабудовы ў ранейшы, да ажыццяўлення самавольнага будаўніцтва, стан з вызначэннем у такім рашэнні тэрмінаў выканання гэтых дзеянняў – калі захаванне пабудовы цягне за сабой істотныя парушэнні горадабудаўнічых і будаўнічых нормаў і правілаў.

Абскарджанне ва ўстаноўленым парадку рашэння мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, указанага ў падпунктах 2 і 3 часткі першай гэтага пункта, прыпыняе яго выкананне.

6. Знос самавольнай пабудовы, прывядзенне зямельнага ўчастка ў прыдатны для выкарыстання па мэтавым прызначэнні стан ці прывядзенне самавольнай пабудовы ў ранейшы, да ажыццяўлення самавольнага будаўніцтва, стан на падставе рашэння мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, якое ўступіла ў сілу, прынятага ў адпаведнасці з часткай першай пункта 4, а таксама падпунктамі 2 ці 3 часткі першай пункта 5 гэтага артыкула, выконвае асоба, якая ажыццявіла самавольнае будаўніцтва, або законны пакупнік, або за кошт такіх асоб.

У выпадках парушэння заканадаўства на падставах, указаных у падпунктах 2 і 3 часткі першай пункта 1 гэтага артыкула, законны пакупнік, які выканаў патрабаванні, прадугледжаныя часткай першай гэтага пункта, мае права прад'явіць рэгрэснае патрабаванне да асобы, якая ажыццявіла адчужэнне такога зямельнага ўчастка, аб пакрыцці панесеных затрат.

7. У выпадку адмовы асобы, якая ажыццявіла самавольнае будаўніцтва, законнага пакупніка выканаць рашэнне мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, якое ўступіла ў сілу, прынятае ў адпаведнасці з часткай першай пункта 4, а таксама падпунктамі 2 ці 3 часткі першай пункта 5 гэтага артыкула, ці невыканання гэтага рашэння ва ўстаноўлены тэрмін або ў выпадку непрызнання судом права

ўласнасці на самавольную пабудову ў адпаведнасці з часткай другой пункта 4 гэтага артыкула мясцовы выканаўчы і распарадчы орган (упаўнаважаная ім арганізацыяй) зносяць самавольную пабудову і прыводзяць зямельны ўчастак у прыдатны для выкарыстання па мэтавым прызначэнні стан ці прыводзяць пабудову ў ранейшы, да ажыццяўлення самавольнага будаўніцтва, стан, за выключэннем выпадкаў, указаных у пункте 8 гэтага артыкула.

8. Адмова асобы, якая ажыццявіла самавольнае будаўніцтва на зямельным участку, што знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці (за выключэннем зямельнага ўчастка, дадзенага ў пажыццёвае валоданне, якое атрымліваецца ў спадчыну), выканаць рашэнне абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, якое ўступіла ў сілу, прынятае ў адпаведнасці з часткай першай пункта 4 гэтага артыкула, ці невыкананне гэтага рашэння ва ўстаноўлены тэрмін прызнаецца адмовай ад права ўласнасці на матэрыялы, з якіх узведзена самавольная пабудова.

У гэтым выпадку мясцовы выканаўчы і распарадчы орган (упаўнаважаная ім арганізацыя) ажыццяўляе адно з наступных дзеянняў:

зносіць самавольную пабудову ці прыводзіць пабудову ў ранейшы, да ажыццяўлення самавольнага будаўніцтва, стан (калі захаванне пабудовы цягне за сабой істотныя парушэнні горадабудаўнічых і будаўнічых нормаў і правілаў), а таксама прыводзіць зямельны ўчастак у прыдатны для выкарыстання па мэтавым прызначэнні стан;

падае ў суд заяву аб прызнанні матэрыялаў, з якіх узведзена самавольная пабудова, безгаспадарнымі і прызнанні права камунальнай уласнасці на іх (калі захаванне пабудовы не цягне за сабой істотных парушэнняў горадабудаўнічых і будаўнічых нормаў і правілаў). Пасля ўступлення ў сілу рашэння суда мясцовы выканаўчы і распарадчы орган прымае рашэнне аб далейшым выкарыстанні матэрыялаў, з якіх узведзена самавольная пабудова, у тым ліку аб працягу будаўніцтва (прыняцці самавольнай пабудовы ў эксплуатацыю і яе дзяржаўнай рэгістрацыі ва ўстаноўленым парадку), і аб даванні зямельнага ўчастка ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам аб ахове і выкарыстанні зямель.

9. Спагнанне затрат на ажыццяўленне зносу самавольнай пабудовы ці прывядзенне пабудовы ў ранейшы, да ажыццяўлення самавольнага будаўніцтва, стан, прывядзенне зямельнага ўчастка ў прыдатны для выкарыстання па мэтавым прызначэнні стан у адпаведнасці з пунктам 7 і абзацам другім часткі другой пункта 8 гэтага артыкула праводзіцца ў судовым парадку.

10. У выпадку, калі самавольнае будаўніцтва ажыццёўлена на зямельным участку, дадзеным дзяржаўным органам, які не мае паўнамоцтваў на прыняцце адпаведнага рашэння, і (ці) без правядзення аўкцыёну, калі даванне зямельнага ўчастку магчымае толькі па выніках аўкцыёну, і (ці) дадзеным з парушэннем устаноўленай чарговасці давання зямельных участкаў, і (ці) без папярэдняга ўзгаднення месца размяшчэння зямельнага ўчастка, калі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі патрабуецца яго правядзенне, прычыненая асобе шкода ў выніку незаконных дзеянняў (бяздзейнасці) дзяржаўных органаў або іх службовых асоб кампенсуецца ў адпаведнасці з артыкулам 938 гэтага Кодэкса.

Артыкул 224. Момант узнікнення права ўласнасці ў пакупніка паводле дагавора

1. Права ўласнасці ў пакупніка рэчы паводле дагавора ўзнікае з моманту яе перадачы, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам.

2. Калі дагавор аб адчужэнні маёмасці падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі, права ўласнасці ў пакупніка ўзнікае з моманту яго рэгістрацыі, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

Артыкул 225. Перадача рэчы

1. Перадачай прызнаецца ўручэнне рэчы пакупніку, а таксама здача перавозчыку для адпраўкі пакупніку ці здача ў арганізацыю сувязі для перасылкі пакупніку рэчаў, адчужаных без абавязацельства дастаўкі.

Рэч лічыцца ўручанай пакупніку з моманту яе фактычнага паступлення ў валоданне пакупніка ці ўказанай ім асобы.

2. Калі да моманту заключэння дагавора аб адчужэнні рэчы яна ўжо знаходзіцца ў валоданні пакупніка, рэч прызнаецца перададзенай яму з гэтага моманту.

3. Да перадачы рэчы прыраўноўваецца перадача канасамента ці іншага таварараспарадчага дакумента на яе.

Артыкул 226. Безгаспадарныя рэчы

1. Безгаспадарнай з'яўляецца рэч, якая не мае ўласніка ці ўласнік якой невядомы, або рэч, ад права ўласнасці на якую ўласнік адмовіўся.

2. Калі гэта не выключаецца правіламі гэтага Кодэкса аб набыцці права ўласнасці на рэчы, ад якіх уласнік адмовіўся (артыкул 227), аб знаходцы (артыкулы 228 і 229), аб безнаглядных жывёлах (артыкулы 231 і 232), аб скарбе (артыкул 234), аб антыкварнай, гістарычнай зброі і боепрыпасах, іншым узбраенні ці ваеннай тэхніцы (артыкул 234[1]), аб археалагічных артэфактах (артыкул 234[2]), права ўласнасці на безгаспадарныя рухомыя рэчы можа быць набыта ў выніку набыўной даўнасці (артыкул 235).

3. Безгаспадарныя нерухомыя рэчы прымаюцца на ўлік арганізацыямі па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй па заяве адпаведнага дзяржаўнага органа, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі.

Права камунальнай уласнасці на безгаспадарную нерухомую рэч можа быць прызнана судом.

Безгаспадарная нерухомая рэч, не прызнаная паводле рашэння суда рэччу, якая паступіла ў камунальную ўласнасць, можа быць зноў прынята ў валоданне, карыстанне і распараджэнне ўласнікам, які пакінуў яе, або набыта ва ўласнасць у выніку набыўной даўнасці (артыкул 235).

4. Матэрыялы, з якіх узведзена самавольная пабудова, прызнаюцца безгаспадарнымі на падставах, прадугледжаных артыкулам 223 гэтага Кодэкса, у парадку, устаноўленым грамадзянскім працэсуальным заканадаўствам.

Артыкул 227. Рухомыя рэчы, ад якіх уласнік адмовіўся

1. Рухомыя рэчы, кінутыя ўласнікам ці іншым чынам пакінутыя ім (кінутыя рэчы) з мэтай адмовы ад права ўласнасці на іх (артыкул 237), могуць быць накіраваны іншымі асобамі ў сваю ўласнасць у парадку, устаноўленым пунктам 2 гэтага артыкула.

2. Асоба, ва ўласнасці, валоданні ці карыстанні якой знаходзіцца зямельны ўчастак, вадаём ці іншы аб'ект, дзе знаходзіцца кінутая рэч, кошт якой яўна ніжэйшы за суму, што адпавядае пяцікратнаму памеру базавай велічыні, або кінутыя лом металаў, бракаваная прадукцыя, тапляк ад сплаву, адвалы і злівы, якія ўтвараюцца пры здабычы карысных выкапняў, адходы вытворчасці і іншыя адходы,

мае права звярнуць гэтыя рэчы ў сваю ўласнасць, распачаўшы іх выкарыстанне ці зрабіўшы іншыя дзеянні, якія сведчаць аб накіраванні рэчы ва ўласнасць.

Іншыя кінутыя рэчы паступаюць ва ўласнасць асобы, якая ўступіла ў валоданне імі, калі па заяве гэтай асобы яны прызнаны судом безгаспадарнымі.

Артыкул 228. Знаходка

1. Асоба, якая знайшла страчаную рэч, абавязана неадкладна паведаміць аб гэтым асобе, якая згубіла яе, ці ўласніку рэчы, ці каму-небудзь іншаму з вядомых ёй асоб, якія маюць права атрымаць яе, і вярнуць знойдзеную рэч гэтай асобе.

Калі рэч знойдзена ў памяшканні ці на транспарце, яна падлягае здачы асобе, якая прадстаўляе ўладальніка гэтага памяшкання ці сродку транспарту. У гэтым выпадку асоба, якой здадзена знаходка, набывае права і нясе абавязкі асобы, якая знайшла рэч.

2. Асоба, якая знайшла рэч, абавязана заявіць аб знаходцы ў орган унутраных спраў ці орган мясцовага кіравання і самакіравання, калі асоба, якая мае права запатрабаваць вяртання знойдзенай рэчы, ці месца яе знаходжання невядомыя.

3. Асоба, якая знайшла рэч, мае права захоўваць яе ў сябе або здаць на захаванне ў орган унутраных спраў, орган мясцовага кіравання і самакіравання ці ўказанай імі асобе.

Скорапсавальная рэч ці рэч, выдаткі па захаванні якой несуразмерна вялікія ў параўнанні з яе коштам, можа быць рэалізавана асобамі, якія знайшлі рэч з атрыманнем пісьмовых доказаў, якія сведчаць суму выручкі. Грошы, выручаныя ад продажу знойдзенай рэчы, падлягаюць вяртанню асобе, правамоцнай на яе атрыманне.

4. Асоба, якая знайшла рэч, адказвае за яе страту ці пашкоджанне толькі ў выпадку намеру ці грубай неасцярожнасці і ў межах кошту рэчы.

Артыкул 229. Набыццё права ўласнасці на знаходку

1. Калі на працягу шасці месяцаў з моманту заявы аб знаходцы ў орган унутраных спраў ці орган мясцовага кіравання і самакіравання (пункт 2 артыкула 228) асоба, правамоцная на атрыманне згубленай рэчы, не будзе вызначана і не заявіць аб сваім праве на рэч асобе, якая знайшла яе, або ў орган унутраных спраў, або орган мясцовага кіравання і самакіравання, асоба, якая знайшла рэч, набывае права ўласнасці на яе.

2. Калі асоба, якая знайшла рэч, адмовіцца ад набыцця яе ва ўласнасць, знойдзеная рэч паступае ў камунальную ўласнасць.

Артыкул 230. Пакрыццё расходаў, звязаных са знаходкай, і ўзнагарода асобе, якая знайшла рэч

1. Асоба, якая знайшла і вярнула рэч асобе, правамоцнай на яе атрыманне, мае права атрымаць ад гэтай асобы, а ў выпадках пераходу рэчы ў камунальную ўласнасць – ад адпаведнага органа мясцовага кіравання і самакіравання пакрыццё неабходных расходаў, звязаных з захаваннем, здачай ці рэалізацыяй рэчы, а таксама выдаткаў на выяўленне асобы, правамоцнай атрымаць рэч.

2. Асоба, якая знайшла рэч, мае права запатрабаваць ад асобы, правамоцнай на атрыманне рэчы, узнагароду за знаходку ў памеры да дваццаці працэнтаў кошту рэчы. Калі знойдзеная рэч уяўляе каштоўнасць толькі для асобы, правамоцнай на яе атрыманне, памер узнагароды вызначаецца па пагадненні з гэтай асобай, а ў выпадку недасягнення пагаднення – судом.

Права на ўзнагароду не ўзнікае, калі асоба, якая знайшла рэч, не заявіла аб знаходцы ці паспрабавала яе ўтаіць.

Артыкул 231. Безнаглядныя жывёлы

1. Асоба, якая затрымала безнаглядную ці нагульную жывёлу ці іншых безнаглядных свойскіх жывёл, абавязана вярнуць іх уласніку, а калі ўласнік жывёл ці месца яго знаходжання невядомыя, не пазней трох дзён з моманту затрымання заявіць аб знойдзеных жывёлах у орган унутраных спраў ці орган мясцовага кіравання і самакіравання, якія прымаюць меры да вышуку ўласніка.

2. На час вышуку ўласніка жывёл асоба, якая затрымала іх, можа пакінуць іх у сябе на ўтрыманні і ў карыстанні або здаць на ўтрыманне і ў карыстанне іншай асобе, якая мае неабходныя для гэтага ўмовы. Па просьбе асобы, якая затрымала безнаглядных жывёл, вышук асобы, якая мае неабходныя ўмовы для іх утрымання, і перадачу ёй жывёл ажыццяўляе орган унутраных спраў ці орган мясцовага кіравання і самакіравання.

3. Асоба, якая затрымала безнаглядных жывёл, ці асоба, якой яны перададзены на ўтрыманне і ў карыстанне, абавязаны іх належна ўтрымліваць і пры наяўнасці віны адказваюць за гібель і псаванне жывёл у межах іх кошту.

Артыкул 232. Набыццё права ўласнасці на безнаглядных жывёл

1. Калі на працягу шасці месяцаў з моманту заявы аб затрыманні безнаглядных свойскіх жывёл іх уласнік не будзе выяўлены ці сам не заявіць аб сваім праве на іх, асоба, у якой жывёла знаходзілася на ўтрыманні і ў карыстанні, набывае права ўласнасці на іх.

Пры адмове гэтай асобы ад набыцця ва ўласнасць жывёл, якія ўтрымліваліся ў яе, яны паступаюць у камунальную ўласнасць і выкарыстоўваюцца ў парадку, які вызначае орган мясцовага кіравання і самакіравання.

2. У выпадку яўкі ранейшага ўласніка жывёл пасля пераходу іх ва ўласнасць іншай асобы ранейшы ўласнік мае права пры наяўнасці абставін, якія сведчаць аб захаванні да яго прывязанасці з боку гэтых жывёл ці аб жорсткім або іншым неналежным абыходжанні з імі новага ўласніка, запатрабаваць іх вяртання на ўмовах, якія вызначаюцца па пагадненні з новым уласнікам, а пры недасягненні пагаднення – судом.

Артыкул 233. Пакрыццё расходаў на ўтрыманне безнаглядных жывёл і ўзнагароду за іх

1. У выпадку вяртання безнаглядных свойскіх жывёл уласніку асоба, якая затрымала жывёл, і асоба, у якой яны знаходзіліся на ўтрыманні і ў карыстанні, маюць права на пакрыццё іх уласнікам неабходных расходаў, звязаных з утрыманнем жывёл, з залікам выгад, атрыманых ад карыстання імі.

2. Асоба, якая затрымала безнаглядных свойскіх жывёл, мае права запатрабаваць ад іх уласніка ўзнагароду ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 230 гэтага Кодэкса.

Артыкул 234. Скарб

1. Скарб, гэта значыць закапаныя ў зямлі ці схаваныя іншым спосабам грошы ці каштоўныя прадметы, уласнік якіх не можа быць устаноўлены або паводле акта заканадаўства страціў на іх права, паступае ва ўласнасць асобы, якой належыць маёмасць (зямельны ўчастак, пабудовы і да т.п.), дзе скарб быў схаваны, і асобы, якая знайшла скарб, у роўных долях, калі пагадненнем паміж імі не ўстаноўлена іншае.

Калі скарб знайшла асоба, якая праводзіла раскопкі ці пошукі каштоўнасцей без згоды на гэта ўласніка зямельнага ўчастка ці іншай маёмасці, дзе скарб быў

схаваны, скарб падлягае перадачы ўласніку зямельнага ўчастка ці іншай маёмасці, у якой быў знойдзены скарб.

Правілы частак першай і другой гэтага пункта не прымяняюцца ў адносінах да скарбаў, якія складаюцца з археалагічных артэфактаў.

2. У выпадку выяўлення скарбу, што складаецца з матэрыяльных культурных каштоўнасцей, якія валодаюць адметнымі духоўнымі, мастацкімі і (ці) дакументальнымі вартасцямі і адпавядаюць аднаму з крытэрыяў для надання ім статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, такія матэрыяльныя культурныя каштоўнасці падлягаюць перадачы ў дзяржаўную ўласнасць. Пры гэтым уласнік зямельнага ўчастка ці іншай маёмасці, дзе скарб быў схаваны, і асоба, якая знайшла скарб, маюць права на атрыманне разам узнагароды ў памеры пяцідзесяці працэнтаў кошту скарбу. Узнагарода размяркоўваецца паміж гэтымі асобамі ў роўных долях, калі пагадненнем паміж імі не ўстаноўлена іншае.

Калі такі скарб знайшла асоба, якая праводзіла раскопкі ці пошукі каштоўнасцей без згоды ўласніка маёмасці, дзе скарб быў схаваны, узнагарода гэтай асобе не выплачваецца і поўнасцю паступае ўласніку.

3. Правілы гэтага артыкула не прымяняюцца да асоб, у кола працоўных ці службовых абавязкаў якіх уваходзіла правядзенне раскопак і пошуку, накіраваных на знаходжанне скарбу.

Артыкул 234[1]. Набыццё права ўласнасці на безгаспадарныя антыкварную, гістарычную зброю і боепрыпасы, іншае ўзбраенне ці ваенную тэхніку

Калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, у выпадку выяўлення безгаспадарных антыкварнай, гістарычнай зброі і боепрыпасаў, іншага ўзбраення ці ваеннай тэхнікі пры правядзенні пошукавых работ, раскопак або іншым чынам указаныя рэчы падлягаюць перадачы ў дзяржаўную ўласнасць у парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Артыкул 2342. Набыццё права ўласнасці на археалагічныя артэфакты

Калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі, археалагічныя артэфакты, выяўленыя пры правядзенні археалагічных даследаванняў або іншым чынам, падлягаюць перадачы ў дзяржаўную ўласнасць у парадку, устаноўленым заканадаўствам.

У выпадку выяўлення археалагічных артэфактаў, якія з'яўляюцца скарбам, валодаюць адметнымі духоўнымі, мастацкімі і (ці) дакументальнымі вартасцямі і адпавядаюць аднаму з крытэрыяў для надання ім статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, прымяняюцца правілы, прадугледжаныя пунктамі 2 і 3 артыкула 234 гэтага Кодэкса.

Артыкул 235. Набыўная даўнасць

1. Асоба – грамадзянін ці юрыдычная асоба, ва ўласнасці якой не знаходзіцца маёмасць, але якая добрасумленна, адкрыта і бесперапынна валодае ёй як сваёй уласнай нерухомай маёмасцю на працягу пятнаццаці гадоў або іншай маёмасцю на працягу пяці гадоў, набывае права ўласнасці на гэту маёмасць (набыўная даўнасць).

Права ўласнасці на нерухомую і іншую маёмасць, якая падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі, узнікае ў асобы, якая набыла гэту маёмасць у выніку набыўной даўнасці, з моманту такой рэгістрацыі.

2. Да набыцця на маёмасць права ўласнасці ў выніку набыўной даўнасці асоба, якая валодае маёмасцю як сваёй уласнай, мае права на абарону свайго валодання супраць трэціх асоб, якія не з'яўляюцца ўласнікамі маёмасці, а таксама не маюць

правоў на валоданне ёй у выніку іншай прадугледжанай заканадаўствам ці дагаворам падставы.

3. Асоба, якая спасылаецца на даўнасць валодання, можа далучыць да часу свайго валодання ўвесь час, на працягу якога гэтай маёмасцю валодаў той, чыім праваперaемнікам гэта асоба з'яўляецца.

4. Цячэнне тэрміну набыўной даўнасці ў адносінах да рэчаў, якія знаходзяцца ў асобы, з валодання якой яны маглі быць выпатрабаваны ў адпаведнасці з артыкуламі 282–284 і 286 гэтага Кодэкса, пачынаецца з дня, які ідзе следам за днём сканчэння тэрміну іскавай даўнасці па адпаведных патрабаваннях.

ГЛАВА 15
СПЫНЕННЕ ПРАВА ЎЛАСНАСЦІ

Артыкул 236. Падставы спынення права ўласнасці

1. Права ўласнасці спыняецца пры адчужэнні ўласнікам сваёй маёмасці іншым асобам, адмове ўласніка ад права ўласнасці, гібелі ці знішчэнні маёмасці, страце права ўласнасці на маёмасць і ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

2. Прымусовае адабранне ва ўласніка маёмасці не дапускаецца, акрамя выпадкаў, калі на падставах, прадугледжаных законам, а таксама згодна пастанове суда праводзяцца:

1) накіраванне спагнання на маёмасць па абавязацельствах (артыкул 238);

2) адчужэнне маёмасці, якая паводле акта заканадаўства не можа належаць гэтай асобе (артыкул 239);

3) адчужэнне нерухомай маёмасці ў сувязі з адабраннем зямельнага ўчастка (артыкул 240);

4) выкуп культурных каштоўнасцей, якія безгаспадарча ўтрымліваюцца (артыкул 241), выкуп свойскіх жывёл (артыкул 242);

5) рэквізіцыя (артыкул 243);

6) канфіскацыя (артыкул 244);

7) адчужэнне маёмасці ў выпадках, прадугледжаных пунктам 4 артыкула 255 і артыкулам 275[1];

8) прыватызацыя (артыкул 218);

9) нацыяналізацыя (артыкул 245);

10) бязвыплатнае адабранне маёмасці ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі ў сферы барацьбы з карупцыяй.

Артыкул 237. Адмова ад права ўласнасці

1. Грамадзянін ці юрыдычная асоба можа адмовіцца ад права ўласнасці на прыналежную яму маёмасць, аб’явіўшы аб гэтым або зрабіўшы іншыя дзеянні, якія безумоўна сведчаць аб яго ўстараненні ад валодання, карыстання і распараджэння маёмасцю без намеру захаваць якія-небудзь правы на гэту маёмасць.

Прызнаецца адмовай ад права ўласнасці на матэрыялы, з якіх узведзена самавольная пабудова, адмова асобы, якая ажыццявіла самавольнае будаўніцтва на зямельным участку, што знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці (за выключэннем зямельнага ўчастка, дадзенага ў пажыццёвае валоданне, якое атрымліваецца ў спадчыну), выканаць рашэнне, абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, якое ўступіла ў законную сілу, прынятае ў адпаведнасці з часткай першай пункта 4 артыкула 223 гэтага Кодэкса, ці невыкананне такога рашэння ва ўстаноўлены тэрмін.

2. Адмова ад права ўласнасці, за выключэннем адмовы ад права ўласнасці на матэрыялы, з якіх узведзена самавольная пабудова, прадугледжанага часткай

другой пункта 1 гэтага артыкула, не цягне за сабой спынення правоў і абавязкаў уласніка ў адносінах да адпаведнай маёмасці да моманту набыцця права ўласнасці на гэту маёмасць іншай асобай, за выключэннем выпадкаў, калі маёмасць у адпаведнасці з заканадаўствам утылізавана ці знішчана.

Артыкул 238. Накіраванне спагнання на маёмасць па абавязацельствах уласніка

1. Адабранне маёмасці шляхам накіравання спагнання на маёмасць па абавязацельствах уласніка праводзіцца на падставе рашэння суда, калі іншы парадак накіравання спагнання не прадугледжаны заканадаўствам ці дагаворам.

2. Права ўласнасці на маёмасць, на якую накіроўваецца спагнанне, спыняецца ва ўласніка з моманту ўзнікнення права ўласнасці на адабраную маёмасць у асобы, да якой пераходзіць гэта маёмасць.

Артыкул 239. Спыненне права ўласнасці асобы на маёмасць, якая не можа яму належаць

1. Калі на падставах, дапушчальных заканадаўствам, ва ўласнасці асобы аказалася маёмасць, якая паводле заканадаўчага акта не можа ёй належаць, гэта маёмасць павінна быць адчужана ўласнікам на працягу года з моманту ўзнікнення права ўласнасці на маёмасць, калі заканадаўствам не ўстаноўлены іншы тэрмін.

2. У выпадках, калі маёмасць не адчужана ўласнікам у тэрміны, указаныя ў пункце 1 гэтага артыкула, такая маёмасць з улікам яе характару і прызначэння паводле рашэння суда, вынесенага па заяве адпаведнага дзяржаўнага органа ці органа мясцовага кіравання і самакіравання, падлягае прымусоваму продажу з перадачай былому ўласніку выручанай ад продажу сумы або перадачы ў дзяржаўную ўласнасць з пакрыццём былому ўласніку кошту маёмасці, вызначанага судом. Пры гэтым вылічваюцца затраты на адчужэнне (адказнае трыманне) указанай маёмасці.

3. Калі ва ўласнасці грамадзяніна ці юрыдычнай асобы на падставах, дапушчальных заканадаўствам, акажацца рэч, знаходжанне якой у абарачэнні дапускаецца па спецыяльным дазволе, а ў выдачы такога дазволу ўласніку адмоўлена або ён не звярнуўся за атрыманнем указанага дазволу на працягу тэрміну, прадугледжанага заканадаўствам, гэта рэч падлягае адчужэнню ў парадку, устаноўленым для маёмасці, якая не можа належаць гэтаму ўласніку.

Пры гэтым адчужэнне рэчы дапускаецца з прытрымліваннем парадку абарачэння адпаведнай маёмасці, устаноўленага заканадаўствам, і толькі асобе, якая мае ўказаны дазвол, ці дзяржаве.

Артыкул 240. Адчужэнне нерухомай маёмасці ў сувязі з адабраннем зямельнага ўчастка, на якім яна знаходзіцца

1. У выпадках, калі адабранне зямельнага ўчастка для дзяржаўных патрэб або ў выніку неналежнага выкарыстання зямлі немагчымае без спынення права ўласнасці на капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні) ці іншую нерухомую маёмасць, якая знаходзіцца на дадзеным участку, гэта маёмасць можа быць адабрана ва ўласніка шляхам выкупу дзяржавай ці продажу з публічных таргоў у парадку, прадугледжаным заканадаўствам.

Патрабаванне аб адабранні нерухомай маёмасці не падлягае задавальненню, калі адпаведны дзяржаўны орган ці орган мясцовага кіравання і самакіравання, які звярнуўся з гэтым патрабаваннем у суд, не дакажа, што выкарыстанне зямельнага

ўчастка ў мэтах, для якіх ён адбіраецца, немагчымае без спынення права ўласнасці на гэту нерухомую маёмасць.

2. Правілы гэтага артыкула адпаведна прымяняюцца пры спыненні права ўласнасці на нерухомую маёмасць у сувязі з адабраннем горных адводаў і іншых участкаў, на якіх знаходзіцца маёмасць.

Артыкул 241. Выкуп культурных каштоўнасцей, якія безгаспадарча ўтрымліваюцца

У выпадках, калі ўласнік культурных каштоўнасцей, аднесеных у адпаведнасці з заканадаўствам да асабліва каштоўных і тых, якія ахоўваюцца дзяржавай, безгаспадарча ўтрымлівае гэтыя каштоўнасці, што пагражае стратай імі свайго значэння, такія каштоўнасці паводле рашэння суда могуць быць адабраны ва ўласніка шляхам выкупу дзяржавай ці продажу з публічных таргоў.

Пры выкупе культурных каштоўнасцей уласніку кампенсуецца іх кошт у памеры, устаноўленым пагадненнем бакоў, а ў выпадку спрэчкі – судом. Пры продажы з публічных таргоў уласніку перадаецца выручаная ад продажу сума за вылікам расходаў на правядзенне таргоў.

Артыкул 242. Выкуп свойскіх жывёл пры неналежным абыходжанні з імі

У выпадках, калі ўласнік свойскіх жывёл абыходзіцца з імі ў яўнай супярэчнасці з устаноўленымі заканадаўствам правіламі і прынятымі ў грамадстве нормамі гуманных адносін да жывёл, гэтыя жывёлы могуць быць адабраны ва ўласніка шляхам іх выкупу асобай, якая прад'явіла адпаведнае патрабаванне ў суд. Цана выкупу вызначаецца пагадненнем бакоў, а ў выпадку спрэчкі – судом.

Артыкул 243. Рэквізіцыя

1. У выпадках стыхійных бедстваў, аварый, эпідэмій, эпізаотый і ў іншых абставінах, якія маюць надзвычайны характар, маёмасць у інтарэсах грамадства паводле рашэння дзяржаўных органаў можа быць адабрана ва ўласніка ў парадку і на ўмовах, устаноўленых законам, з выплатай яму кошту маёмасці (рэквізіцыя).

2. Ацэнка, паводле якой уласніку кампенсуецца кошт рэквізаванай маёмасці, можа быць аспрэчана ім у судзе.

3. Асоба, маёмасць якой рэквізавана, мае права пры спыненні дзеяння абставін, у сувязі з якімі праведзена рэквізіцыя, патрабаваць па судзе вяртання яму захаванай маёмасці.

Артыкул 244. Канфіскацыя

У выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, маёмасць можа быць бязвыплатна адабрана ва ўласніка ў выглядзе санкцыі за ўчыненне злачынства ці іншага правапарушэння (канфіскацыя). Пры гэтым канфіскацыя маёмасці ў адміністрацыйным парадку дапускаецца толькі з прытрымліваннем умоў і парадку, прадугледжаных законам. Рашэнне аб канфіскацыі, прынятае ў адміністрацыйным парадку, можа быць абскарджана ў суд.

Артыкул 245. Нацыяналізацыя

Накіраванне маёмасці, якая знаходзіцца ва ўласнасці грамадзян і юрыдычных асоб, у дзяржаўную ўласнасць шляхам яе нацыяналізацыі дапускаецца толькі на падставе прынятага ў адпаведнасці з Канстытуцыяй закона аб парадку і ўмовах нацыяналізацыі гэтай маёмасці і са своечасовай і поўнай кампенсацыяй асобе,

маёмасць якой нацыяналізавана, кошту гэтай маёмасці і іншых страт, якія прычыняюцца яе адабраннем.

ГЛАВА 16
АГУЛЬНАЯ ЎЛАСНАСЦЬ

Артыкул 246. Паняцце і падставы ўзнікнення агульнай уласнасці

1. Маёмасць, якая знаходзіцца ва ўласнасці дзвюх ці некалькіх асоб, належыць ім на праве агульнай уласнасці.

2. Маёмасць можа знаходзіцца ў агульнай уласнасці з вызначэннем долі кожнага з уласнікаў у праве ўласнасці (долевая ўласнасць) ці без вызначэння такіх долей (сумесная ўласнасць).

3. Агульная ўласнасць на маёмасць з'яўляецца долевай, за выключэннем выпадкаў, калі заканадаўчымі актамі дапускаецца ўтварэнне сумеснай уласнасці на гэту маёмасць.

4. Агульная ўласнасць узнікае пры паступленні ва ўласнасць дзвюх ці некалькіх асоб маёмасці, якая не можа быць падзелена без змянення яе прызначэння (непадзельныя рэчы) або не падлягае падзелу паводле заканадаўства.

Агульная ўласнасць на падзельную маёмасць узнікае ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам ці дагаворам.

5. Па пагадненні ўдзельнікаў сумеснай уласнасці, а пры недасягненні згоды – паводле рашэння суда на агульную маёмасць можа быць устаноўлена долевая ўласнасць гэтых асоб.

6. Заканадаўчымі актамі ў галіне жыллёвых адносін, а таксама заканадаўчымі актамі, якія рэгулююць пытанні рэканструкцыі жылых дамоў, могуць устанаўлівацца іншыя правілы, чым прадугледжаныя гэтай главой.

Артыкул 247. Вызначэнне долей у праве долевай уласнасці

1. Калі памер долей удзельнікаў долевай уласнасці не можа быць вызначаны на падставе акта заканадаўства і не ўстаноўлены пагадненнем усіх яе ўдзельнікаў, долі лічацца роўнымі.

2. Пагадненнем усіх удзельнікаў долевай уласнасці можа быць устаноўлены парадак вызначэння і змянення іх долей у залежнасці ад укладу кожнага з іх у стварэнне і прырашчэнне агульнай маёмасці.

3. Удзельнік долевай уласнасці, які ажыццявіў за свой кошт з прытрымліваннем устаноўленага парадку выкарыстання агульнай маёмасці неаддзельныя паляпшэнні гэтай маёмасці, мае права на адпаведнае павелічэнне сваёй долі ў праве на агульную маёмасць.

Аддзельныя паляпшэнні агульнай маёмасці, калі іншае не прадугледжана пагадненнем удзельнікаў долевай уласнасці, паступаюць ва ўласнасць таго з удзельнікаў, які іх зрабіў.

Артыкул 248. Наступствы надбудовы, прыбудовы ці перабудовы жылога дому ці іншай пабудовы, якая знаходзіцца ў агульнай долевай уласнасці

Калі ўласнік з прытрымліваннем устаноўленых правілаў павялічыў за свой кошт плошчу дому ці іншага збудавання, якое знаходзіцца ў долевай уласнасці, шляхам прыбудовы, надбудовы ці перабудовы, то па патрабаванні гэтага ўласніка долі ў агульнай уласнасці на дом ці пабудову і парадак карыстання памяшканнямі ў ім падлягаюць адпаведнаму змяненню.

Артыкул 249. Распараджэнне маёмасцю, якая знаходзіцца ў долевай уласнасці

1. Распараджэнне маёмасцю, якая знаходзіцца ў долевай уласнасці, ажыццяўляецца па пагадненні ўсіх яе ўдзельнікаў.

2. Удзельнік долевай уласнасці мае права па сваім меркаванні прадаць, падарыць, завяшчаць, здаць у заклад сваю долю або распарадзіцца ёй іншым чынам з прытрымліваннем пры яе аплатным адчужэнні правілаў, устаноўленых артыкулам 253 гэтага Кодэкса.

Артыкул 250. Валоданне і карыстанне маёмасцю, якая знаходзіцца ў долевай уласнасці

1. Валоданне і карыстанне маёмасцю, якая знаходзіцца ў долевай уласнасці, ажыццяўляецца па пагадненні ўсіх яе ўдзельнікаў, а пры недасягненні згоды – у парадку, які ўстанаўлівае суд.

2. Удзельнік долевай уласнасці мае права на даванне ў яго валоданне і карыстанне часткі агульнай маёмасці, суразмернай яго долі, а пры немагчымасці гэтага мае права патрабаваць ад іншых удзельнікаў, якія валодаюць і карыстаюцца маёмасцю, што даводзіцца на яго долю, адпаведнай кампенсацыі.

Артыкул 251. Набыткі, прадукцыя і даходы ад выкарыстання маёмасці, якая знаходзіцца ў долевай уласнасці

Набыткі, прадукцыя і даходы ад выкарыстання маёмасці, якая знаходзіцца ў долевай уласнасці, паступаюць у склад агульнай маёмасці і размяркоўваюцца паміж удзельнікамі долевай уласнасці адпаведна іх долям, калі іншае не прадугледжана пагадненнем паміж імі.

Артыкул 252. Расходы па ўтрыманні маёмасці, якая знаходзіцца ў долевай уласнасці

1. Кожны ўдзельнік долевай уласнасці абавязаны адпаведна са сваёй доляй удзельнічаць у выплаце падаткаў, збораў і іншых плацяжоў па агульнай маёмасці, а таксама выдатках па яе ўтрыманні і захаванні, калі заканадаўствам ці дагаворам не ўстаноўлена іншае.

2. Расходы, якія не з'яўляюцца неабходнымі і праведзены адным з уласнікаў без згоды астатніх, кладуцца на яго самога. Спрэчкі, якія ўзнікаюць пры гэтым, падлягаюць вырашэнню ў судовым парадку.

Артыкул 253. Пераважнае права куплі долі ў праве агульнай уласнасці

1. Пры продажы долі ў праве агульнай уласнасці чужой асобе астатнія ўдзельнікі долевай уласнасці маюць пераважнае права куплі долі, якая прадаецца, па цане, за якую яна прадаецца, і на іншых роўных умовах, акрамя выпадку продажу з публічных таргоў.

Публічныя таргі для продажу долі ў праве агульнай уласнасці пры адсутнасці згоды на гэта ўсіх удзельнікаў долевай уласнасці могуць праводзіцца ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 258 гэтага Кодэкса, і ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

2. Прадавец долі абавязаны паведаміць у пісьмовай форме астатнім удзельнікам долевай уласнасці аб намеры прадаць сваю долю ў праве агульнай уласнасці чужой асобе з указаннем цаны і іншых умоў, на якіх прадае яе. Пісьмовым пагадненнем удзельнікаў долевай уласнасці, прынятым з прытрымліваннем патрабаванняў пункта 1 артыкула 249 гэтага Кодэкса, можа быць устаноўлены спосаб такога паведамлення. Адмова ўдзельнікаў долевай уласнасці ад атрымання пісьмовага паведамлення прадаўца аб намеры прадаць сваю долю,

зафіксаваная ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку, лічыцца належным паведамленнем гэтым удзельнікам долевай уласнасці.

Калі астатнія ўдзельнікі долевай уласнасці адмовяцца ад куплі ці не набудуць долю, якая прадаецца, у праве агульнай уласнасці на нерухомую маёмасць на працягу месяца, а ў адносінах да іншай маёмасці – на працягу дзесяці дзён з дня паведамлення, прадавец мае права прадаць сваю долю любой асобе.

3. Пры продажы долі з парушэннем пераважнага права куплі любы іншы ўдзельнік долевай уласнасці мае права на працягу трох месяцаў патрабаваць у судовым парадку пераводу на яго правоў і абавязкаў пакупніка.

4. Уступка пераважнага права куплі долі не дапускаецца.

5. Правілы гэтага артыкула прымяняюцца таксама пры адчужэнні долі паводле дагавора мены.

6. Правілы гэтага артыкула не прымяняюцца пры пакупцы долі ў праве агульнай уласнасці на маёмасць, якая складае паявы інвестыцыйны фонд, засведчанай інвестыцыйным паем, астатнімі ўдзельнікамі долевай уласнасці.

Артыкул 254. Момант пераходу долі ў праве агульнай уласнасці да пакупніка паводле дагавора

Доля ў праве агульнай уласнасці пераходзіць да пакупніка паводле дагавора з моманту заключэння дагавора, калі пагадненнем бакоў не прадугледжана іншае.

Момант пераходу долі ў праве агульнай уласнасці паводле дагавора, які падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі, вызначаецца ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 224 гэтага Кодэкса.

Артыкул 255. Падзел маёмасці, якая знаходзіцца ў долевай уласнасці, і выдзел з яе долі

1. Маёмасць, якая знаходзіцца ў долевай уласнасці, за выключэннем маёмасці, якая складае паявы інвестыцыйны фонд, можа быць падзелена паміж яе ўдзельнікамі па пагадненні паміж імі.

2. Удзельнік долевай уласнасці мае права патрабаваць выдзелу сваёй долі з агульнай маёмасці, за выключэннем маёмасці, якая складае паявы інвестыцыйны фонд.

3. Пры недасягненні ўдзельнікамі долевай уласнасці пагаднення аб спосабах і ўмовах падзелу агульнай маёмасці ці выдзелу долі аднаго з іх удзельнік долевай уласнасці мае права ў судовым парадку патрабаваць выдзелу ў натуры сваёй долі з агульнай маёмасці.

Калі выдзел долі ў натуры не дапускаецца заканадаўствам ці немагчымы без несуразмернага ўрону маёмасці, якая знаходзіцца ў агульнай уласнасці, уласнік, які выдзяляецца, мае права на выплату яму кошту яго долі іншымі ўдзельнікамі долевай уласнасці.

4. Несуразмернасць маёмасці, якая выдзяляецца ў натуры ўдзельніку долевай уласнасці на падставе гэтага артыкула, яго долі ў праве ўласнасці ўстараняецца выплатай адпаведнай грашовай сумы ці іншай кампенсацыяй.

Выплата ўдзельніку долевай уласнасці астатнімі ўласнікамі кампенсацыі замест выдзелу яго долі ў натуры дапускаецца з яго згоды. У выпадках, калі доля адпаведнага ўласніка нязначная, не можа быць рэальна выдзелена і ён не мае істотнага інтарэсу ў выкарыстанні агульнай маёмасці, суд можа і пры адсутнасці згоды гэтага ўласніка абавязаць яго перадаць сваю долю астатнім удзельнікам з выплатай яму кампенсацыі.

5. З атрыманнем кампенсацыі ў адпаведнасці з гэтым артыкулам уласнік губляе права на долю ў агульнай маёмасці.

Артыкул 256. Валоданне, карыстанне і распараджэнне маёмасцю, якая знаходзіцца ў сумеснай уласнасці

1. Удзельнікі сумеснай уласнасці, калі іншае не прадугледжана пагадненнем паміж імі, сумесна валодаюць і карыстаюцца агульнай маёмасцю.

2. Распараджэнне маёмасцю, якая знаходзіцца ў сумеснай уласнасці, ажыццяўляецца па згодзе ўсіх удзельнікаў, якая маецца на ўвазе незалежна ад таго, хто з удзельнікаў заключыў здзелку па распараджэнні маёмасцю. Гэта правіла не распаўсюджваецца на нерухомую маёмасць, для распараджэння якой неабходна пісьмовая згода ўсіх удзельнікаў сумеснай уласнасці.

3. Кожны з удзельнікаў сумеснай уласнасці мае права заключаць здзелкі па распараджэнні агульнай маёмасцю, калі іншае не вынікае з пагаднення ўсіх удзельнікаў. Заключаная адным з удзельнікаў сумеснай уласнасці здзелка, звязаная з распараджэннем агульнай маёмасцю, можа быць прызнана несапраўднай па патрабаванні астатніх удзельнікаў па матывах адсутнасці ва ўдзельніка, які заключыў здзелку, неабходных паўнамоцтваў толькі ў выпадку, калі даказана, што іншы бок у здзелцы ведаў ці заведама павінен быў ведаць аб гэтым (артыкул 175).

4. Правілы гэтага артыкула прымяняюцца, калі для асобных відаў сумеснай уласнасці заканадаўствам не ўстаноўлена іншае.

Артыкул 257. Падзел маёмасці, якая знаходзіцца ў сумеснай уласнасці, і выдзел з яе долі

1. Падзел агульнай маёмасці паміж удзельнікамі сумеснай уласнасці, а таксама выдзел долі аднаго з іх можа быць ажыццёўлены пры ўмове папярэдняга вызначэння долі кожнага з удзельнікаў у праве на агульную маёмасць.

2. Пры падзеле агульнай маёмасці і выдзеле з яе долі, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці пагадненнем удзельнікаў, іх долі прызнаюцца роўнымі.

3. Падставы і парадак падзелу агульнай маёмасці і выдзелу з яе долі вызначаюцца па правілах артыкула 255 гэтага Кодэкса, паколькі іншае для асобных відаў сумеснай уласнасці не ўстаноўлена заканадаўствам і не вынікае з сутнасці адносін удзельнікаў сумеснай уласнасці.

Артыкул 258. Накіраванне спагнання на долю ў агульнай маёмасці

Крэдытор удзельніка долевай ці сумеснай уласнасці пры недастатковасці ў апошняга іншай маёмасці мае права прад'явіць патрабаванне аб выдзяленні долі даўжніка ў агульнай маёмасці для накіравання на яго спагнання.

Калі ў такіх выпадках выдзяленне долі ў натуры немагчымае або супраць гэтага пярэчаць астатнія ўдзельнікі долевай ці сумеснай уласнасці, крэдытор мае права патрабаваць продажу даўжніком сваёй долі астатнім удзельнікам агульнай уласнасці па цане, суразмернай рыначнаму кошту гэтай долі, з накіраваннем выручаных ад продажу сродкаў на пагашэнне доўгу.

У выпадку адмовы астатніх удзельнікаў агульнай уласнасці ад набыцця долі даўжніка крэдытор мае права патрабаваць па судзе накіравання спагнання на долю даўжніка ў праве агульнай уласнасці шляхам продажу гэтай долі з публічных таргоў.

Артыкул 259. Агульная ўласнасць сужэнцаў

1. Маёмасць, нажытая сужэнцамі за час шлюбу, знаходзіцца ў іх сумеснай уласнасці, калі дагаворам паміж імі не ўстаноўлены іншы рэжым гэтай маёмасці.

2. Маёмасць, якая належала кожнаму з сужэнцаў да ўступлення ў шлюб, а таксама атрыманая адным з сужэнцаў у час шлюбу ў дар ці ў парадку атрымання ў спадчыну, знаходзіцца ў яго ўласнасці.

Рэчы індывідуальнага карыстання (адзенне, абутак і да т. п.), за выключэннем каштоўнасцей і іншых прадметаў раскошы, хоць і набытыя ў час шлюбу за кошт агульных сродкаў сужэнцаў, прызнаюцца ўласнасцю таго сужэнца, які імі карыстаўся.

Маёмасць кожнага з сужэнцаў можа быць прызнана іх сумеснай уласнасцю, калі будзе ўстаноўлена, што на працягу шлюбу за кошт агульнай маёмасці сужэнцаў ці асабістай маёмасці іншага сужэнца былі праведзены ўкладанні, якія значна павялічваюць кошт гэтай маёмасці (капітальны рамонт, рэканструкцыя, пераабсталяванне і да т. п.). Гэта правіла не прымяняецца, калі дагаворам паміж сужэнцамі прадугледжана іншае.

3. Па абавязацельствах аднаго з сужэнцаў спагнанне можа быць накіравана толькі на маёмасць, якая знаходзіцца ў яго ўласнасці, а таксама на яго долю ў агульнай маёмасці сужэнцаў, якая належала б яму пры падзеле гэтай маёмасці. Накіраванне спагнання на маёмасць унітарнага прадпрыемства, якая належыць сужэнцам на праве сумеснай уласнасці, не дапускаецца.

3[1]. Пры падзеле маёмасці, якая знаходзіцца ў сумеснай уласнасці сужэнцаў, сужэнец удзельніка гаспадарчай суполкі, таварыства з абмежаванай адказнасцю ці таварыства з дадатковай адказнасцю мае права патрабаваць у судовым парадку прызнання за ім права на належную яму частку долі яго сужэнца ў статутным фондзе адпаведнага таварыства ці суполкі.

У выпадку прызнання судом за сужэнцам удзельніка гаспадарчай суполкі , таварыства з абмежаванай адказнасцю ці таварыства з дадатковай адказнасцю права на належную яму частку долі яго сужэнца ў статутным фондзе адпаведнага таварыства ці суполкі са згоды астатніх удзельнікаў гэтага таварыства ці суполкі ён мае права стаць яго ўдзельнікам або патрабаваць выплаты кошту належнай яму часткі долі яго сужэнца ў статутным фондзе ці выдачы ў натуры маёмасці на такі кошт. Пры гэтым адмова ва ўключэнні ў склад удзельнікаў адпаведнага таварыства ці суполкі цягне за сабой абавязак гэтага таварыства ці суполкі выплаціць сужэнцу кошт належнай яму часткі долі яго сужэнца ў статутным фондзе або выдаць у натуры маёмасць на такі кошт.

Вызначэнне кошту часткі долі ў статутным фондзе таварыства ці суполкі і яе выплата або выдача ў натуры маёмасці на такі кошт ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 64 гэтага Кодэкса ў тэрмін, прадугледжаны ўстаноўчымі дакументамі гэтага таварыства ці суполкі, але не пазней за дванаццаць месяцаў з дня прад'яўлення сужэнцам адпаведнага патрабавання.

Правілы частак першай і другой гэтага пункта распаўсюджваюцца на выпадкі падзелу маёмасці, якая знаходзіцца ў сумеснай уласнасці сужэнцаў, адзін з якіх з'яўляецца членам вытворчага кааператыва. Пры гэтым вызначэнне кошту часткі паю сужэнца ў маёмасці вытворчага кааператыва і яе выплата або выдача ў натуры маёмасці на такі кошт ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 111 гэтага Кодэкса ў тэрмін, прадугледжаны статутам вытворчага кааператыва, але не пазней за дванаццаць месяцаў з дня прад'яўлення сужэнцам адпаведнага патрабавання.

4. Правілы вызначэння долей сужэнцаў у агульнай маёмасці пры яе падзеле і парадак такога падзелу ўстанаўлівае заканадаўства аб шлюбе і сям'і.

Артыкул 260. Выключаны

Артыкул 261. Выключаны

ГЛАВА 17
РЭЧАВЫЯ ПРАВЫ НА НЕРУХОМУЮ МАЁМАСЦЬ

Артыкул 262. Рэчавыя правы на зямельныя ўчасткі

1. Зямельныя ўчасткі могуць знаходзіцца ў землекарыстальнікаў на рэчавых правах у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі аб ахове і выкарыстанні зямель і гэтым Кодэксам.

2. Правы на зямельныя ўчасткі, а таксама абмежаванні (абцяжарванні) правоў на іх узнікаюць, пераходзяць і спыняюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам аб ахове і выкарыстанні зямель і грамадзянскім заканадаўствам.

Артыкул 263. Зямельныя ўчасткі агульнага карыстання. Доступ на зямельны ўчастак

1. Грамадзяне маюць права свабодна, без якіх-небудзь дазволаў знаходзіцца на не закрытых для агульнага доступу зямельных участках, якія знаходзяцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь, і выкарыстоўваць прыродныя аб’екты, якія ёсць на гэтых участках, у межах, дапушчальных заканадаўствам.

2. Калі зямельны ўчастак не абгароджаны або яго землекарыстальнік іншым спосабам ясна не абазначыў, што ўваход на ўчастак без яго дазволу не дапускаецца, любая асоба можа прайсці праз гэты ўчастак, калі гэта не прычыняе ўрону ці клопату землекарыстальніку.

Артыкул 264. Выключаны

Артыкул 265. Выключаны

Артыкул 266. Выключаны

Артыкул 267. Пераход правоў на зямельны ўчастак пры адчужэнні капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), якія на ім знаходзяцца

1. Пры пераходзе правоў на капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), незавершаныя закансерваваныя капітальныя пабудовы да пакупнікоў гэтых збудаванняў пераходзяць правы, абмежаванні (абцяжарванні) правоў на зямельныя ўчасткі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам аб ахове і выкарыстанні зямель.

2. Пры пераходзе правоў на капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), незавершаныя закансерваваныя капітальныя пабудовы, размешчаныя на зямельных участках, якія арандуюцца, да пакупнікоў гэтых пабудоў пераходзяць правы і абавязкі па адпаведных дагаворах арэнды зямельнага ўчастка на астатні тэрмін арэнды адпаведнага зямельнага ўчастка ў парадку, устаноўленым заканадаўствам аб ахове і выкарыстанні зямель.

Артыкул 268. Права абмежаванага карыстання чужой нерухомай маёмасцю (сервітут)

1. Уласнік нерухомай маёмасці мае права патрабаваць ад уласніка суседняй нерухомай маёмасці, а ў неабходных выпадках – і ад уласніка іншай нерухомай маёмасці давання права абмежаванага карыстання нерухомай маёмасцю (сервітуту).

2. Абцяжарванне нерухомай маёмасці сервітутам не пазбаўляе ўласніка нерухомай маёмасці правоў валодання, карыстання і распараджэння гэтай нерухомай маёмасцю.

3. Сервітут устанаўліваецца па пагадненні паміж асобай, якая патрабуе ўстанаўлення сервітуту, і ўласнікам нерухомай маёмасці і падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй. У выпадку недасягнення пагаднення аб устанаўленні ці ўмовах сервітуту спрэчку вырашае суд паводле іску асобы, якая патрабуе ўстанаўлення сервітуту.

4. Уласнік нерухомай маёмасці, абцяжаранай сервітутам, мае права, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам, патрабаваць ад асоб, у інтарэсах якіх устаноўлены сервітут, суразмерную плату за карыстанне нерухомай маёмасцю.

5. Адносіны, звязаныя з правам абмежаванага карыстання чужым зямельным участкам (зямельны сервітут), рэгулююцца заканадаўствам аб ахове і выкарыстанні зямель. Права абмежаванага карыстання чужым зямельным участкам (зямельны сервітут) устанаўліваецца і спыняецца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб ахове і выкарыстанні зямель.

Артыкул 269. Захаванне сервітуту пры пераходзе права на нерухомую маёмасць

1. Сервітут захоўваецца ў выпадку пераходу правоў на нерухомую маёмасць, якая абцяжарана гэтым сервітутам, да іншай асобы.

2. Сервітут не можа быць самастойным прадметам куплі-продажу, закладу і не можа перадавацца якім-небудзь спосабам асобам, якія не з'яўляюцца ўласнікамі нерухомай маёмасці, для забеспячэння выкарыстання якой сервітут устаноўлены.

Артыкул 270. Спыненне сервітуту

1. Па патрабаванні ўласніка маёмасці, абцяжаранай сервітутам, гэты сервітут можа быць спынены ў выніку знікнення падстаў, на якіх сервітут быў устаноўлены.

2. У выпадках, калі нерухомая маёмасць, якая належыць грамадзяніну ці юрыдычнай асобе, у выніку абцяжарвання сервітутам не можа выкарыстоўвацца ў адпаведнасці з прызначэннем, уласнік мае права патрабаваць па судзе спынення сервітуту.

Артыкул 271. Выключаны

ГЛАВА 18
ПРАВА ЎЛАСНАСЦІ І ІНШЫЯ РЭЧАВЫЯ ПРАВЫ НА ЖЫЛЫЯ ПАМЯШКАННІ

Артыкул 272. Уласнасць на жылы дом і кватэру

1. Уласнік ажыццяўляе правы валодання, карыстання і распараджэння прыналежным яму жылым памяшканнем у адпаведнасці з яго прызначэннем.

2. Жылыя памяшканні прызначаны для пражывання грамадзян.

Грамадзянін – уласнік жылога памяшкання можа выкарыстоўваць яго для асабістага пражывання і пражывання членаў яго сям'і асобна ці разам з сям'ёй.

Жылыя памяшканні могуць здавацца іх уласнікамі на падставе дагавора.

3. Размяшчэнне ў жылых дамах прамысловых вытворчасцей не дапускаецца.

Размяшчэнне ўласнікам у прыналежным яму жылым памяшканні арганізацый і іх падраздзяленняў дапускаецца толькі пасля пераводу гэтых памяшканняў у нежылыя, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі. Перавод памяшканняў з жылых у нежылыя праводзіцца ў парадку, які вызначаецца жыллёвым заканадаўствам.

Артыкул 273. Кватэра як аб'ект права ўласнасці

Уласніку кватэры ў шматкватэрным доме нароўні з прыналежным яму памяшканнем, якое займаецца пад кватэру, належыць таксама доля ў праве ўласнасці на агульную маёмасць дома (артыкул 274).

Артыкул 274. Агульная маёмасць уласнікаў у шматкватэрным доме

1. Уласнікам кватэр у шматкватэрным доме належаць на праве агульнай долевай уласнасці агульныя памяшканні дому, канструкцыі дому, механічнае, электрычнае, санітарна-тэхнічнае і іншае абсталяванне за межамі ці ўнутры кватэры, якія абслугоўваюць больш за адну кватэру, а ў выпадках, устаноўленых заканадаўствам ці дагаворам, і іншую маёмасць.

Валоданне і карыстанне агульнай маёмасцю, якая знаходзіцца ў долевай уласнасці, ажыццяўляюцца ў парадку, устаноўленым жыллёвым заканадаўствам у частцы, не ўрэгуляванай гэтым Кодэксам.

2. Уласнік кватэры не мае права адчужаць сваю долю ў праве ўласнасці на агульную маёмасць жылога дому, а таксама здзяйсняць іншыя дзеянні, якія цягнуць за сабой перадачу гэтай долі асобна ад права ўласнасці на кватэру. Адчужэнне агульнай маёмасці, якая знаходзіцца ў долевай уласнасці, ажыццяўляецца паводле рашэння агульнага сходу ўласнікаў жылых і (ці) нежылых памяшканняў са згоды дзвюх трацей ад агульнай колькасці ўласнікаў жылых і (ці) нежылых памяшканняў.

3. Уласнікі кватэр для забеспячэння эксплуатацыі шматкватэрнага дому, карыстання кватэрамі і іх агульнай маёмасцю маюць права, а ва ўстаноўленых заканадаўствам выпадках абавязаны ствараць суполкі ўласнікаў. Таварыства ўласнікаў з'яўляецца некамерцыйнай арганізацыяй, якая ствараецца выключна з мэтамі, прадугледжанымі гэтым пунктам, і дзейнічае ў адпаведнасці з заканадаўствам аб такіх таварыствах.

Артыкул 275. Правы членаў сям'і ўласніка жылога памяшкання

1. Члены сям'і ўласніка, які пражывае ў прыналежным яму жылым памяшканні, маюць права карыстання гэтым памяшканнем на ўмовах, прадугледжаных жыллёвым заканадаўствам.

2. Пераход права ўласнасці на жылы дом ці кватэру да іншай асобы не з'яўляецца падставай для спынення права карыстання жылым памяшканнем членамі сям'і ранейшага ўласніка, калі іншае не прадугледжана жыллёвым заканадаўствам.

3. Члены сям'і ўласніка жылога памяшкання могуць патрабаваць ліквідацыі парушэнняў іх правоў на жылое памяшканне ад любых асоб, уключаючы ўласніка жылога памяшкання.

Артыкул 275[1]. Адабранне жылога памяшкання ва ўласніка

Жылое памяшканне можа быць адабрана ва ўласніка ў выпадках і парадку, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

ГЛАВА 19
ПРАВА ГАСПАДАРЧАГА РАСПАРАДЖЭННЯ, ПРАВА АПЕРАТЫЎНАГА КІРАВАННЯ

Артыкул 276. Права гаспадарчага распараджэння

1. Унітарнае прадпрыемства ці дзяржаўнае аб'яднанне, а ў выпадках, якія вызначае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, іншая юрыдычная асоба, якім маёмасць належыць на праве гаспадарчага распараджэння, валодаюць, карыстаюцца і распараджаюцца гэтай маёмасцю ў межах, якія вызначаюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

2. Уласнік маёмасці ў адпаведнасці з заканадаўствам вырашае пытанні стварэння ўнітарнага прадпрыемства, вызначэння прадмета і мэт яго дзейнасці, яго рэарганізацыі і ліквідацыі, прызначае кіраўніка ўнітарнага прадпрыемства, ажыццяўляе кантроль за выкарыстаннем па прызначэнні і захаванасці прыналежнай унітарнаму прадпрыемству маёмасці.

Уласнік маёмасці, якая знаходзіцца ў гаспадарчым распараджэнні, кантралюе выкарыстанне па прызначэнні і захаванасці гэтай маёмасці, а таксама мае права на атрыманне часткі прыбытку ад яе выкарыстання.

3. Юрыдычныя асобы не маюць права прадаваць прыналежную ім на праве гаспадарчага распараджэння нерухомую маёмасць, здаваць яе ў арэнду, у заклад, уносіць у якасці ўкладу ў статутны фонд гаспадарчых суполак і таварыстваў ці іншым спосабам распараджацца гэтай маёмасцю без згоды ўласніка.

Астатняй маёмасцю, прыналежнай юрыдычным асобам на праве гаспадарчага распараджэння, яны распараджаюцца самастойна, за выключэннем выпадкаў, устаноўленых заканадаўствам і ўласнікам маёмасці.

Артыкул 277. Права аператыўнага кіравання

1. Казённае прадпрыемства, установа ці дзяржаўнае аб'яднанне, за якімі маёмасць замацавана на праве аператыўнага кіравання, у адносінах да замацаванай за імі маёмасці ажыццяўляюць у межах, устаноўленых заканадаўствам, у адпаведнасці з мэтамі сваёй дзейнасці, заданнямі ўласніка і прызначэннем маёмасці правы валодання, карыстання і распараджэння ёй.

2. Уласнік маёмасці, замацаванай за казённым прадпрыемствам, установай ці дзяржаўным аб'яднаннем на праве аператыўнага кіравання, мае права адабраць залішнюю маёмасць, а таксама маёмасць, якая не выкарыстоўваецца або выкарыстоўваецца не па прызначэнні, і распарадзіцца ёй па сваім меркаванні.

3. Маёмасць рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання, замацаваная за яго арганізацыйнымі структурамі ў выглядзе юрыдычнай асобы, належыць ім на праве аператыўнага кіравання, калі іншае не прадугледжана статутам рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання.

На арганізацыйныя структуры рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання ў выглядзе юрыдычнай асобы, за якімі маёмасць замацавана на праве аператыўнага кіравання, распаўсюджваюцца правілы, прадугледжаныя гэтым артыкулам, артыкуламі 279, 280 і пунктам 2 артыкула 281 гэтага Кодэкса.

Артыкул 278. Распараджэнне маёмасцю казённага прадпрыемства і дзяржаўнага аб'яднання, за якім маёмасць замацавана на праве аператыўнага кіравання

1. Казённае прадпрыемства мае права адчужаць ці іншым спосабам распараджацца замацаванай за ім маёмасцю толькі са згоды ўласніка гэтай маёмасці. Казённае прадпрыемства мае права перадаваць у заклад маёмасць, якая знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці, у парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі аб распараджэнні дзяржаўнай маёмасцю, калі іншае не прадугледжана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Казённае прадпрыемства самастойна рэалізуе тавары (работы, паслугі), калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

2. Парадак размеркавання даходаў казённага прадпрыемства вызначае ўласнік яго маёмасці.

3. Правілы, прадугледжаныя пунктамі 1 і 2 гэтага артыкула, прымяняюцца да дзяржаўнага аб'яднання, за якім маёмасць замацавана на праве аператыўнага кіравання, калі іншае не вызначана актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 279. Распараджэнне маёмасцю ўстановы

1. Установа не мае права без згоды ўласніка адчужаць ці іншым спосабам распараджацца замацаванай за ёй маёмасцю і маёмасцю, набытай за кошт выдзеленых ёй сродкаў, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам ці іншымі заканадаўчымі актамі. Установа мае права перадаваць у заклад маёмасць, якая знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці, у парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі аб распараджэнні дзяржаўнай маёмасцю, калі іншае не прадугледжана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, а маёмасць, якая знаходзіцца ў прыватнай уласнасці, – са згоды ўласніка гэтай маёмасці або ўпаўнаважанай ім асобы.

2. Калі ў адпаведнасці з устаноўчымі дакументамі ўстанове дадзена права ажыццяўляць дзейнасць, якая прыносіць даходы, то атрыманыя ад такой дзейнасці даходы і набытая за кошт іх маёмасць паступаюць у самастойнае распараджэнне ўстановы і ўлічваюцца на асобным балансе (асобна ў кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання), калі іншае не прадугледжана заканадаўствам.

Артыкул 280. Набыццё і спыненне права гаспадарчага распараджэння **і права аператыўнага кіравання**

1. Права гаспадарчага распараджэння ці права аператыўнага кіравання маёмасцю, у адносінах да якой уласнік прыняў рашэнне аб замацаванні за ўнітарным прадпрыемствам, установай ці дзяржаўным аб'яднаннем, узнікае ў гэтага прадпрыемства, установы ці дзяржаўнага аб'яднання з моманту перадачы маёмасці, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

2. Набыткі, прадукцыя і даходы ад выкарыстання маёмасці, якая знаходзіцца ў гаспадарчым распараджэнні ці аператыўным кіраванні, а таксама маёмасць, набытая ўнітарным прадпрыемствам, установай ці дзяржаўным аб'яднаннем паводле дагавораў ці на іншых падставах, паступаюць у гаспадарчае распараджэнне ці аператыўнае кіраванне прадпрыемства, установы ці дзяржаўнага аб'яднання ў парадку, устаноўленым заканадаўствам для набыцця права ўласнасці. Права ўласнасці на гэтыя набыткі, прадукцыю, даходы і маёмасць набывае ўласнік маёмасці ўказаных юрыдычных асоб.

3. Права гаспадарчага распараджэння і права аператыўнага кіравання маёмасцю спыняюцца на падставах і ў парадку, прадугледжаных заканадаўчымі актамі для спынення права ўласнасці, а таксама ў выпадках правамернага адабрання маёмасці ў прадпрыемства, установы ці дзяржаўнага аб'яднання паводле рашэння ўласніка.

Артыкул 281. Захаванне права на маёмасць пры пераходзе прадпрыемства ці маёмасці ўстановы да іншага ўласніка

1. Пры пераходзе права ўласнасці на прадпрыемства як маёмасны комплекс да іншага ўласніка юрыдычная асоба, якой гэта прадпрыемства належыць на праве гаспадарчага распараджэння, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь ці дагаворам, захоўвае права гаспадарчага распараджэння на прыналежнае яму прадпрыемства.

2. Пры пераходзе права ўласнасці на маёмасць установы да іншай асобы гэта ўстанова захоўвае права аператыўнага кіравання на замацаваную за ім маёмасць.

ГЛАВА 20
АБАРОНА ПРАВА ЎЛАСНАСЦІ І ІНШЫХ РЭЧАВЫХ ПРАВОЎ

Артыкул 282. Выпатрабаванне маёмасці з чужога незаконнага валодання

Уласнік мае права выпатрабаваць сваю маёмасць з чужога незаконнага валодання.

Артыкул 283. Выпатрабаванне маёмасці ад добрасумленнага пакупніка

1. Калі маёмасць платна набыта ў асобы, якая не мела права яе адчужаць, аб чым пакупнік не ведаў і не мог ведаць (добрасумленны пакупнік), то ўласнік мае права выпатрабаваць гэту маёмасць у пакупніка ў выпадку, калі маёмасць страчана ўласнікам ці асобай, якой маёмасць была перададзена ўласнікам у валоданне, або выкрадзена ў таго ці іншага, або выбыла з іх валодання іншым шляхам без іх волі.

2. Калі маёмасць набыта бязвыплатна ў асобы, якая не мела права яе адчужаць, уласнік мае права выпатрабаваць маёмасць ва ўсіх выпадках.

3. Грошы, а таксама каштоўныя паперы на прад'яўніка не могуць быць выпатрабаваны ў добрасумленнага пакупніка.

Артыкул 284. Разлікі пры звароце маёмасці з незаконнага валодання

Пры выпатрабаванні маёмасці з чужога незаконнага валодання ўласнік мае права таксама запатрабаваць ад асобы, якая ведала ці павінна была ведаць, што яе валоданне незаконнае (нядобрасумленны ўладальнік), вяртання ці пакрыцця ўсіх даходаў, якія гэта асоба атрымала ці павінна была атрымаць за ўвесь час валодання, а ад добрасумленнага ўладальніка – вяртання ці пакрыцця ўсіх даходаў, якія ён атрымаў ці павінен быў атрымаць з часу, калі ён даведаўся ці павінен быў даведацца аб неправамернасці валодання ці атрымаў павестку па іску ўласніка аб вяртанні маёмасці.

Уладальнік, як добрасумленны, так і нядобрасумленны, у сваю чаргу мае права патрабаваць ад уласніка пакрыцця праведзеных ім неабходных затрат на маёмасць з таго часу, з якога ўласніку належаць даходы ад маёмасці.

Добрасумленны ўладальнік мае права пакінуць за сабой праведзеныя ім паляпшэнні, калі яны могуць быць аддзелены без пашкоджання маёмасці. Калі такое аддзяленне паляпшэнняў немагчымае, добрасумленны ўладальнік мае права патрабаваць пакрыцця праведзеных на паляпшэнне затрат, але не большых за памер павелічэння кошту маёмасці.

Артыкул 285. Абарона правоў уласніка ад парушэнняў, не звязаных з пазбаўленнем валодання

Уласнік можа патрабаваць ліквідацыі ўсякіх парушэнняў яго права, хаця б гэтыя парушэнні і не былі злучаны з пазбаўленнем валодання.

Артыкул 286. Абарона правоў уладальніка, які не з'яўляецца ўласнікам

Правы, прадугледжаныя артыкуламі 282–285 гэтага Кодэкса, належаць таксама асобе, якая хоць і не з'яўляецца ўласнікам, але валодае маёмасцю на праве пажыццёвага валодання, якое атрымліваецца ў спадчыну, гаспадарчага распараджэння, аператыўнага кіравання або на іншай падставе, прадугледжанай заканадаўствам ці дагаворам. Гэта асоба мае права на абарону яе валодання таксама супраць уласніка.

Артыкул 287. Наступствы спынення права ўласнасці паводле акта заканадаўства

У выпадку прыняцця акта заканадаўства, які спыняе права ўласнасці, страты, прычыненыя ўласніку ў выніку прыняцця гэтага акта, у тым ліку кошт маёмасці, кампенсуе дзяржава. Спрэчкі аб пакрыцці страт вырашае суд.

РАЗДЗЕЛ III
АГУЛЬНАЯ ЧАСТКА АБАВЯЗАЦЕЛЬНАГА ПРАВА

ПАДРАЗДЗЕЛ 1
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ АБ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАХ
ГЛАВА 21
ПАНЯЦЦЕ І БАКІ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА

Артыкул 288. Паняцце абавязацельства і падставы яго ўзнікнення

1. З прычыны абавязацельства адна асоба (даўжнік) абавязана здзейсніць на карысць іншай асобы (крэдытора) пэўнае дзеянне, як: перадаць маёмасць, выканаць работу, выплаціць грошы і да т. п., або ўстрымацца ад пэўнага дзеяння, а крэдытор мае права патрабаваць ад даўжніка выканання яго абавязку.

2. Абавязацельствы ўзнікаюць з дагавора, у выніку прычынення шкоды, беспадстаўнага абагачэння і з іншых падстаў, указаных у гэтым Кодэксе і іншых актах заканадаўства.

Артыкул 289. Бакі абавязацельства

1. У абавязацельстве ў якасці кожнага з яго бакоў – крэдытора ці даўжніка – могуць удзельнічаць адна ці адначасова некалькі асоб.

Несапраўднасць патрабаванняў крэдытора да адной з асоб, якія ўдзельнічаюць у абавязацельстве на баку даўжніка, таксама як і сканчэнне тэрміну іскавай даўнасці па патрабаванні да такой асобы, самі па сабе не закранаюць яго патрабаванні да астатніх гэтых асоб.

2. Калі кожны з бакоў паводле дагавора нясе абавязак на карысць іншага боку, ён лічыцца даўжніком іншага боку ў тым, што абавязаны зрабіць на яго карысць, і адначасова яго крэдыторам у тым, што мае права ад яго патрабаваць.

3. Абавязацельства не стварае абавязкаў для асоб, якія не ўдзельнічаюць у ім у якасці бакоў (для трэціх асоб).

У выпадках, прадугледжаных заканадаўствам ці пагадненнем бакоў, абавязацельства можа ствараць для трэціх асоб правы ў адносінах да аднаго ці абодвух бакоў абавязацельства.

ГЛАВА 22
ВЫКАНАННЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ

Артыкул 290. Агульныя палажэнні

Абавязацельствы павінны выконвацца належным чынам у адпаведнасці з умовамі абавязацельства і патрабаваннямі заканадаўства, а пры адсутнасці такіх умоў і патрабаванняў – у адпаведнасці з патрабаваннямі, якія звычайна прад'яўляюцца.

Артыкул 291. Недапушчальнасць аднабаковай адмовы ад выканання абавязацельства

Аднабаковая адмова ад выканання абавязацельства і аднабаковае змяненне яго ўмоў не дапускаюцца, калі іншае не вынікае з заканадаўства ці дагавора.

Артыкул 292. Выкананне абавязацельства па частках

Крэдытор мае права не прымаць выканання абавязацельства па частках, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам, умовамі абавязацельства і не вынікае з сутнасці абавязацельства.

Артыкул 293. Выкананне абавязацельства належнай асобе

Калі іншае не прадугледжана пагадненнем бакоў і не вынікае з сутнасці абавязацельства, даўжнік мае права пры выкананні абавязацельства запатрабаваць доказаў таго, што выкананне прымаецца самім крэдыторам ці асобай, якой ён даў на гэта права, і нясе рызыку наступстваў невыканання такога патрабавання.

Артыкул 294. Выкананне абавязацельства трэцяй асобай

1. Выкананне абавязацельства можа быць ускладзена даўжніком на трэцюю асобу, калі з заканадаўства, умоў абавязацельства ці яго сутнасці не вынікае абавязак даўжніка выканаць абавязацельства асабіста. У гэтым выпадку крэдытор абавязаны прыняць выкананне, прапанаванае за даўжніка трэцяй асобай.

2. Трэцяя асоба, якая падвяргаецца небяспецы страціць сваё права на маёмасць даўжніка (права арэнды, закладу ці інш.) у выніку накіравання крэдыторам спагнання на гэту маёмасць, можа за свой кошт забяспечыць патрабаванне крэдытора без згоды даўжніка. У гэтым выпадку да трэцяй асобы пераходзяць правы крэдытора па абавязацельстве ў адпаведнасці з артыкуламі 353–358 гэтага Кодэкса.

Артыкул 295. Тэрмін выканання абавязацельства

1. Калі абавязацельства прадугледжвае ці дазваляе вызначыць дзень яго выканання ці перыяд часу, на працягу якога яно павінна быць выканана, абавязацельства падлягае выкананню ў гэты дзень ці адпаведна ў любы момант у межах такога перыяду.

2. У выпадках, калі абавязацельства не прадугледжвае тэрмін яго выканання і не ўтрымлівае ўмоў, якія дазваляюць вызначыць гэты тэрмін, яно павінна быць выканана ў разумны тэрмін пасля ўзнікнення абавязацельства.

Абавязацельства, не выкананае ў разумны тэрмін, а таксама абавязацельства, тэрмін якога вызначаны момантам запатрабавання, даўжнік абавязаны выканаць у сямідзённы тэрмін з дня паступлення пісьмовага патрабавання крэдытора аб яго выкананні, калі абавязак выканання ў іншы тэрмін не вынікае з акта заканадаўства, умоў абавязацельства ці сутнасці абавязацельства.

Артыкул 296. Датэрміновае выкананне абавязацельства

Даўжнік мае права выканаць абавязацельства да тэрміну, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці ўмовамі абавязацельства або не вынікае з яго сутнасці. Аднак датэрміновае выкананне абавязацельства, звязанага з ажыццяўленнем яго бакамі прадпрымальніцкай дзейнасці, дапускаецца толькі ў выпадках, калі магчымасць выканаць абавязацельства датэрмінова прадугледжана заканадаўствам ці ўмовамі абавязацельства або вынікае з сутнасці абавязацельства.

Артыкул 297. Месца выканання абавязацельства

Калі месца выканання абавязацельства не вызначана заканадаўствам ці дагаворам, не вынікае з сутнасці абавязацельства, выкананне павінна быць праведзена:

1) па абавязацельстве перадаць зямельны ўчастак, капітальную пабудову (будынак, збудаванне) ці іншую нерухомую маёмасць – у месцы знаходжання маёмасці;

2) па абавязацельстве перадаць тавар ці іншую маёмасць, якое прадугледжвае яе перавозку, – у месцы здачы маёмасці першаму перавозчыку для дастаўкі яго крэдытору;

3) па іншых абавязацельствах даўжніка перадаць тавар ці іншую маёмасць – у месцы вырабу ці захоўвання маёмасці, калі гэта месца было вядома крэдытору ў момант узнікнення абавязацельства;

4) па грашовым абавязацельстве – у месцы жыхарства крэдытора ў момант узнікнення абавязацельства, а калі крэдыторам з'яўляецца юрыдычная асоба, – у месцы яго знаходжання ў момант узнікнення абавязацельства. Калі крэдытор да моманту выканання абавязацельства змяніў месца жыхарства ці месца знаходжання і паведаміў аб гэтым даўжніку, – у новым месцы жыхарства ці месцы знаходжання крэдытора з аднясеннем на кошт крэдытора расходаў, звязаных з пераменай месца выканання;

5) па ўсіх іншых абавязацельствах – у месцы жыхарства даўжніка, а калі даўжніком з'яўляецца юрыдычная асоба, – у месцы яго знаходжання.

Артыкул 298. Валюта грашовых абавязацельстваў

1. Грашовыя абавязацельствы павінны быць выражаны ў беларускіх рублях (артыкул 141).

У грашовым абавязацельстве можа быць прадугледжана, што яно падлягае аплаце ў беларускіх рублях у суме, эквівалентнай пэўнай суме ў замежнай валюце ці ва ўмоўных грашовых адзінках («спецыяльных правах запазычання» і інш.). У гэтым выпадку падлеглая аплаце ў рублях сума вызначаецца па афіцыйным курсе адпаведнай валюты ці ўмоўных грашовых адзінак на дзень выплаты, калі іншы курс ці іншая дата яго вызначэння не ўстаноўлены заканадаўствам ці пагадненнем бакоў.

2. Выкарыстанне замежнай валюты, а таксама плацежных дакументаў у замежнай валюце пры ажыццяўленні разлікаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь па абавязацельствах дапускаецца ў выпадках, парадку і на ўмовах, вызначаных заканадаўствам.

Артыкул 299. Павелічэнне сум, якія выплачваюцца на ўтрыманне грамадзяніна

Сума, якая выплачваецца па грашовым абавязацельстве непасрэдна на ўтрыманне грамадзяніна як пакрыццё шкоды, прычыненай яго жыццю і здароўю, паводле дагавора пажыццёвага ўтрымання і ў іншых выпадках, з павелічэннем устаноўленага заканадаўствам памеру базавай велічыні прапарцыянальна павялічваецца.

Артыкул 300. Чарговасць пагашэння патрабаванняў па грашовым абавязацельстве

Сума праведзенага плацяжу, недастатковая для поўнага выканання грашовага абавязацельства, пагашае, калі іншае не прадугледжана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь:

у першую чаргу – выдаткі крэдытора па атрыманні выканання;

у другую чаргу – асноўную суму доўгу і працэнты за карыстанне грашовымі сродкамі, якія падлягаюць выплаце па грашовым абавязацельстве (пазыцы, крэдыце, авансе і г. д.);

у трэцюю чаргу – працэнты, прадугледжаныя артыкулам 366 гэтага Кодэкса за невыкананне ці пратэрміноўку выканання грашовага абавязацельства, і няўстойку.

Артыкул 301. Выкананне альтэрнатыўнага абавязацельства

Даўжніку, абавязанаму перадаць крэдытору тую ці другую маёмасць або здзейсніць адно з двух ці некалькіх дзеянняў, належыць права выбару, калі з заканадаўства ці ўмоў абавязацельства не вынікае іншае.

Артыкул 302. Выкананне абавязацельства, у якім удзельнічаюць некалькі крэдытораў ці некалькі даўжнікоў

Калі ў абавязацельстве ўдзельнічаюць некалькі крэдытораў ці некалькі даўжнікоў, то кожны з крэдытораў мае права патрабаваць выканання, а кожны з даўжнікоў абавязаны выканаць абавязацельства ў роўнай долі з іншымі, паколькі з заканадаўства ці ўмоў абавязацельства не вынікае іншае.

Артыкул 303. Салідарныя абавязацельствы

1. Салідарны абавязак (адказнасць) ці салідарнае патрабаванне ўзнікаюць, калі салідарнасць абавязку ці патрабавання прадугледжана дагаворам ці ўстаноўлена заканадаўствам, у прыватнасці пры непадзельнасці прадмета абавязацельства.

2. Абавязкі некалькіх даўжнікоў па абавязацельстве, звязаным з прадпрымальніцкай дзейнасцю, таксама як і патрабаванні некалькіх крэдытораў у такім абавязацельстве, з'яўляюцца салідарнымі, калі заканадаўствам ці ўмовамі абавязацельства не прадугледжана іншае.

Артыкул 304. Правы крэдытора пры салідарным абавязку

1. Пры салідарным абавязку даўжнікоў крэдытор мае права патрабаваць выканання як ад усіх даўжнікоў сумесна, так і ад любога з іх паасобку, прытым як поўнасцю, так і ў частцы доўгу.

2. Крэдытор, які не атрымаў поўнага задавальнення ад аднаго з салідарных даўжнікоў, мае права патрабаваць недаатрыманае ад астатніх салідарных даўжнікоў.

Салідарныя даўжнікі застаюцца абавязанымі да таго часу, пакуль абавязацельства не будзе выканана поўнасцю.

Артыкул 305. Пярэчанні супраць патрабаванняў крэдытора пры салідарным абавязку

У выпадку салідарнага абавязку даўжнік не мае права высоўваць супраць патрабавання крэдытора пярэчанні, заснаваныя на такіх адносінах іншых даўжнікоў з крэдыторам, у якіх гэты даўжнік не ўдзельнічае.

Артыкул 306. Выкананне салідарнага абавязку адным з даўжнікоў

1. Выкананне салідарнага абавязку поўнасцю адным з даўжнікоў вызваляе астатніх даўжнікоў ад выканання крэдытору.

2. Калі іншае не вынікае з адносін паміж салідарнымі даўжнікамі:

1) даўжнік, які выканаў салідарны абавязак, мае права рэгрэснага патрабавання да астатніх даўжнікоў у роўных долях за вылікам долі, якая прыпадае на яго самога;

2) незаплачанае адным з салідарных даўжнікоў даўжніку, які выканаў салідарны абавязак, прыпадае ў роўнай долі на гэтага даўжніка і на астатніх даўжнікоў.

3. Правілы гэтага артыкула прымяняюцца адпаведна пры спыненні салідарнага абавязацельства залікам сустрэчнага патрабавання аднаго з даўжнікоў.

Артыкул 307. Салідарныя патрабаванні

1. Пры салідарнасці патрабавання любы з салідарных крэдытораў мае права прад'явіць да даўжніка патрабаванне ў поўным аб'ёме.

Да прад'яўлення патрабавання адным з салідарных крэдытораў даўжнік мае права выканаць абавязацельства любому з іх па сваім меркаванні.

2. Даўжнік не мае права выказваць супраць патрабавання аднаго з салідарных крэдытораў пярэчанні, заснаваныя на такіх адносінах даўжніка з іншымі салідарнымі крэдыторамі, у якіх гэты крэдытор не ўдзельнічае.

3. Выкананне абавязацельства поўнасцю аднаму з салідарных крэдытораў вызваляе даўжніка ад выканання астатнім крэдыторам.

4. Салідарны крэдытор, які атрымаў выкананне ад даўжніка, абавязаны кампенсаваць належнае іншым крэдыторам у роўных долях, калі іншае не вынікае з адносін паміж імі.

Артыкул 308. Выкананне абавязацельства ўнясеннем доўгу ў дэпазіт

1. Даўжнік мае права ўнесці грошы ці каштоўныя паперы, якія належаць з яго, у дэпазіт натарыуса, дыпламатычнага агента дыпламатычнага прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь і консульскай службовай асобы консульскай установы Рэспублікі Беларусь, а ў выпадках, устаноўленых заканадаўствам, – у дэпазіт суда, калі абавязацельства не можа быць выканана даўжніком у выніку:

1) адсутнасці крэдытора ці асобы, упаўнаважанай ім прыняць выкананне, у месцы, дзе абавязацельства павінна быць выканана;

2) недзеяздольнасці крэдытора і адсутнасці ў яго прадстаўніка;

3) відавочнай адсутнасці пэўнасці наконт таго, хто з'яўляецца крэдыторам па абавязацельстве, у прыватнасці ў сувязі са спрэчкай з гэтай прычыны паміж крэдыторам і іншымі асобамі;

4) ухілення крэдытора ад прыняцця выканання ці іншай пратэрміноўкі з яго боку.

2. Унясенне грашовай сумы ці каштоўных папер у дэпазіт натарыуса, дыпламатычнага агента дыпламатычнага прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь і консульскай службовай асобы консульскай установы Рэспублікі Беларусь ці суда лічыцца выкананнем абавязацельства.

Натарыус, дыпламатычны агент дыпламатычнага прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь і консульская службовая асоба консульскай установы Рэспублікі Беларусь ці суд, у дэпазіт якога ўнесены грошы ці каштоўныя паперы, паведамляе аб гэтым крэдытору.

Артыкул 309. Сустрэчнае выкананне абавязацельства

1. Сустрэчным прызнаецца выкананне абавязацельства аднаго з бакоў, якое ў адпаведнасці з дагаворам абумоўлена выкананнем сваіх абавязацельстваў іншым бокам.

2. У выпадку непрад’яўлення абавязаным бокам абумоўленага дагаворам выканання абавязацельства або наяўнасці абставін, якія відавочна сведчаць аб тым, што такое выкананне не будзе праведзена ва ўстаноўлены тэрмін, бок, на якім ляжыць сустрэчнае выкананне, мае права прыпыніць выкананне свайго абавязацельства або адмовіцца ад выканання гэтага абавязацельства і запатрабаваць пакрыцця страт.

Калі абумоўленае дагаворам выкананне абавязацельства праведзена не ў поўным аб'ёме, бок, на якім ляжыць сустрэчнае выкананне, мае права прыпыніць выкананне свайго абавязацельства ці адмовіцца ад выканання ў частцы, якая адпавядае непрад’яўленаму выкананню.

3. Калі сустрэчнае выкананне абавязацельства праведзена нягледзячы на непрад'яўленне іншым бокам абумоўленага дагаворам выканання свайго абавязацельства, гэты бок абавязаны прад'явіць такое выкананне.

4. Правілы, прадугледжаныя пунктамі 2 і 3 гэтага артыкула, прымяняюцца, калі дагаворам ці заканадаўствам не прадугледжана іншае.

ГЛАВА 23
ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ВЫКАНАННЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ

§ 1. Агульныя палажэнні

Артыкул 310. Спосабы забеспячэння выканання абавязацельстваў

1. Выкананне абавязацельстваў можа забяспечвацца няўстойкай, закладам, утрыманнем маёмасці даўжніка, паручыцельствам, гарантыяй, банкаўскай гарантыяй, задаткам і іншымі спосабамі, прадугледжанымі заканадаўствам ці дагаворам.

2. Несапраўднасць пагаднення аб забеспячэнні выканання абавязацельства не цягне за сабой несапраўднасці гэтага абавязацельства (асноўнага абавязацельства).

3. Несапраўднасць асноўнага абавязацельства цягне за сабой несапраўднасць абавязацельства, якое забяспечвае яго, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

4. Да адносін па забеспячэнні выканання абавязацельстваў па каштоўных паперах прымяняюцца правілы гэтай главы з улікам асаблівасцей, устаноўленых заканадаўствам аб каштоўных паперах.

§ 2. Няўстойка

Артыкул 311. Паняцце няўстойкі

1. Няўстойкай (штрафам, пеняй) прызнаецца вызначаная заканадаўствам ці дагаворам грашовая сума, якую даўжнік абавязаны заплаціць крэдытору, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі, у выпадку невыканання ці неналежнага выканання абавязацельства, у прыватнасці ў выпадку пратэрміноўкі выканання. Па патрабаванні аб выплаце няўстойкі крэдытор не абавязаны даказваць прычыненне яму страт.

2. Крэдытор не мае права патрабаваць выплаты няўстойкі ў выпадках, калі даўжнік не нясе адказнасці за невыкананне ці неналежнае выкананне абавязацельства.

3. Заканадаўчымі актамі могуць быць прадугледжаны асаблівасці выплаты (спагнання) няўстойкі (штрафу, пені).

Артыкул 312. Форма пагаднення аб няўстойцы

Пагадненне аб няўстойцы павінна быць заключана ў пісьмовай форме незалежна ад формы асноўнага абавязацельства.

Незахаванне пісьмовай формы цягне за сабой несапраўднасць пагаднення аб няўстойцы.

Артыкул 313. Законная няўстойка

1. Крэдытор мае права патрабаваць выплаты няўстойкі, вызначанай заканадаўствам, незалежна ад таго, ці прадугледжаны абавязак яе выплаты пагадненнем бакоў.

2. Памер законнай няўстойкі можа быць зменены пагадненнем бакоў, калі заканадаўства гэтага не забараняе.

Артыкул 314. Змяншэнне няўстойкі

Калі падлеглая выплаце няўстойка яўна несуразмерная наступствам парушэння абавязацельства, суд мае права зменшыць няўстойку.

Пры вырашэнні пытання аб змяншэнні няўстойкі суд можа ўлічыць дзеянні бакоў, накіраваныя на добраахвотнае дасудовае ўрэгуляванне спрэчкі.

Змяншэнне няўстойкі пасля яе выплаты не дапускаецца. Заканадаўчымі актамі могуць прадугледжвацца выпадкі, калі няўстойка не падлягае змяншэнню.

Правілы гэтага артыкула не закранаюць правы даўжніка на змяншэнне памеру яго адказнасці на падставе артыкула 375 гэтага Кодэкса і права крэдытора на пакрыццё страт у выпадках, прадугледжаных артыкулам 365 гэтага Кодэкса.

§ 3. Заклад

Артыкул 315. Паняцце і падставы ўзнікнення закладу

1. З прычыны закладу крэдытор па забяспечаным закладам абавязацельстве (закладатрымальнік) мае права ў выпадку невыканання ці неналежнага выканання даўжніком гэтага абавязацельства атрымаць задавальненне з кошту закладзенай маёмасці пераважна перад іншымі крэдыторамі асобы, якой належыць гэта маёмасць (заклададавальніка), за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

2. Заклад зямельных участкаў, прадпрыемстваў, капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), кватэр і іншай нерухомай маёмасці (іпатэка) рэгулюецца заканадаўчымі актамі аб іпатэцы. Агульныя правілы аб закладзе, якія ўтрымліваюцца ў гэтым Кодэксе, прымяняюцца да іпатэкі ў выпадках, калі заканадаўчымі актамі аб іпатэцы не ўстаноўлены іншыя правілы.

Да закладу каштоўных папер правілы гэтага параграфа прымяняюцца, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам аб каштоўных паперах.

3. Заклад узнікае паводле дагавора. Заклад узнікае таксама на падставе акта заканадаўства пры надыходзе ўказаных у ім абставін, калі ў заканадаўстве прадугледжана, якая маёмасць і для забеспячэння выканання якога абавязацельства прызнаецца, што яна знаходзіцца ў закладзе.

Правілы гэтага Кодэкса аб закладзе, які ўзнікае паводле дагавора, адпаведна прымяняюцца да закладу, які ўзнікае на падставе акта заканадаўства, калі заканадаўствам не ўстаноўлена іншае.

Артыкул 316. Заклададавальнік

1. Заклададавальнікам можа быць як сам даўжнік, так і трэцяя асоба.

2. Заклададавальнікам рэчы можа быць яе ўласнік або асоба, якая мае на яе права гаспадарчага распараджэння ці аператыўнага кіравання, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных часткамі другой і трэцяй гэтага пункта.

Асоба, якой рэч належыць на праве гаспадарчага распараджэння , мае права закласці яе без згоды ўласніка толькі пры распараджэнні маёмасцю ў адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 276 гэтага Кодэкса.

Арганізацыі, за якімі маёмасць замацавана на праве аператыўнага кіравання, маюць права перадаваць у заклад маёмасць, якая знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці, у парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі аб распараджэнні дзяржаўнай маёмасцю, калі іншае не прадугледжана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, а маёмасць, якая знаходзіцца ў прыватнай уласнасці, – са згоды ўласніка гэтай маёмасці або ўпаўнаважанай ім асобы.

3. Заклададавальнікам права можа быць асоба, якой належыць права, што закладаецца.

Заклад права арэнды ці іншага права на чужую рэч не дапускаецца без згоды яе ўласніка ці асобы, якая мае на яе права гаспадарчага распараджэння ці аператыўнага кіравання, калі заканадаўствам ці дагаворам забаронена адчужэнне гэтага права без згоды ўказаных асоб.

Артыкул 317. Прадмет закладу

1. Прадметам закладу можа быць усякая маёмасць, у тым ліку рэчы і маёмасныя правы (патрабаванні), за выключэннем маёмасці, адабранай з абарачэння, патрабаванняў, неразрыўна звязаных з асобай крэдытора, у прыватнасці патрабаванняў аб аліментах, аб пакрыцці шкоды, прычыненай яго жыццю ці здароўю, і іншых правоў, уступка якіх іншай асобе забаронена законам.

Маёмасць, набытая за кошт знешняй дзяржаўнай пазыкі (крэдыту), не можа з'яўляцца прадметам закладу, у тым ліку іпатэкі, да поўнага пагашэння абавязацельстваў па такой пазыцы (крэдыце).

Заканадаўчымі актамі могуць быць устаноўлены іншыя абмежаванні на перадачу маёмасці ў заклад.

2. Заклад асобных відаў маёмасці, у прыватнасці маёмасці грамадзян, на якую не дапускаецца накіраванне спагнання, можа быць законам забаронены ці абмежаваны.

Артыкул 318. Патрабаванне, якое забяспечваецца закладам

Калі іншае не прадугледжана дагаворам, заклад забяспечвае патрабаванне ў тым аб'ёме, які яно мае да моманту задавальнення, у прыватнасці працэнты, няўстойку, пакрыццё страт, прычыненых невыкананнем ці неналежным выкананнем, расходаў закладатрымальніка на ўтрыманне закладзенай рэчы і расходаў па спагнанні.

Артыкул 319. Заклад без перадачы і з перадачай закладзенай маёмасці закладатрымальніку

1. Закладзеная маёмасць застаецца ў заклададавальніка, калі дагаворам не прадугледжана перадача закладзенай маёмасці ў валоданне закладатрымальніку (заклад).

Маёмасць, на якую ўстаноўлена іпатэка, закладзеныя акцыі, а таксама закладзеныя тавары ў абарачэнні не могуць быць прадметам закладу.

2. Па пагадненні бакоў прадмет закладу можа быць пакінуты ў заклададавальніка пад замком з пячаткай закладатрымальніка ці з накладаннем знакаў, якія сведчаць аб закладзе (цвёрды заклад).

Правілы, якія рэгулююць заклад, прымяняюцца да цвёрдага закладу ў той меры, у якой іх прымяненне не супярэчыць сутнасці адносін закладатрымальніка з заклададавальнікам пры такім відзе закладу.

3. Прадмет закладу, перададзены заклададавальнікам на час у валоданне ці карыстанне трэцяй асобе, лічыцца пакінутым у заклададавальніка.

4. Пры закладзе маёмаснага права, засведчанага каштоўнай паперай, за выключэннем эмісійнай каштоўнай паперы, яна перадаецца закладатрымальніку або ў дэпазіт натарыуса, дыпламатычнага агента дыпламатычнага прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь і консульскай службовай асобы консульскай установы Рэспублікі Беларусь, калі дагаворам не прадугледжана іншае.

Артыкул 320. Дагавор аб закладзе, яго форма і рэгістрацыя

1. У дагаворы аб закладзе павінны быць указаны прадмет закладу і яго кошт, сутнасць, памер і тэрмін выканання абавязацельства, якое забяспечваецца закладам, а таксама іншыя ўмовы, калі абавязковасць іх уключэння ў дагавор прадугледжана

гэтай главой. У дагаворы аб закладзе павінна таксама ўтрымлівацца ўказанне на тое, у якога з бакоў знаходзіцца закладзеная маёмасць.

2. Дагавор аб закладзе павінен быць заключаны ў пісьмовай форме.

Дагавор аб закладзе маёмасці і (ці) маёмасных правоў (патрабаванняў) у забеспячэнне абавязацельстваў паводле дагавора, які павінен быць натарыяльна засведчаны, падлягае натарыяльнаму засведчанню.

3. Дагавор аб іпатэцы павінен быць зарэгістраваны ў парадку, устаноўленым для рэгістрацыі здзелак з адпаведнай маёмасцю. Дагавор аб іпатэцы, які прадугледжвае заклад нерухомай маёмасці, якая паступіць заклададавальніку ў будучыні і якая на момант заключэння дагавора не лічыцца створанай у адпаведнасці з заканадаўствам, не падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі і лічыцца заключаным з моманту надання яму пісьмовай формы.

4. Незахаванне правілаў, якія ўтрымліваюцца ў пунктах 2 і 3 гэтага артыкула, цягне за сабой несапраўднасць дагавора аб закладзе.

Артыкул 321. Маёмасць, на якую распаўсюджваецца права закладатрымальніка

1. Права закладатрымальніка (права закладу) на рэч, якая з'яўляецца прадметам закладу, распаўсюджваецца на яе прыладдзе, калі іншае не прадугледжана дагаворам.

На атрыманыя ў выніку выкарыстання закладзенай маёмасці набыткі, прадукцыю і даходы права закладу распаўсюджваецца ў выпадках, прадугледжаных дагаворам.

2. Пры іпатэцы прадпрыемства ці іншага маёмаснага комплексу ў цэлым права закладу распаўсюджваецца на ўсю яго маёмасць – рухомую і нерухомую, уключаючы права патрабавання і выключныя правы, у тым ліку набытыя ў перыяд іпатэкі, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі ці дагаворам.

3. Выключаны.

4. Выключаны.

5. Выключаны.

6. Дагаворам аб закладзе, а ў адносінах да закладу, які ўзнікае на падставе акта заканадаўства, заканадаўствам можа быць прадугледжаны заклад рэчаў і маёмасных правоў, якія заклададавальнік набудзе ў будучыні.

Артыкул 322. Узнікненне права закладу

1. Права закладу ўзнікае з моманту заключэння дагавора аб закладзе, у адносінах да закладу маёмасці, якая падлягае перадачы закладатрымальніку, – з моманту перадачы гэтай маёмасці, калі іншае не прадугледжана дагаворам аб закладзе, а ў выпадках, калі неабходная рэгістрацыя дагавора, – з моманту рэгістрацыі дагавора.

Калі прадметам закладу з'яўляецца маёмасць, якая будзе створана ці набыта заклададавальнікам у будучыні, права закладу ўзнікае ў закладатрымальніка з моманту стварэння ці набыцця заклададавальнікам гэтай маёмасці, калі заканадаўствам ці дагаворам аб закладзе не прадугледжана, што яно ўзнікае ў іншы тэрмін.

2. Права закладу на тавары ў абарачэнні ўзнікае ў адпаведнасці з правіламі пункта 2 артыкула 338 гэтага Кодэкса.

Артыкул 323. Наступны заклад. Чарговасць задавальнення патрабаванняў закладатрымальнікаў

1. Калі закладзеная маёмасць становіцца прадметам яшчэ аднаго закладу ў забеспячэнне іншых патрабаванняў (наступны заклад), патрабаванні закладатрымальнікаў задавальняюцца з кошту гэтай маёмасці з прытрымліваннем чарговасці, прадугледжанай пунктам 2 гэтага артыкула, калі іншае не ўстаноўлена артыкулам 323[1] гэтага Кодэкса.

Наступны заклад не дапускаецца:

калі ён забаронены папярэднімі дагаворамі аб закладзе;

у іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

Заклададавальнік абавязаны паведамляць закладатрымальніку па кожным наступным закладзе звесткі аб усіх існуючых закладах гэтай маёмасці, прадугледжаных пунктам 1 артыкула 320 гэтага Кодэкса, і адказвае за страты, прычыненыя закладатрымальнікам невыкананнем гэтага абавязку.

2. Права закладатрымальніка на атрыманне задавальнення з кошту закладзенай маёмасці пераважна перад іншымі закладатрымальнікамі, якія маюць права на атрыманне задавальнення з кошту гэтай маёмасці (прыярытэт закладатрымальніка), вызначаецца ў залежнасці ад моманту ўзнікнення права закладу, калі іншае не прадугледжана часткай другой гэтага пункта і іншымі заканадаўчымі актамі.

У выпадку, калі інфармацыя аб правах закладатрымальнікаў на належную заклададавальніку рухомую маёмасць, абцяжараную закладам, у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі падлягае ўнясенню ў рэестр рухомай маёмасці, абцяжаранай закладам, прыярытэт закладатрымальніка вызначаецца па чарговасці ўнясення ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, інфармацыі аб закладе гэтай маёмасці ў рэестр рухомай маёмасці, абцяжаранай закладам. Закладатрымальнікі, якія ўнеслі поўную і дакладную інфармацыю аб адпаведных правах у рэестр рухомай маёмасці, абцяжаранай закладам, у выпадках, калі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі такая інфармацыя падлягае ўнясенню ў названы рэестр, валодаюць прыярытэтам закладатрымальніка перад закладатрымальнікамі, якія не ўнеслі такую інфармацыю ў гэты рэестр або ўнеслі ў яго інфармацыю, не адпаведную патрабаванням заканадаўчых актаў (за выключэннем тэхнічных памылак), і (ці) недакладную інфармацыю.

Прыярытэт закладатрымальнікаў, якія не ўнеслі інфармацыю аб правах закладатрымальнікаў на належную заклададавальніку рухомую маёмасць, абцяжараную закладам, у рэестр рухомай маёмасці, абцяжаранай закладамі, або ўнеслі ў яго інфармацыю, не адпаведную патрабаванням заканадаўчых актаў (за выключэннем тэхнічных памылак), і (ці) недакладную інфармацыю, вызначаецца ў залежнасці ад моманту ўзнікнення права закладу.

Патрабаванні закладатрымальніка, які не валодае прыярытэтам закладатрымальніка (наступны закладатрымальнік), задавальняюцца з кошту закладзенай маёмасці пасля задавальнення патрабаванняў закладатрымальніка, які валодае прыярытэтам закладатрымальніка (папярэдні закладатрымальнік).

3. У выпадку накіравання спагнання на закладзеную маёмасць папярэднім закладатрымальнікам наступны закладатрымальнік мае права запатрабаваць ад даўжніка датэрміновага выканання абавязацельства, забяспечанага наступным закладам, за выключэннем абавязацельстваў, забяспечаных гарантыямі Урада Рэспублікі Беларусь, гарантыямі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. У выпадку невыканання такога абавязацельства наступны закладатрымальнік мае права накіраваць спагнанне на закладзеную маёмасць адначасова з папярэднім

закладатрымальнікам з прытрымліваннем чарговасці, прадугледжанай пунктам 2 гэтага артыкула.

Дагаворам паміж заклададавальнікам і наступным закладатрымальнікам можа быць абмежавана права такога закладатрымальніка запатрабаваць ад даўжніка датэрміновага выканання абавязацельства, забяспечанага наступным закладам.

4. Калі пры накіраванні спагнання на закладзеную маёмасць папярэднім закладатрымальнікам наступны закладатрымальнік не скарыстаўся ў адпаведнасці з пунктам 3 гэтага артыкула правам запатрабаваць ад даўжніка датэрміновага выканання абавязацельства ці такое права было абмежавана дагаворам або наступным закладам былі забяспечаны абавязацельствы, забяспечаныя таксама гарантыямі Урада Рэспублікі Беларусь, гарантыямі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, наступны заклад спыняецца ў выпадку, калі для задавальнення патрабаванняў папярэдняга закладатрымальніка накіравана спагнанне на ўсю закладзеную маёмасць. У іншым выпадку наступны заклад захоўвае сілу ў адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 334 гэтага Кодэкса.

Калі папярэдні закладатрымальнік скарыстаўся правам, прадугледжаным часткай другой пункта 4 артыкула 331 гэтага Кодэкса, наступны заклад спыняецца.

Калі папярэдні закладатрымальнік не скарыстаўся правам, прадугледжаным часткай другой пункта 4 артыкула 331 гэтага Кодэкса, гэтым правам можа скарыстацца наступны закладатрымальнік, які запатрабаваў ад даўжніка датэрміновага выканання абавязацельства, калі такое права не абмежавана дагаворам.

5. У выпадку накіравання спагнання на закладзеную маёмасць наступным закладатрымальнікам папярэдні закладатрымальнік мае права запатрабаваць ад даўжніка датэрміновага выканання абавязацельства, забяспечанага папярэднім закладам, за выключэннем абавязацельстваў, забяспечаных гарантыямі Урада Рэспублікі Беларусь, гарантыямі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. У выпадку невыканання такога абавязацельства папярэдні закладатрымальнік мае права накіраваць спагнанне на закладзеную маёмасць адначасова з наступным закладатрымальнікам з прытрымліваннем чарговасці, прадугледжанай пунктам 2 гэтага артыкула. Калі папярэдні закладатрымальнік не скарыстаўся гэтым правам, права закладу захоўвае сілу ў адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 334 гэтага Кодэкса.

6. Заклададавальнік, да якога адным з закладатрымальнікаў прад'яўлена патрабаванне аб накіраванні спагнання на закладзеную маёмасць, абавязаны не пазней за сем рабочых дзён з даты атрымання ўказанага патрабавання накіраваць пісьмовае паведамленне аб яго прад'яўленні ўсім іншым закладатрымальнікам гэтай маёмасці і нясе адказнасць за страты, прычыненыя такім закладатрымальнікам невыкананнем гэтага абавязку.

Калі закладатрымальнікі, якія атрымалі пісьмовае паведамленне аб прад'яўленні патрабавання аб накіраванні спагнання на закладзеную маёмасць, маюць права ў адпаведнасці з пунктамі 3 і 5 гэтага артыкула прад'явіць да даўжніка патрабаванне аб датэрміновым выкананні абавязацельства, забяспечанага закладам, указанае патрабаванне можа быць прад'яўлена на працягу аднаго месяца з даты атрымання такога паведамлення.

7. Правілы, устаноўленыя гэтым артыкулам, не прымяняюцца, калі закладатрымальнікам па папярэднім і наступным закладах з'яўляецца адна і тая ж асоба. У гэтым выпадку патрабаванні, забяспечаныя кожным з закладаў,

задавальняюцца ў парадку чарговасці, якая адпавядае тэрмінам выканання забяспечаных закладам абавязацельстваў, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі ці дагаворам.

Артыкул 323[1]. Сузакладатрымальнікі

1. У выпадках, прадугледжаных заканадаўствам ці дагаворам, прадмет закладу можа знаходзіцца ў закладзе ў некалькіх асоб, якія валодаюць у адносінах да яго роўным прыярытэтам закладатрымальніка (сузакладатрымальнікі), у забеспячэнне выканання розных абавязацельстваў, па якіх сузакладатрымальнікі з'яўляюцца самастойнымі крэдыторамі, за выключэннем маёмасці, інфармацыя аб правах закладатрымальнікаў на якую ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі падлягае ўнясенню ў рэестр рухомай маёмасці, абцяжаранай закладам.

Кожны сузакладатрымальнік самастойна ажыццяўляе правы і абавязкі закладатрымальніка, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці пагадненнем паміж сузакладатрымальнікамі.

У выпадку накіравання спагнання на закладзеную маёмасць адным з сузакладатрымальнікаў іншыя сузакладатрымальнікі маюць права запатрабаваць ад даўжніка датэрміновага выканання абавязацельства, забяспечанага закладам, і ў выпадку невыканання такога абавязацельства накіраваць спагнанне на закладзеную маёмасць адначасова з гэтым сузакладатрымальнікам, за выключэннем выпадкаў, калі дагаворам паміж заклададавальнікам і сузакладатрымальнікам абмежавана права такога сузакладатрымальніка запатрабаваць ад даўжніка датэрміновага выканання абавязацельства, забяспечанага закладам. У выпадку недастатковасці грашовых сродкаў, выручаных ад рэалізацыі закладзенай маёмасці, такія грашовыя сродкі размяркоўваюцца паміж сузакладатрымальнікамі прапарцыянальна памерам іх патрабаванняў, забяспечаных закладам, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі ці пагадненнем паміж сузакладатрымальнікамі.

Калі пры накіраванні спагнання на закладзеную маёмасць адным з сузакладатрымальнікаў іншыя сузакладатрымальнікі не скарысталіся ў адпаведнасці з часткай трэцяй гэтага пункта правам запатрабаваць ад даўжніка датэрміновага выканання абавязацельства ці такое права было абмежавана дагаворам, права закладу гэтых сузакладатрымальнікаў захоўвае сілу ў адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 334 гэтага Кодэкса.

Заклададавальнік, да якога адным з сузакладатрымальнікаў прад'яўлена патрабаванне аб накіраванні спагнання на закладзеную маёмасць, абавязаны не пазней за сем рабочых дзён з даты атрымання ўказанага патрабавання накіраваць пісьмовае паведамленне аб яго прад'яўленні ўсім іншым сузакладатрымальнікам гэтай маёмасці, калі іншы парадак паведамлення не прадугледжаны заканадаўствам ці дагаворам, і нясе адказнасць за страты, прычыненыя такім сузакладатрымальнікам невыкананнем гэтага абавязку. Сузакладатрымальнікі, якія атрымалі пісьмовае паведамленне аб прад'яўленні патрабавання аб накіраванні спагнання на закладзеную маёмасць, маюць права на працягу аднаго месяца з даты атрымання такога паведамлення прад'явіць да даўжніка патрабаванне аб датэрміновым выкананні абавязацельства, забяспечанага закладам.

2. Крэдыторы, якія маюць права прад'явіць да даўжніка патрабаванне па асноўным абавязацельстве, забяспечаным закладам, у поўным аб'ёме (салідарныя крэдыторы), і крэдыторы, якія маюць права прад'явіць да даўжніка частку патрабавання па такім абавязацельстве (долевыя крэдыторы), з'яўляюцца

сузакладатрымальнікамі па гэтым закладзе, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам.

Задавальненне патрабаванняў салідарных крэдытораў па асноўным абавязацельстве, забяспечаным закладам, ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым пунктам 4 артыкула 307 гэтага Кодэкса.

Задавальненне патрабаванняў долевых крэдытораў па асноўным абавязацельстве, забяспечаным закладам, ажыццяўляецца прапарцыянальна памерам іх патрабаванняў, забяспечаных закладам, калі іншае не прадугледжана дагаворам паміж імі.

Артыкул 324. Утрыманне і захаванасць закладзенай маёмасці

1. Заклададавальнік ці закладатрымальнік у залежнасці ад таго, у каго з іх знаходзіцца закладзеная маёмасць (артыкул 319), абавязаны, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам:

1) страхаваць за кошт заклададавальніка закладзеную маёмасць у поўным яго кошце ад рызык страты і пашкоджання, а калі поўны кошт маёмасці перавышае памер забяспечанага закладам патрабавання, – на суму, не ніжэйшую за памер патрабавання;

2) прымаць меры, неабходныя для забеспячэння захаванасці закладзенай маёмасці, у тым ліку для абароны яе ад замахаў і патрабаванняў з боку трэціх асоб;

3) неадкладна паведамляць іншаму боку аб узнікненні пагрозы страты ці пашкоджання закладзенай маёмасці.

2. Закладатрымальнік і заклададавальнік маюць права правяраць па дакументах і фактычна наяўнасць, колькасць, стан і ўмовы захоўвання закладзенай маёмасці, якая знаходзіцца ў іншага боку.

3. Пры грубым парушэнні закладатрымальнікам абавязкаў, указаных у пункце 1 гэтага артыкула, якое стварае пагрозу страты ці пашкоджання закладзенай маёмасці, заклададавальнік мае права запатрабаваць датэрміновага спынення закладу.

Артыкул 325. Наступствы страты ці пашкоджання закладзенай маёмасці

1. Заклададавальнік нясе рызыку выпадковай гібелі ці выпадковага пашкоджання закладзенай маёмасці, калі іншае не прадугледжана дагаворам аб закладзе.

2. Закладатрымальнік адказвае за поўную ці частковую страту ці пашкоджанне перададзенага яму прадмета закладу, калі не дакажа, што можа быць вызвалены ад адказнасці ў адпаведнасці з артыкулам 372 гэтага Кодэкса.

Закладатрымальнік адказвае за страту прадмета закладу ў памеры яго кошту з улікам інфляцыі, а за яго пашкоджанне – у памеры сумы, на якую гэты кошт панізіўся, незалежна ад яго кошту, указанага ў дагаворы.

Калі ў выніку пашкоджання прадмета закладу ён змяніўся настолькі, што не можа быць выкарыстаны па прамым прызначэнні, заклададавальнік мае права ад яго адмовіцца і запатрабаваць пакрыцця за яго страту.

Дагавор можа прадугледжваць абавязак закладатрымальніка кампенсаваць заклададавальніку і іншыя страты, прычыненыя стратай ці пашкоджаннем прадмета закладу.

Заклададавальнік, які з'яўляецца даўжніком па забяспечаным закладам абавязацельстве, мае права залічыць патрабаванне да закладатрымальніка аб

пакрыцці страт, прычыненых стратай ці пашкоджаннем прадмета закладу, у пагашэнне абавязацельства, забяспечанага закладам.

Артыкул 326. Замена і аднаўленне прадмета закладу

1. Замена прадмета закладу дапускаецца са згоды закладатрымальніка, калі заканадаўствам ці дагаворам не прадугледжана іншае.

Калі ўзнікае рэальная пагроза поўнай ці частковай страты або пашкоджання прадмета закладу не па віне закладатрымальніка, ён мае права патрабаваць замены прадмета закладу, а ў выпадку адмовы заклададавальніка выканаць гэта патрабаванне – патрабаваць датэрміновага выканання забяспечанага закладам абавязацельства.

2. Калі прадмет закладу страчаны ці пашкоджаны або права ўласнасці на яго ці права гаспадарчага распараджэнняці аператыўнага кіравання спынена на падставах, устаноўленых заканадаўствам, заклададавальнік мае права ў разумны тэрмін вярнуць прадмет закладу ці замяніць яго іншай раўнацэннай маёмасцю, калі дагаворам не прадугледжана іншае.

Артыкул 327. Карыстанне і распараджэнне прадметам закладу

1. Заклададавальнік мае права, калі іншае не прадугледжана дагаворам і не вынікае з сутнасці закладу, карыстацца прадметам закладу ў адпаведнасці з яго прызначэннем, у тым ліку атрымліваць з яго набыткі і даходы.

2. Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам і не вынікае з сутнасці закладу, заклададавальнік мае права адчужаць прадмет закладу, перадаваць яго ў арэнду ці бязвыплатнае карыстанне іншай асобе або іншым чынам распараджацца ім толькі са згоды закладатрымальніка.

Пагадненне, якое абмяжоўвае права заклададавальніка завяшчаць закладзеную маёмасць, нікчэмнае.

3. Закладатрымальнік мае права карыстацца перададзеным яму прадметам закладу толькі ў выпадках, прадугледжаных дагаворам, рэгулярна падаючы заклададавальніку справаздачу аб карыстанні. Паводле дагавора на закладатрымальніка можа быць ускладзены абавязак атрымліваць з прадмета закладу набыткі і даходы ў мэтах пагашэння асноўнага абавязацельства ці ў інтарэсах заклададавальніка.

Артыкул 328. Абарона закладатрымальнікам сваіх правоў на прадмет закладу

1. Закладатрымальнік, у якога знаходзілася ці павінна была знаходзіцца закладзеная маёмасць, мае права выпатрабаваць яе з чужога незаконнага валодання, у тым ліку і ад заклададавальніка (артыкулы 282, 283 і 286).

2. У выпадках, калі па ўмовах дагавора закладатрымальніку дадзена права карыстацца перададзеным яму прадметам закладу, ён можа патрабаваць ад іншых асоб, у тым ліку і ад заклададавальніка, ліквідацыі ўсіх парушэнняў яго правоў, хоць бы гэтыя парушэнні і не былі звязаны з пазбаўленнем валодання (артыкулы 285 і 286).

Артыкул 329. Падставы накіравання спагнання на закладзеную маёмасць

1. Спагнанне на закладзеную маёмасць для задавальнення патрабаванняў закладатрымальніка (крэдытора) можа быць накіравана ў выпадку невыканання ці

неналежнага выканання даўжніком забяспечанага закладам абавязацельства з-за абставін, за якія ён адказвае.

2. У накіраванні спагнання на закладзеную маёмасць можа быць адмоўлена, калі дапушчанае даўжніком парушэнне забяспечанага закладам абавязацельства надзвычай нязначнае і памер патрабаванняў закладатрымальніка ў выніку гэтага яўна несуразмерны кошту закладзенай маёмасці.

Артыкул 330. Парадак накіравання спагнання на закладзеную маёмасць

1. Патрабаванні закладатрымальніка (крэдытора) задавальняюцца з кошту закладзенай маёмасці паводле рашэння суда, калі іншае не прадугледжана часткамі другой і трэцяй гэтага пункта і часткай першай пункта 5 артыкула 339 гэтага Кодэкса.

Задавальненне патрабавання закладатрымальніка за кошт закладзенай маёмасці без звароту ў суд дапускаецца на падставе натарыяльна засведчанага пагаднення закладатрымальніка з заклададавальнікам, заключанага да або пасля ўзнікнення ўстаноўленых заканадаўствам падстаў для накіравання спагнання на закладзеную маёмасць, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктам 3 гэтага артыкула. Пры гэтым у такім пагадненні павінна ўтрымлівацца ўмова аб даванні права заклададавальніку, або закладатрымальніку, або іншай асобе па выбары бакоў ажыццявіць ад імя заклададавальніка продаж закладзенай маёмасці ў выпадку накіравання спагнання на закладзеную маёмасць для задавальнення патрабавання закладатрымальніка і не можа прадугледжвацца пераход права ўласнасці на закладзеную маёмасць да закладатрымальніка. Такое пагадненне можа быць прызнана судом несапраўдным па іску асобы, чые правы парушаны гэтым пагадненнем.

Задавальненне патрабавання закладатрымальніка за кошт закладзенага маёмаснага права (патрабавання) на атрыманне грашовых сродкаў без звароту ў суд дапускаецца на падставе дагавора аб закладзе (іншага пагаднення, заключанага паміж закладатрымальнікам і заклададавальнікам), за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктам 3 гэтага артыкула. Пры гэтым такі дагавор (пагадненне) павінен прадугледжваць магчымасць пакідання закладатрымальнікам закладзенага маёмаснага права (патрабавання) на атрыманне грашовых сродкаў за сабой на вызначаных у ім умовах, але не ніжэй кошту такога права (патрабавання), указанага ў дагаворы аб закладзе.

2. У выпадках, калі для закладу ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі патрабуецца згода (рашэнне) асобы ці дзяржаўнага органа, іншай дзяржаўнай арганізацыі, заключэнне пагаднення, указанага ў частцы другой пункта 1 гэтага артыкула, магчымае толькі пасля атрымання ва ўстаноўленым парадку такой згоды (рашэння) гэтай асобы ці дзяржаўнага органа, іншай дзяржаўнай арганізацыі.

3. Спагнанне на закладзеную маёмасць можа быць накіравана толькі паводле рашэння суда ў выпадку, калі:

1) заклададавальнік адсутнічае і ўстанавіць месца яго знаходжання немагчыма;

2) прадметам закладу з'яўляецца маёмасць, якая адносіцца да гісторыка-культурных каштоўнасцей;

3) прадметам закладу з'яўляецца маёмасць, абмежавана здольная да абарачэння;

4) прадметам закладу з'яўляецца прадпрыемства як маёмасны комплекс;

5) прадметам іпатэкі з'яўляецца маёмасць, якая знаходзіцца ў сумеснай уласнасці, і хто-небудзь з яе ўласнікаў не дае ў пісьмовай форме згоды на задавальненне патрабаванняў закладатрымальніка ў пазасудовым парадку;

6) для іпатэкі маёмасці патрабуецца згода (рашэнне) іншай асобы ці дзяржаўнага органа, іншай дзяржаўнай арганізацыі.

Артыкул 331. Рэалізацыя закладзенай маёмасці

1. Рэалізацыя закладзенай маёмасці, на якую ў адпаведнасці з часткай першай пункта 1 артыкула 330 гэтага Кодэкса звернута спагнанне паводле рашэння суда, праводзіцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні, калі гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства не ўстаноўлены іншы парадак.

2. Па просьбе заклададавальніка суд мае права ў рашэнні аб накіраванні спагнання на закладзеную маёмасць адтэрмінаваць яе продаж на тэрмін да аднаго года.

Адтэрміноўка не закранае правоў і абавязкаў бакоў па абавязацельстве, забяспечаным закладам гэтай маёмасці, і не вызваляе даўжніка ад пакрыцця ўзросшых за час адтэрміноўкі страт крэдытора і няўстойкі.

2^1. Закладзеная маёмасць, на якую накіравана спагнанне без звароту ў суд у адпаведнасці з часткай другой пункта 1 і пунктам 2 артыкула 330 гэтага Кодэкса, рэалізуецца:

1) на публічных таргах у парадку, устаноўленым актамі заканадаўства:

закладатрымальнікам, заклададавальнікам ці іншай асобай, упаўнаважанай натарыяльна засведчаным пагадненнем закладатрымальніка з заклададавальнікам, за выключэннем выпадку, указанага ў абзацы трэцім гэтага падпункта;

закладатрымальнікам, калі прадметам закладу з'яўляюцца зямельны ўчастак, які знаходзіцца ў прыватнай уласнасці, ці права арэнды зямельнага ўчастка, у тым ліку з капітальнымі пабудовамі (будынкамі, збудаваннямі), якія размешчаны ці ўзводзяцца на іх, або капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні) з адначасовым закладам зямельнага ўчастка, які знаходзіцца ў прыватнай уласнасці (права арэнды зямельнага ўчастка), на якім размешчаны гэтыя капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), а таксама іншая маёмасць, якая адносіцца да асноўных сродкаў заклададавальніка;

2) паводле дагавора куплі-продажу без правядзення публічных таргоў банкам-закладатрымальнікам, заклададавальнікам ці іншай асобай, упаўнаважанай натарыяльна засведчаным пагадненнем банка-закладатрымальніка з заклададавальнікам, у выпадку задавальнення патрабаванняў аб пагашэнні банкаўскага крэдыту за кошт закладзенай маёмасці, за выключэннем маёмасці, указанай у абзацы трэцім падпункта 1 гэтага пункта.

3. Пачатковая цана закладзенай маёмасці, з якой пачынаюцца таргі, вызначаецца рашэннем суда ў адпаведнасці з працэсуальным заканадаўствам пры накіраванні спагнання на маёмасць у судовым парадку ці пагадненнем закладатрымальніка і заклададавальніка пры накіраванні спагнання на гэту маёмасць без звароту ў суд, калі заканадаўчымі актамі не прадугледжана іншае.

Закладзеная маёмасць прадаецца асобе, якая прапанавала на таргах найвышэйшую цану.

Калі прызнана, што таргі, у тым ліку паўторныя, не адбыліся з прычыны таго, што заяўка (заява) на ўдзел у іх пададзена толькі адным удзельнікам або для ўдзелу ў іх прыбыў толькі адзін удзельнік, у выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі

актамі, прадмет таргоў прадаецца гэтаму ўдзельніку пры яго згодзе па пачатковай цане, павялічанай на пяць працэнтаў.

4. Пры аб’яўленні, што таргі не адбыліся, і адмове адзінага ўдзельніка, які падаў заяўку (заяву) на ўдзел у таргах або прыбыў для ўдзелу ў іх, ад набыцця закладзенай маёмасці па пачатковай цане, павялічанай на пяць працэнтаў, калі магчымасць такога набыцця прадугледжана заканадаўчымі актамі, закладатрымальнік мае права па пагадненні з заклададавальнікам набыць закладзеную маёмасць і залічыць у кошт пакупной цаны свае патрабаванні, забяспечаныя закладам. Да такога пагаднення прымяняюцца правілы аб дагаворы куплі-продажу.

Пры аб’яўленні, што паўторныя таргі не адбыліся, і адмове адзінага ўдзельніка, які падаў заяўку (заяву) на ўдзел у паўторных таргах або прыбыў для ўдзелу ў іх, ад набыцця закладзенай маёмасці па пачатковай цане, павялічанай на пяць працэнтаў, калі магчымасць такога набыцця прадугледжана заканадаўчымі актамі, закладатрымальнік мае права пакінуць прадмет закладу за сабой з ацэнкай яго кошту ў суме, не больш чым на дзесяць працэнтаў ніжэйшай за пачатковую цану на паўторных таргах.

Калі закладатрымальнік не скарыстаецца правам пакінуць за сабой прадмет закладу на працягу месяца з дня аб’яўлення, што паўторныя таргі не адбыліся, і ў выпадку адмовы адзінага ўдзельніка, які падаў заяўку (заяву) на ўдзел у паўторных таргах або прыбыў для ўдзелу ў іх, ад набыцця закладзенай маёмасці па пачатковай цане, павялічанай на пяць працэнтаў, калі магчымасць такога набыцця прадугледжана заканадаўчымі актамі, дагавор аб закладзе спыняецца.

Парадак, устаноўлены часткамі першай і другой гэтага пункта, не распаўсюджваецца на рэалізацыю маёмасці ў выканаўчым вядзенні.

5. Калі сума, выручаная пры рэалізацыі закладзенай маёмасці, недастатковая для пакрыцця патрабавання закладатрымальніка, ён мае права пры адсутнасці іншага ўказання ў заканадаўстве ці дагаворы атрымаць суму, якой не хапае, з іншай маёмасці даўжніка, не карыстаючыся перавагай, заснаванай на закладзе.

6. Калі сума, выручаная пры рэалізацыі закладзенай маёмасці, перавышае памер забяспечанага закладам патрабавання закладатрымальніка, розніца за вылікам усіх выдаткаў вяртаецца заклададавальніку, за выключэннем выпадку, прадугледжанага часткай пятай пункта 5 артыкула 339 гэтага Кодэкса.

7. Даўжнік і заклададавальнік, які з'яўляецца трэцяй асобай, мае права ў любы час да продажу прадмета закладу спыніць накіраванне на яго спагнання і рэалізацыю, выканаўшы забяспечанае закладам абавязацельства ці тую яго частку, выкананне па якой пратэрмінавана. Пагадненне, якое абмяжоўвае гэта права, нікчэмнае.

Артыкул 332. Датэрміновае выкананне абавязацельства, забяспечанага закладам, і накіраванне спагнання на закладзеную маёмасць

1. Закладатрымальнік мае права запатрабаваць датэрміновага выканання забяспечанага закладам абавязацельства ў выпадках:

1) калі прадмет закладу выбыў з валодання заклададавальніка, у якога ён быў пакінуты, не ў адпаведнасці з умовамі дагавора аб закладзе;

2) парушэння заклададавальнікам правілаў аб замене прадмета закладу (артыкул 326);

3) страты прадмета закладу з-за абставін, за якія закладатрымальнік не адказвае, калі заклададавальнік не скарыстаўся правам, прадугледжаным пунктам 2 артыкула 326 гэтага Кодэкса.

2. Закладатрымальнік мае права запатрабаваць датэрміновага выканання забяспечанага закладам абавязацельства, а калі яго патрабаванне не будзе задаволена, накіраваць спагнанне на прадмет закладу ў выпадках:

1) парушэння заклададавальнікам правілаў аб наступным закладзе або накіравання спагнання на закладзеную маёмасць папярэднім ці наступным закладатрымальнікам або адным з сузакладатрымальнікаў (артыкулы 323 і 323[1]);

2) невыканання заклададавальнікам абавязкаў, прадугледжаных падпунктамі 1 і 2 пункта 1 і пунктам 2 артыкула 324 гэтага Кодэкса;

3) парушэння заклададавальнікам правілаў аб распараджэнні закладзенай маёмасцю (пункт 2 артыкула 327).

Артыкул 333. Спыненне закладу

1. Заклад спыняецца:

1) са спыненнем забяспечанага закладам абавязацельства;

2) па патрабаванні заклададавальніка пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных пунктам 3 артыкула 324 гэтага Кодэкса;

3) у выпадках гібелі закладзенай рэчы ці спынення закладзенага права, калі заклададавальнік не скарыстаўся правам, прадугледжаным пунктам 2 артыкула 326 гэтага Кодэкса;

4) у выпадку рэалізацыі закладзенай маёмасці ў парадку, устаноўленым артыкулам 331 гэтага Кодэкса, заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні, а таксама ў выпадку, калі яе рэалізацыя аказалася немагчымай;

5) з пераводам на іншую асобу доўгу па абавязацельстве, забяспечаным закладам, калі заклададавальнік не даў крэдытору згоды адказваць за новага даўжніка (статья 337);

6) пры накіраванні спагнання на закладзеную маёмасць папярэднім закладатрымальнікам, калі наступны закладатрымальнік не скарыстаўся правам запатрабаваць ад даўжніка датэрміновага выканання абавязацельства ці такое права было абмежавана дагаворам або наступным закладам былі забяспечаны абавязацельствы, забяспечаныя таксама гарантыямі Урада Рэспублікі Беларусь, гарантыямі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, і для задавальнення патрабаванняў папярэдняга закладатрымальніка накіравана спагнанне на ўсю закладзеную маёмасць або калі папярэдні закладатрымальнік скарыстаўся правам, прадугледжаным часткай другой пункта 4 артыкула 331 гэтага Кодэкса.

2. Спыненне іпатэкі павінна быць зарэгістравана ў адпаведнасці з заканадаўствам.

3. Пры спыненні закладу ў выніку выканання забяспечанага закладам абавязацельства або па патрабаванні заклададавальніка (пункт 3 артыкула 324) закладатрымальнік, у якога знаходзілася закладзеная маёмасць, абавязаны неадкладна вярнуць яе заклададавальніку.

Артыкул 334. Захаванне закладу пры пераходзе права на закладзеную маёмасць да іншай асобы

1. У выпадку пераходу права ўласнасці на закладзеную маёмасць ці права гаспадарчага распараджэння ім ад заклададавальніка да іншай асобы ў выніку аплатнага ці бязвыплатнага адчужэння гэтай маёмасці або ў парадку ўніверсальнага праваперaемства права закладу захоўвае сілу.

Праваперaемнік заклададавальніка становіцца на месца заклададавальніка і нясе ўсе яго абавязкі, калі пагадненнем з закладатрымальнікам не ўстаноўлена іншае.

2. Калі маёмасць заклададавальніка, якая з'яўляецца прадметам закладу, перайшла ў парадку праваперaемства да некалькіх асоб, кожны з праваперaемнікаў (пакупнікоў маёмасці) нясе наступствы невыканання забяспечанага закладам абавязацельства, якія вынікаюць з закладу, суразмерна з часткай указанай маёмасці, якая перайшла да яго. Аднак калі прадмет закладу непадзельны ці на іншых падставах застаецца ў агульнай уласнасці праваперaемнікаў, яны становяцца салідарнымі заклададавальнікамі.

Артыкул 335. Наступствы прымусовага адабрання закладзенай маёмасці

1. Калі права ўласнасці заклададавальніка на маёмасць, якая з'яўляецца прадметам закладу, спыняецца на падставах і ў парадку, якія ўстаноўлены законам, у выніку адабрання (выкупу) для дзяржаўных патрэб, рэквізіцыі ці нацыяналізацыі і заклададавальніку даецца іншая маёмасць ці адпаведная кампенсацыя, права закладу распаўсюджваецца на дадзеную наўзамен маёмасць або адпаведна закладатрымальнік набывае права пераважнага задавальнення свайго патрабавання з сумы належнай заклададавальніку кампенсацыі. Закладатрымальнік мае права таксама запатрабаваць датэрміновага выканання забяспечанага закладам абавязацельства.

2. У выпадках, калі маёмасць, якая з'яўляецца прадметам закладу, адбіраецца ў заклададавальніка ва ўстаноўленым заканадаўчымі актамі парадку на той падставе, што насамрэч уласнікам гэтай маёмасці з'яўляецца іншая асоба (артыкул 282), або ў выглядзе санкцый за здзейсненае злачынства ці іншае правапарушэнне (артыкул 244), заклад у адносінах да гэтай маёмасці спыняецца. У гэтых выпадках закладатрымальнік мае права патрабаваць датэрміновага выканання забяспечанага закладам абавязацельства.

Артыкул 336. Уступка правоў паводле дагавора закладу

Закладатрымальнік мае права перадаць свае правы паводле дагавора аб закладзе іншай асобе з прытрымліваннем правілаў аб перадачы правоў крэдытора шляхам уступкі патрабавання (артыкулы 353–361).

Уступка закладатрымальнікам сваіх правоў паводле дагавора аб закладзе іншай асобе сапраўдная, калі той жа асобе ўступлена права патрабавання да даўжніка па асноўным абавязацельстве, забяспечаным закладам.

Калі не даказана іншае, уступка правоў паводле дагавора аб іпатэцы азначае і ўступку правоў па забяспечаным іпатэкай абавязацельстве.

Артыкул 337. Перавод доўгу па абавязацельстве, забяспечаным закладам

З пераводам на іншую асобу доўгу па абавязацельстве, забяспечаным закладам, заклад спыняецца, калі заклададавальнік не даў крэдытору згоды адказваць за новага даўжніка.

Артыкул 338. Заклад тавару ў абарачэнні

1. Закладам тавару ў абарачэнні прызнаецца заклад тавараў з пакіданнем іх у заклададавальніка і з даваннем заклададавальніку права змяняць склад і

натуральную форму закладзенай маёмасці (таварных запасаў, сыравіны, матэрыялаў, паўфабрыкатаў, гатовай прадукцыі і да т.п.) пры ўмове, што іх агульны кошт не становіцца меншым за ўказаны ў дагаворы аб закладзе.

Перадача ў заклад любой рухомай маёмасці, вызначанай радавымі прыкметамі, можа ажыццяўляцца ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі для закладу тавараў у абарачэнні.

Дагавор аб закладзе тавараў у абарачэнні павінен вызначаць радавыя прыкметы закладзенага тавару і агульны кошт закладзенага тавару.

Змяншэнне кошту закладзеных тавараў у абарачэнні дапускаецца суразмерна з выкананай часткай забяспечанага закладам абавязацельства, калі іншае не прадугледжана дагаворам.

2. Тавары ў абарачэнні, адчужаныя заклададавальнікам, перастаюць быць прадметам закладу з моманту іх пераходу ва ўласнасць, гаспадарчае распараджэнне ці аператыўнае кіраванне пакупніка, а набытыя заклададавальнікам тавары, указаныя ў дагаворы аб закладзе, становяцца прадметам закладу з моманту ўзнікнення ў заклададавальніка на іх права ўласнасці, гаспадарчага распараджэння ці аператыўнага кіравання.

3. Заклададавальнік тавараў у абарачэнні абавязаны весці кнігу запісу закладаў, у якую ўносяцца запісы аб умовах закладу тавараў і аб усіх аперацыях, якія цягнуць за сабой змяненне складу ці натуральнай формы закладзеных тавараў, уключаючы іх перапрацоўку, на дзень апошняй аперацыі.

4. Пры парушэнні заклададавальнікам умоў закладу тавараў у абарачэнні закладатрымальнік мае права шляхам накладання на закладзеныя тавары сваіх знакаў і пячатак прыпыніць аперацыі з імі да ліквідацыі парушэння ці запатрабаваць перадачы яму закладзеных тавараў або патрабаваць датэрміновага выканання забяспечанага закладам абавязацельства.

Артыкул 339. Заклад рэчаў у ламбардзе

1. Прыняцце ад грамадзян у заклад рухомай маёмасці, прызначанай для асабістага, сямейнага ці хатняга выкарыстання, у забеспячэнне кароткатэрміновых мікрапазык (пазык у суме, якая не перавышае 15 000 базавых велічыняў на аднаго пазычальніка на дзень заключэння дагавора) можа ажыццяўляцца ў якасці прадпрымальніцкай дзейнасці спецыялізаванымі арганізацыямі – ламбардамі.

2. Дагавор аб закладзе рэчаў у ламбардзе афармляецца выдачай ламбардам закладнога білета.

3. Рэчы, якія закладаюцца, перадаюцца ламбарду.

Ламбард абавязаны страхаваць на карысць заклададавальніка за свой кошт прынятыя ў заклад рэчы па кошце, які ўстанаўліваецца ў адпаведнасці з цэнамі на рэчы такога ж роду і якасці, якія звычайна ўстанаўліваюцца ў гандлі ў момант іх прыняцця ў заклад.

Ламбард не мае права карыстацца і распараджацца закладзенымі рэчамі.

4. Ламбард нясе адказнасць за страту і пашкоджанне закладзеных рэчаў, калі не дакажа, што страта ці пашкоджанне адбыліся ў выніку непераадольнай сілы.

5. Ламбард у выпадку невяртання сумы мікрапазыкі ў тэрмін, устаноўлены дагаворам мікрапазыкі, выкананне абавязацельстваў па якім забяспечана закладам рухомай маёмасці, прызначанай для асабістага, сямейнага ці хатняга выкарыстання, сума ацэнкі якой на дзень заключэння дагавора мікрапазыкі не перавышае 100 базавых велічыняў, пасля сканчэння месячнага тэрміну пасля надыходу дня звароту

сумы мікрапазыкі, устаноўленай дагаворам мікрапазыкі, мае права самастойна накіраваць спагнанне на такую маёмасць без звароту ў суд і прытрымлівання іншых патрабаванняў, прадугледжаных часткай другой пункта 1 артыкула 330 гэтага Кодэкса, і рэалізаваць яе ў адпаведнасці з парадкам, вызначаным правіламі давання мікрапазык, якія зацвярджаюцца ламбардам у адпаведнасці з заканадаўствам, калі іншы парадак не ўстаноўлены дагаворам мікрапазыкі (закладным білетам), за выключэннем выпадку, указанага ў частцы чацвёртай гэтага пункта.

Самастойнае накіраванне спагнання на рухомую маёмасць, прызначаную для асабістага, сямейнага ці хатняга выкарыстання, якой забяспечана выкананне абавязацельстваў паводле дагавора мікрапазыкі, сума ацэнкі якой на дзень заключэння дагавора мікрапазыкі не перавышае 100 базавых велічыняў, а таксама самастойная рэалізацыя такой маёмасці ажыццяўляюцца ламбардам у адпаведнасці з правіламі, якія вызначаюць Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь.

У выпадку невяртання сумы мікрапазыкі ў тэрмін, устаноўлены дагаворам мікрапазыкі, выкананне абавязацельстваў па якім забяспечана закладам рухомай маёмасці, прызначанай для асабістага, сямейнага ці хатняга выкарыстання, сума ацэнкі якой на дзень заключэння дагавора мікрапазыкі перавышае 100 базавых велічыняў, накіраванне спагнання на такую маёмасць пасля сканчэння месячнага тэрміну пасля надыходу дня звароту сумы мікрапазыкі, устаноўленай дагаворам мікрапазыкі, а таксама рэалізацыя такой маёмасці ажыццяўляюцца ламбардам у адпаведнасці з артыкулам 330 і пунктамі 1–4 і 7 артыкула 331 гэтага Кодэкса, актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, за выключэннем выпадку, указанага ў частцы чацвёртай гэтага пункта.

Асаблівасці ажыццяўлення ламбардам аперацый з каштоўнымі металамі і каштоўнымі камянямі, у тым ліку асаблівасці рэалізацыі каштоўных металаў і каштоўных камянёў, не запатрабаваных з ламбарда, устанаўліваюцца заканадаўствам у сферы дзейнасці з каштоўнымі металамі і каштоўнымі камянямі.

Пасля рэалізацыі рухомай маёмасці, прызначанай для асабістага, сямейнага ці хатняга выкарыстання, перададзенага пазычальнікам ці іншай асобай, якая з'яўляецца заклададавальнікам, ламбарду ў забеспячэнне выканання абавязацельстваў пазычальніка паводле дагавора мікрапазыкі, патрабаванні ламбарда да пазычальніка пагашаюцца, нават калі сума, выручаная ад рэалізацыі закладзенай рухомай маёмасці, недастатковая для іх поўнага задавальнення. Калі сума, выручаная пры рэалізацыі гэтай маёмасці, перавышае памер забяспечанага закладам патрабавання ламбарда, розніца паміж выручанай ад рэалізацыі сумай і памерам патрабавання без выліку выдаткаў вяртаецца заклададавальніку. Не запатрабаваная заклададавальнікам на працягу трох гадоў з дня рэалізацыі закладзенай рухомай маёмасці розніца падлягае ўнясенню ў даход мясцовага бюджэту па месцы знаходжання ламбарда.

6. Правілы давання мікрапазык грамадзянам ламбардамі пад заклад належных грамадзянам рэчаў устанаўліваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

7. Умовы дагавора аб закладзе рэчаў у ламбардзе, якія абмяжоўваюць правы заклададавальніка, у параўнанні з правамі, якія дае яму заканадаўства, нікчэмныя. Замест такіх умоў прымяняюцца адпаведныя палажэнні заканадаўства.

Артыкул 339[1]. Заклад маёмаснага права (патрабавання)

1. Пры закладзе маёмаснага права (патрабавання) яго кошт вызначаецца пагадненнем бакоў, калі іншае не вынікае з характару самога права (патрабавання) ці не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

2. Тэрміновае маёмаснае права (патрабаванне) можа быць прадметам закладу толькі да заканчэння тэрміну яго дзеяння.

3. Пры закладзе маёмаснага права (патрабавання), калі іншае не прадугледжана дагаворам, заклададавальнік абавязаны:

1) ажыццяўляць усе дзеянні, неабходныя для забеспячэння сапраўднасці закладзенага права (патрабавання);

2) не здзяйсняць уступкі закладзенага права (патрабавання);

3) не здзяйсняць дзеянняў, якія цягнуць за сабой спыненне закладзенага права (патрабавання) або змяншэнне яго кошту;

4) прымаць меры, неабходныя для абароны закладзенага права (патрабавання) ад замахаў з боку трэціх асоб;

5) паведамляць закладатрымальніку звесткі аб змяненнях, якія адбыліся ў закладзеным праве (патрабаванні), аб яго парушэннях з боку трэціх асоб і аб прэтэнзіях трэціх асоб на гэта права (патрабаванне).

4. Пры закладзе маёмаснага права (патрабавання), калі іншае не прадугледжана дагаворам, закладатрымальнік мае права незалежна ад надыходу тэрміну выканання забяспечанага закладам абавязацельства патрабаваць у судовым парадку пераводу на сябе закладзенага права (патрабавання), калі заклададавальнік не выканаў абавязку, прадугледжанага падпунктамі 2 – 4 пункта 3 гэтага артыкула, пры ўмове, што закладзенае права (патрабаванне) не спынена.

5. Заклад маёмаснага права (патрабавання), засведчанага каштоўнай паперай, ажыццяўляецца шляхам абцяжарвання закладам гэтай каштоўнай паперы.

§ 4. Утрыманне

Артыкул 340. Утрыманне

1. Крэдытор, у якога знаходзіцца рэч, якая падлягае перадачы даўжніку або асобе, указанай даўжніком, мае права ў выпадку невыканання даўжніком у тэрмін абавязацельства па аплаце гэтай рэчы ці пакрыцці крэдытору звязаных з ёю выдаткаў і іншых страт утрымліваць яе да таго часу, пакуль адпаведнае абавязацельства не будзе выканана.

2. Утрыманнем рэчы могуць забяспечвацца таксама патрабаванні, хоць і не звязаныя з аплатай рэчы ці пакрыццём выдаткаў на яе і іншых страт, але ўзніклыя з абавязацельства, бакі якога дзейнічаюць як прадпрымальнікі.

3. Крэдытор можа ўтрымліваць рэч, якая знаходзіцца ў яго, нягледзячы на тое, што пасля таго, як гэта рэч паступіла ў валоданне крэдытора, правы на яе набыты трэцяй асобай.

4. Указаныя вышэй правілы гэтага артыкула прымяняюцца, калі дагаворам не прадугледжана іншае.

5. Патрабаванні крэдытора, які ўтрымлівае рэч, задавальняюцца з яе кошту ў аб'ёме і парадку, прадугледжаных для задавальнення патрабаванняў, забяспечаных закладам.

§ 5. Паручыцельства

Артыкул 341. Дагавор паручыцельства

1. Паводле дагавора паручыцельства паручыцель абавязваецца перад крэдыторам іншай асобы адказваць за выкананне апошнім яго абавязацельства поўнасцю ці ў частцы.

2. Дагавор паручыцельства можа быць заключаны таксама для забеспячэння абавязацельства, якое ўзнікне ў будучыні.

3. Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і (ці) законамі можа быць устаноўлены асаблівы парадак давання і выканання паручыцельстваў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

Артыкул 342. Форма дагавора паручыцельства

Дагавор паручыцельства павінен быць заключаны ў пісьмовай форме. Незахаванне пісьмовай формы цягне за сабой несапраўднасць дагавора паручыцельства.

Артыкул 343. Адказнасць паручыцеля

1. Пры невыкананні ці неналежным выкананні даўжніком забяспечанага паручыцельствам абавязацельства паручыцель і даўжнік адказваюць перад крэдыторам салідарна, калі заканадаўствам ці дагаворам паручыцельства не прадугледжана субсідыярная адказнасць паручыцеля.

2. Паручыцель адказвае перад крэдыторам у тым жа аб'ёме, што і даўжнік, уключаючы выплату працэнтаў, пакрыццё судовых выдаткаў па спагнанні доўгу і іншых страт крэдытора, выкліканых невыкананнем ці неналежным выкананнем абавязацельстваў даўжніком, калі іншае не прадугледжана дагаворам паручыцельства.

3. Асобы, якія сумесна далі паручыцельства, адказваюць перад крэдыторам салідарна, калі іншае не прадугледжана дагаворам паручыцельства.

Артыкул 344. Права паручыцеля на пярэчанні супраць патрабавання крэдытора

1. Паручыцель мае права выказваць супраць патрабавання крэдытора пярэчанні, якія мог бы прадставіць даўжнік, калі іншае не вынікае з дагавора паручыцельства.

Паручыцель не губляе права на гэтыя пярэчанні нават у тым выпадку, калі даўжнік ад іх адмовіўся ці прызнаў свой доўг.

2. Калі да паручыцеля прад'яўлены іск, ён абавязаны прыцягнуць даўжніка да ўдзелу ў справе.

3. Калі паручыцель не выканаў абавязкі, указаныя ў пункце 2 гэтага артыкула, даўжнік мае права выказаць супраць рэгрэснага патрабавання паручыцеля пярэчанні, якія ён меў супраць крэдытора.

Артыкул 345. Правы паручыцеля, які выканаў абавязацельства

1. Да паручыцеля, які выканаў абавязацельства, пераходзяць правы крэдытора паводле гэтага абавязацельства і правы, якія належалі крэдытору як закладатрымальніку, у тым аб'ёме, у якім паручыцель забяспечыў патрабаванне крэдытора. Паручыцель таксама мае права патрабаваць ад даўжніка выплаты працэнтаў на суму, выплачаную крэдытору, і пакрыцця іншых страт, панесеных у сувязі з адказнасцю за даўжніка.

2. Пасля выканання паручыцелем абавязацельства крэдытор абавязаны ўручыць паручыцелю дакументы, якія сведчаць патрабаванне да даўжніка, і перадаць правы, якія забяспечваюць гэта патрабаванне.

3. Правілы, устаноўленыя гэтым артыкулам, прымяняюцца, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам паручыцеля з даўжніком і не вынікае з адносін паміж імі.

Артыкул 346. Паведамленне паручыцелю аб выкананні абавязацельства даўжніком

Даўжнік, які выканаў абавязацельства, забяспечанае паручыцельствам, абавязаны неадкладна паведаміць аб гэтым паручыцелю. У адваротным выпадку паручыцель, які ў сваю чаргу выканаў абавязацельства, мае права спагнаць з крэдытора беспадстаўна атрыманае або прад'явіць рэгрэснае патрабаванне да даўжніка. У апошнім выпадку даўжнік мае права спагнаць з крэдытора толькі беспадстаўна атрыманае.

Артыкул 347. Спыненне паручыцельства

1. Паручыцельства спыняецца са спыненнем забяспечанага ім абавязацельства, а таксама ў выпадку змянення гэтага абавязацельства, якое цягне за сабой павелічэнне адказнасці ці іншыя неспрыяльныя наступствы для паручыцеля, без згоды апошняга.

2. Паручыцельства спыняецца з пераводам на іншую асобу доўгу паводле забяспечанага паручыцельствам абавязацельства, калі паручыцель не даў крэдытору згоды адказваць за новага даўжніка.

3. Паручыцельства спыняецца, калі крэдытор адмовіўся прыняць належнае выкананне, прапанаванае даўжніком ці паручыцелем.

4. Паручыцельства спыняецца пасля сканчэння ўказанага ў дагаворы паручыцельства тэрміну, на які яно дадзена. Калі такі тэрмін не ўстаноўлены, яно спыняецца, калі крэдытор на працягу аднаго года з дня надыходу тэрміну выканання забяспечанага паручыцельствам абавязацельства не прад'явіць іску да паручыцеля. Калі тэрмін выканання асноўнага абавязацельства не ўказаны і не можа быць вызначаны ці вызначаны момантам запатрабавання, паручыцельства спыняецца, калі крэдытор не прад'явіць іску да паручыцеля на працягу двух гадоў з дня заключэння дагавора паручыцельства.

§ 6. Гарантыя

Артыкул 348. Паняцце гарантыі

1. Паводле гарантыі гарант абавязваецца перад крэдыторам іншай асобы (даўжніка) адказваць поўнасцю ці часткова за выкананне абавязацельства гэтай асобы.

2. Гарантыйнае абавязацельства можа ўзнікнуць на падставе дагавора.

3. Гарантыяй можа забяспечвацца толькі сапраўднае патрабаванне.

4. Правілы артыкула 342, пунктаў 2 і 3 артыкула 343, артыкулаў 344–347 гэтага Кодэкса распаўсюджваюцца на гарантыі, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і (ці) законамі можа быць устаноўлены асаблівы парадак давання і выканання гарантый Урада Рэспублікі Беларусь, гарантый мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, іншых арганізацый, уключаючы гаспадарчыя суполкі з доляй дзяржавы ў статутных фондах.

Артыкул 349. Субсідыярная адказнасць гаранта

1. У выпадку невыканання абавязацельства гарант адказвае перад крэдыторам як субсідыярны (дадатковы) даўжнік.

2. Пасля выканання абавязацельства гарант не набывае права рэгрэснага патрабавання да даўжніка аб звароце заплачанай сумы.

Артыкул 350. Асаблівасці банкаўскай гарантыі

Асаблівасці банкаўскай гарантыі і яе асобных відаў вызначаюцца заканадаўствам.

§ 7. Задатак

Артыкул 351. Паняцце задатку. Форма пагаднення аб задатку

1. Задаткам прызнаецца грашовая сума, якую выдае адзін з бакоў, што дагаворваюцца, у кошт належных з яго паводле дагавора плацяжоў іншаму боку як доказ заключэння дагавора і як забеспячэнне яго выканання.

2. Пагадненне аб задатку незалежна ад сумы задатку павінна быць заключана ў пісьмовай форме.

3. У выпадку сумнення ў адносінах да таго, ці з'яўляецца сума, заплачаная ў кошт належных з боку паводле дагавора плацяжоў, задаткам, у прыватнасці ў выніку незахавання правіла, устаноўленага пунктам 2 гэтага артыкула, гэта сума лічыцца заплачанай у якасці авансу, калі не даказана іншае.

Артыкул 352. Наступствы спынення і невыканання абавязацельства, забяспечанага задаткам

1. Пры спыненні абавязацельства, забяспечанага задаткам, да пачатку яго выканання па пагадненні бакоў або ў выніку немагчымасці выканання (артыкул 386) задатак павінен быць вернуты.

2. Калі за невыкананне дагавора адказны бок, які даў задатак, то задатак застаецца ў іншага боку. Калі за невыкананне дагавора адказны бок, які атрымаў задатак, ён абавязаны выплаціць іншаму боку двайную суму задатку.

Звыш таго бок, адказны за невыкананне дагавора, абавязаны кампенсаваць іншаму боку страты з залікам сумы задатку, калі ў дагаворы не прадугледжана іншае.

ГЛАВА 24
ПЕРАМЕНА АСОБ У АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЕ

§ 1. Пераход правоў крэдытора да іншай асобы

Артыкул 353. Падставы і парадак пераходу правоў крэдытора да іншай асобы

1. Права (патрабаванне), якое належыць крэдытору на падставе абавязацельства, можа быць перададзена ім іншай асобе па здзелцы (уступка патрабавання) ці перайсці да іншай асобы на падставе акта заканадаўства.

Правілы аб пераходзе правоў крэдытора да іншай асобы не прымяняюцца да рэгрэсных патрабаванняў.

2. Для пераходу да іншай асобы правоў крэдытора не патрабуецца згоды даўжніка, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам.

3. Калі даўжніку не было пісьмова паведамлена аб пераходзе правоў крэдытора, які адбыўся, да іншай асобы, новы крэдытор нясе рызыку выкліканых гэтым неспрыяльных для яго наступстваў. У гэтым выпадку выкананне абавязацельства першапачатковаму крэдытору прызнаецца выкананнем належнаму крэдытору.

Артыкул 354. Правы крэдытора, якія не могуць пераходзіць да іншых асоб

Пераход да іншай асобы правоў, неразрыўна звязаных з асобай крэдытора, у прыватнасці патрабаванняў аб аліментах, аб пакрыцці шкоды, прычыненай жыццю ці здароўю, не дапускаецца.

Артыкул 355. Аб'ём правоў крэдытора, якія пераходзяць да іншай асобы

Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам, права першапачатковага крэдытора пераходзіць да новага крэдытора ў тым аб'ёме і на тых умовах, якія існавалі да моманту пераходу права. У прыватнасці, да новага крэдытора пераходзяць правы, якія забяспечваюць выкананне абавязацельства, а таксама іншыя звязаныя з патрабаваннем правы, у тым ліку права на нявыплачаныя працэнты.

Артыкул 356. Доказы правоў новага крэдытора

1. Крэдытор, які ўступіў патрабаванне іншай асобе, абавязаны перадаць яму дакументы, якія сведчаць права патрабавання, і паведаміць звесткі, якія маюць значэнне для ажыццяўлення патрабавання.

2. Даўжнік мае права не выконваць абавязацельства новаму крэдытору да прад'яўлення яму доказаў пераходу патрабавання да гэтай асобы.

Артыкул 357. Пярэчанні даўжніка супраць патрабаванняў новага крэдытора

Даўжнік мае права выказваць супраць патрабавання новага крэдытора пярэчанні, якія ён меў супраць першапачатковага крэдытора да моманту атрымання паведамлення аб пераходзе правоў па абавязацельстве да новага крэдытора.

Артыкул 358. Пераход правоў крэдытора да іншай асобы на падставе акта заканадаўства

Правы крэдытора па абавязацельстве пераходзяць да іншай асобы на падставе акта заканадаўства і надыходу ўказаных у ёй абставін:

1) у выніку ўніверсальнага правапераемства ў правах крэдытора;

2) паводле рашэння суда аб пераводзе правоў крэдытора на іншую асобу, калі магчымасць такога пераводу прадугледжана заканадаўствам;

3) у выніку выканання абавязацельства даўжніка яго паручыцелем ці заклададавальнікам, які не з'яўляецца даўжніком па гэтым абавязацельстве;

4) пры субрагацыі страхоўшчыку правоў крэдытора да даўжніка, адказнага за надыход страхавога выпадку;

5) у іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

Артыкул 359. Умовы ўступкі патрабавання

1. Уступка патрабавання крэдыторам іншай асобе дапускаецца, калі яна не супярэчыць заканадаўству ці дагавору.

2. Не дапускаецца без згоды даўжніка ўступка патрабавання па абавязацельстве, у якім асоба крэдытора мае істотнае значэнне для даўжніка.

Артыкул 360. Форма ўступкі патрабавання

1. Уступка патрабавання, заснаванага на здзелцы, заключанай у простай пісьмовай ці натарыяльнай форме, павінна быць заключана ў адпаведнай пісьмовай форме.

2. Уступка патрабавання па здзелцы, якая патрабуе дзяржаўнай рэгістрацыі, павінна быць зарэгістравана ў парадку, устаноўленым для рэгістрацыі гэтай здзелкі, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

3. Уступка патрабавання па ордэрнай каштоўнай паперы адбываецца шляхам індасамента на гэтай каштоўнай паперы (пункт 3 артыкула 147).

Артыкул 361. Адказнасць крэдытора, які ўступіў патрабаванне

Першапачатковы крэдытор, які ўступіў патрабаванне, адказвае перад новым крэдыторам за несапраўднасць перададзенага яму патрабавання, але не адказвае за невыкананне гэтага патрабавання даўжніком, акрамя выпадку, калі першапачатковы крэдытор прыняў на сябе паручыцельства за даўжніка перад новым крэдыторам.

§ 2. Перавод доўгу

Артыкул 362. Умовы і форма пераводу доўгу

1. Перавод даўжніком свайго доўгу на іншую асобу дапускаецца толькі са згоды крэдытора.

2. Да формы пераводу доўгу адпаведна прымяняюцца правілы, якія ўтрымліваюцца ў пунктах 1 і 2 артыкула 360 гэтага Кодэкса.

Артыкул 363. Пярэчанні новага даўжніка супраць патрабаванняў крэдытора

Новы даўжнік мае права выказваць супраць патрабавання крэдытора пярэчанні, заснаваныя на адносінах паміж крэдыторам і першапачатковым даўжніком.

ГЛАВА 25
АДКАЗНАСЦЬ ЗА ПАРУШЭННЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ

Артыкул 364. Абавязак даўжніка кампенсаваць страты

1. Даўжнік абавязаны кампенсаваць крэдытору страты, прычыненыя невыкананнем ці неналежным выкананнем абавязацельства.

2. Страты вызначаюцца ў адпаведнасці з правіламі, устаноўленымі артыкулам 14 гэтага Кодэкса.

3. Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам, пры вызначэнні страт прымаюцца пад увагу цэны, якія існуюць у тым месцы, дзе абавязацельства павінна быць выканана, у дзень добраахвотнага задавальнення даўжніком патрабавання крэдытора, а калі патрабаванне добраахвотна задаволена не было, – у дзень прад'яўлення іску. Зыходзячы з абставін, суд можа забяспечыць патрабаванне аб пакрыцці страт, прымаючы пад увагу цэны, які існуюць на дзень вынясення рашэння.

4. Пры вызначэнні ўпушчанай выгады ўлічваюцца прынятыя крэдыторам для яе атрымання меры і зробленая з гэтай мэтай падрыхтоўка.

Артыкул 365. Страты і няўстойка

1. Калі за невыкананне ці неналежнае выкананне абавязацельства ўстаноўлена няўстойка, то страты кампенсуюцца ў частцы, не пакрытай няўстойкай.

Заканадаўствам ці дагаворам могуць быць прадугледжаны выпадкі, калі дапускаецца спагнанне толькі няўстойкі, але не страт, калі страты могуць быць спагнаны ў поўнай суме звыш няўстойкі, калі па выбары крэдытора могуць быць спагнаны або няўстойка, або страты.

2. У выпадках, калі за невыкананне ці неналежнае выкананне абавязацельства ўстаноўлена абмежаваная адказнасць (артыкул 371), страты, якія падлягаюць пакрыццю ў частцы, не пакрытай няўстойкай, або звыш яе, або замест яе, могуць быць спагнаны да межаў, устаноўленых такім абмежаваннем.

Артыкул 366. Адказнасць за невыкананне грашовага абавязацельства

1. За карыстанне чужымі грашовымі сродкамі ў выніку іх неправамернага ўтрымання, ухілення ад іх звароту, іншай пратэрміноўкі ў іх выплаце або беспадстаўнага атрымання ці захавання за кошт іншай асобы падлягаюць выплаце працэнты на суму гэтых сродкаў. Памер працэнтаў вызначаецца стаўкай рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь на дзень выканання грашовага абавязацельства ці яго адпаведнай часткі, за выключэннем спагнання доўгу ў судовым парадку, калі суд задавальняе патрабаванне крэдытора зыходзячы са стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка на дзень вынясення рашэння.

Гэтыя правілы прымяняюцца, калі іншы памер працэнтаў не ўстаноўлены заканадаўствам ці дагаворам.

У выпадку, калі грашовае абавязацельства ў адпаведнасці з заканадаўствам падлягае аплаце ў беларускіх рублях у памеры, эквівалентным вызначанай суме ў замежнай валюце ці ва ўмоўных грашовых адзінках, працэнты налічаюцца на падлеглую аплаце суму ў беларускіх рублях, вызначаную па афіцыйным курсе адпаведнай валюты ці ўмоўных грашовых адзінак на дзень выканання грашовага абавязацельства або яго адпаведнай часткі, а ў выпадку спагнання доўгу ў судовым парадку – на дзень вынясення рашэння судом.

2. Калі страты, прычыненыя крэдытору неправамерным карыстаннем яго грашовымі сродкамі, перавышаюць суму працэнтаў, належных яму на падставе пункта 1 гэтага артыкула, ён мае права патрабаваць ад даўжніка пакрыцця страт у частцы, якая перавышае гэту суму.

У выпадках, прадугледжаных заканадаўствам ці дагаворам, крэдытор мае права патрабаваць ад даўжніка пакрыцця сумы доўгу, павялічанай з улікам інфляцыі, у частцы, якая перавышае суму працэнтаў, належных яму на падставе пункта 1 гэтага артыкула. Пры гэтым памер доўгу, павялічанага з улікам інфляцыі, разлічваецца ў парадку, вызначаным дагаворам, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

3. Працэнты за карыстанне чужымі грашовымі сродкамі збіраюцца да дня выплаты сумы гэтых сродкаў крэдытору, калі заканадаўствам ці дагаворам для налічэння працэнтаў не ўстаноўлены больш кароткі тэрмін.

4. Калі сума падлеглых выплаце працэнтаў за карыстанне чужымі грашовымі сродкамі, памер якіх вызначаны дагаворам на падставе часткі другой пункта 1 гэтага артыкула, яўна несуразмерная наступствам парушэння абавязацельства, суд мае права зменшыць суму гэтых працэнтаў па заяве даўжніка, але не ніжэй чым да сумы працэнтаў, падлічанай у адпаведнасці з часткай першай пункта 1 гэтага артыкула.

Артыкул 367. Адказнасць за невыкананне абавязацельства ў натуры

1. Выплата няўстойкі і пакрыццё страт у выпадку неналежнага выканання абавязацельства не вызваляюць даўжніка ад выканання абавязацельства ў натуры, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам.

2. Пакрыццё страт у выпадку невыканання абавязацельства і выплата няўстойкі за яго невыкананне вызваляюць даўжніка ад выканання абавязацельства ў натуры, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам.

3. Адмова крэдытора ад прыняцця выканання, якое ў выніку пратэрміноўкі страціла для яго інтарэс (пункт 2 артыкула 376), а таксама выплата адступнога (артыкул 380) вызваляюць даўжніка ад выканання абавязацельства ў натуры.

Артыкул 368. Выкананне абавязацельства за кошт даўжніка

У выпадку невыканання даўжніком абавязацельства вырабіць і перадаць рэч ва ўласнасць, гаспадарчае распараджэнне ці аператыўнае кіраванне, або перадаць рэч у карыстанне крэдытору, або выканаць для яго пэўную работу ці аказаць яму паслугу крэдытор мае права ў разумны тэрмін даручыць выкананне абавязацельства трэцім асобам за разумную цану або выканаць яго сваімі сіламі, калі іншае не вынікае з акта заканадаўства, дагавора ці сутнасці абавязацельства, і запатрабаваць ад даўжніка пакрыцця панесеных неабходных расходаў і іншых страт.

Артыкул 369. Наступствы невыканання абавязацельства перадаць індывідуальна-вызначаную рэч

У выпадку невыканання абавязацельства перадаць індывідуальна-вызначаную рэч ва ўласнасць, гаспадарчае распараджэнне, аператыўнае кіраванне ці аплатнае карыстанне крэдытору апошні мае права запатрабаваць адабрання гэтай рэчы і перадачы яе крэдытору на прадугледжаных абавязацельствам умовах. Гэта права знікае, калі рэч ужо перададзена трэцяй асобе, якая мае права ўласнасці, гаспадарчага распараджэнняці аператыўнага кіравання. Калі рэч яшчэ не перададзена, перавагу мае той з крэдытораў, на карысць якога абавязацельства ўзнікла раней, а калі гэта немагчыма ўстанавіць, – той, хто раней прад'явіць іск.

Замест патрабавання перадаць яму рэч, якая з'яўляецца прадметам абавязацельства, крэдытор мае права патрабаваць пакрыцця страт.

Артыкул 370. Субсідыярная адказнасць

1. Да прад'яўлення патрабавання да асобы, якая ў адпаведнасці з заканадаўствам ці ўмовамі абавязацельства нясе адказнасць дадаткова да адказнасці іншай асобы, якая з'яўляецца асноўным даўжніком (субсідыярная адказнасць), крэдытор павінен прад'явіць патрабаванне да асноўнага даўжніка.

Калі асноўны даўжнік адмовіўся забяспечыць патрабаванне крэдытора ці крэдытор не атрымаў ад яго ў разумны тэрмін адказу на прад'яўленае патрабаванне, гэта патрабаванне можа быць прад'яўлена асобе, якая нясе субсідыярную адказнасць.

2. Крэдытор не мае права патрабаваць задавальнення свайго патрабавання да асноўнага даўжніка ад асобы, якая нясе субсідыярную адказнасць, калі гэта патрабаванне можа быць задаволена шляхам заліку сустрэчнага патрабавання да асноўнага даўжніка або бясспрэчнага спагнання сродкаў з асноўнага даўжніка.

3. Асоба, якая нясе субсідыярную адказнасць, павінна да задавальнення патрабавання, прад'яўленага ёй крэдыторам, папярэдзіць аб гэтым асноўнага даўжніка, а калі да такой асобы прад'яўлены іск, – прыцягнуць асноўнага даўжніка да ўдзелу ў справе. У адваротным выпадку асноўны даўжнік мае права выказаць супраць рэгрэснага патрабавання асобы, якая адказвае субсідыярна, пярэчанні, якія ён меў супраць крэдытора.

Артыкул 371. Абмежаванне памеру адказнасці па абавязацельствах

1. Па асобных відах абавязацельстваў і па абавязацельствах, звязаных з пэўным родам дзейнасці, заканадаўствам можа быць абмежавана права на поўнае пакрыццё страт (абмежаваная адказнасць).

2. Пагадненне аб абмежаванні памеру адказнасці даўжніка паводле дагавора далучэння ці іншым дагаворы, у якім крэдыторам з'яўляецца грамадзянін, які выступае ў якасці спажыўца, нікчэмнае, калі памер адказнасці для гэтага віду абавязацельстваў ці за гэта парушэнне вызначаны законам.

Артыкул 372. Падставы адказнасці за парушэнне абавязацельства

1. Асоба, якая не выканала абавязацельства або выканала яго неналежным чынам, нясе адказнасць пры наяўнасці віны (намеру ці неасцярожнасці), акрамя выпадкаў, калі заканадаўствам ці дагаворам прадугледжаны іншыя падставы адказнасці.

Асоба прызнаецца невінаватай, калі пры той ступені клапатлівасці і абачлівасці, якая ад яе патрабавалася паводле характару абавязацельства і ўмовах грамадзянскага абароту, яна прыняла ўсе меры для належнага выканання абавязацельства.

2. Адсутнасць віны даказваецца асобай, якая парушыла абавязацельства.

3. Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам, асоба, якая не выканала абавязацельства або выканала яго неналежным чынам пры ажыццяўленні прадпрымальніцкай дзейнасці, нясе адказнасць, калі не дакажа, што належнае выкананне абавязацельства немагчымае ў выніку непераадольнай сілы, гэта значыць надзвычайных і непазбежных пры гэтых умовах абставін.

4. Заключанае раней пагадненне аб ліквідацыі ці абмежаванні адказнасці за наўмыснае парушэнне абавязацельства нікчэмнае.

Артыкул 373. Адказнасць даўжніка за сваіх работнікаў

Дзеянні работнікаў даўжніка па выкананні яго абавязацельства лічацца дзеяннямі даўжніка. Даўжнік адказвае за гэтыя дзеянні, калі яны пацягнулі за сабой невыкананне ці неналежнае выкананне абавязацельства.

Артыкул 374. Адказнасць даўжніка за дзеянні трэціх асоб

Даўжнік адказвае за невыкананне ці неналежнае выкананне абавязацельства трэцімі асобамі, на якіх было ўскладзена выкананне, калі заканадаўствам не ўстаноўлена, што адказнасць нясе трэцяя асоба, якая з'яўляецца непасрэдным выканаўцам.

Артыкул 375. Віна крэдытора

1. Калі невыкананне ці неналежнае выкананне абавязацельства адбылося па віне абодвух бакоў, суд адпаведна змяншае памер адказнасці даўжніка.

Суд таксама мае права зменшыць памер адказнасці даўжніка, калі крэдытор наўмысна ці па неасцярожнасці садзейнічаў павелічэнню памеру страт, прычыненых невыкананнем ці неналежным выкананнем абавязацельства, або не прыняў разумных мер да іх змяншэння.

2. Правілы пункта 1 гэтага артыкула адпаведна прымяняюцца і ў выпадках, калі даўжнік паводле заканадаўчага акта ці дагавора нясе адказнасць за невыкананне ці неналежнае выкананне абавязацельства незалежна ад сваёй віны.

Артыкул 376. Пратэрміноўка даўжніка

1. Даўжнік, які пратэрмінаваў выкананне, адказвае перад крэдыторам за страты, прычыненыя пратэрміноўкай, і за наступствы немагчымасці выканання, якая выпадкова надышла ў час пратэрміноўкі.

2. Калі ў выніку пратэрміноўкі даўжніка выкананне страціла інтарэс для крэдытора, ён можа адмовіцца ад прыняцця выканання і патрабаваць пакрыцця страт.

3. Не лічыцца, што даўжнік пратэрмінаваў, пакуль абавязацельства не можа быць выканана ў выніку пратэрміноўкі крэдытора.

Артыкул 377. Пратэрміноўка крэдытора

1. Лічыцца, што крэдытор пратэрмінаваў, калі ён адмовіўся прыняць прапанаванае даўжніком належнае выкананне абавязацельства ці не здзейсніў дзеянняў, якія прадугледжаны заканадаўствам ці дагаворам або вынікаюць з

сутнасці абавязацельства, да ўчынення якіх даўжнік не мог выканаць свайго абавязацельства.

Лічыцца, што крэдытор пратэрмінаваў таксама ў выпадках, указаных у пункце 2 артыкула 379 гэтага Кодэкса.

2. Пратэрміноўка крэдытора дае даўжніку права на пакрыццё прычыненых пратэрміноўкай страт, калі крэдытор не дакажа, што пратэрміноўка адбылася з-за абставін, за якія ні ён сам, ні тыя асобы, на якіх паводле заканадаўства ці даручэння крэдытора было ўскладзена прыняцце выканання, не адказваюць.

3. Па грашовым абавязацельстве даўжнік не абавязаны плаціць працэнты за час пратэрміноўкі крэдытора.

ГЛАВА 26
СПЫНЕННЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ

Артыкул 378. Падставы спынення абавязацельстваў

1. Абавязацельства спыняецца поўнасцю ці часткова на падставах, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства ці дагаворам.

2. Спыненне абавязацельства па патрабаванні аднаго з бакоў дапускаецца толькі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам ці дагаворам.

Артыкул 379. Спыненне абавязацельства выкананнем

1. Належнае выкананне спыняе абавязацельства.

2. Крэдытор, прымаючы выкананне, абавязаны па патрабаванні даўжніка выдаць яму распіску ці іншы дакумент у доказ атрымання выканання поўнасцю ці ў адпаведнай частцы.

Калі даўжнік выдаў крэдытору як пасведчанне абавязацельства даўгавы дакумент, то крэдытор, прымаючы выкананне, павінен вярнуць гэты дакумент, а пры немагчымасці вяртання ўказаць на гэта ў распісцы, якая выдаецца ім. Распіска можа быць заменена подпісам на даўгавым дакуменце, які вяртаецца. Знаходжанне даўгавога дакумента ў даўжніка сведчыць, пакуль не даказана іншае, спыненне абавязацельства.

Пры адмове крэдытора выдаць распіску, вярнуць даўгавы дакумент ці адзначыць у распісцы немагчымасць яго вяртання даўжнік мае права затрымаць выкананне. У гэтых выпадках лічыцца, што крэдытор пратэрмінаваў.

Артыкул 380. Адступное

Па пагадненні бакоў абавязацельства можа быць спынена даваннем наўзамен выканання адступнога (выплатай грошай, перадачай маёмасці і да т.п.). Памер, тэрміны і парадак давання адступнога ўстанаўліваюцца бакамі.

Артыкул 381. Спыненне абавязацельства залікам. Выпадкі недапушчальнасці заліку

1. Абавязацельства спыняецца поўнасцю ці часткова залікам сустрэчнага аднароднага патрабавання, тэрмін якога надышоў або тэрмін якога не ўказаны ці вызначаны момантам запатрабавання. Для заліку дастаткова заявы аднаго боку.

2. Не дапускаецца залік патрабаванняў:

1) калі па заяве іншага боку да патрабавання падлягае прымяненню тэрмін іскавай даўнасці і гэты тэрмін скончыўся;

2) аб пакрыцці шкоды, прычыненай жыццю ці здароўю;

3) аб спагнанні аліментаў;

4) аб пажыццёвым утрыманні;

5) у іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам ці дагаворам.

Артыкул 382. Залік пры ўступцы патрабавання

У выпадку ўступкі патрабавання даўжнік мае права залічыць супраць патрабавання новага крэдытора сваё сустрэчнае патрабаванне да першапачатковага крэдытора.

Залік праводзіцца, калі патрабаванне ўзнікла на падставе, якая існавала да моманту атрымання даўжніком паведамлення аб уступцы патрабавання, і тэрмін патрабавання надышоў да яго атрымання або гэты тэрмін не ўказаны ці вызначаны момантам запатрабавання.

Артыкул 383. Спыненне абавязацельства супадзеннем даўжніка і крэдытора ў адной асобе

Абавязацельства спыняецца супадзеннем даўжніка і крэдытора ў адной асобе.

Артыкул 384. Спыненне абавязацельства навацыяй

1. Абавязацельства спыняецца пагадненнем бакоў аб замене першапачатковага абавязацельства, якое існавала паміж імі, іншым абавязацельствам паміж тымі ж асобамі, якое прадугледжвае іншы прадмет ці спосаб выканання (навацыя).

2. Навацыя не дапускаецца ў адносінах да абавязацельстваў па пакрыцці шкоды, прычыненай жыццю ці здароўю, і па ўплаце аліментаў.

3. Навацыя спыняе дадатковыя абавязацельствы, звязаныя з першапачатковым абавязацельствам, калі іншае не прадугледжана пагадненнем бакоў.

Артыкул 385. Дараванне доўгу

Абавязацельства спыняецца вызваленнем крэдыторам даўжніка ад абавязкаў, якія ляжаць на ім, калі гэта не парушае правоў іншых асоб у адносінах да маёмасці крэдытора.

Артыкул 386. Спыненне абавязацельства немагчымасцю выканання

1. Калі ў двухбаковым дагаворы выкананне стала немагчымым для аднаго з бакоў у выніку абставін, за якія ні адзін з бакоў не адказвае, ён пры адсутнасці ў заканадаўстве ці дагаворы іншых указанняў не мае права патрабаваць ад іншага боку задавальнення паводле дагавора. Кожны з бакоў мае права патрабаваць ад контрагента вяртання ўсяго, што ён выканаў, не атрымаўшы сустрэчнага задавальнення.

2. Калі ў двухбаковым дагаворы выкананне стала немагчымым для аднаго боку з прычыны абставін, за якія ён адказвае, іншы бок пры адсутнасці ў заканадаўстве ці дагаворы іншых указанняў мае права адступіцца ад дагавора і спагнаць прычыненыя невыкананнем страты.

3. Калі ў двухбаковым дагаворы выкананне стала немагчымым для аднаго з бакоў у выніку абставін, за якія адказвае іншы бок, першы захоўвае права на сустрэчнае задавальненне з залікам выгад, якія зберагаюцца ці набываюцца ім у выніку вызвалення ад абавязацельства.

Артыкул 387. Спыненне абавязацельства на падставе акта дзяржаўнага органа

1. Калі ў выніку выдання акта дзяржаўнага органа выкананне абавязацельства становіцца немагчымым поўнасцю ці часткова, абавязацельства спыняецца поўнасцю ці ў адпаведнай частцы.

Бакі, якія панеслі ў выніку гэтага страты, маюць права патрабаваць іх пакрыцця ў адпаведнасці з заканадаўствам.

2. У выпадку прызнання ва ўстаноўленым парадку несапраўдным акта дзяржаўнага органа, на падставе якога абавязацельства спынілася, абавязацельства аднаўляецца, калі іншае не вынікае з пагаднення бакоў ці сутнасці абавязацельства і выкананне не страціла інтарэс для крэдытора.

Артыкул 388. Спыненне абавязацельства смерцю грамадзяніна

1. Абавязацельства спыняецца смерцю грамадзяніна, калі выкананне не можа быць праведзена без асабістага ўдзелу даўжніка або абавязацельства іншым чынам неразрыўна звязана з асобай даўжніка.

2. Абавязацельства спыняецца смерцю крэдытора, калі выкананне прызначана асабіста для крэдытора або абавязацельства іншым чынам неразрыўна звязана з асобай крэдытора.

Артыкул 389. Спыненне абавязацельства ліквідацыяй юрыдычнай асобы

Абавязацельства спыняецца ліквідацыяй юрыдычнай асобы (даўжніка ці крэдытора), акрамя выпадкаў, калі заканадаўствам выкананне абавязацельства ліквідаванай юрыдычнай асобы ўскладаецца на іншую асобу (па патрабаваннях аб пакрыцці шкоды, прычыненай жыццю ці здароўю, і ў іншых выпадках).

ПАДРАЗДЗЕЛ 2
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ АБ ДАГАВОРЫ
ГЛАВА 27
ПАНЯЦЦЕ І ЎМОВЫ ДАГАВОРА

Артыкул 390. Паняцце дагавора

1. Дагаворам прызнаецца пагадненне дзвюх ці некалькіх асоб аб устанаўленні, змяненні ці спыненні грамадзянскіх правоў і абавязкаў.

2. Да дагавораў прымяняюцца правілы аб двух- і шматбаковых здзелках, прадугледжаных главой 9 гэтага Кодэкса.

3. Да абавязацельстваў, якія ўзніклі з дагавора, прымяняюцца агульныя палажэнні аб абавязацельствах (артыкулы 288–389), калі іншае не прадугледжана правіламі гэтай главы і правіламі аб асобных відах дагавораў, якія ўтрымліваюцца ў заканадаўстве.

4. Да дагавораў, якія заключаюцца больш чым двума бакамі, агульныя палажэнні аб дагаворы прымяняюцца, калі гэта не супярэчыць шматбаковаму характару такіх дагавораў.

Артыкул 391. Свабода дагавора

1. Грамадзяне і юрыдычныя асобы свабодныя ў заключэнні дагавора.

Прымус да заключэння дагавора не дапускаецца, за выключэннем выпадкаў, калі абавязак заключыць дагавор прадугледжаны заканадаўствам ці добраахвотна прынятым абавязацельствам.

2. Калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі, бакі могуць заключаць дагавор, у якім утрымліваюцца элементы розных дагавораў, прадугледжаных заканадаўствам (змешаны дагавор). Да адносін бакоў па змешаным дагаворы прымяняюцца ў адпаведных частках правілы аб дагаворах, элементы якіх утрымліваюцца ў змешаным дагаворы, калі іншае не вынікае з пагаднення бакоў ці сутнасці змешанага дагавора.

3. Умовы дагавора вызначаюцца па меркаванні бакоў у парадку і межах, прадугледжаных заканадаўствам (артыкул 392).

У выпадках, калі ўмовы дагавора прадугледжаны нормай, якая прымяняецца пастолькі, паколькі пагадненнем бакоў не ўстаноўлена іншая (дыспазітыўная норма), бакі могуць сваім пагадненнем устанавіць умову, адрозную ад прадугледжанай у ёй, калі гэта не супярэчыць заканадаўству. Пры адсутнасці такога пагаднення ўмова дагавора вызначаецца дыспазітыўнай нормай.

Артыкул 392. Дагавор і заканадаўства

1. Дагавор павінен адпавядаць абавязковым для бакоў правілам, устаноўленым заканадаўствам.

2. Калі пасля заключэння і да спынення дзеяння дагавора прыняты акт заканадаўства, які ўстанаўлівае абавязковыя для бакоў правілы, іншыя, чым тыя, якія дзейнічалі пры заключэнні дагавора, умовы заключанага дагавора павінны быць прыведзены ў адпаведнасць з заканадаўствам, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам.

Артыкул 393. Аплатны і бязвыплатны дагавор

1. Дагавор, па якім бок павінен атрымаць плату ці іншае сустрэчнае даванне за выкананне сваіх абавязкаў, з'яўляецца аплатным.

2. Бязвыплатным прызнаецца дагавор, па якім адзін бок абавязваецца даць што-небудзь іншаму баку без атрымання ад яго платы ці іншага сустрэчнага давання.

3. Дагавор лічыцца аплатным, калі з заканадаўства, зместу ці сутнасці дагавора не вынікае іншае.

Артыкул 394. Цана

1. Разлікі бакоў пры выкананні дагавора ажыццяўляюцца па цане, устаноўленай пагадненнем бакоў з прытрымліваннем нормаў заканадаўства.

У прадугледжаных заканадаўствам выпадках прымяняюцца цэны (тарыфы, расцэнкі, стаўкі і да т. п.), якія ўстанаўліваюцца ці рэгулююцца ўпаўнаважанымі на тое дзяржаўнымі органамі.

2. Змяненне цаны пасля заключэння дагавора дапускаецца ў выпадках і на ўмовах, прадугледжаных дагаворам, заканадаўствам або ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

3. У выпадках, калі ў аплатным дагаворы цана не прадугледжана і не можа быць вызначана зыходзячы з умоў дагавора, выкананне дагавора павінна быць аплачана па цане, якая пры параўнальных абставінах звычайна збіраецца за аналагічныя тавары, работы ці паслугі.

Артыкул 395. Дзеянне дагавора

1. Дагавор уступае ў сілу і становіцца абавязковым для бакоў з моманту яго заключэння.

2. Бакі маюць права ўстанавіць, што ўмовы заключанага імі дагавора прымяняюцца да іх адносін, якія ўзніклі да заключэння дагавора.

3. Заканадаўствам ці дагаворам можа быць прадугледжана, што заканчэнне тэрміну дзеяння дагавора цягне за сабой спыненне абавязацельстваў бакоў паводле дагавора.

Дагавор, у якім адсутнічае такая ўмова, прызнаецца дзейным да вызначанага ў ім моманту заканчэння выканання бакамі абавязацельства.

4. Заканчэнне тэрміну дзеяння дагавора не вызваляе бакі ад адказнасці за яго парушэнне.

Артыкул 396. Публічны дагавор

1. Публічным прызнаецца дагавор, заключаны камерцыйнай арганізацыяй, які ўстанаўлівае яе абавязкі па продажы тавараў, выкананні работ ці аказанні паслуг, якія такая арганізацыя паводле характару сваёй дзейнасці павінна ажыццяўляць у адносінах да кожнага, хто да яе звернецца (рознічны гандаль, перавозка транспартам агульнага карыстання, паслугі сувязі, энергазабеспячэнне, медыцынскае, гасцінічнае абслугоўванне, абавязковае страхаванне і да т. п.).

Камерцыйная арганізацыя не мае права аддаць перавагу адной асобе перад іншай у адносінах да заключэння публічнага дагавора, акрамя выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам.

2. Цана тавараў, работ і паслуг, а таксама іншыя ўмовы публічнага дагавора ўстанаўліваюцца аднолькавымі для ўсіх спажыўцоў, за выключэннем выпадкаў, калі заканадаўствам дапускаецца даванне льгот для асобных катэгорый спажыўцоў.

3. Адмова камерцыйнай арганізацыі ад заключэння публічнага дагавора пры наяўнасці магчымасці даць спажыўцу адпаведныя тавары (работы, паслугі) не дапускаецца.

Пры неабгрунтаваным ухіленні камерцыйнай арганізацыі ад заключэння публічнага дагавора прымяняюцца палажэнні, прадугледжаныя пунктам 4 артыкула 415 гэтага Кодэкса.

4. У выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, Урад Рэспублікі Беларусь можа выдаваць правілы, абавязковыя для бакоў пры заключэнні і выкананні публічных дагавораў (тыпавыя дагаворы, палажэнні і да т. п.), калі іншае не ўстанавіў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

5. Умовы публічнага дагавора, не адпаведныя патрабаванням, устаноўленым пунктамі 2 і 4 гэтага артыкула, нікчэмныя.

Артыкул 397. Прыкладныя ўмовы дагавораў

1. У дагаворы можа быць прадугледжана, што яго асобныя ўмовы вызначаюцца прыкладнымі ўмовамі, распрацаванымі для дагавораў адпаведнага віду і апублікаванымі ў друку.

2. Прыкладныя ўмовы могуць быць выкладзены ў форме прыкладнага дагавора ці іншага дакумента, які ўтрымлівае гэтыя ўмовы.

Артыкул 398. Дагавор далучэння

1. Дагаворам далучэння прызнаецца дагавор, умовы якога вызначаны адным з бакоў у фармулярах ці іншых стандартных формах і маглі быць прыняты іншым бокам няйнакш як шляхам далучэння да прапанаванага дагавора ў цэлым.

Дагаворам далучэння ў сферы страхавання прызнаецца дагавор, умовы якога вызначаны ў правілах адпаведных відаў страхавання, зацверджаных страхоўшчыкам або аб'яднаннем страхоўшчыкаў і ўзгодненых з органам, які ажыццяўляе дзяржаўны нагляд за страхавой дзейнасцю, і могуць быць прыняты іншым бокам (страхавальнікам) няйнакш як шляхам далучэння да дагавора страхавання.

2. Бок, які далучыўся да дагавора, мае права запатрабаваць скасавання ці змянення дагавора, калі дагавор далучэння хоць і не супярэчыць заканадаўству, але пазбаўляе гэты бок правоў, якія звычайна даюцца паводле дагавораў такога віду, выключае ці абмяжоўвае адказнасць іншага боку за парушэнне абавязацельстваў або ўтрымлівае іншыя яўна абцяжарвальныя для боку, які далучыўся, умовы, якія ён, зыходзячы са сваіх разумных інтарэсаў, не прыняў бы пры наяўнасці ў яго магчымасці ўдзельнічаць у вызначэнні ўмоў дагавора.

3. Пры наяўнасці абставін, прадугледжаных у пункце 2 гэтага артыкула, патрабаванне аб скасаванні дагавора, прад'яўленае бокам, які далучыўся да дагавора ў сувязі з ажыццяўленнем сваёй прадпрымальніцкай дзейнасці, не падлягае задавальненню, калі бок, які далучыўся, ведаў ці павінен быў ведаць, на якіх умовах заключае дагавор.

Артыкул 399. Папярэдні дагавор

1. Па папярэднім дагаворы бакі абавязваюцца заключыць у будучыні дагавор (асноўны дагавор) на ўмовах, прадугледжаных папярэднім дагаворам.

2. Папярэдні дагавор заключаецца ў форме, устаноўленай заканадаўствам для асноўнага дагавора, а калі форма асноўнага дагавора не ўстаноўлена, то ў пісьмовай форме. Незахаванне правілаў аб форме папярэдняга дагавора цягне за сабой яго нікчэмнасць.

3. Папярэдні дагавор павінен утрымліваць умовы, якія дазваляюць устанавіць прадмет, а таксама іншыя істотныя ўмовы асноўнага дагавора.

4. У папярэднім дагаворы ўказваецца тэрмін, у які бакі абавязваюцца заключыць асноўны дагавор.

Калі такі тэрмін у папярэднім дагаворы не вызначаны, асноўны дагавор падлягае заключэнню на працягу года з моманту заключэння папярэдняга дагавора.

5. У выпадках, калі бок, які заключыў папярэдні дагавор, ухіляецца ад заключэння асноўнага дагавора, прымяняюцца палажэнні, устаноўленыя для заключэння дагавораў у абавязковым парадку (пункт 4 артыкула 415).

6. Абавязацельствы, прадугледжаныя папярэднім дагаворам, спыняюцца, калі да заканчэння тэрміну, у які бакі павінны заключыць асноўны дагавор, ён не будзе заключаны і ні адзін з бакоў не накіруе іншаму боку прапанову заключыць гэты дагавор.

Артыкул 400. Дагавор на карысць трэцяй асобы

1. Дагаворам на карысць трэцяй асобы прызнаецца дагавор, у якім бакі ўстанавілі, што даўжнік абавязаны правесці выкананне не крэдытору, а ўказанай ці не ўказанай у дагаворы трэцяй асобе, якая мае права патрабаваць ад даўжніка выканання абавязацельства на сваю карысць.

2. Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам, з моманту выказвання трэцяй асобай даўжніку намеру скарыстацца сваім правам паводле дагавора бакі не могуць скасаваць ці змяняць заключаны імі дагавор без згоды трэцяй асобы.

3. Даўжнік у дагаворы мае права выказваць супраць патрабавання трэцяй асобы пярэчанні, якія ён мог выказаць супраць крэдытора.

4. У выпадку, калі трэцяя асоба адмовілася ад права, дадзенага ёй паводле дагавора, крэдытор можа скарыстацца гэтым правам, калі гэта не супярэчыць заканадаўству і дагавора.

Артыкул 401. Тлумачэнне дагавора

Пры тлумачэнні ўмоў дагавора суд прымае пад увагу літаральнае значэнне слоў і выразаў, якія ў ім утрымліваюцца. Літаральнае значэнне ўмовы дагавора ў выпадку няяснасці ўстанаўліваецца шляхам параўнання з іншымі ўмовамі і сэнсам дагавора ў цэлым.

Калі правілы, якія ўтрымліваюцца ў частцы першай гэтага артыкула, не дазваляюць вызначыць змест дагавора, павінна быць вызначана сапраўдная агульная воля бакоў з улікам мэты дагавора. Пры гэтым прымаюцца на ўвагу ўсе адпаведныя абставіны, уключаючы перагаворы і перапіску, якія папярэднічаюць дагавора, практыку, якая ўсталявалася ва ўзаемных адносінах бакоў, наступныя паводзіны бакоў.

ГЛАВА 28
ЗАКЛЮЧЭННЕ ДАГАВОРА

Артыкул 402. Асноўныя палажэнні аб заключэнні дагавора

1. Дагавор лічыцца заключаным, калі паміж бакамі ў патрэбнай у падлеглых выпадках форме дасягнута пагадненне па ўсіх істотных умовах дагавора.

Істотнымі з'яўляюцца ўмовы аб прадмеце дагавора, умовы, якія названы ў заканадаўстве як істотныя, неабходныя ці абавязковыя для дагавораў гэтага віду, а таксама ўсе тыя ўмовы, адносна якіх па заяве аднаго з бакоў павінна быць дасягнута пагадненне.

2. Дагавор заключаецца пры дапамозе накіравання аферты (прапановы заключыць дагавор) аднаго з бакоў і яе акцэпта (прыняцця прапановы) іншым бокам.

Артыкул 403. Момант заключэння дагавора

1. Дагавор прызнаецца заключаным у момант атрымання асобай, якая накіравала аферту, яе акцэпта.

2. Калі ў адпаведнасці з заканадаўствам для заключэння дагавора неабходна таксама перадача маёмасці, дагавор лічыцца заключаным з моманту перадачы адпаведнай маёмасці (артыкул 225).

3. Дагавор, які падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі, лічыцца заключаным з моманту яго рэгістрацыі, а пры неабходнасці натарыяльнага засведчання і рэгістрацыі – з моманту рэгістрацыі дагавора, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі.

4. Дагавор, які заключаецца на біржы, лічыцца заключаным з моманту, вызначанага заканадаўствам, якое рэгулюе дзейнасць такой біржы, ці правіламі, якія дзейнічаюць на біржы.

Артыкул 404. Форма дагавора

1. Дагавор можа быць заключаны ў любой форме, прадугледжанай для заключэння здзелак, калі гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства для дагавораў гэтага віду не ўстаноўлена пэўная форма.

Калі заканадаўствам для гэтага віду дагавора не патрабуецца натарыяльнай формы, але бакі дамовіліся скончыць яго ў такой форме, то дагавор лічыцца заключаным з моманту надання яму натарыяльнай формы.

Калі заканадаўствам для гэтага віду дагавора не патрабуецца пісьмовай (простай ці натарыяльнай) формы, але бакі дамовіліся заключыць яго ў простай пісьмовай форме, то дагавор лічыцца заключаным з моманту надання яму простай пісьмовай формы.

2. Дагавор у пісьмовай форме можа быць заключаны шляхам складання аднаго тэкставага дакумента, уключаючы дакумент у электронным выглядзе (у тым ліку электронны дакумент), ці шляхам абмену тэкставымі дакументамі, уключаючы дакументы ў электронным выглядзе (у тым ліку электронныя дакументы), якія падпісаны бакамі ўласнаручна або з выкарыстаннем сродкаў сувязі і іншых тэхнічных сродкаў, камп’ютарных праграм, інфармацыйных сістэм ці інфармацыйных сетак, калі такі спосаб падпісання дазваляе дакладна ўстанавіць, што адпаведны тэкставы дакумент падпісаны бакамі паводле дагавора (факсімільнае ўзнаўленне ўласнаручнага подпісу з дапамогай сродкаў механічнага ці іншага капіравання, электронны лічбавы подпіс ці іншы аналаг уласнаручнага подпісу, які забяспечвае ідэнтыфікацыю боку паводле дагавора), і не супярэчыць заканадаўству і пагадненню бакоў.

У выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, дапускаюцца толькі вызначаныя імі спосабы заключэння дагавора ў простай пісьмовай форме.

3. Пісьмовая форма дагавора лічыцца захаванай, калі пісьмовая прапанова заключыць дагавор шляхам накіравання тэкставага дакумента, уключаючы дакумент у электронным выглядзе (у тым ліку электронны дакумент), прынята ў адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 408 гэтага Кодэкса.

Артыкул 405. Аферта

1. Афертай прызнаецца адрасаваная адной ці некалькім канкрэтным асобам прапанова, якая дастаткова пэўная і выказвае намер асобы, якая зрабіла прапанову, лічыць сябе асобай, якая заключыла дагавор з адрасатам, якім будзе прынята прапанова.

Аферта павінна ўтрымліваць істотныя ўмовы дагавора.

2. Аферта звязвае асобу, якая накіравала яе, з моманту атрымання яе адрасатам. Калі паведамленне аб адкліканні аферты паступіла раней ці адначасова з самой афертай, яна лічыцца неатрыманай.

Артыкул 406. Безадклікальнасць аферты

Атрыманая адрасатам аферта не можа быць адклікана на працягу тэрміну, устаноўленага для яе акцэпта, калі іншае не агаворана ў самой аферце або не вынікае з сутнасці прапановы ці абстаноўкі, у якой яна была зроблена.

Артыкул 407. Запрашэнне рабіць аферты

1. Рэклама і іншыя прапановы, адрасаваныя нявызначанаму колу асоб, разглядаюцца як запрашэнне рабіць аферты, калі іншае прама не ўказана ў прапанове.

2. Публічнай афертай прызнаецца прапанова, якая ўтрымлівае ўсе істотныя ўмовы дагавора, з якой бачыцца воля асобы, якая робіць прапанову, заключыць дагавор на ўказаных у прапанове ўмовах з любым, хто адгукнецца.

Артыкул 408. Акцэпт

1. Акцэптам прызнаецца адказ асобы, якой адрасавана аферта, аб яе прыняцці.

Акцэпт павінен быць поўным і безагаворачным.

2. Маўчанне не з'яўляецца акцэптам, калі іншае не вынікае з заканадаўства ці пагаднення бакоў.

3. Здзяйсненне асобай, якая атрымала аферту, у тэрмін, устаноўлены для яе акцэпта, дзеянняў па выкананні ўказаных у ёй умоў дагавора (адгрузка тавараў, аказанне паслуг, выкананне работ, выплата адпаведнай сумы і г. д.) лічыцца акцэптам, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці не ўказана ў аферце.

Артыкул 409. Адкліканне акцэпта

Калі паведамленне аб адкліканні акцэпта паступіла асобе, якая накіравала аферту, раней за сам акцэпт ці адначасова з ім, акцэпт лічыцца неатрыманым.

Артыкул 410. Заключэнне дагавора на падставе аферты, якая ўтрымлівае тэрмін для акцэпта

Калі ў аферце вызначаны тэрмін для акцэпта, дагавор лічыцца заключаным, калі акцэпт атрымала асоба, якая накіравала аферту, у межах указанага ў ёй тэрміну.

Артыкул 411. Заключэнне дагавора на падставе аферты, якая не ўтрымлівае тэрміну для акцэпта

1. Калі ў пісьмовай аферце не вызначаны тэрмін для акцэпта, дагавор лічыцца заключаным, калі акцэпт атрымала асоба, якая накіравала аферту, да заканчэння тэрміну, устаноўленага заканадаўствам, а калі такі тэрмін не ўстаноўлены, – на працягу нармальна неабходнага для гэтага часу.

2. Калі аферта зроблена вусна без указання тэрміну для акцэпта, дагавор лічыцца заключаным, калі іншы бок неадкладна заявіў аб яе акцэпце.

Артыкул 412. Акцэпт, атрыманы са спазненнем

1. У выпадках, калі своечасова накіраванае паведамленне аб акцэпце атрымана са спазненнем, лічыцца, што акцэпт не спазніўся, калі бок, які накіраваў аферту, неадкладна паведаміць іншаму боку аб атрыманні акцэпта са спазненнем.

2. Калі бок, які накіраваў аферту, неадкладна паведаміць іншаму боку аб прыняцці яго акцэпта, атрыманага са спазненнем, дагавор лічыцца заключаным.

Артыкул 413. Акцэпт на іншых умовах

Адказ аб згодзе заключыць дагавор на іншых умовах, чым прапанавана ў аферце, не з'яўляецца акцэптам.

Такі адказ прызнаецца адмовай ад акцэпта і ў той жа час новай афертай.

Артыкул 414. Месца заключэння дагавора

Калі ў дагаворы не ўказана месца яго заключэння, дагавор прызнаецца заключаным у месцы жыхарства грамадзяніна ці месцы знаходжання юрыдычнай асобы, якая накіравала аферту.

Артыкул 415. Заключэнне дагавора ў абавязковым парадку

1. У выпадках, калі ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства для боку, якому накіравана аферта (праект дагавора), заключэнне дагавора абавязковае, гэты бок павінен накіраваць іншаму боку паведамленне аб акцэпце, або аб адмове ад акцэпта, або аб акцэпце аферты на іншых умовах (пратакол рознагалоссяў да праекту дагавора) на працягу трыццаці дзён з дня атрымання аферты.

Бок, які накіраваў аферту і атрымаў ад боку, для якога заключэнне дагавора абавязковае, паведамленне аб яе акцэпце на іншых умовах (пратакол рознагалоссяў да праекту дагавора), мае права перадаць рознагалоссі, якія ўзніклі пры заключэнні дагавора, на разгляд суда на працягу трыццаці дзён з дня атрымання такога паведамлення або сканчэння тэрміну для акцэпта.

2. У выпадках, калі ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства заключэнне дагавора абавязковае для боку, які накіраваў аферту (праект дагавора), і яму на працягу трыццаці дзён будзе накіраваны пратакол рознагалоссяў да праекта дагавора, гэты бок абавязаны на працягу трыццаці дзён з дня атрымання пратакола рознагалоссяў паведаміць іншаму боку аб прыняцці дагавора ў яго рэдакцыі або аб адхіленні пратакола рознагалоссяў.

Пры адхіленні пратакола рознагалоссяў або неатрыманні паведамлення аб выніках яго разгляду ва ўказаны тэрмін бок, які накіраваў пратакол рознагалоссяў, мае права перадаць рознагалоссі, якія ўзніклі пры заключэнні дагавора, на разгляд суда.

3. Правілы аб тэрмінах, прадугледжаныя пунктамі 1 і 2 гэтага артыкула, прымяняюцца, калі іншыя тэрміны не ўстаноўлены заканадаўствам ці не ўзгоднены бакамі.

4. Калі бок, для якога ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства заключэнне дагавора абавязковае, ухіляецца ад яго заключэння, іншы бок мае права звярнуцца ў суд з патрабаваннем аб прымусе заключыць дагавор.

Бок, які неабгрунтавана ўхіляецца ад заключэння дагавора, павінен кампенсаваць іншаму боку прычыненыя гэтым страты.

Артыкул 416. Пераддагаворныя спрэчкі

У выпадках перадачы рознагалоссяў, якія ўзніклі пры заключэнні дагавора, на разгляд суда на падставе артыкула 415 гэтага Кодэкса або па пагадненні бакоў умовы дагавора, па якім у бакоў меліся рознагалоссі, вызначаюцца ў адпаведнасці з рашэннем суда.

Артыкул 417. Заключэнне дагавора на таргах

1. Дагавор, калі іншае не вынікае з яго сутнасці, можа быць заключаны шляхам правядзення таргоў. Дагавор заключаецца з асобай, якая выйграла таргі.

2. У якасці арганізатара таргоў могуць выступаць уласнік рэчы ці ўладальнік маёмаснага права або спецыялізаваная арганізацыя. Спецыялізаваная арганізацыя дзейнічае на падставе дагавора з уласнікам рэчы ці ўладальнікам маёмаснага права і выступае ад іх імя ці ад свайго імя.

3. У выпадках, указаных у гэтым Кодэксе ці іншых актах заканадаўства, дагаворы аб продажы рэчы ці маёмаснага права могуць быць заключаны толькі шляхам правядзення таргоў.

4. Таргі (тэндар) праводзяцца ў форме аўкцыёну ці конкурсу. Асобай, якая выйграла таргі на аўкцыёне прызнаецца тая, якая прапанавала найбольш высокую цану, а па конкурсе – асобу, якая паводле заключэння конкурснай камісіі, загадзя прызначанай арганізатарамі таргоў, прапанавала найлепшыя ўмовы.

5. Аўкцыён і конкурс, для ўдзелу ў якіх не было пададзена ні адной заяўкі (заявы), або заяўка (заява) пададзена толькі адным удзельнікам, або прыбыў толькі адзін удзельнік, або ніхто не прыбыў, або ў іншых выпадках, устаноўленых заканадаўчымі актамі, прызнаюцца аўкцыёнам або конкурсам, якія не адбыліся.

Калі прызнана, што аўкцыён па продажы маёмасці не адбыўся з прычыны таго, што заяўка (заява) на ўдзел у ім пададзена толькі адным удзельнікам або для ўдзелу ў ім прыбыў толькі адзін удзельнік, прадмет аўкцыёну прадаецца гэтаму ўдзельніку пры яго згодзе за пачатковую цану, павялічаную на пяць працэнтаў, калі іншае не ўстанавіў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

Пры паступленні заяўкі (заявы) на ўдзел у конкурсе па продажы маёмасці толькі ад аднаго ўдзельніка або яўкі для ўдзелу ў ім толькі аднаго ўдзельніка і адпаведнасці яго прапаноў умовам конкурсу продаж прадмета конкурсу гэтай асобе праводзіцца на прапанаваных ім умовах, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

6. Правілы, прадугледжаныя гэтым Кодэксам, прымяняюцца да публічных таргоў, якія праводзяцца ў парадку выканання рашэнняў суда, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні, заканадаўствам аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве).

7. У выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, дапускаецца ўдзел у аўкцыёне на баку аднаго ўдзельніка дзвюх і больш асоб.

Артыкул 418. Арганізацыя і парадак правядзення таргоў

1. Аўкцыёны і конкурсы могуць быць адкрытымі і закрытымі. У адкрытым аўкцыёне і адкрытым конкурсе можа ўдзельнічаць любая асоба. У закрытым аўкцыёне і закрытым конкурсе ўдзельнічаюць толькі асобы, спецыяльна запрошаныя для гэтай мэты.

2. Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам, паведамленне аб правядзенні таргоў падлягае абавязковаму апублікаванню ў друкаваных сродках масавай інфармацыі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, і павінна быць зроблена арганізатарам не менш чым за трыццаць дзён да іх правядзення, а ў выпадку паўторных таргоў, якія праводзяцца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства, – не

менш чым за дзесяць дзён да іх правядзення. Інфармацыя аб аб'яўленых таргах і аб прадмеце таргоў дадаткова размяшчаецца ў глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт у парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі. Паведамленне павінна ўтрымліваць у любым выпадку звесткі аб часе, месцы і форме таргоў, іх прадмеце і парадку правядзення, у тым ліку аб афармленні ўдзелу ў таргах, вызначэнні асобы, якая выйграла таргі, а таксама звесткі аб пачатковай цане.

У выпадку, калі прадметам таргоў з'яўляецца толькі права заключэння дагавора, у паведамленні аб таргах, якія адбудуцца, павінен быць указаны тэрмін, які даецца для гэтага.

3. Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці ў паведамленні аб правядзенні таргоў, арганізатар адкрытых таргоў, які зрабіў паведамленне, мае права адмовіцца ад аўкцыёну ў любы час, але не пазней чым за тры дні да надыходу даты яго правядзення, а ад конкурсу – не пазней чым за трыццаць дзён да правядзення конкурсу.

У выпадках, калі арганізатар адкрытых таргоў адмовіўся ад іх правядзення з парушэннем указаных тэрмінаў, ён абавязаны кампенсаваць удзельнікам панесены імі рэальны ўрон. Арганізатар закрытага аўкцыёну ці закрытага конкурсу абавязаны кампенсаваць удзельнікам, якія запрашаюцца ім, рэальны ўрон незалежна ад таго, у які менавіта тэрмін пасля накіравання паведамлення з’явілася адмова ад таргоў.

4. Удзельнікі таргоў уносяць задатак у памеры, тэрміны і парадку, якія ўказаны ў паведамленні, у лік выканання абавязацельстваў паводле дагавора, які можа быць заключаны на таргах.

Удзельніку, які не выйграў таргі, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, задатак павінен быць вернуты на працягу пяці рабочых дзён з дня правядзення аўкцыёну (конкурсу). Удзельніку, які выйграў таргі, ці асобам, указаным у частках другой і трэцяй пункта 5 артыкула 417 гэтага Кодэкса, сума ўнесенага задатку ўлічваецца ў лік выканання абавязацельстваў паводле дагавора, які заключаецца на таргах.

5. Удзельнік, які выйграў таргі, ці асобы, указаныя ў частках другой і трэцяй пункта 5 артыкула 417 гэтага Кодэкса, і арганізатар таргоў падпісваюць у дзень правядзення аўкцыёну (конкурсу) пратакол, які мае сілу дагавора.

Калі па ўмовах таргоў разыгрываецца толькі права на заключэнне дагавора, такі дагавор павінен быць падпісаны бакамі не пазней чым за дваццаць дзён ці іншы ўказаны ў паведамленні тэрмін пасля завяршэння таргоў і афармлення пратакола, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі.

У выпадку адмовы ці ўхілення ўдзельніка, які выйграў таргі, ці асоб, указаных у частках другой і трэцяй пункта 5 артыкула 417 гэтага Кодэкса, ад падпісання пратакола і (ці) дагавора, які афармляецца па выніках аўкцыёну (конкурсу), пакрыцця затрат на арганізацыю і правядзенне аўкцыёну (конкурсу), а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, унесены імі задатак звароту не падлягае. Арганізатар таргоў, які ўхіліўся ад падпісання пратакола, абавязаны вярнуць задатак у двайным памеры, а таксама кампенсаваць удзельніку, які выйграў таргі, ці асобам, указаным у частках другой і трэцяй пункта 5 артыкула 417 гэтага Кодэкса, страты, прычыненыя ўдзелам у таргах, у частцы, якая перавышае суму задатку.

У выпадку ўхілення ад заключэння дагавора аднаго з бакоў іншы бок мае права звярнуцца ў суд з патрабаваннем аб прымусе заключыць дагавор, а таксама аб пакрыцці страт, прычыненых ухіленнем ад яго заключэння.

6. Заканадаўчымі актамі можа ўстанаўлівацца іншы парадак арганізацыі і правядзення таргоў.

Да аўкцыёнаў, якія праводзіць Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь у мэтах рэгулявання бягучай ліквіднасці банкаў, прадугледжаныя гэтым артыкулам правілы прымяняюцца, калі заканадаўствам не прадугледжана іншае.

Артыкул 419. Наступствы парушэння правілаў правядзення таргоў

1. Таргі, праведзеныя з парушэннем правілаў, устаноўленых заканадаўствам, могуць быць прызнаны судом несапраўднымі па іску зацікаўленай асобы.

2. Прызнанне таргоў несапраўднымі цягне за сабой несапраўднасць дагавора, заключанага з асобай, якая выйграла таргі.

ГЛАВА 29
ЗМЯНЕННЕ І СКАСАВАННЕ ДАГАВОРА

Артыкул 420. Падставы змянення і скасавання дагавора

1. Змяненне і скасаванне дагавора магчымае па пагадненні бакоў, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства ці дагаворам.

2. Па патрабаванні аднаго з бакоў дагавор можа быць зменены ці скасаваны паводле рашэння суда толькі:

1) пры істотным парушэнні дагавора іншым бокам;

2) у іншых выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства ці дагаворам.

Істотным прызнаецца парушэнне дагавора адным з бакоў, якое цягне за сабой для іншага боку такі ўрон, у выніку якога ён у значнай ступені пазбаўляецца таго, на што меў права разлічваць пры заключэнні дагавора.

3. У выпадку аднабаковай адмовы ад выканання дагавора поўнасцю ці часткова, калі такая адмова дапускаецца заканадаўствам ці пагадненнем бакоў, дагавор лічыцца адпаведна скасаваным ці змененым.

Артыкул 421. Змяненне і скасаванне дагавора ў сувязі з істотным змяненнем абставін

1. Істотнае змяненне абставін, з якіх бакі зыходзілі пры заключэнні дагавора, з'яўляецца падставай для яго змянення ці скасавання, калі іншае не прадугледжана дагаворам ці не вынікае з яго сутнасці.

Змяненне абставін прызнаецца істотным, калі яны змяніліся настолькі, што, калі б бакі маглі гэта разумна прадбачыць, дагавор увогуле не быў бы імі заключаны ці быў бы заключаны на ўмовах, якія значна адрозніваюцца.

2. Калі бакі не дасягнулі пагаднення аб прывядзенні дагавора ў адпаведнасць з абставінамі, якія істотна змяніліся, ці аб яго скасаванні, дагавор можа быць скасаваны, а на падставах, прадугледжаных пунктам 4 гэтага артыкула, зменены судом па патрабаванні зацікаўленага боку пры наяўнасці адначасова наступных умоў:

1) у момант заключэння дагавора бакі зыходзілі з таго, што такога змянення абставін не адбудзецца;

2) змяненне абставін выклікана прычынамі, якія зацікаўлены бок не мог пераадолець пасля іх узнікнення пры той ступені добрасумленнасці і абачлівасці, якая ад яго патрабавалася паводле характару дагавора і ўмовах грамадзянскага абароту;

3) выкананне дагавора без змянення яго ўмоў настолькі парушыла б адпаведныя дагавору суадносіны маёмасных інтарэсаў бакоў і пацягнула б за сабой

для зацікаўленага боку такі ўрон, што ён у значнай ступені страціў бы тое, на што меў права разлічваць пры заключэнні дагавора;

4) з сутнасці дагавора не вынікае, што рызыку змянення абставін нясе зацікаўлены бок.

3. Пры скасаванні дагавора ў выніку абставін, якія істотна змяніліся, суд па патрабаванні любога з бакоў вызначае наступствы скасавання дагавора зыходзячы з неабходнасці справядлівага размеркавання паміж бакамі расходаў, панесеных імі ў сувязі з выкананнем гэтага дагавора.

4. Змяненне дагавора ў сувязі з істотным змяненнем абставін дапускаецца паводле рашэння суда ў выключных выпадках, калі скасаванне дагавора супярэчыць грамадскім інтарэсам або пацягне за сабой для бакоў урон, які значна перавышае затраты, неабходныя для выканання дагавора на змененых судом умовах.

Артыкул 422. Парадак змянення і скасавання дагавора

1. Пагадненне аб змяненні ці скасаванні дагавора адбываецца ў той жа форме, што і дагавор, калі з заканадаўства, дагавора не вынікае іншае.

2. Патрабаванне аб змяненні ці скасаванні дагавора можа быць заяўлена бокам у суд толькі пасля атрымання адмовы іншага боку на прапанову змяніць ці скасаваць дагавор або неатрыманні адказу ў тэрмін, указаны ў прапанове ці ўстаноўлены заканадаўствам або дагаворам, а пры яго адсутнасці – у трыццацідзённы тэрмін. Гэтым Кодэксам, іншымі законамі і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь можа быць устаноўлены іншы парадак скасавання дагавора.

Артыкул 423. Наступствы скасавання і змянення дагавора

1. Пры скасаванні дагавора абавязацельствы бакоў спыняюцца.

2. Пры змяненні дагавора абавязацельствы бакоў працягваюць дзейнічаць у змененым выглядзе.

3. У выпадках скасавання ці змянення дагавора абавязацельствы лічацца спыненымі ці зменеными з моманту дасягнення пагаднення бакоў аб змяненні ці скасаванні дагавора, калі іншае не вынікае з пагаднення бакоў ці характару змянення дагавора, а пры скасаванні ці змяненні дагавора ў судовым парадку – з моманту ўступлення ў законную сілу рашэння суда аб скасаванні ці змяненні дагавора.

4. Бакі не маюць права патрабаваць вяртання таго, што было выканана імі па абавязацельстве да моманту скасавання ці змянення дагавора, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам ці пагадненнем бакоў.

5. Калі падставай для скасавання ці змянення дагавора паслужыла істотнае парушэнне дагавора адным з бакоў, іншы бок мае права патрабаваць пакрыцця страт, прычыненых скасаваннем ці змяненнем дагавора.

РАЗДЗЕЛ IV
АСОБНЫЯ ВІДЫ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ

ГЛАВА 30
КУПЛЯ-ПРОДАЖ

§ 1. Агульныя палажэнні аб куплі-продажы

Артыкул 424. Дагавор куплі-продажу

1. Паводле дагавора куплі-продажу адзін бок (прадавец) абавязваецца перадаць маёмасць (рэч, тавар) ва ўласнасць, гаспадарчае распараджэнне,

аператыўнае кіраванне (далей для мэт гэтага раздзела – ва ўласнасць, калі з сутнасці абавязацельства і статусу боку ў абавязацельстве не вынікае іншае) іншаму боку (пакупніку), а пакупнік абавязваецца прыняць гэту маёмасць і заплаціць за яе пэўную грашовую суму (цану).

2. Да куплі-продажу каштоўных папер і валютных каштоўнасцей палажэнні, прадугледжаныя гэтым параграфам, прымяняюцца, калі заканадаўствам не ўстаноўлены спецыяльныя правілы іх продажу.

3. У выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства, асаблівасці куплі і продажу тавараў асобных відаў вызначаюцца актамі заканадаўства.

4. Палажэнні, прадугледжаныя гэтым параграфам, прымяняюцца да продажу маёмасных правоў, калі іншае не вынікае са зместу ці характару гэтых правоў.

5. Да асобных відаў дагавора куплі-продажу (рознічная купля-продаж, пастаўка тавараў, пастаўка тавараў для дзяржаўных патрэб, энергазабеспячэнне, кантрактацыя, продаж нерухомасці, продаж прадпрыемства) палажэнні, прадугледжаныя гэтым параграфам, прымяняюцца, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства аб гэтых відах дагавораў.

Артыкул 425. Умова дагавора аб тавары

1. Таварам паводле дагавора куплі-продажу могуць быць любыя рэчы з прытрымліваннем правілаў артыкула 129 гэтага Кодэкса.

2. Дагавор можа быць заключаны на куплю-продаж тавару, які ёсць у наяўнасці ў прадаўца ў момант заключэння дагавора, а таксама тавару, які будзе створаны ці набыты прадаўцом у будучыні, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам ці не вынікае з характару тавару.

3. Умова дагавора куплі-продажу аб тавары лічыцца ўзгодненай, калі дагавор дазваляе вызначыць найменне і колькасць тавару.

Артыкул 426. Абавязкі прадаўца па перадачы тавару

1. Прадавец абавязаны перадаць пакупніку тавар, прадугледжаны дагаворам куплі-продажу.

2. Калі іншае не прадугледжана дагаворам, прадавец абавязаны адначасова з перадачай тавару перадаць пакупніку яго прыладдзе, а таксама дакументы, якія адносяцца да яго (тэхнічны пашпарт, сертыфікат якасці, інструкцыю па эксплуатацыі і да т.п.), прадугледжаныя заканадаўствам ці дагаворам.

Артыкул 427. Тэрмін выканання абавязку перадаць тавар

1. Тэрмін выканання прадаўцом абавязку перадаць тавар пакупніку вызначаецца дагаворам куплі-продажу, а калі дагавор не дазваляе вызначыць гэты тэрмін, – у адпаведнасці з правіламі, прадугледжанымі артыкулам 295 гэтага Кодэкса.

2. Дагавор куплі-продажу прызнаецца заключаным з умовай аб яго выкананні да строга вызначанага тэрміну, калі з дагавора ясна вынікае, што пры парушэнні тэрміну яго выканання пакупнік губляе інтарэс да дагавора.

Прадавец мае права выконваць такі дагавор да надыходу ці пасля сканчэння вызначанага ў ім тэрміну толькі са згоды пакупніка.

Артыкул 428. Момант выканання абавязку прадаўца перадаць тавар

1. Калі іншае не прадугледжана дагаворам куплі-продажу, абавязак прадаўца перадаць тавар пакупніку лічыцца выкананым у момант:

1) уручэння тавару пакупніку ці ўказанай ім асобе, калі дагаворам прадугледжаны абавязак прадаўца па дастаўцы тавару;

2) давання тавару ў распараджэнне пакупніка, калі тавар павінен быць перададзены пакупніку ці ўказанай ім асобе ў месцы знаходжання тавару. Тавар лічыцца дадзеным у распараджэнне пакупніка, калі да тэрміну, прадугледжанага дагаворам, тавар гатовы да перадачы ў належным месцы і пакупніку ў адпаведнасці з умовамі дагавора паведамлена аб гатоўнасці тавару да перадачы. Тавар не прызнаецца гатовым да перадачы, калі ён не ідэнтыфікаваны для мэт дагавора шляхам маркіроўкі ці іншым чынам.

2. У выпадках, калі з дагавора не вынікае абавязак прадаўца па дастаўцы тавару ці перадачы тавару ў месцы яго знаходжання пакупніку, абавязак прадаўца перадаць тавар пакупніку лічыцца выкананым у момант здачы тавару перавозчыку ці арганізацыі сувязі для дастаўкі пакупніку, калі дагаворам не прадугледжана іншае.

Артыкул 429. Пераход рызыкі выпадковай гібелі тавару

1. Калі іншае не прадугледжана дагаворам куплі-продажу, рызыка выпадковай гібелі ці выпадковага пашкоджання тавару пераходзіць на пакупніка з моманту, калі ў адпаведнасці з заканадаўствам ці дагаворам лічыцца, што прадавец выканаў свой абавязак па перадачы тавару пакупніку.

2. Рызыка выпадковай гібелі ці выпадковага пашкоджання тавару, прададзенага ў час яго знаходжання на шляху, пераходзіць на пакупніка з моманту заключэння дагавора, калі іншае не прадугледжана такім дагаворам.

Умова дагавора аб тым, што рызыка выпадковай гібелі ці выпадковага пашкоджання тавару пераходзіць на пакупніка з моманту здачы тавару першаму перавозчыку, па патрабаванні пакупніка можа быць прызнана судом несапраўднай, калі ў момант заключэння дагавора прадавец ведаў ці павінен быў ведаць, што тавар страчаны ці пашкоджаны, і не паведаміў аб гэтым пакупніку.

Артыкул 430. Абавязак прадаўца перадаць тавар свабодным ад правоў трэціх асоб

1. Прадавец абавязаны перадаць пакупніку тавар свабодным ад любых правоў трэціх асоб, за выключэннем выпадку, калі пакупнік пагадзіўся прыняць тавар, абцяжараны правамі трэціх асоб.

Невыкананне прадаўцом гэтага абавязку дае пакупніку права патрабаваць змяншэння цаны тавару або скасавання дагавора куплі-продажу, за выключэннем выпадку, калі будзе даказана, што пакупнік ведаў ці павінен быў ведаць аб правах трэціх асоб на гэты тавар.

2. Правілы, прадугледжаныя пунктам 1 гэтага артыкула, адпаведна прымяняюцца і ў тым выпадку, калі ў адносінах да тавару да моманту яго перадачы пакупніку меліся прэтэнзіі трэціх асоб, аб якіх прадаўцу было вядома, калі гэтыя прэтэнзіі пасля прызнаны ва ўстаноўленым парадку правамернымі.

Артыкул 431. Адказнасць прадаўца ў выпадку адабрання тавару ў пакупніка

1. Пры адабранні тавару ў пакупніка трэцімі асобамі на падставах, якія ўзніклі да выканання дагавора куплі-продажу, прадавец абавязаны кампенсаваць пакупніку панесеныя ім страты, за выключэннем выпадку, калі пакупнік ведаў ці павінен быў ведаць аб наяўнасці гэтых падстаў.

2. Пагадненне бакоў аб вызваленні прадаўца ад адказнасці ці аб яе абмежаванні ў выпадку выпатрабавання набытай маёмасці ў пакупніка трэцімі асобамі несапраўднае.

Артыкул 432. Абавязкі пакупніка і прадаўца ў выпадку прад'яўлення іску аб адабранні тавару

Калі трэцяя асоба на падставе, якая ўзнікла да выканання дагавора куплі-продажу, прад'явіць да пакупніка іск аб адабранні тавару, пакупнік абавязаны прыцягнуць прадаўца да ўдзелу ў справе, а прадавец абавязаны ўступіць у гэту справу на баку пакупніка.

Непрыцягненне пакупніком прадаўца да ўдзелу ў справе вызваляе прадаўца ад адказнасці перад пакупніком, калі прадавец дакажа, што, прыняўшы ўдзел у справе, ён мог бы прадухіліць адабранне прададзенага тавару ў пакупніка.

Прадавец, прыцягнуты пакупніком да ўдзелу ў справе, але які не прыняў у ёй удзелу, пазбаўляецца права даказваць няправільнасць вядзення справы пакупніком.

Артыкул 433. Наступствы адмовы прадаўца перадаць тавар

1. Калі прадавец адмаўляецца перадаць пакупніку прададзены тавар, пакупнік мае права адмовіцца ад выканання дагавора куплі-продажу.

2. Пры адмове прадаўца ад перадачы індывідуальна-вызначанай рэчы пакупнік мае права прад'явіць прадаўцу патрабаванні, прадугледжаныя артыкулам 369 гэтага Кодэкса.

Артыкул 434. Наступствы невыканання абавязку перадаць прыладдзе і дакументы, якія адносяцца да тавару

Калі прадавец не перадае ці адмаўляецца перадаць пакупніку прыладдзе ці дакументы, якія адносяцца да тавару і якія ён павінен перадаць у адпаведнасці з заканадаўствам ці дагаворам куплі-продажу (пункт 2 артыкула 426), пакупнік мае права прызначыць яму разумны тэрмін для іх перадачы.

У выпадку, калі прыладдзе ці дакументы, якія адносяцца да тавару, не перададзены прадаўцом ва ўказаны тэрмін, пакупнік мае права адмовіцца ад тавару, калі іншае не прадугледжана дагаворам.

Артыкул 435. Колькасць тавару

1. Колькасць тавару, які падлягае перадачы пакупніку, прадугледжваецца дагаворам куплі-продажу ў адпаведных адзінках вымярэння ці ў грашовым выражэнні. Умова аб колькасці тавару можа быць узгоднена шляхам устанаўлення ў дагаворы парадку яго вызначэння.

2. Калі дагавор не дазваляе вызначыць колькасць падлеглага перадачы тавару, дагавор не лічыцца заключаным.

Артыкул 436. Наступствы парушэння ўмовы дагавора аб колькасці

1. Калі прадавец перадаў у парушэнне ўмоў дагавора пакупніку меншую колькасць тавару, чым вызначана дагаворам куплі-продажу, пакупнік мае права, калі іншае не прадугледжана дагаворам, або запатрабаваць перадаць колькасць тавару, якой не хапае, або адмовіцца ад прададзенага тавару і яго аплаты, а калі ён аплачаны, – запатрабаваць вяртання заплачанай за яго грашовай сумы.

2. Калі прадавец перадаў пакупніку тавар у колькасці, якая перавышае ўказаную ў дагаворы, пакупнік абавязаны паведаміць аб гэтым прадаўцу ў парадку, прадугледжаным пунктам 1 артыкула 453 гэтага Кодэкса. У выпадку, калі ў разумны тэрмін пасля атрымання паведамлення пакупніка прадавец не

распарадзіцца адпаведным таварам, пакупнік мае права, паколькі іншае не прадугледжана дагаворам, прыняць усю колькасць тавару.

3. У выпадку прыняцця пакупніком тавару ў колькасці, якая перавышае ўказаную ў дагаворы куплі-продажу (пункт 2 гэтага артыкула), дадаткова прыняты тавар аплачваецца па цане, вызначанай для тавару, прынятага ў адпаведнасці з дагаворам, калі іншая цана не вызначана пагадненнем бакоў.

Артыкул 437. Асартымент тавараў

1. Калі паводле дагавора куплі-продажу перадачы падлягаюць тавары ў пэўных суадносінах па відах, мадэлях, памерах, колерах і іншых прыкметах (асартымент), прадавец абавязаны перадаць пакупніку тавары ў асартыменце, узгодненым бакамі.

2. Калі асартымент у дагаворы куплі-продажу не вызначаны і ў дагаворы не ўстаноўлены парадак яго вызначэння, але з сутнасці абавязацельства вынікае, што тавары павінны быць перададзены пакупніку ў асартыменце, прадавец мае права перадаць пакупніку тавары ў асартыменце зыходзячы з патрэб пакупніка, якія былі вядомыя прадаўцу на момант заключэння дагавора, ці адмовіцца ад выканання дагавора.

Артыкул 438. Наступствы парушэння ўмовы дагавора аб асартыменце

1. Пры перадачы прадаўцом прадугледжаных дагаворам куплі-продажу тавараў у асартыменце, не адпаведным дагавору, пакупнік мае права адмовіцца ад іх прыняцця і аплаты, а калі яны ўжо аплачаны, – запатрабаваць вяртання заплачанай грашовай сумы.

2. Калі прадавец перадаў пакупніку нароўні з таварамі, асартымент якіх адпавядае дагавору куплі-продажу, тавары з парушэннем умовы аб асартыменце, пакупнік мае права па сваім выбары:

1) прыняць тавары, якія адпавядаюць умовам аб асартыменце, і адмовіцца ад астатніх тавараў;

2) адмовіцца ад усіх перададзеных тавараў;

3) запатрабаваць замяніць тавары, не адпаведныя ўмове аб асартыменце, таварамі ў асартыменце, прадугледжаным дагаворам;

4) прыняць усе перададзеныя тавары.

3. Пры адмове ад тавараў, асартымент якіх не адпавядае ўмове дагавора куплі-продажу, ці прад'яўленні патрабавання аб замене тавараў, не адпаведных умове аб асартыменце, пакупнік мае права таксама адмовіцца ад аплаты гэтых тавараў, а калі яны аплачаны, – запатрабаваць звароту заплачанай сумы.

4. Тавары, не адпаведныя ўмове дагавора куплі-продажу аб асартыменце, лічацца прынятымі, калі пакупнік у разумны тэрмін пасля іх атрымання не паведаміць прадаўцу аб сваёй адмове ад тавараў.

5. Калі пакупнік не адмовіўся ад тавараў, асартымент якіх не адпавядае дагавору куплі-продажу, ён абавязаны іх аплаціць па цане, узгодненай з прадаўцом. У выпадку, калі прадаўцом не прыняты неабходныя меры да ўзгаднення цаны ў разумны тэрмін, пакупнік аплачвае тавары па цане, якая ў момант заключэння дагавора пры параўнальных абставінах звычайна збіралася за аналагічныя тавары.

6. Правілы гэтага артыкула прымяняюцца, калі іншае не прадугледжана дагаворам.

Артыкул 439. Якасць тавару

1. Прадавец абавязаны перадаць пакупніку тавар, якасць якога адпавядае дагавору куплі-продажу.

2. Пры адсутнасці ў дагаворы ўмоў аб якасці тавару прадавец абавязаны перадаць пакупніку тавар, прыдатны для мэт, для якіх тавар такога роду звычайна выкарыстоўваецца.

Калі пакупнік паведаміў прадаўцу пры заключэнні дагавора аб канкрэтных мэтах набыцця тавару, прадавец абавязаны перадаць пакупніку тавар, прыдатны для выкарыстання ў адпаведнасці з гэтымі мэтамі.

3. Пры продажы тавару па ўзоры і (ці) па апісанні прадавец абавязаны перадаць пакупніку тавар, які адпавядае ўзору і (ці) апісанню.

4. Калі ў адпаведнасці з заканадаўствам ці іншымі абавязковымі правіламі прадугледжаны патрабаванні да якасці тавару, які прадаецца, то прадавец, які ажыццяўляе прадпрымальніцкую дзейнасць, абавязаны перадаць пакупніку тавар, які адпавядае гэтым патрабаванням.

Па пагадненні паміж прадаўцом і пакупніком можа быць перададзены тавар, які адпавядае павышаным патрабаванням да якасці ў параўнанні з патрабаваннямі, прадугледжанымі заканадаўствам ці іншымі абавязковымі правіламі.

Артыкул 440. Гарантыя якасці

1. Тавар, які прадавец абавязаны перадаць пакупніку, павінен адпавядаць патрабаванням, прадугледжаным артыкулам 439 гэтага Кодэкса, у момант перадачы пакупніку, калі іншы момант вызначэння адпаведнасці тавару гэтым патрабаванням не прадугледжаны дагаворам куплі-продажу, і ў межах разумнага тэрміну павінен быць прыдатным для мэт, для якіх тавар такога роду звычайна выкарыстоўваецца.

2. Калі ў адпаведнасці з заканадаўствам ці іншымі абавязковымі правіламі або дагаворам куплі-продажу прадугледжана даванне прадаўцом гарантыі якасці тавару, прадавец абавязаны перадаць пакупніку тавар, які павінен адпавядаць патрабаванням, прадугледжаным артыкулам 439 гэтага Кодэкса, на працягу каляндарнага тэрміну, устаноўленага ў днях, месяцах, гадах, або напрацоўкі, устаноўленай у гадзінах, цыклах дзейнічанняў, кіламетрах прабегу ці іншых аналагічных паказчыках (гарантыйнага тэрміну).

3. Гарантыя якасці тавару распаўсюджваецца і на ўсе часткі, якія складаюць яго (камплектуючыя вырабы), калі іншае не прадугледжана дагаворам куплі-продажу.

Артыкул 441. Вылічэнне гарантыйнага тэрміну

1. Гарантыйны тэрмін пачынае ісці з моманту перадачы тавараў пакупніку (артыкул 428), калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам куплі-продажу.

2. Калі пакупнік пазбаўлены магчымасці выкарыстоўваць тавар, у адносінах да якога дагаворам устаноўлены гарантыйны тэрмін, з-за абставін, якія залежаць ад прадаўца, гарантыйны тэрмін не пачынаецца да ліквідацыі адпаведных абставін прадаўцом.

Калі іншае не прадугледжана дагаворам, гарантыйны тэрмін працягваецца на час, на працягу якога тавар не мог выкарыстоўвацца з-за выяўленых у ім недахопаў, пры ўмове паведамлення прадаўцу аб недахопах тавару ў парадку, устаноўленым артыкулам 453 гэтага Кодэкса.

3. Калі іншае не прадугледжана дагаворам, гарантыйны тэрмін на камплектуючы выраб лічыцца роўным гарантыйнаму тэрміну на асноўны выраб і пачынае ісці адначасова з гарантыйным тэрмінам на асноўны выраб.

4. На тавар (камплектуючы выраб), перададзены прадаўцом наўзамен тавару (камплектуючага вырабу), у якім на працягу гарантыйнага тэрміну былі выяўлены

недахопы (артыкул 446), устанаўліваецца гарантыйны тэрмін той жа працягласці, што і на заменены, калі іншае не прадугледжана дагаворам куплі-продажу.

Артыкул 442. Тэрмін прыдатнасці

1. У адпаведнасці з заканадаўствам ці іншымі абавязковымі правіламі можа быць вызначаны тэрмін, пасля сканчэння якога тавар лічыцца не прыдатным для выкарыстання па прызначэнні (тэрмін прыдатнасці).

2. Тавары, на якія ўстаноўлены тэрмін прыдатнасці, прадавец абавязаны перадаць пакупніку з такім разлікам, каб яны маглі быць выкарыстаны па прызначэнні да сканчэння тэрміну прыдатнасці.

Артыкул 443. Вылічэнне тэрміну прыдатнасці

Тэрмін прыдатнасці вызначаецца перыядам часу, які вылічаецца з дня (часу) вырабу тавару, на працягу якога ён прыдатны да выкарыстання, або датай, да надыходу якой тавар прыдатны да выкарыстання.

Артыкул 444. Праверка якасці тавару

1. Праверка якасці тавару можа быць прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам куплі-продажу. Парадак праверкі якасці тавару ўстанаўліваецца заканадаўствам ці дагаворам. Калі парадак праверкі ўстаноўлены заканадаўствам, парадак праверкі якасці тавару, які вызначаецца дагаворам, павінен адпавядаць патрабаванням заканадаўства.

2. Калі парадак праверкі якасці тавару не ўстаноўлены ў адпаведнасці з пунктам 1 гэтага артыкула, то праверка якасці тавару праводзіцца ў адпаведнасці з умовамі праверкі тавару, падлеглага перадачы паводле дагавора куплі-продажу, якія звычайна ўжываюцца.

3. Калі заканадаўствам ці дагаворам куплі-продажу прадугледжаны абавязак прадаўца праверыць якасць тавару, які перадаецца пакупніку (выпрабаванне, аналіз, агляд і да т.п.), прадавец павінен даць пакупніку доказы ажыццяўлення праверкі якасці тавару.

4. Парадак, а таксама іншыя ўмовы праверкі якасці тавару, якая праводзіцца як прадаўцом, так і пакупніком, павінны быць аднымі і тымі ж.

Артыкул 445. Наступствы перадачы тавару неналежнай якасці

1. Калі недахопы тавару не былі агавораны прадаўцом, пакупнік, якому перададзены тавар неналежнай якасці, мае права па сваім выбары запатрабаваць ад прадаўца:

1) суразмернага змяншэння пакупной цаны;

2) бязвыплатнай ліквідацыі недахопаў тавару ў разумны тэрмін;

3) пакрыцця сваіх расходаў на ліквідацыю недахопаў тавару.

2. У выпадку істотнага парушэння патрабаванняў да якасці тавару (выяўлення неадольных недахопаў, недахопаў, якія не могуць быць ліквідаваны без несуразмерных расходаў ці затрат часу ці выяўляюцца неаднаразова або праяўляюцца зноў пасля іх ліквідацыі, і іншых падобных недахопаў) пакупнік мае права па сваім выбары:

1) адмовіцца ад выканання дагавора куплі-продажу і запатрабаваць вяртання заплачанай за тавар грашовай сумы;

2) запатрабаваць замены тавару неналежнай якасці на тавар, які адпавядае дагавору.

3. Патрабаванні аб ліквідацыі недахопаў ці замене тавару, указаныя ў пунктах 1 і 2 гэтага артыкула, могуць быць прад'яўлены пакупнікам, калі іншае не вынікае з характару тавару ці сутнасці абавязацельства.

4. У выпадку неналежнай якасці часткі тавараў, якія ўваходзяць у камплект (артыкул 449), пакупнік мае права ў адносінах да гэтых тавараў ажыццявіць правы, прадугледжаныя пунктамі 1 і 2 гэтага артыкула.

5. Правілы, прадугледжаныя гэтым артыкулам, прымяняюцца, калі гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства не ўстаноўлена іншае.

Артыкул 446. Недахопы тавару, за якія адказвае прадавец

1. Прадавец адказвае за недахопы тавару, калі пакупнік дакажа, што недахопы тавару ўзніклі да яго перадачы пакупніку ці з-за прычын, якія ўзніклі да гэтага моманту.

2. У адносінах да тавару, на які прадаўцом дадзена гарантыя якасці, прадавец адказвае за недахопы тавару, калі не дакажа, што недахопы тавару ўзніклі пасля яго перадачы пакупніку ў выніку парушэння пакупніком правілаў карыстання таварам ці яго захоўвання, або дзеянняў трэціх асоб, або непераадольнай сілы.

Артыкул 447. Тэрміны выяўлення недахопаў у перададзеным тавары

1. Калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам ці дагаворам куплі-продажу, пакупнік мае права прад'явіць патрабаванні, звязаныя з недахопамі тавару, пры ўмове, што яны выяўлены ў тэрміны, устаноўленыя гэтым артыкулам.

2. Калі на тавары не ўстаноўлены гарантыйны тэрмін ці тэрмін прыдатнасці, патрабаванні, звязаныя з недахопамі тавару, могуць быць прад'яўлены пакупніком пры ўмове, што недахопы ў прададзеным тавары былі выяўлены ў разумны тэрмін, але ў межах двух гадоў з дня перадачы тавару пакупніку або ў межах больш працяглага тэрміну, калі такі тэрмін устаноўлены заканадаўствам ці дагаворам куплі-продажу. Тэрмін для выяўлення недахопаў тавару, які падлягае перавозцы ці адпраўцы па пошце, вылічаецца з дня дастаўкі тавару ў месца яго прызначэння.

3. Калі на тавар устаноўлены гарантыйны тэрмін, пакупнік мае права прад'явіць патрабаванні, звязаныя з недахопамі тавару, пры выяўленні недахопаў на працягу гарантыйнага тэрміну.

У выпадках, калі на камплектуючы выраб у дагаворы куплі-продажу ўстаноўлены гарантыйны тэрмін меншай працягласці, чым на асноўны выраб, пакупнік мае права прад'явіць патрабаванні, звязаныя з недахопамі камплектуючага вырабу, пры іх выяўленні на працягу гарантыйнага тэрміну на асноўны выраб.

Калі на камплектуючы выраб у дагаворы ўстаноўлены гарантыйны тэрмін большай працягласці, чым гарантыйны тэрмін на асноўны выраб, пакупнік мае права прад'явіць патрабаванні, звязаныя з недахопамі тавару, калі недахопы камплектуючага вырабу выяўлены на працягу гарантыйнага тэрміну на яго, незалежна ад сканчэння гарантыйнага тэрміну на асноўны выраб.

4. У адносінах да тавару, на які ўстаноўлены тэрмін прыдатнасці, пакупнік мае права прад'явіць патрабаванні, звязаныя з недахопамі тавару, калі яны выяўлены на працягу тэрміну прыдатнасці тавару.

5. У выпадках, калі прадугледжаны дагаворам гарантыйны тэрмін складае менш двух гадоў і недахопы тавару выяўлены пакупніком пасля сканчэння гарантыйнага тэрміну, але ў межах двух гадоў з дня перадачы тавару пакупніку, прадавец нясе адказнасць, калі пакупнік дакажа, што недахопы тавару ўзніклі да перадачы тавару пакупніку ці з-за прычын, якія ўзніклі да гэтага моманту.

Артыкул 448. Камплектнасць тавару

1. Прадавец абавязаны перадаць пакупніку тавар, які адпавядае ўмовам дагавора куплі-продажу аб камплектнасці.

2. У выпадку, калі дагаворам куплі-продажу не вызначана камплектнасць тавару, прадавец абавязаны перадаць пакупніку тавар, камплектнасць якога вызначаецца патрабаваннямі, якія звычайна прад'яўляюцца.

Артыкул 449. Камплект тавараў

1. Калі дагаворам куплі-продажу прадугледжаны абавязак прадаўца перадаць пакупніку пэўны набор тавараў у камплекце (камплект тавараў), абавязацельства лічыцца выкананым з моманту перадачы ўсіх тавараў, уключаных у камплект.

2. Калі іншае не прадугледжана дагаворам і не вынікае з сутнасці абавязацельства, прадавец абавязаны перадаць пакупніку ўсе тавары, якія ўваходзяць у камплект, адначасова.

Артыкул 450. Наступствы перадачы некамплектных тавараў

1. У выпадку перадачы некамплектнага тавару (артыкул 448) пакупнік мае права па сваім выбары запатрабаваць ад прадаўца:

1) суразмернага змяншэння пакупной цаны;

2) даўкамплектавання тавару ў разумны тэрмін.

2. Калі прадавец у разумны тэрмін не выканаў патрабаванні пакупніка аб даўкамплектаванні тавару, пакупнік мае права па сваім выбары:

1) запатрабаваць замены некамплектнага тавару на камплектны;

2) адмовіцца ад выканання дагавора куплі-продажу і запатрабаваць вяртання заплачанай грашовай сумы.

3. Наступствы, прадугледжаныя пунктамі 1 і 2 гэтага артыкула, прымяняюцца і ў выпадку парушэння прадаўцом абавязку перадаць пакупніку камплект тавараў (артыкул 449), калі іншае не прадугледжана дагаворам куплі-продажу і не вынікае з сутнасці абавязацельства.

Артыкул 451. Тара і ўпакоўка

1. Калі іншае не прадугледжана дагаворам куплі-продажу і не вынікае з сутнасці абавязацельства, прадавец абавязаны перадаць пакупніку тавар у тары і (ці) упакоўцы, за выключэннем тавару, які па сваім характары не патрабуе затарвання і (ці) упакоўкі.

2. Калі дагаворам не вызначаны патрабаванні да тары і ўпакоўкі, то тавар павінен быць затараны і (ці) упакаваны звычайным для такога тавару спосабам, а пры адсутнасці гэтакага – спосабам, які забяспечвае захаванасць тавараў такога роду пры звычайных умовах захоўвання і транспартавання.

3. Калі ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку прадугледжаны абавязковыя патрабаванні да тары і (ці) упакоўкі, то прадавец, які ажыццяўляе прадпрымальніцкую дзейнасць, абавязаны перадаць пакупніку тавар у тары і (ці) упакоўцы, якія адпавядаюць гэтым абавязковым патрабаванням.

Артыкул 452. Наступствы перадачы тавару без тары і (ці) упакоўкі або ў неналежнай тары і (ці) упакоўцы

1. У выпадках, калі падлеглы затарванню і (ці) упакоўцы тавар перадаецца пакупніку без тары і (ці) упакоўкі або ў неналежнай тары і (ці) упакоўцы, пакупнік мае права запатрабаваць ад прадаўца затарыць і (ці) упакаваць тавар або замяніць неналежную тару і (ці) упакоўку, калі іншае не вынікае з сутнасці абавязацельства ці характару тавару.

2. У выпадках, прадугледжаных пунктам 1 гэтага артыкула, пакупнік мае права замест прад'яўлення прадаўцу патрабаванняў, указаных у гэтым пункце, прад'явіць да яго патрабаванні, якія вынікаюць з перадачы тавару неналежнай якасці (артыкул 445).

Артыкул 453. Паведамленне прадаўцу аб неналежным выкананні дагавора

1. Пакупнік абавязаны паведаміць прадаўцу аб парушэнні ўмоў дагавора куплі-продажу аб колькасці, аб асартыменце, аб якасці, камплектнасці, тары і (ці) упакоўцы тавару ў тэрмін, прадугледжаны заканадаўствам ці дагаворам, а калі такі тэрмін не ўстаноўлены, – у разумны тэрмін пасля таго, як парушэнне адпаведнай умовы дагавора павінна было быць выяўлена, зыходзячы з характару і прызначэння тавару.

2. У выпадку невыканання правіла, прадугледжанага пунктам 1 гэтага артыкула, прадавец мае права адмовіцца поўнасцю ці часткова ад задавальнення патрабаванняў пакупніка аб перадачы яму колькасці тавару, якой не хапае, замене тавару, які не адпавядае ўмовам дагавора куплі-продажу аб якасці ці аб асартыменце, аб ліквідацыі недахопаў тавару, аб даўкамплектаванні тавару ці аб замене некамплектнага тавару на камплектны, аб затарванні і (ці) упакоўцы тавару або аб замене неналежнай тары і (ці) упакоўкі тавару, калі дакажа, што невыкананне гэтага правіла пакупніком пацягнула за сабой немагчымасць забяспечыць яго патрабаванні ці цягне за сабой для прадаўца несувымерныя расходы ў параўнанні з тымі, якія ён панёс бы, калі б быў своечасова апавешчаны аб парушэнні ўмоў дагавора.

3. Калі прадавец ведаў ці павінен быў ведаць аб тым, што перададзеныя пакупніку тавары не адпавядаюць умовам дагавора куплі-продажу, ён не мае права спасылацца на палажэнні, прадугледжаныя пунктамі 1 і 2 гэтага артыкула.

Артыкул 454. Абавязак пакупніка прыняць тавар

1. Пакупнік абавязаны прыняць перададзены яму тавар, за выключэннем выпадкаў, калі ён паводле акта заканадаўства ці дагавора мае права запатрабаваць замены тавару ці адмовіцца ад выканання дагавора куплі-продажу.

2. Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам куплі-продажу, пакупнік абавязаны здзейсніць дзеянні, якія ў адпаведнасці з патрабаваннямі, што звычайна прад'яўляюцца, неабходныя з яго боку для забеспячэння перадачы і атрымання адпаведнага тавару.

3. У выпадках, калі пакупнік у парушэнне заканадаўства ці дагавора не прымае ці адмаўляецца прыняць тавар, прадавец мае права адмовіцца ад выканання дагавора.

Артыкул 455. Цана тавару

1. Пакупнік абавязаны аплаціць тавар па цане, прадугледжанай дагаворам куплі-продажу (калі іншае не прадугледжана заканадаўствам), або, калі яна дагаворам не прадугледжана і не можа быць вызначана зыходзячы з яго ўмоў, – па цане, якая вызначаецца ў адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 394 гэтага Кодэкса, а

таксама здзейсніць за свой кошт дзеянні, якія ў адпаведнасці з заканадаўствам, дагаворам ці патрабаваннямі, што звычайна прад'яўляюцца, неабходныя для ажыццяўлення плацяжу.

2. Калі цана ўстаноўлена ў залежнасці ад вагі тавару, яна вызначаецца па вазе нета, калі іншае не прадугледжана дагаворам куплі-продажу.

3. Калі дагавор куплі-продажу прадугледжвае, што цана тавару падлягае змяненню ў залежнасці ад паказчыкаў, якія абумоўліваюць цану тавару (сабекошт, затраты і да т. п.), але пры гэтым не вызначаны спосаб перагляду цаны, цана вызначаецца зыходзячы з суадносін гэтых паказчыкаў на момант заключэння дагавора і на момант перадачы тавару. Пры пратэрміноўцы прадаўцом выканання абавязку перадаць тавар цана вызначаецца зыходзячы з суадносін гэтых паказчыкаў на момант заключэння дагавора і на момант перадачы тавару, прадугледжаны дагаворам, а калі ён дагаворам не прадугледжаны, – на момант, вызначаны ў адпаведнасці з артыкулам 295 гэтага Кодэкса.

Правілы, прадугледжаныя гэтым пунктам, прымяняюцца, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам, іншымі актамі заканадаўства ці дагаворам або не вынікае з сутнасці абавязацельства.

Артыкул 456. Аплата тавару

1. Пакупнік абавязаны аплаціць тавар непасрэдна да ці пасля перадачы яму прадаўцом тавару, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам, іншымі актамі заканадаўства ці дагаворам куплі-продажу або не вынікае з сутнасці абавязацельства.

2. Калі дагаворам не прадугледжана растэрміноўка ў аплаце перададзенага тавару, пакупнік абавязаны выплаціць прадаўцу цану перададзенага тавару поўнасцю.

3. Калі пакупнік своечасова не аплачвае перададзены ў адпаведнасці з дагаворам тавар, прадавец мае права запатрабаваць аплаты тавару і выплаты працэнтаў у адпаведнасці з артыкулам 366 гэтага Кодэкса.

4. Калі пакупнік у парушэнне дагавора адмаўляецца прыняць і аплаціць тавар, прадавец мае права па сваім выбары запатрабаваць аплаты тавару або адмовіцца ад выканання дагавора.

5. У выпадках, калі прадавец у адпаведнасці з дагаворам абавязаны перадаць пакупніку не толькі тавары, якія пакупніком не аплачаны, але і іншыя тавары, прадавец мае права прыпыніць перадачу гэтых тавараў да поўнай аплаты ўсіх раней перададзеных тавараў, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам.

Артыкул 457. Папярэдняя аплата тавару

1. У выпадках, калі дагаворам куплі-продажу прадугледжаны абавязак пакупніка выплаціць цану поўнасцю ці часткова да перадачы прадаўцом тавару (папярэдняя аплата), пакупнік павінен зрабіць аплату ў тэрмін, прадугледжаны дагаворам, а калі такі тэрмін дагаворам не прадугледжаны, – у тэрмін, вызначаны ў адпаведнасці з артыкулам 295 гэтага Кодэкса.

2. У выпадку невыканання пакупніком абавязку папярэдне аплаціць тавар прымяняюцца правілы, прадугледжаныя артыкулам 309 гэтага Кодэкса.

3. У выпадках, калі прадавец, які атрымаў суму папярэдняй аплаты, не выконвае свае абавязкі па перадачы тавару ва ўстаноўлены тэрмін (артыкул 427), пакупнік мае права запатрабаваць перадачы аплачанага тавару ці вяртання сумы папярэдняй аплаты за тавар, не перададзены прадаўцом.

4. У выпадку, калі прадавец не выконвае абавязак па перадачы папярэдне аплачанага тавару і іншае не прадугледжана дагаворам куплі-продажу, на суму папярэдняй аплаты падлягаюць выплаце працэнты ў адпаведнасці з артыкулам 366 гэтага Кодэкса з дня, калі паводле дагавора перадача тавару павінна была быць праведзена, па дзень перадачы тавару пакупніку ці вяртання яму папярэдне выплачанай ім сумы. Дагаворам можа быць прадугледжаны абавязак прадаўца выплачваць працэнты на суму папярэдняй аплаты пачынаючы з дня атрымання гэтай сумы ад пакупніка.

Артыкул 458. Аплата тавару, прададзенага ў крэдыт

1. У выпадках, калі дагаворам куплі-продажу прадугледжана аплата тавару праз вызначаны час пасля яго перадачы пакупніку (продаж тавару ў крэдыт), пакупнік павінен зрабіць аплату ў тэрмін, прадугледжаны дагаворам, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам, а калі такі тэрмін дагаворам ці заканадаўствам не прадугледжаны, – у тэрмін, вызначаны ў адпаведнасці з артыкулам 295 гэтага Кодэкса.

2. У выпадку невыканання прадаўцом абавязку па перадачы тавару прымяняюцца правілы, прадугледжаныя артыкулам 309 гэтага Кодэкса.

3. У выпадках, калі пакупнік, які атрымаў тавар, не выконвае абавязак па яго аплаце ва ўстаноўлены дагаворам тэрмін, прадавец мае права запатрабаваць аплаты перададзенага тавару ці вяртання неаплачаных тавараў.

4. У выпадках, калі пакупнік не выконвае абавязак па аплаце перададзенага тавару ва ўстаноўлены дагаворам тэрмін і іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам, іншымі актамі заканадаўства ці дагаворам куплі-продажу, на пратэрмінаваную суму падлягаюць выплаце працэнты ў адпаведнасці з артыкулам 366 гэтага Кодэкса з дня, калі паводле дагавора тавар павінен быў быць аплачаны, па дзень аплаты тавару пакупніком. Дагаворам можа быць прадугледжаны абавязак пакупніка выплачваць працэнты на суму, якая адпавядае цане тавару, пачынаючы з дня перадачы тавару прадаўцом.

5. Калі іншае не прадугледжана дагаворам, з моманту перадачы тавару пакупніку і да яго аплаты тавар, прададзены ў крэдыт, прызнаецца таварам, што знаходзіцца ў закладзе ў прадаўца для забеспячэння выканання пакупніком яго абавязку па аплаце тавару.

Артыкул 459. Аплата тавару ў растэрміноўку

1. Дагаворам аб продажу тавару ў крэдыт можа быць прадугледжана аплата тавару ў растэрміноўку.

Дагавор аб продажы тавару ў крэдыт з умовай аб растэрміноўцы выплаты лічыцца заключаным, калі ў ім нароўні з іншымі істотнымі ўмовамі дагавора куплі-продажу ўказаны цана тавару, парадак, тэрміны і памеры выплат.

2. Калі пакупнік не праводзіць ва ўстаноўлены дагаворам тэрмін чарговую выплату за прададзены ў растэрміноўку і перададзены яму тавар, прадавец мае права адмовіцца ад выканання дагавора і запатрабаваць вяртання прададзенага тавару, за выключэннем выпадкаў, калі сума выплат, атрыманых ад пакупніка, перавышае палову цаны тавару.

3. Да дагавора аб продажы тавару з умовай аб растэрміноўцы плацяжу прымяняюцца правілы, прадугледжаныя пунктамі 2, 4 і 5 артыкула 458 гэтага Кодэкса.

Артыкул 460. Страхаванне тавару

Дагаворам куплі-продажу можа быць прадугледжаны абавязак прадаўца ці пакупніка страхаваць тавар.

У выпадках, калі бок, абавязаны страхаваць тавар, не ажыццяўляе страхавання ў адпаведнасці з умовамі дагавора, іншы бок мае права застрахаваць тавар і запатрабаваць ад абавязанага боку пакрыцця расходаў на страхаванне або адмовіцца ад выканання дагавора.

Артыкул 461. Захаванне права ўласнасці за прадаўцом

У выпадках, калі дагаворам куплі-продажу прадугледжана, што права ўласнасці на перададзены пакупніку тавар захоўваецца за прадаўцом да аплаты тавару ці надыходу іншых абставін, пакупнік не мае права да пераходу да яго права ўласнасці адчужаць тавар ці распараджацца ім іншым чынам, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам або не вынікае з прызначэння і ўласцівасцей тавару.

У выпадках, калі ў тэрмін, прадугледжаны дагаворам, перададзены тавар не будзе аплачаны ці не настануць іншыя абставіны, пры якіх права ўласнасці пераходзіць да пакупніка, прадавец мае права запатрабаваць ад пакупніка вярнуць яму тавар, калі іншае не прадугледжана дагаворам.

§ 2. Рознічная купля-продаж

Артыкул 462. Дагавор рознічнай куплі-продажу

1. Паводле дагавора рознічнай куплі-продажу прадавец, які ажыццяўляе прадпрымальніцкую дзейнасць па продажы тавараў у розніцу, або асоба, якая ажыццяўляе рамесную дзейнасць ці рэалізацыю тавараў на рынках ці ў іншых вызначаных мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі месцах, у тым ліку разавую рэалізацыю, абавязваецца перадаць пакупніку тавар, прызначаны для асабістага, сямейнага, хатняга ці іншага выкарыстання, не звязанага з прадпрымальніцкай дзейнасцю.

2. Дагавор рознічнай куплі-продажу з'яўляецца публічным дагаворам (артыкул 396).

3. Да адносін паводле дагавора рознічнай куплі-продажу з удзелам пакупніка-грамадзяніна, не ўрэгуляваных гэтым Кодэксам, прымяняецца заканадаўства аб абароне правоў спажыўцоў.

Артыкул 463. Форма дагавора рознічнай куплі-продажу

Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам рознічнай куплі-продажу, у тым ліку ўмовамі фармуляраў ці іншых стандартных формаў, да якіх далучаецца пакупнік (артыкул 398), дагавор рознічнай куплі-продажу лічыцца заключаным у належнай форме з моманту выдачы прадаўцом пакупніку касавага ці таварнага чэка або іншага дакумента, які пацвярджае аплату тавару. Адсутнасць у пакупніка ўказаных дакументаў не пазбаўляе яго магчымасці спасылацца на паказанні сведак у пацвярджэнне факта заключэння дагавора і яго ўмоў.

Артыкул 464. Публічная аферта тавару

1. Прапанова тавару ў яго рэкламе, каталогах і апісаннях тавараў, звернутых да нявызначанага кола асоб, прызнаецца публічнай афертай (пункт 2 артыкула 407), калі яна ўтрымлівае ўсе істотныя ўмовы дагавора рознічнай куплі-продажу.

2. Выстаўленне ў месцы продажу (на прылаўках, у вітрынах і да т. п.) тавараў, дэманстрацыя іх узораў ці даванне звестак аб таварах, якія прадаюцца, (апісанняў,

каталогаў, фотаздымкаў тавараў і да т.п.) у месцы іх продажу прызнаецца публічнай афертай незалежна ад таго, ці ўказаны цана і іншыя істотныя ўмовы дагавора рознічнай куплі-продажу, за выключэннем выпадку, калі прадавец яўна вызначыў, што адпаведныя тавары не прызначаны для продажу.

Артыкул 465. Даванне пакупніку інфармацыі аб тавары

1. Прадавец абавязаны даць пакупніку неабходную і дакладную інфармацыю аб тавары, што прапануецца да продажу, якая адпавядае патрабаванням, што ўстаноўлены заканадаўствам і звычайна прад'яўляюцца ў рознічным гандлі да зместу і спосабаў давання такой інфармацыі.

2. Пакупнік мае права да заключэння дагавора рознічнай куплі-продажу агледзець тавар, запатрабаваць правядзення ў яго прысутнасці праверкі ўласцівасцей ці дэманстрацыі выкарыстання тавару, калі гэта не выключана з прычыны характару тавару і не супярэчыць правілам, прынятым у рознічным гандлі.

3. Калі пакупніку не дадзена магчымасць неадкладна атрымаць у месцы продажу інфармацыю аб тавары, указаную ў пунктах 1 і 2 гэтага артыкула, ён мае права запатрабаваць ад прадаўца пакрыцця страт, выкліканых неабгрунтаваным ухіленнем ад заключэння дагавора рознічнай куплі-продажу (пункт 4 артыкула 415), а калі дагавор заключаны, – у разумны тэрмін адмовіцца ад выканання дагавора, запатрабаваць вяртання заплачанай за тавар сумы і пакрыцця іншых страт.

4. Прадавец, які не даў пакупніку магчымасці атрымаць адпаведную інфармацыю аб тавары, нясе адказнасць і за тыя недахопы тавару, якія ўзніклі пасля яго перадачы пакупніку, у адносінах да якіх пакупнік дакажа, што яны ўзніклі ў сувязі з адсутнасцю ў яго такой інфармацыі.

Артыкул 466. Дагавор рознічнай куплі-продажу з умовай аб прыняцці пакупніком тавару ў вызначаны тэрмін

Бакі могуць заключыць дагавор рознічнай куплі-продажу з умовай аб прыняцці пакупніком тавару ў вызначаны дагаворам тэрмін, на працягу якога гэты тавар не можа быць прададзены іншаму пакупніку.

Калі іншае не прадугледжана дагаворам, няяўка пакупніка ці неўчыненне іншых неабходных дзеянняў для прыняцця тавару ў вызначаны дагаворам тэрмін можа разглядацца прадаўцом у якасці адмовы пакупніка ад выканання дагавора.

Дадатковыя расходы прадаўца па забеспячэнні перадачы тавару пакупніку ў вызначаны дагаворам тэрмін уключаюцца ў цану тавару, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам.

Артыкул 467. Продаж тавараў па ўзорах

1. Дагавор рознічнай куплі-продажу можа быць заключаны на падставе азнаямлення пакупніка з узорам тавару (яго апісаннем, каталогам тавараў і да т. п.), прапанаваным прадаўцом.

2. Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам, дагавор рознічнай куплі-продажу тавару па ўзоры лічыцца выкананым з моманту дастаўкі тавару ў месца, указанае ў дагаворы, а калі месца перадачы тавару дагаворам не

вызначана, – з моманту дастаўкі тавару пакупніку па месцы жыхарства грамадзяніна ці месцы знаходжання юрыдычнай асобы.

3. Пакупнік мае права адмовіцца ад выканання дагавора рознічнай куплі-продажу да перадачы тавару пры ўмове пакрыцця прадаўцу неабходных расходаў, панесеных у сувязі са здзяйсненнем дзеянняў для выканання дагавора.

Артыкул 468. Продаж тавараў з выкарыстаннем аўтаматаў

1. У выпадках, калі тавары прадаюцца з выкарыстаннем аўтаматаў, уладальнік аўтаматаў абавязаны давесці да пакупнікоў інфармацыю аб прадаўцу тавараў шляхам змяшчэння яе на аўтамаце ці давання пакупнікам іншым спосабам звестак аб найменні (фірменным найменні) прадаўца, месцы яго знаходжання, рэжыме работы, а таксама аб дзеяннях, якія трэба зрабіць пакупніку для атрымання тавару.

2. Дагавор рознічнай куплі-продажу з выкарыстаннем аўтаматаў лічыцца заключаным з моманту здзяйснення пакупніком дзеянняў, неабходных для атрымання тавару.

3. Калі пакупніку не выдаецца аплачаны тавар, прадавец абавязаны па патрабаванні пакупніка неадкладна выдаць пакупніку тавар ці вярнуць заплачаную ім суму.

4. У выпадках, калі аўтамат выкарыстоўваецца для размену грошай, набыцця знакаў аплаты ці абмену валюты, прымяняюцца правілы аб рознічнай куплі-продажу, калі іншае не вынікае з сутнасці абавязацельства.

Артыкул 469. Продаж тавару з умовай яго дастаўкі пакупніку

1. У выпадку, калі дагавор рознічнай куплі-продажу заключаны з умовай дастаўкі тавару пакупніку, прадавец абавязаны ва ўстаноўлены дагаворам тэрмін даставіць тавар у месца, указанае пакупніком, а калі месца дастаўкі тавару пакупніком не ўказана, – у месца жыхарства грамадзяніна ці месца знаходжання юрыдычнай асобы, якая з'яўляецца пакупніком.

2. Дагавор рознічнай куплі-продажу лічыцца выкананым з моманту ўручэння тавару пакупніку, а пры яго адсутнасці – любой асобе, якая прад'явіла квітанцыю ці іншы дакумент, які сведчыць аб заключэнні дагавора ці аб афармленні дастаўкі тавару, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам або не вынікае з сутнасці абавязацельства.

3. У выпадках, калі дагаворам рознічнай куплі-продажу не вызначаны час дастаўкі тавару для ўручэння яго пакупніку, тавар павінен быць дастаўлены ў разумны тэрмін пасля атрымання патрабавання пакупніка.

Артыкул 470. Цана і аплата тавару

1. Пакупнік абавязаны аплаціць тавар па цане, аб'яўленай прадаўцом у момант заключэння дагавора рознічнай куплі-продажу, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці не вынікае з сутнасці абавязацельства.

2. У выпадку, калі дагаворам рознічнай куплі-продажу прадугледжана папярэдняя аплата тавару (артыкул 457), неаплата пакупніком тавару ва ўстаноўлены дагаворам тэрмін прызнаецца адмовай пакупніка ад выканання дагавора, калі іншае не прадугледжана пагадненнем бакоў.

3. Да дагавораў рознічнай куплі-продажу тавараў у крэдыт, у тым ліку з умовай аплаты пакупніком тавараў у растэрміноўку, не падлягаюць прымяненню правілы, прадугледжаныя пунктам 4 артыкула 458 гэтага Кодэкса.

Пакупнік мае права аплаціць тавар у любы час у межах устаноўленага дагаворам перыяду растэрміноўкі аплаты тавару.

Артыкул 471. Дагавор найму-продажу

Дагаворам можа быць прадугледжана, што да пераходу права ўласнасці на тавар да пакупніка (артыкул 461) пакупнік з'яўляецца наймальнікам (арандатарам) перададзенага яму тавару (дагавор найму-продажу).

Калі іншае не прадугледжана дагаворам, пакупнік становіцца ўласнікам тавару з моманту яго аплаты.

Артыкул 472. Абмен тавараў належнай якасці

1. Пакупнік мае права на працягу чатырнаццаці дзён з моманту перадачы яму непрадуктовага тавару, калі больш працяглы тэрмін не аб'яўлены прадаўцом, замяніць куплены тавар у месцы куплі і іншых месцах, аб'яўленых прадаўцом, на аналагічны тавар іншага памеру, формы, габарыту, фасону, расфарбоўкі ці камплектацыі, зрабіўшы ў выпадку розніцы ў цане неабходны пераразлік з прадаўцом.

Пры адсутнасці ў прадаўца неабходнага для абмену тавару пакупнік мае права вярнуць набыты тавар прадаўцу і атрымаць заплачаную за яго грашовую суму.

Патрабаванне пакупніка аб абмене або звароце тавару падлягае задавальненню, калі тавар не быў у выкарыстанні, захаваны яго спажывецкія ўласцівасці і маюцца доказы набыцця яго ў гэтага прадаўца.

Правілы гэтага пункта прымяняюцца да адносін паводле дагавора рознічнай куплі-продажу з удзелам пакупніка-грамадзяніна, калі заканадаўствам аб абароне правоў спажыўцоў не ўстаноўлены іншыя правілы.

2. Пералік тавараў, якія не падлягаюць абмену ці звароту на ўказаных у гэтым артыкуле падставах, вызначаецца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Артыкул 473. Правы пакупніка ў выпадку продажу яму тавару неналежнай якасці

1. Пакупнік, якому прададзены тавар неналежнай якасці, калі яго недахопы не былі агавораны прадаўцом, мае права на свой выбар запатрабаваць:

1) замены недабраякаснага тавару таварам належнай якасці;

2) суразмернага змяншэння пакупной цаны тавару;

3) неадкладнай бязвыплатнай ліквідацыі недахопаў тавару;

4) пакрыцця расходаў на ліквідацыю недахопаў тавару.

2. У выпадку выяўлення недахопаў тавару, уласцівасці якога не дазваляюць ліквідаваць гэтыя недахопы (харчовыя прадукты, тавары бытавой хіміі і да т. п.), пакупнік мае права на свой выбар запатрабаваць замены такога тавару таварам належнай якасці або суразмернага змяншэння пакупной цаны.

3. Замест прад'яўлення ўказаных у пунктах 1 і 2 гэтага артыкула патрабаванняў пакупнік мае права адмовіцца ад выканання дагавора рознічнай куплі-продажу і запатрабаваць вяртання заплачанай за тавар грашовай сумы.

Пры гэтым пакупнік на патрабаванне прадаўца і за яго кошт павінен вярнуць атрыманы тавар неналежнай якасці.

Пры вяртанні пакупніку заплачанай за тавар грашовай сумы прадавец не мае права ўтрымліваць з яе суму, на якую панізіўся кошт тавару з-за поўнага ці

частковага выкарыстання тавару, страты ім таварнага выгляду ці іншых падобных абставін.

4. У выпадку выяўлення недахопаў тэхнічна складанага тавару, які вызначаецца заканадаўствам, ці дарагога тавару пакупнік мае права прад'явіць патрабаванні, указаныя ў падпункце 1 пункта 1 і пункце 3 гэтага артыкула, на працягу трыццаці дзён з дня перадачы яму тавару. Пасля сканчэння ўказанага тэрміну такія патрабаванні могуць быць прад'яўлены пакупніком толькі ў выпадку істотнага парушэння патрабаванняў да якасці тавару (пункт 2 артыкула 445) ці парушэння прадугледжаных заканадаўствам тэрмінаў бязвыплатнай ліквідацыі недахопаў тавару.

Артыкул 474. Пакрыццё розніцы ў цане пры замене тавару, змяншэнні пакупной цаны і вяртанні тавару неналежнай якасці

1. Пры замене недабраякаснага тавару на адпаведны дагавору рознічнай куплі-продажу тавар належнай якасці прадавец не мае права патрабаваць пакрыцця розніцы паміж цаной тавару, устаноўленай дагаворам, і цаной тавару, якая існуе ў момант замены тавару ці вынясення судом рашэння аб замене тавару.

2. Пры замене недабраякаснага тавару на аналагічны, але іншы па памеры, фасоне, сорце ці іншых прыкметах тавар належнай якасці падлягае пакрыццю розніца паміж цаной заменнага тавару ў момант замены і цаной тавару, які перадаецца наўзамен тавару неналежнай якасці.

Калі патрабаванне пакупніка не задаволена прадаўцом, цана заменнага тавару і цана тавару, які перадаецца наўзамен яго, вызначаюцца на момант вынясення судом рашэння аб замене тавару.

3. У выпадку прад'яўлення патрабавання аб суразмерным змяншэнні пакупной цаны тавару ў разлік прымаецца цана тавару на момант прад'яўлення патрабавання аб уцэнцы, а калі патрабаванне пакупніка добраахвотна не задаволена, – на момант вынясення судом рашэння аб суразмерным змяншэнні цаны.

4. Пры вяртанні прадаўцу тавару неналежнай якасці пакупнік мае права запатрабаваць пакрыцця розніцы паміж цаной тавару, устаноўленай дагаворам рознічнай куплі-продажу, і цаной адпаведнага тавару на момант добраахвотнага задавальнення яго патрабавання, а калі патрабаванне добраахвотна не задаволена, – на момант вынясення судом рашэння.

Артыкул 475. Адказнасць прадаўца і выкананне абавязацельства ў натуры

У выпадку невыканання прадаўцом абавязацельства паводле дагавора рознічнай куплі-продажу пакрыццё страт і выплата няўстойкі не вызваляюць прадаўца ад выканання абавязацельства ў натуры.

§ 3. Пастаўка тавараў

Артыкул 476. Дагавор пастаўкі

Паводле дагавора пастаўкі пастаўшчык-прадавец, які ажыццяўляе прадпрымальніцкую дзейнасць, абавязваецца перадаць у абумоўлены тэрмін ці тэрміны тавары, якія вырабляюцца ці закупляюцца ім, пакупніку для выкарыстання

іх у прадпрымальніцкай дзейнасці ці ў іншых мэтах, не звязаных з асабістым, сямейным, хатнім і іншым падобным выкарыстаннем.

Артыкул 477. Урэгуляванне рознагалоссяў пры заключэнні дагавора пастаўкі

1. У выпадку, калі пры заключэнні дагавора пастаўкі паміж бакамі ўзніклі рознагалоссі па асобных умовах дагавора, бок, які прапанаваў заключыць дагавор і атрымаў ад іншага боку прапановы аб узгадненні гэтых умоў, павінен на працягу трыццаці дзён з дня атрымання гэтай прапановы, калі іншы тэрмін не ўстаноўлены заканадаўствам ці не ўзгоднены бакамі, прыняць меры для ўзгаднення адпаведных умоў дагавора або пісьмова паведаміць іншаму боку аб адмове ад яго заключэння.

2. Бок, які атрымаў прапанову па адпаведных умовах дагавора пастаўкі, але не прыняў мер для ўзгаднення ўмоў дагавора і не паведаміў іншаму боку аб адмове ад яго заключэння ў тэрмін, прадугледжаны пунктам 1 гэтага артыкула, абавязаны кампенсаваць страты, выкліканыя ўхіленнем ад узгаднення ўмоў дагавора.

Артыкул 478. Перыяды пастаўкі тавараў

1. У выпадку, калі бакамі прадугледжана пастаўка тавараў на працягу тэрміну дзеяння дагавора пастаўкі асобнымі партыямі і тэрміны пастаўкі асобных партый (перыяды пастаўкі) у ім не вызначаны, тавары павінны пастаўляцца раўнамернымі партыямі штомесячна, калі іншае не вынікае з заканадаўства ці сутнасці абавязацельства.

2. Нароўні з вызначэннем перыядаў пастаўкі ў дагаворы можа быць устаноўлены графік пастаўкі тавараў (дэкадны, сутачны, гадзінны і да т. п.).

3. Датэрміновая пастаўка тавараў можа праводзіцца са згоды пакупніка.

Тавары, пастаўленыя датэрмінова і прынятыя пакупніком, залічваюцца ў лік колькасці тавараў, якія падлягаюць пастаўцы ў наступным перыядзе.

Артыкул 479. Парадак пастаўкі тавараў

1. Пастаўшчык пастаўляе тавары шляхам адгрузкі (перадачы) тавараў пакупніку, які з'яўляецца бокам дагавора пастаўкі, ці асобе, указанай у дагаворы ў якасці атрымальніка.

2. У выпадку, калі дагаворам пастаўкі прадугледжана права пакупніка даваць пастаўшчыку ўказанні аб адгрузцы (перадачы) тавараў атрымальнікам (адгрузачныя разнарадкі), пастаўшчык адгружае (перадае) тавары атрымальнікам, указаным у адгрузачнай разнарадцы.

Змест адгрузачнай разнарадкі і тэрмін яе накіравання пакупніком пастаўшчыку вызначаюцца дагаворам. Калі тэрмін накіравання адгрузачнай разнарадкі дагаворам не прадугледжаны, яна павінна быць накіравана пастаўшчыку не пазней чым за трыццаць дзён да надыходу перыяду пастаўкі.

3. Непадача пакупніком адгрузачнай разнарадкі ва ўстаноўлены тэрмін дае пастаўшчыку права або адмовіцца ад выканання дагавора, або запатрабаваць ад пакупніка аплаты тавараў. Акрамя таго, пастаўшчык мае права запатрабаваць пакрыцця страт, прычыненых у сувязі з непадачай адгрузачнай разнарадкі.

Артыкул 480. Дастаўка тавараў

1. Пастаўшчык дастаўляе тавары шляхам адгрузкі іх транспартам, прадугледжаным дагаворам пастаўкі, і на вызначаных у дагаворы ўмовах.

У выпадках, калі ў дагаворы не вызначана, якім відам транспарту ці на якіх умовах ажыццяўляецца дастаўка, права выбару віду транспарту ці вызначэння ўмоў дастаўкі тавару належыць пастаўшчыку, калі іншае не вынікае з заканадаўства ці сутнасці абавязацельства.

2. Дагаворам пастаўкі можа быць прадугледжана атрыманне тавараў пакупніком (атрымальнікам) у месцы знаходжання пастаўшчыка (выбарка).

Калі тэрмін выбаркі не прадугледжаны дагаворам, выбарка тавараў пакупніком (атрымальнікам) павінна праводзіцца ў разумны тэрмін пасля атрымання паведамлення пастаўшчыка аб гатоўнасці тавараў.

Артыкул 481. Папаўненне недапастаўкі тавараў

1. Пастаўшчык, які дапусціў недапастаўку тавараў у асобным перыядзе пастаўкі, абавязаны дапоўніць недапастаўленую колькасць тавараў у наступным перыядзе (перыядах) у межах тэрміну дзеяння дагавора пастаўкі, калі іншае не прадугледжана дагаворам.

2. У выпадку, калі пастаўшчык адгружае тавары некалькім атрымальнікам, указаным у дагаворы пастаўкі ці адгрузачнай разнарадцы пакупніка, тавары, пастаўленыя аднаму атрымальніку звыш колькасці, прадугледжанай у дагаворы ці адгрузачнай разнарадцы, не залічваюцца ў пакрыццё недапастаўкі іншым атрымальнікам, калі іншае не прадугледжана ў дагаворы.

3. Пакупнік мае права, паведаміўшы пастаўшчыку, адмовіцца ад прыняцця тавараў, пастаўка якіх пратэрмінавана, калі ў дагаворы пастаўкі не прадугледжана іншае. Тавары, пастаўленыя да атрымання пастаўшчыком паведамлення, пакупнік абавязаны прыняць і аплаціць.

Артыкул 482. Асартымент тавараў пры папаўненні недапастаўкі

1. Асартымент тавараў, недапастаўка якіх падлягае папаўненню, вызначаецца пагадненнем бакоў. Пры адсутнасці такога пагаднення пастаўшчык абавязаны дапоўніць недапастаўленую колькасць тавараў у асартыменце, устаноўленым для таго перыяду, у якім дапушчана недапастаўка.

2. Пастаўка тавараў аднаго наймення ў большай колькасці, чым прадугледжана дагаворам пастаўкі, не залічваецца ў пакрыццё недапастаўкі тавараў іншага наймення, якія ўваходзяць у той жа асартымент, і падлягае папаўненню, акрамя выпадкаў, калі такая пастаўка праведзена з папярэдняй пісьмовай згоды пакупніка.

Артыкул 483. Прыняцце тавараў пакупніком

1. Пакупнік (атрымальнік) абавязаны зрабіць усе неабходныя дзеянні, якія забяспечваюць прыняцце тавараў, пастаўленых у адпаведнасці з дагаворам пастаўкі.

2. Прыняты пакупніком (атрымальнікам) тавар павінен быць ім агледжаны ў тэрмін, вызначаны заканадаўствам, дагаворам пастаўкі.

Пакупнік (атрымальнік) абавязаны ў гэты ж тэрмін праверыць колькасць і якасць прынятых тавараў у парадку, устаноўленым заканадаўствам ці дагаворам пастаўкі, і аб выяўленых неадпаведнасцях ці недахопах тавараў неадкладна пісьмова паведаміць пастаўшчыку.

3. У выпадку атрымання пастаўленых тавараў ад транспартнай арганізацыі пакупнік (атрымальнік) абавязаны праверыць адпаведнасць тавараў звесткам, указаным у транспартных і суправаджальных дакументах, а таксама прыняць гэтыя тавары ад транспартнай арганізацыі з прытрымліваннем правілаў, прадугледжаных заканадаўствам, якое рэгулюе дзейнасць транспарту.

Артыкул 484. Адказнае захоўванне тавару, не прынятага пакупніком

1. Калі пакупнік (атрымальнік) у адпаведнасці з заканадаўствам ці дагаворам пастаўкі адмаўляецца ад перададзенага пастаўшчыком тавару, ён абавязаны

забяспечыць захаванасць гэтага тавару (адказнае захоўванне) і неадкладна паведаміць пастаўшчыку.

2. Пастаўшчык абавязаны вывезці тавар, прыняты пакупніком (атрымальнікам) на адказнае захоўванне, ці распарадзіцца ім у разумны тэрмін.

Калі пастаўшчык у гэты тэрмін не распарадзіцца таварам, пакупнік мае права рэалізаваць тавар ці вярнуць яго пастаўшчыку.

3. Неабходныя расходы, панесеныя пакупніком у сувязі з прыняццем тавару на адказнае захоўванне, рэалізацыяй тавару ці яго вяртаннем прадаўцу, падлягаюць пакрыццю пастаўшчыком.

Пры гэтым выручка ад рэалізацыі тавару перадаецца пастаўшчыку за вылікам належнага пакупніку.

4. У выпадках, калі пакупнік без устаноўленых заканадаўствам ці дагаворам пастаўкі падстаў не прымае тавар ад пастаўшчыка ці адмаўляецца ад яго прыняцця, пастаўшчык мае права запатрабаваць ад пакупніка аплаты тавару.

Артыкул 485. Выбарка тавараў

1. Калі дагаворам пастаўкі прадугледжана выбарка тавараў пакупніком (атрымальнікам) у месцы знаходжання пастаўшчыка (пункт 2 артыкула 480), пакупнік абавязаны ажыццявіць агляд тавараў, якія перадаюцца, у месцы іх перадачы, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам, дагаворам пастаўкі ці не вынікае з сутнасці абавязацельства.

2. Нявыбарка пакупніком (атрымальнікам) тавараў ва ўстаноўлены дагаворам пастаўкі тэрмін, а пры яго адсутнасці – у разумны тэрмін пасля атрымання паведамлення пастаўшчыка аб гатоўнасці тавараў дае пастаўшчыку права адмовіцца ад выканання дагавора або запатрабаваць ад пакупніка аплаты тавараў.

Артыкул 486. Разлікі за тавары, якія пастаўляюцца

1. Пакупнік аплачвае тавары, якія пастаўляюцца, з прытрымліваннем парадку і формы разлікаў, прадугледжаных дагаворам пастаўкі. Калі пагадненнем бакоў парадак і форма разлікаў не вызначаны, то разлікі ажыццяўляюцца плацежнымі даручэннямі.

2. Калі дагаворам пастаўкі прадугледжана, што тавары аплачвае атрымальнік (плацельшчык), і апошні неабгрунтавана адмовіўся ад аплаты або не аплаціў тавары ва ўстаноўлены дагаворам тэрмін, пастаўшчык мае права запатрабаваць аплаты пастаўленых тавараў ад пакупніка.

3. У выпадку, калі ў дагаворы пастаўкі прадугледжана пастаўка тавараў асобнымі часткамі, якія ўваходзяць у камплект, пакупнік аплачвае тавары пасля адгрузкі (выбаркі) апошняй часткі, якая ўваходзіць у камплект, калі іншае не ўстаноўлена дагаворам.

Артыкул 487. Тара і ўпакоўка

Калі іншае не ўстаноўлена дагаворам пастаўкі, пакупнік (атрымальнік) абавязаны вярнуць пастаўшчыку шматабаротную тару і сродкі пакетавання, у якіх паступіў тавар, у парадку і тэрміны, устаноўленыя заканадаўствам.

Іншая тара, а таксама ўпакоўка тавару падлягаюць вяртанню пастаўшчыку толькі ў выпадках, прадугледжаных дагаворам.

Артыкул 488. Наступствы пастаўкі тавараў неналежнай якасці

1. Пакупнік (атрымальнік), якому пастаўлены тавар неналежнай якасці, мае права прад'явіць пастаўшчыку патрабаванні, прадугледжаныя артыкулам 445 гэтага Кодэкса, за выключэннем выпадку, калі пастаўшчык, які атрымаў паведамленне

пакупніка аб недахопах пастаўленых тавараў, без прамаруджання заменіць пастаўленыя тавары таварамі належнай якасці.

2. Пакупнік (атрымальнік), які ажыццяўляе продаж пастаўленых яму тавараў у розніцу, мае права патрабаваць замены ў разумны тэрмін тавару неналежнай якасці, вернутага спажыўцом, калі іншае не прадугледжана дагаворам пастаўкі.

3. Тэрмін іскавай даўнасці для патрабаванняў, якія прад'яўляюцца ў сувязі з пастаўкай тавараў неналежнай якасці, складае адзін год з дня прыняцця тавару пакупніком (атрымальнікам).

Калі дагаворам пастаўкі прадугледжана даванне пастаўшчыком гарантыі якасці тавару (артыкул 440) і заява з прычыны недахопаў тавару зроблена ў межах устаноўленага гарантыйнага тэрміну, цячэнне тэрміну іскавай даўнасці, указанага ў частцы першай гэтага пункта, пачынаецца з дня заявы аб недахопах.

Артыкул 489. Наступствы пастаўкі некамплектных тавараў

1. Пакупнік (атрымальнік), якому пастаўлены тавары з парушэннем умоў дагавора пастаўкі, патрабаванняў заканадаўства або патрабаванняў, якія звычайна прад'яўляюцца да камплектнасці, мае права прад'явіць пастаўшчыку патрабаванні, прадугледжаныя артыкулам 450 гэтага Кодэкса, за выключэннем выпадку, калі пастаўшчык, які атрымаў паведамленне пакупніка аб некамплектнасці пастаўленых тавараў, без прамаруджання даўкамплектуе тавары або заменіць іх камплектнымі таварамі.

2. Пакупнік (атрымальнік), які прадае тавары ў розніцу, мае права патрабаваць замены ў разумны тэрмін некамплектных тавараў, вернутых спажыўцом, камплектнымі, калі іншае не прадугледжана дагаворам пастаўкі.

Артыкул 490. Правы пакупніка ў выпадку недапастаўкі тавараў, невыканання патрабаванняў аб ліквідацыі недахопаў тавараў ці аб даўкамплектаванні тавараў

1. Калі пастаўшчык не паставіў прадугледжаную дагаворам пастаўкі колькасць тавараў або не выканаў патрабаванні пакупніка аб замене недабраякасных тавараў ці аб даўкамплектаванні тавараў ва ўстаноўлены тэрмін, пакупнік мае права набыць непастаўленыя тавары ў іншых асоб з аднясеннем на кошт пастаўшчыка ўсіх неабходных і разумных расходаў на іх набыццё.

2. Вылічэнне расходаў атрымальніка на набыццё тавараў у іншых асоб у выпадках іх недапастаўкі пастаўшчыком ці невыканання патрабаванняў пакупніка аб ліквідацыі недахопаў тавараў або аб даўкамплектаванні тавараў праводзіцца па правілах, прадугледжаных пунктам 1 артыкула 494 гэтага Кодэкса.

3. Пакупнік (атрымальнік) мае права адмовіцца ад аплаты тавараў неналежнай якасці і некамплектных тавараў, а калі такія тавары аплачаны, – запатрабаваць вяртання заплачаных сум надалей да ліквідацыі недахопаў і даўкамплектавання тавараў або іх замены.

Артыкул 491. Няўстойка за недапастаўку і пратэрміноўку пастаўкі тавараў

Устаноўленая заканадаўствам ці дагаворам пастаўкі няўстойка за недапастаўку ці пратэрміноўку пастаўкі тавараў спаганяецца з пастаўшчыка да фактычнага выканання абавязацельства ў межах яго абавязку дапоўніць недапастаўленую колькасць тавараў у наступных перыядах пастаўкі, калі іншы парадак выплаты няўстойкі не ўстаноўлены заканадаўствам ці дагаворам.

Артыкул 492. Пагашэнне аднародных абавязацельстваў па некалькіх дагаворах пастаўкі

1. У выпадках, калі пастаўшчык пастаўляе пакупніку аднайменныя тавары адначасова паводле некалькіх дагавораў пастаўкі і колькасць пастаўленых тавараў недастатковая для пагашэння абавязацельстваў пастаўшчыка па ўсіх дагаворах, пастаўленыя тавары павінны залічвацца ў кошт выканання дагавора, указанага пастаўшчыком пры ажыццяўленні пастаўкі або без прамаруджання пасля пастаўкі.

2. Калі пакупнік аплаціў пастаўшчыку аднайменныя тавары, атрыманыя па некалькіх дагаворах пастаўкі, і сума аплаты недастатковая для пагашэння абавязацельстваў пакупніка па ўсіх дагаворах, заплачаная сума павінна залічвацца ў кошт выканання дагавора, указанага пакупніком пры ажыццяўленні аплаты тавараў ці без прамаруджання пасля аплаты.

3. Калі пастаўшчык ці пакупнік не скарыстаўся правамі, дадзенымі ім адпаведна пунктамі 1 і 2 гэтага артыкула, выкананне абавязацельстваў залічваецца ў пагашэнне абавязацельстваў паводле дагавора, тэрмін выканання якога надышоў раней. Калі тэрмін выканання абавязацельства па некалькіх дагаворах надышоў адначасова, гэта выкананне залічваецца прапарцыянальна ў пагашэнне абавязацельстваў па ўсіх дагаворах.

Артыкул 493. Аднабаковая адмова ад выканання дагавора пастаўкі

1. Аднабаковая адмова ад выканання дагавора пастаўкі (поўнасцю ці часткова) ці аднабаковае яго змяненне дапускаюцца ў выпадку істотнага парушэння дагавора адным з бакоў (пункт 2 артыкула 420).

2. Парушэнне дагавора пастаўкі пастаўшчыком лічыцца істотным у выпадку:

1) пастаўкі тавараў неналежнай якасці з недахопамі, якія не могуць быць ліквідаваны ў прымальны для пакупніка тэрмін;

2) неаднаразовага парушэння тэрмінаў пастаўкі тавараў.

3. Парушэнне дагавора пастаўкі пакупніком лічыцца істотным у выпадку:

1) неаднаразовага парушэння тэрмінаў аплаты тавараў;

2) неаднаразовай нявыбаркі тавараў.

4. Дагавор пастаўкі лічыцца змененым ці скасаваным з моманту атрымання адным бокам паведамлення іншага боку аб аднабаковай адмове ад выканання дагавора поўнасцю ці часткова, калі іншы тэрмін скасавання ці змянення дагавора не прадугледжаны ў паведамленні або не вызначаны пагадненнем бакоў.

Артыкул 494. Вылічэнне страт пры скасаванні дагавора пастаўкі

1. Калі ў разумны тэрмін пасля скасавання дагавора пастаўкі ў выніку парушэння абавязацельства прадаўцом пакупнік купіў у іншай асобы па больш высокай, але разумнай цане тавар наўзамен прадугледжанага дагаворам, пакупнік можа прад'явіць прадаўцу патрабаванне аб пакрыцці страт у выглядзе розніцы паміж устаноўленай у дагаворы цаной і цаной па заключанай наўзамен здзелцы.

2. Калі ў разумны тэрмін пасля скасавання дагавора пастаўкі ў выніку парушэння абавязацельства пакупніком прадавец прадаў тавар іншай асобе па больш нізкай, чым прадугледжаная дагаворам, але разумнай цане, прадавец можа прад'явіць пакупніку патрабаванне аб пакрыцці страт у выглядзе розніцы паміж устаноўленай у дагаворы цаной і цаной па заключанай наўзамен здзелцы.

3. Калі пасля скасавання дагавора пастаўкі на падставах, прадугледжаных пунктамі 1 і 2 гэтага артыкула, не заключана здзелка наўзамен скасаванага дагавора і на гэты тавар маецца цяперашняя цана, бок можа прад'явіць патрабаванне аб

пакрыцці страт у выглядзе розніцы паміж цаной, устаноўленай у дагаворы, і цяперашняй цаной на момант скасавання дагавора.

Цяперашняй цаной прызнаецца цана, якая звычайна збіралася пры параўнальных абставінах за аналагічны тавар у месцы, дзе павінна была быць ажыццёўлена перадача тавару. Калі ў гэтым месцы не існуе цяперашняй цаны, можа быць выкарыстана цана, якая прымянялася ў іншым месцы, што можа служыць разумнай заменай, з улікам розніцы ў расходах па транспарціроўцы тавару.

4. Задавальненне патрабаванняў, прадугледжаных пунктамі 1, 2 і 3 гэтага артыкула, не вызваляе бок, які не выканаў ці неналежна выканаў абавязацельства, ад пакрыцця іншых страт, прычыненых іншаму боку, на падставе артыкула 14 гэтага Кодэкса.

§ 4. Пастаўка тавараў для дзяржаўных патрэб

Артыкул 495. Падставы пастаўкі тавараў для дзяржаўных патрэб

1. Тавары для дзяржаўных патрэб пастаўляюцца на аснове заключаных дагавораў пастаўкі тавараў для дзяржаўных патрэб. Дзяржаўнымі патрэбамі прызнаюцца патрэбнасці Рэспублікі Беларусь, якія вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь, патрэбнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, якія вызначаюцца абласнымі і Мінскім гарадскім Саветамі дэпутатаў або ў парадку, які вызначаецца імі, за выключэннем патрэбнасцей, якія забяспечваюцца шляхам ажыццяўлення дзяржаўных закупак.

2. Да адносін па пастаўцы тавараў для дзяржаўных патрэб прымяняюцца правілы аб дагаворы пастаўкі (артыкула 476–493), калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства.

Артыкул 496. Выключаны

Артыкул 497. Выключаны
Артыкул 498. Выключаны
Артыкул 499. Выключаны

Артыкул 500. Выключаны

Артыкул 501. Выключаны

Артыкул 502. Выключаны

Артыкул 503. Выключаны

Артыкул 504. Выключаны

§ 5. Кантрактацыя

Артыкул 505. Дагавор кантрактацыі

1. Паводле дагавора кантрактацыі вытворца сельскагаспадарчай прадукцыі абавязваецца перадаць вырашчаную (выробленую) ім сельскагаспадарчую прадукцыю асобе, якая ажыццяўляе закупкі такой прадукцыі для перапрацоўкі ці продажу (нарыхтоўшчыку).

2. Да адносін паводле дагавора кантрактацыі, не ўрэгуляваных правіламі гэтага параграфа, прымяняюцца правілы дагавора пастаўкі тавараў (артыкулы 476-494).

Артыкул 506. Абавязкі вытворцы сельскагаспадарчай прадукцыі

1. Вытворца сельскагаспадарчай прадукцыі абавязаны вырабіць і перадаць у абумоўленыя тэрміны кантрактанту вызначаную дагаворам кантрактацыі колькасць сельскагаспадарчай прадукцыі, якая адпавядае патрабаванням дагавора па асартыменце і якасці.

2. Дагаворам кантрактацыі можа быць прадугледжаны абавязак вытворцы сельскагаспадарчай прадукцыі арганізаваць сельскагаспадарчую вытворчасць, якая забяспечвае атрыманне сельскагаспадарчай прадукцыі неабходнага асартыменту і якасці.

3. Вытворца сельскагаспадарчай прадукцыі абавязаны падаць нарыхтоўшчыку па яго патрабаванні справаздачу аб выкарыстанні атрыманых фінансавых і матэрыяльных сродкаў.

Артыкул 507. Абавязкі нарыхтоўшчыка

1. Нарыхтоўшчык абавязаны перадаць вытворцы сельскагаспадарчай прадукцыі прадугледжаныя дагаворам кантрактацыі фінансавыя і матэрыяльныя сродкі, аказаць тэхнічнае садзейнічанне для ажыццяўлення вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі.

2. Калі іншае не прадугледжана дагаворам кантрактацыі, нарыхтоўшчык абавязаны прыняць сельскагаспадарчую прадукцыю па месцы знаходжання вытворцы сельскагаспадарчай прадукцыі і забяспечыць яе вываз.

3. Дагаворам кантрактацыі можа быць прадугледжаны абавязак нарыхтоўшчыка прыняць на ўстаноўленых у дагаворы ўмовах усю сельскагаспадарчую прадукцыю, выробленую яе вытворцам.

4. Дагаворам кантрактацыі можа быць прадугледжаны абавязак нарыхтоўшчыка, які ажыццяўляе перапрацоўку сельскагаспадарчай прадукцыі, вяртаць вытворцу сельскагаспадарчай прадукцыі адходы ад перапрацоўкі гэтай прадукцыі з аплатай па цане, вызначанай дагаворам кантрактацыі.

Артыкул 508. Выкананне дагавора кантрактацыі

1. Тэрмін выканання дагавора кантрактацыі вызначаецца пагадненнем бакоў з улікам тэрмінаў (перыяду) вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі.

2. Калі сельскагаспадарчая прадукцыя падлягае дастаўцы ў тары ці ўпакоўцы, нарыхтоўшчык забяспечвае вытворцу сельскагаспадарчай прадукцыі неабходнай тарай і ўпаковачнымі матэрыяламі ў колькасці і тэрміны, устаноўленыя дагаворам кантрактацыі.

3. Калі іншае не прадугледжана дагаворам кантрактацыі, нарыхтоўшчык не мае права адмовіцца ад прыняцця частковага выканання паводле гэтага дагавора.

4. У выпадку, калі сельскагаспадарчая прадукцыя перадаецца ў месцы знаходжання нарыхтоўшчыка ці іншым указаным ім месцы, нарыхтоўшчык не мае права адмовіцца ад прыняцця сельскагаспадарчай прадукцыі, якая адпавядае ўмовам дагавора кантрактацыі і пастаўлена нарыхтоўшчыку ва ўстаноўлены дагаворам тэрмін.

Артыкул 509. Наступствы невыканання ці неналежнага выканання дагавора кантрактацыі

1. У выпадку, калі нарыхтоўшчыку становіцца заведама вядома, што сельскагаспадарчая прадукцыя не можа быць выраблена і перададзена ў колькасці, асартыменце і якасці, прадугледжаных дагаворам кантрактацыі, нарыхтоўшчык мае права запатрабаваць скасавання ці змянення дагавора.

2. Вытворца сельскагаспадарчай прадукцыі, які не выканаў або неналежным чынам выканаў абавязацельства, нясе адказнасць пры наяўнасці яго віны.

3. Калі ў выніку абставін, за якія ні адзін з бакоў не адказвае, вытворца сельскагаспадарчай прадукцыі не можа вырабіць і перадаць нарыхтоўшчыку сельскагаспадарчую прадукцыю, ён абавязаны вярнуць атрыманы аванс.

4. Вытворца сельскагаспадарчай прадукцыі абавязаны паведаміць нарыхтоўшчыку аб немагчымасці пастаўкі сельскагаспадарчай прадукцыі ў выніку абставін, за якія ён не адказвае. Невыкананне гэтага абавязку па віне вытворцы сельскагаспадарчай прадукцыі пазбаўляе яго права спасылацца на гэтыя абставіны.

§ 6. Энергазабеспячэнне

Артыкул 510. Дагавор энергазабеспячэння

1. Паводле дагавора энергазабеспячэння энергазабяспечвальная арганізацыя абавязваецца падаваць абаненту (спажыўцу) праз далучаную сетку энергію, а абанент абавязваецца аплачваць прынятую энергію, а таксама выконваць прадугледжаны дагаворам рэжым яе спажывання, забяспечваць бяспеку эксплуатацыі энергетычных сетак, якія знаходзяцца ў яго вядзенні, і спраўнасць прыбораў і абсталявання, якія выкарыстоўваюцца ім, звязаных са спажываннем энергіі.

2. Дагавор энергазабеспячэння заключаецца з абанентам пры наяўнасці ў яго энергапрымальнай прылады, якая адпавядае ўстаноўленым тэхнічным патрабаванням і далучана да сетак энергазабяспечвальнай арганізацыі, і іншага неабходнага абсталявання, а таксама пры забеспячэнні ўліку спажывання энергіі.

Артыкул 511. Заключэнне і працягванне дагавора энергазабеспячэння

1. У выпадках, калі абанентам паводле дагавора энергазабеспячэння выступае грамадзянін, які выкарыстоўвае энергію для бытавога спажывання, дагавор лічыцца заключаным з моманту першага фактычнага падключэння абанента ва ўстаноўленым парадку да далучанай сеткі.

Калі іншае не прадугледжана пагадненнем бакоў, такі дагавор лічыцца заключаным на нявызначаны тэрмін і можа быць зменены ці скасаваны на падставах, прадугледжаных артыкулам 517 гэтага Кодэкса.

2. Дагавор энергазабеспячэння, заключаны на вызначаны тэрмін, лічыцца працягнутым на той жа тэрмін і на тых жа ўмовах, калі да заканчэння тэрміну яго дзеяння ні адзін з бакоў не заявіць аб яго спыненні ці змяненні або аб заключэнні новага дагавора.

3. Калі адным з бакоў да заканчэння тэрміну дзеяння дагавора энергазабеспячэння ўнесена прапанова аб заключэнні новага дагавора, то адносіны бакоў да заключэння новага дагавора рэгулююцца раней заключаным дагаворам.

Артыкул 512. Колькасць энергіі

1. Энергазабяспечвальная арганізацыя абавязана падаваць абаненту энергію праз далучаную сетку ў колькасці, прадугледжанай дагаворам энергазабеспячэння, і з прытрымліваннем рэжыму падачы, узгодненага бакамі. Колькасць пададзенай энергазабяспечвальнай арганізацыяй і выкарыстанай абанентам энергіі вызначаецца ў адпаведнасці з дадзенымі ўліку аб яе фактычным спажыванні.

2. Дагаворам энергазабеспячэння можа быць прадугледжана права абанента змяняць колькасць энергіі, якая прымаецца ім і вызначана дагаворам, пры ўмове пакрыцця ім расходаў, панесеных энергазабяспечвальнай арганізацыяй у сувязі з забеспячэннем падачы энергіі не ў абумоўленай дагаворам колькасці.

3. У выпадках, калі абанентам паводле дагавора энергазабеспячэння выступае грамадзянін, які выкарыстоўвае энергію для бытавога спажывання, ён мае права выкарыстоўваць энергію ў неабходнай яму колькасці.

Артыкул 513. Якасць энергіі

1. Якасць энергазабяспечвальнай арганізацыяй энергіі, якая падаецца, павінна адпавядаць абавязковым для захавання патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі, патрабаванням, устаноўленым іншымі актамі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання ці прадугледжаным дагаворам энергазабеспячэння.

2. У выпадку парушэння энергазабяспечвальнай арганізацыяй патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да якасці энергіі, абанент мае права адмовіцца ад аплаты такой энергіі. Пры гэтым энергазабяспечвальная арганізацыя мае права патрабаваць пакрыцця абанентам кошту таго, што абанент беспадстаўна захаваў у выніку выкарыстання гэтай энергіі (пункт 2 артыкула 974), калі іншае не прадугледжана заканадаўствам.

Артыкул 514. Абавязкі абанента па ўтрыманні і эксплуатацыі сетак, прыбораў і абсталявання

1. Абанент абавязаны забяспечваць належны тэхнічны стан і бяспеку энергетычных сетак, прыбораў і абсталявання, якія эксплуатуюцца, выконваць устаноўлены рэжым спажывання энергіі, а таксама неадкладна паведамляць энергазабяспечвальнай арганізацыі аб аварыях, пажарах, няспраўнасцях прыбораў уліку энергіі і аб іншых парушэннях, якія ўзнікаюць пры выкарыстанні энергіі.

2. У выпадку, калі абанентам паводле дагавора энергазабеспячэння выступае грамадзянін, які выкарыстоўвае энергію для бытавога спажывання, абавязак забяспечваць належны тэхнічны стан і бяспеку энергетычных сетак, а таксама прыбораў уліку спажывання энергіі ўскладаецца на энергазабяспечвальную арганізацыю, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам. Пры гэтым абанент абавязаны забяспечыць доступ прадстаўнікоў энергазабяспечвальнай арганізацыі да энергетычных сетак, прыбораў уліку спажывання энергіі, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

3. Патрабаванні да тэхнічнага стану і эксплуатацыі энергетычных сетак, прыбораў і абсталявання, а таксама парадак ажыццяўлення кантролю за іх захаваннем вызначаюцца заканадаўствам і прынятымі ў адпаведнасці з ім актамі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання.

Артыкул 515. Аплата энергіі

1. Аплата энергіі праводзіцца за фактычна прынятую абанентам колькасць энергіі ў адпаведнасці з дадзенымі ўліку энергіі, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці пагадненнем бакоў.

2. Парадак разлікаў за энергію вызначаецца заканадаўствам ці пагадненнем бакоў.

Артыкул 516. Субабанент

1. Абанент можа перадаваць энергію, прынятую ім ад энергазабяспечвальнай арганізацыі праз далучаную сетку, іншай асобе (субабаненту) на падставе дагавора толькі са згоды энергазабяспечвальнай арганізацыі.

2. Да дагавора па перадачы абанентам энергіі субабаненту прымяняюцца правілы гэтага параграфа, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам.

3. Пры перадачы энергіі субабаненту адказным перад энергазабяспечвальнай арганізацыяй застаецца абанент, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

Артыкул 517. Змяненне і скасаванне дагавора энергазабеспячэння

1. У выпадку, калі абанентам паводле дагавора энергазабеспячэння выступае грамадзянін, які выкарыстоўвае энергію для бытавога спажывання, ён мае права скасаваць дагавор у аднабаковым парадку пры ўмове пісьмовага паведамлення аб гэтым энергазабяспечвальнай арганізацыі і поўнай аплаты выкарыстанай энергіі.

У выпадках, калі абанентам паводле дагавора энергазабеспячэння выступае юрыдычная асоба, энергазабяспечвальная арганізацыя мае права адмовіцца ад выканання дагавора ў аднабаковым парадку на падставах, прадугледжаных падпунктам 1 пункта 3 артыкула 493 гэтага Кодэкса, за выключэннем выпадкаў, устаноўленых заканадаўствам.

2. Перапынак у падачы, спыненне ці абмежаванне падачы энергіі дапускаюцца па пагадненні бакоў, за выключэннем выпадкаў, калі пасведчаны органам дзяржаўнага энергетычнага нагляду нездавальняючы стан энергетычных установак абанента пагражае аварыяй ці стварае пагрозу жыццю і бяспецы грамадзян. Аб перапынку ў падачы, спыненні ці абмежаванні падачы энергіі энергазабяспечвальная арганізацыя павінна папярэдзіць абанента.

3. Перапынак у падачы, спыненне ці абмежаванне падачы энергіі без узгаднення з абанентам і без адпаведнага яго папярэджання дапускаюцца ў выпадку неабходнасці прыняць неадкладныя меры па прадухіленні ці ліквідацыі аварыі ў сістэме энергазабяспечвальнай арганізацыі пры ўмове неадкладнага паведамлення аб гэтым абаненту.

Артыкул 518. Адказнасць паводле дагавора энергазабеспячэння

1. У выпадках невыканання ці неналежнага выканання абавязацельстваў паводле дагавора энергазабеспячэння бок, які парушыў абавязацельства, абавязаны кампенсаваць прычынены гэтым рэальны ўрон (пункт 2 артыкула 14).

2. Калі ў выніку рэгулявання рэжыму спажывання энергіі, ажыццёўленага на падставе заканадаўства, дапушчаны перапынак у падачы энергіі абаненту, энергазабяспечвальная арганізацыя нясе адказнасць за невыкананне ці неналежнае выкананне дагаворных абавязацельстваў пры наяўнасці яе віны.

Артыкул 519. Прымяненне правілаў аб энергазабеспячэнні да іншых дагавораў

1. Правілы, прадугледжаныя артыкуламі 510–518 гэтага Кодэкса, прымяняюцца да адносін, звязаных з забеспячэннем цеплавой энергіяй праз далучаную сетку, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

2. Да адносін, звязаных з забеспячэннем праз далучаную сетку газам, нафтай і нафтапрадуктамі, вадой і іншымі таварамі, правілы аб дагаворы энергазабеспячэння (артыкулы 510–518) прымяняюцца, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам ці не вынікае з сутнасці абавязацельства.

§ 7. Продаж нерухомасці

Артыкул 520. Дагавор продажу нерухомасці

1. Паводле дагавора куплі-продажу нерухомай маёмасці (дагавора продажу нерухомасці) прадавец абавязваецца перадаць ва ўласнасць пакупніка зямельны ўчастак, капітальную пабудову (будынак, збудаванне), кватэру ці іншую нерухомую маёмасць (пункт 1 артыкула 130).

2. Правілы гэтага параграфа прымяняюцца да продажу прадпрыемстваў пастолькі, паколькі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства аб дагаворы продажу прадпрыемства (артыкулы 530–537).

Артыкул 521. Форма дагавора продажу нерухомасці

Дагавор продажу нерухомасці заключаецца ў пісьмовай форме шляхам складання аднаго дакумента, падпісанага бакамі (пункт 2 артыкула 404).

Незахаванне формы дагавора продажу нерухомасці цягне за сабой яго несапраўднасць.

Артыкул 522. Дзяржаўная рэгістрацыя пераходу права ўласнасці на нерухомасць

1. Пераход права ўласнасці на нерухомасць паводле дагавора продажу нерухомасці да пакупніка падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі.

2. Выкананне дагавора продажу нерухомасці бакамі да дзяржаўнай рэгістрацыі пераходу права ўласнасці не з'яўляецца падставай для змянення іх адносін з трэцімі асобамі.

3. У выпадках, калі адзін з бакоў ухіляецца ад дзяржаўнай рэгістрацыі пераходу права ўласнасці на нерухомасць, суд мае права па патрабаванні іншага боку вынесці рашэнне аб дзяржаўнай рэгістрацыі пераходу права ўласнасці. Бок, які неабгрунтавана ўхіляецца ад дзяржаўнай рэгістрацыі пераходу права ўласнасці, павінен кампенсаваць іншаму боку страты, выкліканыя затрымкай рэгістрацыі.

Артыкул 523. Выключаны

Артыкул 524. Выключаны

Артыкул 525. Вызначэнне прадмета ў дагаворы продажу нерухомасці

У дагаворы продажу нерухомасці павінны быць указаны звесткі, якія дазваляюць бясспрэчна вызначыць нерухомую маёмасць, якая падлягае перадачы пакупніку паводле дагавора, у тым ліку звесткі, якія вызначаюць размяшчэнне нерухомасці на адпаведным зямельным участку або ў складзе іншай нерухомай маёмасці.

Пры адсутнасці гэтых звестак у дагаворы ўмова аб нерухомай маёмасці, якая падлягае перадачы, лічыцца не ўзгодненай бакамі, а адпаведны дагавор не лічыцца заключаным.

Артыкул 526. Цана нерухомасці ў дагаворы

1. Дагавор продажу нерухомасці павінен прадугледжваць цану гэтай нерухомасці.

Пры адсутнасці ўзгодненай бакамі ў пісьмовай форме ўмовы аб цане нерухомасці дагавор аб яе продажы лічыцца незаключаным. Пры гэтым правілы вызначэння цаны, прадугледжаныя пунктам 3 артыкула 394 гэтага Кодэкса, не прымяняюцца.

2. Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам продажу нерухомасці, устаноўленая ў ім цана пабудовы, збудавання ці іншай нерухомай маёмасці, якая знаходзіцца на зямельным участку, уключае цану адпаведнай часткі зямельнага ўчастка, якая перадаецца з гэтай нерухомай маёмасцю, ці права на яе.

3. У выпадках, калі цана нерухомасці ўстаноўлена ў дагаворы продажу нерухомасці на адзінку яе плошчы ці іншага паказчыка яе памеру, агульная цана такой нерухомай маёмасці, якая падлягае выплаце, вызначаецца зыходзячы з фактычнага памеру перададзенай пакупніку нерухомай маёмасці.

Артыкул 527. Перадача нерухомасці

1. Перадача нерухомасці прадаўцом і прыняцце яе пакупніком ажыццяўляюцца па перадатачным акце, які падпісваюць бакамі, ці іншым дакуменце аб перадачы.

Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам, абавязацельства прадаўца перадаць нерухомасць пакупніку лічыцца выкананым пасля перадачы гэтай маёмасці пакупніку і падпісання бакамі адпаведнага дакумента аб перадачы.

Ухіленне аднаго з бакоў ад падпісання дакумента аб перадачы нерухомасці на ўмовах, прадугледжаных дагаворам, лічыцца адмовай адпаведна прадаўца ад выканання абавязку перадаць маёмасць, а пакупніка – ад абавязку прыняць маёмасць.

2. Прыняцце пакупніком нерухомасці, не адпаведнай умовам дагавора продажу нерухомасці, у тым ліку ў выпадку, калі такая неадпаведнасць агаворана ў дакуменце аб перадачы нерухомасці, не з'яўляецца падставай для вызвалення прадаўца ад адказнасці за неналежнае выкананне дагавора.

Артыкул 528. Наступствы перадачы нерухомасці неналежнай якасці

У выпадку перадачы прадаўцом пакупніку нерухомасці, не адпаведнай умовам дагавора продажу нерухомасці аб яе якасці, прымяняюцца правілы артыкула 445 гэтага Кодэкса, за выключэннем палажэнняў аб праве пакупніка запатрабаваць замены тавару неналежнай якасці на тавар, які адпавядае ўмовам дагавора.

Артыкул 529. Асаблівасці продажу жылых памяшканняў

1. Істотнай умовай дагавора продажу жылога дому, кватэры, часткі жылога дому ці кватэры, у якіх пражываюць асобы, што захоўваюць у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі права карыстання гэтым жылым памяшканнем пасля яго набыцця пакупніком, з'яўляецца пералік гэтых асоб з указаннем іх правоў на карыстанне жылым памяшканнем, якое прадаецца.

2. Дагавор продажу жылога дому, кватэры, часткі жылога дому ці кватэры падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі і лічыцца заключаным з моманту такой рэгістрацыі.

§ 8. Продаж прадпрыемства

Артыкул 530. Дагавор продажу прадпрыемства

1. Паводле дагавора продажу прадпрыемства прадавец абавязваецца перадаць ва ўласнасць пакупніка прадпрыемства ў цэлым як маёмасны комплекс (артыкул 132), за выключэннем правоў і абавязкаў, якія прадавец не мае права перадаваць іншым асобам.

2. Правы на фірменнае найменне, таварны знак, знак абслугоўвання і іншыя сродкі індывідуалізацыі прадаўца і яго тавараў, работ ці паслуг, а таксама прыналежныя яму на падставе ліцэнзіі правы выкарыстання такіх сродкаў індывідуалізацыі пераходзяць да пакупніка, калі іншае не прадугледжана дагаворам.

3. Правы прадаўца, атрыманыя ім на падставе спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на займанне адпаведнай дзейнасцю, не падлягаюць перадачы пакупніку прадпрыемства, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам. Перадача пакупніку ў складзе прадпрыемства абавязацельстваў, выкананне якіх пакупніком немагчыма пры адсутнасці ў яго такога спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), не вызваляе прадаўца ад адпаведных абавязацельстваў перад крэдыторамі.

Артыкул 531. Форма і дзяржаўная рэгістрацыя дагавора продажу прадпрыемства

1. Дагавор продажу прадпрыемства заключаецца ў пісьмовай форме шляхам складання аднаго дакумента, падпісанага бакамі (пункт 2 артыкула 404), з абавязковым прыкладаннем да яго дакументаў, указаных у пункце 2 артыкула 532 гэтага Кодэкса.

2. Незахаванне формы дагавора продажу прадпрыемства цягне за сабой яго несапраўднасць.

3. Дагавор продажу прадпрыемства падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі і лічыцца заключаным з моманту такой рэгістрацыі.

Артыкул 532. Пасведчанне складу прадпрыемства, якое прадаецца

1. Склад і кошт прадпрыемства, якое прадаецца, вызначаюцца ў дагаворы продажу прадпрыемства на падставе поўнай інвентарызацыі прадпрыемства, якая праводзіцца ў адпаведнасці з устаноўленымі правіламі такой інвентарызацыі.

2. Да падпісання дагавора продажу прадпрыемства павінны быць складзены і разгледжаны бакамі дакумент, якім аформлены вынікі інвентарызацыі, бухгалтарскі баланс (кніга ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання), аўдытарскае заключэнне аб складзе і кошце прадпрыемства як маёмаснага комплексу, а таксама пералік усіх даўгоў (абавязацельстваў), якія ўключаюцца ў склад прадпрыемства, з указаннем крэдыторaў, характару, памеру і тэрмінаў іх патрабаванняў.

Маёмасць, правы і абавязкі, указаныя ў названых дакументах, падлягаюць перадачы прадаўцом пакупніку, калі іншае не вынікае з правілаў артыкула 530 гэтага Кодэкса і не ўстаноўлена пагадненнем бакоў.

Артыкул 533. Правы крэдыторaў пры продажы прадпрыемства

1. Крэдыторы па абавязацельствах, уключаных у склад прадпрыемства, якое прадаецца, павінны быць да яго перадачы пакупніку пісьмова апавешчаны аб яго продажы адным з бакоў дагавора продажу прадпрыемства.

2. Крэдытор, які пісьмова не паведаміў прадаўцу ці пакупніку аб сваёй згодзе на перавод доўгу, мае права на працягу трох месяцаў з дня атрымання паведамлення аб продажы прадпрыемства запатрабаваць спынення ці датэрміновага выканання абавязацельства і пакрыцця прадаўцом прычыненых гэтым страт.

3. Крэдытор, які не быў апавешчаны аб продажы прадпрыемства ў парадку, прадугледжаным пунктам 1 гэтага артыкула, можа прад'явіць іск аб задавальненні патрабаванняў, прадугледжаных пунктам 2 гэтага артыкула, на працягу года з дня, калі ён даведаўся ці павінен быў даведацца аб перадачы прадпрыемства прадаўцом пакупніку.

4. Пасля перадачы прадпрыемства пакупніку прадавец і пакупнік нясуць салідарную адказнасць па ўключаных у склад перададзенага прадпрыемства даўгах, якія былі пераведзены на пакупніка без згоды крэдытора.

Артыкул 534. Перадача прадпрыемства

1. Пакупнік перадае прадпрыемства прадаўцу паводле перадатачнага акта, у якім указваюцца даныя аб складзе прадпрыемства і аб паведамленні крэдытораў аб продажы прадпрыемства, а таксама звесткі аб выяўленых недахопах перададзенай маёмасці і пералік маёмасці, абавязкі па перадачы якой не выкананыя прадаўцом у выніку яе страты.

Падрыхтоўка прадпрыемства да перадачы, уключаючы складанне і падачу на падпісанне перадатачнага акта, з'яўляецца абавязкам прадаўца і ажыццяўляецца за яго кошт, калі іншае не прадугледжана дагаворам.

2. Прадпрыемства лічыцца перададзеным пакупніку з дня падпісання перадатачнага акта абодвума бакамі.

З гэтага моманту на пакупніка пераходзіць рызыка выпадковай гібелі ці выпадковага пашкоджання маёмасці, перададзенай у складзе прадпрыемства.

Артыкул 535. Пераход права ўласнасці на прадпрыемства

1. Права ўласнасці на прадпрыемства пераходзіць да пакупніка з моманту дзяржаўнай рэгістрацыі гэтага права.

2. Калі іншае не прадугледжана дагаворам продажу прадпрыемства, права ўласнасці на прадпрыемства пераходзіць да пакупніка і падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі непасрэдна пасля перадачы прадпрыемства пакупніку (артыкул 534).

3. У выпадках, калі дагаворам прадугледжана захаванне за прадаўцом права ўласнасці на прадпрыемства, перададзенае пакупніку, да аплаты прадпрыемства ці да надыходу іншых абставін, пакупнік мае права да пераходу да яго права ўласнасці распараджацца маёмасцю і правамі, якія ўваходзяць у склад перададзенага прадпрыемства, у той меры, у якой гэта неабходна для мэт, для якіх прадпрыемства было набыта.

Артыкул 536. Наступствы перадачы і прыняцця прадпрыемства з недахопамі

1. Наступствы перадачы прадаўцом і прыняцця пакупнікам па перадатачным акце прадпрыемства, склад якога не адпавядае прадугледжанаму дагаворам продажу прадпрыемства, у тым ліку ў адносінах да якасці перададзенай маёмасці, вызначаюцца на падставе правілаў, прадугледжаных артыкуламі 430–432, 436, 439, 445, 449 гэтага Кодэкса, калі іншае не вынікае з дагавора і не прадугледжана пунктамі 2–4 гэтага артыкула.

2. У выпадку, калі прадпрыемства перададзена і прынята па перадатачным акце, у якім указаны звесткі аб выяўленых недахопах прадпрыемства і аб страчанай маёмасці (пункт 1 артыкула 534), пакупнік мае права патрабаваць адпаведнага змяншэння пакупной цаны прадпрыемства, калі права на прад'яўленне ў такіх выпадках іншых патрабаванняў не прадугледжана дагаворам продажу прадпрыемства.

3. Пакупнік мае права патрабаваць змяншэння пакупной цаны ў выпадку перадачы яму ў складзе прадпрыемства даўгоў (абавязацельстваў) прадаўца, якія не былі ўказаны ў дагаворы продажу прадпрыемства ці перадатачным акце, калі прадавец не дакажа, што пакупнік ведаў аб такіх даўгах (абавязацельствах) у час заключэння дагавора і перадачы прадпрыемства.

4. Прадавец у выпадку атрымання паведамлення пакупніка аб недахопах маёмасці, перададзенай у складзе прадпрыемства, ці адсутнасці ў гэтым складзе асобных відаў маёмасці, якія падлягаюць перадачы, можа без прамаруджання замяніць маёмасць неналежнай якасці ці выдаць пакупніку маёмасць, якой не хапае.

5. Пакупнік мае права ў судовым парадку патрабаваць скасавання ці змянення дагавора продажу прадпрыемства і вяртання таго, што выканана бакамі паводле дагавора, калі ўстаноўлена, што прадпрыемства ў выніку недахопаў, за якія прадавец адказвае, непрыдатнае для мэт, названых у дагаворы продажу, і гэтыя недахопы не ліквідаваны прадаўцом на ўмовах, у парадку і тэрміны, якія ўстаноўлены ў адпаведнасці з заканадаўствам ці дагаворам, або ліквідацыя такіх недахопаў немагчымая.

Артыкул 537. Прымяненне да дагавора продажу прадпрыемства правілаў аб наступствах несапраўднасці здзелак і аб змяненні ці скасаванні дагавора

Правілы гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства аб наступствах несапраўднасці здзелак і аб змяненні ці аб скасаванні дагавора куплі-продажу, якія прадугледжваюць вяртанне ці спагнанне ў натуры атрыманага паводле дагавора з аднаго боку ці з абодвух бакоў, прымяняюцца да дагавора продажу прадпрыемства, калі такія наступствы істотна не парушаюць правы і інтарэсы, якія ахоўваюцца заканадаўствам, крэдытораў прадаўца і пакупніка, іншых асоб і не супярэчаць дзяржаўным і грамадскім інтарэсам.

ГЛАВА 31
МЕНА

Артыкул 538. Дагавор мены

1. Паводле дагавора мены кожны з бакоў абавязваецца перадаць ва ўласнасць іншага боку адзін тавар у абмен на іншы.

2. Да дагавора мены прымяняюцца адпаведна правілы аб куплі-продажу (глава 30), калі гэта не супярэчыць правілам гэтай главы і сутнасці мены. Пры гэтым кожны з бакоў прызнаецца прадаўцом тавару, які ён абавязваецца перадаць, і пакупніком тавару, які ён абавязваецца прыняць у абмен.

Артыкул 539. Цэны і расходы паводле дагавора мены

1. Калі з дагавора мены не вынікае іншае, тавары, якія падлягаюць абмену, лічацца раўнацэннымі, а расходы на іх перадачу і прыняцце ажыццяўляюцца ў кожным выпадку тым бокам, які нясе адпаведныя абавязкі.

2. У выпадку, калі ў адпаведнасці з дагаворам мены тавары, якія абменьваюцца, прызнаюцца нераўнацэннымі, бок, абавязаны перадаць тавар, цана якога ніжэйшая за цану тавару, што даецца ў абмен, павінен аплаціць розніцу ў цэнах непасрэдна да ці пасля выканання яго абавязку перадаць тавар, калі іншы парадак аплаты не прадугледжаны заканадаўствам ці дагаворам.

Артыкул 540. Сустрэчнае выкананне абавязацельства перадаць тавар паводле дагавора мены

У выпадку, калі ў адпаведнасці з дагаворам мены тэрміны перадачы тавараў, якія абменьваюцца, не супадаюць, да выканання абавязацельства перадаць тавар бокам, які павінен перадаць тавар пасля перадачы тавару іншым бокам, прымяняюцца правілы аб сустрэчным выкананні абавязацельстваў (артыкул 309).

Артыкул 541. Пераход права ўласнасці на тавары, якія абменьваюцца

Калі заканадаўствам ці дагаворам мены не прадугледжана іншае, права ўласнасці на тавары, якія абменьваюцца, пераходзіць да бакоў, што выступаюць паводле дагавора мены ў якасці пакупнікоў, адначасова пасля выканання абавязацельстваў перадаць адпаведныя тавары абодвума бакамі.

Артыкул 542. Адказнасць за канфіскацыю тавару, набытага паводле дагавора мены

Бок, у якога трэцяй асобай канфіскаваны тавар, набыты паводле дагавора мены, мае права пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных артыкулам 431 гэтага Кодэкса, запатрабаваць ад іншага боку вяртання тавару, атрыманага апошнім у абмен, і (ці) пакрыцця страт.

ГЛАВА 32
ДАРЭННЕ

Артыкул 543. Дагавор дарэння

1. Паводле дагавора дарэння адзін бок (дарыльшчык) бязвыплатна перадае ці абавязваецца перадаць іншаму боку (атрымальніку дару) рэч ва ўласнасць, або маёмаснае права (патрабаванне) да сябе ці да трэцяй асобы, або вызваляе ці абавязваецца вызваліць яго ад маёмаснага абавязку перад сабой ці перад трэцяй асобай.

Пры наяўнасці сустрэчнай перадачы рэчы ці права або сустрэчнага абавязацельства дагавор не прызнаецца дарэннем. Да такога дагавора прымяняюцца правілы, прадугледжаныя пунктам 2 артыкула 171 гэтага Кодэкса.

2. Абяцанне бязвыплатна перадаць каму-небудзь рэч ці маёмаснае права або вызваліць каго-небудзь ад маёмаснага абавязку (абяцанне дарэння) прызнаецца дагаворам дарэння і звязвае асобу, якая абяцала, калі абяцанне зроблена ў належнай форме (пункт 2 артыкула 545) і ўтрымлівае ясна выказаны намер зрабіць у будучыні бязвыплатную перадачу рэчы ці права канкрэтнай асобе або вызваліць яе ад маёмаснага абавязку.

Абяцанне падарыць усю сваю маёмасць ці частку сваёй маёмасці без указання на канкрэтны прадмет дарэння ў выглядзе рэчы, права ці вызвалення ад абавязку нікчэмнае.

3. Дагавор, які прадугледжвае перадачу дару атрымальніку пасля смерці дарыльшчыка, нікчэмны.

Да такога роду дарэння прымяняюцца правілы грамадзянскага заканадаўства аб успадкаванні.

4. Істотнай умовай дагавора дарэння жылога дому, кватэры, часткі жылога дому ці кватэры, у якіх пражываюць асобы, што захоўваюць у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі права карыстання гэтым жылым памяшканнем пасля пераходу права ўласнасці на яго, з'яўляецца пералік гэтых асоб з указаннем іх правоў на карыстанне жылым памяшканнем, якое перадаецца ў дар.

Артыкул 544. Адмова атрымальніка прыняць дар

1. Атрымальнік дару мае права ў любы час да перадачы яму дару ад яго адмовіцца. У гэтым выпадку дагавор дарэння лічыцца скасаваным.

2. Калі дагавор дарэння заключаны ў пісьмовай форме, адмова ад дару павінна быць аформлена таксама ў пісьмовай форме. У выпадку, калі дагавор дарэння зарэгістраваны (пункт 3 артыкула 545), адмова ад прыняцця дару таксама падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі.

3. Калі дагавор дарэння быў заключаны ў пісьмовай форме, дарыльшчык мае права патрабаваць ад атрымальніка дару пакрыцця рэальнага ўрону, прычыненага адмовай прыняць дар.

Артыкул 545. Форма дагавора дарэння

1. Дарэнне, якое суправаджаецца перадачай дару атрымальніку, можа быць здзейснена вусна, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктамі 2 і 3 гэтага артыкула.

Перадача дару ажыццяўляецца праз яго ўручэнне, сімвалічную перадачу (уручэнне ключоў і да т. п.) або ўручэнне праваўстаноўчых дакументаў.

2. Дагавор дарэння рухомай маёмасці павінен быць заключаны ў пісьмовай форме ў выпадках, калі:

1) дарыльшчыкам з'яўляецца юрыдычная асоба і кошт дару перавышае больш чым у пяць разоў устаноўлены заканадаўствам памер базавай велічыні;

2) дагавор утрымлівае абяцанне дарэння ў будучыні.

У выпадках, прадугледжаных у гэтым пункце, дагавор дарэння, заключаны вусна, нікчэмны.

3. Дагавор дарэння нерухомай маёмасці падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі.

Артыкул 546. Забарона дарэння

Не дапускаецца дарэнне, за выключэннем звычайных падарункаў, кошт якіх не перавышае ўстаноўленага заканадаўствам пяцікратнага памеру базавай велічыні:

1) ад імя малалетніх і грамадзян, прызнаных недзеяздольнымі, – іх законнымі прадстаўнікамі;

2) работнікам арганізацый аховы здароўя, устаноў адукацыі, устаноў сацыяльнага абслугоўвання, іншых аналагічных арганізацый – грамадзянамі, якія знаходзяцца ў іх на лячэнні, утрыманні, атрымліваюць у іх адукацыю, сужэнцамі і сваякамі гэтых грамадзян;

3) выключаны;

4) у адносінах паміж камерцыйнымі арганізацыямі.

Заканадаўчымі актамі могуць быць устаноўлены іншыя забароны дарэння дзяржаўным службовым ці прыраўнаваным да іх асобам або замежным службовым асобам у сувязі з выкананнем службовых (працоўных) абавязкаў, за выключэннем сувеніраў, якія ўручаюцца пры правядзенні пратакольных і іншых афіцыйных мерапрыемстваў, чым прадугледжаныя гэтым артыкулам.

Артыкул 547. Абмежаванні дарэння

1. Юрыдычная асоба, якой рэч належыць на праве гаспадарчага распараджэнняці аператыўнага кіравання, мае права падарыць яе са згоды ўласніка, калі заканадаўствам не прадугледжана іншае. Гэта абмежаванне не распаўсюджваецца на звычайныя падарункі невялікага кошту (артыкул 546).

2. Дарэнне маёмасці, якая знаходзіцца ў агульнай сумеснай уласнасці, дапускаецца пры згодзе ўсіх удзельнікаў сумеснай уласнасці з прытрымліваннем правілаў, прадугледжаных артыкулам 256 гэтага Кодэкса.

3. Даверанасць на здзяйсненне дарэння прадстаўніком, у якой не названы атрымальнік дару і не ўказаны прадмет дарэння, нікчэмная.

Артыкул 548. Адмова ад выканання дагавора дарэння

1. Дарыльшчык мае права адмовіцца ад выканання дагавора, які ўтрымлівае абяцанне перадаць у будучыні атрымальніку дару рэч ці права, калі пасля заключэння дагавора маёмасны ці сямейны стан або стан здароўя дарыльшчыка пагоршыўся.

2. Дарыльшчык мае права адмовіцца ад выканання дагавора, які ўтрымлівае абяцанне перадаць у будучыні атрымальніку дару рэч ці права, на падставах, якія даюць яму права адмяніць дарэнне (пункт 1 артыкула 549).

3. Адмова дарыльшчыка ад выканання дагавора дарэння на падставах, прадугледжаных пунктамі 1 і 2 гэтага артыкула, не дае атрымальніку дару права патрабаваць пакрыцця страт.

Артыкул 549. Адмена дарэння

1. Дарыльшчык мае права адмяніць дарэнне, калі атрымальнік дару зрабіў замах на яго жыццё, жыццё каго-небудзь з членаў яго сям'і ці блізкіх сваякоў або наўмысна зрабіў дарыльшчыку цялесныя пашкоджанні.

У выпадку наўмыснага пазбаўлення жыцця дарыльшчыка атрымальнікам дару права патрабаваць у судзе адмены дарэння належыць спадчыннікам дарыльшчыка.

2. Па патрабаванні зацікаўленай асобы суд можа адмяніць дарэнне, здзейсненае індывідуальным прадпрымальнікам ці юрыдычнай асобай з парушэннем палажэнняў акта заканадаўства аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве) за кошт сродкаў, звязаных з яго прадпрымальніцкай дзейнасцю, на працягу шасці месяцаў, якія папярэднічалі аб’яўленню такой асобы эканамічна неплацежаздольнай (банкрутам).

3. У дагаворы дарэння можа быць абумоўлена права дарыльшчыка адмяніць дарэнне ў выпадку, калі ён перажыве атрымальніка дару.

4. У выпадку адмены дарэння атрымальнік дару абавязаны вярнуць падораную рэч, калі яна захавалася ў натуры да моманту адмены дарэння.

Артыкул 550. Выпадкі, у якіх адмова ад выканання дагавора дарэння і адмена дарэння немагчымыя

Правілы аб адмове ад выканання дагавора дарэння (артыкул 548) і аб адмене дарэння (артыкул 549) не прымяняюцца да звычайных падарункаў невялікага кошту (артыкул 546).

Артыкул 551. Наступствы прычынення шкоды ў выніку недахопаў падоранай рэчы

Шкода, прычыненая жыццю, здароўю ці маёмасці грамадзяніна, які адорваецца, у выніку недахопаў падоранай рэчы, падлягае пакрыццю дарыльшчыкам у адпаведнасці з правіламі главы 58 гэтага Кодэкса, калі даказана, што гэтыя недахопы ўзніклі да перадачы рэчы атрымальніку дару, не адносяцца да ліку яўных і дарыльшчык, хоць і ведаў аб іх, не папярэдзіў аб іх атрымальніка дару.

Артыкул 552. Праваперaемства пры абяцанні дарэння

1. Права атрымальніка дару, якому паводле дагавора дарэння абяцаны дар, не пераходзяць да яго спадчыннікаў (праваперaемнікаў), калі іншае не прадугледжана дагаворам дарэння.

2. Абавязкі дарыльшчыка, які абяцаў дарэнне, пераходзяць да яго спадчыннікаў (праваперaемнікаў), калі іншае не прадугледжана дагаворам дарэння.

Артыкул 553. Ахвяраванні

1. Ахвяраваннем прызнаецца дарэнне рэчы ці права ў агульнакарысных мэтах.

Ахвяраванні могуць рабіцца грамадзянам, арганізацыям аховы здароўя, установам адукацыі, установам сацыяльнага абслугоўвання, іншым аналагічным арганізацыям, дабрачынным, навуковым арганізацыям, фондам, арганізацыям культуры і іншым арганізацыям, якія ажыццяўляюць культурную дзейнасць, грамадскім, рэлігійным і іншым некамерцыйным арганізацыям, а таксама Рэспубліцы Беларусь і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльным адзінкам.

2. На прыняцце ахвяраванняў не патрабуецца чый-небудзь дазвол ці згода.

3. Ахвяраванне маёмасці грамадзяніну павінна быць, а юрыдычным асобам можа быць абумоўлена ахвяравальнікам выкарыстаннем гэтай маёмасці па пэўным прызначэнні. Пры адсутнасці такой умовы ахвяраванне маёмасці грамадзяніну лічыцца звычайным дарэннем, а ў астатніх выпадках ахвяраваная маёмасць выкарыстоўваецца атрымальнікам дару ў адпаведнасці з прызначэннем маёмасці.

Юрыдычная асоба, якая прымае ахвяраванне, для выкарыстання якога ўстаноўлена пэўнае прызначэнне, павінна весці адасоблены ўлік усіх аперацый па выкарыстанні ахвяраванай маёмасці.

4. Калі выкарыстанне ахвяраванай маёмасці ў адпаведнасці з указаным ахвяравальнікам прызначэннем становіцца ў выніку абставін, якія змяніліся, немагчымым, яна можа быць выкарыстана па іншым прызначэнні толькі са згоды ахвяравальніка, а ў выпадку смерці грамадзяніна-ахвяравальніка ці ліквідацыі юрыдычнай асобы – ахвяравальніка – паводле рашэння суда.

5. Выкарыстанне ахвяраванай маёмасці не ў адпаведнасці з указаным ахвяравальнікам прызначэннем ці змяненне гэтага прызначэння з парушэннем правілаў пункта 4 гэтага артыкула дае права ахвяравальніку, яго спадчыннікам ці іншаму праваперaемніку патрабаваць адмены ахвяравання.

6. Да ахвяраванняў не прымяняюцца артыкулы 549 і 552 гэтага Кодэкса.

ГЛАВА 33
РЭНТА І ДАЖЫВОЦЦЕ З УТРЫМАННЕМ

§ 1. Агульныя палажэнні аб рэнце і дажывоцці з утрыманнем

Артыкул 554. Дагавор рэнты

1. Паводле дагавора рэнты адзін бок (атрымальнік рэнты) перадае іншаму боку (плацельшчыку рэнты) ва ўласнасць маёмасць, а плацельшчык рэнты абавязваецца ў абмен на атрыманую маёмасць перыядычна выплачваць атрымальніку рэнту ў выглядзе вызначанай грашовай сумы або давання сродкаў на яго ўтрыманне ў іншай форме.

2. Паводле дагавора рэнты дапускаецца ўстанаўленне абавязку выплачваць рэнту бестэрмінова (пастаянная рэнта) ці на тэрмін жыцця атрымальніка рэнты (пажыццёвая рэнта). Пажыццёвая рэнта можа быць устаноўлена на ўмовах дажывоцця грамадзяніна з утрыманнем.

Артыкул 555. Форма дагавора рэнты

Дагавор рэнты падлягае натарыяльнаму засведчанню, а дагавор, які прадугледжвае адчужэнне нерухомай маёмасці пад выплату рэнты, падлягае таксама дзяржаўнай рэгістрацыі.

Артыкул 556. Адчужэнне маёмасці пад выплату рэнты

1. Маёмасць, якая адчужаецца пад выплату рэнты, можа быць перададзена атрымальнікам рэнты ва ўласнасць плацельшчыка рэнты за плату ці бясплатна.

2. У выпадках, калі дагаворам рэнты прадугледжваецца перадача маёмасці за плату, да адносін бакоў па перадачы і аплаце прымяняюцца правілы аб куплі-продажу (глава 30), а ў выпадках, калі такая маёмасць перадаецца бясплатна, – правілы аб дагаворы дарэння (глава 32) пастолькі, паколькі іншае не ўстаноўлена правіламі гэтай главы і не супярэчыць сутнасці дагавора рэнты.

Артыкул 557. Абцяжарванне рэнтай нерухомай маёмасці

1. Рэнта абцяжарвае прадпрыемства, капітальную пабудову (будынак, збудаванне) ці іншую нерухомую маёмасць, размешчаную на зямельным участку і перададзеную пад яе выплату. У выпадку адчужэння такой маёмасці плацельшчыкам рэнты яго абавязацельствы паводле дагавора рэнты пераходзяць на пакупніка маёмасці, у тым ліку з улікам патрабаванняў заканадаўства аб ахове і выкарыстанні зямель у адносінах да зямельнага ўчастка, на якім размешчана гэта маёмасць.

2. Асоба, якая перадала абцяжараную рэнтай нерухомую маёмасць ва ўласнасць іншай асобы, нясе субсідыярную з ім адказнасць (артыкул 370) па патрабаваннях атрымальніка рэнты, якія ўзніклі ў сувязі з парушэннем дагавора рэнты, калі гэтым Кодэксам, іншымі актамі заканадаўства ці дагаворам не прадугледжана салідарная адказнасць па гэтым абавязацельстве.

Артыкул 558. Забеспячэнне выплаты рэнты

1. Пры перадачы пад выплату рэнты нерухомай маёмасці, за выключэннем зямельнага ўчастка, атрымальнік рэнты ў забеспячэнне абавязацельства плацельшчыка рэнты набывае права закладу на гэту маёмасць. Пры гэтым зямельны ўчастак перадаецца пад выплату рэнты ў адпаведнасці з заканадаўствам аб ахове і выкарыстанні зямель.

2. Істотнай умовай дагавора, якая прадугледжвае перадачу пад выплату рэнты грашовай сумы ці іншай рухомай маёмасці, з'яўляецца ўмова, якая ўстанаўлівае абавязак плацельшчыка рэнты перадаць забеспячэнне выканання яго

абавязацельстваў (артыкул 310) або застрахаваць на карысць атрымальніка рэнты адказнасць паводле дагавора (артыкул 824) за невыкананне або неналежнае выкананне гэтых абавязацельстваў.

3. Пры невыкананні плацельшчыкам рэнты абавязкаў, прадугледжаных пунктам 2 гэтага артыкула, а таксама ў выпадку страты забеспячэння ці пагаршэння яго ўмоў з-за абставін, за якія атрымальнік рэнты не адказвае, атрымальнік рэнты мае права скасаваць дагавор рэнты і запатрабаваць пакрыцця страт, выкліканых скасаваннем дагавора.

Артыкул 559. Адказнасць за пратэрміноўку выплаты рэнты

За пратэрміноўку выплаты рэнты плацельшчык рэнты выплачвае атрымальніку рэнты працэнты, прадугледжаныя артыкулам 366 гэтага Кодэкса, калі іншы памер працэнтаў не ўстаноўлены дагаворам рэнты.

§ 2. Пастаянная рэнта

Артыкул 560. Атрымальнік пастаяннай рэнты

1. Атрымальнікамі пастаяннай рэнты могуць быць толькі грамадзяне, а таксама некамерцыйныя арганізацыі, калі гэта не супярэчыць заканадаўству і адпавядае мэтам іх дзейнасці.

2. Правы атрымальніка рэнты паводле дагавора пастаяннай рэнты могуць перадавацца асобам, указаным у пункце 1 гэтага артыкула, шляхам уступкі патрабавання і пераходзіць па спадчыне або ў парадку праваперaемства пры рэарганізацыі юрыдычных асоб, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам.

Артыкул 561. Форма і памер пастаяннай рэнты

1. Пастаянная рэнта выплачваецца ў грашовай форме ў памеры, які ўстанаўліваецца дагаворам.

Дагаворам пастаяннай рэнты можа быць прадугледжана выплата рэнты шляхам давання рэчаў, выканання работ ці аказання паслуг, якія адпавядаюць па кошце грашовай суме рэнты.

2. Калі іншае не прадугледжана дагаворам, памер рэнты, якая выплачваецца, павялічваецца прапарцыянальна павелічэнню ўстаноўленага заканадаўствам памеру базавай велічыні.

Артыкул 562. Тэрміны выплаты пастаяннай рэнты

Калі іншае не прадугледжана дагаворам пастаяннай рэнты, пастаянная рэнта выплачваецца пасля заканчэння кожнага каляндарнага квартала.

Артыкул 563. Права плацельшчыка на выкуп пастаяннай рэнты

1. Плацельшчык пастаяннай рэнты мае права адмовіцца ад далейшай выплаты рэнты шляхам яе выкупу.

2. Такая адмова сапраўдная пры ўмове, што яна заяўлена плацельшчыкам рэнты ў пісьмовай форме не пазней чым за тры месяцы да спынення выплаты рэнты

ці за больш працяглы тэрмін, прадугледжаны дагаворам пастаяннай рэнты. Пры гэтым абавязацельства па выплаце рэнты не спыняецца да атрымання ўсёй сумы выкупу атрымальнікам рэнты, калі іншы парадак выкупу не прадугледжаны дагаворам.

3. Умова дагавора аб адмове плацельшчыка пастаяннай рэнты ад права на яе выкуп нікчэмная.

Дагаворам можа быць прадугледжана, што права на выкуп пастаяннай рэнты не можа быць ажыццёўлена пры жыцці атрымальніка рэнты або на працягу іншага тэрміну, які не перавышае трыццаць гадоў з моманту заключэння дагавора.

Артыкул 564. Выкуп пастаяннай рэнты па патрабаванні атрымальніка рэнты

Атрымальнік рэнты мае права патрабаваць выкупу рэнты плацельшчыкам у выпадках, калі:

1) плацельшчык рэнты пратэрмінаваў яе выплату больш чым на адзін год, калі іншае не прадугледжана дагаворам пастаяннай рэнты;

2) плацельшчык рэнты парушыў свае абавязацельствы па забеспячэнні выплаты рэнты (артыкул 558);

3) плацельшчык рэнты прызнаны эканамічна неплацежаздольным (банкрутам) або ўзніклі іншыя абставіны, якія відавочна сведчаць, што рэнта не будзе выплачвацца ім у памеры і тэрміны, устаноўленыя дагаворам;

4) нерухомая маёмасць, перададзеная пад выплату рэнты, паступіла ў агульную ўласнасць ці падзелена паміж некалькімі асобамі;

5) у іншых выпадках, прадугледжаных дагаворам.

Артыкул 565. Выкупная цана пастаяннай рэнты

1. Выкуп пастаяннай рэнты ў выпадках, прадугледжаных артыкуламі 563 і 564 гэтага Кодэкса, праводзіцца па цане, вызначанай дагаворам пастаяннай рэнты.

2. Пры адсутнасці ўмовы аб выкупной цане ў дагаворы, па якой маёмасць перададзена пад выплату рэнты з аплатай, выкуп ажыццяўляецца па цане, якая адпавядае гадавой суме падлеглай выплаце рэнты.

3. Пры адсутнасці ўмовы аб выкупной цане ў дагаворы, па якой маёмасць перададзена пад выплату рэнты бясплатна, у выкупную цану нароўні з гадавой сумай рэнтавых выплат уключаецца цана перададзенай маёмасці, якая вызначаецца па правілах, прадугледжаных пунктам 3 артыкула 394 гэтага Кодэкса.

Артыкул 566. Рызыка выпадковай гібелі маёмасці, перададзенай пад выплату пастаяннай рэнты

1. Рызыка выпадковай гібелі ці выпадковага псавання, пашкоджання маёмасці, перададзенай бясплатна пад выплату пастаяннай рэнты, нясе плацельшчык рэнты.

2. Пры выпадковай гібелі ці выпадковым пашкоджанні маёмасці, перададзенай за плату пад выплату пастаяннай рэнты, плацельшчык мае права патрабаваць адпаведна спынення абавязацельства па выплаце рэнты або змянення ўмоў яе выплаты.

§ 3. Пажыццёвая рэнта

Артыкул 567. Атрымальнік пажыццёвай рэнты

1. Пажыццёвая рэнта можа быць устаноўлена на перыяд жыцця грамадзяніна, які перадае маёмасць пад выплату рэнты, або на перыяд жыцця іншага ўказанага ім грамадзяніна.

2. Дапускаецца ўстанаўленне пажыццёвай рэнты на карысць некалькіх грамадзян, долі якіх у праве на атрыманне рэнты лічацца роўнымі, калі іншае не прадугледжана дагаворам пажыццёвай рэнты.

У выпадку смерці аднаго з атрымальнікаў рэнты яго доля ў праве на атрыманне рэнты пераходзіць да атрымальнікаў рэнты, якія перажылі яго, калі дагаворам пажыццёвай рэнты не прадугледжана іншае, а ў выпадку смерці апошняга атрымальніка рэнты абавязацельства выплаты рэнты спыняецца.

3. Дагавор, які ўстанаўлівае пажыццёвую рэнту на карысць грамадзяніна, які памёр да моманту заключэння дагавора, нікчэмны.

Артыкул 568. Памер пажыццёвай рэнты

1. Пажыццёвая рэнта вызначаецца ў дагаворы як грашовая сума, якая перыядычна выплачваецца атрымальніку рэнты на працягу яго жыцця. У выпадках, калі бакі заключылі дагавор аб дажывоцці з утрыманнем, у дагаворы павінен быць вызначаны кошт такога ўтрымання.

2. Памер пажыццёвай рэнты, які вызначаецца ў дагаворы, у разліку на месяц павінен быць не меншы за памер базавай велічыні, устаноўлены заканадаўствам, а ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 299 гэтага Кодэкса, падлягае павелічэнню.

Артыкул 569. Тэрміны выплаты пажыццёвай рэнты

Калі іншае не прадугледжана дагаворам пажыццёвай рэнты, пажыццёвая рэнта выплачваецца пасля заканчэння кожнага каляндарнага месяца.

Артыкул 570. Скасаванне дагавора пажыццёвай рэнты па патрабаванні атрымальніка рэнты

1. У выпадках істотнага парушэння дагавора пажыццёвай рэнты плацельшчыкам рэнты атрымальнік рэнты мае права патрабаваць ад плацельшчыка рэнты выкупу рэнты на ўмовах, прадугледжаных артыкулам 565 гэтага Кодэкса, або скасавання дагавора і пакрыцця страт.

2. Калі пад выплату пажыццёвай рэнты кватэра, жылы дом ці іншая маёмасць адчужана бясплатна, атрымальнік рэнты мае права пры істотным парушэнні дагавора плацельшчыкам рэнты запатрабаваць вяртання гэтай маёмасці з залікам яго кошту ў лік выкупной цаны рэнты.

Артыкул 571. Рызыка выпадковай гібелі маёмасці, перададзенай пад выплату рэнты

Выпадковая гібель ці выпадковае пашкоджанне маёмасці, перададзенай пад выплату пажыццёвай рэнты, не вызваляюць плацельшчыка рэнты ад

абавязацельства выплачваць яе на ўмовах, прадугледжаных дагаворам пажыццёвай рэнты.

§ 4. Дажывоцце з утрыманнем

Артыкул 572. Дагавор дажывоцця з утрыманнем

1. Паводле дагавора дажывоцце з утрыманнем атрымальнік рэнты – грамадзянін перадае прыналежную яму нерухомую маёмасць, за выключэннем зямельнага ўчастка, ва ўласнасць плацельшчыка рэнты, які абавязваецца забяспечыць дажывоцце з утрыманнем грамадзяніна і (ці) указанай ім трэцяй асобы (асоб). Пры гэтым зямельны ўчастак перадаецца пад выплату рэнты ў адпаведнасці з заканадаўствам аб ахове і выкарыстанні зямель.

2. Да дагавора дажывоцця з утрыманнем прымяняюцца правілы аб пажыццёвай рэнце, калі іншае не прадугледжана правіламі гэтага параграфа.

Артыкул 573. Абавязак па даванні дажывоцця з утрыманнем

1. Абавязак плацельшчыка рэнты па даванні дажывоцця з утрыманнем можа ўключаць забеспячэнне патрэбнасцей у жыллі, харчаванні і адзенні, а калі гэтага патрабуе стан здароўя грамадзяніна, то і догляд за ім. Дагаворам дажывоцця з утрыманнем можа быць таксама прадугледжана аплата плацельшчыкам рэнты рытуальных паслуг.

2. У дагаворы дажывоцця з утрыманнем павінен быць вызначаны кошт усяго аб'ёму ўтрымання. Пры гэтым кошт агульнага аб'ёму ўтрымання ў месяц не можа быць меншы за двухкратны памер базавай велічыні, устаноўлены заканадаўствам.

3. Пры вырашэнні спрэчкі паміж бакамі аб аб'ёме ўтрымання, якое даецца ці павінна давацца грамадзяніну, суд павінен кіравацца прынцыпамі добрасумленнасці і разумнасці.

Артыкул 574. Замена дажывоцця **перыядычнымі плацяжамі**

Дагаворам дажывоцце з утрыманнем можа быць прадугледжана магчымасць замены дажывоцця з утрыманнем у натуры выплатай на працягу жыцця грамадзяніна перыядычных плацяжоў у грашах.

Артыкул 575. Адчужэнне і выкарыстанне маёмасці, перададзенай для забеспячэння дажывоцця

Плацельшчык рэнты мае права адчужаць, здаваць у заклад ці іншым спосабам абцяжарваць нерухомую маёмасць, перададзеную яму ў забеспячэнне дажывоцця, толькі пры наяўнасці папярэдняй згоды атрымальніка рэнты.

Плацельшчык рэнты абавязаны прымаць неабходныя меры для таго, каб у перыяд давання дажывоцця з утрыманнем выкарыстанне ўказанай маёмасці не прыводзіла да зніжэння кошту гэтай маёмасці.

Артыкул 576. Спыненне дажывоцця з утрыманнем

1. Абавязацельства дажывоцця з утрыманнем спыняецца смерцю асобы (асоб), якая атрымлівае дажывоцце з утрыманнем.

2. Пры істотным парушэнні плацельшчыкам рэнты сваіх абавязацельстваў атрымальнік рэнты мае права запатрабаваць вяртання нерухомай маёмасці, перададзенай у забеспячэнне дажывоцце, або выплаты яму выкупной цаны на ўмовах, устаноўленых артыкулам 565 гэтага Кодэкса. Пры гэтым плацельшчык

рэнты не мае права патрабаваць кампенсацыі расходаў, панесеных у сувязі з утрыманнем асобы (асоб), якая атрымлівае дажывоцце з утрыманнем.

ГЛАВА 34
АРЭНДА

§ 1. Агульныя палажэнні аб арэндзе

Артыкул 577. Дагавор арэнды

Паводле дагавора арэнды (маёмаснага найму) арэндадавец (наймадавец) абавязваецца аддаць арандатару (наймальніку) маёмасць за плату ў часовае валоданне і карыстанне ці ў часовае карыстанне.

Набыткі, прадукцыя і даходы, атрыманыя арандатарам у выніку выкарыстання арандаванай маёмасці ў адпаведнасці з дагаворам, з'яўляюцца яго ўласнасцю.

Артыкул 578. Аб'екты арэнды

1. У арэнду могуць быць перададзены зямельныя ўчасткі і іншыя адасобленыя прыродныя аб'екты, прадпрыемствы і іншыя маёмасныя комплексы, капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), ізаляваныя памяшканні, машына-месцы, іх часткі, вызначаныя бакамі ў дагаворы, абсталяванне, транспартныя сродкі і іншыя рэчы, якія не губляюць сваіх натуральных уласцівасцей у працэсе іх выкарыстання (неспажывальныя рэчы).

Заканадаўчымі актамі могуць быць устаноўлены віды маёмасці, здача якой у арэнду не дапускаецца ці абмяжоўваецца.

2. Заканадаўствам могуць быць устаноўлены асаблівасці здачы ў арэнду зямельных участкаў і іншых адасобленых прыродных аб'ектаў, а таксама асобных відаў іншай маёмасці.

3. У дагаворы арэнды павінны быць указаны звесткі, які дазваляюць бясспрэчна ўстанавіць маёмасць, якая падлягае перадачы арандатару ў якасці аб'екта арэнды. Пры адсутнасці гэтых звестак у дагаворы ўмова аб аб'екце, які падлягае перадачы ў арэнду, лічыцца няўзгодненай бакамі, а адпаведны дагавор не лічыцца заключаным.

Артыкул 579. Арэндадавец

Права здачы маёмасці ў арэнду належыць яго ўласніку. Арэндадаўцамі могуць быць таксама асобы, надзеленыя правамоцтвамі заканадаўствам ці ўласнікам здаваць маёмасць у арэнду.

Артыкул 580. Форма і дзяржаўная рэгістрацыя дагавора арэнды

1. Дагавор арэнды на тэрмін, большы за адзін год, а калі хаця б адным з бакоў дагавора з'яўляецца юрыдычная асоба, – незалежна ад тэрміну павінен быць заключаны ў пісьмовай форме, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

2. Дагавор арэнды нерухомай маёмасці падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

3. Дагавор арэнды маёмасці, які прадугледжвае выкуп арандатарам арандаванай маёмасці (артыкул 595), заключаецца ў форме, прадугледжанай для дагавора куплі-продажу такой маёмасці.

Артыкул 581. Тэрмін дагавора арэнды

1. Дагавор арэнды заключаецца на тэрмін, вызначаны дагаворам.

2. Калі тэрмін арэнды ў дагаворы не вызначаны, дагавор арэнды лічыцца заключаным на нявызначаны тэрмін.

У гэтым выпадку кожны з бакоў мае права ў любы час адмовіцца ад дагавора, папярэдзіўшы аб гэтым іншы бок за адзін месяц, а пры арэндзе нерухомай

маёмасці – за тры месяцы. Заканадаўствам ці дагаворам можа быць устаноўлены іншы тэрмін для папярэджання аб спыненні дагавора арэнды, заключанага на нявызначаны тэрмін.

3. Заканадаўствам могуць устанаўлівацца максімальныя (гранічныя) тэрміны дагавора для асобных відаў арэнды, а таксама для арэнды асобных відаў маёмасці. У гэтых выпадках, калі тэрмін арэнды ў дагаворы не вызначаны і ні адзін з бакоў не адмовіўся ад дагавора да сканчэння гранічнага тэрміну, устаноўленага заканадаўствам, дагавор пасля сканчэння гранічнага тэрміну спыняецца.

Дагавор арэнды, заключаны на тэрмін, які перавышае ўстаноўлены заканадаўствам гранічны тэрмін, лічыцца заключаным на тэрмін, роўны гранічнаму.

Артыкул 582. Даванне маёмасці арандатару

1. Арэндадавец абавязаны даць арандатару маёмасць у стане, які адпавядае патрабаванням заканадаўства і ўмовам дагавора арэнды, а таксама прызначэнню такой маёмасці.

2. Маёмасць здаецца ў арэнду разам з усім яе прыладдзем і дакументамі (тэхнічным пашпартам, сертыфікатам якасці і да т. п.), якія адносяцца да яго, калі іншае не прадугледжана дагаворам.

Калі такія прыладдзе і дакументы перададзены не былі, аднак без іх арандатар не можа карыстацца маёмасцю ў адпаведнасці з яе прызначэннем або ў значнай ступені пазбаўляецца таго, на што меў права разлічваць пры заключэнні дагавора, ён можа запатрабаваць давання яму арэндадаўцам такіх прыладдзя і дакументаў ці скасавання дагавора, а таксама пакрыцця страт.

3. Калі арэндадавец не даў арандатару здадзеную ў арэнду маёмасць ва ўказаны ў дагаворы арэнды тэрмін, а ў выпадку, калі ў дагаворы такі тэрмін не ўказаны, – у разумны тэрмін, арандатар мае права выпатрабаваць ад яго гэту маёмасць у адпаведнасці з артыкулам 369 гэтага Кодэкса і запатрабаваць пакрыцця страт, прычыненых затрымкай выканання, або запатрабаваць скасавання дагавора і пакрыцця страт, прычыненых яго невыкананнем.

Артыкул 583. Адказнасць арэндадаўца за недахопы здадзенай у арэнду маёмасці

1. Арэндадавец адказвае за недахопы здадзенай у арэнду маёмасці, якія поўнасцю ці часткова перашкаджаюць карыстанню ёй, нават калі ў час заключэння дагавора арэнды ён не ведаў аб гэтых недахопах.

Пры выяўленні такіх недахопаў арандатар мае права па сваім выбары:

1) запатрабаваць ад арэндадаўца або бязвыплатнай ліквідацыі недахопаў маёмасці, або суразмернага змяншэння арэннай платы, або пакрыцця сваіх расходаў на ліквідацыю недахопаў маёмасці;

2) непасрэдна ўтрымаць суму панесеных ім расходаў на ліквідацыю гэтых недахопаў з арэннай платы, спачатку паведаміўшы аб гэтым арэндадаўцу;

3) запатрабаваць датэрміновага скасавання дагавора.

Арэндадавец, апавешчаны аб патрабаваннях арандатара ці аб яго намеры ліквідаваць недахопы маёмасці за кошт арэндадаўца, можа без прамаруджання зрабіць замену дадзенай арандатару маёмасці іншай аналагічнай маёмасцю, якая знаходзіцца ў належным стане, або бязвыплатна ліквідаваць недахопы маёмасці.

Калі задавальненне патрабаванняў арандатара ці вылічэнне ім расходаў на ліквідацыю недахопаў з арэннай платы не пакрывае прычыненых арандатару страт, ён мае права запатрабаваць пакрыцця непакрытай часткі страт.

2. Арэндадавец не адказвае за недахопы здадзенай у арэнду маёмасці, якія былі ім агавораны пры заключэнні дагавора арэнды, або былі загадзя вядомыя арандатару, або павінны былі быць выяўлены арандатарам у час агляду маёмасці ці праверкі яго спраўнасці пры заключэнні дагавора ці перадачы маёмасці ў арэнду.

Артыкул 584. Правы трэціх асоб на маёмасць, якая здаецца ў арэнду

Перадача маёмасці ў арэнду не з'яўляецца падставай для спынення ці змянення правоў трэціх асоб на гэту маёмасць.

Пры заключэнні дагавора арэнды арэндадавец абавязаны папярэдзіць арандатара аб усіх правах трэціх асоб на маёмасць, якая здаецца ў арэнду (сервітуце, праве закладу і да т. п.). Невыкананне арэндадаўцам гэтага абавязку дае арандатару права патрабаваць змяншэння арэннай платы або скасавання дагавора і пакрыцця страт.

Артыкул 585. Арэндная плата

1. Арандатар абавязаны своечасова ўносіць плату за карыстанне маёмасцю (арэндную плату).

Парадак, умовы і тэрміны ўнясення арэннай платы вызначаюцца дагаворам арэнды. У выпадках, калі дагаворам яны не вызначаны, лічыцца, што ўстаноўлены парадак, умовы і тэрміны, якія звычайна прымяняюцца пры арэндзе аналагічнай маёмасці пры параўнальных абставінах.

2. Арэндная плата ўстанаўліваецца за ўсю маёмасць, якая арандуецца, у цэлым ці асобна па кожнай з яе састаўных частак у выглядзе:

1) вызначаных у цвёрдай суме выплат, якія ўносяцца перыядычна ці аднаразова;

2) устаноўленай долі атрыманых у выніку выкарыстання арандаванай маёмасці прадукцыі, набыткаў ці даходаў;

3) аказання арандатарам пэўных паслуг;

4) перадачы арандатарам арэндадаўцу абумоўленых дагаворам рэчаў ва ўласнасць ці ў арэнду;

5) ускладання на арандатара абумоўленых дагаворам затрат на паляпшэнне арандаванай маёмасці.

Бакі могуць прадугледжваць у дагаворы арэнды спалучэнне ўказаных формаў арэннай платы ці іншыя формы аплаты арэнды, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

3. Калі іншае не прадугледжана дагаворам, памер арэннай платы можа змяняцца па пагадненні бакоў у тэрміны, прадугледжаныя дагаворам, але не часцей аднаго разу ў год. Заканадаўствам могуць быць прадугледжаны іншыя мінімальныя тэрміны перагляду памеру арэннай платы для асобных відаў арэнды, а таксама для арэнды асобных відаў маёмасці.

4. Калі заканадаўствам не прадугледжана іншае, арандатар мае права запатрабаваць адпаведнага змяншэння арэннай платы, калі з прычыны абставін, за якія ён не адказвае, умовы карыстання, прадугледжаныя дагаворам арэнды, ці стан маёмасці істотна пагоршыліся.

5. Калі іншае не прадугледжана дагаворам арэнды, у выпадку істотнага парушэння арандатарам тэрмінаў унясення арэннай платы арэндадавец мае права запатрабаваць ад яго датэрміновага ўнясення арэннай платы ва ўстаноўлены арэндадаўцам тэрмін. Пры гэтым арэндадавец не мае права патрабаваць датэрміновага ўнясення арэннай платы больш чым за два тэрміны запар.

Артыкул 586. Карыстанне арандаванай маёмасцю

1. Арандатар абавязаны карыстацца арандаванай маёмасцю ў адпаведнасці з умовамі дагавора арэнды, а калі такія ўмовы ў дагаворы не вызначаны, – у адпаведнасці з прызначэннем маёмасці.

2. Арандатар мае права са згоды арэндадаўца здаваць арандаваную маёмасць у субарэнду (паднаём) і перадаваць свае правы і абавязкі паводле дагавора арэнды іншай асобе (перанаём), аддаваць арандаваную маёмасць у бязвыплатнае карыстанне, а таксама аддаваць арэндныя правы ў заклад і ўносіць іх у якасці ўкладу ў статутны фонд гаспадарчых таварыстваў і суполак ці паявога ўзносу ў вытворчы кааператыў, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам. Ва ўказаных выпадках, за выключэннем перанаймання, адказным паводле дагавора перад арэндадаўцам застаецца арандатар.

Дагавор субарэнды не можа быць заключаны на тэрмін, які перавышае тэрмін дагавора арэнды.

Да дагавораў субарэнды прымяняюцца правілы аб дагаворах арэнды, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства.

3. Калі арандатар карыстаецца маёмасцю не ў адпаведнасці з умовамі дагавора арэнды ці прызначэннем маёмасці, арэндадавец мае права запатрабаваць скасавання дагавора і пакрыцця страт.

Артыкул 587. Абавязкі бакоў па ўтрыманні арандаванай маёмасці

1. Арэндадавец абавязаны рабіць за свой кошт капітальны рамонт перададзенай у арэнду маёмасці, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам арэнды.

Гэтым Кодэксам, іншымі законамі і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь могуць быць устаноўлены выпадкі, калі ў адносінах да асобных відаў арандаванай маёмасці абавязак па правядзенні капітальнага рамонту такой маёмасці, у тым ліку забеспячэнні наяўнасці на ёй у належным стане інжынерных камунікацый, можа быць ускладзены толькі на арэндадаўца.

Капітальны рамонт павінен праводзіцца ў тэрмін, устаноўлены дагаворам арэнды, а калі ён не вызначаны дагаворам ці выкліканы безадкладнай неабходнасцю, – у разумны тэрмін.

Парушэнне арэндадаўцам абавязку па правядзенні капітальнага рамонту дае арандатару права па сваім выбары:

1) правесці капітальны рамонт, прадугледжаны дагаворам ці выкліканы безадкладнай неабходнасцю, і спагнаць з арэндадаўца кошт рамонту ці залічыць яго ў кошт арэнднай платы;

2) запатрабаваць адпаведнага змяншэння арэнднай платы;

3) запатрабаваць скасавання дагавора і пакрыцця страт.

2. Арандатар абавязаны падтрымліваць маёмасць у спраўным стане, рабіць за свой кошт бягучы рамонт і несці расходы на ўтрыманне маёмасці, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам ці дагаворам арэнды.

Артыкул 588. Захаванне дагавора арэнды ў сіле пры змяненні бакоў

1. Пераход права ўласнасці (пажыццёвага валодання, якое атрымліваецца ў спадчыну) на здадзеную ў арэнду маёмасць да іншай асобы не з'яўляецца падставай для змянення ці скасавання дагавора арэнды.

2. У выпадку смерці грамадзяніна, які арандуе нерухомую маёмасць, яго правы і абавязкі паводле дагавора арэнды пераходзяць да спадчынніка, калі заканадаўствам ці дагаворам не прадугледжана іншае.

Арэндадавец не мае права адмовіць такому спадчыннікy ва ўступленні ў дагавор на астатні тэрмін яго дзеяння, за выключэннем выпадкаў, калі заключэнне дагавора было абумоўлена асабістымі якасцямі арандатара.

Артыкул 589. Спыненне дагавора субарэнды пры датэрміновым спыненні дагавора арэнды

1. Калі іншае не прадугледжана дагаворам арэнды, датэрміновае спыненне дагавора арэнды цягне за сабой спыненне заключанага ў адпаведнасці з ім дагавора субарэнды. Субарандатар у гэтым выпадку мае права на заключэнне з ім дагавора арэнды на маёмасць, якая знаходзілася ў яго карыстанні ў адпаведнасці з дагаворам субарэнды, у межах астатняга тэрміну субарэнды на ўмовах, якія адпавядаюць умовам спыненага дагавора арэнды.

2. Калі дагавор арэнды на падставах, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства, з'яўляецца нікчэмным, нікчэмным з'яўляецца і заключаны ў адпаведнасці з ім дагавор субарэнды.

Артыкул 590. Датэрміновае скасаванне дагавора арэнды па патрабаванні арэндадаўца

Па патрабаванні арэндадаўца дагавор арэнды можа быць датэрмінова скасаваны судом, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам, іншымі законамі і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у выпадках, калі арандатар:

1) карыстаецца маёмасцю з істотным парушэннем умоў дагавора ці прызначэння маёмасці або з неаднаразовымі парушэннямі;

2) істотна пагаршае маёмасць;

3) больш двух раз запар пасля сканчэння ўстаноўленага дагаворам тэрміну плацяжу не ўносіць арэндную плату;

4) не робіць капітальнага рамонту маёмасці ва ўстаноўленыя дагаворам арэнды тэрміны, а пры адсутнасці іх у дагаворы – у разумныя тэрміны ў тых выпадках, калі ў адпаведнасці з заканадаўствам ці дагаворам правядзенне капітальнага рамонту з'яўляецца абавязкам арандатара.

Дагаворам арэнды могуць быць устаноўлены і іншыя падставы датэрміновага скасавання дагавора па патрабаванні арэндадаўца ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 420 гэтага Кодэкса.

Арэндадавец мае права патрабаваць датэрміновага скасавання дагавора толькі пасля накіравання арандатару пісьмовага папярэджання аб неабходнасці выканання ім абавязацельства ў разумны тэрмін, калі іншы парадак датэрміновага скасавання дагавора не прадугледжаны гэтым Кодэксам, іншымі законамі і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 591. Датэрміновае скасаванне дагавора арэнды па патрабаванні арандатара

Па патрабаванні арандатара дагавор арэнды можа быць датэрмінова скасаваны судом у выпадках, калі:

1) арэндадавец не аддае маёмасць у карыстанне арандатару або стварае перашкоды карыстанню маёмасцю ў адпаведнасці з умовамі дагавора ці прызначэннем маёмасці;

2) перададзеная арандатару маёмасць мае недахопы, якія перашкаджаюць карыстанню ёй, якія не былі агавораны арэндадаўцам пры заключэнні дагавора, не былі загадзя вядомыя арандатару і не маглі быць выяўлены арандатарам у час агляду маёмасці ці праверкі яго спраўнасці пры заключэнні дагавора;

3) арэндадавец не робіць капітальны рамонт маёмасці, які з'яўляецца яго абавязкам, ва ўстаноўленыя дагаворам арэнды тэрміны, а пры адсутнасці іх у дагаворы – у разумныя тэрміны;

4) маёмасць з прычыны абставін, за якія арандатар не адказвае, акажацца ў стане, не прыдатным для выкарыстання.

Дагаворам арэнды могуць быць устаноўлены і іншыя падставы датэрміновага скасавання дагавора па патрабаванні арандатара ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 420 гэтага Кодэкса.

Артыкул 592. Пераважнае права арандатара на заключэнне дагавора арэнды на новы тэрмін

1. Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам арэнды, арандатар, які належным чынам выконваў свае абавязкі, пасля сканчэння тэрміну дагавора мае пры іншых роўных умовах пераважнае перад іншымі асобамі права на заключэнне дагавора арэнды на новы тэрмін. Арандатар абавязаны пісьмова паведаміць арэндадаўцу аб жаданні заключыць такі дагавор у тэрмін, указаны ў дагаворы арэнды, а калі ў дагаворы такі тэрмін не ўказаны, – у разумны тэрмін да заканчэння дзеяння дагавора.

Пры заключэнні дагавора арэнды на новы тэрмін умовы дагавора могуць быць зменены па пагадненні бакоў.

Калі арэндадавец адмовіў арандатару ў заключэнні дагавора на новы тэрмін, але на працягу года з дня сканчэння тэрміну дагавора з ім заключыў дагавор арэнды з іншай асобай, арандатар мае права па сваім выбары запатрабаваць у судзе пераводу на сябе правоў і абавязкаў па заключаным дагаворы і пакрыцця страт, прычыненых адмовай аднавіць з ім дагавор арэнды, або толькі пакрыцця такіх страт.

2. Калі арандатар працягвае карыстацца маёмасцю пасля сканчэння тэрміну дагавора пры адсутнасці пярэчанняў з боку арэндадаўца, дагавор лічыцца адноўленым на тых жа ўмовах на нявызначаны тэрмін (артыкул 581).

Артыкул 593. Вяртанне арандаванай маёмасці арэндадаўцу

Пры спыненні дагавора арэнды арандатар абавязаны вярнуць арэндадаўцу маёмасць у тым стане, у якім ён яе атрымаў, з улікам нармальнага зносу ці ў стане, абумоўленым дагаворам.

Калі арандатар не вярнуў арандаваную маёмасць або вярнуў яе несвоечасова, арэндадавец мае права запатрабаваць унясення арэнднай платы за ўвесь час пратэрміноўкі. У выпадку, калі ўказаная плата не пакрывае прычыненых арэндадаўцу страт, ён можа запатрабаваць іх пакрыцця.

У выпадку, калі за нясвоечасовае вяртанне арандаванай маёмасці дагаворам прадугледжана няўстойка, страты могуць быць спагнаны ў поўнай суме звыш няўстойкі, калі іншае не прадугледжана дагаворам.

Артыкул 594. Паляпшэнне арандаванай маёмасці

1. Праведзеныя арандатарам аддзяляльныя паляпшэнні арандаванай маёмасці з'яўляюцца яго ўласнасцю, калі іншае не прадугледжана дагаворам арэнды.

2. У выпадку, калі арандатар зрабіў за кошт уласных сродкаў і са згоды арэндадаўца паляпшэнні арандаванай маёмасці, неаддзельныя без шкоды для маёмасці, арандатар мае права пасля спынення дагавора на пакрыццё кошту гэтых паляпшэнняў, калі іншае не прадугледжана дагаворам арэнды.

3. Кошт неаддзельных паляпшэнняў арандаванай маёмасці, праведзеных арандатарам без згоды арэндадаўца, пакрыццю не падлягае, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам.

4. Паляпшэнні арандаванай маёмасці, як аддзяляльныя, так і неаддзяляльныя, праведзеныя за кошт амартызацыйных адлічэнняў ад гэтай маёмасці, з'яўляюцца ўласнасцю арэндадаўца.

5. Ажыццяўленне арандатарам неаддзяляльных паляпшэнняў арандаванай дзяржаўнай маёмасці, а таксама іншай арандаванай маёмасці ў выпадках, вызначаных заканадаўчымі актамі, не можа з'яўляцца падставай для павелічэння арэнднай платы гэтаму арандатару.

Артыкул 595. Выкуп арандаванай маёмасці

1. У заканадаўстве ці дагаворы арэнды можа быць прадугледжана, што арандаваная маёмасць можа быць выкуплена арандатарам пасля сканчэння тэрміну арэнды ці да яго сканчэння пры ўмове ўнясення арандатарам усёй абумоўленай дагаворам выкупной цаны.

2. Калі ўмова аб выкупе арандаванай маёмасці не прадугледжана ў дагаворы арэнды, яна можа быць устаноўлена дадатковым пагадненнем бакоў, якія пры гэтым маюць права дамовіцца аб заліку раней выплачанай арэнднай платы ў выкупную цану.

3. Заканадаўствам могуць быць устаноўлены выпадкі забароны выкупу арандаванай маёмасці.

Артыкул 596. Асаблівасці асобных відаў дагавора арэнды і дагавораў арэнды асобных відаў маёмасці

Да асобных відаў дагавора арэнды і дагавораў арэнды асобных відаў маёмасці (пракат, арэнда транспартных сродкаў, арэнда капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), ізаляваных памяшканняў, машына-месцаў, іх частак, арэнда прадпрыемства, фінансавая арэнда (лізінг)) палажэнні, прадугледжаныя гэтым параграфам, прымяняюцца, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

§ 2. Пракат

Артыкул 597. Дагавор пракату

1. Паводле дагавора пракату арэндадавец, які ажыццяўляе здачу маёмасці ў арэнду ў якасці пастаяннай прадпрымальніцкай дзейнасці, абавязваецца даць арандатару рухомую маёмасць за плату ў часовае валоданне і карыстанне.

Маёмасць, дадзеная паводле дагавора пракату, выкарыстоўваецца для спажывецкіх мэт, калі іншае не прадугледжана дагаворам ці не вынікае з сутнасці абавязацельства.

2. Дагавор пракату заключаецца ў пісьмовай форме.

3. Дагавор пракату з'яўляецца публічным дагаворам (артыкул 396).

Артыкул 598. Тэрмін дагавора пракату

1. Дагавор пракату заключаецца на тэрмін да аднаго года.

2. Правілы аб аднаўленні дагавора арэнды на нявызначаны тэрмін і аб пераважным праве арандатара на аднаўленне дагавора арэнды (артыкул 592) да дагавора пракату не прымяняюцца.

3. Арандатар мае права адмовіцца ад дагавора пракату ў любы час.

Артыкул 599. Даванне маёмасці арандатару

Арэндадавец, які заключае дагавор пракату, абавязаны ў прысутнасці арандатара праверыць спраўнасць маёмасці, якая здаецца ў арэнду, а таксама

азнаёміць арандатара з правіламі эксплуатацыі маёмасці або выдаць яму пісьмовыя інструкцыі аб карыстанні гэтай маёмасцю.

Артыкул 600. Ліквідацыя недахопаў здадзенай у арэнду маёмасці

1. Пры выяўленні арандатарам недахопаў здадзенай у арэнду маёмасці, якія поўнасцю ці часткова перашкаджаюць карыстанню ёй, арэндадавец абавязаны ў дзесяцідзённы тэрмін з дня заявы арандатара аб недахопах, калі больш кароткі тэрмін не ўстаноўлены дагаворам пракату, бязвыплатна ліквідаваць недахопы маёмасці на месцы або зрабіць замену дадзенай маёмасці іншай аналагічнай маёмасцю, якая знаходзіцца ў належным стане.

2. Калі недахопы арандаванай маёмасці з'явіліся вынікам парушэння арандатарам правілаў эксплуатацыі і ўтрымання маёмасці, арандатар аплачвае арэндадаўцу кошт рамонту і транспарціроўкі маёмасці.

Артыкул 601. Арэндная плата паводле дагавора пракату

1. Арэндная плата паводле дагавора пракату ўстанаўліваецца ў выглядзе вызначаных у цвёрдай суме выплат, якія ўносяцца перыядычна ці аднаразова.

2. У выпадку датэрміновага вяртання маёмасці арандатарам арэндадавец вяртае яму адпаведную частку атрыманай арэнднай платы, вылічваючы яе з дня, які ідзе следам за днём фактычнага вяртання маёмасці.

3. Запазычанасць па арэнднай плаце спаганяецца з арандатара ў бясспрэчным парадку на падставе выканаўчага надпісу натарыуса, дыпламатычнага агента дыпламатычнага прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь і консульскай службовай асобы консульскай установы Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 602. Карыстанне арандаванай маёмасцю

1. Капітальны і бягучы рамонт маёмасці, здадзенай у арэнду паводле дагавора пракату, з'яўляецца абавязкам арэндадаўца.

У выпадку невыканання гэтага абавязку плата за пракат за час, на працягу якога арандатар не мог карыстацца гэтай маёмасцю, не збіраецца.

2. Здача ў субарэнду маёмасці, дадзенай арандатару паводле дагавора пракату, перадача ім сваіх правоў і абавязкаў паводле дагавора пракату іншай асобе, даванне гэтай маёмасці ў бязвыплатнае карыстанне, заклад арэндных правоў і ўнясенне іх у якасці маёмаснага ўкладу ў гаспадарчыя таварыствы і суполкі ці паявога ўзносу ў вытворчыя кааператывы не дапускаюцца.

§ 3. Арэнда транспартных сродкаў

1. Арэнда транспартнага сродку з аказаннем паслуг па кіраванні і тэхнічнай эксплуатацыі (арэнда транспартнага сродку з экіпажам)

Артыкул 603. Дагавор арэнды транспартнага сродку з экіпажам

1. Паводле дагавора арэнды (фрахтавання на час) транспартнага сродку з экіпажам арэндадавец дае арандатару транспартны сродак за плату ў часовае валоданне і карыстанне і аказвае сваімі сіламі паслугі па кіраванні ім і па яго тэхнічнай эксплуатацыі.

2. Правілы аб аднаўленні дагавора арэнды на нявызначаны тэрмін і аб пераважным праве арандатара на заключэнне дагавора арэнды на новы тэрмін (артыкул 592) да дагавора арэнды транспартнага сродку з экіпажам не прымяняюцца.

Артыкул 604. Форма дагавора арэнды транспартнага сродку з экіпажам

Дагавор арэнды транспартнага сродку з экіпажам павінен быць заключаны ў пісьмовай форме незалежна ад яго тэрміну. Да такога дагавора арэнды не прымяняюцца правілы аб рэгістрацыі дагавораў арэнды, прадугледжаныя пунктам 2 артыкула 580 гэтага Кодэкса.

Артыкул 605. Абавязак арэндадаўца па ўтрыманні транспартнага сродку

Арэндадавец на працягу ўсяго тэрміну дагавора арэнды транспартнага сродку з экіпажам абавязаны падтрымліваць належны стан здадзенага ў арэнду транспартнага сродку, уключаючы ажыццяўленне бягучага і капітальнага рамонту і даванне неабходнага прыладдзя.

Артыкул 606. Абавязкі арэндадаўца па кіраванні і тэхнічнай эксплуатацыі транспартнага сродку

1. Паслугі па кіраванні і тэхнічнай эксплуатацыі транспартнага сродку, якія арэндадавец аказвае арандатару, павінны забяспечыць яго нармальную і бяспечную эксплуатацыю ў адпаведнасці з мэтамі арэнды, указанымі ў дагаворы. Дагаворам арэнды транспартнага сродку з экіпажам можа быць прадугледжаны шырэйшае кола паслуг, якія аказваюцца арандатару.

2. Склад экіпажа транспартнага сродку і яго кваліфікацыя павінны адпавядаць абавязковым для бакоў правілам і ўмовам дагавора, а калі абавязковымі для бакоў правіламі такія патрабаванні не ўстаноўлены, – патрабаванням звычайнай практыкі эксплуатацыі транспартнага сродку гэтага віду і ўмовам дагавора.

Члены экіпажа з'яўляюцца работнікамі арэндадаўца. Яны падпарадкоўваюцца распараджэнням арэндадаўцы, якія адносяцца да кіравання і тэхнічнай эксплуатацыі, і распараджэнням арандатара, якія адносяцца да камерцыйнай эксплуатацыі транспартнага сродку.

Калі дагаворам арэнды не прадугледжана іншае, расходы па аплаце паслуг членаў экіпажа, а таксама расходы на іх утрыманне нясе арэндадавец.

Артыкул 607. Абавязак арандатара па аплаце расходаў, звязаных з камерцыйнай эксплуатацыяй транспартнага сродку

Калі іншае не прадугледжана дагаворам арэнды транспартнага сродку з экіпажам, арандатар нясе расходы, якія ўзнікаюць у сувязі з камерцыйнай эксплуатацыяй транспартнага сродку, у тым ліку расходы на аплату паліва, іншых матэрыялаў, якія расходуюцца ў працэсе эксплуатацыі, і на аплату збораў.

Артыкул 608. Страхаванне транспартнага сродку

Калі іншае не прадугледжана дагаворам арэнды транспартнага сродку з экіпажам, абавязак страхаваць транспартны сродак і (ці) страхаваць адказнасць за ўрон, які можа быць прычынены ім ці ў сувязі з яго эксплуатацыяй, ускладаецца на арэндадаўца ў выпадку, калі такі абавязак вынікае з добраахвотна прынятага абавязацельства па заключэнні дагавора страхавання.

Артыкул 609. Дагаворы з трэцімі асобамі аб выкарыстанні транспартнага сродку

1. Калі дагаворам арэнды транспартнага сродку з экіпажам не прадугледжана іншае, арандатар мае права без згоды арэндадаўца здаваць транспартны сродак у субарэнду.

2. Арандатар у рамках ажыццяўлення камерцыйнай эксплуатацыі арандаванага транспартнага сродку мае права без згоды арэндадаўца ад свайго імя заключаць з

трэцімі асобамі дагаворы перавозкі і іншыя дагаворы, калі яны не супярэчаць мэтам выкарыстання транспартнага сродку, указаным у дагаворы арэнды, а калі такія мэты не ўстаноўлены, – прызначэнню транспартнага сродку.

Артыкул 610. Адказнасць за шкоду, прычыненую транспартнаму сродку

У выпадку гібелі ці пашкоджання арандаванага транспартнага сродку арандатар абавязаны кампенсаваць арэндадаўцу прычыненыя страты, калі апошні дакажа, што гібель ці пашкоджанне транспартнага сродку адбыліся з-за абставін, за якія арандатар адказвае ў адпаведнасці з заканадаўствам ці дагаворам арэнды.

Артыкул 611. Адказнасць за шкоду, прычыненую транспартным сродкам

Адказнасць за шкоду, прычыненую трэцім асобам арандаваным транспартным сродкам, яго механізмамі, прыладдзем, абсталяваннем, нясе арэндадавец у адпаведнасці з правіламі, прадугледжанымі главой 58 гэтага Кодэкса. Ён мае права прад'явіць да арандатара рэгрэснае патрабаванне аб пакрыцці сум, выплачаных трэцім асобам, калі дакажа, што шкода ўзнікла па віне арандатара.

Артыкул 612. Асаблівасці арэнды асобных відаў транспартных сродкаў

Транспартнымі статутамі, кодэксамі і іншымі актамі заканадаўства могуць быць устаноўлены іншыя, апрача прадугледжаных гэтым параграфам, асаблівасці арэнды асобных відаў транспартных сродкаў з аказаннем паслуг па кіраванні і тэхнічнай эксплуатацыі.

2. Арэнда транспартнага сродку без аказання паслуг па кіраванні і тэхнічнай эксплуатацыі (арэнда транспартнага сродку без экіпажа)

Артыкул 613. Дагавор арэнды транспартнага сродку без экіпажа

Паводле дагавора арэнды транспартнага сродку без экіпажа арэндадавец дае арандатару транспартны сродак за плату ў часовае валоданне і карыстанне без аказання паслуг па кіраванні ім і яго тэхнічнай эксплуатацыі.

Правілы аб аднаўленні дагавора арэнды на нявызначаны тэрмін і аб пераважным праве арандатара на заключэнне дагавора арэнды на новы тэрмін (артыкул 592) да дагавора арэнды транспартнага сродку без экіпажа не прымяняюцца.

Артыкул 614. Форма дагавора арэнды транспартнага сродку без экіпажа

Дагавор арэнды транспартнага сродку без экіпажа павінен быць заключаны ў пісьмовай форме незалежна ад яго тэрміну. Да такога дагавора не прымяняюцца правілы аб рэгістрацыі дагавораў арэнды, прадугледжаныя пунктам 2 артыкула 580 гэтага Кодэкса.

Артыкул 615. Абавязак арандатара па ўтрыманні транспартнага сродку

Арандатар на працягу ўсяго тэрміну дагавора арэнды транспартнага сродку без экіпажа абавязаны падтрымліваць належны стан арандаванага транспартнага сродку, уключаючы ажыццяўленне бягучага і капітальнага рамонту.

Артыкул 616. Абавязкі арандатара па кіраванні транспартным сродкам і яго тэхнічнай эксплуатацыі

Арандатар сваімі сіламі ажыццяўляе кіраванне арандаваным транспартным сродкам і яго эксплуатацыю, як камерцыйную, так і тэхнічную.

Артыкул 617. Абавязак арандатара па аплаце расходаў на ўтрыманне транспартнага сродку

Калі іншае не прадугледжана дагаворам арэнды транспартнага сродку без экіпажа, арандатар нясе расходы на ўтрыманне арандаванага транспартнага сродку, яго страхаванне, уключаючы страхаванне сваёй адказнасці, а таксама расходы, якія ўзнікаюць у сувязі з яго эксплуатацыяй.

Артыкул 618. Дагаворы з трэцімі асобамі аб выкарыстанні транспартнага сродку

1. Калі дагаворам арэнды транспартнага сродку без экіпажа не прадугледжана іншае, арандатар мае права без згоды арэндадаўца здаваць арандаваны транспартны сродак у субарэнду на ўмовах дагавора арэнды транспартнага сродку з экіпажам ці без экіпажа.

2. Арандатар мае права без згоды арэндадаўца ад свайго імя заключаць з трэцімі асобамі дагаворы перавозкі і іншыя дагаворы, калі яны не супярэчаць мэтам выкарыстання транспартнага сродку, указаным у дагаворы арэнды, а калі такія мэты не ўстаноўлены, – прызначэнню транспартнага сродку.

Артыкул 619. Адказнасць за шкоду, прычыненую транспартным сродкам

Адказнасць за шкоду, прычыненую трэцім асобам транспартным сродкам, яго механізмамі, прыладдзем, абсталяваннем, нясе арандатар у адпаведнасці з правіламі главы 58 гэтага Кодэкса.

Артыкул 620. Асаблівасці арэнды асобных відаў транспартных сродкаў

Транспартнымі статутамі, кодэксамі і іншымі актамі заканадаўства могуць быць устаноўлены іншыя, апрача прадугледжаных гэтым параграфам, асаблівасці арэнды асобных відаў транспартных сродкаў без аказання паслуг па кіраванні і тэхнічнай эксплуатацыі.

§ 4. Арэнда капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), ізаляваных памяшканняў ці машына-месцаў

Артыкул 621. Дагавор арэнды капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), ізаляванага памяшкання ці машына-месца

1. Паводле дагавора арэнды капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), ізаляванага памяшкання ці машына-месца арэндадавец абавязваецца перадаць у часовае валоданне і карыстанне ці ў часовае карыстанне арандатару капітальную пабудову (будынак, збудаванне), ізаляванае памяшканне ці машына-месца.

Правілы гэтага параграфа прымяняюцца да арэнды часткі капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), ізаляванага памяшкання ці машына-месца, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам.

2. Правілы гэтага параграфа прымяняюцца да арэнды прадпрыемстваў, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства аб арэндзе прадпрыемства.

Артыкул 622. Форма дагавора арэнды капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), ізаляванага памяшкання ці машына-месца

Дагавор арэнды капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), ізаляванага памяшкання ці машына-месца заключаецца ў пісьмовай форме шляхам складання аднаго дакумента, падпісанага бакамі (пункт 2 артыкула 404).

Незахаванне формы дагавора арэнды капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), ізаляванага памяшкання ці машына-месца цягне за сабой яго несапраўднасць.

Артыкул 623. Правы на зямельны ўчастак пры арэндзе капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), якая знаходзіцца на ім

1. Паводле дагавора арэнды капітальнай пабудовы (будынка, збудавання) арандатару адначасова з перадачай правоў валодання і карыстання такой нерухомасцю дазваляецца выкарыстанне той часткі зямельнага ўчастка, якая занята гэтай нерухомасцю і неабходная для яе выкарыстання.

2. У выпадку, калі арэндадавец з'яўляецца ўласнікам зямельнага ўчастка, на якім знаходзіцца капітальная пабудова (будынак, збудаванне), якая здаецца ў арэнду, арандатару можа давацца права арэнды на зямельны ўчастак, дадзены для абслугоўвання гэтай капітальнай пабудовы (будынка, збудавання).

3. Арэнда капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), якая знаходзіцца на зямельным участку, што не належыць арэндадаўцу на праве ўласнасці, дапускаецца без згоды ўласніка гэтага ўчастка, калі гэта не супярэчыць умовам карыстання такім участкам, устаноўленым заканадаўствам ці дагаворам з уласнікам зямельнага ўчастка.

Артыкул 624. Захаванне за арандатарам капітальнай пабудовы (будынка, збудавання) права карыстання зямельным участкам пры яго продажы

У выпадках, калі зямельны ўчастак, на якім знаходзіцца арандаваная капітальная пабудова (будынак, збудаванне), прадаецца іншай асобе, за арандатарам гэтай капітальнай пабудовы (будынка, збудавання) захоўваецца права карыстання той часткай зямельнага ўчастка, якая занята капітальнай пабудовай (будынкам, збудаваннем) і неабходная для яе выкарыстання, на ўмовах, якія дзейнічалі да продажу зямельнага ўчастка.

Артыкул 625. Памер арэнднай платы

1. Дагавор арэнды капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), ізаляванага памяшкання ці машына-месца павінен прадугледжваць памер арэнднай платы. Пры адсутнасці ўзгодненай бакамі ў пісьмовай форме ўмовы аб памеры арэнднай платы дагавор арэнды капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), ізаляванага памяшкання ці машына-месца лічыцца незаключаным. Пры гэтым правілы вызначэння цаны, прадугледжаныя пунктам 3 артыкулы 394 гэтага Кодэкса, не прымяняюцца.

2. Устаноўленая ў дагаворы арэнды капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), ізаляванага памяшкання ці машына-месца плата за карыстанне капітальнай пабудовай (будынкам, збудаваннем), ізаляваным памяшканнем ці машына-месцам уключае плату за карыстанне зямельным участкам, на якім яна размешчана, ці адпаведнай часткай участка, якая перадаецца разам з ім, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам.

3. У выпадках, калі плата за арэнду капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), ізаляванага памяшкання ці машына-месца ўстаноўлена ў дагаворы на адзінку плошчы капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), ізаляванага памяшкання ці машына-месца або іншага паказчыка іх памеру, арэндная плата вызначаецца зыходзячы з фактычнага памеру перададзенай арандатару капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), ізаляванага памяшкання ці машына-месца.

Артыкул 626. Перадача капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), ізаляванага памяшкання ці машына-месца

1. Арэндадавец перадае капітальную пабудову (будынак, збудаванне), ізаляванае памяшканне ці машына-месца і арандатар яго прымае па перадатачным акце ці іншым дакуменце аб перадачы, які падпісваюць бакі.

Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам арэнды капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), ізаляванага памяшкання ці машына-месца, абавязацельства арэндадаўца перадаць капітальную пабудову (будынак, збудаванне), ізаляванае памяшканне ці машына-месца арандатару лічыцца выкананым пасля давання яго арандатару ў валоданне ці карыстанне і падпісання бакамі адпаведнага дакумента аб перадачы.

Ухіленне аднаго з бакоў ад падпісання дакумента аб перадачы капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), ізаляванага памяшкання ці машына-месца на ўмовах, прадугледжаных дагаворам, разглядаецца як адмова адпаведна арэндадаўца ад выканання абавязку па перадачы маёмасці, а арандатара – ад прыняцця маёмасці.

2. Пры спыненні дагавора арэнды капітальнай пабудовы (будынка, збудавання), ізаляванага памяшкання ці машына-месца арандаваная капітальная пабудова (будынак, збудаванне), ізаляванае памяшканне ці машына-месца павінна быць вернута арэндадаўцу з прытрымліваннем правілаў, прадугледжаных пунктам 1 гэтага артыкула.

§ 5. Арэнда прадпрыемства

Артыкул 627. Дагавор арэнды прадпрыемства

1. Паводле дагавора арэнды прадпрыемства ў цэлым як маёмаснага комплексу, які выкарыстоўваецца для прадпрымальніцкай дзейнасці, арэндадавец абавязваецца аддаць арандатару за плату ў часовае валоданне і карыстанне зямельныя ўчасткі, капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), абсталяванне і іншыя асноўныя сродкі, якія ўваходзяць у склад прадпрыемства, перадаць у парадку, на ўмовах і ў межах, якія вызначаюцца дагаворам, запасы сыравіны, паліва, матэрыялы і іншыя абаротныя сродкі, правы карыстання зямлёй, вадой і іншымі прыроднымі рэсурсамі, капітальнымі пабудовамі (будынкамі, збудаваннямі) і абсталяваннем, іншыя маёмасныя правы, звязаныя з прадпрыемствам, правы на знакі, якія індывідуалізуюць юрыдычную асобу, яго тавары (работы, паслугі), і іншыя выключныя правы, а таксама ўступіць яму правы патрабавання і перавесці на яго даўгі, якія адносяцца да прадпрыемства. Правы валодання і карыстання маёмасцю, якая знаходзіцца ва ўласнасці іншых асоб, у тым ліку зямлёй і іншымі прыроднымі рэсурсамі, перадаюцца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам.

2. Правы арэндадаўца, атрыманыя ім на падставе спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на займанне адпаведнай дзейнасцю, не падлягаюць перадачы арандатару, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам. Уключэнне ў склад прадпрыемства, якое перадаецца паводле дагавора, абавязацельстваў, выкананне якіх арандатарам немагчымае пры адсутнасці ў яго такога спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), не вызваляе арэндадаўца ад адпаведных абавязацельстваў перад крэдыторамі.

Артыкул 628. Правы крэдыторaў пры арэндзе прадпрыемства

1. Крэдыторы па абавязацельствах, уключаных у склад прадпрыемства да яго перадачы арандатару, павінны быць пісьмова апавешчаны арэндадаўцам аб перадачы прадпрыемства ў арэнду.

2. Крэдытор, які пісьмова не паведаміў арэндадаўцу аб сваёй згодзе на перавод доўгу, мае права на працягу трох месяцаў з дня атрымання паведамлення аб перадачы прадпрыемства ў арэнду запатрабаваць спынення ці датэрміновага выканання абавязацельства і пакрыцця прычыненых гэтым страт.

3. Крэдытор, які не быў апавешчаны аб перадачы прадпрыемства ў арэнду ў парадку, прадугледжаным пунктам 1 гэтага артыкула, можа прад'явіць іск аб задавальненні патрабаванняў, прадугледжаных пунктам 2 гэтага артыкула, на працягу года з моманту перадачы прадпрыемства ў арэнду.

4. Пасля перадачы прадпрыемства ў арэнду арэндадавец і арандатар нясуць салідарную адказнасць па ўключаных у склад перададзенага прадпрыемства даўгах, якія былі пераведзены на арандатара без згоды крэдытора.

Артыкул 629. Форма і дзяржаўная рэгістрацыя дагавора арэнды прадпрыемства

1. Дагавор арэнды прадпрыемства заключаецца ў пісьмовай форме шляхам складання аднаго дакумента, падпісанага бакамі (пункт 2 артыкула 404).

2. Дагавор арэнды прадпрыемства падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі і лічыцца заключаным з моманту такой рэгістрацыі.

3. Незахаванне формы дагавора арэнды прадпрыемства цягне за сабой яго несапраўднасць.

Артыкул 630. Перадача арандаванага прадпрыемства

Прадпрыемства перадаецца арандатару па перадатачным акце.

Падрыхтоўка прадпрыемства да перадачы, уключаючы складанне і прадстаўленне на падпісанне перадатачнага акта, з'яўляецца абавязкам арэндадаўца і ажыццяўляецца за яго кошт, калі іншае не прадугледжана дагаворам арэнды прадпрыемства.

Артыкул 631. Карыстанне маёмасцю арандаванага прадпрыемства

Калі іншае не прадугледжана дагаворам арэнды прадпрыемства, арандатар не мае права без згоды арэндадаўца прадаваць, абменьваць, даваць у часовае карыстанне або пазычаць матэрыяльныя каштоўнасці, якія ўваходзяць у склад маёмасці арандаванага прадпрыемства, здаваць іх у субарэнду і перадаваць свае правы і абавязкі паводле дагавора арэнды ў адносінах да такіх каштоўнасцей іншай асобе. Пры ажыццяўленні ўказаных здзелак са згоды арандатара не дапускаюцца змяншэнне кошту прадпрыемства і парушэнне іншых палажэнняў дагавора арэнды прадпрыемства. Указаны парадак не прымяняецца ў адносінах да зямлі і іншых прыродных рэсурсаў, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

Калі іншае не прадугледжана дагаворам арэнды прадпрыемства, арандатар мае права без згоды арэндадаўца ўносіць змяненні ў склад арандаванага маёмаснага комплексу, праводзіць яго рэканструкцыю, пашырэнне, тэхнічнае пераўзбраенне, якія павялічваюць яго кошт.

Артыкул 632. Абавязкі арандатара па ўтрыманні прадпрыемства і аплаце расходаў на яго эксплуатацыю

1. Арандатар прадпрыемства абавязаны на працягу ўсяго тэрміну дзеяння дагавора арэнды прадпрыемства падтрымліваць прадпрыемства ў належным тэхнічным стане, у тым ліку ажыццяўляць яго бягучы і капітальны рамонт.

2. На арандатара ўскладаюцца расходы, звязаныя з эксплуатацыяй арандаванага прадпрыемства, калі іншае не прадугледжана дагаворам, а таксама з выплачваннем плацяжоў па страхаванні арандаванай маёмасці.

Артыкул 633. Унясенне арандатарам паляпшэнняў у арандаванае прадпрыемства

Арандатар прадпрыемства мае права на пакрыццё яму кошту неаддзяляльных паляпшэнняў арандаванай маёмасці, калі яны праведзены са згоды арэндадаўца і іншае не прадугледжана дагаворам арэнды прадпрыемства.

Арэндадавец можа быць вызвалены судом ад абавязку пакрыцця арандатару кошту такіх паляпшэнняў, калі дакажа, што выдаткі арандатара на гэтыя паляпшэнні павышаюць кошт арандаванай маёмасці несуразмерна паляпшэнню яго якасці і (ці) эксплуатацыйных уласцівасцей ці пры ажыццяўленні такіх паляпшэнняў былі парушаны прынцыпы добрасумленнасці і разумнасці.

Артыкул 634. Прымяненне да дагавора арэнды прадпрыемства правілаў аб наступствах несапраўднасці здзелак, аб змяненні і скасаванні дагавора

Правілы гэтага Кодэкса аб наступствах несапраўднасці здзелак, аб змяненні і скасаванні дагавора, якія прадугледжваюць вяртанне ці спагнанне ў натуры атрыманага паводле дагавора з аднаго боку ці з абодвух бакоў, прымяняюцца да дагавора арэнды прадпрыемства, калі такія наступствы не парушаюць істотна правы і інтарэсы крэдыторaў, арэндадаўца і арандатара, іншых асоб, якія ахоўваюцца законам, і не супярэчаць дзяржаўным і грамадскім інтарэсам.

Артыкул 635. Вяртанне арандаванага прадпрыемства

Пры спыненні дагавора арэнды прадпрыемства арандаваны маёмасны комплекс павінен быць вернуты арэндадаўцу з прытрымліваннем правілаў, прадугледжаных артыкуламі 627, 628 і 630 гэтага Кодэкса. Падрыхтоўка прадпрыемства да перадачы арэндадаўцу, уключаючы складанне і прадстаўленне на падпісанне перадатачнага акта, з'яўляецца ў гэтым выпадку абавязкам арандатара і ажыццяўляецца за яго кошт, калі іншае не прадугледжана дагаворам.

§ 6. Фінансавая арэнда (лізінг)

Артыкул 636. Дагавор фінансавай арэнды (лізінгу)

Паводле дагавора фінансавай арэнды (лізінгу) (далей – дагавор фінансавай арэнды) арэндадавец (лізінгадавальнік), які з'яўляецца юрыдычнай асобай ці індывідуальным прадпрымальнікам, абавязваецца набыць ва ўласнасць указаную арандатарам (лізінгаатрымальнікам) маёмасць у вызначанага ім прадаўца (пастаўшчыка) і аддаць арандатару (лізінгаатрымальніку) гэту маёмасць, якая складае прадмет дагавора фінансавай арэнды, за плату ў часовае валоданне і карыстанне. Арэндадавец (лізінгадавальнік) у гэтым выпадку не нясе адказнасці за выбар прадмета дагавора фінансавай арэнды і прадаўца (пастаўшчыка).

Дагаворам фінансавай арэнды можа быць прадугледжана, што прадаўца (пастаўшчыка) і маёмасць, якая набываецца, выбірае арэндадавец (лізінгадавальнік).

Арандатар (лізінгаатрымальнік) можа выступіць у якасці прадаўца (пастаўшчыка) маёмасці, якая перадаецца яму ў якасці прадмета дагавора фінансавай арэнды.

Арэндадавец (лізінгадавальнік) мае права ажыццяўляць кантроль за захаванасцю прадмета дагавора фінансавай арэнды і падтрыманнем яго ў рабочым стане, прытрымліваннем устаноўленых ім абмежаванняў на выкарыстанне прадмета

дагавора фінансавай арэнды, у тым ліку перададзенага сублізінгаатрымальніку ў часовае валоданне і карыстанне паводле дагавора сублізінгу.

Артыкул 636[1]. Дагавор сублізінгу

Паводле дагавора сублізінгу арандатар (лізінгаатрымальнік) (сублізінгадавальнік паводле дагавора сублізінгу) перадае трэцяй асобе (сублізінгаатрымальніку) у межах сваіх правоў, дадзеных паводле дагавора фінансавай арэнды, у валоданне і карыстанне на вызначаны тэрмін за плату маёмасць, атрыманую ад арэндадаўца (лізінгадавальніка) паводле дагавора фінансавай арэнды, якая складае прадмет такога дагавора.

Згода арэндадаўца (лізінгадавальніка) на перадачу арандатарам (лізінгаатрымальнікам) (сублізінгадавальнікам паводле дагавора сублізінгу) прадмета дагавора фінансавай арэнды трэцяй асобе (сублізінгаатрымальніку) за плату ў часовае валоданне і карыстанне паводле дагавора сублізінгу павінна быць выказана ў пісьмовай форме.

Арандатар (лізінгаатрымальнік) (сублізінгадавальнік паводле дагавора сублізінгу) мае права ажыццяўляць кантроль за захаванасцю прадмета дагавора фінансавай арэнды і падтрыманнем яго ў рабочым стане, прытрымліваннем устаноўленых ім абмежаванняў на выкарыстанне прадмета дагавора фінансавай арэнды.

Да дагавораў сублізінгу прымяняюцца правілы аб дагаворах субарэнды, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам ці іншымі актамі заканадаўства.

Артыкул 637. Прадмет дагавора фінансавай арэнды

Прадметам дагавора фінансавай арэнды могуць быць любыя неспажывальныя рэчы, акрамя зямельных участкаў і іншых прыродных аб'ектаў.

Артыкул 638. Выключаны

Артыкул 639. Перадача арандатару (лізінгаатрымальніку) прадмета дагавора фінансавай арэнды

1. Калі іншае не прадугледжана дагаворам фінансавай арэнды, маёмасць, якая з'яўляецца прадметам гэтага дагавора, прадавец (пастаўшчык) перадае непасрэдна арандатару (лізінгаатрымальніку) у месцы знаходжання апошняга.

2. У выпадку, калі маёмасць, якая з'яўляецца прадметам дагавора фінансавай арэнды, не перададзена арандатару (лізінгаатрымальніку) ва ўказаны ў гэтым дагаворы тэрмін, а калі ў дагаворы такі тэрмін не ўказаны, – у разумны тэрмін, арандатар (лізінгаатрымальнік) мае права, калі пратэрміноўка дапушчана з-за абставін, за якія адказвае арэндадавец (лізінгадавальнік), запатрабаваць скасавання дагавора і пакрыцця страт.

Артыкул 640. Пераход да арандатара (лізінгаатрымальніка) рызыкі выпадковай гібелі ці выпадковага пашкоджання маёмасці

Рызыка выпадковай гібелі ці выпадковага пашкоджання арандаванай маёмасці пераходзіць да арандатара (лізінгаатрымальніка) у момант перадачы яму арандаванай маёмасці, калі іншае не прадугледжана дагаворам фінансавай арэнды.

Артыкул 641. Адказнасць прадаўца (пастаўшчыка)

1. Арандатар (лізінгаатрымальнік) мае права прад'яўляць непасрэдна прадаўцу (пастаўшчыку) маёмасці, якая з'яўляецца прадметам дагавора фінансавай арэнды, патрабаванні, якія вынікаюць з дагавора куплі-продажу (пастаўкі), заключанага паміж прадаўцом (пастаўшчыком) і арэндадаўцам (лізінгадавальнікам), у прыватнасці ў адносінах да якасці і камплектнасці маёмасці, тэрмінаў яе пастаўкі і ў іншых выпадках неналежнага выканання дагавора прадаўцом (пастаўшчыком). Пры

гэтым арандатар (лізінгаатрымальнік) мае права і нясе абавязкі, прадугледжаныя гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства для пакупніка, за выключэннем абавязку аплаціць набытую маёмасць, як калі б ён быў бокам дагавора куплі-продажу (пастаўкі) указанай маёмасці. Аднак арандатар (лізінгаатрымальнік) не можа скасаваць дагавор куплі-продажу (пастаўкі) з прадаўцом (пастаўшчыком) без згоды арэндадаўца (лізінгадавальніка).

У адносінах з прадаўцом (пастаўшчыком) арандатар (лізінгаатрымальнік) і арэндадавец (лізінгадавальнік) выступаюць як салідарныя крэдыторы (артыкул 307).

2. Калі іншае не прадугледжана дагаворам фінансавай арэнды, арэндадавец (лізінгадавальнік) не адказвае перад арандатарам (лізінгаатрымальнікам) за выкананне прадаўцом (пастаўшчыком) патрабаванняў, якія вынікаюць з дагавора куплі-продажу (пастаўкі), акрамя выпадкаў, калі адказнасць за выбар прадаўца (пастаўшчыка) ляжыць на арэндадаўцы (лізінгадавальніку). У апошнім выпадку арандатар (лізінгаатрымальнік) мае права па сваім выбары прад'яўляць патрабаванні, якія вынікаюць з дагавора куплі-продажу (пастаўкі), як непасрэдна прадаўцу (пастаўшчыку) маёмасці, так і арэндадаўцу (лізінгадавальніку), якія нясуць салідарную адказнасць.

ГЛАВА 35
НАЁМ ЖЫЛОГА ПАМЯШКАННЯ

Артыкул 642. Дагавор найму жылога памяшкання

Адносіны, якія вынікаюць з дагавора найму жылога памяшкання, рэгулююцца Жыллёвым кодэксам Рэспублікі Беларусь.

ГЛАВА 36
БЯЗВЫПЛАТНАЕ КАРЫСТАННЕ

Артыкул 643. Дагавор бязвыплатнага карыстання (пазыка)

1. Паводле дагавора бязвыплатнага карыстання (дагаворы пазыкі) адзін бок (пазыкадавальнік) абавязваецца перадаць ці перадае рэч у бязвыплатнае часовае карыстанне іншаму боку (пазыкаатрымальніку), а апошні абавязваецца вярнуць тую ж рэч у тым стане, у якім ён яе атрымаў, з улікам нармальнага зносу ці ў стане, абумоўленым дагаворам.

2. Да дагавора бязвыплатнага карыстання адпаведна прымяняюцца правілы, прадугледжаныя артыкулам 578, пунктам 1 і часткай першай пункта 2 артыкула 581, пунктамі 1 і 3 артыкула 586, пунктам 2 артыкула 592, пунктамі 1 і 3 артыкула 594 гэтага Кодэкса.

Артыкул 644. Пазыкадавальнік

1. Права перадачы рэчы ў бязвыплатнае карыстанне належыць яе ўласніку і іншым асобам, якім нададзена права на тое заканадаўствам ці ўласнікам.

2. Камерцыйная арганізацыя не мае права перадаваць маёмасць у бязвыплатнае карыстанне асобе, якая з'яўляецца ўласнікам маёмасці гэтай арганізацыі, яе заснавальнікам, удзельнікам, кіраўніком, членам яе органаў кіравання ці кантролю.

Артыкул 645. Даванне рэчы ў бязвыплатнае карыстанне

1. Пазыкадавальнік абавязаны аддаць рэч у стане, які адпавядае ўмовам дагавора бязвыплатнага карыстання і яе прызначэнню.

2. Рэч аддаецца ў бязвыплатнае карыстанне з усім яе прыладдзем і дакументамі, якія адносяцца да яе (інструкцыяй па выкарыстанні, тэхнічным пашпартам і да т.п.), калі іншае не прадугледжана дагаворам.

Калі такое прыладдзе і дакументы перададзены не былі, аднак без іх рэч не можа быць выкарыстана па прызначэнні або яе выкарыстанне ў значнай ступені губляе каштоўнасць для пазыкаатрымальніка, апошні мае права запатрабаваць перадачы яму такога прыладдзя і дакументаў або скасавання дагавора і пакрыцця панесенага ім рэальнага ўрону (пункт 2 артыкула 14).

Артыкул 646. Наступствы недавання рэчы ў бязвыплатнае карыстанне

Калі пазыкадавальнік не перадае рэч пазыкаатрымальніку, апошні мае права запатрабаваць скасавання дагавора бязвыплатнага карыстання і пакрыцця панесенага ім рэальнага ўрону.

Артыкул 647. Адказнасць за недахопы рэчы, перададзенай у бязвыплатнае карыстанне

1. Пазыкадавальнік адказвае за недахопы рэчы, якія ён наўмысна ці з-за грубай неасцярожнасці не агаварыў пры заключэнні дагавора бязвыплатнага карыстання.

Пры выяўленні такіх недахопаў пазыкаатрымальнік мае права на свой выбары запатрабаваць ад пазыкадавальніка бязвыплатнай ліквідацыі недахопаў рэчы ці пакрыцця сваіх расходаў на ліквідацыю недахопаў рэчы або запатрабаваць датэрміновага скасавання дагавора і пакрыцця панесенага ім рэальнага ўрону.

2. Пазыкадавальнік, апавешчаны аб патрабаваннях пазыкаатрымальніка ці аб яго намеры ліквідаваць недахопы рэчы за кошт пазыкадавальніка, можа без прамаруджання зрабіць замену няспраўнай рэчы іншай аналагічнай рэччу, якая знаходзіцца ў належным стане.

3. Пазыкадавальнік не адказвае за недахопы рэчы, якія былі ім агавораны пры заключэнні дагавора, або былі загадзя вядомыя пазыкаатрымальніку, або павінны былі быць выяўлены пазыкаатрымальнікам у час агляду рэчы ці праверкі яе спраўнасці пры заключэнні дагавора ці пры перадачы рэчы.

Артыкул 648. Правы трэціх асоб на рэч, якая перадаецца ў бязвыплатнае карыстанне

Перадача рэчы ў бязвыплатнае карыстанне не з'яўляецца падставай для змянення ці спынення правоў трэціх асоб на гэту рэч.

Пры заключэнні дагавора бязвыплатнага карыстання пазыкадавальнік абавязаны папярэдзіць пазыкаатрымальніка аб усіх правах трэціх асоб на гэту рэч (сервітуце, праве закладу і да т. п.). Невыкананне гэтага абавязку дае пазыкаатрымальніку права патрабаваць скасавання дагавора і пакрыцця панесенага ім рэальнага ўрону.

Артыкул 649. Абавязкі пазыкаатрымальніка па ўтрыманні рэчы

Пазыкаатрымальнік абавязаны падтрымліваць рэч, атрыманую ў бязвыплатнае карыстанне, у спраўным стане, уключаючы ажыццяўленне бягучага і капітальнага рамонту, і несці ўсе расходы па яе ўтрыманні, калі іншае не прадугледжана дагаворам бязвыплатнага карыстання.

Артыкул 650. Рызыка выпадковай гібелі ці выпадковага пашкоджання рэчы

Пазыкаатрымальнік нясе рызыку выпадковай гібелі ці выпадковага пашкоджання атрыманай у бязвыплатнае карыстанне рэчы, калі рэч загінула ці была сапсавана ў сувязі з тым, што ён выкарыстоўваў яе не ў адпаведнасці з дагаворам бязвыплатнага карыстання ці прызначэннем рэчы або перадаў яе трэцяй асобе без згоды пазыкадавальніка. Пазыкаатрымальнік нясе таксама рызыку выпадковай гібелі ці выпадковага пашкоджання рэчы, калі з улікам фактычных абставін мог прадухіліць яе гібель ці псаванне, ахвяраваўшы сваёй рэччу, але аддаў перавагу захаванню сваёй рэчы.

Артыкул 651. Адказнасць за шкоду, прычыненую трэцяй асобе ў выніку выкарыстання рэчы

Пазыкадавальнік адказвае за шкоду, прычыненую трэцяй асобе ў выніку выкарыстання рэчы, калі не дакажа, што шкода прычынена ў выніку намеру ці грубай неасцярожнасці пазыкаатрымальніка ці асобы, у якой гэта рэч апынулася са згоды пазыкадавальніка.

Артыкул 652. Датэрміновае скасаванне дагавора

1. Пазыкадавальнік мае права патрабаваць датэрміновага скасавання дагавора бязвыплатнага карыстання ў выпадках, калі пазыкаатрымальнік:

1) выкарыстоўвае рэч не ў адпаведнасці з дагаворам ці прызначэннем рэчы;

2) не выконвае абавязкаў па падтрыманні рэчы ў спраўным стане ці яе ўтрыманні;

3) істотна пагаршае стан рэчы;

4) без згоды пазыкадавальніка перадаў рэч трэцяй асобе.

2. Пазыкаатрымальнік мае права патрабаваць датэрміновага скасавання дагавора бязвыплатнага карыстання:

1) пры выяўленні недахопаў, якія робяць нармальнае выкарыстанне рэчы немагчымым ці абцяжарвальным, аб наяўнасці якіх ён не ведаў і не мог ведаць у момант заключэння дагавора;

2) калі рэч з прычыны абставін, за якія ён не адказвае, апынецца ў стане, не прыдатным для выкарыстання;

3) калі пры заключэнні дагавора пазыкадавальнік не папярэдзіў яго аб правах трэціх асоб на рэч, якая перадаецца;

4) пры невыкананні пазыкадавальнікам абавязку перадаць рэч або яе прыладдзе і дакументы, якія адносяцца да яе.

Артыкул 653. Адмова ад дагавора

1. Кожны з бакоў мае права ў любы час адмовіцца ад дагавора бязвыплатнага карыстання, заключанага без указання тэрміну, паведаміўшы аб гэтым іншаму боку за адзін месяц, калі дагаворам не прадугледжаны іншы тэрмін паведамлення.

2. Калі іншае не прадугледжана дагаворам, пазыкаатрымальнік мае права ў любы час адмовіцца ад дагавора, заключанага з указаннем тэрміну, у парадку, прадугледжаным пунктам 1 гэтага артыкула.

Артыкул 654. Змяненне бакоў у дагаворы

1. Пазыкадавальнік мае права зрабіць адчужэнне рэчы ці перадаць яе ў аплатнае карыстанне трэцяй асобе. Пры гэтым да новага ўласніка ці карыстальніка пераходзяць правы з раней заключанага дагавора бязвыплатнага карыстання, а яго правы ў адносінах да рэчы абцяжарваюцца правамі пазыкаатрымальніка.

2. У выпадку смерці грамадзяніна-пазыкадавальніка або рэарганізацыі ці ліквідацыі юрыдычнай асобы – пазыкадавальніка правы і абавязкі пазыкадавальніка паводле дагавора бязвыплатнага карыстання пераходзяць да спадчынніка

(праваперaемніка) ці да іншай асобы, да якой перайшло права ўласнасці на рэч ці іншае права, на падставе якога рэч была перададзена ў бязвыплатнае карыстанне.

У выпадку рэарганізацыі юрыдычнай асобы – пазыкаатрымальніка яго правы і абавязкі паводле дагавора пераходзяць да юрыдычнай асобы, якая з'яўляецца яго праваперaемнікам, калі іншае не прадугледжана дагаворам.

Артыкул 655. Спыненне дагавора

Дагавор бязвыплатнага карыстання спыняецца ў выпадку смерці грамадзяніна-пазыкаатрымальніка ці ліквідацыі юрыдычнай асобы – пазыкаатрымальніка, калі іншае не прадугледжана дагаворам.

ГЛАВА 37
ПАДРАД

§ 1. Агульныя палажэнні аб падрадзе

Артыкул 656. Дагавор падраду

1. Паводле дагавора падраду адзін бок (падрадчык) абавязваецца выканаць па заданні іншага боку (заказчыка) пэўную работу і здаць яе вынік заказчыку ва ўстаноўлены тэрмін, а заказчык абавязваецца прыняць вынік работы і аплаціць яго (заплаціць цану работы). Работа выконваецца за рызыку падрадчыка, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці пагадненнем бакоў.

2. Да асобных відаў дагавора падраду (бытавы падрад, будаўнічы падрад, падрад на праектныя і вышукальныя работы) палажэнні, прадугледжаныя гэтым параграфам, прымяняюцца, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства аб гэтых відах дагавораў.

Артыкул 657. Работы, якія выконваюцца паводле дагавора падраду

1. Дагавор падраду заключаецца на выраб ці перапрацоўку (апрацоўку) рэчы або на выкананне іншай работы з перадачай яе выніку заказчыку.

2. Паводле дагавора падраду, заключанаму на выраб рэчы, падрадчык перадае правы на яе заказчыку.

3. Калі іншае не прадугледжана дагаворам, падрадчык самастойна вызначае спосабы выканання задання заказчыка.

Артыкул 658. Выкананне работы коштам падрадчыка

1. Калі іншае не прадугледжана дагаворам, работа выконваецца коштам падрадчыка – з яго матэрыялаў, яго сіламі і сродкамі.

2. Падрадчык нясе адказнасць за неналежную якасць дадзеных ім матэрыялаў і абсталявання, а таксама за даванне матэрыялаў і абсталявання, абцяжараных правамі трэціх асоб.

Артыкул 659. Размеркаванне рызык паміж бакамі

1. Калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства ці дагаворам падраду:

1) рызыку выпадковай гібелі ці выпадковага пашкоджання матэрыялаў, абсталявання, перададзенай для перапрацоўкі (апрацоўкі) рэчы ці іншай маёмасці, якая выкарыстоўваецца для выканання дагавора, нясе бок, які даў іх;

2) рызыку выпадковай гібелі ці выпадковага пашкоджання выніку выкананай работы да яе прыёмкі заказчыкам нясе падрадчык.

2. Пры пратэрміноўцы перадачы ці прыёмкі выніку работы рызыкі, прадугледжаныя пунктам 1 гэтага артыкула, нясе бок, які дапусціў пратэрміноўку.

Артыкул 660. Генеральны падрадчык і субпадрадчык

1. Калі з акта заканадаўства ці дагавора падраду не вынікае абавязак падрадчыка выканаць прадугледжаную ў дагаворы работу асабіста, падрадчык мае права прыцягнуць да выканання сваіх абавязацельстваў іншых асоб (субпадрадчыкаў). У гэтым выпадку падрадчык выступае ў ролі генеральнага падрадчыка.

2. Падрадчык, які прыцягнуў да выканання дагавора падраду субпадрадчыка ў парушэнне палажэнняў пункта 1 гэтага артыкула ці дагавора, нясе перад заказчыкам адказнасць за страты, прычыненыя ўдзелам такога субпадрадчыка ў выкананні дагавора.

3. Генеральны падрадчык нясе перад заказчыкам адказнасць за наступствы невыканання ці неналежнага выканання абавязацельстваў субпадрадчыкам у адпаведнасці з правіламі пункта 1 артыкула 294 і артыкула 374 гэтага Кодэкса, а перад субпадрадчыкам – адказнасць за невыкананне ці неналежнае выкананне заказчыкам абавязацельстваў паводле дагавора падраду.

Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам, заказчык і субпадрадчык не маюць права прад'яўляць адзін аднаму патрабаванні, звязаныя з парушэннем дагавораў, заключаных кожным з іх з генеральным падрадчыкам.

4. Са згоды генеральнага падрадчыка заказчык мае права заключыць дагавор на выкананне асобных работ з іншымі асобамі. У гэтым выпадку ўказаныя асобы нясуць адказнасць за невыкананне ці неналежнае выкананне работы непасрэдна перад заказчыкам.

Артыкул 661. Умовы ўдзелу ў выкананні работы некалькіх асоб

1. Калі на баку падрадчыка выступаюць адначасова дзве асобы ці больш, пры непадзельнасці прадмета абавязацельства яны прызнаюцца ў адносінах да заказчыка салідарнымі даўжнікамі і адпаведна салідарнымі крэдыторамі.

2. Пры дзялімасці прадмета абавязацельства, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам ці дагаворам, кожная з указаных у пункце 1 гэтага артыкула асоб набывае права і нясе абавязкі ў адносінах да заказчыка ў межах сваёй долі (артыкул 302).

Артыкул 662. Тэрміны выканання работы

1. У дагаворы падраду ўказваюцца пачатковы і канчатковы тэрміны выканання работы. Па ўзгадненні паміж бакамі ў дагаворы могуць быць прадугледжаны таксама тэрміны пачатку і завяршэння асобных этапаў работы (прамежкавыя тэрміны).

Калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам ці не прадугледжана дагаворам, падрадчык нясе адказнасць за парушэнне як пачатковага і канчатковага, так і прамежкавых тэрмінаў выканання работ.

2. Указаныя ў дагаворы падраду пачатковы, канчатковы і прамежкавыя тэрміны выканання работы могуць быць зменены ў выпадках і парадку, прадугледжаных дагаворам.

3. Указаныя ў пункце 2 артыкула 376 гэтага Кодэкса наступствы пратэрміноўкі выканання надыходзяць пры парушэнні канчатковага тэрміну выканання работы.

Артыкул 663. Цана работы

1. У дагаворы падраду ўказваюцца цана падлеглай выкананню работы ці спосабы яе вызначэння. Пры адсутнасці ў дагаворы такіх указанняў цана

вызначаецца ў адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 394 гэтага Кодэкса зыходзячы з цэн, якія звычайна прымяняюцца за аналагічныя работы з улікам неабходных расходаў, панесеных бакамі.

2. Цана ў дагаворы падраду ўключае кампенсацыю выдаткаў падрадчыка і належную яму ўзнагароду.

3. Цана работы можа быць вызначана шляхам складання каштарыса.

У выпадку, калі работа выконваецца ў адпаведнасці з каштарысам, складзеным падрадчыкам, каштарыс набывае сілу і становіцца часткай дагавора падраду з моманту пацвярджэння яе заказчыкам.

4. Цана работы (каштарыс) можа быць цвёрдай ці прыблізнай. Пры адсутнасці іншых указанняў у дагаворы падраду цана работы лічыцца цвёрдай.

5. Калі ўзнікла неабходнасць у правядзенні дадатковых работ і з-за гэтай прычыны істотна перавышаецца цана работы, вызначаная прыблізна, падрадчык абавязаны своечасова папярэдзіць аб гэтым заказчыка. Заказчык, які не згадзіўся на перавышэнне ўказанай у дагаворы падраду цаны работы, мае права адмовіцца ад дагавора. У гэтым выпадку падрадчык можа патрабаваць ад заказчыка выплаты яму цаны за выкананую частку работы.

Падрадчык, які своечасова не папярэдзіў заказчыка аб неабходнасці перавышэння ўказанай у дагаворы цаны работы, абавязаны выканаць дагавор, захоўваючы права на аплату работы па цане, вызначанай у дагаворы.

6. Падрадчык не мае права патрабаваць павелічэння цвёрдай цаны (цвёрдага каштарыса), а заказчык – яе змяншэння, у тым ліку і ў выпадку, калі ў момант заключэння дагавора выключалася магчымасць прадугледзець поўны аб'ём падлеглай выкананню работы ці неабходных для гэтага расходаў.

Пры істотным узрастанні пасля заключэння дагавора кошту матэрыялаў і абсталявання, якія павінны быць дадзены падрадчыкам, а таксама паслуг, якія аказваюць яму трэція асобы, якія нельга было прадугледзець пры заключэнні дагавора, падрадчык мае права патрабаваць павелічэння ўстаноўленай цаны (каштарыса), а пры адмове заказчыка выканаць яго патрабаванне – скасавання дагавора ў адпаведнасці з артыкулам 421 гэтага Кодэкса.

Артыкул 664. Эканомія падрадчыка

1. У выпадках, калі фактычныя расходы падрадчыка аказаліся меншымі за тыя, якія ўлічваліся пры вызначэнні цаны (складанні каштарыса), падрадчык захоўвае права на аплату работ па цане, прадугледжанай дагаворам (каштарысам), калі заказчык не дакажа, што атрыманая падрадчыкам эканомія паўплывала на якасць выкананых работ.

2. У дагаворы падраду можа быць прадугледжана размеркаванне атрыманай падрадчыкам эканоміі паміж бакамі.

Артыкул 665. Парадак аплаты работы

1. Калі дагаворам падраду не прадугледжана папярэдняя аплата выкананай работы ці асобных яе этапаў, заказчык абавязаны заплаціць падрадчыку абумоўленую цану пасля канчатковай здачы вынікаў работы пры ўмове, што работа выканана належным чынам і ва ўзгоднены тэрмін, або са згоды заказчыка – датэрмінова.

2. Падрадчык мае права патрабаваць выплаты яму авансу або задатку толькі ў выпадках і памеры, указаных у заканадаўстве ці дагаворы падраду.

Артыкул 666. Права падрадчыка на ўтрыманне

Пры невыкананні заказчыкам абавязку выплаціць устаноўленую цану або іншую суму, належную падрадчыку ў сувязі з выкананнем дагавора падраду, падрадчык мае права на ўтрыманне ў адпаведнасці з артыкулам 340 гэтага Кодэкса выніку работ, а таксама прыналежнага заказчыку абсталявання, перададзенай для перапрацоўкі (апрацоўкі) рэчы, рэшты нявыкарыстанага матэрыялу і іншай маёмасці заказчыка, якая апынулася ў яго, да выплаты заказчыкам адпаведных сум.

Артыкул 667. Выкананне работы з выкарыстаннем матэрыялу заказчыка

1. Пры выкананні работы з выкарыстаннем матэрыялу заказчыка падрадчык абавязаны:

1) выкарыстоўваць дадзены заказчыкам матэрыял эканомна і ашчадна;

2) пасля заканчэння работы падаць заказчыку справаздачу аб зрасходаванні матэрыялу;

3) вярнуць яго рэшту або са згоды заказчыка зменшыць цану (каштарыс) работы з улікам кошту нявыкарыстанага матэрыялу, які застаецца ў падрадчыка.

2. Калі вынік работы не быў дасягнуты або дасягнуты вынік выявіўся з недахопамі, якія робяць яго непрыдатным для прадугледжанага ў дагаворы падраду выкарыстання, а пры адсутнасці ў дагаворы ўмовы выкарыстання – непрыдатным для звычайнага выкарыстання з-за прычын, выкліканых недахопамі дадзенага заказчыкам матэрыялу, падрадчык мае права запатрабаваць аплаты выкананай ім работы.

3. Падрадчык можа ажыццявіць правы, указаныя ў пункце 2 гэтага артыкула, у выпадку, калі дакажа, што недахопы дадзенага заказчыкам матэрыялу не маглі быць выяўлены пры належнай прыёмцы падрадчыкам гэтага матэрыялу.

Артыкул 668. Адказнасць падрадчыка за незахаванасць дадзенай заказчыкам маёмасці

Падрадчык нясе адказнасць за незахаванасць дадзенага заказчыкам матэрыялу, абсталявання, перададзенай для перапрацоўкі (апрацоўкі) рэчы ці іншай маёмасці, якая апынулася ў валоданні падрадчыка ў сувязі з выкананнем дагавора падраду.

Артыкул 669. Правы заказчыка ў час выканання работы падрадчыкам

1. Заказчык заўсёды мае права правяраць ход і якасць работы, якая выконваецца падрадчыкам, не ўмешваючыся ў яго дзейнасць.

2. Калі падрадчык не распачынае своечасова выкананне дагавора падраду ці выконвае работу настолькі марудна, што заканчэнне яе да тэрміну робіцца яўна немагчымым, заказчык мае права адмовіцца ад выканання дагавора і запатрабаваць пакрыцця страт.

3. Калі ў час выканання работы стане відавочным, што яна не будзе выканана належным чынам, заказчык мае права прызначыць падрадчыку разумны тэрмін для ліквідацыі недахопаў і пры невыкананні падрадчыкам у прызначаны тэрмін гэтага патрабавання адмовіцца ад дагавора або даручыць выпраўленне работы іншай асобе за кошт падрадчыка, а таксама запатрабаваць пакрыцця страт.

4. Калі іншае не прадугледжана дагаворам падраду, пры наяўнасці ўважлівых прычын заказчык можа ў любы час да здачы яму работы адмовіцца ад дагавора падраду, выплаціўшы падрадчыку частку ўстаноўленай цаны за работу, выкананую да атрымання паведамлення аб адмове заказчыка ад дагавора. Заказчык таксама абавязаны кампенсаваць падрадчыку страты, прычыненыя спыненнем дагавора, у межах розніцы паміж часткай цаны, выплачанай за выкананую работу, і цаной, вызначанай за ўсю работу.

Артыкул 670. Абставіны, аб якіх падрадчык абавязаны папярэдзіць заказчыка

1. Падрадчык абавязаны неадкладна папярэдзіць заказчыка і да атрымання ад яго ўказанняў прыпыніць работу пры выяўленні:

1) непрыдатнасці ці недабраякаснасці дадзенага заказчыкам матэрыялу, абсталявання, тэхнічнай дакументацыі ці перададзенай для перапрацоўкі (апрацоўкі) рэчы;

2) магчымых неспрыяльных для заказчыка і (ці) падрадчыка наступстваў выканання яго ўказанняў аб спосабе выканання работы;

3) іншых абставін, якія не залежаць ад падрадчыка і пагражаюць прыдатнасці ці трываласці вынікаў работы, якая выконваецца, або ствараюць немагчымасць яе завяршэння ў тэрмін.

2. Падрадчык, які не папярэдзіў заказчыка аб абставінах, пералічаных у пункце 1 гэтага артыкула, або які адтэрмінаваў работу, не чакаючы сканчэння ўстаноўленага ў дагаворы тэрміну, а пры яго адсутнасці – разумнага тэрміну для адказу на папярэджанне ці нягледзячы на своечасовае ўказанне заказчыка аб спыненні работ, не мае права пры прад'яўленні да яго ці ім да заказчыка адпаведных патрабаванняў спасылацца на ўказаныя абставіны.

3. Калі заказчык, нягледзячы на своечасовае і абгрунтаванае папярэджанне з боку падрадчыка аб абставінах, указаных у пункце 1 гэтага артыкула, у разумны тэрмін не заменіць непрыдатны ці недабраякасны матэрыял, абсталяванне, тэхнічную дакументацыю ці перададзеную для перапрацоўкі (апрацоўкі) рэч, не зменіць указанняў аб спосабе выканання работы ці не прыме іншых неабходных мер для ліквідацыі абставін, якія пагражаюць яе прыдатнасці, падрадчык мае права адмовіцца ад выканання дагавора падраду і запатрабаваць пакрыцця прычыненых яго спыненнем страт.

Артыкул 671. Садзейнічанне заказчыка

1. Заказчык абавязаны ў выпадках, парадку і аб'ёме, прадугледжаных дагаворам падраду, аказваць садзейнічанне падрадчыку ў выкананні работы.

Пры невыкананні заказчыкам гэтага абавязку падрадчык мае права патрабаваць пакрыцця прычыненых страт, уключаючы дадатковыя выдаткі, выкліканыя прастоем, або перанясення тэрмінаў выканання работ, або павелічэння ўказанай у дагаворы цаны работы.

2. У выпадках, калі выкананне работы паводле дагавора падраду стала немагчымым у выніку дзеянняў ці нядбайнасці заказчыка, падрадчык захоўвае права на выплату яму ўказанай у дагаворы цаны з улікам выкананай часткі работы.

Артыкул 672. Невыкананне заказчыкам сустрэчных абавязкаў паводле дагавора

1. Падрадчык мае права не распачынаць работу, а пачатую работу прыпыніць у выпадках, калі парушэнне заказчыкам сваіх абавязкаў паводле дагавора падраду, у прыватнасці недаванне матэрыялу, абсталявання, тэхнічнай дакументацыі ці падлеглай перапрацоўцы (апрацоўцы) рэчы, іх недабраякаснасць і непрыдатнасць, перашкаджаюць выкананню дагавора падрадчыкам, а таксама пры наяўнасці абставін, якія відавочна сведчаць аб тым, што выкананне ўказаных абавязкаў не будзе праведзена ва ўстаноўлены тэрмін (артыкул 309).

2. Калі іншае не прадугледжана дагаворам падраду, падрадчык пры наяўнасці абставін, указаных у пункце 1 гэтага артыкула, мае права адмовіцца ад выканання дагавора і запатрабаваць пакрыцця страт.

Артыкул 673. Прыёмка заказчыкам выкананай падрадчыкам работы

1. Заказчык абавязаны ў парадку і тэрміны, прадугледжаныя дагаворам падраду, з удзелам падрадчыка агледзець і прыняць вынік выкананай работы, а пры выяўленні адступленняў ад дагавора, якія пагаршаюць вынік работы, ці іншых недахопаў у рабоце неадкладна заявіць аб гэтым падрадчыку.

2. Заказчык, які выявіў пры прыёмцы недахопы ў выніку выкананай работы, мае права спасылацца на іх толькі ў выпадку, калі ў акце або ў іншым дакуменце, які сведчыць прыёмку, былі агавораны гэтыя недахопы або магчымасць наступнага прад'яўлення патрабавання аб іх ліквідацыі.

3. Калі іншае не прадугледжана дагаворам падраду, заказчык, які прыняў вынікі работы без праверкі, пазбаўляецца права спасылацца на недахопы работы, якія маглі быць выяўлены пры звычайным спосабе яе прыёмкі (яўныя недахопы).

4. Заказчык, які выявіў пасля прыёмкі выніку работы адступленні ад дагавора падраду ці іншыя недахопы, якія не маглі быць выяўлены пры звычайным спосабе прыёмкі (скрытыя недахопы), у тым ліку наўмысна скрытыя падрадчыкам, абавязаны паведаміць аб гэтым падрадчыку пасля іх выяўлення.

5. Пры ўзнікненні паміж заказчыкам і падрадчыкам спрэчкі наконт недахопаў выкананай работы ці іх прычын на патрабаванне любога з бакоў павінна быць прызначана экспертыза. Расходы на правядзенне экспертызы нясе падрадчык, за выключэннем выпадкаў, калі экспертызай не выяўлена парушэнняў дагавора падраду з боку падрадчыка ці прычыннай сувязі паміж дзеяннямі падрадчыка і выяўленымі недахопамі. У гэтых выпадках расходы на правядзенне экспертызы нясе бок, які запатрабаваў яе прызначэння, а калі экспертыза прызначана паводле пагаднення паміж бакамі, – абодва бакі пароўну.

6. Калі іншае не прадугледжана дагаворам падраду, пры ўхіленні заказчыка ад прыняцця выніку выкананай работы падрадчык мае права пасля сканчэння месяца з дня, калі згодна з дагаворам вынік работы павінен быў быць перададзены заказчыку, і пры ўмове наступнага двухкратнага папярэджання заказчыка прадаць вынікі работы, а выручаную суму, за вылікам усіх належных падрадчыку выплат, унесці на імя заказчыка ў дэпазіт у парадку, прадугледжаным артыкулам 308 гэтага Кодэкса.

7. Калі ўхіленне заказчыка ад прыняцця выкананай работы пацягнула за сабой пратэрміноўку ў здачы работы, прызнаецца, што рызыка яе выпадковай гібелі перайшла да заказчыка ў момант, калі перадача рэчы павінна была адбыцца.

Артыкул 674. Якасць работы

1. Якасць выкананай падрадчыкам работы павінна адпавядаць умовам дагавора падраду, а пры іх адсутнасці ці непаўнаце – патрабаванням, якія звычайна прад'яўляюцца да работ адпаведнага роду. Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам, вынік выкананай работы павінен у момант перадачы заказчыку валодаць якасцямі, указанымі ў дагаворы ці вызначанымі патрабаваннямі, якія звычайна прад'яўляюцца, і ў межах разумнага тэрміну быць прыдатным для ўстаноўленага дагаворам выкарыстання, а калі такое выкарыстанне дагаворам не прадугледжана, – для звычайнага выкарыстання выніку работы такога роду.

2. Калі заканадаўствам ці ва ўстаноўленым ім парадку прадугледжаны абавязковыя патрабаванні да работы, якая выконваецца паводле дагавора падраду, падрадчык, які дзейнічае ў якасці прадпрымальніка, абавязаны выконваць работу, прытрымліваючыся гэтых абавязковых патрабаванняў.

Артыкул 675. Гарантыя якасці работы

1. Калі ў адпаведнасці з заканадаўствам, дагаворам падраду прадугледжана даванне падрадчыкам заказчыку гарантыі якасці работы, падрадчык абавязаны перадаць заказчыку вынік работы, які павінен адпавядаць патрабаванням пункта 1 артыкула 674 гэтага Кодэкса на працягу ўсяго гарантыйнага тэрміну.

2. Гарантыя якасці выніку работы, калі іншае не прадугледжана дагаворам, распаўсюджваецца на ўсё, што складае вынік работы.

Артыкул 676. Адказнасць падрадчыка за неналежную якасць работы

1. У выпадках, калі работа выканана падрадчыкам з адступленнямі ад дагавора падраду, якія пагоршылі вынік работы, ці з іншымі недахопамі, якія робяць яго непрыдатным для прадугледжанага ў дагаворы выкарыстання, або пры адсутнасці ў дагаворы адпаведнай умовы – непрыдатнасці для звычайнага выкарыстання, заказчык мае права, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам ці дагаворам, па сваім выбары запатрабаваць ад падрадчыка:

1) бязвыплатнай ліквідацыі недахопаў у разумны тэрмін;

2) суразмернага змяншэння ўстаноўленай за работу цаны;

3) пакрыцця сваіх расходаў на ліквідацыю недахопаў, калі права заказчыка ліквідаваць іх прадугледжана ў дагаворы падраду (артыкул 368).

2. Падрадчык мае права замест ліквідацыі недахопаў, за якія ён адказвае, бязвыплатна выканаць работу нанава з пакрыццём заказчыку прычыненых пратэрміноўкай выканання страт. У гэтым выпадку заказчык абавязаны вярнуць раней перададзены яму вынік работы падрадчыку, калі паводле характару работы такое вяртанне магчымае.

3. Калі адступленні ў рабоце ад умоў дагавора падраду ці іншыя недахопы выніку работы ва ўстаноўлены заказчыкам разумны тэрмін не былі ліквідаваны або з'яўляюцца істотнымі і неадольнымі, заказчык мае права адмовіцца ад выканання дагавора і запатрабаваць пакрыцця прычыненых страт.

4. Умова дагавора падраду аб вызваленні падрадчыка ад адказнасці за пэўныя недахопы не вызваляе яго ад адказнасці, калі даказана, што такія недахопы ўзніклі ў выніку вінаватых дзеянняў ці бяздзейнасці падрадчыка.

5. Падрадчык, які даў матэрыял для выканання работы, адказвае за яго якасць па правілах аб адказнасці прадаўца за тавары неналежнай якасці (артыкул 445).

Артыкул 677. Тэрміны выяўлення неналежнай якасці выніку работы

1. Калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам ці дагаворам падраду, заказчык мае права прад'явіць патрабаванні, звязаныя з неналежнай якасцю выніку работы, пры ўмове, што яна выяўлена ў тэрміны, устаноўленыя гэтым артыкулам.

2. У выпадку, калі на вынік работы не ўстаноўлены гарантыйны тэрмін, патрабаванні, звязаныя з недахопамі выніку работы, могуць быць прад'яўлены заказчыкам пры ўмове, што яны былі выяўлены ў разумны тэрмін, але ў межах двух гадоў з дня перадачы выніку работы, калі іншыя тэрміны не ўстаноўлены заканадаўствам, дагаворам.

3. Заказчык мае права прад'явіць патрабаванні, звязаныя з недахопамі выніку работы, выяўленымі на працягу гарантыйнага тэрміну.

4. У выпадку, калі прадугледжаны дагаворам гарантыйны тэрмін складае менш чым два гады і недахопы выніку работы выяўлены заказчыкам пасля сканчэння гарантыйнага тэрміну, але ў межах двух гадоў з моманту, прадугледжанага пунктам 5 гэтага артыкула, падрадчык нясе адказнасць, калі заказчык дакажа, што недахопы

ўзніклі да перадачы выніку работы заказчыку ці з-за прычын, якія ўзніклі да гэтага моманту.

5. Калі іншае не прадугледжана дагаворам падраду, гарантыйны тэрмін (пункт 1 артыкула 675) пачынае ісці з моманту, калі вынік выканання работы быў прыняты ці павінен быў быць прыняты заказчыкам.

6. Да сканчэння гарантыйнага тэрміну паводле дагавора падраду прымяняюцца адпаведна правілы, якія ўтрымліваюцца ў пунктах 2 і 4 артыкула 441 гэтага Кодэкса, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам, пагадненнем бакоў ці не вынікае з асаблівасцей дагавора падраду.

Артыкул 678. Даўнасць па ісках аб неналежнай якасці работы

1. Тэрмін іскавай даўнасці для патрабаванняў, якія прад'яўляюцца ў сувязі з неналежнай якасцю работы, выкананай паводле дагавора падраду, складае адзін год, а ў адносінах да капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), незавершаных закансерваваных капітальных пабудоў, ізаляваных памяшканняў, машына-месцаў – тры гады.

2. Калі заканадаўствам ці дагаворам падраду ўстаноўлены гарантыйны тэрмін і заява наконт недахопаў выніку работы зроблена ў межах гарантыйнага тэрміну, цячэнне тэрміну іскавай даўнасці, указанага ў пункце 1 гэтага артыкула, пачынаецца з дня заявы аб недахопах.

3. Калі ў адпаведнасці з дагаворам падраду вынік работы прыняты заказчыкам па частках, цячэнне тэрміну іскавай даўнасці пачынаецца з дня прыёмкі выніку работы ў цэлым.

Артыкул 679. Абавязак падрадчыка перадаць інфармацыю заказчыку

Падрадчык абавязаны перадаць заказчыку разам з вынікам работы інфармацыю, якая датычыцца эксплуатацыі ці іншага выкарыстання прадмета дагавора падраду, калі гэта прадугледжана дагаворам ці характар інфармацыі такі, што без яе немагчыма выкарыстанне вынікаў работы для мэт, указаных у дагаворы.

Артыкул 680. Канфідэнцыяльнасць атрыманай бакамі дагавора падраду інфармацыі

Калі бок дзякуючы выкананню свайго абавязацельства паводле дагавора падраду атрымаў ад іншага боку інфармацыю аб новых рашэннях і тэхнічных ведах, у тым ліку тых, якія не карыстаюцца прававой аховай, а таксама звесткі, якія могуць разглядацца як камерцыйная тайна (артыкул 140), ён не мае права паведамляць іх трэцім асобам без згоды іншага боку.

Парадак і ўмовы карыстання такой інфармацыяй вызначаюцца пагадненнем бакоў.

Артыкул 681. Вяртанне падрадчыкам заказчыку матэрыялаў і абсталявання

У выпадках, калі заказчык на падставе пункта 2 артыкула 669 ці пункта 3 артыкула 676 гэтага Кодэкса скасоўвае дагавор падраду, падрадчык абавязаны вярнуць дадзеныя заказчыкам матэрыялы, абсталяванне, перададзеную для перапрацоўкі (апрацоўкі) рэч і іншую маёмасць або перадаць іх указанай заказчыкам асобе, а калі гэта выявілася немагчымым, – кампенсаваць кошт матэрыялаў, абсталявання і іншай маёмасці.

Артыкул 682. Наступствы спынення дагавора падраду да прыёмкі выніку работы

У выпадку спынення дагавора падраду на падставах, прадугледжаных заканадаўствам ці дагаворам, да прыёмкі заказчыкам выніку работы, выкананай падрадчыкам (пункт 1 артыкула 673), заказчык мае права патрабаваць перадачы яму выніку незавершанай работы з кампенсацыяй падрадчыку праведзеных затрат.

§ 2. Бытавы падрад

Артыкул 683. Дагавор бытавога падраду

1. Паводле дагавора бытавога падраду падрадчык, які ажыццяўляе прадпрымальніцкую дзейнасць, абавязваецца выканаць па заданні грамадзяніна (заказчыка) пэўную работу, прызначаную для задавальнення асабістых, хатніх, сямейных патрэбнасцей заказчыка, а заказчык абавязваецца прыняць і аплаціць работу.

2. Дагавор бытавога падраду з'яўляецца публічным дагаворам (артыкул 396).

3. Да адносін паводле дагавора бытавога падраду прымяняецца заканадаўства аб абароне правоў спажыўцоў.

Артыкул 684. Гарантыі правоў заказчыка

1. Падрадчык не мае права навязваць заказчыку ўключэнне ў дагавор бытавога падраду дадатковых аплатных работ і паслуг. Пры парушэнні гэтага патрабавання заказчык мае права адмовіцца ад аплаты работ і паслуг, не прадугледжаных дагаворам.

2. Заказчык мае права ў любы час да здачы яму выніку работы адмовіцца ад дагавора бытавога падраду, выплаціўшы падрадчыку частку ўстаноўленай цаны прапарцыянальна частцы работы, выкананай да паведамлення аб адмове заказчыка ад дагавора, і кампенсаваўшы падрадчыку расходы, праведзеныя да гэтага моманту з мэтай выканання дагавора, калі яны не ўваходзяць ва ўказаную частку цаны работы. Умовы дагавора, якія пазбаўляюць заказчыка гэтага права, нікчэмныя.

Артыкул 685. Форма дагавора

Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам бытавога падраду, у тым ліку ўмовамі фармуляраў і іншых стандартных формаў, да якіх далучаецца заказчык (артыкул 398), дагавор бытавога падраду лічыцца заключаным у належнай форме з моманту выдачы падрадчыкам заказчыку квітанцыі ці іншага дакумента, які пацвярджае заключэнне дагавора.

Артыкул 686. Публічная аферта паводле дагавора бытавога падраду

Да рэкламы і іншых прапаноў работ, якія выконваюцца паводле дагавора бытавога падраду, прымяняюцца адпаведна правілы аб публічнай аферце тавараў, якія ўтрымліваюцца ў артыкуле 407 гэтага Кодэкса.

Артыкул 687. Прад’яўленне заказчыку інфармацыі аб прапанаванай рабоце

1. Падрадчык абавязаны да заключэння дагавора бытавога падраду прад’явіць заказчыку неабходную і дакладную інфармацыю аб прапанаванай рабоце, яе відах і асаблівасцях, аб цане і форме аплаты, а таксама паведаміць заказчыку па яго просьбе іншыя звесткі, якія датычацца дагавора і адпаведнай работы. Калі з-за

характару работы гэта мае значэнне, падрадчык павінен паказаць заказчыку канкрэтную асобу, якая будзе яе выконваць.

2. Заказчык мае права патрабаваць скасавання заключанага дагавора бытавога падраду без аплаты выкананай работы, а таксама пакрыцця страт у выпадках, калі ў выніку непаўнаты ці няпэўнасці атрыманай ад падрадчыка інфармацыі быў заключаны дагавор на выкананне работы, якая не валодае ўласцівасцямі, якія меў на ўвазе заказчык.

3. Інфармацыя, указаная ў гэтым артыкуле, павінна быць прад'яўлена заказчыку на адной з дзяржаўных моў. Звесткі, паведамленыя ці перададзеныя на замежнай мове, лічацца непрад'яўленымі, за выключэннем выпадкаў, калі звесткі былі паведамлены ці перададзены на замежнай мове па жаданні заказчыка.

Артыкул 688. Выкананне работы з матэрыялу падрадчыка

1. Калі работа паводле дагавора бытавога падраду выконваецца з матэрыялу падрадчыка, матэрыял аплачваецца заказчыкам пры заключэнні дагавора поўнасцю ці ў частцы, указанай у дагаворы, з канчатковым разлікам пры атрыманні заказчыкам выкананай падрадчыкам работы.

У адпаведнасці з дагаворам бытавога падраду матэрыял можа быць дадзены падрадчыкам у крэдыт, у тым ліку з умовай аплаты заказчыкам матэрыялу ў растэрміноўку.

2. Змяненне пасля заключэння дагавора бытавога падраду цаны дадзенага падрадчыкам матэрыялу не цягне за сабой пераразліку.

Артыкул 689. Выкананне работы з матэрыялу заказчыка

Калі работа паводле дагавора бытавога падраду выконваецца з матэрыялу заказчыка, у квітанцыі ці іншым дакуменце, які падрадчык выдае заказчыку пры заключэнні дагавора, павінны быць указаны дакладнае найменне, апісанне і цана матэрыялу, якая вызначаецца па пагадненні бакоў. Цана матэрыялу, указаная ў квітанцыі ці іншым аналагічным дакуменце, можа быць аспрэчана заказчыкам у судовым парадку.

Артыкул 690. Цана і аплата работы

Цана работы ў дагаворы бытавога падраду вызначаецца пагадненнем бакоў і не можа быць вышэйшай за рэгуляваную адпаведнымі дзяржаўнымі органамі. Заказчык аплачвае работу пасля яе канчатковай здачы падрадчыкам. Са згоды заказчыка работа можа быць аплачана ім пры заключэнні дагавора поўнасцю ці шляхам выдачы авансу.

Артыкул 691. Папярэджанне заказчыка аб умовах выкарыстання выкананай работы

Пры здачы работы заказчыку падрадчык абавязаны паведаміць яму аб патрабаваннях, якія трэба выконваць для эфектыўнага і бяспечнага выкарыстання выніку работы, а таксама аб магчымых для самога заказчыка і іншых асоб наступствах незахавання адпаведных патрабаванняў.

Артыкул 692. Наступствы выяўлення недахопаў у выкананай рабоце

1. У выпадку выяўлення недахопаў у час прыёмкі выніку работы ці ў час яго выкарыстання заказчык можа на працягу агульных тэрмінаў даўнасці, прадугледжаных артыкулам 678 гэтага Кодэкса, а пры наяўнасці гарантыйных тэрмінаў – на працягу гэтых тэрмінаў па сваім выбары ажыццявіць адно з

прадугледжаных у артыкуле 676 гэтага Кодэкса правоў або запатрабаваць бязвыплатнага паўторнага выканання работы ці пакрыцця панесеных ім расходаў на выпраўленне недахопаў сваімі сродкамі ці трэцімі асобамі.

2. Патрабаванне аб бязвыплатнай ліквідацыі такіх недахопаў работы, выкананай паводле дагавора бытавога падраду, якія могуць уяўляць небяспеку для жыцця ці здароўя самога заказчыка і іншых асоб, можа быць прад'яўлена заказчыкам ці яго праваперaемнікам на працягу дзесяці гадоў з моманту прыняцця выніку работы, калі ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку не прадугледжаны больш працяглыя тэрміны (тэрміны службы). Такое патрабаванне можа быць прад'яўлена незалежна ад таго, калі выяўлены гэтыя недахопы, у тым ліку і пры выяўленні іх пасля заканчэння гарантыйнага тэрміну.

3. Пры невыкананні падрадчыкам патрабавання, прадугледжанага пунктам 2 гэтага артыкула, заказчык мае права на працягу таго ж тэрміну запатрабаваць або вяртання часткі цаны, заплачанай за работу, або пакрыцця расходаў, панесеных у сувязі з ліквідацыяй недахопаў заказчыкам сваімі сіламі ці з дапамогай трэціх асоб.

Артыкул 693. Наступствы няяўкі заказчыка за атрыманнем выніку работы

1. У выпадку няяўкі заказчыка за атрыманнем выніку выкананай работы ці іншага ўхілення заказчыка ад яго прыёмкі падрадчык мае права, пісьмова папярэдзіўшы заказчыка, пасля сканчэння двух месяцаў з дня такога папярэджання прадаць прадмет падраду за разумную цану, а выручаную суму, за вылікам усіх належных падрадчыку выплат, унесці ў дэпазіт у парадку, прадугледжаным артыкулам 308 гэтага Кодэкса.

2. Ва ўказаных у пункце 1 гэтага артыкула выпадках падрадчык можа замест продажу прадмета падраду скарыстацца правам на яго ўтрыманне (артыкул 340) ці спагнаць з заказчыка прычыненыя страты.

Артыкул 694. Наступствы смерці аднаго з бакоў у дагаворы бытавога падраду

У выпадках спынення дагавора бытавога падраду на падставах, прадугледжаных артыкулам 388 гэтага Кодэкса, наступствы спынення дагавора вызначаюцца па пагадненні паміж праваперaемнікам адпаведнага боку і яго контрагентам, а пры недасягненні імі пагаднення – судом з улікам памеру выкананай работы і яе цаны, кошту страчанага і захаванага матэрыялу, а таксама іншых істотных абставін.

Артыкул 695. Правы заказчыка ў выпадку неналежнага выканання ці невыканання работы паводле дагавора бытавога падраду

У выпадку неналежнага выканання ці невыканання работы паводле дагавора бытавога падраду заказчык можа скарыстацца правамі, дадзенымі пакупніку ў адпаведнасці з артыкуламі 473–475 гэтага Кодэкса.

§ 3. Будаўнічы падрад

Артыкул 696. Дагавор будаўнічага падраду

1. Паводле дагавора будаўнічага падраду падрадчык абавязваецца ва ўстаноўлены дагаворам тэрмін пабудаваць па заданні заказчыка пэўны аб'ект або

выканаць будаўнічыя і іншыя спецыяльныя мантажныя работы і здаць іх заказчыку, а заказчык абавязваецца стварыць падрадчыку неабходныя ўмовы для выканання работ, прыняць вынікі гэтых работ і выплаціць абумоўленую цану.

2. Дагавор будаўнічага падраду заключаецца на будаўніцтва ці рэканструкцыю капітальнай пабудовы (будынка, збудавання) ці іншага аб'екта, а таксама на выкананне будаўнічых і іншых спецыяльных мантажных работ. Правілы аб дагаворы будаўнічага падраду прымяняюцца да работ па капітальным рамонце капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў) і іншых аб'ектаў, калі іншае не прадугледжана дагаворам. Калі гэта прадугледжана дагаворам, падрадчык прымае на сябе абавязак забяспечыць эксплуатацыю аб'екта пасля прыняцця заказчыкам на працягу ўказанага ў дагаворы тэрміну.

3. У выпадках, калі паводле дагавора будаўнічага падраду выконваюцца работы для задавальнення асабістых, хатніх і сямейных патрэбнасцей грамадзяніна (заказчыка), да такога дагавора адпаведна прымяняюцца таксама правілы параграфа 2 гэтай главы аб правах заказчыка паводле дагавора бытавога падраду.

Артыкул 697. Размеркаванне рызыкі паміж бакамі

1. Рызыку выпадковай гібелі ці выпадковага пашкоджання аб'екта будаўніцтва, які складае прадмет дагавора будаўнічага падраду, да прыёмкі гэтага аб'екта заказчыкам нясе падрадчык.

2. Калі аб'ект будаўніцтва да яго прыёмкі заказчыкам загінуў ці пашкоджаны ў выніку недабраякаснасці дадзенага заказчыкам матэрыялу (дэталей, канструкцый) ці абсталявання або выканання памылковых указанняў заказчыка, падрадчык мае права патрабаваць аплаты ўсяго прадугледжанага каштарысам кошту работы пры ўмове, што ім былі выкананы абавязкі, прадугледжаныя пунктам 1 артыкула 670 гэтага Кодэкса.

Артыкул 698. Праектна-каштарысная дакументацыя

1. Падрадчык абавязаны ажыццяўляць будаўніцтва і звязаныя з ім работы ў адпаведнасці з праектнай дакументацыяй, якая ўстанаўлівае аб'ём, змест работ і іншыя патрабаванні, якія прад'яўляюцца да іх, у тым ліку з каштарыснай дакументацыяй (каштарысам), які вызначае цану работы. Пры адсутнасці іншых указанняў у дагаворы лічыцца, што падрадчык абавязаны выканаць усе работы, указаныя ў праектнай дакументацыі, у тым ліку каштарыснай дакументацыі (праектна-каштарыснай дакументацыі).

2. Дагаворам будаўнічага падраду павінны быць вызначаны склад і змест праектна-каштарыснай дакументацыі, а таксама павінна быць прадугледжана, які з бакоў і ў які тэрмін павінен прад’явіць адпаведную дакументацыю.

3. Падрадчык, які выявіў у ходзе будаўніцтва няўлічаныя ў праектна-каштарыснай дакументацыі работы і ў сувязі з гэтым неабходнасць правядзення дадатковых работ і павелічэння каштарыснага кошту будаўніцтва, абавязаны паведаміць аб гэтым заказчыку. Пры неатрыманні ад заказчыка адказу на сваё паведамленне на працягу дзесяці дзён, калі заканадаўствам ці дагаворам не прадугледжаны іншы тэрмін, падрадчык абавязаны прыпыніць адпаведныя работы з аднясеннем страт, выкліканых прастоем, на кошт заказчыка. Заказчык вызваляецца ад пакрыцця гэтых страт, калі дакажа адсутнасць неабходнасці ў правядзенні дадатковых работ.

4. Падрадчык, які не выканаў абавязкі, устаноўленыя пунктам 3 гэтага артыкула, пазбаўляецца права патрабаваць ад заказчыка аплаты выкананых ім

дадатковых работ і пакрыцця выкліканых гэтым страт, калі не дакажа неабходнасці неадкладных дзеянняў у інтарэсах заказчыка, у прыватнасці ў сувязі з тым, што прыпыненне работ магло прывесці да гібелі ці пашкоджання аб'екта будаўніцтва.

5. Пры згодзе заказчыка на правядзенне і аплату дадатковых работ падрадчык мае права адмовіцца ад іх выканання толькі ў выпадках, калі яны не ўваходзяць у сферу прафесійнай дзейнасці падрадчыка або не могуць быць выкананы падрадчыкам з-за прычын, якія не залежаць ад яго.

Артыкул 699. Унясенне змяненняў у праектна-каштарысную дакументацыю

1. Заказчык мае права патрабаваць унясення ў праектна-каштарысную дакументацыю змяненняў, не звязаных з дадатковымі расходамі для падрадчыка.

2. Змяненні праектна-каштарыснай дакументацыі, які патрабуюць дадатковых расходаў для падрадчыка, ажыццяўляюцца за кошт заказчыка на аснове ўзгодненага бакамі дадатковага каштарыса.

3. Падрадчык мае права патрабаваць у адпаведнасці з артыкулам 420 гэтага Кодэкса перагляду каштарыса, калі з-за прычын, якія не залежаць ад яго, кошт работ перавысіў каштарыс не менш чым на дзесяць працэнтаў.

4. Падрадчык мае права патрабаваць пакрыцця разумных расходаў, якія панесены ім у сувязі з выяўленнем і ліквідацыяй дэфектаў у праектна-каштарыснай дакументацыі.

Артыкул 700. Забеспячэнне будаўніцтва матэрыяламі і абсталяваннем

1. Абавязкі па забеспячэнні будаўніцтва матэрыяламі, у тым ліку дэталямі і канструкцыямі, ці абсталяваннем нясе падрадчык, калі дагаворам будаўнічага падраду не прадугледжана, што забеспячэнне будаўніцтва ў цэлым ці ў пэўнай частцы ажыццяўляе заказчык.

2. Бок, у абавязак якога ўваходзіць забеспячэнне будаўніцтва, нясе адказнасць за выяўленую немагчымасць выкарыстання дадзеных ёю матэрыялаў ці абсталявання без пагаршэння якасці работ, якія выконваюцца, калі не дакажа, што немагчымасць выкарыстання ўзнікла з-за абставін, за якія адказвае іншы бок.

3. У выпадках выяўленай немагчымасці выкарыстання без пагаршэння якасці работ якія выконваюцца, дадзеных заказчыкам матэрыялаў ці абсталявання падрадчык абавязаны запатрабаваць замены іх заказчыкам у разумны тэрмін, а пры невыкананні гэтага патрабавання падрадчык мае права адмовіцца ад дагавора будаўнічага падраду і запатрабаваць ад заказчыка выплаты цаны дагавора прапарцыянальна выкананай рабоце, а таксама пакрыцця страт, не пакрытых гэтай сумай.

Артыкул 701. Аплата работ

1. Заказчык аплачвае выкананыя падрадчыкам работы ў памеры, прадугледжаным каштарысам, у тэрміны і парадку, якія ўстаноўлены заканадаўствам і дагаворам будаўнічага падраду. Пры адсутнасці адпаведных указанняў у заканадаўстве ці дагаворы аплата работ праводзіцца ў адпаведнасці з артыкулам 665 гэтага Кодэкса.

2. Дагаворам будаўнічага падраду можа быць прадугледжана аплата работ аднаразова і ў поўным аб'ёме пасля прыёмкі аб'екта заказчыкам.

Артыкул 702. Дадатковыя абавязкі заказчыка паводле дагавора будаўнічага падраду

1. Заказчык абавязаны своечасова даць для будаўніцтва зямельны ўчастак такой плошчы і ў такім стане, якія ўказаны ў дагаворы будаўнічага падраду. Пры адсутнасці ў дагаворы такіх указанняў плошча і стан зямельнага ўчастка павінны забяспечваць своечасовы пачатак работ, нармальнае іх вядзенне і завяршэнне ў тэрмін.

2. Заказчык абавязаны ў выпадках і парадку, прадугледжаных дагаворам будаўнічага падраду, перадаваць падрадчыку ў карыстанне неабходныя для ажыццяўлення работ капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні) ці іншыя аб'екты, забяспечваць транспарціроўку грузаў на яго адрас, часовую падводку сетак энергазабеспячэння, вода- і газаправода і аказваць іншыя паслугі.

3. Аплата аказаных заказчыкам паслуг, указаных у пункце 2 гэтага артыкула, ажыццяўляецца ў выпадках і на ўмовах, прадугледжаных дагаворам будаўнічага падраду.

Артыкул 703. Кантроль і нагляд заказчыка за выкананнем работ паводле дагавора будаўнічага падраду

1. Заказчык мае права ажыццяўляць кантроль і нагляд за ходам і якасцю работ, якія выконваюцца, прытрымліваннем тэрмінаў іх выканання (графіка), якасцю дадзеных падрадчыкам матэрыялаў, а таксама правільнасцю выкарыстання падрадчыкам матэрыялаў заказчыка, не ўмешваючыся пры гэтым у аператыўна-гаспадарчую дзейнасць падрадчыка.

2. Заказчык, які выявіў пры ажыццяўленні кантролю і нагляду за выкананнем работ адступленні ад умоў дагавора будаўнічага падраду, якія могуць пагоршыць якасць работ, ці іншыя іх недахопы, абавязаны неадкладна заявіць аб гэтым падрадчыку. Заказчык, які не зрабіў такой заявы, губляе права ў далейшым спасылацца на выяўленыя ім недахопы.

3. Падрадчык абавязаны выконваць атрыманыя ў ходзе будаўніцтва ўказанні заказчыка, калі такія ўказанні не супярэчаць умовам дагавора будаўнічага падраду і не ўяўляюць сабой умяшанне ў аператыўна-гаспадарчую дзейнасць падрадчыка.

4. Падрадчык, які неналежным чынам выканаў работы, не мае права спасылацца на тое, што заказчык не ажыццяўляў кантроль і нагляд за іх выкананнем, акрамя выпадкаў, калі абавязак ажыццяўляць такі кантроль і нагляд ускладзены на заказчыка заканадаўствам.

Артыкул 704. Удзел інжынера (інжынернай арганізацыі) у ажыццяўленні правоў і выкананні абавязкаў заказчыка

Заказчык у мэтах ажыццяўлення кантролю і нагляду за будаўніцтвам і прыняцця ад яго імя рашэнняў ва ўзаемаадносінах з падрадчыкам можа заключыць самастойна без згоды падрадчыка дагавор аб аказанні заказчыку паслуг такога роду з адпаведным інжынерам (інжынернай арганізацыяй). У гэтым выпадку ў дагаворы будаўнічага падраду вызначаюцца функцыі такога інжынера (інжынернай арганізацыі), звязаныя з наступствамі яго дзеянняў для падрадчыка.

Артыкул 705. Супрацоўніцтва бакоў у дагаворы будаўнічага падраду

1. Калі пры выкананні будаўніцтва і звязаных з ім работ выяўляюцца перашкоды да належнага выканання дагавора будаўнічага падраду, кожны з бакоў абавязаны прыняць усе разумныя меры, якія залежаць ад яго, для ліквідацыі такіх перашкод. Бок, які не выканаў гэтага абавязку, губляе права на пакрыццё страт, прычыненых тым, што адпаведныя перашкоды не былі ліквідаваны.

2. Расходы боку, звязаныя з выкананнем абавязкаў, указаных у пункце 1 гэтага артыкула, падлягаюць пакрыццю іншым бокам у выпадках, калі гэта прадугледжана дагаворам будаўнічага падраду.

Артыкул 706. Абавязкі падрадчыка па ахове навакольнага асяроддзя і забеспячэнні бяспекі будаўнічых работ

1. Падрадчык абавязаны пры ажыццяўленні будаўніцтва і звязаных з ім работ выконваць патрабаванні заканадаўства аб ахове навакольнага асяроддзя і аб бяспецы будаўнічых работ і нясе адказнасць за парушэнне гэтых патрабаванняў.

2. Падрадчык не мае права выкарыстоўваць у ходзе работ матэрыялы і абсталяванне, дадзеныя заказчыкам, ці выконваць яго ўказанні, калі гэта можа прывесці да парушэння абавязковых для бакоў патрабаванняў аб ахове навакольнага асяроддзя і аб бяспецы будаўнічых работ.

Артыкул 707. Наступствы кансервацыі будаўніцтва

Калі з-за незалежных ад бакоў прычын работы паводле дагавора будаўнічага падраду прыпынены і аб'ект будаўніцтва закансерваваны, заказчык абавязаны аплаціць падрадчыку ў поўным аб'ёме выкананыя да моманту кансервацыі работы, а таксама кампенсаваць расходы, выкліканыя неабходнасцю спынення работ і кансервацыяй будаўніцтва з залікам выгад, якія падрадчык атрымаў ці мог атрымаць у выніку спынення работ.

Артыкул 708. Здача і прыёмка работ

1. Заказчык, які атрымаў паведамленне падрадчыка аб гатоўнасці да здачы выніку выкананых работ або, калі гэта прадугледжана дагаворам, выкананага этапу работы, абавязаны на працягу трох дзён прыступіць да іх прыёмкі.

2. Заказчык арганізуе і ажыццяўляе прыёмку выніку работы за свой кошт, калі іншае не прадугледжана дагаворам будаўнічага падраду.

У прадугледжаных заканадаўствам выпадках у прыёмцы выніку работы павінны ўдзельнічаць прадстаўнікі дзяржаўных органаў, органаў мясцовага кіравання і самакіравання.

3. Заказчык, які спачатку прыняў вынік асобнага этапу работ, нясе рызыку наступстваў гібелі ці пашкоджання выніку работ, якія надышлі не па віне падрадчыка.

4. Здача выніку работы падрадчыкам і прыёмка яго заказчыкам афармляюцца актам, падпісаным абодвума бакамі. Пры адмове аднаго з бакоў ад падпісання акта ў ім робіцца адзнака аб гэтым з указаннем матываў адмовы і акт падпісваецца іншым бокам.

Аднабаковы акт здачы ці прыёмкі выніку работ можа быць прызнаны судом несапраўдным толькі ў выпадку, калі матывы адмовы ад падпісання акта прызнаны ім абгрунтаванымі.

5. У выпадках, калі гэта прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам будаўнічага падраду або вынікае з характару работ, якія выконваюцца паводле дагавора, прыёмцы выніку работ павінны папярэднічаць папярэднія выпрабаванні. У гэтых выпадках прыёмка можа ажыццяўляцца толькі пры станоўчым выніку папярэдніх выпрабаванняў.

6. Заказчык мае права адмовіцца ад прыёмкі выніку работ у выпадку выяўлення недахопаў, якія выключаюць магчымасць яго выкарыстання для

ўказанай у дагаворы будаўнічага падраду мэты і не могуць быць ліквідаваны падрадчыкам ці заказчыкам.

Артыкул 709. Адказнасць падрадчыка за якасць работ

1. Падрадчык нясе адказнасць перад заказчыкам за дапушчаныя адступленні ад патрабаванняў, прадугледжаных у праектна-каштарыснай дакументацыі і абавязковых для бакоў будаўнічых нормах і правілах, а таксама за недасягненне ўказаных у праектна-каштарыснай дакументацыі паказчыкаў аб'екта будаўніцтва, у тым ліку такіх, як вытворчая магутнасць прадпрыемства.

2. Падрадчык не нясе адказнасці за дапушчаныя ім без згоды заказчыка дробныя адступленні ад праектна-каштарыснай дакументацыі, калі дакажа, што яны не паўплывалі на якасць аб'екта будаўніцтва.

Артыкул 710. Гарантыі якасці ў дагаворы будаўнічага падраду

1. Падрадчык, калі іншае не прадугледжана дагаворам будаўнічага падраду, гарантуе дасягненне аб'ектам будаўніцтва ўказаных у праектна-каштарыснай дакументацыі паказчыкаў і магчымасць эксплуатацыі аб'екта ў адпаведнасці з дагаворам будаўнічага падраду на працягу гарантыйнага тэрміну. Устаноўлены заканадаўствам гарантыйны тэрмін можа быць павялічаны пагадненнем бакоў.

2. Падрадчык нясе адказнасць за недахопы (дэфекты), выяўленыя ў межах гарантыйнага тэрміну, калі не дакажа, што яны адбыліся ў выніку нармальнага зносу аб'екта ці яго частак, няправільнай яго эксплуатацыі ці няправільнасці інструкцый па яго эксплуатацыі, распрацаваных самім заказчыкам ці прыцягнутымі ім трэцімі асобамі, неналежнага рамонту аб'екта, праведзенага самім заказчыкам ці прыцягнутымі ім трэцімі асобамі.

3. Цячэнне гарантыйнага тэрміну перапыняецца на ўвесь час, на працягу якога аб'ект не мог эксплуатавацца ў выніку недахопаў, за якія адказвае падрадчык.

4. Пры выяўленні на працягу гарантыйнага тэрміну недахопаў, указаных у пункце 1 артыкула 709 гэтага Кодэкса, заказчык (уласнік, уладальнік, карыстальнік) аб'екта мае права да сканчэння ўказанага тэрміну ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку запатрабаваць ад падрадчыка ліквідацыі недахопаў.

Артыкул 711. Тэрміны выяўлення неналежнай якасці будаўнічых работ

Пры прад'яўленні патрабаванняў, звязаных з неналежнай якасцю выніку работ, прымяняюцца правілы, прадугледжаныя пунктамі 1-5 артыкула 677 гэтага Кодэкса.

Пры гэтым гранічны тэрмін выяўлення недахопаў у адпаведнасці з пунктамі 2 і 4 артыкула 677 гэтага Кодэкса складае пяць гадоў.

Артыкул 712. Ліквідацыя недахопаў за кошт заказчыка

1. Дагаворам будаўнічага падраду можа быць прадугледжаны абавязак падрадчыка ліквідаваць па патрабаванні заказчыка і за яго кошт недахопы, за якія падрадчык не нясе адказнасці.

2. Падрадчык мае права адмовіцца ад выканання абавязку, указанага ў пункце 1 гэтага артыкула, у выпадках, калі ліквідацыя недахопаў не звязана непасрэдна з прадметам дагавора або не можа быць ажыццёўлена падрадчыкам з-за прычын, якія не залежаць ад яго.

§ 4. Падрад на выкананне праектных і вышукальных работ

Артыкул 713. Дагавор падраду на выкананне праектных і вышукальных работ

1. Паводле дагавора падраду на выкананне праектных і вышукальных работ падрадчык (праекціроўшчык, разведвальнік) абавязваецца па заданні заказчыка распрацаваць праектна-каштарысную дакументацыю і (ці) выканаць вышукальныя работы, а заказчык абавязваецца прыняць і аплаціць іх вынік.

2. Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам, рызыка выпадковай немагчымасці выканання дагавора на выкананне праектных і вышукальных работ ляжыць на заказчыку.

Артыкул 714. Зыходныя даныя для выканання праектных і вышукальных работ

1. Паводле дагавора падраду на выкананне праектных і вышукальных работ заказчык абавязаны перадаць падрадчыку заданне на праектаванне, а таксама іншыя зыходныя даныя, неабходныя для складання праектна-каштарыснай дакументацыі. Заданне на выкананне праектных работ можа быць па даручэнні заказчыка падрыхтавана падрадчыкам. У гэтым выпадку заданне становіцца абавязковым для бакоў з моманту яго зацвярджэння заказчыкам.

2. Падрадчык абавязаны выконваць патрабаванні, якія ўтрымліваюцца ў заданні і іншых зыходных даных для выканання праектных і вышукальных работ, і мае права адступіць ад іх толькі са згоды заказчыка.

Артыкул 715. Абавязкі падрадчыка

1. Паводле дагавора падраду на выкананне праектных і вышукальных работ падрадчык абавязаны:

1) выконваць работы ў адпаведнасці з зыходнымі данымі на праектаванне і дагаворам;

2) узгадняць гатовую праектна-каштарысную дакументацыю з заказчыкам, а пры неабходнасці разам з заказчыкам – з кампетэнтнымі дзяржаўнымі органамі і органамі мясцовага кіравання і самакіравання;

3) перадаць заказчыку гатовую праектна-каштарысную дакументацыю і вынікі вышукальных работ.

Падрадчык не мае права перадаваць праектна-каштарысную дакументацыю трэцім асобам без згоды заказчыка.

2. Падрадчык паводле дагавора падраду на выкананне праектных і вышукальных работ гарантуе заказчыку адсутнасць у трэціх асоб права перашкодзіць выкананню работ ці абмяжоўваць іх выкананне на аснове падрыхтаванай падрадчыкам праектна-каштарыснай дакументацыі.

Артыкул 716. Адказнасць падрадчыка за неналежнае выкананне праектных і вышукальных работ

1. Падрадчык паводле дагавора падраду на выкананне праектных і вышукальных работ нясе адказнасць за неналежнае выкананне праектна-каштарыснай дакументацыі і вышукальных работ, уключаючы недахопы, выяўленыя пасля ў ходзе будаўніцтва, а таксама ў працэсе эксплуатацыі аб'екта, створанага на аснове выкананай праектна-каштарыснай дакументацыі і даных вышукальных работ.

2. Пры выяўленні недахопаў у праектна-каштарыснай дакументацыі ці ў вышукальных работах падрадчык на патрабаванне заказчыка абавязаны бязвыплатна перарабіць праектна-каштарысную дакументацыю і адпаведна зрабіць неабходныя дадатковыя вышукальныя работы, а таксама кампенсаваць заказчыку прычыненыя страты, калі заканадаўствам ці дагаворам не ўстаноўлена іншае.

Артыкул 717. Абавязкі заказчыка

Паводле дагавора падраду на выкананне праектных і вышукальных работ заказчык абавязаны, калі іншае не прадугледжана дагаворам:

1) заплаціць падрадчыку ўстаноўленую цану поўнасцю пасля завяршэння ўсіх работ ці плаціць яе часткамі пасля завяршэння асобных этапаў работ;

2) выкарыстоўваць праектна-каштарысную дакументацыю, атрыманую ад падрадчыка, толькі на мэты, прадугледжаныя дагаворам, не перадаваць тэхнічную дакументацыю трэцім асобам і не выдаваць даныя, якія ўтрымліваюцца ў ёй, без згоды падрадчыка;

3) садзейнічаць падрадчыку ў выкананні праектных і вышукальных работ у аб'ёме і на ўмовах, прадугледжаных у дагаворы;

4) удзельнічаць разам з падрадчыкам ва ўзгадненні гатовай праектна-каштарыснай дакументацыі з адпаведнымі дзяржаўнымі органамі і органамі мясцовага кіравання і самакіравання;

5) кампенсаваць падрадчыку дадатковыя расходы, выкліканыя змяненнем зыходных даных для выканання праектных і вышукальных работ у выніку абставін, якія не залежаць ад падрадчыка;

6) прыцягнуць падрадчыка да ўдзелу ў справе па іску, прад'яўленым да заказчыка трэцяй асобай у сувязі з недахопамі складзенай праектна-каштарыснай дакументацыі ці выкананых вышукальных работ.

§ 5. Выключаны

Артыкул 718. Выключаны

Артыкул 719. Выключаны

Артыкул 720. Выключаны

Артыкул 721. Выключаны

Артыкул 722. Выключаны

ГЛАВА 38
ВЫКАНАННЕ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫХ РАБОТ, ВОПЫТНА-КАНСТРУКТАРСКІХ І ТЭХНАЛАГІЧНЫХ РАБОТ

Артыкул 723. Дагаворы на выкананне навукова-даследчых работ, вопытна-канструктарскіх і тэхналагічных работ

1. Паводле дагавора на выкананне навукова-даследчых работ адзін бок (выканаўца) абавязваецца правесці абумоўленыя тэхнічным заданнем заказчыка навуковыя даследаванні, а паводле дагавора на выкананне вопытна-канструктарскіх і тэхналагічных работ – распрацаваць узор новага вырабу, канструктарскую дакументацыю на яго ці новую тэхналогію, а іншы бок (заказчык) абавязваецца прыняць работу і аплаціць яе.

2. Дагавор з выканаўцам можа ахопліваць як увесь цыкл правядзення даследавання, распрацоўкі і вырабу ўзораў, так і асобныя яго этапы (элементы).

3. Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам, рызыку выпадковай немагчымасці выканання дагавораў на выкананне навукова-даследчых работ, вопытна-канструктарскіх і тэхналагічных работ нясе заказчык.

4. Выключаны.

Артыкул 724. Выкананне работ

1. Выканаўца абавязаны правесці навуковыя даследаванні асабіста. Ён мае права прыцягваць да выканання дагавора на выкананне навукова-даследчых работ трэціх асоб толькі са згоды заказчыка.

2. Пры выкананні вопытна-канструктарскіх ці тэхналагічных работ выканаўца мае права, калі іншае не прадугледжана дагаворам, прыцягваць да яго выканання трэціх асоб. Да адносін выканаўцы з трэцімі асобамі прымяняюцца правілы аб генеральным падрадчыку і субпадрадчыку (артыкул 660).

Артыкул 725. Канфідэнцыяльнасць звестак, якія складаюць прадмет дагавора

1. Калі іншае не прадугледжана дагаворамі на выкананне навукова-даследчых работ, вопытна-канструктарскіх і тэхналагічных работ, бакі абавязаны забяспечыць канфідэнцыяльнасць звестак, якія тычацца прадмета дагавора, ходу яго выканання і атрыманых вынікаў. Аб'ём звестак, якія прызнаюцца канфідэнцыяльнымі, вызначаецца ў дагаворы.

2. Кожны з бакоў абавязваецца публікаваць атрыманыя пры выкананні работы звесткі, прызнаныя канфідэнцыяльнымі, толькі са згоды іншага боку.

Артыкул 726. Правы бакоў на вынікі работ

1. Бакі ў дагаворах на выкананне навукова-даследчых работ, вопытна-канструктарскіх і тэхналагічных работ маюць права выкарыстоўваць вынікі работ, у тым ліку падлеглыя прававой ахове, у межах і на ўмовах, прадугледжаных дагаворам.

2. Калі іншае не прадугледжана дагаворам, права на вынікі работ, у тым ліку падлеглыя прававой ахове, у рамках прадмета дагавора належаць заказчыку, а выканаўца мае права выкарыстоўваць атрыманыя ім вынікі работ для ўласных патрэб.

Пад выкарыстаннем для ўласных патрэб не можа разумецца дзейнасць, накіраваная на сістэматычнае атрыманне прыбытку ад выкарыстання вынікаў работ.

Артыкул 727. Абавязкі выканаўцы

Выканаўца ў дагаворах на выкананне навукова-даследчых работ, вопытна-канструктарскіх і тэхналагічных работ абавязаны:

1) выканаць работу ў адпаведнасці з узгодненым з заказчыкам тэхнічным заданнем і перадаць заказчыку вынік у прадугледжаны дагаворам тэрмін;

2) узгадніць з заказчыкам неабходнасць выкарыстання вынікаў ахоўнай інтэлектуальнай дзейнасці, якія належаць трэцім асобам, і набыццё правоў на іх выкарыстанне;

3) сваімі сіламі і за свой кошт ліквідаваць дапушчаныя па яго віне ў выкананых работах недахопы, якія могуць пацягнуць за сабой адступленні ад тэхнічна-эканамічных параметраў, прадугледжаных у тэхнічным заданні ці ў дагаворы;

4) неадкладна інфармаваць заказчыка аб выяўленай немагчымасці атрымаць чаканыя вынікі ці аб немэтазгоднасці працягу работы;

5) гарантаваць заказчыку перадачу атрыманых паводле дагавора вынікаў, якія не парушаюць выключных правоў іншых асоб.

Артыкул 728. Абавязкі заказчыка

1. Заказчык у дагаворах на выкананне навукова-даследчых работ, вопытна-канструктарскіх і тэхналагічных работ абавязаны:

1) перадаваць выканаўцу неабходную для выканання работы інфармацыю;

2) прыняць вынікі выкананых работ і аплаціць іх.

2. Дагаворам можа быць таксама прадугледжаны абавязак заказчыка выдаць выканаўцу тэхнічнае заданне і ўзгадніць з ім праграму (тэхнічна-эканамічныя параметры) ці тэматыку работ.

Артыкул 729. Наступствы немагчымасці дасягнення вынікаў навукова-даследчых работ

Калі ў ходзе навукова-даследчых работ выяўляецца немагчымасць дасягнуць вынікі з-за абставін, якія не залежаць ад выканаўцы, заказчык абавязаны аплаціць кошт работ, праведзеных да выяўлення немагчымасці атрымаць прадугледжаныя дагаворам на выкананне навукова-даследчых работ вынікі, але не больш за адпаведную частку цаны работ, указанай у дагаворы.

Артыкул 730. Наступствы немагчымасці працягу вопытна-канструктарскіх і тэхналагічных работ

Калі ў ходзе выканання вопытна-канструктарскіх і тэхналагічных работ выяўляецца немагчымасць ці немэтазгоднасць працягу работы, якая ўзнікла не па віне выканаўцы, заказчык абавязаны аплаціць панесеныя выканаўцам затраты.

Артыкул 731. Адказнасць выканаўцы за парушэнне дагавора

1. Выканаўца нясе адказнасць перад заказчыкам за парушэнне дагавораў на выкананне навукова-даследчых работ, вопытна-канструктарскіх і тэхналагічных работ, калі не дакажа, што такое парушэнне адбылося не па віне выканаўцы (пункт 1 артыкула 372).

2. Выканаўца абавязаны кампенсаваць страты, прычыненыя ім заказчыку, у межах кошту работ, у якіх выяўлены недахопы, калі дагаворам не прадугледжана, што яны падлягаюць пакрыццю ў межах агульнага кошту работ паводле дагавора. Упушчаная выгада падлягае пакрыццю ў выпадках, прадугледжаных дагаворам.

Артыкул 732. Прававое рэгуляванне дагавораў на выкананне навукова-даследчых работ, вопытна-канструктарскіх і тэхналагічных работ

Да тэрмінаў выканання і цаны работы, а таксама да наступстваў няяўкі заказчыка за атрыманнем выніку работ прымяняюцца адпаведна правілы артыкулаў 662, 663 і 693 гэтага Кодэкса.

ГЛАВА 39
АПЛАТНАЕ АКАЗАННЕ ПАСЛУГ

Артыкул 733. Дагавор аплатнага аказання паслуг

1. Паводле дагавора аплатнага аказання паслуг адзін бок (выканаўца) абавязваецца па заданні іншага боку (заказчыка) аказаць паслугі (зрабіць пэўныя дзеянні ці ажыццявіць пэўную дзейнасць), а заказчык абавязваецца аплаціць гэтыя паслугі.

2. Правілы гэтай главы прымяняюцца да дагавораў аказання медыцынскіх, ветэрынарных, аўдытарскіх, кансультацыйных, інфармацыйных, рыэлтарскіх, турыстычных паслуг, паслуг сувязі, у сферы адукацыі і іншых паслуг, за выключэннем паслуг, якія аказваюцца паводле дагавораў, прадугледжаных главамі 37, 38, 40, 41, 44–49, 51 і 52 гэтага Кодэкса.

Артыкул 734. Выкананне дагавора аплатнага аказання паслуг

Калі іншае не прадугледжана дагаворам аплатнага аказання паслуг, выканаўца абавязаны аказаць паслугі асабіста.

Артыкул 735. Цана паслуг

1. Заказчык абавязаны аплаціць аказаныя яму паслугі ў тэрміны і ў парадку, указаныя ў заканадаўстве ці дагаворы аплатнага аказання паслуг.

2. У выпадку немагчымасці выканання, якая ўзнікла па віне заказчыка, паслугі падлягаюць аплаце ў поўным аб'ёме, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам аплатнага аказання паслуг.

3. У выпадках, калі немагчымасць выканання ўзнікла з-за абставін, за якія ні адзін з бакоў не адказвае, заказчык кампенсуе выканаўцу фактычна панесеныя ім расходы, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам аплатнага аказання паслуг.

Артыкул 736. Аднабаковая адмова ад выканання дагавора аплатнага аказання паслуг

1. Заказчык мае права адмовіцца ад дагавора аплатнага аказання паслуг пры ўмове аплаты выканаўцу фактычна панесеных ім расходаў, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі.

2. Выканаўца мае права адмовіцца ад выканання абавязацельстваў паводле дагавора аплатнага аказання паслуг толькі пры ўмове поўнага пакрыцця заказчыку страт.

Артыкул 737. Прававое рэгуляванне дагавора аплатнага аказання паслуг

Агульныя палажэнні аб падрадзе (артыкулы 656–682) і палажэнні аб бытавым падрадзе (артыкулы 683–695) прымяняюцца да дагавора аплатнага аказання паслуг, калі гэта не супярэчыць артыкулам 733-736 гэтага Кодэкса, а таксама асаблівасцям прадмета дагавора аплатнага аказання паслуг.

ГЛАВА 40
ПЕРАВОЗКА

Артыкул 738. Агульныя палажэнні аб перавозцы

1. Перавозка грузаў, пасажыраў і багажу праводзіцца паводле дагавора перавозкі.

2. Умовы перавозкі вызначаюцца гэтым Кодэксам, транспартнымі статутамі і кодэксамі, іншымі актамі заканадаўства, а таксама пагадненнем бакоў.

Правілы гэтай главы прымяняюцца да перавозак пастолькі, паколькі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі.

Артыкул 739. Дагавор перавозкі грузу

1. Паводле дагавора перавозкі грузу перавозчык абавязваецца даставіць даверaны яму адпраўшчыкам груз у пункт прызначэння і выдаць яго ўпаўнаважанай на атрыманне грузу асобе (атрымальніку), а адпраўшчык абавязваецца выплаціць за перавозку грузу ўстаноўленую плату.

2. Заключэнне дагавора перавозкі грузу пацвярджаецца складаннем транспартнай накладной (канасамента ці іншага дакумента на груз, прадугледжанага транспартным статутам ці кодэксам, іншымі актамі заканадаўства).

Артыкул 740. Дагавор перавозкі пасажыра

1. Паводле дагавора перавозкі пасажыра перавозчык абавязваецца перавезці пасажыра ў пункт прызначэння, а ў выпадку здачы пасажырам багажу таксама даставіць багаж у пункт прызначэння і выдаць яго ўпаўнаважанай на атрыманне багажу асобе; пасажыр абавязваецца выплаціць, калі іншае не вызначана заканадаўчымі актамі, устаноўленую плату за праезд, а пры здачы багажу – і за правоз багажу.

2. Калі іншае не вызначана заканадаўствам, заключэнне дагавора перавозкі пасажыра сведчыцца білетам і (ці) іншым дакументам, прадугледжаным заканадаўствам, а здача пасажырам багажу – багажнай квітанцыяй.

Формы білета і багажнай квітанцыі ўстанаўліваюцца ў парадку, прадугледжаным транспартнымі статутамі і кодэксамі, іншымі актамі заканадаўства.

3. Пасажыр мае права ў парадку, прадугледжаным адпаведным транспартным статутам і кодэксам, іншымі актамі заканадаўства:

1) выключаны;

2) правозіць з сабой бясплатна ручную паклажу ў межах устаноўленых нормаў;

3) здаваць да перавозкі багаж за плату па тарыфе.

Артыкул 741. Дагавор фрахтавання

Паводле дагавора фрахтавання адзін бок (фрахтоўшчык) абавязваецца аддаць іншаму боку (фрахтавальніку) за плату ўсю ці частку ўмяшчальнасці аднаго ці некалькіх транспартных сродкаў на адзін ці некалькі рэйсаў для перавозкі грузаў, пасажыраў і багажу.

Парадак заключэння дагавора фрахтавання, а таксама форма ўказанага дагавора ўстанаўліваюцца транспартнымі статутамі, кодэксамі і іншым заканадаўствам.

Артыкул 742. Змешаная перавозка

1. Змешаная перавозка азначае перавозку грузаў, пасажыраў і багажу сама меней двума відамі транспарту.

2. Змешаная перавозка грузаў ажыццяўляецца ці забяспечваецца экспедытарам паводле дагавора транспартнай экспедыцыі ў парадку, прадугледжаным главой 41 гэтага Кодэкса.

3. Змешаная перавозка грузаў, пасажыраў і багажу па адзіным транспартным дакуменце з'яўляецца прамой змешанай перавозкай. Узаемаадносіны перавозчыкаў у розных відах транспарту, а таксама парадак арганізацыі прамой змешанай перавозкі вызначаюцца транспартнымі статутамі і кодэксамі і іншымі актамі заканадаўства.

Артыкул 743. Перавозка транспартам агульнага карыстання

1. Перавозка, якую ажыццяўляе перавозчык, прызнаецца перавозкай транспартам агульнага карыстання, калі з заканадаўчых актаў ці выдадзенага гэтаму перавозчыку спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) вынікае, што гэты перавозчык абавязаны ажыццяўляць перавозкі грузаў, пасажыраў і багажу па звароце любога грамадзяніна ці юрыдычнай асобы.

2. Пералік арганізацый, абавязаных ажыццяўляць перавозкі, якія прызнаюцца перавозкамі транспартам агульнага карыстання, публікуецца ва ўстаноўленым парадку.

3. Дагавор перавозкі транспартам агульнага карыстання з'яўляецца публічным дагаворам (артыкул 396).

Артыкул 744. Правазная плата

1. За перавозку грузаў, пасажыраў і багажу збіраецца правазная плата, устаноўленая пагадненнем бакоў, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам.

2. Плата за перавозку грузаў, пасажыраў і багажу транспартам агульнага карыстання вызначаецца на падставе тарыфаў, якія ўстанаўліваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

3. Работы і паслугі, якія выконваюцца перавозчыкам па патрабаванні грузаўладальніка і не прадугледжаныя тарыфамі, аплачваюцца паводле пагаднення бакоў.

4. Перавозчык мае права ўтрымліваць перададзеныя яму для перавозкі грузы ў забеспячэнне належнай яму правазной платы і іншых выплат па перавозцы (артыкул 340), калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам ці не вынікае з сутнасці абавязацельства.

5. У выпадках, калі ў адпаведнасці з заканадаўствам устаноўлены льготы ці перавагі па правазной плаце за перавозку грузаў, пасажыраў і багажу, панесеныя ў сувязі з гэтым расходы кампенсуюцца транспартнай арганізацыі за кошт сродкаў адпаведнага бюджэту.

Артыкул 745. Падача транспартных сродкаў, пагрузка і выгрузка грузу

1. Перавозчык абавязаны падаць адпраўшчыку грузу пад пагрузку ў тэрмін, устаноўлены дагаворам перавозкі, спраўныя транспартныя сродкі ў стане, прыдатным для перавозкі адпаведнага грузу.

Адпраўшчык грузу мае права адмовіцца ад пададзеных транспартных сродкаў, не прыдатных для перавозкі адпаведнага грузу.

2. Пагрузка (выгрузка) грузу ажыццяўляецца перавозчыкам ці адпраўшчыкам (атрымальнікам) у парадку, прадугледжаным дагаворам, з прытрымліваннем палажэнняў, устаноўленых заканадаўствам і актамі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, якія выдаюцца ў адпаведнасці з ім.

3. Пагрузка (выгрузка) грузу, якая ажыццяўляецца сіламі і сродкамі адпраўшчыка (атрымальніка) грузу, павінна праводзіцца ў тэрміны, прадугледжаныя дагаворам, калі такія тэрміны не ўстаноўлены заканадаўствам і актамі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, якія выдаюцца ў адпаведнасці з ім.

Артыкул 746. Тэрмін дастаўкі грузу, пасажыра і багажу

Перавозчык абавязаны даставіць груз, пасажыра ці багаж у пункт прызначэння ў тэрміны, вызначаныя ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам, а пры адсутнасці такіх тэрмінаў – у разумны тэрмін.

Артыкул 747. Адказнасць па абавязацельствах па перавозцы

1. У выпадку невыканання або неналежнага выканання абавязацельстваў па перавозцы бакі нясуць адказнасць, устаноўленую гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства, а таксама пагадненнем бакоў.

2. Пагадненні перавозчыкаў з пасажырамі і грузаўладальнікамі аб абмежаванні ці ліквідацыі ўстаноўленай заканадаўствам адказнасці несапраўдныя, за выключэннем выпадкаў, калі магчымасць такіх пагадненняў пры перавозках грузу прадугледжана заканадаўствам.

Артыкул 748. Адказнасць перавозчыка за непадачу транспартных сродкаў і адпраўшчыка за невыкарыстанне пададзеных транспартных сродкаў

1. Перавозчык за непадачу транспартных сродкаў для перавозкі грузу ў адпаведнасці з дагаворам, а адпраўнік за непрад'яўленне грузу або невыкарыстанне пададзеных транспартных сродкаў з-за іншых прычын нясуць адказнасць, устаноўленую заканадаўствам, а таксама пагадненнем бакоў.

2. Перавозчык і адпраўшчык грузу вызваляюцца ад адказнасці ў выпадку непадачы транспартных сродкаў або невыкарыстання пададзеных транспартных сродкаў, калі гэта адбылося ў выніку:

1) непераадольнай сілы, а таксама іншых з'яў стыхійнага характару (пажараў, заносаў, навадненняў) і ваенных дзеянняў;

2) спынення ці абмежавання перавозкі грузаў у пэўных напрамках, устаноўленага ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам;

3) у іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

Артыкул 749. Адказнасць перавозчыка за затрымку адпраўлення пасажыра

1. За затрымку адпраўлення транспартнага сродку, які перавозіць пасажыра, ці спазненне прыбыцця такога транспартнага сродку ў пункт прызначэння (за выключэннем гарадскіх і прыгарадных аўтамабільных перавозак у рэгулярных зносінах, перавозак гарадскім электрычным транспартам у рэгулярных зносінах і метрапалітэнам, перавозак унутраным водным транспартам агульнага карыстання ў гарадскіх і прыгарадных зносінах, а таксама перавозак чыгуначным транспартам агульнага карыстання ў цягніках гарадскіх ліній і рэгіянальных ліній эканомкласа) перавозчык плаціць пасажыру няўстойку ў памеры, устаноўленым заканадаўствам, калі не дакажа, што затрымка ці спазненне мелі месца ў выніку непераадольнай сілы, ліквідацыі няспраўнасці транспартнага сродку, якія пагражаюць жыццю і здароўю пасажыра, ці іншых абставін, якія не залежаць ад перавозчыка.

2. У выпадку адмовы пасажыра ад перавозкі з-за затрымкі адпраўлення транспартнага сродку перавозчык абавязаны вярнуць пасажыру правазную плату.

Артыкул 750. Адказнасць перавозчыка за страту, недастачу і пашкоджанне (псаванне) грузу ці багажу

1. Перавозчык нясе адказнасць за незахаванасць грузу ці багажу, якая адбылася пасля прыняцця яго да перавозкі і да выдачы грузаатрымальніку, упаўнаважанай ім асобе ці асобе, упаўнаважанай на атрыманне багажу, калі не дакажа, што страта, недастача ці пашкоджанне (псаванне) грузу ці багажу адбыліся ў выніку абставін, якія перавозчык не мог прадухіліць і ліквідацыя якіх ад яго не залежала.

2. Урон, прычынены пры перавозцы грузу ці багажу, кампенсуецца перавозчыкам:

1) у выпадку страты ці недастачы грузу ці багажу – у памеры кошту страчанага ці адсутнага грузу ці багажу;

2) у выпадку пашкоджання (псавання) грузу ці багажу – у памеры сумы, на якую панізіўся яго кошт, а пры немагчымасці аднаўлення пашкоджанага грузу ці багажу – у памеры яго кошту;

3) у выпадку страты грузу ці багажу, здадзенага да перавозкі з аб’яўленнем яго каштоўнасці, – у памеры аб'яўленага кошту грузу ці багажу.

Кошт грузу ці багажу вызначаецца зыходзячы з яго цаны, указанай у рахунку прадаўца ці прадугледжанай дагаворам, а пры адсутнасці рахунку ці ўказання цаны ў дагаворы – зыходзячы з цаны, якая пры параўнальных абставінах звычайна збіраецца за аналагічныя тавары.

3. Перавозчык нароўні з пакрыццём вызначанага ўрону, выкліканага стратай, недастачай ці пашкоджаннем (псаваннем) грузу ці багажу, вяртае адпраўшчыку (атрымальніку) правазную плату, спагнаную за перавозку страчанага, адсутнага,

сапсаванага ці пашкоджанага грузу ці багажу, калі гэта плата не ўваходзіць у кошт грузу.

4. Дакументы аб прычынах незахаванасці грузу ці багажу (камерцыйны акт, акт агульнай формы і да т.п.), складзеныя перавозчыкам у аднабаковым парадку, у выпадку спрэчкі падлягаюць ацэнцы судом нароўні з іншымі дакументамі, якія сведчаць абставіны, што могуць служыць падставай для адказнасці перавозчыка, адпраўшчыка або атрымальніка грузу ці багажу.

Артыкул 751. Прэтэнзіі і іскі па перавозках грузаў

1. Да прад'яўлення да перавозчыка іску, які вынікае з перавозкі грузу, абавязковае прад'яўленне яму прэтэнзіі ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам.

2. Іск да перавозчыка можа быць прад'яўлены грузаадпраўшчыкам ці грузаатрымальнікам у выпадку поўнай ці частковай адмовы перавозчыка забяспечыць прэтэнзію або неатрыманне ад перавозчыка адказу ў трыццацідзённы тэрмін.

3. Тэрмін іскавай даўнасці па патрабаваннях, якія вынікаюць з перавозкі грузу, устанаўліваецца ў адзін год з моманту, які вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Артыкул 752. Дагаворы аб арганізацыі перавозак

1. Перавозчык і грузаўладальнік пры неабходнасці ажыццяўлення сістэматычных перавозак грузаў могуць заключаць дагаворы аб арганізацыі перавозак.

Паводле дагавора аб арганізацыі перавозкі грузаў перавозчык абавязваецца ва ўстаноўленыя тэрміны прымаць, а грузаўладальнік прад'яўляць да перавозкі грузы ў абумоўленым аб'ёме. У дагаворы аб арганізацыі перавозкі грузаў вызначаюцца аб'ёмы, тэрміны і іншыя ўмовы давання транспартных сродкаў і прад'яўлення грузаў для перавозкі, парадак разлікаў, а таксама іншыя ўмовы арганізацыі перавозкі.

2. Перавозчык пры неабходнасці ажыццяўлення сістэматычных перавозак пасажыраў можа заключаць з грамадзянамі ці юрыдычнымі асобамі дагаворы аб арганізацыі перавозак пасажыраў.

Дагавор аб арганізацыі перавозак пасажыраў заключаецца ў пісьмовай форме.

У дагаворы аб арганізацыі перавозак пасажыраў вызначаюцца маршрут, колькасць рэйсаў, тэрміны і іншыя ўмовы давання транспартных сродкаў для перавозкі, парадак разлікаў, а таксама іншыя ўмовы арганізацыі перавозак.

Артыкул 753. Дагаворы паміж перавозчыкамі

Паміж перавозчыкамі розных відаў транспарту могуць заключацца дагаворы аб арганізацыі работы для забеспячэння перавозак грузаў (вузлавыя пагадненні, дагаворы на цэнтралізаваны завоз (вываз) грузаў і інш.).

Парадак заключэння такіх дагавораў вызначаецца транспартнымі статутамі і кодэксамі, іншымі актамі заканадаўства.

Артыкул 754. Адказнасць перавозчыка за прычыненне шкоды жыццю ці здароўю пасажыра

Адказнасць перавозчыка за шкоду, прычыненую жыццю ці здароўю пасажыра, вызначаецца па правілах главы 58 гэтага Кодэкса, калі заканадаўствам ці дагаворам перавозкі не прадугледжана павышаная адказнасць перавозчыка.

ГЛАВА 41
ТРАНСПАРТНАЯ ЭКСПЕДЫЦЫЯ

Артыкул 755. Дагавор транспартнай экспедыцыі

1. Паводле дагавора транспартнай экспедыцыі адзін бок (экспедытар) абавязваецца за ўзнагароду і за кошт іншага боку (кліента – грузаадпраўшчыка ці грузаатрымальніка) выканаць ці арганізаваць выкананне вызначаных дагаворам экспедыцыі паслуг, звязаных з перавозкай грузу.

Дагаворам транспартнай экспедыцыі могуць быць прадугледжаны абавязкі экспедытара арганізаваць перавозку грузу транспартам і маршрутам, выбранымі экспедытарам ці кліентам, абавязак экспедытара заключыць ад імя кліента ці ад свайго імя дагавор (дагаворы) перавозкі грузу, забяспечыць адпраўку і атрыманне грузу, а таксама іншыя абавязкі, звязаныя з перавозкай.

У якасці дадатковых паслуг дагаворам транспартнай экспедыцыі можа быць прадугледжана ажыццяўленне такіх неабходных для дастаўкі грузу аперацый, як атрыманне неабходных для экспарту ці імпарту дакументаў, выкананне мытных і іншых фармальнасцей, праверка колькасці і стану грузу, яго пагрузка і выгрузка, выплата расходаў, якія ўскладаюцца на кліента, захоўванне грузу, яго атрыманне ў пункце прызначэння, а таксама выкананне іншых аперацый і паслуг, прадугледжаных дагаворам.

2. Правілы гэтай главы распаўсюджваюцца і на выпадкі, калі ў адпаведнасці з дагаворам абавязкі экспедытара выконваюцца перавозчыкам.

3. Умовы выканання дагавора транспартнай экспедыцыі вызначаюцца пагадненнем бакоў, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

4. Дагавор транспартнай экспедыцыі заключаецца ў пісьмовай форме.

5. Кліент павінен выдаць экспедытару даверанасць, калі яна неабходная для выканання яго абавязкаў.

Артыкул 756. Адказнасць экспедытара паводле дагавора транспартнай экспедыцыі

За невыкананне ці неналежнае выкананне абавязкаў паводле дагавора экспедыцыі экспедытар нясе адказнасць на падставах і ў памеры, якія вызначаюцца ў адпаведнасці з правіламі главы 25 гэтага Кодэкса.

Калі экспедытар дакажа, што парушэнне абавязацельства выклікана неналежным выкананнем дагавораў перавозкі, адказнасць экспедытара перад кліентам вызначаецца па тых жа правілах, па якіх перад экспедытарам адказвае адпаведны перавозчык.

Артыкул 757. Дакументы і іншая інфармацыя, якая даецца экспедытару

1. Кліент абавязаны даць экспедытару дакументы і іншую інфармацыю аб уласцівасцях грузу, умовах яго перавозкі, а таксама іншую інфармацыю, неабходную для выканання экспедытарам абавязку, прадугледжанага дагаворам транспартнай экспедыцыі.

2. Экспедытар абавязаны паведаміць кліенту аб выяўленых недахопах атрыманай інфармацыі, а ў выпадку непаўнаты інфармацыі запытаць у кліента неабходныя дадатковыя даныя.

3. У выпадку недавання кліентам неабходнай інфармацыі экспедытар мае права не брацца за выкананне адпаведных абавязкаў да давання такой інфармацыі.

4. Кліент нясе адказнасць за страты, прычыненыя экспедытару ў сувязі з парушэннем абавязку па даванні інфармацыі, указанай у пункце 1 гэтага артыкула.

Артыкул 758. Выкананне абавязкаў экспедытара трэцяй асобай

Калі з дагавора транспартнай экспедыцыі не вынікае, што экспедытар павінен выканаць свае абавязкі асабіста, экспедытар мае права прыцягнуць да выканання сваіх абавязкаў іншых асоб.

Ускладанне выканання абавязку на трэцюю асобу не вызваляе экспедытара ад адказнасці перад кліентам за выкананне дагавора.

Артыкул 759. Аднабаковае скасаванне дагавора экспедыцыі

Любы з бакоў мае права адмовіцца ад выканання дагавора транспартнай экспедыцыі, папярэдзіўшы аб гэтым іншы бок у разумны тэрмін.

Пры аднабаковай адмове ад выканання дагавора бок, які заявіў аб адмове, кампенсуе іншаму боку страты, выкліканыя скасаваннем дагавора.

ГЛАВА 42
ПАЗЫКА І КРЭДЫТ

Артыкул 760. Дагавор пазыкі

1. Паводле дагавора пазыкі адзін бок (пазыкадаўца) перадае ва ўласнасць іншаму боку (пазычальніку) грошы ці іншыя рэчы, вызначаныя радавымі прыкметамі, а пазычальнік абавязваецца вярнуць пазыкадаўцу такую ж суму грошай (суму пазыкі) ці роўную колькасць іншых атрыманых ім рэчаў тых жа роду і якасці.

Актамі заканадаўства могуць устанаўлівацца асаблівасці давання юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі пазык у суме, якая не перавышае 15 000 базавых велічыняў на аднаго пазычальніка на дзень заключэння дагавора.

2. Дагавор пазыкі лічыцца заключаным з моманту перадачы грошай ці іншых рэчаў, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

3. Замежная валюта і валютныя каштоўнасці могуць быць прадметам дагавора пазыкі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з прытрымліваннем правілаў артыкулаў 141, 142 і 298 гэтага Кодэкса.

Артыкул 761. Форма дагавора пазыкі

1. Дагавор пазыкі павінен быць заключаны ў пісьмовай форме, калі яго сума перавышае не менш чым у дзесяць разоў устаноўлены заканадаўствам памер базавай велічыні, а ў выпадках, калі пазыкадаўцам з'яўляецца юрыдычная асоба, – незалежна ад сумы.

2. У пацвярджэнне дагавора пазыкі і яго ўмоў можа быць прадстаўлена распіска пазычальніка ці іншы дакумент, які сведчыць перадачу яму пазыкадаўцам пэўнай грашовай сумы ці пэўнай колькасці рэчаў.

Артыкул 762. Працэнты паводле дагавора пазыкі

1. Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам пазыкі, пазыкадаўца мае права на атрыманне з пазычальніка працэнтаў на суму пазыкі ў памерах і парадку, вызначаных дагаворам. Пры адсутнасці ў дагаворы ўмовы аб памеры працэнтаў іх памер вызначаецца стаўкай рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь на дзень выплаты пазычальнікам сумы доўгу ці яго адпаведнай часткі.

2. Пры адсутнасці іншага пагаднення працэнты выплачваюцца штомесяц да дня вяртання сумы пазыкі.

3. Дагавор пазыкі лічыцца беспрацэнтным, калі ў ім прама не прадугледжана іншае, у выпадках, калі:

1) дагавор заключаны паміж грамадзянамі на суму, якая не перавышае ўстаноўлены заканадаўствам пяцідзесяціразовы памер базавай велічыні, і не звязаны з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці хаця б аднаго з бакоў;

2) паводле дагавора пазычальніку перадаюцца не грошы, а іншыя рэчы, вызначаныя радавымі прыкметамі.

Артыкул 763. Абавязак пазычальніка вярнуць суму пазыкі

1. Пазычальнік абавязаны вярнуць пазыкадаўцу атрыманую суму пазыкі ў тэрмін і парадку, якія прадугледжаны дагаворам пазыкі.

У выпадках, калі тэрмін вяртання дагаворам не ўстаноўлены ці вызначаны момантам запатрабавання, сума пазыкі павінна быць вернута пазычальнікам на працягу трыццаці дзён з дня прад'яўлення пазыкадаўцам патрабавання аб гэтым, калі іншае не прадугледжана дагаворам.

2. Калі іншае не прадугледжана дагаворам пазыкі, сума беспрацэнтнай пазыкі можа быць вернута пазычальнікам датэрмінова.

Сума пазыкі, дадзенай пад працэнты, можа быць вернута датэрмінова са згоды пазыкадаўцы.

3. Калі іншае не прадугледжана дагаворам пазыкі, сума пазыкі лічыцца вернутай у момант перадачы яе пазыкадаўцу ці залічэння адпаведных грашовых сродкаў на яго банкаўскі рахунак.

Артыкул 764. Наступствы парушэння пазычальнікам дагавора пазыкі

1. Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам пазыкі, у выпадках, калі пазычальнік не вяртае ў тэрмін суму пазыкі, на гэту суму падлягаюць выплаце працэнты ў памеры, прадугледжаным пунктам 1 артыкула 366 гэтага Кодэкса, з дня, калі яна павінна была быць вернута, па дзень яе вяртання пазыкадаўцу незалежна ад выплаты працэнтаў, прадугледжаных пунктам 1 артыкула 762 гэтага Кодэкса.

2. Калі дагаворам пазыкі прадугледжана вяртанне пазыкі па частках (у растэрміноўку), то пры парушэнні пазычальнікам тэрміну, устаноўленага для вяртання чарговай часткі пазыкі, пазыкадаўца мае права запатрабаваць датэрміновага вяртання ўсёй астатняй сумы пазыкі разам з належнымі працэнтамі.

Артыкул 765. Аспрэчванне дагавора пазыкі

1. Пазычальнік мае права аспрэчваць дагавор пазыкі па яго безграшовасці, даказваючы, што грошы ці іншыя рэчы насамрэч не атрыманы ім ад пазыкадаўцы ці атрыманы ў меншай колькасці, чым указана ў дагаворы.

2. Калі дагавор пазыкі павінен быць заключаны ў пісьмовай форме (артыкул 761), яго аспрэчванне па безграшовасці шляхам паказанняў сведак не дапускаецца, за выключэннем выпадкаў, калі дагавор быў заключаны пад уплывам падману, насілля, пагрозы, зламыснага пагаднення прадстаўніка пазычальніка з пазыкадаўцам ці збегу цяжкіх абставін.

3. Калі ў працэсе аспрэчвання пазычальнікам дагавора пазыкі па яго безграшовасці будзе ўстаноўлена, што грошы ці іншыя рэчы насамрэч не былі атрыманы ад пазыкадаўцы, дагавор пазыкі лічыцца незаключаным.

Калі грошы ці іншыя рэчы насамрэч атрыманы пазычальнікам ад пазыкадаўцы ў меншай колькасці, дагавор лічыцца заключаным на гэту колькасць грошай ці рэчаў.

Артыкул 766. Наступствы страты забеспячэння абавязацельства пазычальніка

Пры невыкананні пазычальнікам прадугледжаных дагаворам пазыкі абавязкаў па забеспячэнні вяртання сумы пазыкі, а таксама пры страце забеспячэння ці пагаршэнні яго ўмоў з-за абставін, за якія пазыкадаўца не адказвае, пазыкадаўца мае права запатрабаваць ад пазычальніка датэрміновага вяртання сумы пазыкі і выплаты належных працэнтаў, калі іншае не прадугледжана дагаворам.

Артыкул 767. Мэтавая пазыка

1. Калі дагавор пазыкі заключаны з умовай выкарыстання пазычальнікам атрыманых сродкаў на пэўныя мэты (мэтавая пазыка), пазычальнік абавязаны забяспечыць магчымасць ажыццяўлення пазыкадаўцам кантролю за мэтавым выкарыстаннем сумы пазыкі.

2. У выпадку невыканання пазычальнікам умовы дагавора пазыкі аб мэтавым выкарыстанні сумы пазыкі, а таксама пры парушэнні абавязкаў, прадугледжаных пунктам 1 гэтага артыкула, пазыкадаўца мае права запатрабаваць ад пазычальніка датэрміновага вяртання сумы пазыкі і выплаты належных працэнтаў, калі іншае не прадугледжана дагаворам.

Артыкул 768. Пазыка, афармленая вэксалем ці аблігацыяй

Да адносін пазыкі, афармленай вэксалем ці аблігацыяй, прымяняюцца правілы гэтай главы пастолькі, паколькі гэта не супярэчыць заканадаўству аб выдачы і абарачэнні вэксаляў ці эмісіі і абарачэнні аблігацый.

Артыкул 769. Дагавор дзяржаўнай пазыкі

Да адносін па пазыцы, па якой пазычальнікам выступае Рэспубліка Беларусь, ці пазыцы, па якім пазычальнікам выступае адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, правілы гэтай главы прымяняюцца пастолькі, паколькі гэта не супярэчыць актам заканадаўства.

Артыкул 770. Камерцыйная пазыка

Правілы, устаноўленыя гэтай главой, распаўсюджваюцца таксама на выпадкі авансу, папярэдняй аплаты, адтэрміноўкі і растэрміноўкі аплаты тавараў, работ ці паслуг (камерцыйная пазыка), калі іншае не прадугледжана заканадаўствам.

Артыкул 771. Крэдытны дагавор

1. Па крэдытным дагаворы банк ці нябанкаўская крэдытна-фінансавая арганізацыя (крэдытадавальнік) абавязваецца выдаць грашовыя сродкі (крэдыт) іншай асобе (крэдытаатрымальніку) у памеры і на ўмовах, прадугледжаных дагаворам, а крэдытаатрымальнік абавязваецца вярнуць атрыманую грашовую суму і выплаціць працэнты на яе.

2. Да адносін па крэдытным дагаворы прымяняюцца правілы гэтай главы з улікам асаблівасцей, устаноўленых заканадаўствам.

ГЛАВА 43
ФІНАНСАВАННЕ ПАД УСТУПКУ ГРАШОВАГА ПАТРАБАВАННЯ (ФАКТОРЫНГ)

Артыкул 772. Дагавор фінансавання пад уступку грашовага патрабавання (факторынг)

1. Паводле дагавора фінансавання пад уступку грашовага патрабавання (факторынга) адзін бок (фактар) абавязваецца іншаму боку (крэдытору) ці бакам (крэдытору і даўжніку) уступіць у грашовае абавязацельства паміж крэдыторам і даўжніком шляхам выплаты крэдытору сумы грашовага абавязацельства даўжніка за ўзнагароду.

Узнагарода фактару выплачваецца крэдыторам (даўжніком) у форме дысконту (розніца паміж сумай грашовага абавязацельства даўжніка і сумай, якая выплачваецца фактарам крэдытору) і (ці) у іншых формах, вызначаных дагаворам факторынга.

2. У якасці фактара можа выступаць банк ці нябанкаўская крэдытна-фінансавая арганізацыя.

3. Дагавор факторынга можа заключацца наконт як аднаго грашовага абавязацельства, так і шэрагу грашовых абавязацельстваў, у тым ліку і тых, якія могуць узнікнуць у будучыні, у прыватнасці, аднародных грашовых абавязацельстваў па атрыманні аплаты за пастаўлены тавар.

4. Адносіны па факторынгу рэгулююцца заканадаўствам.

ГЛАВА 44
БАНКАЎСКІ ЎКЛАД (ДЭПАЗІТ)

Артыкул 773. Дагавор банкаўскага ўкладу (дэпазіту)

Паводле дагавора банкаўскага ўкладу (дэпазіту) адзін бок (укладаатрымальнік) прымае ад іншага боку (укладчыка) грашовыя сродкі ў беларускіх рублях ці замежнай валюце – уклад (дэпазіт) і абавязваецца вярнуць укладчыку грашовыя сродкі, правесці безнаяўныя разлікі па даручэнні ўкладчыка ў адпаведнасці з дагаворам, а таксама выплаціць налічаныя па ўкладзе (дэпазіце) працэнты на ўмовах і ў парадку, вызначаных гэтым дагаворам.

Ва ўклад (дэпазіт) паводле дагавора банкаўскага ўкладу (дэпазіту) могуць быць унесены таксама каштоўныя металы і (ці) каштоўныя камяні.

Адносіны па банкаўскім укладзе (дэпазіце) рэгулююцца заканадаўствам і дагаворам.

ГЛАВА 45
БЯГУЧЫ (РАЗЛІКОВЫ) БАНКАЎСКІ РАХУНАК

Артыкул 774. Дагавор бягучага (разліковага) банкаўскага рахунку

Паводле дагавора бягучага (разліковага) банкаўскага рахунку адзін бок (банк ці нябанкаўская крэдытна-фінансавая арганізацыя) абавязваецца адкрыць іншаму боку (уладальніку рахунка) бягучы (разліковы) банкаўскі рахунак для захоўвання грашовых сродкаў уладальніка рахунка і (ці) залічэння на гэты рахунак грашовых сродкаў, якія паступаюць на карысць уладальніка рахунка, а таксама выконваць даручэнні ўладальніка рахунка аб пераліку і выдачы адпаведных грашовых сродкаў з рахунку, а ўладальнік рахунку дае банку ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі права выкарыстоўваць часова свабодныя грашовыя сродкі, якія знаходзяцца на рахунку, з выплатай працэнтаў, вызначаных заканадаўствам ці дагаворам, а таксама, за выключэннем выпадкаў, устаноўленых заканадаўчымі актамі, выплачвае банку ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі ўзнагароду (плату) за паслугі, якія яму аказваюцца.

Адносіны па бягучым (разліковым) банкаўскім рахунку рэгулююцца заканадаўствам.

ГЛАВА 46
РАЗЛІКІ

Артыкул 775. Разлікі

1. Разлікі з удзелам грамадзян, не звязаныя з ажыццяўленнем імі прадпрымальніцкай дзейнасці, могуць праводзіцца наяўнымі грашамі (артыкул 141) ці ў безнаяўным парадку, устаноўленым заканадаўствам.

2. Разлікі паміж юрыдычнымі асобамі, а таксама разлікі з удзелам грамадзян, звязаныя з ажыццяўленнем імі прадпрымальніцкай дзейнасці, праводзяцца ў безнаяўным парадку. Разлікі паміж гэтымі асобамі могуць праводзіцца таксама наяўнымі грашамі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

3. Безнаяўныя разлікі праводзяцца праз банкі ці нябанкаўскія крэдытна-фінансавыя арганізацыі, у якіх адкрыты адпаведныя рахункі, калі іншае не вынікае з акта заканадаўства і не абумоўлена формай разлікаў, якая выкарыстоўваецца.

4. Адносіны па разліках рэгулююцца заканадаўствам.

ГЛАВА 47
ЗАХОЎВАННЕ

§ 1. Агульныя палажэнні аб захоўванні

Артыкул 776. Дагавор захоўвання

1. Паводле дагавора захоўвання адзін бок (захавальнік) абавязваецца захоўваць рэч, перададзеную яму іншым бокам (паклажадаўцам), і вярнуць гэту рэч захаванай.

2. У дагаворы захоўвання, у якім захавальнікам з'яўляецца камерцыйная арганізацыя або некамерцыйная арганізацыя, якая ажыццяўляе захоўванне ў якасці адной з мэт сваёй прафесійнай дзейнасці (прафесійны захавальнік), можа быць прадугледжаны абавязак захавальніка прыняць на захоўванне рэч ад паклажадаўца ў прадугледжаны дагаворам тэрмін.

Артыкул 777. Форма дагавора захоўвання

1. Дагавор захоўвання павінен быць заключаны ў пісьмовай форме ў выпадках, указаных у артыкуле 162 гэтага Кодэкса. Пры гэтым для дагавора захоўвання паміж грамадзянамі (падпункт 2 часткі першай артыкула 162) прытрымліванне пісьмовай формы патрабуецца, калі кошт рэчы, якая перадаецца на захоўванне перавышае не менш чым у дзесяць разоў устаноўлены заканадаўствам памер базавай велічыні.

Дагавор захоўвання, які прадугледжвае абавязак захавальніка прыняць рэч на захоўванне, павінен быць заключаны ў пісьмовай форме незалежна ад складу ўдзельнікаў гэтага дагавора і кошту рэчы, якая перадаецца на захоўванне.

Перадача рэчы на захоўванне пры надзвычайных абставінах (пажар, стыхійнае бедства, раптоўная хвароба, пагроза нападу і да т. п.) можа быць даказана паказаннямі сведак.

2. Простая пісьмовая форма дагавора захоўвання лічыцца захаванай, калі прыняцце рэчы на захоўванне засведчыў захавальнік шляхам выдачы паклажадаўцу:

1) захоўнай распіскі, квітанцыі, пасведчання ці іншага дакумента, падпісанага захавальнікам;

2) нумарнога жэтона (нумара), іншага знака, які сведчыць прыём рэчаў на захоўванне, калі такая форма пацвярджэння прыёму рэчаў на захоўванне прадугледжана заканадаўствам або звычайная для гэтага віду захоўвання.

3. Незахаванне простай пісьмовай формы дагавора захоўвання не пазбаўляе бакі права спасылацца на паказанні сведак у выпадку спрэчкі аб тоеснасці рэчы, прынятай на захоўванне, і рэчы, вернутай захавальнікам.

Артыкул 778. Выкананне абавязку прыняць рэч на захоўванне

1. Захавальнік, які ўзяў на сябе паводле дагавора захоўвання абавязак прыняць рэч на захоўванне (пункт 2 артыкула 776), не мае права патрабаваць перадачы яму гэтай рэчы на захоўванне.

Аднак паклажадавец, які не перадаў рэч на захоўванне ў прадугледжаны дагаворам тэрмін, нясе адказнасць перад захавальнікам за страты, прычыненыя ў сувязі з захоўваннем, якое не адбылося, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам захоўвання. Паклажадавец вызваляецца ад гэтай адказнасці, калі заявіць захавальніку аб адмове ад яго паслуг у разумны тэрмін.

2. Калі іншае не прадугледжана дагаворам, захавальнік вызваляецца ад абавязку прыняць рэч на трыманне ў выпадках, калі ў абумоўлены дагаворам тэрмін рэч не будзе перададзена яму на трыманне.

Артыкул 779. Тэрмін захоўвання

1. Захавальнік абавязаны захоўваць рэч на працягу абумоўленага дагаворам захоўвання тэрміну.

2. Калі тэрмін захоўвання дагаворам не прадугледжаны і не можа быць вызначаны зыходзячы з яго ўмоў, захавальнік абавязаны захоўваць рэч да запатрабавання яе паклажадаўцам.

3. Калі тэрмін захоўвання вызначаны момантам запатрабавання рэчы паклажадаўцам, захавальнік мае права пасля сканчэння звычайнага пры гэтых абставінах тэрміну захоўвання рэчы запатрабаваць ад паклажадаўца ўзяць назад рэч, даўшы яму для гэтага разумны тэрмін. Невыкананне паклажадаўцам гэтага абавязку цягне за сабой наступствы, прадугледжаныя артыкулам 789 гэтага Кодэкса.

Артыкул 780. Захоўванне рэчаў з абезасобленнем

У выпадках, прама прадугледжаных дагаворам захоўвання, прынятыя на захоўванне рэчы аднаго паклажадаўца могуць змешвацца з рэчамі таго ж роду і якасці іншых паклажадаўцаў (захоўванне з **абезасобленнем**). Паклажадаўцу вяртаецца роўная ці абумоўленая бакамі колькасць рэчаў таго ж роду і якасці.

Артыкул 781. Абавязак захавальніка забяспечыць захаванасць рэчы

1. Захавальнік абавязаны прыняць усе прадугледжаныя дагаворам меры для таго, каб забяспечыць захаванасць перададзенай на захоўванне рэчы.

Пры адсутнасці ў дагаворы захоўвання ўмоў аб такіх мерах ці непаўнаце гэтых умоў захавальнік павінен прыняць для захавання рэчы таксама меры, якія адпавядаюць сутнасці абавязацельства, у тым ліку ўласцівасцям перададзенай на захоўванне рэчы, калі толькі неабходнасць прыняцця гэтых мер не выключана дагаворам.

2. Захавальнік ва ўсялякім выпадку павінен прыняць для захавання перададзенай яму рэчы меры, абавязковасць якіх прадугледжана заканадаўствам ці ва ўстаноўленым ім парадку (проціпажарныя, санітарныя, ахоўныя і да т. п.).

3. Калі захоўванне ажыццяўляецца бязвыплатна, захавальнік абавязаны клапаціцца аб прынятай на захоўванне рэчы не менш, чым аб сваіх рэчах.

Артыкул 782. Карыстанне рэччу, перададзенай на захоўванне

Захавальнік не мае права без згоды паклажадаўца карыстацца перададзенай на захоўванне рэччу, а таксама даваць магчымасць карыстання ёю трэцім асобам, за выключэннем выпадкаў, калі карыстанне рэччу, якая захоўваецца, неабходнае для забеспячэння яе захаванасці і не супярэчыць дагавору.

Артыкул 783. Змяненне ўмоў захоўвання

1. Пры неабходнасці змянення ўмоў захоўвання рэчы, прадугледжаных дагаворам захоўвання, захавальнік абавязаны неадкладна паведаміць аб гэтым паклажадаўцу і дачакацца яго адказу.

Калі змяненне ўмоў захоўвання неабходна для ліквідацыі небяспекі страты, недастачы ці пашкоджання рэчы, захавальнік мае права змяніць спосаб, месца і іншыя ўмовы захоўвання, не чакаючы адказу паклажадаўца.

2. Калі ў час захоўвання ўзнікла рэальная пагроза пашкоджання рэчы, або рэч ужо была пашкоджана, або ўзніклі абставіны, якія не дазваляюць забяспечыць яе захаванасць, а своечасовага прыняцця мер з боку паклажадаўца чакаць нельга, захавальнік мае права самастойна прадаць рэч ці частку яе па цане, якая склалася ў месцы захоўвання. Калі ўказаныя абставіны ўзніклі з-за прычын, за якія захавальнік не адказвае, ён мае права на пакрыццё сваіх расходаў па продажы за кошт пакупной цаны.

Артыкул 784. Захоўванне рэчаў з небяспечнымі ўласцівасцямі

1. Рэчы, лёгкія на загаранне, выбухованебяспечныя ці ўвогуле небяспечныя па сваёй прыродзе, калі паклажадавец пры іх здачы на захоўванне не папярэдзіў захавальніка аб гэтых уласцівасцях, могуць быць у любы час абясшкоджаны ці знішчаны захавальнікам без пакрыцця паклажадаўцу страт. Паклажадавец адказвае за страты, прычыненыя ў сувязі з захоўваннем такіх рэчаў захавальніку і трэцім асобам.

Пры перадачы рэчаў з небяспечнымі ўласцівасцямі на захоўванне прафесійнаму захавальніку правілы, выкладзеныя ў частцы першай гэтага пункта, прымяняюцца ў выпадку, калі такія рэчы былі здадзены на захоўванне пад няправільным найменнем і захавальнік пры іх прыняцці не мог шляхам вонкавага агляду пераканацца ў іх небяспечных уласцівасцях.

Пры аплатным захоўванні ў выпадках, прадугледжаных гэтым пунктам, выплачаная за захоўванне рэчаў узнагарода не вяртаецца, а калі яна не была выплачана, захавальнік можа спагнаць яе поўнасцю.

2. Калі прынятыя на захоўванне з ведама і згоды захавальніка рэчы, указаныя ў частцы першай пункта 1 гэтага артыкула, сталі, нягледзячы на прытрымліванне ўмоў іх захоўвання, небяспечнымі для навакольных або для маёмасці захавальніка ці трэціх асоб і абставіны не дазваляюць захавальніку запатрабаваць ад паклажадаўца неадкладна іх забраць або ён не выконвае гэтага патрабавання, гэтыя рэчы могуць быць абясшкоджаны ці знішчаны захавальнікам без пакрыцця паклажадаўцу страт. Паклажадавец не нясе ў такім выпадку адказнасці перад захавальнікам і трэцімі асобамі за страты, прычыненыя ў сувязі з захоўваннем гэтых рэчаў.

Артыкул 785. Перадача рэчы на захоўванне трэцяй асобе

Калі дагаворам захоўвання не прадугледжана іншае, захавальнік не мае права без згоды паклажадаўца перадаваць рэч на захоўванне трэцяй асобе, за выключэннем выпадкаў, калі ён вымушаны да гэтага сілаю абставін у інтарэсах паклажадаўца і пазбаўлены магчымасці атрымаць яго згоду.

Аб перадачы рэчы на захоўванне трэцяй асобе захавальнік абавязаны неадкладна паведаміць паклажадаўцу.

Пры перадачы рэчы на захоўванне трэцяй асобе ўмовы дагавора паміж паклажадаўцам і першапачатковым захавальнікам захоўваюць сілу і апошні адказвае за дзеянні трэцяй асобы, якой ён перадаў рэч на захоўванне, як за свае ўласныя.

Артыкул 786. Узнагарода за захоўванне

1. Узнагарода за захоўванне павінна быць выплачана захавальніку пасля заканчэння захоўвання, а калі аплата захоўвання прадугледжана па перыядах, яна павінна выплачвацца адпаведнымі часткамі пасля сканчэння кожнага перыяду.

2. Пры пратэрміноўцы аплаты ўзнагароды за захоўванне больш чым на палову перыяду, за які яна павінна быць выплачана, захавальнік мае права адмовіцца ад выканання дагавора і запатрабаваць ад паклажадаўца неадкладна забраць здадзеную на захоўванне рэч.

3. Калі захоўванне спыняецца да сканчэння абумоўленага тэрміну з-за абставін, за якія захавальнік не адказвае, ён мае права на суразмерную частку ўзнагароды, а ў выпадку, прадугледжаным пунктам 1 артыкула 784 гэтага Кодэкса, – на ўсю суму ўзнагароды.

Калі захоўванне спыняецца датэрмінова з-за абставін, за якія захавальнік адказвае, ён не мае права патрабаваць узнагароды за захоўванне, а атрыманую ў кошт гэтай узнагароды суму павінен вярнуць паклажадаўцу.

4. Калі пасля сканчэння тэрміну захоўвання рэч, якая знаходзіцца на захоўванні, не ўзята назад паклажадаўцам, ён абавязаны заплаціць захавальніку суразмерную ўзнагароду за далейшае захоўванне рэчы. Гэта правіла прымяняецца і ў выпадку, калі паклажадавец абавязаны забраць рэч да сканчэння тэрміну захоўвання.

5. Правілы гэтага артыкула прымяняюцца, калі дагаворам захоўвання не прадугледжана іншае.

Артыкул 787. Пакрыццё расходаў на захоўванне

1. Калі іншае не прадугледжана дагаворам захоўвання, расходы захавальніка на захоўванне рэчы ўключаюцца ва ўзнагароду за захоўванне.

2. Пры бязвыплатным захоўванні паклажадавец абавязаны кампенсаваць захавальніку праведзеныя ім неабходныя расходы на захоўванне рэчы, калі заканадаўствам ці дагаворам не прадугледжана іншае.

Артыкул 788. Надзвычайныя расходы на захоўванне

1. Расходы на захоўванне рэчы, якія перавышаюць звычайныя расходы такога роду і якія бакі не маглі прадбачыць пры заключэнні дагавора захоўвання (надзвычайныя расходы), кампенсуюцца захавальніку, калі паклажадавец даў згоду на гэтыя расходы ці адобрыў іх пасля, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам ці дагаворам.

2. Пры неабходнасці зрабіць надзвычайныя расходы захавальнік абавязаны запытаць паклажадаўца аб згодзе на гэтыя расходы. Калі паклажадавец не паведаміць аб сваёй нязгодзе ў тэрмін, указаны захавальнікам, ці на працягу нармальна неабходнага для адказу часу, лічыцца, што ён згодны на надзвычайныя расходы.

У выпадку, калі захавальнік зрабіў надзвычайныя расходы на захоўванне, не атрымаўшы ад паклажадаўца папярэдняй згоды на гэтыя расходы, хоць з-за абставін справы гэта было магчыма, і паклажадавец пасля не адобрыў іх, захавальнік можа патрабаваць пакрыцця надзвычайных расходаў толькі ў межах урону, які мог быць прычынены рэчы, калі б гэтыя расходы не былі праведзены.

3. Калі іншае не прадугледжана дагаворам, надзвычайныя расходы кампенсуюцца звыш узнагароды за захоўванне.

Артыкул 789. Абавязак паклажадаўца ўзяць рэч назад

1. Пасля сканчэння абумоўленага тэрміну захоўвання ці тэрміну, дадзенага захавальнікам для атрымання рэчы назад на падставе пункта 3 артыкула 779 гэтага Кодэкса, паклажадавец абавязаны неадкладна забраць перададзеную на захоўванне рэч.

2. Пры невыкананні паклажадаўцам свайго абавязку ўзяць назад рэч, перададзеную на захоўванне, у тым ліку пры яго ўхіленні ад атрымання рэчы, захавальнік мае права, калі іншае не прадугледжана дагаворам, пасля пісьмовага папярэджання паклажадаўца самастойна прадаць рэч па цане, якая склалася ў месцы захоўвання, а калі такая цана перавышае ў сто разоў устаноўлены заканадаўствам памер базавай велічыні, – прадаць яе з аўкцыёну ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 417–419 гэтага Кодэкса.

Сума, выручаная ад продажу рэчы, перадаецца паклажадаўцу за вылікам сум, належных захавальніку, у тым ліку яго расходаў на продаж рэчы.

Артыкул 790. Абавязак захавальніка вярнуць рэч

1. Захавальнік абавязаны вярнуць паклажадаўцу ці асобе, указанай ёй у якасці атрымальніка, тую самую рэч, якая была перададзена на захоўванне, калі дагаворам не прадугледжана захоўванне з **абезасобленнем** (артыкул 780).

2. Рэч павінна быць вернута захавальнікам у тым стане, у якім яна была прынята на захоўванне, з улікам яе натуральнага пагаршэння, натуральнага змяншэння ці іншага змянення ў выніку яе натуральных уласцівасцей.

3. Адначасова з вяртаннем рэчы захавальнік абавязаны перадаць набыткі і даходы, атрыманыя за час яе захоўвання, калі іншае не прадугледжана дагаворам.

Артыкул 791. Падставы адказнасці захавальніка

1. Захавальнік адказвае за страту, недастачу ці пашкоджанне рэчаў, прынятых на захоўванне, на падставах, прадугледжаных артыкулам 372 гэтага Кодэкса. Прафесійны захавальнік адказвае за страту, недастачу ці пашкоджанне рэчаў, калі не дакажа, што страта, недастача ці пашкоджанне адбыліся ў выніку непераадольнай сілы, або з-за ўласцівасцей рэчы, аб якіх захавальнік, прымаючы яе на захоўванне, не ведаў і не павінен быў ведаць, або ў выніку намеру ці грубай неасцярожнасці паклажадаўца.

2. За страту, недастачу ці пашкоджанне прынятых на захоўванне рэчаў пасля таго, як надышоў абавязак паклажадаўца ўзяць гэтыя рэчы назад (пункт 1 артыкула 789), захавальнік адказвае толькі пры наяўнасці з яго боку намеру ці грубай неасцярожнасці.

Артыкул 792. Памер адказнасці захавальніка

1. Страты, прычыненыя паклажадаўцу стратай, недастачай ці пашкоджаннем рэчаў, кампенсуе захавальнік у адпаведнасці з артыкулам 364 гэтага Кодэкса, калі заканадаўствам ці дагаворам не прадугледжана іншае.

2. Пры бязвыплатным захоўванні страты, прычыненыя паклажадаўцу стратай, недастачай ці пашкоджаннем рэчаў, кампенсуюцца:

1) за страту і недастачу рэчаў – у памеры кошту страчаных ці адсутных рэчаў;

2) за пашкоджанне рэчаў – у памеры сумы, на якую панізіўся іх кошт.

3. У выпадках, калі ў выніку пашкоджання, за якое захавальнік адказвае, якасць рэчы змянілася настолькі, што яна не можа быць выкарыстана для першапачатковага прызначэння, паклажадавец мае права ад яе адмовіцца і запатрабаваць ад захавальніка пакрыцця кошту гэтай рэчы, а таксама іншых страт, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам захоўвання.

Артыкул 793. Пакрыццё страт, прычыненых захавальніку

Паклажадавец абавязаны кампенсаваць захавальніку страты, прычыненыя ўласцівасцямі здадзенай на захоўванне рэчы, калі захавальнік, прымаючы рэч на захоўванне, не ведаў і не павінен быў ведаць аб гэтых уласцівасцях.

Артыкул 794. Спыненне абавязацельства захоўвання па патрабаванні паклажадаўца

Захавальнік абавязаны па першым патрабаванні паклажадаўца вярнуць прынятую на захоўванне рэч, хоць прадугледжаны дагаворам тэрмін яе захоўвання яшчэ і не скончыўся.

Артыкул 795. Прымяненне агульных палажэнняў аб захоўванні да асобных яго відаў

Агульныя палажэнні аб захоўванні (артыкулы 776–794) прымяняюцца да асобных яго відаў, калі правіламі аб асобных відах захоўвання, якія ўтрымліваюцца ў артыкулах 797–816 гэтага Кодэкса і іншых актах заканадаўства, не ўстаноўлена іншае.

Артыкул 796. Захоўванне паводле акта заканадаўства

Правілы гэтай главы адпаведна прымяняюцца да абавязацельстваў захоўвання, якія ўзнікаюць паводле акта заканадаўства, калі заканадаўствам не ўстаноўлены іншыя правілы.

§ 2. Захоўванне на таварным складзе

Артыкул 797. Дагавор складскога захоўвання

1. Паводле дагавора складскога захоўвання таварны склад (захавальнік) абавязваецца за ўзнагароду захоўваць тавары, перададзеныя яму тавараўладальнікам (паклажадаўцам), і вярнуць гэтыя тавары захаванымі.

Таварным складам прызнаецца арганізацыя, якая ажыццяўляе ў якасці прадпрымальніцкай дзейнасці захоўванне тавараў і аказвае звязаныя з захоўваннем паслугі.

2. Пісьмовая форма дагавора складскога захоўвання лічыцца захаванай, калі яго заключэнне і прыняцце тавару на склад засведчаны складскім дакументам (артыкул 802).

Артыкул 798. Захоўванне тавараў складам агульнага карыстання

1. Таварны склад прызнаецца складам агульнага карыстання, калі з заканадаўства ці выдадзенага гэтай камерцыйнай арганізацыі спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) вынікае, што яна абавязана прымаць тавары на захоўванне ад любога тавараўладальніка.

2. Дагавор складскога захоўвання, які заключае таварны склад агульнага карыстання, прызнаецца публічным дагаворам (артыкул 396).

Артыкул 799. Праверка тавараў пры іх прыёме таварным складам і ў час захоўвання

1. Калі іншае не прадугледжана дагаворам захоўвання, таварны склад пры прыёме тавараў на захоўванне абавязаны за свой кошт зрабіць агляд тавараў і вызначыць іх колькасць (колькасць адзінак ці таварных месцаў або меру, вагу, аб'ём) і знешні стан.

2. Таварны склад абавязаны даваць тавараўладальніку ў час захоўвання магчымасць аглядаць тавары ці іх узоры, калі захоўванне ажыццяўляецца з **абезасобленнем**, браць пробы і прымаць меры, неабходныя для забеспячэння захаванасці тавараў.

Артыкул 800. Змяненне ўмоў захоўвання і стану тавараў

1. У выпадку, калі для забеспячэння захаванасці тавараў патрабуецца змяніць умовы іх захоўвання, таварны склад мае права прыняць патрэбныя меры самастойна. Аднак ён абавязаны паведаміць тавараўладальніку аб прынятых мерах, калі патрабавалася істотна змяніць умовы захоўвання тавараў, прадугледжаныя дагаворам складскога захоўвання.

2. Пры выяўленні ў час захоўвання пашкоджанняў тавару, якія выходзяць за межы ўзгодненых у дагаворы складскога захоўвання ці звычайных нормаў натуральнага пашкоджання, таварны склад абавязаны неадкладна скласці аб гэтым акт і ў той жа дзень паведаміць тавараўладальніку.

Артыкул 801. Праверка колькасці і стану тавару пры вяртанні яго тавараўладальніку

1. Тавараўладальнік і таварны склад маюць права кожны патрабаваць пры вяртанні тавару яго агляду і праверкі яго колькасці. Выкліканыя гэтым расходы нясе той, хто запатрабаваў агляду тавару ці праверкі яго колькасці.

2. Калі пры вяртанні тавару складам тавараўладальніку тавар не быў імі сумесна агледжаны ці правераны, заява аб недастачы ці пашкоджанні тавару ў выніку яго неналежнага захоўвання павінна быць зроблена складу пісьмова пры атрыманні тавару, а ў адносінах да недастачы ці пашкоджання, якія не маглі быць выяўлены пры звычайным спосабе прыняцця тавару, – на працягу трох дзён пасля яго атрымання.

Пры адсутнасці заявы тавараўладальніка, указанага ў частцы першай гэтага пункта, лічыцца, паколькі не даказана іншае, што тавар вернуты складам у адпаведнасці з умовамі дагавора складскога захоўвання.

Артыкул 802. Складскія дакументы

1. Таварны склад выдае ў пацвярджэнне прыняцця тавараў на захоўванне адзін з наступных складскіх дакументаў:

1) двайное складское пасведчанне;

2) простае складское пасведчанне;

3) складскую квітанцыю.

Не дапускаецца выдача двайнога складскога пасведчання ці простага складскога пасведчання пры прыняцці на захоўванне:

маёмасці, якія не належыць паклажадаўцу на праве ўласнасці ці іншым рэчавым праве;

каштоўных папер;

маёмасці, абцяжаранай закладам;

маёмасці, якія не можа быць захавана без страты якасных ці колькасных характарыстык на працягу ўсяго тэрміну дзеяння дагавора захоўвання;

маёмасці, у адносінах да якой не спынена вядзенне па ісках аб выпатрабаванні з чужога незаконнага валодання;

маёмасці, на якую не можа быць звернута спагнанне ў адпаведнасці з заканадаўствам.

2. Двайное складское пасведчанне складаецца з дзвюх частак – складскога пасведчання і закладнога пасведчання (варанта), якія могуць быць аддзелены адно ад аднаго.

3. Двайное складское пасведчанне, кожная з дзвюх яго частак і простае складское пасведчанне з'яўляюцца каштоўнымі паперамі.

4. Тавар, прыняты на захоўванне па двайным складскім пасведчанні, можа быць на працягу яго захоўвання прадметам закладу шляхам аддзялення і перадачы закладнога пасведчання. Пры закладзе тавару аб гэтым робіцца адзнака на складскім пасведчанні.

Артыкул 803. Двайное складское пасведчанне

1. У кожнай частцы двайнога складскога пасведчання павінны быць аднолькава ўказаны:

1) найменне і месца знаходжання таварнага склада, які прыняў тавар на захоўванне;

2) бягучы нумар складскога пасведчання па рэестры склада;

3) найменне юрыдычнай асобы або імя грамадзяніна, ад якога прыняты тавар на захоўванне, а таксама месца знаходжання (месца жыхарства) тавараўладальніка;

4) найменне і колькасць прынятага на захоўванне тавару – колькасць адзінак і (ці) таварных месцаў і (ці) мера (вага, аб'ём) тавару;

5) тэрмін, на які тавар прыняты на захоўванне, калі такі тэрмін устанаўліваецца, або ўказанне, што тавар прыняты на захоўванне да запатрабавання;

6) памер узнагароды за захоўванне або тарыфы, на падставе якіх ён вылічаецца, і парадак аплаты захоўвання;

7) дата выдачы складскога пасведчання.

Абедзве часткі двайнога складскога пасведчання павінны мець ідэнтычныя подпісы ўпаўнаважанай асобы і пячаткі таварнага складу.

2. Дакумент, які не адпавядае патрабаванням гэтага артыкула, не з'яўляецца двайным складскім пасведчаннем.

Артыкул 804. Правы трымальнікаў складскога і закладнога пасведчанняў

1. Трымальнік складскога і закладнога пасведчанняў мае права распараджэння таварам, які захоўваецца на складзе, у поўным аб'ёме.

2. Трымальнік складскога пасведчання, аддзеленага ад закладнога пасведчання, мае права распараджацца таварам, але не можа ўзяць яго са склада да выплаты ім усёй сумы доўгу па закладным пасведчанні.

3. Трымальнік закладнога пасведчання, іншы, чым трымальнік складскога пасведчання, мае права закладу на тавар у памеры сумы абавязацельства, у забеспячэнне выканання якога перададзена закладное пасведчанне.

4. Таварны склад не мае права выступаць трымальнікам выдадзенага ім двайнога складскога пасведчання (яго часткі).

5. Трымальнік складскога пасведчання, які аддзяліў закладное пасведчанне, не мае права адчужаць складское пасведчанне да выплаты ім усёй сумы доўгу па закладным пасведчанні.

Артыкул 805. Перадача складскога і закладнога пасведчанняў

1. Складское пасведчанне і закладное пасведчанне могуць перадавацца разам ці паасобку па перадатачных надпісах (індасаментах).

2. Індасамент павінен быць простым і нічым не абумоўленым. Усялякая ўмова, якая абмяжоўвае яго, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, лічыцца нікчэмнай. Частковы індасамент несапраўдны.

3. Не дапускаюцца ўключэнне ў тэкст індасамента агаворак, пры здзяйсненні чарговага індасамента ўнясенне змяненняў і дапаўненняў у тэкст папярэдніх індасаментаў, складскога пасведчання ці закладнога пасведчання, а таксама здзяйсненне бланкавага індасамента.

4. Індасаменты, здзейсненыя з парушэннем патрабаванняў, устаноўленых гэтым артыкулам, лічацца несапраўднымі.

Артыкул 806. Выдача тавару па двайным складскім пасведчанні

1. Таварны склад выдае тавар трымальніку складскога і закладнога пасведчанняў (двайнога складскога пасведчання) няйнакш як у абмен на абодва гэтыя пасведчанні разам. Пры ўплаце ўсёй сумы доўгу па закладным пасведчанні закладное пасведчанне вяртаецца трымальніку складскога пасведчання, на ім робіцца адзнака аб уплаце ўсёй сумы доўгу і спыненні закладу.

2. Трымальніку складскога пасведчання, які не мае закладнога пасведчання, але ўнёс суму доўгу па ім, тавар выдаецца складам няйнакш як у абмен на складское пасведчанне і пры ўмове прадстаўлення разам з ім дакумента, які пацвярджае выплату ўсёй сумы доўгу па закладным пасведчанні.

3. Таварны склад, які выдаў насуперак патрабаванням гэтага артыкула тавар трымальніку складскога пасведчання, які не мае закладнога пасведчання і не ўнёс суму доўгу па ім, нясе адказнасць перад трымальнікам закладнога пасведчання за

выкананне абавязацельства, у забеспячэнне выканання якога перададзена закладное пасведчанне.

4. Трымальнік складскога і закладнога пасведчанняў мае права патрабаваць выдачы тавару па частках. Пры гэтым у абмен на першапачатковыя пасведчанні яму выдаюцца новыя пасведчанні на тавары, якія засталіся на складзе.

Артыкул 807. Простае складское пасведчанне

1. Простае складское пасведчанне выдаецца на прад'яўніка.

2. Простае складское пасведчанне павінна ўтрымліваць звесткі, прадугледжаныя падпунктамі 1, 2, 4-7 пункта 1 артыкула 803 гэтага Кодэкса, а таксама ўказанне на тое, што яно выдадзена на прад'яўніка.

3. Дакумент, які не адпавядае патрабаванням гэтага артыкула, не з'яўляецца простым складскім пасведчаннем.

Артыкул 808. Захоўванне рэчаў з правам распараджэння імі

Калі з заканадаўства ці дагавора вынікае, што таварны склад можа распараджацца здадзенымі яму на захоўванне таварамі, то да адносін бакоў прымяняюцца правілы главы 42 гэтага Кодэкса аб пазыцы, аднак час і месца вяртання тавараў вызначаюцца правіламі гэтай главы.

§ 3. Спецыяльныя віды захоўвання

Артыкул 809. Выключаны

Артыкул 810. Выключаны

Артыкул 811. Захоўванне каштоўнасцей у банку ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі

1. Банк ці нябанкаўская крэдытна-фінансавая арганізацыя могуць прымаць на захоўванне каштоўныя паперы, каштоўныя металы і камяні, іншыя каштоўныя рэчы і каштоўнасці, у тым ліку дакументы.

2. Дагавор захоўвання каштоўнасцей у банку ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі афармляецца выдачай банкам ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыяй паклажадаўцу імяннога захоўнага дакумента, прад'яўленне якога з'яўляецца падставай для выдачы каштоўнасцей, што захоўваюцца, паклажадаўцу.

Артыкул 812. Захоўванне каштоўнасцей у індывідуальным банкаўскім сейфе

1. Дагаворам захоўвання каштоўнасцей у банку ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі можа быць прадугледжана іх захоўванне з выкарыстаннем паклажадаўцам (кліентам) ці з даваннем яму індывідуальнага банкаўскага сейфа, які ахоўваецца банкам ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыяй (ячэйкі сейфа, ізаляванага памяшкання ў банку ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі).

Паводле дагавора захоўвання каштоўнасцей у індывідуальным банкаўскім сейфе кліенту даецца права самому змяшчаць каштоўнасці ў сейф і забіраць іх з сейфа, для чаго яму павінны быць выдадзены ключ ад сейфа, картка, якая дазваляе

ідэнтыфікаваць кліента, або іншы знак ці дакумент, які сведчыць права кліента на доступ да сейфа і яго змесціва.

Умовамі дагавора можа быць прадугледжана права кліента працаваць у банку ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі з каштоўнасцямі, якія захоўваюцца ў індывідуальным сейфе.

2. Паводле дагавора захоўвання каштоўнасцей у банку ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі з выкарыстаннем кліентам індывідуальнага банкаўскага сейфа банк ці нябанкаўская крэдытна-фінансавая арганізацыя прымаюць ад кліента каштоўнасці, якія павінны захоўвацца ў сейфе, ажыццяўляюць кантроль за іх змяшчэннем кліентам у сейф і забіраннем з сейфа і пасля забірання вяртаюць іх кліенту.

3. Паводле дагавора захоўвання каштоўнасцей у банку ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі з даваннем кліенту індывідуальнага банкаўскага сейфа банк ці нябанкаўская крэдытна-фінансавая арганізацыя забяспечваюць кліенту магчымасць змяшчэння каштоўнасцей у сейф і забірання іх з сейфа па-за чыім-небудзь кантролем, у тым ліку і кантролем з боку банка ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі.

Банк ці нябанкаўская крэдытна-фінансавая арганізацыя абавязаны ажыццяўляць кантроль за доступам у памяшканне, дзе знаходзіцца дадзены кліенту сейф.

Калі дагаворам захоўвання каштоўнасцей у банку ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі з даваннем кліенту індывідуальнага банкаўскага сейфа не прадугледжана іншае, банк ці нябанкаўская крэдытна-фінансавая арганізацыя вызваляюцца ад адказнасці за незахаванасць змесціва сейфа, калі дакажуць, што па ўмовах захоўвання доступ каго-небудзь да сейфа без ведама кліента быў немагчымы або стаў магчымы ў выніку непераадольнай сілы.

4. Да дагавора аб даванні банкаўскага сейфа ў карыстанне іншай асобе без адказнасці банка ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі за змесціва сейфа прымяняюцца правілы гэтага Кодэкса (глава 34) і іншых актаў заканадаўства аб дагаворы арэнды.

Артыкул 813. Захоўванне ў камерах захоўвання транспартных арганізацый

1. Камеры захоўвання, якія знаходзяцца ў распараджэнні транспартных арганізацый агульнага карыстання, абавязаны прымаць на захоўванне рэчы пасажыраў і іншых грамадзян незалежна ад наяўнасці ў іх праязных дакументаў. Дагавор захоўвання рэчаў у камерах захоўвання транспартных арганізацый прызнаецца публічным дагаворам (артыкул 396).

2. У пацвярджэнне прыняцця рэчы на захоўванне ў камеру захоўвання (акрамя аўтаматычных камер) паклажадаўцу выдаецца квітанцыя ці нумарны жэтон. У выпадку страты квітанцыі ці нумарнога жэтона здадзеная ў камеру захоўвання рэч выдаецца паклажадаўцу пасля прадстаўлення доказаў прыналежнасці яму гэтай рэчы.

3. Тэрмін, на працягу якога камера захоўвання абавязана захоўваць рэчы, вызначаецца актамі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, выдадзенымі ў адпаведнасці з часткай другой пункта 2 артыкула 738 гэтага Кодэкса, калі пагадненнем бакоў не ўстаноўлены больш працяглы тэрмін. Рэчы, не запатрабаваныя ва ўказаныя тэрміны, камера захоўвання абавязана захоўваць яшчэ на працягу трыццаці дзён. Пасля сканчэння гэтага тэрміну незапатрабаваныя рэчы

могуць быць прададзены ў парадку, прадугледжаным пунктам 2 артыкула 789 гэтага Кодэкса.

4. Страты паклажадаўца ў выніку згубы, недастачы ці пашкоджання рэчаў, здадзеных у камеру захоўвання, у межах іх кошту, які вызначаецца паклажадаўцам пры здачы на захоўванне, падлягаюць пакрыццю захавальнікам на працягу дваццаці чатырох гадзін з моманту прад'яўлення патрабавання аб іх пакрыцці.

Артыкул 814. Захоўванне ў гардэробах арганізацый

1. Захоўванне ў гардэробах арганізацый лічыцца бязвыплатным, калі ўзнагарода за захоўванне не агаворана ці іншым відавочным чынам не абумоўлена пры здачы рэчы на захоўванне.

Захавальнік рэчы, здадзенай у гардэроб, незалежна ад таго, ажыццяўляецца захоўванне выплатна ці бязвыплатна, абавязаны прыняць для забеспячэння захаванасці рэчы ўсе меры, прадугледжаныя пунктамі 1 і 2 артыкула 781 гэтага Кодэкса.

2. Правілы гэтага артыкула прымяняюцца таксама да захоўвання верхняга адзення, галаўных убораў і іншых падобных рэчаў, якія застаюцца без здачы іх на захоўванне грамадзянамі ў месцах, адведзеных для гэтых мэт у арганізацыях і сродках транспарту.

Артыкул 815. Захоўванне ў гасцініцы

1. Гасцініца адказвае як захавальнік і без асобнага аб тым пагаднення з асобай, якая пражывае ў ёй (пастаяльцам), за згубу, недастачу ці пашкоджанне яе рэчаў, унесеных у гасцініцу, за выключэннем грошай, іншых валютных каштоўнасцей, каштоўных папер і іншых каштоўных рэчаў.

Унесенай у гасцініцу лічыцца рэч, даверaная работнікам гасцініцы, або рэч, змешчаная ў гасцінічным нумары ці іншым прызначаным для гэтага месцы.

2. Гасцініца адказвае за страту грошай, іншых валютных каштоўнасцей, каштоўных папер і іншых каштоўных рэчаў пастаяльца пры ўмове, калі яны былі прыняты гасцініцай на захоўванне або былі змешчаны пастаяльцам у забяспечаны яму гасцініцай індывідуальны сейф незалежна ад таго, знаходзіцца гэты сейф у яго нумары ці ў іншым памяшканні гасцініцы. Гасцініца вызваляецца ад адказнасці за незахаванасць змесціва такога сейфа, калі дакажа, што з-за ўмоў захоўвання доступ каго-небудзь да сейфа без ведама пастаяльца быў немагчымы або стаў магчымы ў выніку непераадольнай сілы.

3. Пастаялец, які выявіў згубу, недастачу ці пашкоджанне сваіх рэчаў, абавязаны без прамаруджання заявіць аб гэтым гасцініцы. У адваротным выпадку гасцініца вызваляецца ад адказнасці за незахаванасць рэчаў.

4. Зробленая гасцініцай аб’ява аб тым, што яна не прымае на сябе адказнасці за незахаванасць рэчаў пастаяльцаў, не вызваляе яе ад адказнасці.

5. Гасцініца вызваляецца ад адказнасці за згубу, недастачу ці пашкоджанне рэчаў пастаяльца, калі яны адбыліся па яго віне.

6. Правілы гэтага артыкула адпаведна прымяняюцца ў адносінах да захоўвання рэчаў грамадзян у матэлях, дамах адпачынку, пансіянатах, санаторыях, лазнях і іншых падобных арганізацыях.

Артыкул 816. Захоўванне рэчаў, якія з'яўляюцца прадметам спрэчкі (секвестр)

1. Паводле дагавора аб секвестры дзве ці некалькі асоб, паміж якімі ўзнікла спрэчка аб праве на рэч, перадаюць гэту рэч трэцяй асобе, якая прымае на сябе абавязак пасля вырашэння спрэчкі вярнуць рэч той асобе, якой яна будзе прысуджана паводле рашэння суда або па пагадненні ўсіх асоб, якія спрачаюцца (дагаворны секвестр).

2. Рэч, якая з'яўляецца прадметам спрэчкі паміж дзвюма ці некалькімі асобамі, можа быць перададзена на захоўванне ў парадку секвестру паводле рашэння суда (судовы секвестр).

Захавальнікам па судовым секвестры можа быць як асоба, прызначаная судом, так і асоба, якая вызначаецца па ўзаемнай згодзе бакоў, што спрачаюцца. У абодвух выпадках патрабуецца згода захавальніка, калі заканадаўствам не ўстаноўлена іншае.

3. На захоўванне ў парадку секвестру могуць быць перададзены як рухомыя, так і нерухомыя рэчы.

4. Захавальнік, які ажыццяўляе захоўванне рэчы ў парадку секвестру, мае права на ўзнагароду за кошт бакоў, якія спрачаюцца, калі дагаворам ці рашэннем суда, якім устаноўлены секвестр, не прадугледжана іншае.

ГЛАВА 48
СТРАХАВАННЕ

Артыкул 817. Добраахвотнае і абавязковае страхаванне

1. Страхаванне ажыццяўляецца ў добраахвотным парадку на падставе дагавораў страхавання, якія заключаюцца страхавальнікам са страхоўшчыкам, калі іншае не ўстаноўлена законамі ці актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Страхавальнікі – грамадзяне, у тым ліку замежныя, асобы без грамадзянства, арганізацыі, у тым ліку замежныя і міжнародныя, а таксама Рэспубліка Беларусь і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі, замежныя дзяржавы, якія заключылі са страхоўшчыкамі дагаворы страхавання або з'яўляюцца гэтакімі паводле закона ці акта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

2. У выпадках, калі законамі ці актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на ўказаных у іх асоб ускладаецца абавязак па страхаванні жыцця, здароўя ці маёмасці або сваёй грамадзянскай адказнасці (абавязковае страхаванне, за выключэннем абавязковага дзяржаўнага страхавання), страхаванне ажыццяўляецца ў адпаведнасці з законамі і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

3. Правілы гэтай главы прымяняюцца да абавязковага страхавання, паколькі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 818. Інтарэсы, страхаванне якіх не дапускаецца

1. Страхаванне проціпраўных інтарэсаў не дапускаецца.

2. Не дапускаецца страхаванне страт ад удзелу ў гульнях, латарэях і закладах.

3. Не дапускаецца страхаванне расходаў, да якіх асоба можа быць прымушана ў мэтах вызвалення заложнікаў.

4. Выключаны.

5. Умовы дагавораў страхавання, якія супярэчаць пунктам 1-3 гэтага артыкула, нікчэмныя.

Артыкул 819. Дагавор страхавання

1. Паводле дагавора страхавання адзін бок (страхоўшчык) абавязваецца пры надыходзе прадугледжанай заканадаўствам ці дагаворам падзеі (страхавога выпадку) кампенсаваць іншаму боку (страхавальніку) ці трэцяй асобе (застрахаванай асобе, выгаданабытчыку), на карысць якой заключаны дагавор, прычынены ў выніку гэтай падзеі ўрон застрахаваным паводле дагавора маёмасным інтарэсам (зрабіць страхавую выплату ў выглядзе страхавога пакрыцця ці страхавога забеспячэння) у межах вызначанай дагаворам сумы (страхавой сумы, ліміту адказнасці), а іншы бок (страхавальнік) абавязваецца заплаціць абумоўленую дагаворам суму (страхавы ўзнос, страхавую прэмію).

2. Аб'ектамі страхавання могуць быць маёмасныя інтарэсы, якія не супярэчаць заканадаўству, звязаныя:

з прычыненнем шкоды жыццю ці здароўю страхавальніка або іншай названай у дагаворы фізічнай асобы (асабістае страхаванне, якое не адносіцца да страхавання жыцця);

з дасягненнем грамадзянамі пэўнага ўзросту ці з надыходам у іх жыцці іншага прадугледжанага ў дагаворы страхавога выпадку (асабістае страхаванне, якое адносіцца да страхавання жыцця);

са стратай (гібеллю) ці пашкоджаннем маёмасці, якая знаходзіцца ў валоданні, карыстанні, распараджэнні страхавальніка ці іншага названага ў дагаворы выгаданабытчыка, або з прычыненнем урону іх маёмасным правам, у тым ліку з узнікненнем страт ад прадпрымальніцкай дзейнасці ў сувязі з невыкананнем (выкананнем неналежным чынам) сваіх абавязацельстваў контрагентамі суб'екта гаспадарання* ці са змяненнем умоў гэтай дзейнасці з-за абставін, якія не залежаць ад прадпрымальніка (маёмаснае страхаванне);

з адказнасцю па абавязацельствах, якія ўзніклі ў выпадку прычынення страхавальнікам ці іншай асобай, на якіх такая адказнасць можа быць ускладзена, шкоды жыццю, здароўю ці маёмасці іншых асоб, або з адказнасцю паводле дагавора (страхаванне адказнасці).

---

*Пад суб'ектамі гаспадарання для мэт гэтай главы маюцца на ўвазе гаспадарчыя суполкі і таварыствы , унітарныя прадпрыемствы, вытворчыя кааператывы, у тым ліку сельскагаспадарчыя вытворчыя кааператывы, і сялянскія (фермерскія) гаспадаркі; дзяржаўныя аб'яднанні; асацыяцыі (саюзы) – аб'яднанні камерцыйных і (ці) некамерцыйных арганізацый, аб'яднанні камерцыйных арганізацый і (ці) індывідуальных прадпрымальнікаў; спажывецкія кааператывы, гандлёва-прамысловыя палаты, установы, суполкі ўласнікаў; грамадзяне, якія ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць без утварэння юрыдычнай асобы.

Артыкул 820. Дагавор асабістага страхавання

1. Паводле дагавора асабістага страхавання страхоўшчык абавязваецца за абумоўлены дагаворам страхавы ўзнос (страхавую прэмію), які выплачваецца страхавальнікам, выплаціць аднаразова ці выплачваць перыядычна страхавое забеспячэнне ў межах абумоўленай дагаворам страхавой сумы (ліміту адказнасці) у выпадку прычынення шкоды жыццю ці здароўю самога страхавальніка ці іншай застрахаванай асобы або дасягнення імі пэўнага ўзросту ці надыходу ў іх жыцці іншай прадугледжанай дагаворам падзеі (страхавога выпадку).

2. Дагавор асабістага страхавання лічыцца заключаным на карысць застрахаванай асобы, калі ў дагаворы не названа ў якасці выгаданабытчыка іншая асоба. У выпадку смерці асобы, застрахаванай паводле дагавора, у якім не названы

іншы выгаданабытчык, выгаданабытчыкамі прызнаюцца спадчыннікі застрахаванай асобы.

Дагавор асабістага страхавання на карысць асобы, якая не з'яўляецца застрахаванай асобай, у тым ліку на карысць страхавальніка, які не з'яўляецца застрахаванай асобай, можа быць заключаны толькі з пісьмовай згоды застрахаванай асобы. Пры адсутнасці такой згоды дагавор можа быць прызнаны несапраўдным па іску застрахаванай асобы, а ў выпадку смерці гэтай асобы – па іску яго спадчыннікаў.

Артыкул 821. Страхаванне маёмасці

1. Маёмасць можа быць застрахавана паводле дагавора страхавання на карысць асобы (страхавальніка ці выгаданабытчыка), якая мае заснаваны на заканадаўстве ці дагаворы інтарэс у захаванні гэтай маёмасці.

2. Дагавор страхавання маёмасці, заключаны пры адсутнасці ў страхавальніка ці выгаданабытчыка інтарэсу ў захаванні застрахаванай маёмасці, несапраўдны.

3. Дагавор страхавання маёмасці на карысць выгаданабытчыка можа быць заключаны без указання імя ці наймення выгаданабытчыка.

Пры заключэнні такога дагавора страхавальніку выдаецца страхавы поліс на прад'яўніка. Пры ажыццяўленні страхавальнікам ці выгаданабытчыкам правоў па такім дагаворы неабходна прадстаўленне гэтага поліса страхоўшчыку.

Артыкул 822. Страхаванне маёмасных правоў і прадпрымальніцкай рызыкі

1. Паводле дагавора страхавання маёмасных правоў могуць быць застрахаваны маёмасныя правы страхавальніка ці іншага названага ў дагаворы выгаданабытчыка.

У якасці маёмасных правоў, якія могуць быць застрахаваны паводле дагавора, прымаюцца правы страхавальнікаў (выгаданабытчыкаў), звязаных з ажыццяўленнем імі правамоцтваў валодання, карыстання і распараджэння маёмасцю, а таксама з маёмаснымі патрабаваннямі, якія ўзнікаюць паміж страхавальнікамі (выгаданабытчыкамі) і іншымі асобамі наконт вызначэння лёсу маёмасці і звязаных з ёй правоў (права ўласнасці, гаспадарчага распараджэння, аператыўнага кіравання, абавязацельныя правы (дагаворныя і пазадагаворныя), права на вынікі інтэлектуальнай дзейнасці).

2. Прадпрымальніцкая рызыка – рызыка, якая ўзнікае пры ажыццяўленні страхавальнікам прадпрымальніцкай дзейнасці.

3. Паводле дагавора страхавання прадпрымальніцкай рызыкі можа быць застрахавана прадпрымальніцкая рызыка толькі самога страхавальніка і толькі на яго карысць.

Дагавор страхавання прадпрымальніцкай рызыкі асобы, якая не з'яўляецца страхавальнікам, нікчэмны.

Дагавор страхавання прадпрымальніцкай рызыкі на карысць асобы, якая не з'яўляецца страхавальнікам, лічыцца заключаным на карысць страхавальніка.

4. Да дагавора страхавання рызыкі невяртання (непагашэння) і (ці) пратэрміноўкі вяртання (пагашэння) крэдыту прымяняюцца правілы, прадугледжаныя гэтай главой, якія падлягаюць прымяненню ў адносінах да страхавання прадпрымальніцкай рызыкі.

Артыкул 823. Страхаванне адказнасці за прычыненне шкоды

1. Паводле дагавора страхавання адказнасці па абавязацельствах, якія ўзнікаюць у выніку прычынення шкоды жыццю, здароўю ці маёмасці іншых асоб,

можа быць застрахавана адказнасць самога страхавальніка ці іншай асобы, на якую такая адказнасць можа быць ускладзена.

2. Асоба, адказнасць якой за прычыненне шкоды застрахавана, павінна быць названа ў дагаворы страхавання, а калі асоба не названа, лічыцца застрахаванай адказнасць самога страхавальніка.

3. Дагавор страхавання адказнасці за прычыненне шкоды лічыцца заключаным на карысць асоб, якім можа быць прычынена шкода (выгаданабытчыкаў), нават калі дагавор заключаны на карысць страхавальніка ці іншай асобы, адказнай за прычыненне шкоды, або ў дагаворы не сказана, на чыю карысць ён заключаны.

4. У выпадку, калі адказнасць за прычыненне шкоды застрахавана з прычыны таго, што яе страхаванне абавязковае, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам ці дагаворам страхавання такой адказнасці, асоба, на карысць якой лічыцца заключаным дагавор страхавання, мае права прад'явіць патрабаванне аб пакрыцці шкоды ў межах страхавой сумы (ліміту адказнасці).

Артыкул 824. Страхаванне адказнасці паводле дагавора

1. Страхаванне адказнасці за парушэнне дагавора дапускаецца ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

2. Паводле дагавора страхавання адказнасці за парушэнне дагавора можа быць застрахавана толькі адказнасць самога страхавальніка. Дагавор страхавання, які не адпавядае гэтаму патрабаванню, нікчэмны.

3. Адказнасць за парушэнне дагавора лічыцца застрахаванай на карысць бока, перад якім па ўмовах гэтага дагавора страхавальнік павінен несці адпаведную адказнасць, – выгаданабытчыка, нават калі дагавор страхавання заключаны на карысць іншай асобы або ў ім не сказана, на чыю карысць ён заключаны.

Артыкул 825. Абавязковае страхаванне

1. Законамі ці актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на ўказаных у іх асоб можа быць ускладзены абавязак страхаваць:

1) жыццё, здароўе ці маёмасць;

2) сваю грамадзянскую адказнасць, якая можа надысці ў выніку прычынення шкоды жыццю, здароўю ці маёмасці іншых асоб або ў выніку парушэння дагавораў з іншымі асобамі.

2. Абавязак страхаваць сваё жыццё ці здароўе не можа быць ускладзены на грамадзяніна Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве.

3. Выключаны.

4. У выпадках, калі абавязак страхавання не вынікае з закона ці акта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а заснаваны на дагаворы, у тым ліку абавязак страхавання маёмасці – на дагаворы з уладальнікам маёмасці ці на ўстаноўчых дакументах юрыдычнай асобы, якая з'яўляецца ўласнікам маёмасці, такое страхаванне не з'яўляецца абавязковым у сэнсе гэтага артыкула і не цягне за сабой наступстваў, прадугледжаных артыкулам 827 гэтага Кодэкса.

Артыкул 826. Ажыццяўленне абавязковага страхавання

1. Абавязковае страхаванне ажыццяўляецца шляхам заключэння са страхоўшчыкам дагавора страхавання асобай, на якую законамі ці актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ускладзены абавязак такога страхавання (страхавальнікам).

2. Абавязковае страхаванне ажыццяўляецца за кошт страхавальніка, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

3. Аб'екты абавязковага страхавання, страхавыя рызыкі і памеры (мінімальныя памеры) страхавых сум (лімітаў адказнасці) вызначаюцца законамі і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

4. Правілы гэтага артыкула не распаўсюджваюцца на абавязковае дзяржаўнае страхаванне (артыкул 859).

Артыкул 827. Наступствы парушэння заканадаўства аб абавязковым страхаванні

1. Асоба, на карысць якой у адпаведнасці з законамі ці актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь павінна быць ажыццёўлена абавязковае страхаванне, мае права, калі ёй вядома, што страхаванне не ажыццёўлена, запатрабаваць у судовым парадку яго ажыццяўлення асобай, на якую ўскладзены абавязак страхавання.

2. Калі асоба, на якую ўскладзены абавязак страхавання, не ажыццявіла яго ці заключыла дагавор страхавання на ўмовах, якія пагаршаюць становішча выгаданабытчыка ў параўнанні з умовамі, вызначанымі законамі і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, яна пры надыходзе страхавога выпадку нясе адказнасць перад выгаданабытчыкам на тых жа ўмовах, на якіх павінна было б быць выплачана страхавое пакрыццё або страхавое забеспячэнне пры належным страхаванні.

3. Сумы, беспадстаўна сабраныя асобай, на якую ўскладзены абавязак страхавання, у сувязі з тым, што яна не выканала гэты абавязак або выканала яго неналежным чынам, спаганяюцца па іску органа, які ажыццяўляе нагляд і кантроль за страхавой дзейнасцю, у даход Рэспублікі Беларусь з налічэннем на гэтыя сумы працэнтаў у адпаведнасці з артыкулам 366 гэтага Кодэкса.

Артыкул 828. Страхоўшчыкі

1. Страхоўшчыкі – камерцыйныя арганізацыі, створаныя для ажыццяўлення страхавой дзейнасці, якія маюць спецыяльныя дазволы (ліцэнзіі) на ажыццяўленне страхавой дзейнасці.

Для асобных відаў страхавання законамі ці актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь можа быць прадугледжаны іншы склад страхоўшчыкаў.

2. Патрабаванні, якім павінны адпавядаць страхоўшчыкі, і парадак ліцэнзавання іх дзейнасці вызначаюцца заканадаўствам.

Артыкул 829. Выкананне абавязкаў паводле дагавора страхавання страхавальнікам і выгаданабытчыкам

1. Заключэнне дагавора страхавання на карысць выгаданабытчыка, у тым ліку і тады, калі ім з'яўляецца застрахаваная асоба, не вызваляе страхавальніка ад выканання абавязкаў паводле гэтага дагавора, калі толькі дагаворам не прадугледжана іншае, або абавязкі, якія ляжаць на страхавальніку, выкананы асобай, на карысць якой заключаны дагавор.

2. Страхоўшчык мае права патрабаваць ад выгаданабытчыка, у тым ліку і тады, калі выгаданабытчыкам з'яўляецца застрахаваная асоба, выканання абавязкаў паводле дагавора страхавання, уключаючы абавязкі, якія ляжаць на страхавальніку, але не выкананыя ім, пры прад'яўленні выгаданабытчыкам патрабавання аб выплаце страхавога пакрыцця або страхавога забеспячэння. Рызыка наступстваў невыканання ці несвоечасовага выканання абавязкаў, якія павінны былі быць выкананы раней, нясе выгаданабытчык.

Артыкул 830. Форма дагавора страхавання

1. Дагавор страхавання павінен быць заключаны ў пісьмовай форме, калі іншае не ўстаноўлена законамі ці актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Незахаванне пісьмовай формы цягне за сабой несапраўднасць дагавора страхавання, за выключэннем дагавора абавязковага дзяржаўнага страхавання (артыкул 859).

2. Дагавор добраахвотнага страхавання можа быць заключаны шляхам складання аднаго дакумента, а таксама шляхам абмену дакументамі пры дапамозе паштовай, тэлеграфнай, тэлетайпнай, электроннай ці іншай сувязі, якая дазваляе дакладна ўстанавіць, што дакумент зыходзіць ад бока паводле дагавора, або ўручэння страхоўшчыкам страхавальніку на падставе яго пісьмовай ці вуснай заявы страхавога поліса (пасведчання, сертыфіката), падпісанага імі.

Да дагавораў добраахвотнага страхавання павінны прыкладацца правілы адпаведнага віду страхавання, зацверджаныя страхоўшчыкам або аб'яднаннем страхоўшчыкаў і ўзгодненыя з органам, які ажыццяўляе нагляд і кантроль за страхавой дзейнасцю. Дадатак да дагавора добраахвотнага страхавання правілаў страхавання павінен сведчыцца запісам у гэтым дагаворы.

3. Страхоўшчык пры заключэнні дагавора добраахвотнага страхавання мае права скарыстоўваць формы страхавых полісаў (пасведчанняў, сертыфікатаў), распрацаваныя ім, калі іншае не ўстаноўлена актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Абавязковыя рэквізіты страхавога поліса (пасведчання, сертыфіката), парадак яго запаўнення і выкарыстання вызначае орган, які ажыццяўляе нагляд і кантроль за страхавой дзейнасцю, калі іншае не ўстаноўлена актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

4. Заключэнне дагавора страхавання ў форме электроннага дакумента ажыццяўляецца з прытрымліваннем парадку і ўмоў, устаноўленых органам, які ажыццяўляе нагляд і кантроль за страхавой дзейнасцю.

Артыкул 831. Страхаванне па генеральным полісе

1. Сістэматычнае страхаванне розных партый аднароднай маёмасці (тавараў, грузаў і да т.п.) на падобных умовах на працягу вызначанага тэрміну можа па пагадненні страхавальніка са страхоўшчыкам ажыццяўляцца на падставе аднаго дагавора страхавання – генеральнага поліса.

2. Страхавальнік абавязаны ў адносінах да кожнай партыі маёмасці, якая падпадае пад дзеянне генеральнага поліса, паведамляць страхоўшчыку абумоўленыя такім полісам звесткі ў прадугледжаны ім тэрмін, а калі ён не прадугледжаны, – неадкладна пасля яго атрымання. Страхавальнік не вызваляецца ад гэтага абавязку, нават калі да моманту атрымання такіх звестак магчымасць страт, якія падлягаюць пакрыццю страхоўшчыкам, ужо мінула.

3. Па патрабаванні страхавальніка страхоўшчык абавязаны выдаваць страхавыя полісы па асобных партыях маёмасці, якія падпадаюць пад дзеянне генеральнага поліса.

У выпадку неадпаведнасці зместу страхавога поліса генеральнаму полісу перавага аддаецца страхавому полісу.

Артыкул 832. Істотныя ўмовы дагавора страхавання

1. Пры заключэнні дагавора маёмаснага страхавання ці страхавання адказнасці паміж страхавальнікам і страхоўшчыкам павінна быць дасягнута пагадненне:

1) аб пэўнай маёмасці або іншым маёмасным інтарэсе, які з'яўляецца аб'ектам страхавання;

2) аб характары падзеі, на выпадак надыходу якой ажыццяўляецца страхаванне (страхавога выпадку);

3) аб памеры страхавой сумы (ліміту адказнасці);

4) аб суме страхавога ўзносу (страхавой прэміі) і тэрмінах яго выплаты;

5) аб тэрміне дзеяння дагавора.

2. Пры заключэнні дагавора асабістага страхавання паміж страхавальнікам і страхоўшчыкам павінна быць дасягнута пагадненне:

1) аб застрахаванай асобе;

2) аб характары падзеі, на выпадак надыходу якой у жыцці застрахаванай асобы ажыццяўляецца страхаванне (страхавога выпадку);

3) аб памеры страхавой сумы (ліміту адказнасці);

4) аб суме страхавога ўзносу (страхавой прэміі) і тэрмінах яго выплаты;

5) аб тэрміне дзеяння дагавора.

3. Пры заключэнні дагавора страхавання паміж страхавальнікам і страхоўшчыкам, калі страхавальнікам выступае грамадзянін, акрамя істотных умоў, прадугледжаных пунктамі 1 і 2 гэтага артыкула, павінна быць дасягнута пагадненне:

1) аб падставах скасавання дагавора раней устаноўленага тэрміну;

2) аб парадку вяртання страхавальніку страхавога ўзносу (страхавой прэміі) у выпадку невыканання абавязацельства ці скасавання дагавора раней устаноўленага тэрміну;

3) аб адказнасці за невыкананне абавязацельства.

Артыкул 833. Вызначэнне ўмоў дагавора страхавання ў правілах страхавання

1. Умовы, на якіх заключаецца дагавор добраахвотнага страхавання, вызначаюцца ў правілах адпаведнага віду страхавання, зацверджаных страхоўшчыкам або аб'яднаннем страхоўшчыкаў і ўзгодненых з органам, які ажыццяўляе нагляд і кантроль за страхавой дзейнасцю.

2. Умовы, якія ўтрымліваюцца ў правілах страхавання, у тым ліку не ўключаныя ў тэкст дагавора страхавання ці страхавога поліса (пасведчання, сертыфіката), абавязковыя для страхоўшчыка і страхавальніка ці выгаданабытчыка.

Артыкул 834. Звесткі, якія падаюцца страхавальнікам пры заключэнні дагавора

1. Пры заключэнні дагавора страхавання страхавальнік абавязаны паведаміць страхоўшчыку вядомыя страхавальніку абставіны, якія маюць істотнае значэнне для вызначэння імавернасці надыходу страхавога выпадку і памеру магчымых страт ад яго надыходу (страхавой рызыкі), калі гэтыя абставіны не вядомыя і не павінны быць вядомыя страхоўшчыку.

Істотнымі прызнаюцца ва ўсялякім выпадку абставіны, прадугледжаныя ў дагаворы страхавання ці страхавым полісе (пасведчанні, сертыфікаце) на падставе пісьмовай ці вуснай заявы страхавальніка.

2. Калі дагавор страхавання заключаны пры адсутнасці адказаў страхавальніка на якія-небудзь пытанні страхоўшчыка, страхоўшчык не можа пасля патрабаваць скасавання дагавора або прызнання яго несапраўдным на той падставе, што адпаведныя абставіны не былі паведамлены страхавальнікам.

3. Калі пасля заключэння дагавора будзе ўстаноўлена, што страхавальнік паведаміў страхоўшчыку яўна ілжывыя звесткі аб абставінах, указаных у пункце 1 гэтага артыкула, страхоўшчык мае права запатрабаваць прызнання дагавора несапраўдным і прымянення наступстваў, прадугледжаных пунктам 2 артыкула 180 гэтага Кодэкса.

Патрабаванне страхоўшчыка аб прызнанні дагавора страхавання несапраўдным не падлягае задавальненню, калі абставіны, аб якіх змоўчаў страхавальнік, ужо адпалі.

Артыкул 835. Права страхоўшчыка на ацэнку страхавой рызыкі

1. Пры заключэнні дагавора страхавання маёмасці страхоўшчык мае права зрабіць агляд маёмасці, якая страхуецца, а пры неабходнасці прызначыць экспертызу дакладнасці кошту такой маёмасці.

2. Пры заключэнні дагавора асабістага страхавання страхоўшчык мае права зрабіць абследаванне асобы, якая страхуецца, для ацэнкі фактычнага стану яго здароўя.

3. Ацэнка страхавой рызыкі страхоўшчыкам на падставе гэтага артыкула неабавязковая для страхавальніка, які мае права даказваць іншае.

Артыкул 836. Тайна звестак аб страхаванні

Страхоўшчык не мае права выдаваць атрыманыя ім у выніку сваёй прафесійнай дзейнасці звесткі аб страхавальніку, застрахаванай асобе і выгаданабытчыку, стане іх здароўя, а таксама аб маёмасным стане гэтых асоб, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам. За парушэнне тайны звестак аб страхаванні страхоўшчык у залежнасці ад роду парушаных правоў і характару парушэння нясе адказнасць у адпаведнасці з правіламі, прадугледжанымі артыкулам 140 ці артыкулам 151 гэтага Кодэкса.

Артыкул 837. Страхавая сума (ліміт адказнасці)

1. Страхавой сумай (лімітам адказнасці) з'яўляецца ўстаноўленая законам, актам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ці дагаворам страхавання грашовая сума, у межах якой, калі іншае не прадугледжана законам, актам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, страхоўшчык абавязаны зрабіць страхавую выплату пры надыходзе страхавога выпадку.

2. Пры страхаванні маёмасці ці прадпрымальніцкай рызыкі страхавая сума (ліміт адказнасці) не павінна перавышаць іх страхавога кошту. Такім коштам лічацца:

1) для маёмасці – яе сапраўдны кошт у месцы яе знаходжання ў дзень заключэння дагавора страхавання;

2) для прадпрымальніцкай рызыкі – страты ад прадпрымальніцкай дзейнасці, якія страхавальнік панёс бы пры надыходзе страхавога выпадку.

У выпадках, устаноўленых законамі ці актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, страхавая сума (ліміт адказнасці) можа быць меншай за страхавы кошт.

3. У дагаворах асабістага страхавання і дагаворах страхавання грамадзянскай адказнасці страхавая сума (ліміт адказнасці) вызначаецца бакамі па іх меркаванні, калі іншае не ўстаноўлена законамі і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 838. Аспрэчванне страхавога кошту маёмасці

Страхавы кошт маёмасці, указаны ў дагаворы страхавання, не можа быць пасля аспрэчаны, за выключэннем выпадку, калі страхоўшчык, які не скарыстаўся сваім правам на ацэнку страхавой рызыкі да заключэння дагавора (пункт 1 артыкула 835), быў наўмысна ўведзены ў зман адносна гэтага кошту.

Артыкул 839. Няпоўнае маёмаснае страхаванне

Калі ў дагаворы страхавання маёмасці ці прадпрымальніцкай рызыкі страхавая сума (ліміт адказнасці) устаноўлена ніжэйшай за страхавы кошт, страхоўшчык пры надыходзе страхавога выпадку абавязаны кампенсаваць страхавальніку (выгаданабытчыку) частку панесеных апошнім страт прапарцыянальна адносінам страхавой сумы (ліміту адказнасці) да страхавога кошту. Калі страхаванне праводзіцца па сістэме першай рызыкі, то страхавое пакрыццё выплачваецца ў памеры поўнага кошту загінуўшай маёмасці ці прычыненых страт ад прадпрымальніцкай дзейнасці, але не больш за страхавую суму (ліміт адказнасці).

Артыкул 840. Дадатковае маёмаснае страхаванне

1. У выпадку, калі маёмасць ці прадпрымальніцкая рызыка застрахавана толькі ў частцы страхавога кошту, страхавальнік (выгаданабытчык) мае права ажыццявіць дадатковае страхаванне, у тым ліку ў іншага страхоўшчыка, але з тым, каб агульная страхавая сума (ліміт адказнасці) па ўсіх дагаворах страхавання не перавышала страхавога кошту.

2. Незахаванне палажэнняў пункта 1 гэтага артыкула цягне за сабой наступствы, прадугледжаныя пунктам 4 артыкула 841 гэтага Кодэкса.

Артыкул 841. Наступствы страхавання звыш страхавога кошту

1. Калі страхавая сума (ліміт адказнасці), указаная ў дагаворы страхавання маёмасці ці прадпрымальніцкай рызыкі, перавышае страхавы кошт, дагавор з'яўляецца нікчэмным у той частцы страхавой сумы (ліміту адказнасці), якая перавышае страхавы кошт.

Заплачаная залішне частка страхавога ўзносу (страхавой прэміі) вяртанню ў гэтым выпадку не падлягае.

2. Калі ў адпаведнасці з дагаворам страхавання страхавы ўзнос (страхавая прэмія) уносіцца ў растэрміноўку і да моманту ўстанаўлення абставін, указаных у пункце 1 гэтага артыкула, ён унесены не поўнасцю, астатняя частка страхавога ўзносу (страхавой прэміі) павінна быць выплачана ў памеры, зменшаным прапарцыянальна змяншэнню памеру страхавой сумы (ліміту адказнасці).

3. Калі завышэнне страхавой сумы (ліміту адказнасці) у дагаворы страхавання з’явілася следствам падману з боку страхавальніка, страхоўшчык мае права патрабаваць прызнання дагавора несапраўдным і пакрыцця прычыненых яму ў сувязі з гэтым страт у памеры, які перавышае суму атрыманага ім ад страхавальніка страхавога ўзносу (страхавой прэміі).

4. Правілы, прадугледжаныя ў пунктах 1-3 гэтага артыкула, адпаведна прымяняюцца і ў тым выпадку, калі страхавая сума (ліміт адказнасці) перавысіла страхавы кошт у выніку страхавання аднаго і таго ж аб'екта ў двух ці некалькіх страхоўшчыкаў (двайное страхаванне).

Сума страхавога пакрыцця, якая падлягае выплаце ў гэтым выпадку кожным са страхоўшчыкаў, скарачаецца прапарцыянальна змяншэнню першапачатковай страхавой сумы (ліміту адказнасці) па адпаведным дагаворы страхавання.

Артыкул 842. Маёмаснае страхаванне ад розных страхавых рызык

1. Маёмасць і прадпрымальніцкая рызыка могуць быць застрахаваны ад розных страхавых рызык як паводле аднаго, так і паводле асобных дагавораў страхавання, у тым ліку паводле дагаворах з рознымі страхоўшчыкамі.

У гэтых выпадках дапускаецца перавышэнне памеру агульнай страхавой сумы (ліміту адказнасці) паводле ўсіх дагавораў над страхавым коштам.

2. Калі з двух ці некалькіх дагавораў, заключаных у адпаведнасці з пунктам 1 гэтага артыкула, вынікае абавязак страхоўшчыкаў выплаціць страхавое пакрыццё за адны і тыя ж наступствы надыходу аднаго і таго ж страхавога выпадку, да такіх дагавораў у адпаведнай частцы прымяняюцца правілы, прадугледжаныя пунктам 4 артыкула 841 гэтага Кодэкса.

Артыкул 843. Сустрахаванне

Аб'ект страхавання можа быць застрахаваны паводле аднаго дагавора сумесна некалькімі страхоўшчыкамі (сустрахаванне). Калі ў такім дагаворы не вызначаны правы і абавязкі кожнага са страхоўшчыкаў, яны салідарна адказваюць перад страхавальнікам (выгаданабытчыкам) за выплату страхавога пакрыцця ці страхавога забеспячэння.

Артыкул 844. Страхавы ўзнос (страхавая прэмія)

1. Страхавым узносам (страхавой прэміяй) з'яўляецца сума грашовых сродкаў, якая падлягае выплаце страхавальнікам страхоўшчыку за страхаванне, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

2. Пры вызначэнні памеру страхавога ўзносу (страхавой прэміі), які падлягае выплаце паводле дагавора добраахвотнага страхавання, бакі прымяняюць устаноўленыя страхоўшчыкам страхавыя тарыфы, якія вызначаюць стаўку страхавога ўзносу (страхавой прэміі) з адзінкі страхавой сумы (ліміту адказнасці), з улікам аб'екта страхавання і характару страхавой рызыкі, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

Страхавы тарыф па відах добраахвотнага страхавання ўключае базавы страхавы тарыф, склад якога вызначаецца органам, які ажыццяўляе нагляд і кантроль за страхавой дзейнасцю, і карэкціровачныя каэфіцыенты, якія прымяняюцца да яго. Базавы страхавы тарыф устанаўліваецца страхоўшчыкам па ўзгадненні з органам, які ажыццяўляе нагляд і кантроль за страхавой дзейнасцю.

3. Калі дагаворам страхавання прадугледжана растэрміноўка ўнясення страхавога ўзносу (страхавой прэміі), у ім могуць быць вызначаны наступствы нявыплаты чарговай часткі страхавога ўзносу (страхавой прэміі) ва ўстаноўлены тэрмін.

4. Калі страхавы выпадак надышоў да выплаты чарговай часткі страхавога ўзносу (страхавой прэміі), унясенне якой пратэрмінавана, страхоўшчык мае права пры вызначэнні памеру падлеглага выплаце страхавога пакрыцця ці страхавога забеспячэння залічыць суму пратэрмінаванай часткі страхавога ўзносу (страхавой прэміі).

Артыкул 845. Замена застрахаванай асобы

1. У выпадку, калі паводле дагавора страхавання адказнасці за прычыненне шкоды (артыкул 823) застрахавана адказнасць асобы, іншай, чым страхавальнік, апошні мае права, паколькі іншае не прадугледжана дагаворам, у любы час да надыходу страхавога выпадку замяніць гэту асобу іншай, пісьмова паведаміўшы аб гэтым страхоўшчыку.

2. Застрахаваная асоба, названая ў дагаворы асабістага страхавання, можа быць заменена іншай асобай толькі са згоды самой застрахаванай асобы і страхоўшчыка.

Артыкул 846. Замена выгаданабытчыка

Страхавальнік мае права замяніць выгаданабытчыка, названага ў дагаворы страхавання, іншай асобай, пісьмова паведаміўшы аб гэтым страхоўшчыку. Замена выгаданабытчыка паводле дагавора асабістага страхавання, прызначанага са згоды застрахаванай асобы (пункт 2 артыкула 820), дапускаецца толькі са згоды гэтай асобы.

Выгаданабытчык не можа быць заменены іншай асобай пасля таго, як ён выканаў які-небудзь з абавязкаў паводле дагавора страхавання ці прад'явіў страхоўшчыку патрабаванне аб страхавой выплаце.

Артыкул 847. Пачатак дзеяння дагавора страхавання

1. Дагавор страхавання ўступае ў сілу з дня выплаты страхавога ўзносу (страхавой прэміі) ці першай яго часткі, калі ў заканадаўчых актах ці правілах адпаведнага віду страхавання, зацверджаных страхоўшчыкам або аб'яднаннем страхоўшчыкаў і ўзгодненых з органам, які ажыццяўляе нагляд і кантроль за страхавой дзейнасцю, не прадугледжана іншае.

2. Страхаванне, абумоўленае дагаворам, распаўсюджваецца на страхавыя выпадкі, якія адбыліся пасля ўступлення дагавора страхавання ў сілу, калі ў дагаворы не прадугледжаны іншы тэрмін пачатку дзеяння страхавання.

Артыкул 848. Датэрміновае спыненне дагавора страхавання

1. Дагавор страхавання спыняецца да заканчэння тэрміну, на які ён быў заключаны, калі пасля ўступлення яго ў сілу магчымасць надыходу страхавога выпадку адпала і страхаванне спынілася з-за абставін, іншых, чым страхавы выпадак. Да такіх абставін, у прыватнасці, адносяцца:

1) страта (гібель) застрахаванай маёмасці з-за прычын, іншых, чым надыход страхавога выпадку;

2) спыненне ва ўстаноўленым парадку прадпрымальніцкай дзейнасці асобай, якая застрахавала прадпрымальніцкую рызыку ці іншую рызыку, звязаную з гэтай дзейнасцю.

2. Страхавальнік (выгаданабытчык) мае права адмовіцца ад дагавора страхавання ў любы час, калі да моманту адмовы магчымасць надыходу страхавога выпадку не адпала з-за абставін, указаных у пункце 1 гэтага артыкула.

3. Пры датэрміновым спыненні дагавора страхавання з-за абставін, указаных у пункце 1 гэтага артыкула, страхоўшчык мае права на частку страхавога ўзносу (страхавой прэміі) прапарцыянальна часу, на працягу якога дзейнічала страхаванне.

Пры датэрміновай адмове страхавальніка (выгаданабытчыка) ад дагавора страхавання заплачаны страхоўшчыку страхавы ўзнос (страхавая прэмія) не падлягае вяртанню, калі дагаворам не прадугледжана іншае.

Артыкул 849. Наступствы павелічэння страхавой рызыкі ў перыяд дзеяння дагавора страхавання

1. У перыяд дзеяння дагавора маёмаснага страхавання ці страхавання адказнасці страхавальнік (выгаданабытчык) абавязаны неадкладна паведамляць страхоўшчыку аб значных змяненнях, якія сталі яму вядомымі, у абставінах, паведамленых страхоўшчыку пры заключэнні дагавора, калі гэтыя змяненні могуць істотна паўплываць на павелічэнне страхавой рызыкі.

Значнымі ва ўсялякім выпадку прызнаюцца змяненні, агавораныя ў дагаворы страхавання ці страхавым полісе (пасведчанні, сертыфікаце) і ў перададзеных страхавальніку правілах страхавання.

2. Страхоўшчык, апавешчаны аб абставінах, якія цягнуць за сабой павелічэнне страхавой рызыкі, мае права запатрабаваць змянення ўмоў дагавора страхавання ці выплаты дадатковага страхавога ўзносу (страхавой прэміі) адпаведна павелічэнню рызыкі.

Калі страхавальнік (выгаданабытчык) пярэчыць супраць змянення ўмоў дагавора страхавання ці даплаты страхавога ўзносу (страхавой прэміі), страхоўшчык мае права запатрабаваць скасавання дагавора ў адпаведнасці з правіламі, прадугледжанымі главой 29 гэтага Кодэкса.

3. Пры невыкананні страхавальнікам або выгаданабытчыкам абавязку, прадугледжанага ў пункце 1 гэтага артыкула, страхоўшчык мае права запатрабаваць скасавання дагавора і пакрыцця страт, прычыненых скасаваннем дагавора (пункт 5 артыкула 423).

4. Страхоўшчык не мае права патрабаваць скасавання дагавора, калі абставіны, якія цягнуць за сабой павелічэнне страхавой рызыкі, ужо адпалі.

5. Пры асабістым страхаванні наступствы змянення страхавой рызыкі ў перыяд дзеяння дагавора страхавання, указаныя ў пунктах 2 і 3 гэтага артыкула, могуць настаць, толькі калі яны прама прадугледжаны ў дагаворы.

Артыкул 850. Пераход правоў на застрахаваную маёмасць да іншай асобы

Пры пераходзе правоў на застрахаваную маёмасць ад асобы, у інтарэсах якой быў заключаны дагавор страхавання, да іншай асобы правы і абавязкі па гэтым дагаворы пераходзяць да асобы, да якой перайшлі правы на маёмасць, за выключэннем выпадкаў прымусовага адабрання маёмасці на падставах, указаных у пункце 2 артыкула 236 гэтага Кодэкса, і адмовы ад права ўласнасці (артыкул 237).

Асоба, да якой перайшлі правы на застрахаваную маёмасць, павінна неадкладна пісьмова паведаміць аб гэтым страхоўшчыку.

Артыкул 851. Паведамленне страхоўшчыку аб надыходзе страхавога выпадку

1. Страхавальнік паводле дагавора маёмаснага страхавання ці страхавання адказнасці пасля таго, як яму стала вядома аб надыходзе страхавога выпадку, абавязаны неадкладна паведаміць аб яго надыходзе страхоўшчыку ці яго прадстаўніку. Калі дагаворам прадугледжаны тэрмін і (ці) спосаб паведамлення, паведамленне павінна быць зроблена ва ўмоўлены тэрмін і ўказаным у дагаворы спосабам.

Такі жа абавязак ляжыць на выгаданабытчыку, якому вядома аб заключэнні дагавора страхавання на яго карысць, калі ён намераны скарыстацца правам на страхавое пакрыццё.

2. Невыкананне абавязку, прадугледжанага пунктам 1 гэтага артыкула, дае страхоўшчыку права адмовіць у выплаце страхавога пакрыцця, калі не будзе даказана, што страхоўшчык своечасова даведаўся аб надыходзе страхавога выпадку або што адсутнасць у страхоўшчыка звестак аб гэтым не магла адбіцца на яго абавязку выплаціць страхавое пакрыццё.

3. Правілы, прадугледжаныя пунктамі 1 і 2 гэтага артыкула, адпаведна прымяняюцца да дагавора асабістага страхавання і выплаты страхавога забеспячэння, калі страхавым выпадкам з'яўляецца смерць застрахаванай асобы ці

прычыненне шкоды яе здароўю. Пры гэтым устаноўлены дагаворам тэрмін паведамлення страхоўшчыку не можа быць меншы за трыццаць дзён.

Артыкул 852. Змяншэнне страт ад страхавога выпадку

1. Пры надыходзе страхавога выпадку, прадугледжанага дагаворам маёмаснага страхавання ці страхавання адказнасці, страхавальнік абавязаны прыняць разумныя і даступныя ў абставінах, якія склаліся, меры, каб зменшыць магчымыя страты.

Прымаючы такія меры, страхавальнік павінен кіравацца ўказаннямі страхоўшчыка, калі яны паведамлены страхавальніку.

2. Расходы ў мэтах змяншэння страт, якія падлягаюць пакрыццю страхоўшчыкам, калі такія расходы былі неабходныя ці былі праведзены для выканання ўказанняў страхоўшчыка, павінны быць пакрыты страхоўшчыкам, нават калі адпаведныя меры аказаліся беспаспяховымі.

Такія расходы кампенсуюцца прапарцыянальна адносінам страхавой сумы (ліміту адказнасці) да страхавога кошту незалежна ад таго, што разам з пакрыццём іншых страт яны могуць перавысіць страхавую суму (ліміт адказнасці).

3. Страхоўшчык вызваляецца ад пакрыцця страт, якія ўзніклі ў выніку таго, што страхавальнік наўмысна не прыняў разумных і даступных яму мер, каб зменшыць магчымыя страты.

Артыкул 853. Наступствы надыходу страхавога выпадку па віне страхавальніка, выгаданабытчыка ці застрахаванай асобы

1. Страхоўшчык вызваляецца ад выплаты страхавога пакрыцця ці страхавога забеспячэння, калі страхавы выпадак надышоў у выніку намеру страхавальніка, выгаданабытчыка ці застрахаванай асобы, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктамі 2 і 3 гэтага артыкула.

Заканадаўствам могуць быць прадугледжаны выпадкі вызвалення страхоўшчыка ад выплаты страхавога пакрыцця паводле дагавораў маёмаснага страхавання пры надыходзе страхавога выпадку ў выніку грубай неасцярожнасці страхавальніка ці выгаданабытчыка.

2. Страхоўшчык не вызваляецца ад выплаты страхавога пакрыцця паводле дагавора страхавання адказнасці за прычыненне шкоды жыццю, здароўю ці маёмасці, калі шкода прычынена па віне адказнай за яе асобы.

3. Страхоўшчык не вызваляецца ад выплаты страхавога забеспячэння, якое паводле дагавора асабістага страхавання падлягае выплаце ў выпадку смерці застрахаванай асобы, калі яго смерць надышла ў выніку самагубства і да гэтага часу дагавор страхавання дзейнічаў ужо не менш за два гады.

Артыкул 854. Падставы вызвалення страхоўшчыка ад выплаты страхавога пакрыцця і страхавога забеспячэння

1. Калі міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, актамі заканадаўства ці дагаворам страхавання не прадугледжана іншае, страхоўшчык вызваляецца ад выплаты страхавога пакрыцця і страхавога забеспячэння, калі страхавы выпадак надышоў у выніку:

1) уздзеяння ядзернага выбуху, радыяцыі ці радыеактыўнага забруджвання;

2) ваенных дзеянняў;

3) грамадзянскай вайны.

2. Калі дагаворам маёмаснага страхавання не прадугледжана іншае, страхоўшчык вызваляецца ад выплаты страхавога пакрыцця за страты, якія ўзніклі ў

выніку адабрання, канфіскацыі, рэквізіцыі, нацыяналізацыі, арышту ці знішчэння застрахаванай маёмасці па распараджэнні дзяржаўных органаў.

Артыкул 855. Пераход да страхоўшчыка правоў страхавальніка на пакрыццё ўрону (субрагацыя)

1. Калі дагаворам маёмаснага страхавання і страхавання адказнасці не прадугледжана іншае, да страхоўшчыка, які выплаціў страхавое пакрыццё, пераходзіць у межах выплачанай сумы права патрабавання, якое страхавальнік (выгаданабытчык) мае да асобы, адказнай за страты, кампенсаваныя ў выніку страхавання. Умова дагавора, якая выключае пераход да страхоўшчыка права патрабавання да асобы, якая наўмысна прычыніла страты, нікчэмная.

2. Права патрабавання, якое перайшло да страхоўшчыка, ажыццяўляецца ім з прытрымліваннем правілаў, якія рэгулююць адносіны паміж страхавальнікам (выгаданабытчыкам) і асобай, адказнай за страты.

3. Страхавальнік (выгаданабытчык) абавязаны перадаць страхоўшчыку ўсе дакументы і доказы і паведаміць яму ўсе звесткі, неабходныя для ажыццяўлення страхоўшчыкам права патрабавання, якое перайшло да яго.

4. Калі страхавальнік (выгаданабытчык) адмовіўся ад свайго права патрабавання да асобы, адказнай за страты, кампенсаваныя страхоўшчыкам, ці ажыццяўленне гэтага права стала немагчымым па віне страхавальніка (выгаданабытчыка), страхоўшчык вызваляецца ад выплаты страхавога пакрыцця поўнасцю ці ў адпаведнай частцы і мае права запатрабаваць вяртання залішне выплачанай сумы страхавога пакрыцця.

Артыкул 856. Іскавая даўнасць па патрабаваннях, звязаных з маёмасным страхаваннем і страхаваннем адказнасці

Па патрабаваннях, якія вынікаюць з дагавораў маёмаснага страхавання і страхавання адказнасці, устанаўліваецца агульны тэрмін іскавай даўнасці, які вылічаецца з дня заканчэння дзеяння дагавора страхавання.

Артыкул 857. Перастрахаванне

1. Перастрахаваннем з'яўляецца страхаванне адным страхоўшчыкам (перастрахавальнікам) на вызначаных у дагаворы ўмовах рызыкі выканання часткі сваіх абавязацельстваў у іншага страхоўшчыка (перастрахоўшчыка).

2. Да дагавора перастрахавання прымяняюцца правілы, прадугледжаныя гэтай главой, калі дагаворам перастрахавання не прадугледжана іншае. Пры гэтым страхоўшчык паводле дагавора страхавання (асноўным дагаворы), які заключыў дагавор перастрахавання, лічыцца ў гэтым апошнім дагаворы перастрахавальнікам.

3. Пры перастрахаванні адказным перад страхавальнікам па асноўным дагаворы страхавання за выплату страхавога пакрыцця ці страхавога забеспячэння застаецца страхоўшчык па гэтым дагаворы.

4. Дапускаецца паслядоўнае заключэнне двух ці некалькіх дагавораў перастрахавання.

Артыкул 858. Выключаны.

Артыкул 859. Абавязковае дзяржаўнае страхаванне

1. У мэтах забеспячэння сацыяльных інтарэсаў грамадзян і інтарэсаў дзяржавы заканадаўствам можа быць устаноўлена абавязковае дзяржаўнае страхаванне жыцця, здароўя і (ці) маёмасці грамадзян.

Абавязковае дзяржаўнае страхаванне ажыццяўляецца за кошт сродкаў, якія выдзяляюцца на гэтыя мэты з адпаведнага бюджэту дзяржаўным органам і органам мясцовага кіравання і самакіравання (страхавальнікам).

2. Абавязковае дзяржаўнае страхаванне ажыццяўляецца непасрэдна на падставе заканадаўства аб такім страхаванні або на падставе дагавораў страхавання, якія заключаюцца ва ўстаноўленым парадку страхоўшчыкамі і страхавальнікамі.

3. Абавязковае дзяржаўнае страхаванне аплачвае страхоўшчык у памеры, які вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб такім страхаванні.

4. Правілы гэтай главы прымяняюцца да абавязковага дзяржаўнага страхавання, паколькі іншае не прадугледжана заканадаўствам аб такім страхаванні і не вынікае з сутнасці адпаведных адносін па страхаванні.

Артыкул 860. Прымяненне агульных правілаў аб страхаванні да спецыяльных відаў страхавання

Правілы, прадугледжаныя гэтай главой, прымяняюцца да адносін па страхаванні замежных інвестыцый ад некамерцыйных рызык, марскім страхаванні, медыцынскім страхаванні і страхаванні пенсій пастолькі, паколькі заканадаўствам аб гэтых відах страхавання не ўстаноўлена іншае.

ГЛАВА 49
ДАРУЧЭННЕ

Артыкул 861. Дагавор даручэння

1. Паводле дагавора даручэння адзін бок (павераны) абавязваецца зрабіць ад імя і за кошт іншага боку (даверніка) пэўныя юрыдычныя дзеянні. Правы і абавязкі па здзелцы, заключанай павераным, узнікаюць непасрэдна ў даверніка.

2. Дагавор даручэння можа быць заключаны з указаннем тэрміну, на працягу якога павераны мае права дзейнічаць ад імя даверніка, ці без такога ўказання.

Артыкул 862. Узнагарода паверанага

1. Давернік абавязаны заплаціць паверанаму ўзнагароду, калі гэта прадугледжана заканадаўствам ці дагаворам даручэння.

У выпадках, калі дагавор даручэння звязаны з ажыццяўленнем абодвума бакамі ці адным з іх прадпрымальніцкай дзейнасці, давернік абавязаны заплаціць паверанаму ўзнагароду, калі дагаворам не прадугледжана іншае.

2. Пры адсутнасці ў платным дагаворы даручэння ўмовы аб памеры ўзнагароды ці аб парадку яе выплаты ўзнагарода выплачваецца пасля выканання даручэння ў памеры, які вызначаецца ў адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 394 гэтага Кодэкса.

3. Павераны, які дзейнічае ў якасці камерцыйнага прадстаўніка (пункт 1 артыкула 185), мае права ў адпаведнасці з артыкулам 340 гэтага Кодэкса ўтрымліваць рэчы, якія знаходзіцца ў яго і падлягаюць перадачы даверніку, у забеспячэнне сваіх патрабаванняў паводле дагавора даручэння.

Артыкул 863. Выкананне даручэння ў адпаведнасці з указаннямі даверніка

1. Павераны абавязаны выконваць дадзенае яму даручэнне ў адпаведнасці з указаннямі даверніка. Указанні даверніка павінны быць правамернымі, ажыццявімымі і канкрэтнымі.

2. Павераны мае права адступіць ад указанняў даверніка, калі з-за абставін справы гэта неабходна ў інтарэсах даверніка і павераны не мог спачатку запытаць даверніка або не атрымаў у разумны тэрмін адказу на свой запыт. Павераны

абавязаны паведаміць даверніку аб дапушчаных адступленнях, як толькі паведамленне стала магчымым.

3. Паверанаму, які дзейнічае ў якасці камерцыйнага прадстаўніка (пункт 1 артыкула 185), давернік можа даць права адступаць у інтарэсах даверніка ад яго ўказанняў без папярэдняга запыту аб гэтым. У гэтым выпадку камерцыйны прадстаўнік абавязаны ў разумны тэрмін паведаміць даверніку аб дапушчаных адступленнях, калі іншае не прадугледжана дагаворам даручэння.

Артыкул 864. Абавязкі паверанага

Павераны абавязаны:

1) асабіста выконваць дадзенае яму даручэнне, за выключэннем выпадкаў, указаных у артыкуле 866 гэтага Кодэкса;

2) паведамляць даверніку па яго патрабаванні ўсе звесткі аб ходзе выканання даручэння;

3) перадаваць даверніку без прамаруджання ўсё атрыманае па здзелках, заключаных у выкананне даручэння;

4) пасля выканання даручэння ці пры спыненні дагавора даручэння да яго выканання без прамаруджання вярнуць даверніку даверанасць, тэрмін дзеяння якой не скончыўся, і падаць справаздачу з дадаваннем апраўдальных дакументаў, калі гэта патрабуецца па ўмовах дагавора ці характары даручэння.

Артыкул 865. Абавязкі даверніка

1. Давернік абавязаны выдаць паверанаму даверанасць (даверанасці) на здзяйсненне юрыдычных дзеянняў, прадугледжаных дагаворам даручэння, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных часткай другой пункта 1 артыкула 183 гэтага Кодэкса.

2. Давернік абавязаны, калі іншае не прадугледжана дагаворам, кампенсаваць паверанаму панесеныя выдаткі, а таксама забяспечваць паверанага сродкамі, неабходнымі для выканання даручэння.

3. Давернік абавязаны без прамаруджання прыняць ад паверанага ўсё выкананае ім у адпаведнасці з дагаворам даручэння.

4. Давернік абавязаны заплаціць паверанаму ўзнагароду, калі ў адпаведнасці з артыкулам 862 гэтага Кодэкса дагавор даручэння з'яўляецца платным.

Артыкул 866. Перадавер'е выканання даручэння

1. Павераны мае права перадаць выкананне даручэння іншай асобе (намесніку) толькі ў выпадках і на ўмовах, прадугледжаных артыкулам 188 гэтага Кодэкса.

2. Давернік мае права адхіліць намесніка, выбранага паверaным.

3. Калі магчымы намеснік паверанага пайменаваны ў дагаворы даручэння, павераны не адказвае ні за яго выбар, ні за вядзенне ім спраў.

Калі права паверанага перадаць выкананне даручэння іншай асобе ў дагаворы не прадугледжана або прадугледжана, але намеснік у ім не пайменаваны, павераны адказвае за выбар намесніка.

Артыкул 867. Спыненне дагавора даручэння

1. Дагавор даручэння спыняецца ў выніку:

1) адмены даручэння давернікам;

2) адмовы паверанага;

3) смерці даверніка ці паверанага, аб’яўлення каго-небудзь з іх памерлым, прызнання недзеяздольным, абмежавана дзеяздольным ці адсутным без вестак.

2. Давернік мае права адмяніць даручэнне, а павераны – адмовіцца ад яго ў любы час. Пагадненне аб адмове ад гэтага права нікчэмнае.

3. Бок, які адмаўляецца ад дагавора даручэння, што прадугледжвае дзеянні паверанага ў якасці камерцыйнага прадстаўніка, павінен паведаміць іншаму боку аб спыненні дагавора не пазней чым за трыццаць дзён, калі дагаворам не прадугледжаны больш працяглы тэрмін.

Пры рэарганізацыі юрыдычнай асобы, якая з'яўляецца камерцыйным прадстаўніком, давернік мае права адмяніць даручэнне без такога папярэдняга паведамлення.

Артыкул 868. Наступствы спынення дагавора даручэння

1. Калі дагавор даручэння спынены да таго, як даручэнне выканана павераным поўнасцю, давернік абавязаны кампенсаваць паверанаму панесеныя пры выкананні даручэння выдаткі, а калі паверанаму належала ўзнагарода, таксама заплаціць яму ўзнагароду адпаведна выкананай ім рабоце. Гэта правіла не прымяняецца да выканання павераным даручэння пасля таго, як ён даведаўся ці павінен быў даведацца аб спыненні даручэння.

2. Адмена давернікам даручэння не з'яўляецца падставай для пакрыцця страт, прычыненых паверанаму спыненнем дагавора, за выключэннем выпадкаў спынення дагавора, які прадугледжвае дзеянні паверанага ў якасці камерцыйнага прадстаўніка.

3. Адмова паверанага ад выканання даручэння даверніка не з'яўляецца падставай для пакрыцця страт, прычыненых даверніку спыненнем дагавора даручэння, за выключэннем выпадкаў адмовы паверанага ва ўмовах, калі давернік пазбаўлены магчымасці інакш забяспечыць свае інтарэсы, а таксама адмовы ад выканання дагавора, які прадугледжвае дзеянні паверанага ў якасці камерцыйнага прадстаўніка.

Артыкул 869. Абавязкі спадчыннікаў паверанага і ліквідатара юрыдычнай асобы, якая з'яўляецца павераным

У выпадку смерці паверанага яго спадчыннікі абавязаны паведаміць даверніку аб спыненні дагавора даручэння і прыняць меры, неабходныя для аховы маёмасці даверніка, у прыватнасці захаваць яго рэчы і дакументы і затым перадаць іх даверніку.

Такі ж абавязак ляжыць на ліквідатару юрыдычнай асобы, якая з'яўляецца павераным.

ГЛАВА 50
ДЗЕЯННІ Ў ЧУЖЫМ ІНТАРЭСЕ БЕЗ ДАРУЧЭННЯ

Артыкул 870. Умовы дзеянняў у чужым інтарэсе

1. Дзеянні без даручэння, іншага ўказання ці загадзя абяцанай згоды зацікаўленай асобы ў мэтах прадухілення шкоды яе асобе ці маёмасці, выканання яе

абавязацельства ці ў яе іншых няпроціпраўных інтарэсах (дзеянні ў чужым інтарэсе) павінны ажыццяўляцца зыходзячы з відавочнай выгады ці карысці і сапраўдных ці імаверных намераў зацікаўленай асобы і з неабходнай з-за абставін справы клапатлівасцю і абачлівасцю.

2. Правілы, прадугледжаныя гэтай главой, не прымяняюцца да дзеянняў у інтарэсе іншых асоб, якія здзяйсняюцца дзяржаўнымі органамі і органамі мясцовага кіравання і самакіравання, для якіх такія дзеянні з'яўляюцца адной з мэт іх дзейнасці.

Артыкул 871. Паведамленне зацікаўленай асобе аб дзеяннях у яе інтарэсе

1. Асоба, якая дзейнічае ў чужым інтарэсе, абавязана пры першай магчымасці паведаміць аб гэтым зацікаўленай асобе і дачакацца на працягу разумнага тэрміну яе рашэння аб адабрэнні ці неадабрэнні распачатых дзеянняў, калі толькі такое чаканне не пацягне за сабой сур'ёзнага ўрону для зацікаўленай асобы.

2. Не патрабуецца спецыяльна паведамляць зацікаўленаму грамадзяніну аб дзеяннях у яго інтарэсе, калі гэтыя дзеянні прадпрымаюцца ў яго прысутнасці.

Артыкул 872. Наступствы адабрэння зацікаўленай асобай дзеянняў у яе інтарэсе

Калі асоба, у інтарэсе якой прадпрымаюцца дзеянні без яе даручэння, адобрыць гэтыя дзеянні, да адносін бакоў у далейшым прымяняюцца правілы аб дагаворы даручэння ці іншым дагаворы, які адпавядае характару распачатых дзеянняў, нават калі адабрэнне было вусным.

Артыкул 873. Наступствы неадабрэння зацікаўленай асобай дзеянняў у яе інтарэсе

1. Дзеянні ў чужым інтарэсе, здзейсненыя пасля таго, як таму, хто іх здзяйсняе, стала вядома, што яны не адабраюцца зацікаўленай асобай, не цягнуць за сабой для апошняй абавязкаў ні ў адносінах да таго, хто ўчыніў гэтыя дзеянні, ні ў адносінах да трэціх асоб.

2. Дзеянні з мэтай прадухілення небяспекі для жыцця асобы, якая апынулася ў небяспецы, дапускаюцца і супраць волі гэтай асобы, а выкананне абавязку па ўтрыманні каго-небудзь – супраць волі таго, на кім ляжыць гэты абавязак.

Артыкул 874. Пакрыццё страт асобе, якая дзейнічала ў чужым інтарэсе

1. Неабходныя расходы і іншы рэальны ўрон, панесеныя асобай, якая дзейнічала ў чужым інтарэсе ў адпаведнасці з правіламі, прадугледжанымі гэтай главой, падлягаюць пакрыццю зацікаўленай асобай, за выключэннем расходаў, якія выкліканы дзеяннямі, указанымі ў пункце 1 артыкула 873 гэтага Кодэкса.

Права на пакрыццё неабходных расходаў і іншага рэальнага ўрону захоўваецца і ў тым выпадку, калі дзеянні ў чужым інтарэсе не прывялі да меркаванага выніку. Аднак у выпадку прадухілення ўрону маёмасці іншай асобы памер пакрыцця не павінен перавышаць кошту гэтай маёмасці.

2. Расходы і іншыя страты асобы, якая дзейнічала ў чужым інтарэсе, панесеныя ёй у сувязі з дзеяннямі, якія распачаты пасля атрымання адабрэння ад зацікаўленай асобы (артыкул 872), кампенсуюцца па правілах аб дагаворы адпаведнага віду.

Артыкул 875. Узнагарода за дзеянні ў чужым інтарэсе

Асоба, дзеянні якой у чужым інтарэсе прывялі да станоўчага для зацікаўленай асобы выніку, мае права на атрыманне ўзнагароды, калі такое права прадугледжана заканадаўствам, пагадненнем з зацікаўленай асобай.

Артыкул 876. Наступствы здзелкі ў чужым інтарэсе

Абавязкі па здзелцы, заключанай у чужым інтарэсе, пераходзяць да асобы, у інтарэсах якой яна заключана, пры ўмове адабрэння ёю гэтай здзелкі і калі іншы бок не пярэчыць супраць такога пераходу або пры заключэнні здзелкі ведаў ці павінен быў ведаць аб тым, што здзелка заключана ў чужым інтарэсе.

Пры пераходзе абавязкаў па такой здзелцы да асобы, у інтарэсах якой яна была заключана, апошняй павінны быць перададзены і правы па гэтай здзелцы.

Артыкул 877. Беспадстаўнае абагачэнне ў выніку дзеянняў у чужым інтарэсе

Калі дзеянні, непасрэдна не накіраваныя на забеспячэнне інтарэсаў іншай асобы, у тым ліку ў выпадку, калі асоба, якая ўчыніла іх памылкова, меркавала, што дзейнічае ў сваім інтарэсе, прывялі да беспадстаўнага абагачэння іншай асобы, прымяняюцца правілы, прадугледжаныя главой 59 гэтага Кодэкса.

Артыкул 878. Пакрыццё шкоды, прычыненай дзеяннямі ў чужым інтарэсе

Адносіны па пакрыцці шкоды, прычыненай дзеяннямі ў чужым інтарэсе зацікаўленай асобе ці трэцім асобам, рэгулююцца правіламі, прадугледжанымі главой 58 гэтага Кодэкса.

Артыкул 879. Справаздача асобы, якая дзейнічала ў чужым інтарэсе

Асоба, якая дзейнічала ў чужым інтарэсе, абавязана падаць асобе, у інтарэсах якой ажыццяўляліся такія дзеянні, справаздачу з указаннем атрыманых даходаў, панесеных расходаў і іншых страт.

ГЛАВА 51
КАМІСІЯ

Артыкул 880. Дагавор камісіі

1. Паводле дагавора камісіі адзін бок (камісіянер) абавязваецца па даручэнні іншага боку (камітэнта) за ўзнагароду заключыць адну ці некалькі здзелак ад свайго імя, але за кошт камітэнта.

Па здзелцы, заключанай камісіянерам з трэцяй асобай, набывае права і становіцца абавязаным камісіянер, хоць бы камітэнт і быў названы ў здзелцы ці ўступіў з трэцяй асобай у непасрэдныя адносіны па выкананні здзелкі.

2. Дагавор камісіі можа быць заключаны на пэўны тэрмін ці без указання тэрміну яго дзеяння, з указаннем ці без указання тэрыторыі яго выканання, з абавязацельствам камітэнта не даваць трэцім асобам права заключаць у яго інтарэсах і за яго кошт здзелкі, заключэнне якіх даручана камісіянеру, ці без такога абавязацельства, з умовамі ці без умоў адносна асартыменту тавараў, якія з'яўляюцца прадметам камісіі.

3. Заканадаўствам могуць быць прадугледжаны асаблівасці асобных відаў дагавора камісіі.

Артыкул 881. Камісійная ўзнагарода

1. Камітэнт абавязаны выплаціць камісіянеру ўзнагароду, а ў выпадку, калі камісіянер прыняў на сябе паруку за выкананне здзелкі трэцяй асобай (дэлькрэдэрэ), – таксама дадатковую ўзнагароду ў памеры і парадку, устаноўленых у дагаворы камісіі.

Калі дагаворам памер узнагароды ці парадак яе выплаты не прадугледжаны і памер узнагароды не можа быць вызначаны зыходзячы з умоў дагавора, узнагарода выплачваецца пасля выканання дагавора камісіі ў памеры, які вызначаецца ў адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 394 гэтага Кодэкса.

2. Калі дагавор камісіі не быў выкананы з-за прычын, якія залежаць ад камітэнта, камісіянер захоўвае права на камісійную ўзнагароду, а таксама на пакрыццё панесеных расходаў.

Артыкул 882. Выкананне камісійнага даручэння

Прынятае на сябе даручэнне камісіянер абавязаны выканаць на найбольш выгадных для камітэнта ўмовах у адпаведнасці з указаннямі камітэнта, а пры адсутнасці ў дагаворы камісіі такіх указанняў – у адпаведнасці з патрабаваннямі, якія звычайна прад'яўляюцца.

У выпадку, калі камісіянер заключыў здзелку на ўмовах, больш выгадных, чым тыя, якія былі ўказаны камітэнтам, дадатковая выгада дзеліцца паміж камітэнтам і камісіянерам пароўну, калі іншае не прадугледжана пагадненнем бакоў.

Артыкул 883. Адказнасць за невыкананне здзелкі, заключанай для камітэнта

1. Камісіянер не адказвае перад камітэнтам за невыкананне трэцяй асобай здзелкі, заключанай з ёй за кошт камітэнта, акрамя выпадкаў, калі камісіянер не праявіў неабходнай абачлівасці ў выбары гэтай асобы або прыняў на сябе паруку за выкананне здзелкі (дэлькрэдэрэ).

2. У выпадку невыканання трэцяй асобай здзелкі, заключанай з ёй камісіянерам, камісіянер абавязаны неадкладна паведаміць аб гэтым камітэнту, сабраць неабходныя доказы, а таксама па патрабаванні камітэнта перадаць яму права па такой здзелцы з прытрымліваннем правілаў аб уступцы патрабавання (артыкулы 353–357, 359, 360).

3. Уступка правоў камітэнту па здзелцы на падставе пункта 2 гэтага артыкула дапускаецца незалежна ад пагаднення камісіянера з трэцяй асобай, якое забараняе ці абмяжоўвае такую ўступку. Гэта не вызваляе камісіянера ад адказнасці перад трэцяй асобай у сувязі з уступкай права ў парушэнне пагаднення аб яе абароне ці аб абмежаванні.

Артыкул 884. Субкамісія

1. Калі іншае не прадугледжана дагаворам камісіі, камісіянер мае права ў мэтах выканання дагавора заключыць дагавор субкамісіі з іншай асобай, застаючыся адказным за дзеянні субкамісіянера перад камітэнтам.

Паводле дагавора субкамісіі камісіянер набывае ў адносінах да субкамісіянера правы і абавязкі камітэнта.

2. Да спынення дагавора камісіі камітэнт не мае права без згоды камісіянера ўступаць у непасрэдныя адносіны з субкамісіянерам, калі іншае не прадугледжана дагаворам камісіі.

Артыкул 885. Адступленне ад указанняў камітэнта

1. Камісіянер мае права адступіць ад указанняў камітэнта, калі з-за абставін справы гэта неабходна ў інтарэсах камітэнта і камісіянер не мог спачатку запытаць камітэнта або не атрымаў у разумны тэрмін адказу на свой запыт. Камісіянер абавязаны паведаміць камітэнту аб дапушчаных адступленнях, як толькі паведамленне стала магчымым.

Камісіянеру, які дзейнічае ў якасці прадпрымальніка, можа быць дадзена камітэнтам права адступаць ад яго ўказанняў без папярэдняга запыту. У гэтым выпадку камісіянер абавязаны ў разумны тэрмін паведаміць камітэнту аб дапушчаных адступленнях, калі іншае не прадугледжана дагаворам.

2. Камісіянер, які прадаў маёмасць па цане, ніжэйшай за цану, узгодненую з камітэнтам, абавязаны кампенсаваць апошняму розніцу, калі не дакажа, што ў яго не было магчымасці прадаць маёмасць па ўзгодненай цане і продаж па больш нізкай цане папярэдзіў яшчэ большыя страты. У выпадках, калі камісіянер быў абавязаны спачатку запытаць камітэнта, камісіянер павінен таксама даказаць, што ён не меў магчымасці атрымаць спачатку згоду камітэнта на адступленне ад яго ўказанняў.

3. Калі камісіянер купіў маёмасць па цане, вышэйшай за цану, узгодненую з камітэнтам, камітэнт, які не жадае прыняць такую пакупку, абавязаны заявіць аб гэтым камісіянеру ў разумны тэрмін пасля атрымання ад яго паведамлення аб заключэнні здзелкі з трэцяй асобай. У адваротным выпадку пакупка прызнаецца прынятай камітэнтам.

Калі камісіянер паведаміў, што прымае розніцу ў цане на свой кошт, камітэнт не мае права адмовіцца ад заключанай для яго здзелкі.

Артыкул 886. Правы на рэчы, якія з'яўляюцца прадметам камісіі

1. Рэчы, якія паступілі да камісіянера ад камітэнта або набытыя камісіянерам за кошт камітэнта, з'яўляюцца ўласнасцю апошняга.

2. Камісіянер мае права ў адпаведнасці з артыкулам 340 гэтага Кодэкса ўтрымліваць рэчы, якія знаходзяцца ў яго і падлягаюць перадачы камітэнту або асобе, указанай камітэнтам, у забеспячэнне сваіх патрабаванняў паводле дагавора камісіі.

У выпадку аб’яўлення камітэнта эканамічна неплацежаздольным (банкрутам) указанае права камісіянера спыняецца, а яго патрабаванні да камітэнта ў межах кошту рэчаў, якія ён утрымліваў, задавальняюцца ў адпаведнасці з артыкулам 340 гэтага Кодэкса нароўні з патрабаваннямі, забяспечанымі закладам.

Артыкул 887. Задавальненне патрабаванняў камісіянера з належных камітэнту сум

Камісіянер мае права ў адпаведнасці з артыкулам 340 гэтага Кодэкса ўтрымаць належныя яму паводле дагавора камісіі сумы з усіх сум, якія паступілі да яго за кошт камітэнта. Аднак крэдыторы камітэнта, якія карыстаюцца ў адносінах да чарговасці задавальнення іх патрабаванняў перавагай перад закладатрымальнікамі, не пазбаўляюцца права на задавальненне гэтых патрабаванняў з утрыманых камісіянерам сум.

Артыкул 888. Адказнасць камісіянера за страту, недастачу ці пашкоджанне маёмасці камітэнта

1. Камісіянер адказвае перад камітэнтам за страту, недастачу ці пашкоджанне маёмасці камітэнта, якая знаходзіцца ў яго.

2. Калі пры прыёме камісіянерам маёмасці, якая прыслана камітэнтам або паступіла да камісіянера для камітэнта, у гэтай маёмасці выявяцца пашкоджанні ці недастача, якія могуць быць заўважаны пры вонкавым аглядзе, а таксама ў выпадку прычынення кім-небудзь урону маёмасці камітэнта, якая знаходзіцца ў камісіянера, камісіянер абавязаны прыняць меры да аховы правоў камітэнта, сабраць неабходныя доказы і аб усім без прамаруджання паведаміць камітэнту.

3. Камісіянер які не застрахаваў маёмасць камітэнта, якая знаходзіцца ў яго, адказвае за гэта толькі ў выпадках, калі камітэнт прадпісаў яму застрахаваць маёмасць за кошт камітэнта або страхаванне гэтай маёмасці камісіянерам прадугледжана дагаворам камісіі.

Артыкул 889. Справаздача камісіянера

Пасля выканання даручэння камісіянер абавязаны падаць камітэнту справаздачу і перадаць яму ўсё атрыманае паводле дагавора камісіі. Камітэнт, які мае пярэчанні па справаздачы, павінен паведаміць аб іх камісіянеру на працягу трыццаці дзён з дня атрымання справаздачы, калі пагадненнем бакоў не ўстаноўлены іншы тэрмін. У адваротным выпадку справаздача пры адсутнасці іншага пагаднення лічыцца прынятай.

Артыкул 890. Прыняцце камітэнтам выкананага паводле дагавора

Камітэнт абавязаны:

1) прыняць ад камісіянера ўсё выкананае паводле дагавора камісіі;

2) агледзець маёмасць, набытую для яго камісіянерам, і паведаміць апошняму без прамаруджання аб выяўленых у гэтай маёмасці недахопах;

3) вызваліць камісіянера ад абавязацельстваў па выкананні камісійнага даручэння, прынятых ім на сябе перад трэцяй асобай.

Артыкул 891. Пакрыццё расходаў па выкананні камісійнага даручэння

Камітэнт абавязаны апрача выплаты камісійнай узнагароды, а ў адпаведных выпадках – і дадатковай узнагароды за дэлькрэдэрэ кампенсаваць камісіянеру зрасходаваныя ім на выкананне даручэння сумы.

Камісіянер не мае права на пакрыццё расходаў па ўтрыманні маёмасці камітэнта, якая знаходзіцца ў яго, калі ў заканадаўстве ці дагаворы камісіі не ўстаноўлена іншае.

Артыкул 892. Спыненне дагавора камісіі

Дагавор камісіі спыняецца ў выніку:

1) адмовы камітэнта ад выканання дагавора;

2) адмовы камісіянера ад выканання дагавора ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам ці дагаворам;

3) смерці камісіянера, аб’яўлення яго памерлым, прызнання недзеяздольным, абмежавана дзеяздольным ці адсутным без вестак;

4) прызнання індывідуальнага прадпрымальніка, які з'яўляецца камісіянерам, эканамічна неплацежаздольным (банкрутам).

У выпадку аб’яўлення камісіянера эканамічна неплацежаздольным (банкрутам) яго правы і абавязкі па здзелках, заключаных ім для камітэнта ў выкананне ўказання апошняга, пераходзяць да камітэнта.

Артыкул 893. Адмена камісійнага даручэння камітэнтам

1. Камітэнт мае права ў любы час адмовіцца ад выканання дагавора камісіі, адмяніўшы дадзенае камісіянеру даручэнне. Камісіянер мае права патрабаваць пакрыцця страт, выкліканых адменай даручэння.

2. У выпадку, калі дагавор камісіі заключаны без указання тэрміну яго дзеяння, камітэнт павінен паведаміць камісіянеру аб спыненні дагавора не пазней чым за трыццаць дзён, калі больш працяглы тэрмін паведамлення не прадугледжаны дагаворам.

Пры гэтым камітэнт абавязаны выплаціць камісіянеру ўзнагароду за здзелкі, заключаныя ім да спынення дагавора, а таксама кампенсаваць камісіянеру панесеныя ім да спынення дагавора расходы.

3. У выпадку адмены даручэння камітэнт абавязаны ў тэрмін, устаноўлены дагаворам, а калі такі тэрмін не ўстаноўлены, неадкладна распарадзіцца сваёй маёмасцю, якая знаходзіцца ў вядзенні камісіянера. Калі камітэнт не выканае гэты абавязак, камісіянер мае права здаць маёмасць на захаванне за кошт камітэнта або прадаць яго па найбольш выгаднай для камітэнта цане.

Артыкул 894. Адмова камісіянера ад выканання дагавора камісіі

1. Камісіянер не мае права, калі іншае не прадугледжана дагаворам камісіі, адмовіцца ад яго выканання, за выключэннем выпадку, калі дагавор камісіі заключаны без указання тэрміну яго дзеяння. У гэтым выпадку камісіянер павінен паведаміць камітэнту аб спыненні дагавора не пазней чым за трыццаць дзён, калі больш працяглы тэрмін паведамлення не прадугледжаны дагаворам.

Камісіянер абавязаны прыняць меры, неабходныя для забеспячэння захаванасці маёмасці камітэнта.

2. Камітэнт павінен распарадзіцца сваёй маёмасцю, якая знаходзіцца ў вядзенні камісіянера, на працягу пятнаццаці дзён з дня атрымання паведамлення аб адмове камісіянера выканаць даручэнне, калі дагаворам не ўстаноўлены іншы тэрмін. Калі ён не выканае гэты абавязак, камісіянер мае права здаць маёмасць на захаванне за кошт камітэнта або прадаць яго па найбольш выгаднай для камітэнта цане.

3. Калі дагаворам не прадугледжана іншае, камісіянер, які адмовіўся ад выканання даручэння, захоўвае права на камісійную ўзнагароду за здзелкі, заключаныя ім да спынення дагавора, а таксама на пакрыццё панесеных да гэтага моманту расходаў.

ГЛАВА 52
ДАВЕРНАЕ КІРАВАННЕ МАЁМАСЦЮ

Артыкул 895. Дагавор давернага кіравання маёмасцю

1. Паводле дагавора давернага кіравання маёмасцю адзін бок (давернік) перадае іншаму боку (давернаму кіраўніку) на пэўны тэрмін маёмасць у давернае кіраванне, а даверны кіраўнік абавязваецца за ўзнагароду ажыццяўляць кіраванне гэтай маёмасцю ў інтарэсах даверніка ці ўказанай ім асобы (выгаданабытчыка).

У выпадку заключэння дагавора давернага кіравання маёмасцю ў інтарэсах грамадзяніна, які ў сувязі з захворваннем знаходзіцца ў непрытомным стане, што

выключае магчымасць разумець значэнне сваіх дзеянняў ці кіраваць імі, такі дагавор можа быць заключаны без выплаты ўзнагароды давернаму кіраўніку.

Перадача маёмасці ў давернае кіраванне не цягне за сабой пераходу права ўласнасці на яе да давернага кіраўніка.

2. Ажыццяўляючы давернае кіраванне маёмасцю, даверны кіраўнік мае права здзяйсняць у адносінах да гэтай маёмасці ў адпаведнасці з дагаворам давернага кіравання любыя юрыдычныя і фактычныя дзеянні ў інтарэсах даверніка ці выгаданабытчыка.

Заканадаўствам ці дагаворам могуць быць прадугледжаны абмежаванні ў адносінах да асобных дзеянняў па даверным кіраванні маёмасцю.

3. Здзелкі з перададзенай у давернае кіраванне маёмасцю даверны кіраўнік афармляе ад свайго імя, указваючы пры гэтым, што ён дзейнічае ў якасці такога кіраўніка. Гэта ўмова лічыцца захаванай, калі пры здзяйсненні дзеянняў, якія не патрабуюць пісьмовага афармлення, іншы бок інфармаваны аб іх здзяйсненні даверным кіраўніком у гэтай якасці, а ў пісьмовых дакументах пасля імя ці наймення давернага кіраўніка змешчаны знак «Д. К.».

Пры адсутнасці ўказання аб дзеянні давернага кіраўніка ў гэтай якасці даверны кіраўнік абавязваецца перад трэцімі асобамі асабіста і адказвае перад імі толькі маёмасцю, якая належыць яму.

Артыкул 896. Прадмет давернага кіравання

1. Аб'ектам давернага кіравання могуць быць прадпрыемствы і іншыя маёмасныя комплексы, асобныя аб'екты, якія адносяцца да нерухомай маёмасці, каштоўныя паперы, правы, пасведчаныя бездакументарнымі цэннымі паперамі, выключныя правы і іншая маёмасць.

2. Не могуць быць самастойным прадметам давернага кіравання грошы, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам.

3. Маёмасць, якая знаходзіцца ў гаспадарчым распараджэнні ці ў аператыўным кіраванні, не можа быць перададзена ў давернае кіраванне. Перадача ў давернае кіраванне маёмасці, якая знаходзілася ў гаспадарчым распараджэнні ці ў аператыўным кіраванні, магчымая толькі пасля ліквідацыі юрыдычнай асобы, у гаспадарчым распараджэнні ці аператыўным кіраванні якой маёмасць знаходзілася, або спынення права гаспадарчага распараджэння ці аператыўнага кіравання маёмасцю і паступлення яго ў валоданне ўласніка на іншых прадугледжаных заканадаўствам падставах.

Артыкул 897. Давернік

Давернікам маёмасці, якая перадаецца ў давернае кіраванне, з'яўляецца ўласнік, а ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 909 гэтага Кодэкса, – іншая асоба.

Артыкул 898. Даверны кіраўнік

1. Даверным кіраўніком можа быць індывідуальны прадпрымальнік ці камерцыйная арганізацыя, за выключэннем унітарнага прадпрыемства.

У выпадках, калі давернае кіраванне маёмасцю ажыццяўляецца на падставах, прадугледжаных заканадаўствам, даверным кіраўніком можа быць грамадзянін, які не з'яўляецца прадпрымальнікам, ці некамерцыйная арганізацыя, за выключэннем установы.

Заканадаўствам аб прыватызацыі можа быць прадугледжана, што даверным кіраўнікамі могуць быць і іншыя асобы.

2. Выключаны.

3. Даверны кіраўнік не можа быць выгаданабытчыкам паводле дагавора давернага кіравання маёмасцю.

Артыкул 899. Істотныя ўмовы дагавора давернага кіравання маёмасцю

1. У дагаворы давернага кіравання маёмасцю павінны быць указаны:

1) прадмет дагавора, у тым ліку характарыстыка маёмасці, якая перадаецца ў давернае кіраванне, і яе кошт;

2) межы выкарыстання маёмасці даверным кіраўніком;

3) найменне юрыдычнай асобы ці імя грамадзяніна, у інтарэсах якога ажыццяўляецца кіраванне маёмасцю (даверніка ці выгаданабытчыка);

4) памер і форма ўзнагароды давернаму кіраўніку, калі выплата ўзнагароды прадугледжана дагаворам;

5) тэрмін дзеяння дагавора.

2. Дагавор давернага кіравання заключаецца на тэрмін, які не перавышае пяці гадоў. Для асобных відаў маёмасці, якая перадаецца ў давернае кіраванне, заканадаўствам могуць быць устаноўлены іншыя гранічныя тэрміны, на якія можа быць заключаны дагавор.

Пры адсутнасці заявы аднаго з бакоў аб спыненні дагавора пасля заканчэння тэрміну яго дзеяння ён лічыцца прадоўжаным на той жа тэрмін і на тых жа ўмовах, якія былі прадугледжаны дагаворам.

Артыкул 900. Форма дагавора давернага кіравання маёмасцю

1. Дагавор давернага кіравання маёмасцю павінен быць заключаны ў пісьмовай форме.

2. Дагавор давернага кіравання нерухомай маёмасцю павінен быць заключаны ў форме, прадугледжанай для дагавора продажу нерухомай маёмасці, і падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі.

3. Незахаванне формы дагавора давернага кіравання ці патрабавання аб яго дзяржаўнай рэгістрацыі цягне за сабой несапраўднасць дагавора.

Артыкул 901. Адасабленне маёмасці, якая знаходзіцца ў даверным кіраванні

1. Маёмасць, перададзеная ў давернае кіраванне, адасабляецца ад іншай маёмасці даверніка, а таксама ад маёмасці давернага кіраўніка. Гэта маёмасць адлюстроўваецца ў давернага кіраўніка на асобным балансе (асобна ў кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання), і па ім вядзецца самастойны ўлік. Для разлікаў па дзейнасці, звязанай з даверным кіраваннем, адкрываецца асобны банкаўскі рахунак.

2. Накіраванне спагнання па даўгах даверніка на маёмасць, перададзеную ім у давернае кіраванне, не дапускаецца, за выключэннем эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтва) гэтай асобы. Пры эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве) даверніка давернае кіраванне гэтай маёмасцю спыняецца і яна ўключаецца ў конкурсную масу.

Артыкул 902. Перадача ў давернае кіраванне маёмасці, абцяжаранай закладам

1. Перадача закладзенай маёмасці ў давернае кіраванне не пазбаўляе закладатрымальніка права накіраваць спагнанне на гэту маёмасць.

2. Даверны кіраўнік павінен быць папярэджаны аб тым, што маёмасць, якая перадаецца яму ў давернае кіраванне, абцяжарана закладам. Калі даверны кіраўнік не ведаў і не павінен быў ведаць аб абцяжарванні закладам маёмасці, перададзенай яму ў давернае кіраванне, ён мае права запатрабаваць у судзе скасавання дагавора давернага кіравання маёмасцю і выплаты належнай яму паводле дагавора ўзнагароды.

Артыкул 903. Правы і абавязкі давернага кіраўніка

1. Даверны кіраўнік ажыццяўляе ў межах, прадугледжаных заканадаўствам ці дагаворам давернага кіравання, правамоцтвы ўласніка ў адносінах да маёмасці, перададзенай у давернае кіраванне. Распараджэнне нерухомай маёмасцю даверны кіраўнік ажыццяўляе ў выпадках, прадугледжаных дагаворам давернага кіравання.

2. Правы, набытыя даверным кіраўніком у выніку дзеянняў па даверным кіраванні маёмасцю, уключаюцца ў склад перададзенай у давернае кіраванне маёмасці. Абавязкі, якія ўзніклі ў выніку такіх дзеянняў давернага кіраўніка, выконваюцца за кошт гэтай маёмасці.

3. Для абароны правоў на маёмасць, якая знаходзіцца ў даверным кіраванні, даверны кіраўнік мае права патрабаваць усялякай ліквідацыі парушэння яго правоў (артыкулы 282, 283, 285 і 286).

4. Даверны кіраўнік падае даверніку і выгаданабытчыку справаздачу аб сваёй дзейнасці ў парадку і тэрміны, устаноўленыя дагаворам давернага кіравання маёмасцю.

Артыкул 904. Перадача давернага кіравання маёмасцю

1. Даверны кіраўнік ажыццяўляе давернае кіраванне маёмасцю асабіста, акрамя выпадкаў, прадугледжаных пунктам 2 гэтага артыкула.

2. Даверны кіраўнік можа даручыць іншай асобе (намесніку) здзяйсняць ад імя давернага кіраўніка дзеянні, неабходныя для кіравання маёмасцю, калі ён упаўнаважаны на гэта дагаворам давернага кіравання, або атрымаў на гэта згоду даверніка ў пісьмовай форме, або вымушаны да гэтага з прычыны абставін для забеспячэння інтарэсаў даверніка ці выгаданабытчыка і не мае пры гэтым магчымасці атрымаць указанні даверніка ў разумны тэрмін.

Даверны кіраўнік адказвае за дзеянні выбранага ім намесніка як за ўласныя.

Артыкул 905. Адказнасць давернага кіраўніка

1. Даверны кіраўнік, які не праявіў пры даверным кіраванні маёмасцю належнай клапатлівасці аб інтарэсах выгаданабытчыка ці даверніка, кампенсуе выгаданабытчыку ўпушчаную выгаду за час давернага кіравання маёмасцю, а даверніку – страты, прычыненыя стратай ці пашкоджаннем маёмасці, з улікам яе натуральнага зносу, у тым ліку ўпушчаную выгаду.

Даверны кіраўнік нясе адказнасць за прычыненыя страты, калі не дакажа, што гэтыя страты адбыліся ў выніку непераадольнай сілы або дзеянняў выгаданабытчыка ці даверніка.

2. Абавязацельствы па здзелцы, заключанай даверным кіраўніком з перавышэннем дадзеных яму паўнамоцтваў ці з парушэннем устаноўленых для яго абмежаванняў, нясе даверны кіраўнік асабіста. Калі трэція асобы, якія

ўдзельнічаюць у здзелцы, не ведалі і не павінны былі ведаць аб перавышэнні паўнамоцтваў ці аб устаноўленых абмежаваннях, узнікшыя абавязацельствы падлягаюць выкананню ў парадку, устаноўленым пунктам 3 гэтага артыкула. Давернік можа ў гэтым выпадку запатрабаваць ад давернага кіраўніка пакрыцця панесеных ім страт.

3. Даўгі па абавязацельствах, якія ўзніклі ў сувязі з даверным кіраваннем маёмасцю, пагашаюцца за кошт гэтай маёмасці. У выпадку недастатковасці гэтай маёмасці спагнанне можа быць звернута на маёмасць давернага кіраўніка, а пры недастатковасці і яго маёмасці – на маёмасць даверніка, не перададзеную ў давернае кіраванне.

4. Дагавор давернага кіравання маёмасцю можа прадугледжваць даванне даверным кіраўніком закладу ў забеспячэнне пакрыцця страт, якія могуць быць прычынены даверніку ці выгаданабытчыку неналежным выкананнем дагавора давернага кіравання.

Артыкул 906. Узнагарода давернаму кіраўніку

Даверны кіраўнік мае права на ўзнагароду, прадугледжаную дагаворам давернага кіравання маёмасцю, а таксама на пакрыццё неабходных расходаў, праведзеных ім пры даверным кіраванні маёмасцю, за кошт даходаў ад выкарыстання гэтай маёмасці.

Артыкул 907. Спыненне дагавора давернага кіравання маёмасцю

1. Дагавор давернага кіравання маёмасцю спыняецца ў выніку:

1) смерці грамадзяніна, які з'яўляецца выгаданабытчыкам, або аб’яўлення яго памерлым ці ліквідацыі юрыдычнай асобы – выгаданабытчыка, калі дагаворам не прадугледжана іншае;

2) адмовы выгаданабытчыка ад атрымання выгад паводле дагавора, калі дагаворам не прадугледжана іншае;

3) смерці грамадзяніна, які з'яўляецца даверным кіраўніком, аб’яўлення яго памерлым, прызнання недзеяздольным, абмежавана дзеяздольным ці адсутным без вестак, прызнання індывідуальнага прадпрымальніка эканамічна неплацежаздольным (банкрутам), а таксама ўстанаўлення забароны давернаму кіраўніку ажыццяўляць прадпрымальніцкую дзейнасць у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі;

4) адмовы давернага кіраўніка ці даверніка ад ажыццяўлення давернага кіравання ў сувязі з немагчымасцю для давернага кіраўніка асабіста ажыццяўляць давернае кіраванне маёмасцю;

5) адмовы даверніка ад дагавора з-за іншых прычын, чым тая, якая ўказана ў падпункце 4 гэтага пункта, пры ўмове выплаты давернаму кіраўніку абумоўленай дагаворам узнагароды;

6) прызнання асобы, якая з'яўляецца даверникам, эканамічна неплацежаздольнай (банкрутам);

7) спынення апекі і папячыцельства, калі дагавор давернага кіравання быў заключаны для кіравання маёмасцю падапечнага ў адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 36 гэтага Кодэкса.

2. Пры адмове аднаго боку ад дагавора давернага кіравання маёмасцю іншы бок павінен быць апавешчаны аб гэтым за тры месяцы да спынення дагавора, калі дагаворам не прадугледжаны іншы тэрмін паведамлення.

3. Пры спыненні давернага кіравання маёмасць, якая знаходзіцца ў даверным кіраванні, перадаецца даверніку, калі дагаворам не прадугледжана іншае.

Артыкул 908. Давернае кіраванне каштоўнымі паперамі

1. Пры перадачы каштоўных папер у давернае кіраванне можа быць прадугледжана аб'яднанне каштоўных папер, якія перадаюцца ў давернае кіраванне рознымі асобамі.

2. Правамоцтвы давернага кіраўніка каштоўнымі паперамі вызначаюцца ў дагаворы давернага кіравання.

Паводле дагавора давернага кіравання каштоўнымі паперамі давернаму кіраўніку могуць быць перададзены грашовыя сродкі для набыцця каштоўных папер і кіравання імі.

3. Асаблівасці давернага кіравання каштоўнымі паперамі вызначаюцца заканадаўствам.

4. Правілы гэтага артыкула адпаведна прымяняюцца да правоў, пасведчаных бездакументарнымі каштоўнымі паперамі.

Артыкул 909. Давернае кіраванне маёмасцю на падставах, прадугледжаных заканадаўствам

1. Давернае кіраванне маёмасцю можа быць таксама заснавана:

1) у выніку неабходнасці пастаяннага кіравання маёмасцю падапечнага ці маёмасцю грамадзяніна, прызнанага адсутным без вестак, у выпадках, прадугледжаных артыкуламі 36 і 39 гэтага Кодэкса;

2) на падставе завяшчання, у якім прызначаны выканаўца завяшчання (душапрыказчык);

3) на іншых падставах, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства.

2. Правілы, прадугледжаныя гэтай главой, адпаведна прымяняюцца да адносін па даверным кіраванні маёмасцю, якое ўзнікла на падставах, указаных у пункце 1 гэтага артыкула, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам і не вынікае з сутнасці такіх адносін.

У выпадках, калі давернае кіраванне маёмасцю ўзнікае на падставах, указаных у пункце 1 гэтага артыкула, правы даверніка, прадугледжаныя правіламі гэтай главы, належаць адпаведна органу апекі і папячыцельства, выканаўцу завяшчання (душапрыказчыку) ці іншай асобе, указанай у законе.

ГЛАВА 53
КОМПЛЕКСНАЯ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦКАЯ ЛІЦЭНЗІЯ (ФРАНЧАЙЗІНГ)

Артыкул 910. Дагавор комплекснай прадпрымальніцкай ліцэнзіі (франчайзінгу)

1. Паводле дагавора комплекснай прадпрымальніцкай ліцэнзіі (франчайзінгу) (далей – дагавор франчайзінгу) адзін бок (праваўладальнік) абавязваецца выдаць іншаму боку (карыстальніку) за ўзнагароду на вызначаны ў дагаворы франчайзінгу тэрмін або без указання тэрміну ліцэнзійны комплекс, які ўключае права выкарыстання фірменнага наймення праваўладальніка, іншых аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, прадугледжаных дагаворам франчайзінгу, а таксама нераскрытай інфармацыі ў прадпрымальніцкай дзейнасці карыстальніка.

2. Дагавор франчайзінгу прадугледжвае выкарыстанне ліцэнзійнага комплексу, указанага ў пункце 1 гэтага артыкула, у пэўным аб'ёме (з устанаўленнем мінімальнага і (ці) максімальнага аб'ёму выкарыстання) з указаннем ці без указання

тэрыторыі яго выкарыстання прымяняльна да пэўных відаў прадпрымальніцкай дзейнасці.

3. Бакамі паводле дагавора франчайзінгу могуць быць камерцыйныя арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі.

4. Узнагароду паводле дагавора франчайзінгу можа выплачваць карыстальнік праваўладальніку ў форме фіксаваных разавых ці перыядычных выплат, адлічэнняў ад выручкі ці ў іншай форме, прадугледжанай дагаворам франчайзінгу.

Артыкул 910[1]. Форма і рэгістрацыя дагавора франчайзінгу

1. Дагавор франчайзінгу заключаецца ў пісьмовай форме.

2. Дагавор франчайзінгу падлягае рэгістрацыі ў патэнтным органе ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Артыкул 910[2]. Комплексная прадпрымальніцкая субліцэнзія

1. Дагаворам франчайзінгу можа быць прадугледжана права карыстальніка дазваляць іншым асобам выкарыстанне дадзенага яму ліцэнзійнага комплексу ці часткі гэтага комплексу на ўмовах, узгодненых ім з праваўладальнікам або вызначаных у дагаворы франчайзінгу (комплексная прадпрымальніцкая субліцэнзія). Дагаворам франчайзінгу можа быць прадугледжаны абавязак карыстальніка выдаць на працягу пэўнага тэрміну пэўную колькасць комплексных прадпрымальніцкіх субліцэнзій.

2. Дагавор комплекснай прадпрымальніцкай субліцэнзіі не можа быць заключаны на больш працяглы тэрмін, чым дагавор франчайзінгу, на падставе якога ён заключаўся.

3. Спыненне дагавора франчайзінгу спыняе дагавор комплекснай прадпрымальніцкай субліцэнзіі.

4. Адказнасць перад праваўладальнікам за дзеянні другасных карыстальнікаў нясе карыстальнік, калі іншае не прадугледжана дагаворам франчайзінгу.

5. Да дагавора комплекснай прадпрымальніцкай субліцэнзіі прымяняюцца прадугледжаныя гэтай главой правілы аб дагаворы франчайзінгу, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

Артыкул 910[3]. Абавязкі праваўладальніка

1. Праваўладальнік абавязаны перадаць карыстальніку тэхнічную, камерцыйную ці іншую інфармацыю, неабходную карыстальніку для выкарыстання выдадзенага яму паводле дагавора франчайзінгу ліцэнзійнага комплексу, а таксама праінструктаваць карыстальніка і яго работнікаў па пытаннях, звязаных з выкарыстаннем гэтага комплексу.

2. Калі дагаворам франчайзінгу не прадугледжана іншае, праваўладальнік абавязаны:

аказваць карыстальніку пастаяннае тэхнічнае і кансультатыўнае садзейнічанне, уключаючы садзейнічанне ў навучанні работнікаў;

кантраляваць якасць тавараў (работ, паслуг), якія праводзяцца (выконваюцца, аказваюцца) карыстальнікам на падставе дагавора франчайзінгу.

Артыкул 910[4]. Абавязкі карыстальніка

З улікам характару і асаблівасцей дзейнасці, якая ажыццяўляецца карыстальнікам паводле дагавора франчайзінгу, карыстальнік абавязаны:

выкарыстоўваць пры ажыццяўленні прадугледжанай дагаворам франчайзінгу дзейнасці фірменнае найменне праваўладальніка ўказаным у гэтым дагаворы чынам;

забяспечваць адпаведнасць якасці тавараў (работ, паслуг), якія праводзяцца (выконваюцца, аказваюцца) карыстальнікам на падставе дагавора франчайзінгу, якасці аналагічных тавараў (работ, паслуг), якія праводзяцца (выконваюцца, аказваюцца) непасрэдна праваўладальнікам;

выконваць інструкцыі і ўказанні праваўладальніка, накіраваныя на забеспячэнне адпаведнасці характару, спосабаў і ўмоў выкарыстання ліцэнзійнага комплексу таму, як ён выкарыстоўваецца праваўладальнікам, у тым ліку выконваць указанні, якія датычацца знешняга і ўнутранага афармлення памяшканняў, што выкарыстоўваюцца карыстальнікам пры выкананні дагавора франчайзінгу;

аказваць пакупнікам (заказчыкам) усе дадатковыя паслугі, на якія яны маглі б разлічваць, набываючы тавар, заказваючы выкананне работ, аказанне паслуг непасрэдна ў праваўладальніка;

не выдаваць атрыманую ад праваўладальніка нераскрытую інфармацыю, у тым ліку сакрэты вытворчасці (ноу-хау);

выдаваць агавораную колькасць комплексных прадпрымальніцкіх субліцэнзій, калі такі абавязак прадугледжаны дагаворам франчайзінгу;

інфармаваць пакупнікоў (заказчыкаў) найбольш відавочным для іх спосабам аб тым, што ён выкарыстоўвае фірменнае найменне, таварны знак, знак абслугоўвання ці іншы сродак індывідуалізацыі ўдзельнікаў грамадзянскага абароту, тавараў, работ ці паслуг на падставе дагавора франчайзінгу.

Артыкул 910[5]. Абмежаванні правоў бакоў паводле дагавора франчайзінгу

1. Дагаворам франчайзінгу могуць быць прадугледжаны абмежаванні правоў бакоў пры дапамозе ўказання на:

абавязацельства праваўладальніка не выдаваць іншым асобам аналагічныя ліцэнзійныя комплексы для іх выкарыстання на замацаванай за карыстальнікам тэрыторыі або ўстрымлівацца ад уласнай аналагічнай дзейнасці на гэтай тэрыторыі;

абавязацельства карыстальніка не канкурыраваць з праваўладальнікам на тэрыторыі, на якую распаўсюджваецца дзеянне дагавора франчайзінгу ў адносінах да прадпрымальніцкай дзейнасці, якая ажыццяўляецца карыстальнікам з выкарыстаннем належных праваўладальніку выключных правоў і нераскрытай інфармацыі;

адмову карыстальніка ад атрымання паводле дагавораў франчайзінгу аналагічных выключных правоў і нераскрытай інфармацыі ў канкурэнтаў (патэнцыяльных канкурэнтаў) праваўладальніка;

абавязацельства карыстальніка ўзгадняць з праваўладальнікам месца размяшчэння памяшканняў, якія выкарыстоўваюцца пры выкананні дагавора франчайзінгу, а таксама іх знешняе і ўнутранае афармленне.

2. Абмежаванні правоў бакоў паводле дагавора франчайзінгу могуць быць прызнаны судом несапраўднымі па патрабаванні антыманапольнага органа ці іншай зацікаўленай асобы, калі гэтыя абмежаванні з улікам стану адпаведнага таварнага рынку і эканамічнага становішча бакоў супярэчаць антыманапольнаму заканадаўству.

Артыкул 910[6]. Адказнасць праваўладальніка па патрабаваннях, якія прад'яўляюцца да карыстальніка

1. Праваўладальнік нясе субсідыярную адказнасць па патрабаваннях, якія прад'яўляюцца да карыстальніка, аб неадпаведнасці якасці тавараў (работ, паслуг), якія прадаюцца (выконваюцца, аказваюцца) карыстальнікам паводле дагавора

франчайзінгу, якасці аналагічных тавараў (работ, паслуг), якія прадаюцца (выконваюцца, аказваюцца) непасрэдна праваўладальнікам.

2. Па патрабаваннях, якія прад'яўляюцца да карыстальніка як вырабляльніка прадукцыі (тавараў) праваўладальніка, праваўладальнік адказвае салідарна з карыстальнікам.

Артыкул 910[7]. Змяненне дагавора франчайзінгу

1. Дагавор франчайзінгу можа быць зменены ў адпаведнасці з правіламі главы 29 гэтага Кодэкса.

2. Змяненне дагавора франчайзінгу падлягае рэгістрацыі ў парадку, устаноўленым для рэгістрацыі дагавораў франчайзінгу.

3. У адносінах з трэцімі асобамі бакі дагавора франчайзінгу маюць права спасылацца на змяненне дагавора з моманту рэгістрацыі гэтага змянення.

Артыкул 910[8]. Захаванне дагавора франчайзінгу ў сіле пры перамене бакоў

1. Пераход ад праваўладальніка да іншай асобы якога-небудзь выключнага права на аб'ект інтэлектуальнай уласнасці, які ўваходзіць у дадзены карыстальніку ліцэнзійны комплекс, не з'яўляецца падставай для змянення ці скасавання дагавора франчайзінгу. Новы праваўладальнік становіцца бокам гэтага дагавора ў частцы правоў і абавязкаў, якія адносяцца да выключнага права, што перайшло да яго, на аб'ект інтэлектуальнай уласнасці.

2. У выпадку смерці праваўладальніка – індывідуальнага прадпрымальніка і пераходу ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку яго правоў і абавязкаў паводле дагавора франчайзінгу да спадчынніка дагавор франчайзінгу спыняецца, калі спадчыннік не зарэгістраваны на працягу шасці месяцаў з дня адкрыцця спадчыны ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка.

3. Ажыццяўленне правоў і выкананне абавязкаў памерлага праваўладальніка да прыняцця спадчыннікам гэтых правоў і абавязкаў і рэгістрацыі яго ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка праводзіць даверны кіраўнік у адпаведнасці з главой 52 гэтага Кодэкса.

Артыкул 910[9]. Захаванне дагавора франчайзінгу ў сіле пры змяненні фірменнага наймення

У выпадку змянення праваўладальнікам свайго фірменнага наймення дагавор франчайзінгу захоўваецца і дзейнічае ў адносінах да новага фірменнага наймення праваўладальніка, калі карыстальнік не запатрабуе скасавання дагавора і пакрыцця страт. У выпадку працягвання дзеяння дагавора франчайзінгу карыстальнік мае права запатрабаваць суразмернага змяншэння належнай праваўладальніку ўзнагароды.

Артыкул 910[10]. Наступствы спынення выключнага права, карыстанне якім дадзена паводле дагавора франчайзінгу

1. Калі ў перыяд дзеяння дагавора франчайзінгу скончыўся тэрмін дзеяння выключнага права, карыстанне якім дадзена паводле гэтага дагавора, за выключэннем спынення права на фірменнае найменне без замены яго новым фірменным найменнем, або такое права спынілася на іншай падставе, дагавор франчайзінгу працягвае дзейнічаць, за выключэннем палажэнняў, што адносяцца да права, якое спынілася, а карыстальнік, калі іншае не прадугледжана дагаворам франчайзінгу, мае права запатрабаваць суразмернага змяншэння належнай праваўладальніку ўзнагароды.

2. Дзеянне дагавора франчайзінгу спыняецца ў выпадку спынення права на фірменнае найменне без замены яго новым фірменным найменнем.

Артыкул 910[11]. Скасаванне дагавора франчайзінгу

1. Дагавор франчайзінгу, заключаны з указаннем тэрміну або без указання тэрміну, можа быць скасаваны ў адпаведнасці з правіламі главы 29 гэтага Кодэкса.

2. Кожны з бакоў дагавора франчайзінгу, заключанага без указання тэрміну, мае права ў любы час поўнасцю адмовіцца ад выканання дагавора, паведаміўшы аб гэтым іншаму боку за шэсць месяцаў, калі дагаворам не прадугледжаны больш працяглы тэрмін.

3. Датэрміновае скасаванне дагавора франчайзінгу, заключанага з указаннем тэрміну, а таксама скасаванне дагавора, заключанага без указання тэрміну, падлягаюць рэгістрацыі ў парадку, устаноўленым для рэгістрацыі дагавораў франчайзінгу.

ГЛАВА 54
ПРОСТАЯ СУПОЛКА

Артыкул 911. Дагавор простай суполкі (дагавор аб сумеснай дзейнасці)

1. Паводле дагавора простай суполкі (дагаворы аб сумеснай дзейнасці) дзве ці некалькі асоб (супольнікаў) абавязваюцца злучыць свае ўклады і сумесна дзейнічаць без утварэння юрыдычнай асобы для атрымання прыбытку ці дасягнення іншай мэты, якая не супярэчыць заканадаўству.

2. Бакамі дагавора простай суполкі, які заключаецца для ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, могуць быць толькі індывідуальныя прадпрымальнікі і (ці) камерцыйныя арганізацыі.

Артыкул 912. Уклады супольнікаў

1. Укладам супольніка прызнаецца ўсё тое, што ён уносіць у агульную справу, у тым ліку грошы, іншую маёмасць, прафесійныя і іншыя веды, навыкі і ўменні, а таксама дзелавая рэпутацыя і дзелавыя сувязі.

2. Уклады супольнікаў лічацца роўнымі па кошце, калі іншае не вынікае з дагавора простай суполкі ці фактычных абставін. Кошт неграшовага ўкладу супольніка ацэньваецца паводле пагаднення паміж супольнікамі.

Артыкул 913. Агульная маёмасць супольнікаў

1. Унесеная супольнікамі маёмасць, якой яны валодалі на праве ўласнасці, а таксама выробленая ў выніку сумеснай дзейнасці прадукцыя і атрыманыя ад такой дзейнасці набыткі і даходы прызнаюцца іх агульнай долевай уласнасцю, паколькі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам ці дагаворам простай суполкі або не вынікае з сутнасці абавязацельства.

Унесеная супольнікамі маёмасць, якой яны валодалі на падставах, адрозных ад права ўласнасці (на праве гаспадарчага валодання, аператыўнага кіравання, паводле дагавора арэнды, паводле дагавора бязвыплатнага карыстання маёмасцю і да т.п.), выкарыстоўваецца ў інтарэсах усіх супольнікаў і складае нароўні з маёмасцю, якая знаходзіцца ў іх агульнай уласнасці, агульную маёмасць супольнікаў.

2. Вядзенне бухгалтарскага ўліку агульнай маёмасці супольнікаў можа быць даручана імі адной з асоб, якія ўдзельнічаюць у дагаворы.

3. Карыстанне агульнай маёмасцю супольнікаў ажыццяўляецца па іх агульнай згодзе, а пры недасягненні згоды – у парадку, які ўстанаўлівае суд.

4. Абавязкі супольнікаў па ўтрыманні агульнай маёмасці і парадак пакрыцця расходаў, звязаных з выкананнем гэтых абавязкаў, прадугледжваюцца дагаворам.

Артыкул 914. Вядзенне агульных спраў супольнікаў

1. Пры вядзенні агульных спраў кожны супольнік мае права дзейнічаць ад імя ўсіх супольнікаў, калі дагаворам простай суполкі не ўстаноўлена, што справы вядуць асобныя ўдзельнікі або сумесна ўсе ўдзельнікі дагавора простай суполкі.

Пры сумесным вядзенні спраў для заключэння кожнай здзелкі патрабуецца згода ўсіх супольнікаў.

2. У адносінах з трэцімі асобамі паўнамоцтва супольніка заключаць здзелкі ад імя ўсіх супольнікаў сведчыцца даверанасцю, выдадзенай яму астатнімі супольнікамі, ці дагаворам суполкі, заключаным у пісьмовай форме.

3. У адносінах з трэцімі асобамі супольнікі не могуць спасылацца на абмежаванні правоў па вядзенні агульных спраў супольніка, які заключыў здзелку, за выключэннем выпадкаў, калі яны дакажуць, што ў момант заключэння здзелкі трэцяя асоба ведала ці яўна павінна была ведаць аб наяўнасці такіх абмежаванняў.

4. Супольнік, які заключыў ад імя ўсіх супольнікаў здзелкі, у адносінах да якіх яго права на вядзенне агульных спраў супольнікаў было абмежавана, або які заключыў у інтарэсах усіх супольнікаў здзелкі ад свайго імя, можа патрабаваць пакрыцця праведзеных ім за свой кошт расходаў, калі меліся дастатковыя падставы меркаваць, што гэтыя здзелкі былі неабходнымі ў інтарэсах усіх супольнікаў. Супольнікі, якія панеслі ў выніку такіх здзелак страты, маюць права патрабаваць іх пакрыцця.

5. Рашэнні, якія тычацца агульных спраў супольнікаў, прымаюць супольнікі па агульнай згодзе.

Артыкул 915. Права супольніка на інфармацыю

Кожны супольнік незалежна ад таго, ці ўпаўнаважаны ён весці агульныя справы супольнікаў, мае права знаёміцца з усёй дакументацыяй аб вядзенні спраў. Адмова ад гэтага права ці яго абмежаванне, у тым ліку па пагадненні супольнікаў, нікчэмныя.

Артыкул 916. Агульныя расходы і страты супольнікаў

Парадак пакрыцця расходаў і страт, звязаных з сумеснай дзейнасцю супольнікаў, вызначаецца іх пагадненнем. Пры адсутнасці такога пагаднення кожны супольнік нясе расходы і страты прапарцыянальна кошту яго ўкладу ў агульную справу.

Пагадненне, якое поўнасцю вызваляе каго-небудзь з супольнікаў ад удзелу ў пакрыцці агульных расходаў ці страт, нікчэмнае.

Артыкул 917. Адказнасць супольнікаў па агульных абавязацельствах

1. Калі дагавор простай суполкі не звязаны з ажыццяўленнем яго ўдзельнікамі прадпрымальніцкай дзейнасці, кожны супольнік адказвае па агульных дагаворных абавязацельствах усёй сваёй маёмасцю прапарцыянальна кошту яго ўкладу ў агульную справу.

Па агульных абавязацельствах, якія ўзніклі не з дагавора, супольнікі адказваюць салідарна.

2. Калі дагавор простай суполкі звязаны з ажыццяўленнем яго ўдзельнікамі прадпрымальніцкай дзейнасці, супольнікі адказваюць салідарна па ўсіх агульных абавязацельствах незалежна ад падстаў іх узнікнення.

Артыкул 918. Размеркаванне прыбытку

Прыбытак, атрыманы супольнікамі ў выніку іх сумеснай дзейнасці, размяркоўваецца прапарцыянальна кошту ўкладаў супольнікаў у агульную справу, калі іншае не прадугледжана дагаворам простай суполкі ці іншым пагадненнем супольнікаў. Пагадненне аб устараненні каго-небудзь з супольнікаў ад удзелу ў прыбытку нікчэмнае.

Артыкул 919. Выдзел долі супольніка па патрабаванні яго крэдытора

Крэдытор удзельніка дагавора простай суполкі мае права прад'явіць патрабаванне аб выдзеле долі даўжніка ў агульнай маёмасці ў адпаведнасці з артыкулам 258 гэтага Кодэкса.

Артыкул 920. Спыненне дагавора простай суполкі

1. Дагавор простай суполкі спыняецца ў выніку:

1) прызнання каго-небудзь з супольнікаў адсутным без вестак, недзеяздольным ці абмежавана дзеяздольным, калі дагаворам простай суполкі ці наступным пагадненнем не прадугледжана захаванне дагавора ў адносінах паміж астатнімі супольнікамі;

2) аб’яўлення каго-небудзь з супольнікаў эканамічна неплацежаздольным (банкрутам), за выключэннем, указаным у падпункце 1 гэтага пункта;

3) смерці супольніка (аб’яўлення яго памерлым) ці ліквідацыі або рэарганізацыі юрыдычнай асобы, якая ўдзельнічае ў дагаворы простай суполкі, калі дагаворам простай суполкі ці наступным пагадненнем не прадугледжана захаванне дагавора ў адносінах паміж астатнімі супольнікамі або замяшчэнне памерлага супольніка (рэарганізаванай юрыдычнай асобы) яго спадчыннікамі (праваперaемнікамі);

4) адмовы каго-небудзь з супольнікаў ад далейшага ўдзелу ў бестэрміновым дагаворы простай суполкі, за выключэннем, указаным у падпункце 1 гэтага пункта;

5) скасавання дагавора простай суполкі, заключанага з указаннем тэрміну, паводле патрабавання аднаго з супольнікаў у адносінах паміж ім і астатнімі супольнікамі, за выключэннем, указаным у падпункце 1 гэтага пункта;

6) сканчэння тэрміну дагавора простай суполкі;

7) выдзелу долі супольніка па патрабаванні яго крэдытора, за выключэннем, указаным у падпункце 1 гэтага пункта.

2. Пры спыненні дагавора простай суполкі рэчы, перададзеныя ў агульнае валоданне і (ці) карыстанне супольнікаў, вяртаюцца супольнікам, якія давалі іх, без узнагароды, калі іншае не прадугледжана пагадненнем бакоў.

З моманту спынення дагавора простай суполкі яго ўдзельнікі нясуць салідарную адказнасць па нявыкананых агульных абавязацельствах у адносінах да трэціх асоб.

Падзел маёмасці, якая знаходзілася ў агульнай уласнасці супольнікаў, і агульных правоў патрабавання, якія ўзніклі ў іх, ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым артыкулам 255 гэтага Кодэкса.

Супольнік, які ўнёс у агульную ўласнасць індывідуальна-вызначаную рэч, мае права пры спыненні дагавора простай суполкі патрабаваць у судовым парадку вяртання яму гэтай рэчы пры ўмове прытрымлівання інтарэсаў астатніх супольнікаў і крэдытораў.

Артыкул 921. Адмова ад бестэрміновага дагавора простай суполкі

Заява аб адмове супольніка ад бестэрміновага дагавора простай суполкі павінна быць зроблена ім не пазней чым за тры месяцы да меркаванага выхаду з дагавора.

Пагадненне аб абмежаванні права на адмову ад бестэрміновага дагавора простай суполкі з'яўляецца нікчэмным.

Артыкул 922. Скасаванне дагавора простай суполкі паводле патрабавання боку

Нароўні з падставамі, указанымі ў пункце 2 артыкула 420 гэтага Кодэкса, бок дагавора простай суполкі, заключанага з указаннем тэрміну ці з указаннем мэты ў якасці скасавальнай умовы, мае права патрабаваць скасавання дагавора ў адносінах паміж сабой і астатнімі супольнікамі па ўважлівай прычыне з пакрыццём астатнім супольнікам рэальнага ўрону, прычыненага скасаваннем дагавора.

Артыкул 923. Адказнасць супольніка, у адносінах да якога дагавор простай суполкі скасаваны

У выпадку, калі дагавор простай суполкі не быў спынены ў выніку заявы кім-небудзь з удзельнікаў аб адмове ад далейшага ў ім удзелу або скасавання дагавора па патрабаванні аднаго з супольнікаў, асоба, удзел якой у дагаворы спыніўся, адказвае перад трэцімі асобамі па агульных абавязацельствах, якія ўзніклі ў перыяд яго ўдзелу ў дагаворы, так, як калі б яна засталася ўдзельнікам дагавора простай суполкі.

Артыкул 924. Тайная суполка

1. Дагаворам простай суполкі можа быць прадугледжана, што яго існаванне не раскрываецца для трэціх асоб (тайная суполка). Да такога дагавора прымяняюцца прадугледжаныя гэтай главой правілы аб дагаворы простай суполкі, калі іншае не прадугледжана гэтым артыкулам ці не вынікае з сутнасці тайнай суполкі.

2. У адносінах з трэцімі асобамі кожны з удзельнікаў тайнай суполкі адказвае ўсёй сваёй маёмасцю па здзелках, якія ён заключыў ад свайго імя ў агульных інтарэсах супольнікаў.

3. У адносінах паміж супольнікамі абавязацельствы, якія ўзніклі ў працэсе іх сумеснай дзейнасці, лічацца агульнымі.

ГЛАВА 55
ПУБЛІЧНАЕ АБЯЦАННЕ ЎЗНАГАРОДЫ

Артыкул 925. Абавязак выплаты ўзнагароды

1. Асоба, якая абвясціла публічна аб выплаце грашовай узнагароды ці аб выдачы іншай узнагароды (аб выплаце ўзнагароды) таму, хто здзейсніць указанае ў аб’яве дзеянне ва ўказаны ў ім тэрмін, абавязана выплаціць абяцаную ўзнагароду

любому, хто здзейсніў адпаведнае дзеянне, у прыватнасці адшукаў страчаную рэч ці паведаміў асобе, якая абвясціла аб узнагародзе, неабходныя звесткі.

2. Абавязак выплаціць узнагароду ўзнікае пры ўмове, што абяцанне ўзнагароды дазваляе вызначыць, хто яе абяцаў. Асоба, якая адгукнулася на абяцанне, мае права запатрабаваць пісьмовага пацвярджэння абяцання і нясе рызыку наступстваў непрад'яўлення гэтага патрабавання, калі выявіцца, што насамрэч аб'яўленне аб узнагародзе не было зроблена ўказанай у ім асобай.

3. Калі ў публічным абяцанні ўзнагароды не ўказаны яе памер, ён вызначаецца па пагадненні з асобай, якая абяцала ўзнагароду, а ў выпадку спрэчкі – судом.

4. Абавязак выплаты ўзнагароды ўзнікае незалежна ад таго, здзейснена адпаведнае дзеянне ў сувязі са зробленай аб'явай ці незалежна ад яе.

5. У выпадках, калі дзеянне, указанае ў аб'яве, здзейснілі некалькі асоб, права на атрыманне ўзнагароды набывае тая з іх, якая здзейсніла адпаведнае дзеянне першай.

Калі дзеянне, указанае ў аб'яве, учынена дзвюма ці больш асобамі і немагчыма вызначыць, якая з іх учыніла адпаведнае дзеянне першай, а таксама ў выпадку, калі дзеянне здзейснена дзвюма ці больш асобамі адначасова, узнагарода паміж імі дзеліцца пароўну ці ў іншым памеры, прадугледжаным пагадненнем паміж імі.

6. Калі іншае не прадугледжана ў аб'яве аб узнагародзе і не вынікае з характару ўказанага ў ёй дзеяння, адпаведнасць выкананага дзеяння патрабаванням, якія ўтрымліваюцца ў аб'яве, вызначае асоба, якая публічна абяцала ўзнагароду, а ў выпадку спрэчкі – суд.

Артыкул 926. Адмена публічнага абяцання ўзнагароды

1. Асоба, якая аб'явіла публічна аб выплаце ўзнагароды, мае права ў такой жа форме адмовіцца ад дадзенага абяцання, акрамя выпадкаў, калі ў самой аб'яве прадугледжана ці з яго вынікае недапушчальнасць адмовы ці дадзены вызначаны тэрмін для здзяйснення дзеяння, за якое абяцана ўзнагарода, або да моманту аб'яўлення аб адмове адна ці некалькі асоб, якія адгукнуліся, ужо выканалі ўказанае ў аб'яве дзеянне.

2. Адмена публічнага абяцання ўзнагароды не вызваляе таго, хто абвясціў аб узнагародзе, ад пакрыцця асобе, якая адгукнулася да адмены публічнага абяцання ўзнагароды, расходаў, панесеных ёй у сувязі з здзяйсненнем указанага ў аб'яве дзеяння, у межах указанай у аб'яве ўзнагароды.

ГЛАВА 56
ПУБЛІЧНЫ КОНКУРС

Артыкул 927. Арганізацыя публічнага конкурсу

1. Асоба, якая абвясціла публічна аб выплаце грашовай узнагароды ці выдачы іншай узнагароды (аб выплаце ўзнагароды) за найлепшае выкананне работы ці дасягненне іншых вынікаў (публічны конкурс), павінна выплаціць (выдаць) абумоўленую ўзнагароду таму, хто ў адпаведнасці з умовамі правядзення конкурсу прызнаны яго пераможцам.

2. Публічны конкурс павінен быць накіраваны на дасягненне якіх-небудзь калектыўна карысных мэт.

3. Публічны конкурс можа быць адкрытым, калі прапанова арганізатара конкурсу прыняць у ім удзел звернута да ўсіх жадаючых шляхам аб'явы ў друку ці

іншых сродках масавай інфармацыі, або закрытым, калі прапанова прыняць удзел у конкурсе накіроўваецца вызначанаму колу асоб на выбар арганізатара конкурсу.

Адкрыты конкурс можа быць абумоўлены папярэдняй кваліфікацыяй яго ўдзельнікаў, калі арганізатар конкурсу праводзіць папярэдні адбор асоб, якія пажадалі прыняць у ім удзел.

4. Аб'ява аб публічным конкурсе павінна ўтрымліваць, прынамсі, умовы, якія прадугледжваюць сутнасць задання, крытэрыі і парадак ацэнкі вынікаў работы ці іншых дасягненняў, месца, тэрмін і парадак іх прадстаўлення, памер і форму ўзнагароды, а таксама парадак і тэрміны аб'яўлення вынікаў конкурсу.

5. Да публічнага конкурсу, які ўтрымлівае абавязацельства заключыць з пераможцам конкурсу дагавор, правілы, прадугледжаныя гэтай главой, прымяняюцца пастолькі, паколькі артыкуламі 417–419 гэтага Кодэкса не прадугледжана іншае.

Артыкул 928. Змяненне ўмоў і адмена публічнага конкурсу

1. Асоба, якая абвясціла публічны конкурс, мае права змяніць яго ўмовы ці адмяніць конкурс толькі на працягу першай паловы ўстаноўленага для прадстаўлення работ тэрміну.

2. Паведамленне аб змяненні ўмоў ці адмене конкурсу павінна быць зроблена тым жа спосабам, якім конкурс быў аб'яўлены.

3. У выпадку змянення ўмоў конкурсу ці яго адмены асоба, якая аб'явіла аб конкурсе, павінна кампенсаваць расходы, панесеныя любой асобай, якая выканала прадугледжаную ў аб'яве работу да таго, як ёй стала ці павінна было стаць вядома аб змяненні ўмоў конкурсу ці аб яго адмене.

4. Калі пры змяненні ўмоў конкурсу ці яго адмене былі парушаны патрабаванні, указаныя ў пунктах 1 ці 2 гэтага артыкула, асоба, якая абвясціла конкурс, павінна выплаціць узнагароду тым, хто выканаў работу, якая адпавядае ўказаным у аб'яве ўмовам.

Артыкул 929. Рашэнне аб выплаце ўзнагароды

1. Рашэнне аб выплаце ўзнагароды павінна быць вынесена і паведамлена ўдзельнікам публічнага конкурсу ў парадку і тэрміны, устаноўленыя ў аб'яве аб конкурсе.

2. Калі ўказаныя ў аб'яве вынікі дасягнуты ў рабоце, выкананай сумесна дзвюма ці больш асобамі, узнагарода размяркоўваецца ў адпаведнасці з дасягнутым паміж імі пагадненнем. Калі такое пагадненне не дасягнута, парадак размеркавання ўзнагароды вызначае суд.

Артыкул 930. Выкарыстанне твораў навукі, літаратуры і мастацтва, уганараваных узнагародай

1. Калі прадмет публічнага конкурсу складае стварэнне твора навукі, літаратуры ці мастацтва і ўмовамі конкурсу не прадугледжана іншае, асоба, якая аб'явіла публічны конкурс, набывае пераважнае права на заключэнне з аўтарам твора, уганараванага абумоўленай узнагародай, дагавора аб выкарыстанні твора з выплатай яму за гэта адпаведнай узнагароды.

2. Асоба, якая аб'явіла публічны конкурс, абавязана вярнуць удзельнікам конкурсу работы, не ўганараваныя ўзнагародай, калі іншае не прадугледжана аб'явай аб конкурсе і не вынікае з характару выкананай работы.

ГЛАВА 57
ПРАВЯДЗЕННЕ ГУЛЬНЯЎ І ЗАКЛАДАЎ

Артыкул 931. Патрабаванні, звязаныя з арганізацыяй гульняў і закладаў і ўдзелам у іх

Патрабаванні грамадзян і юрыдычных асоб, звязаныя з арганізацыяй гульняў і закладаў ці з удзелам у іх, не падлягаюць судовай абароне, за выключэннем патрабаванняў асоб, якія прынялі ўдзел у гульнях ці закладах пад уплывам падману, насілля, пагрозы або зламыснага пагаднення іх прадстаўніка з арганізатарам гульняў ці закладаў, а таксама патрабаванняў, указаных у пункце 5 артыкула 932 гэтага Кодэкса, і іншых выпадкаў, устаноўленых заканадаўчымі актамі.

Артыкул 932. Правядзенне латарэй, таталізатараў і іншых гульняў Рэспублікай Беларусь і адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі ці па іх дазволе

1. Права на дзейнасць па заснаванні, арганізацыі і правядзенні латарэй у Рэспубліцы Беларусь належыць дзяржаве і ва ўстаноўленым парадку ажыццяўляецца рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, дзяржаўнымі юрыдычнымі асобамі. Адносіны паміж арганізатарамі латарэй, таталізатараў (узаемных закладаў), іншых заснаваных на рызыцы гульняў і ўдзельнікамі гульняў ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам і заснаваны на дагаворы.

2. Дагавор паміж арганізатарам і ўдзельнікам гульняў заключаецца на добраахвотнай аснове і афармляецца выдачай латарэйнага білета, квітанцыі, іншага дакумента ці іншым прадугледжаным правіламі арганізацыі гульні чынам.

3. Прапанова аб заключэнні дагавора, прадугледжанага пунктам 1 гэтага артыкула, павінна ўключаць умовы аб тэрміне правядзення гульняў, парадку вызначэння выйгрышу і яго памеры.

У выпадку адмовы арганізатара гульняў ад іх правядзення ва ўстаноўлены тэрмін удзельнікі гульняў маюць права патрабаваць ад іх арганізатара пакрыцця панесенага рэальнага ўрону з-за адмены гульняў ці пераносу іх тэрміну.

4. Асобам, якія ў адпаведнасці з умовамі правядзення латарэі, таталізатара ці іншых гульняў прызнаюцца пераможцамі, павінен быць выплачаны арганізатарам гульняў выйгрыш у прадугледжаных умовамі правядзення гульняў памеры, форме (грашовай ці натуральнай) і ў тэрмін, а калі тэрмін у гэтых умовах не ўказаны, – не пазней за дзесяць дзён з моманту прад'яўлення патрабавання аб выплаце выйгрышу.

5. У выпадку невыканання арганізатарам гульняў абавязку, указанага ў пункце 4 гэтага артыкула, удзельнік, які выйграў у латарэі, таталізатары ці іншых гульнях, мае права патрабаваць ад арганізатара гульняў выплаты выйгрышу, а таксама пакрыцця страт, прычыненых парушэннем дагавора з боку арганізатара.

ГЛАВА 58
АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ Ў ВЫНІКУ ПРЫЧЫНЕННЯ ШКОДЫ

§ 1. Агульныя палажэнні аб пакрыцці шкоды

Артыкул 933. Агульныя падставы адказнасці за прычыненне шкоды

1. Шкода, прычыненая асобе ці маёмасці грамадзяніна, а таксама шкода, прычыненая маёмасці юрыдычнай асобы, падлягае пакрыццю ў поўным аб'ёме асобай, якая прычыніла шкоду.

Законам можа быць ускладзены абавязак пакрыцця шкоды на асобу, якая не з'яўляецца прычыняльнікам шкоды.

Законам ці дагаворам можа быць устаноўлены абавязак прычыняльніка шкоды выплаціць пацярпеламу кампенсацыю звыш пакрыцця шкоды.

2. Асоба, якая прычыніла шкоду, вызваляецца ад пакрыцця шкоды, калі дакажа, што шкода прычынена не па яе віне. Законам можа быць прадугледжана пакрыццё шкоды і пры адсутнасці віны прычыняльніка.

3. Шкода, прычыненая правамернымі дзеяннямі, падлягае пакрыццю ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

У пакрыцці шкоды можа быць адмоўлена, калі шкода прычынена па просьбе ці са згоды пацярпелага, а дзеянні прычыняльніка не парушаюць маральных прынцыпаў грамадства.

Артыкул 934. Папярэджанне прычынення шкоды

1. Небяспека прычынення шкоды ў будучыні можа з’явіцца падставай да іску аб забароне дзейнасці, якая стварае такую небяспеку.

2. Калі прычыненая шкода з'яўляецца наступствам эксплуатацыі прадпрыемства, збудавання або іншай вытворчай дзейнасці, якая працягвае прычыняць шкоду ці пагражае новай шкодай, суд мае права абавязаць адказчыка, апрача пакрыцця шкоды, прыпыніць ці спыніць адпаведную дзейнасць.

Суд можа адмовіць у іску аб прыпыненні або спыненні адпаведнай дзейнасці толькі ў выпадку, калі яе прыпыненне ці спыненне супярэчыць дзяржаўным і грамадскім інтарэсам. Адмова ў прыпыненні ці спыненні такой дзейнасці не пазбаўляе пацярпелага права на пакрыццё шкоды, прычыненай гэтай дзейнасцю.

Артыкул 935. Прычыненне шкоды ў стане неабходнай абароны

Не падлягае пакрыццю шкода, прычыненая ў стане неабходнай абароны, калі пры гэтым не былі перавышаны яе межы.

Артыкул 936. Прычыненне шкоды ў стане крайняй неабходнасці

Шкоду, прычыненую ў стане крайняй неабходнасці, гэта значыць для ліквідацыі небяспекі, якая пагражае самому прычыняльніку ці іншым асобам, калі гэта небяспека пры гэтых абставінах не магла быць ліквідавана іншымі сродкамі, павінна пакрыць асоба, якая прычыніла шкоду.

Улічваючы акалічнасці, пры якіх была прычынена такая шкода, суд можа ўскласці абавязак яе пакрыцця на трэцюю асобу, у інтарэсах якой дзейнічала асоба, што прычыніла шкоду, або вызваліць ад пакрыцця шкоды поўнасцю ці часткова як гэту трэцюю асобу, так і асобу, якая прычыніла шкоду.

Артыкул 937. Адказнасць юрыдычнай асобы ці грамадзяніна за шкоду, прычыненую яе (яго) работнікам

1. Юрыдычная асоба або грамадзянін кампенсуе шкоду, прычыненую яе (яго) работнікам пры выкананні сваіх працоўных (службовых, пасадавых) абавязкаў.

Прымяняльна да правілаў, прадугледжаных гэтай главой, работнікамі прызнаюцца грамадзяне, якія выконваюць работу на падставе працоўнага дагавора (кантракта), а таксама грамадзяне, якія выконваюць работу па грамадзянска-прававым дагаворы, калі пры гэтым яны дзейнічалі ці павінны былі дзейнічаць па

заданні адпаведнай юрыдычнай асобы ці грамадзяніна і пад яе (яго)кантролем за бяспечным вядзеннем работ.

2. Гаспадарчыя суполкі і вытворчыя кааператывы кампенсуюць шкоду, прычыненую іх удзельнікамі (членамі) пры ажыццяўленні апошнімі прадпрымальніцкай, вытворчай ці іншай дзейнасці суполкі ці кааператыва.

Артыкул 938. Адказнасць за шкоду, прычыненую дзяржаўнымі органамі, органамі мясцовага кіравання і самакіравання, а таксама іх службовымі асобамі

Шкода, прычыненая грамадзяніну ці юрыдычнай асобе ў выніку незаконных дзеянняў (бяздзейнасці) дзяржаўных органаў, органаў мясцовага кіравання і самакіравання або службовых асоб гэтых органаў, у тым ліку ў выніку выдання неадпаведнага заканадаўству акта дзяржаўнага органа ці органа мясцовага кіравання і самакіравання, падлягае пакрыццю. Шкода кампенсуецца адпаведна за кошт казны Рэспублікі Беларусь ці казны адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі.

Артыкул 939. Адказнасць за шкоду, прычыненую незаконнымі дзеяннямі органаў крымінальнага пераследавання і суда

1. Шкода, прычыненая грамадзяніну ў выніку незаконнага асуджэння, прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння, прыцягнення ў якасці абвінавачванага, затрымання, утрымання пад вартай, хатняга арышту, прымянення падпіскі аб нявыездзе і належных паводзінах, часовага адхілення ад пасады, змяшчэння ў псіхіятрычную (псіханеўралагічную) установу, незаконнага накладання адміністрацыйнага спагнання ў выглядзе адміністрацыйнага арышту, папраўчых работ, кампенсуецца за кошт казны Рэспублікі Беларусь, а ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, – за кошт казны адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ў поўным аб'ёме незалежна ад віны службовых асоб органаў крымінальнага пераследавання і суда ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

2. Шкода, прычыненая грамадзяніну ці юрыдычнай асобе ў выніку незаконнай дзейнасці органаў крымінальнага пераследавання, якая не выклікала наступстваў, прадугледжаных пунктам 1 гэтага артыкула, кампенсуецца на падставах і ў парадку, прадугледжаным артыкулам 938 гэтага Кодэкса. Шкода, прычыненая пры ажыццяўленні правасуддзя, кампенсуецца ў выпадку, калі віна суддзі ўстаноўлена прыгаворам суда, які ўступіў у законную сілу.

Артыкул 940. Органы і асобы, якія выступаюць ад імя казны пры пакрыцці шкоды за яе кошт

У выпадках, калі ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства прычыненая шкода падлягае пакрыццю за кошт казны Рэспублікі Беларусь, казны адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, ад імя казны выступаюць адпаведныя фінансавыя органы, калі ў адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 125 гэтага Кодэкса гэты абавязак не ўскладзены на іншы орган, юрыдычную асобу ці грамадзяніна.

Артыкул 941. Пакрыццё шкоды асобай, якая застрахавала сваю адказнасць

Юрыдычная асоба ці грамадзянін, які застрахаваў сваю адказнасць у парадку добраахвотнага ці абавязковага страхавання на карысць пацярпелага (артыкул 823, пункт 1 артыкула 825), у выпадку, калі страхавога пакрыцця недастаткова для таго, каб поўнасцю кампенсаваць прычыненую шкоду, кампенсуюць розніцу паміж страхавым пакрыццём і фактычным памерам урону.

Артыкул 942. Адказнасць за шкоду, прычыненую непаўналетнім ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў

1. За шкоду, прычыненую непаўналетнім, які не дасягнуў чатырнаццаці гадоў (малалетнім), адказваюць яго бацькі, усынавіцелі ці апякун, калі не дакажуць, што шкода ўзнікла не па яго віне.

2. Калі малалетні, які мае патрэбу ў апецы, знаходзіўся ў арганізацыі, якая ў адпаведнасці з заканадаўствам з'яўляецца яго апекуном (арганізацыі аховы здароўя, установе адукацыі, установе сацыяльнага абслугоўвання, іншай арганізацыі), гэта арганізацыя абавязана кампенсаваць шкоду, прычыненую малалетнім, калі не дакажа, што шкода ўзнікла не па яго віне.

3. Калі малалетні прычыніў шкоду ў той час, калі знаходзіўся пад наглядам арганізацыі аховы здароўя, установы адукацыі ці іншай арганізацыі, абавязаных ажыццяўляць за ім нагляд, або асобы, якая ажыццяўляе нагляд на падставе дагавора, гэта арганізацыя або асоба адказваюць за шкоду, калі не дакажуць, што шкода ўзнікла не з-за недахопаў пры ажыццяўленні нагляду.

4. Абавязак бацькоў, усынавіцеляў, апекуна, арганізацыі аховы здароўя, установы адукацыі і іншай арганізацыі па пакрыцці шкоды не спыняецца з дасягненнем малалетнім паўналецця ці атрыманнем ім маёмасці, дастатковай для пакрыцця шкоды.

Калі бацькі, усынавіцелі, апякун або іншыя грамадзяне, указаныя ў пункце 3 гэтага артыкула, памерлі ці не маюць дастатковых сродкаў для пакрыцця шкоды, прычыненай жыццю ці здароўю пацярпелага, а сам прычыняльнік, які стаў поўнасцю дзеяздольным, валодае такімі сродкамі, суд з улікам маёмаснага становішча пацярпелага і прычыняльніка шкоды, а таксама іншых абставін мае права прыняць рашэнне аб пакрыцці шкоды поўнасцю ці часткова за кошт самога прычыняльніка шкоды.

Артыкул 943. Адказнасць за шкоду, прычыненую непаўналетнім ва ўзросце ад чатырнаццаці да васямнаццаці гадоў

1. Непаўналетні ва ўзросце ад чатырнаццаці да васямнаццаці гадоў самастойна нясе адказнасць за прычыненую шкоду на агульных падставах.

2. У выпадку, калі ў непаўналетняга ва ўзросце ад чатырнаццаці да васямнаццаці гадоў няма даходаў ці іншай маёмасці, дастатковых для пакрыцця шкоды, шкода павінна быць пакрыта поўнасцю ці ў частцы, якой не хапае, яго бацькамі, усынавіцелямі ці папячыцелем, калі яны не дакажуць, што шкода ўзнікла не па яго віне.

Калі непаўналетні ва ўзросце ад чатырнаццаці да васямнаццаці гадоў, які мае патрэбу ў апецы, знаходзіўся ў арганізацыі, якая ў адпаведнасці з заканадаўствам з'яўляецца яго папячыцелем (арганізацыі аховы здароўя, установе адукацыі, установе сацыяльнага абслугоўвання, іншай арганізацыі), гэта арганізацыя абавязана кампенсаваць шкоду поўнасцю ці ў частцы, якой не хапае, калі не дакажа, што шкода ўзнікла не па яго віне.

3. Абавязак бацькоў, усынавіцеляў, папячыцеля і адпаведнай арганізацыі па пакрыцці шкоды, прычыненай непаўналетнім ва ўзросце ад чатырнаццаці да васямнаццаці гадоў, спыняецца пасля дасягнення прычыняльнікам шкоды паўналецця, або ў выпадку, калі ў яго да дасягнення паўналецця з'явіліся даходы ці іншая маёмасць, дастатковыя для пакрыцця шкоды, або калі ён да дасягнення паўналецця набыў дзеяздольнасць.

Артыкул 944. Адказнасць бацькоў, пазбаўленых бацькоўскіх правоў, за шкоду, прычыненую непаўналетнім

На бацьку (маці), пазбаўленага(ай) бацькоўскіх правоў, суд можа ўскласці адказнасць за шкоду, прычыненую яго (яе) непаўналетнім дзіцём, на працягу трох гадоў пасля пазбаўлення бацькоўскіх правоў, калі паводзіны дзіцяці, якія выклікалі прычыненне шкоды, з'явіліся следствам неналежнага ажыццяўлення бацькоўскіх абавязкаў.

Артыкул 945. Адказнасць за шкоду, прычыненую грамадзянінам, прызнаным недзеяздольным

1. Шкоду, прычыненую грамадзянінам, прызнаным недзеяздольным, кампенсуюць яго апякун ці арганізацыя, абавязаная ажыццяўляць за ім нагляд, калі не дакажуць, што шкоду ўзнікла не па яго віне.

2. Абавязак апекуна ці арганізацыі, абавязанай ажыццяўляць нагляд, па пакрыцці шкоды, прычыненай грамадзянінам, прызнаным недзеяздольным, не спыняецца ў выпадку наступнага прызнання яго дзеяздольным.

3. Калі апякун памёр або не мае дастатковых сродкаў для пакрыцця шкоды, прычыненай жыццю ці здароўю пацярпелага, а сам прычыняльнік валодае такімі сродкамі, суд з улікам маёмаснага становішча пацярпелага і прычыняльніка, а таксама іншых абставін мае права прыняць рашэнне аб пакрыцці шкоды поўнасцю ці часткова за кошт самога прычыняльніка шкоды.

Артыкул 946. Адказнасць за шкоду, прычыненую грамадзянінам, прызнаным абмежавана дзеяздольным

Шкоду, прычыненую грамадзянінам, абмежаваным у дзеяздольнасці ў выніку злоўжывання спіртнымі напіткамі, наркатычнымі сродкамі, псіхатропнымі рэчывамі, іх аналагамі, кампенсуе сам прычыняльнік шкоды.

Артыкул 947. Адказнасць за шкоду, прычыненую грамадзянінам, не здольным разумець значэнне сваіх дзеянняў

1. Дзеяздольны грамадзянін, а таксама непаўналетні ва ўзросце ад чатырнаццаці да васямнаццаці гадоў, які прычыніў шкоду ў такім стане, калі ён не мог разумець значэнне сваіх дзеянняў ці кіраваць імі, не адказвае за прычыненую ім шкоду.

Калі шкода прычынена жыццю ці здароўю пацярпелага, суд можа з улікам маёмаснага становішча пацярпелага і прычыняльніка шкоды, а таксама іншых абставін ускласці абавязак па пакрыцці шкоды поўнасцю ці часткова на прычыняльніка шкоды.

2. Прычыняльнік шкоды не вызваляецца ад адказнасці, калі сам прывёў сябе выкарыстаннем спіртных напояў, наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў ці іншым спосабам у такі стан, у якім не мог разумець значэнне сваіх дзеянняў і кіраваць імі.

3. Калі шкоду прычыніла асоба, якая не магла разумець значэнне сваіх дзеянняў ці кіраваць імі ў выніку псіхічнага расстройства (захворвання), суд можа ўскласці абавязак кампенсаваць шкоду на пражываючых сумесна з гэтай асобай яе працаздольных сужэнца, бацькоў, дарослых дзяцей, якія ведалі аб псіхічным расстройстве (захворванні) прычыняльніка шкоды, але не ставілі пытанне аб прызнанні яго недзеяздольным.

Артыкул 948. Адказнасць за шкоду, прычыненую дзейнасцю, якая стварае павышаную небяспеку для навакольных

1. Юрыдычныя асобы і грамадзяне, дзейнасць якіх звязана з павышанай небяспекай для навакольных (выкарыстанне транспартных сродкаў, механізмаў, электрычнай энергіі высокага напружання, атамнай энергіі, выбухных рэчываў, моцнадзеючых ядаў і да т. п.; ажыццяўленне будаўнічай і іншай, звязанай з ёю дзейнасці і інш.), абавязаны кампенсаваць шкоду, прычыненую крыніцай павышанай небяспекі, калі не дакажуць, што шкода ўзнікла ў выніку непераадольнай сілы ці намеру пацярпелага. Уладальнік крыніцы павышанай небяспекі можа быць вызвалены судом ад адказнасці поўнасцю ці часткова таксама на падставах, прадугледжаных пунктамі 2 і 3 артыкула 952 гэтага Кодэкса.

Абавязак пакрыцця шкоды ўскладаецца на юрыдычную асобу ці грамадзяніна, якія валодаюць крыніцай павышанай небяспекі на праве ўласнасці або на іншай законнай падставе, у тым ліку на праве арэнды (за выключэннем арэнды транспартнага сродку з экіпажам (артыкул 611), па даверанасці на права кіравання транспартным сродкам, паводле распараджэння адпаведнага органа аб перадачы яму крыніцы павышанай небяспекі і да т. п.

2. Уладальнікі крыніц павышанай небяспекі салідарна нясуць адказнасць за шкоду, прычыненую ў выніку ўзаемадзеяння гэтых крыніц (сутыкнення транспартных сродкаў і да т. п.) трэцім асобам, на падставах, прадугледжаных пунктам 1 гэтага артыкула.

Шкода, прычыненая ў выніку ўзаемадзеяння крыніц павышанай небяспекі іх уладальнікам, кампенсуецца на агульных падставах (артыкул 933).

3. Уладальнік крыніцы павышанай небяспекі не адказвае за шкоду, прычыненую гэтай крыніцай, калі дакажа, што крыніца выбыла з яго валодання ў выніку проціпраўных дзеянняў іншых асоб. Адказнасць за шкоду, прычыненую крыніцай павышанай небяспекі, у такіх выпадках нясуць асобы, якая супрацьпраўна завалодалі крыніцай. Пры наяўнасці віны ўладальніка ў проціпраўным адабранні гэтай крыніцы з яго валодання адказнасць можа быць ускладзена як на ўладальніка, так і на асобу, якая супрацьпраўна завалодала крыніцай павышанай небяспекі.

Артыкул 949. Адказнасць за сумесна прычыненую шкоду

Асобы, якія сумесна прычынілі шкоду, адказваюць перад пацярпелым салідарна.

Па заяве пацярпелага і ў яго інтарэсах суд мае права ўскласці на асоб, якія сумесна прычынілі шкоду, адказнасць у долях, вызначыўшы іх у прымяненні да правілаў, прадугледжаных пунктам 2 артыкула 950 гэтага Кодэкса.

Артыкул 950. Права рэгрэсу да асобы, якая прычыніла шкоду

1. Асоба, якая кампенсавала шкоду, прычыненую іншай асобай (работнікам пры выкананні ім службовых, пасадавых ці іншых працоўных абавязкаў, асобай, якая кіруе транспартным сродкам і да т. п.), мае права адваротнага патрабавання (рэгрэсу) да гэтай асобы ў памеры выплачанага пакрыцця, калі іншы памер не вызначаны заканадаўствам, ці ў парадку, які ім устанаўліваецца.

2. Прычыняльнік шкоды, які кампенсаваў сумесна прычыненую шкоду, мае права патрабаваць з кожнага з прычыняльнікаў шкоды долю выплачанага пацярпеламу пакрыцця ў памеры, які адпавядае ступені віны гэтага прычыняльніка шкоды. Пры немагчымасці вызначэння ступені віны долі прызнаюцца роўнымі.

3. Рэспубліка Беларусь, адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі, якія кампенсавалі шкоду, прычыненую службовымі асобамі органаў крымінальнага пераследавання і суда (пункт 1 артыкула 939), маюць права рэгрэсу да гэтых асоб, калі віна такіх асоб устаноўлена прыгаворам суда, які ўступіў у законную сілу.

4. Асобы, якія кампенсавалі шкоду на падставах, указаных у артыкулах 942–945 гэтага Кодэкса, не маюць права рэгрэсу да асобы, якая прычыніла шкоду.

Артыкул 951. Спосабы пакрыцця шкоды

Задавальняючы патрабаванне аб пакрыцці шкоды, суд у адпаведнасці з абставінамі справы абавязвае асобу, адказную за прычыненне шкоды, кампенсаваць шкоду ў натуры (даць рэч таго ж роду і якасці, выправіць пашкоджаную рэч і да т. п.) ці кампенсаваць прычыненыя страты (пункт 2 артыкула 14).

Артыкул 952. Улік віны пацярпелага і маёмаснага становішча асобы, якая прычыніла шкоду

1. Шкода, якая ўзнікла ў выніку намеру пацярпелага, пакрыццю не падлягае.

2. Калі грубая неасцярожнасць самога пацярпелага садзейнічала ўзнікненню шкоды ці яе павелічэнню, у залежнасці ад ступені віны пацярпелага і прычыняльніка шкоды памер пакрыцця павінен быць зменшаны.

Пры грубай неасцярожнасці пацярпелага і адсутнасці віны прычыняльніка шкоды ў выпадках, калі яго адказнасць настае незалежна ад віны, памер пакрыцця павінен быць зменшаны ці ў пакрыцці шкоды можа быць адмоўлена, калі заканадаўствам не прадугледжана іншае. Пры прычыненні шкоды жыццю ці здароўю грамадзяніна адмова ў пакрыцці шкоды не дапускаецца.

Віна пацярпелага не ўлічваецца пры пакрыцці дадатковых расходаў (пункт 1 артыкула 954), пры пакрыцці шкоды ў сувязі са смерцю карміцеля (артыкул 958), а таксама пры пакрыцці расходаў на пахаванне (артыкул 963).

3. Суд можа зменшыць памер пакрыцця шкоды, прычыненай грамадзянінам, з улікам яго маёмаснага становішча, за выключэннем выпадкаў, калі шкода прычынена дзеяннямі, учыненымі наўмысна.

§ 2. Пакрыццё шкоды, прычыненай жыццю ці здароўю грамадзяніна

Артыкул 953. Пакрыццё шкоды, прычыненай жыццю ці здароўю грамадзяніна пры выкананні дагаворных або іншых абавязацельстваў

Шкода, прычыненая жыццю ці здароўю грамадзяніна пры выкананні дагаворных абавязацельстваў, а таксама пры выкананні абавязкаў ваеннай службы, службы ў органах унутраных спраў і іншых адпаведных абавязкаў, кампенсуецца па правілах, прадугледжаных гэтай главой, калі заканадаўствам ці дагаворам не прадугледжаны больш высокі памер адказнасці.

Артыкул 954. Аб'ём і характар пакрыцця шкоды, прычыненай пашкоджаннем здароўя

1. Пры прычыненні грамадзяніну калецтва ці іншага пашкоджання здароўя пакрыццю падлягаюць страчаны пацярпелым заробак (даход), які ён меў або павінен быў мець, а таксама дадаткова панесеныя расходы, выкліканыя пашкоджаннем здароўя, у тым ліку расходы на лячэнне, дадатковае харчаванне, набыццё лекавых сродкаў, пратэзаванне, чужы догляд, санаторна-курортнае лячэнне, набыццё тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі, падрыхтоўку да іншай прафесіі, калі выяўлена, што пацярпелы адчуваў патрэбу ў гэтых відах дапамогі і догляду і не мае правоў на іх бясплатнае атрыманне.

2. Пры вызначэнні страчанага заробку (даходу) пенсіі (акрамя пенсіі па інваліднасці, прызначанай пацярпеламу ў сувязі з адпаведным калецтвам ці іншым

пашкоджаннем здароўя), прызначаныя як да, так і пасля прычынення шкоды здароўю, не прымаюцца на ўвагу і не цягнуць за сабой змяншэння памеру шкоды (не залічваюцца ў кошт пакрыцця шкоды). У кошт пакрыцця шкоды не залічваецца таксама заробак (даход), які атрымлівае пацярпелы пасля пашкоджання здароўя.

3. Аб'ём і памер пакрыцця шкоды, належнага пацярпеламу ў адпаведнасці з гэтым артыкулам, могуць быць павялічаны на падставе заканадаўства ці дагавора.

Артыкул 955. Вызначэнне заробку (даходу), страчанага ў выніку пашкоджання здароўя

1. Памер падлеглага пакрыццю страчанага пацярпелым заробку (даходу) вызначаецца ў працэнтах да яго адкарэкціраванага ва ўстаноўленым парадку з улікам інфляцыі сярэдняга месячнага заробку (даходу) да калецтва ці іншага пашкоджання здароўя або да страты ім працаздольнасці, якія адпавядаюць ступені страты пацярпелым прафесійнай працаздольнасці, а пры адсутнасці прафесійнай працаздольнасці – ступені страты агульнай працаздольнасці.

2. У склад страчанага пацярпелым заробку (даходу) уключаюцца ўсе віды аплаты яго працы па працоўных і грамадзянска-прававых дагаворах, якія абкладаюцца падаходным падаткам з фізічных асоб. Не ўлічваюцца выплаты аднаразовага характару, у тым ліку выплаты, якія выплачваюцца пры звальненні, кампенсацыя за нявыкарыстаны працоўны водпуск і выхадная дапамога. Дапамога, выплачаная за перыяд часовай непрацаздольнасці і водпуску па цяжарнасці і родах, улічваецца. Даходы ад прадпрымальніцкай дзейнасці, дзейнасці, указанай у абзацах другім, трэцім, дванаццатым – трыццаць першым, трыццаць трэцім – сорак чацвёртым часткі чацвёртай пункта 1 артыкула 1 гэтага Кодэкса, а таксама аўтарская ўзнагарода ўключаюцца ў склад страчанага пацярпелым заробку (даходу).

Усе віды заробку (даходу) улічваюцца ў сумах, вызначаных да падаткаабкладання і вылічэння абавязковых страхавых узносаў у бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь.

3. Сярэднямесячны заробак (даход) пацярпелага вызначаецца шляхам дзялення агульнай сумы яго заробку (даходу) за дванаццаць месяцаў работы, якія папярэднічаюць прычыненню калецтва, страце або зніжэнню працаздольнасці ў сувязі з калецтвам (па выбару пацярпелага), на дванаццаць.

Сярэднямесячны даход пацярпелага, які ажыццяўляе прадпрымальніцкую дзейнасць, дзейнасць, указаную ў абзацах другім, трэцім, дванаццатым – трыццаць першым, трыццаць трэцім – сорак чацвёртым часткі чацвёртай пункта 1 артыкула 1 гэтага Кодэкса, вызначаецца шляхам дзялення агульнай сумы яго даходу за каляндарны год або чатыры кварталы дзейнасці, якія папярэднічаюць году (кварталу) прычынення калецтва, страты або зніжэння працаздольнасці ў сувязі з калецтвам (па выбару пацярпелага), на дванаццаць.

У выпадку прафесійнага захворвання сярэднямесячны заробак (даход) пацярпелага можа вызначацца таксама за дванаццаць апошніх месяцаў (каляндарны год, чатыры кварталы) работы, якія папярэднічаюць спыненню работы, якая выклікала такое захворванне.

У выпадку, калі пацярпелы да часу прычынення шкоды працаваў, ажыццяўляў прадпрымальніцкую дзейнасць, дзейнасць, указаную ў абзацах другім, трэцім, дванаццатым – трыццаць першым, трыццаць трэцім – сорак чацвёртым часткі чацвёртай пункта 1 артыкула 1 гэтага Кодэкса, менш дванаццаці месяцаў,

сярэднямесячны заробак (даход) вызначаецца шляхам дзялення агульнай сумы яго заробку (даходу) за фактычна прапрацаваную колькасць месяцаў на колькасць гэтых месяцаў. Не поўнасцю прапрацаваныя пацярпелым месяцы па яго жаданні замяняюцца папярэднімі поўнасцю прапрацаванымі месяцамі або выключаюцца з падліку пры немагчымасці іх замены.

4. У выпадку, калі пацярпелы на момант прычынення шкоды не працаваў, не ажыццяўляў прадпрымальніцкую дзейнасць, дзейнасць, указаную ў абзацах другім, трэцім, дванаццатым – трыццаць першым, трыццаць трэцім – сорак чацвёртым часткі чацвёртай пункта 1 артыкула 1 гэтага Кодэкса, улічваюцца па яго жаданні заробак (даход) да звальнення (спынення дзейнасці) або звычайны памер узнагароды работніка яго кваліфікацыі ў гэтай мясцовасці, але не менш чым устаноўлены заканадаўствам пяцікратны памер базавай велічыні.

5. Калі ў заробку (даходзе) пацярпелага да прычынення яму калецтва ці іншага пашкоджання здароўя адбыліся ўстойлівыя змяненні, якія паляпшаюць яго маёмасны стан (павышана заработная плата па займанай пасадзе, ён пераведзены на больш высокааплатную работу, прыняты на работу пасля атрымання адукацыі ў вочнай форме атрымання адукацыі і ў іншых выпадках, калі даказаны ўстойлівасць змянення ці магчымасць змянення заробку (даходу) пацярпелага), пры вызначэнні яго сярэднямесячнага заробку (даходу) улічваецца толькі заробак (даход), які ён атрымаў ці павінен быў атрымаць пасля адпаведнага змянення.

Артыкул 956. Пакрыццё шкоды пры пашкоджанні здароўя асобы, якая не дасягнула паўналецця

1. У выпадку калецтва ці іншага пашкоджання здароўя непаўналетняга, які не дасягнуў чатырнаццаці гадоў (малалетняга) і не мае заробку (даходу), асоба, адказная за прычыненую шкоду, абавязана кампенсаваць расходы, выкліканыя пашкоджаннем здароўя.

2. Пасля дасягнення малалетнім чатырнаццаці гадоў, а таксама ў выпадку прычынення шкоды непаўналетняму ва ўзросце ад чатырнаццаці да васямнаццаці гадоў, які не мае заробку (даходаў), асоба, адказная за прычыненую шкоду, абавязана кампенсаваць пацярпеламу апрача расходаў, выкліканых пашкоджаннем здароўя, таксама шкоду, звязаную са стратай ці змяншэннем яго працаздольнасці, зыходзячы з устаноўленага заканадаўствам пяцікратнага памеру базавай велічыні.

3. Калі да часу пашкоджання яго здароўя непаўналетні меў заробак, то шкода кампенсуецца зыходзячы з памеру гэтага заробку, але не ніжэй чым устаноўлены заканадаўствам пяцікратны памер базавай велічыні.

4. Пасля пачатку працоўнай дзейнасці непаўналетні, здароўю якога была раней прычынена шкода, мае права патрабаваць павелічэння памеру пакрыцця шкоды зыходзячы з заробку, які атрымліваецца ім, але не ніжэй чым памер узнагароды, устаноўленай па займанай ім пасадзе, ці заробку работніка той жа кваліфікацыі па месцы яго працы.

Артыкул 957. Пакрыццё шкоды асобам, якія панеслі ўрон у выніку смерці карміцеля

1. У выпадку смерці пацярпелага (карміцеля) права на пакрыццё шкоды маюць:

1) непрацаздольныя асобы, якія знаходзіліся на забеспячэнні памерлага ці мелі да дня яго смерці права на атрыманне ад яго ўтрымання;

2) дзіця памерлага, якое нарадзілася пасля яго смерці;

3) адзін з бацькоў, сужэнец або іншы член сям'і незалежна ад яго працаздольнасці, які не працуе і заняты доглядам за дзяцьмі, унукамі, братамі і сёстрамі памерлага, якія знаходзіліся на забеспячэнні памерлага і не дасягнулі чатырнаццаці гадоў або, хоць і дасягнулі ўказанага ўзросту, але паводле заключэння медыцынскіх органаў маюць патрэбу з-за стану здароўя ў староннім доглядзе;

4) асобы, якія знаходзіліся на забеспячэнні і сталі непрацаздольнымі на працягу пяці гадоў пасля яго смерці.

Адзін з бацькоў, сужэнец або іншы член сям'і, які не працуе і заняты доглядам за дзяцьмі, унукамі, братамі і сёстрамі памерлага і стаў непрацаздольным у перыяд ажыццяўлення догляду, захоўвае права на пакрыццё шкоды пасля заканчэння догляду за гэтымі асобамі.

2. Шкода кампенсуецца:

1) непаўналетнім – да дасягнення васямнаццаці гадоў;

2) навучэнцам, старэйшым за васямнаццаць гадоў – да атрымання адукацыі ў вочнай форме атрымання адукацыі, але не больш чым да дваццаці трох гадоў;

3) асобам, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, – пажыццёва;

4) інвалідам – на тэрмін інваліднасці;

5) аднаму з бацькоў, сужэнцу або іншаму члену сям'і, занятаму доглядам за дзяцьмі, унукамі, братамі і сёстрамі, якія знаходзіліся на забеспячэнні памерлага, – да дасягнення тымі чатырнаццаці гадоў або да змянення стану іх здароўя.

Артыкул 958. Памер пакрыцця шкоды, панесенай у выпадку смерці карміцеля

1. Асобам, якія маюць права на пакрыццё шкоды ў сувязі са смерцю карміцеля, шкода кампенсуецца ў памеры той долі заробку (даходу) памерлага, вызначанага па правілах артыкула 955 гэтага Кодэкса, якую яны атрымлівалі ці мелі права атрымліваць на сваё ўтрыманне пры яго жыцці. Пры вызначэнні пакрыцця шкоды гэтым асобам у склад даходаў памерлага нароўні з заробкам (даходам) уключаюцца пенсія, дажывоцце і іншыя падобныя выплаты, якія атрымліваліся ім пры жыцці.

2. Пры вызначэнні памеру пакрыцця шкоды пенсіі (акрамя адпаведных пенсій, прызначаных у сувязі са смерцю карміцеля), прызначаныя як да, так і пасля смерці карміцеля, а таксама заробак (даход) і стыпендыя, якія атрымліваюцца гэтымі асобамі, у кошт пакрыцця ім шкоды не залічваюцца.

3. Устаноўлены кожнаму з тых, хто мае права на пакрыццё шкоды ў сувязі са смерцю карміцеля, памер пакрыцця не падлягае далейшаму пераразліку, акрамя выпадкаў:

1) нараджэння дзіцяці пасля смерці карміцеля;

2) прызначэння ці спынення выплаты пакрыцця асобам, занятым доглядам за дзяцьмі, унукамі, братамі і сёстрамі памерлага карміцеля;

3) прызначэння выплаты пакрыцця шкоды асобам, якія знаходзіліся на забеспячэнні сталі непрацаздольнымі на працягу пяці гадоў пасля яго смерці.

Памер пакрыцця можа быць павялічаны на падставе заканадаўства ці дагавора.

Артыкул 959. Наступнае змяненне памеру пакрыцця шкоды

1. Пацярпелы, які часткова страціў працаздольнасць, мае права ў любы час запатрабаваць ад асобы, на якую ўскладзены абавязак пакрыцця шкоды, адпаведнага павелічэння памеру яе пакрыцця, калі працаздольнасць пацярпелага ў далейшым зменшылася ў сувязі з прычыненым пашкоджаннем здароўя ў параўнанні з той, якая была ў яго да моманту прысуджэння яму пакрыцця шкоды.

2. Асоба, на якую ўскладзены абавязак пакрыцця шкоды, прычыненай здароўю пацярпелага, мае права запатрабаваць адпаведнага змяншэння памеру пакрыцця, калі працаздольнасць пацярпелага ўзрасла ў параўнанні з той, якая была ў яго да моманту прысуджэння яму пакрыцця шкоды.

3. Пацярпелы мае права патрабаваць павелічэння памеру пакрыцця шкоды, калі маёмаснае становішча грамадзяніна, на якога ўскладзены абавязак пакрыцця шкоды, палепшылася, а памер пакрыцця быў зменшаны ў адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 952 гэтага Кодэкса.

4. Суд можа па патрабаванні грамадзяніна, які прычыніў шкоду, зменшыць памер пакрыцця шкоды, калі яго маёмаснае становішча ў сувязі з інваліднасцю або дасягненнем агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту пагоршылася ў параўнанні са становішчам на момант прысуджэння пакрыцця шкоды, за выключэннем выпадкаў, калі шкода была прычынена дзеяннямі, учыненымі наўмысна.

Артыкул 960. Павелічэнне пакрыцця шкоды ў сувязі з павышэннем кошту жыцця і павелічэннем базавай велічыні

1. Сумы пакрыцця, шкоды, прычыненай жыццю ці здароўю пацярпелага, якое выплачвае грамадзянін, пры павышэнні кошту жыцця падлягаюць індэксацыі ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

2. Пры павышэнні ўстаноўленага заканадаўствам памеру базавай велічыні сумы пакрыцця страчанага заробку (даходу), іншых выплат, прысуджаных у сувязі з пашкоджаннем здароўя ці смерцю пацярпелага, павялічваюцца прапарцыянальна ўказанаму павышэнню.

Артыкул 961. Выплаты на пакрыццё шкоды

1. Пакрыццё шкоды, выкліканай зніжэннем працаздольнасці ці смерцю пацярпелага, праводзіцца штомесячнымі плацяжамі.

Пры наяўнасці ўважлівых прычын суд з улікам магчымасцей прычыняльніка шкоды можа па патрабаванні грамадзяніна, які мае права на пакрыццё шкоды, прысудзіць яму належныя выплаты аднаразова, але не больш чым за тры гады.

2. Сумы ў пакрыццё дадатковых расходаў (пункт 1 артыкула 954) могуць быць прысуджаны на будучы час у межах тэрмінаў, якія вызначаюцца на аснове заключэння медыцынскай экспертызы, а таксама пры неабходнасці папярэдняй аплаты кошту адпаведных паслуг і маёмасці, у тым ліку набыцця пуцёўкі, аплаты праезду, аплаты тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі.

Артыкул 962. Пакрыццё шкоды ў выпадку спынення юрыдычнай асобы

1. У выпадку рэарганізацыі юрыдычнай асобы, прызнанай ва ўстаноўленым парадку адказнай за шкоду, прычыненую жыццю ці здароўю, абавязак па выплаце адпаведных плацяжоў нясе яе правапераемнік. Да яго ж прад'яўляюцца патрабаванні аб пакрыцці шкоды.

2. У выпадку ліквідацыі юрыдычнай асобы, прызнанай ва ўстаноўленым парадку адказнай за шкоду, прычыненую жыццю ці здароўю, адпаведныя плацяжы павінны быць капіталізаваны для выплаты іх пацярпеламу па правілах, устаноўленых заканадаўствам.

Заканадаўствам могуць быць устаноўлены і іншыя выпадкі, пры якіх можа быць праведзена капіталізацыя плацяжоў.

Артыкул 963. Пакрыццё расходаў на пахаванне

Асобы, адказныя за шкоду, выкліканую смерцю пацярпелага, абавязаны кампенсаваць неабходныя расходы на пахаванне асобе, якая панесла гэтыя расходы.

Дапамога на пахаванне, атрыманая грамадзянамі, які панеслі гэтыя расходы, у кошт пакрыцця шкоды не залічваецца.

§ 3. Пакрыццё шкоды, прычыненай у выніку недахопаў тавару, работы ці паслугі

Артыкул 964. Падставы пакрыцця шкоды, прычыненай у выніку недахопаў тавару, работы ці паслугі

Шкода, прычыненая жыццю, здароўю ці маёмасці грамадзяніна або маёмасці юрыдычнай асобы ў выніку канструктыўных, рэцэптурных ці іншых недахопаў тавару, работы ці паслугі, а таксама ў выніку недакладнай ці недастатковай інфармацыі аб тавары, рабоце ці паслузе, падлягае пакрыццю прадаўцом ці выробляльнікам тавару, асобай, якая выканала работу ці аказала паслугу (выканаўцам), незалежна ад іх віны і ад таго, знаходзіўся пацярпелы з імі ў дагаворных адносінах ці не.

Правілы, прадугледжаныя гэтым артыкулам, прымяняюцца толькі ў выпадках набыцця тавару, выканання работы ці аказання паслугі ў спажывецкіх мэтах, а не для выкарыстання ў прадпрымальніцкай дзейнасці.

Артыкул 965. Асобы, адказныя за шкоду, прычыненую ў выніку недахопаў тавару, работы ці паслугі

1. Шкода, прычыненая ў выніку недахопаў тавару, падлягае пакрыццю на выбар пацярпелага прадаўцом ці выробляльнікам тавару.

2. Шкода, прычыненая ў выніку недахопаў работы ці паслугі, падлягае пакрыццю асобай, якая выканала работу ці аказала паслугу (выканаўцам).

3. Шкода, прычыненая ў выніку непрадстаўлення поўнай ці дакладнай інфармацыі аб тавары, рабоце ці паслузе, падлягае пакрыццю асобамі, указанымі ў пунктах 1 і 2 гэтага артыкула.

Артыкул 966. Тэрміны пакрыцця шкоды, прычыненай у выніку недахопаў тавару, работы ці паслугі

1. Шкода, прычыненая ў выніку недахопаў тавару, работы ці паслугі, падлягае пакрыццю, калі яна ўзнікла на працягу ўстаноўленых тэрмінаў прыдатнасці тавару, работы ці паслугі, а калі тэрмін прыдатнасці ў адпаведнасці з заканадаўствам ці іншымі абавязковымі правіламі не ўстанаўліваецца, – на працягу дзесяці гадоў з дня вытворчасці тавару, выканання работы ці аказання паслугі.

2. За межамі тэрмінаў, указаных у пункце 1 гэтага артыкула, шкода падлягае пакрыццю, калі:

1) у парушэнне патрабаванняў акта заканадаўства ці іншых абавязковых правілаў тэрмін прыдатнасці не ўстаноўлены;

2) асоба, якой прададзены тавар, для якой выканана работа ці аказана паслуга, не была папярэджана аб неабходных дзеяннях пасля сканчэння тэрміну прыдатнасці і магчымых наступствах пры невыкананні ўказаных дзеянняў.

Артыкул 967. Падставы вызвалення ад адказнасці за шкоду, прычыненую ў выніку недахопаў тавару, работы ці паслугі

Прадавец ці вырабляльнік тавару, выканаўца работы ці паслугі вызваляюцца ад адказнасці ў выпадку, калі дакажуць, што шкода ўзнікла ў выніку непераадольнай сілы ці парушэння спажыўцом устаноўленых правілаў карыстання таварам, вынікамі работы, паслугі ці іх захоўвання.

§ 4. Кампенсацыя маральнай шкоды

Артыкул 968. Агульныя палажэнні

1. Падставы і памер кампенсацыі грамадзяніну маральнай шкоды вызначаюцца правіламі, прадугледжанымі гэтай главой і артыкулам 152 гэтага Кодэкса.

2. Маральная шкода, прычыненая дзеяннямі (бяздзейнасцю), якія парушаюць маёмасныя правы грамадзяніна, падлягае кампенсацыі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

3. Кампенсацыя маральнай шкоды ажыццяўляецца незалежна ад падлеглай пакрыццю маёмаснай шкоды.

Артыкул 969. Падставы кампенсацыі маральнай шкоды

Кампенсацыя маральнай шкоды ажыццяўляецца незалежна ад віны прычыняльніка шкоды ў выпадках, калі:

1) шкода прычынена жыццю ці здароўю грамадзяніна крыніцай павышанай небяспекі;

2) шкода прычынена грамадзяніну ў выніку незаконнага асуджэння, прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння, прыцягнення ў якасці абвінавачванага, затрымання, утрымання пад вартай, хатняга арышту, прымянення падпіскі аб нявыездзе і належных паводзінах, часовага адхілення ад пасады, змяшчэння ў псіхіятрычную (псіханеўралагічную) установу, незаконнага накладання адміністрацыйнага спагнання ў выглядзе адміністрацыйнага арышту, папраўчых работ;

3) шкода прычынена распаўсюджваннем звестак, якія не адпавядаюць рэчаіснасці і няславяць гонар, годнасць ці дзелавую рэпутацыю грамадзяніна;

4) у іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

Артыкул 970. Спосаб і памер кампенсацыі маральнай шкоды

1. Кампенсацыя маральнай шкоды ажыццяўляецца ў грашовай форме.

2. Памер кампенсацыі маральнай шкоды вызначае суд у залежнасці ад характару прычыненых пацярпеламу фізічных і духоўных пакут, а таксама ступені віны прычыняльніка шкоды ў выпадках, калі віна з'яўляецца падставай пакрыцця шкоды. Пры вызначэнні памеру кампенсацыі шкоды павінны ўлічвацца патрабаванні разумнасці і справядлівасці.

Характар фізічных і духоўных пакут суд ацэньвае з улікам фактычных абставін, пры якіх была прычынена маральная шкода, і індывідуальных асаблівасцей пацярпелага.

ГЛАВА 59
АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ Ў ВЫНІКУ БЕСПАДСТАЎНАГА АБАГАЧЭННЯ

Артыкул 971. Абавязак вярнуць беспадстаўнае абагачэнне

1. Асоба, якая без устаноўленых заканадаўствам ці здзелкай падстаў набыла ці зберагла маёмасць (пакупнік) за кошт іншай асобы (пацярпелага), абавязана вярнуць апошняй беспадстаўна набытую ці зберажоную маёмасць (беспадстаўнае абагачэнне), за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных артыкулам 978 гэтага Кодэкса.

2. Правілы, прадугледжаныя гэтай главой, прымяняюцца незалежна ад таго, з'явілася беспадстаўнае абагачэнне вынікам паводзін пакупніка маёмасці, самога пацярпелага, трэціх асоб ці адбылося апрача іх волі.

Артыкул 972. Суадносіны патрабаванняў аб вяртанні беспадстаўнага абагачэння з іншымі патрабаваннямі аб абароне грамадзянскіх правоў

Паколькі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам і не вынікае з сутнасці адпаведных адносін, правілы, прадугледжаныя гэтай главой, падлягаюць прымяненню таксама да патрабаванняў:

1) аб вяртанні выкананага па несапраўднай здзелцы;

2) аб выпатрабаванні маёмасці ўласнікам з чужога незаконнага валодання;

3) аднаго боку ў абавязацельстве да другога аб вяртанні выкананага ў сувязі з гэтым абавязацельствам;

4) аб пакрыцці шкоды, у тым ліку прычыненай нядобрасумленнымі паводзінамі асобы, якая абагацілася.

Артыкул 973. Вяртанне беспадстаўнага абагачэння ў натуры

1. Маёмасць, якая складае беспадстаўнае абагачэнне пакупніка, павінна быць вернута пацярпеламу ў натуры.

2. Пакупнік адказвае перад пацярпелым за ўсялякія, у тым ліку і за ўсялякія выпадковыя, недастачу ці пагаршэнне беспадстаўна набытай ці зберажонай маёмасці, якія адбыліся пасля таго, як ён даведаўся ці павінен быў даведацца аб беспадстаўнасці абагачэння. Да гэтага моманту ён адказвае толькі за намер і грубую неасцярожнасць.

Артыкул 974. Пакрыццё кошту беспадстаўнага абагачэння

1. У выпадку немагчымасці вярнуць у натуры беспадстаўна атрыманую ці зберажоную маёмасць пакупнік павінен кампенсаваць пацярпеламу сапраўдны кошт гэтай маёмасці на момант яе набыцця, а таксама страты, выкліканыя наступным змяненнем кошту маёмасці, калі пакупнік не кампенсаваў яе кошт неадкладна пасля таго, як даведаўся аб беспадстаўнасці абагачэння.

2. Асоба, якая часова беспадстаўна карысталася чужой маёмасцю без намеру яе набыць або чужымі паслугамі, павінна кампенсаваць пацярпеламу тое, што зберагла ў выніку такога карыстання, па цане, якая існавала ў час, калі скончылася карыстанне, і ў тым месцы, дзе яно адбывалася.

Артыкул 975. Наступствы беспадстаўнай перадачы права іншай асобе

Асоба, якая перадала шляхам уступкі патрабавання ці іншым чынам належнае ёй права іншай асобе на падставе неіснуючага ці несапраўднага абавязацельства, мае права патрабаваць аднаўлення ранейшага становішча, у тым ліку вяртання ёй дакументаў, якія сведчаць перададзенае права.

Артыкул 976. Пакрыццё пацярпеламу неатрыманых даходаў

1. Асоба, якая беспадстаўна атрымала ці зберагла маёмасць, абавязана вярнуць ці кампенсаваць пацярпеламу ўсе даходы, якія яна атрымала ці павінна была

атрымаць з гэтай маёмасці з таго часу, калі даведалася ці павінна была даведацца аб беспадстаўнасці абагачэння.

2. На суму беспадстаўнага грашовага абагачэння падлягаюць налічэнню працэнты за карыстанне чужымі сродкамі (артыкул 366) з таго часу, калі пакупнік даведаўся ці павінен быў даведацца аб беспадстаўнасці атрымання ці захавання грашовых сродкаў.

Артыкул 977. Пакрыццё затрат на маёмасць, якая падлягае вяртанню

Пры вяртанні беспадстаўна атрыманай ці зберажонай маёмасці (артыкул 973) або пры пакрыцці яе кошту (артыкул 974) пакупнік мае права патрабаваць ад пацярпелага пакрыцця панесеных неабходных затрат на ўтрыманне і захаванне маёмасці з таго часу, з якога ён абавязаны вярнуць даходы (артыкул 976), з залікам атрыманых ім выгад. Права на пакрыццё затрат губляецца ў выпадках, калі пакупнік наўмысна ўтрымліваў маёмасць, якая падлягала вяртанню.

Артыкул 978. Беспадстаўнае абагачэнне, не падлеглае вяртанню

Не падлягаюць вяртанню ў якасці беспадстаўнага абагачэння:

1) маёмасць, перададзеная ў выкананне абавязацельства да надыходу тэрміну выканання, калі абавязацельствам не прадугледжана іншае;

2) маёмасць, перададзеная ў выкананне абавязацельства пасля сканчэння тэрміну іскавай даўнасці;

3) заработная плата і прыраўнаваныя да яе плацяжы, пенсіі, дапамогі, стыпендыі, сумы па пакрыцці шкоды, прычыненай жыццю ці здароўю, аліменты і іншыя грашовыя сумы, дадзеныя грамадзяніну ў якасці сродку да існавання, пры адсутнасці несумленнасці з яго боку і падліковай памылкі;

4) грашовыя сумы і іншая маёмасць, дадзеныя ў выкананне неіснуючага абавязацельства, калі пакупнік дакажа, што асоба, якая патрабуе вяртання маёмасці, ведала аб адсутнасці абавязацельства або дала маёмасць у мэтах дабрачыннасці.

РАЗДЗЕЛ V
ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЯ ЎЛАСНАСЦЬ

ГЛАВА 60
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 979. Заканадаўства аб інтэлектуальнай уласнасці

Заканадаўства аб інтэлектуальнай уласнасці складаецца з гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства.

Артыкул 980. Аб'екты інтэлектуальнай уласнасці

Да аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці адносяцца:

1) вынікі інтэлектуальнай дзейнасці:

творы навукі, літаратуры і мастацтва;

выкананні, фанаграмы і перадачы арганізацый вяшчання;

вынаходкі, карысныя мадэлі, прамысловыя ўзоры;

селекцыйныя дасягненні;

тапалогіі інтэгральных мікрасхем;

сакрэты вытворчасці (ноу-хау);

2) сродкі індывідуалізацыі ўдзельнікаў грамадзянскага абароту, тавараў, работ ці паслуг:

фірменныя найменні;

таварныя знакі і знакі абслугоўвання;

геаграфічныя ўказанні;

3) іншыя вынікі інтэлектуальнай дзейнасці і сродкі індывідуалізацыі ўдзельнікаў грамадзянскага абароту, тавараў, работ ці паслуг у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

Артыкул 981. Падставы ўзнікнення правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці

Прававая ахова аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці ўзнікае паводле факта іх стварэння або ў выніку давання прававой аховы ўпаўнаважаным дзяржаўным органам у выпадках і ў парадку, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

Умовы давання прававой аховы сакрэтам вытворчасці (ноу-хау) вызначаюцца гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

Артыкул 982. Асабістыя немаёмасныя і маёмасныя правы на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці

1. Аўтарам вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці належаць у адносінах да гэтых вынікаў асабістыя немаёмасныя і маёмасныя правы.

Вытворцам фанаграм і арганізацыям вяшчання належаць у адносінах да гэтых аб'ектаў толькі маёмасныя правы.

Асабістыя немаёмасныя правы належаць аўтару незалежна ад яго маёмасных правоў і захоўваюцца за ім у выпадку пераходу яго маёмасных правоў на вынікі інтэлектуальнай дзейнасці да іншай асобы.

2. Уладальнікам права на сродкі індывідуалізацыі ўдзельнікаў грамадзянскага абароту, тавараў, работ ці паслуг (далей – сродкі індывідуалізацыі) належаць у адносінах да гэтых сродкаў маёмасныя правы.

3. Права аўтарства (права прызнавацца аўтарам выніку інтэлектуальнай дзейнасці) з'яўляецца асабістым немаёмасным правам і можа належаць толькі асобе, творчай працай якой створаны вынік інтэлектуальнай дзейнасці.

Права аўтарства неадчужальнае і неперадавальнае.

Калі вынік створаны сумеснай творчай працай дзвюх ці больш асоб, яны прызнаюцца суаўтарамі. У адносінах да асобных аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці заканадаўствам можа быць абмежавана кола асоб, якія прызнаюцца суаўтарамі твора ў цэлым.

Артыкул 983. Выключныя правы на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці

1. Уладальніку маёмасных правоў на вынік інтэлектуальнай дзейнасці (за выключэннем сакрэтаў вытворчасці (ноу-хау)) ці сродак індывідуалізацыі належыць выключнае права правамернага выкарыстання гэтага аб'екта інтэлектуальнай уласнасці па сваім меркаванні ў любой форме і любым спосабам.

Выкарыстанне іншымі асобамі аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, у адносінах да якіх іх праваўладальніку належыць выключнае права, дапускаецца толькі са згоды праваўладальніка.

2. Уладальнік выключнага права на аб'ект інтэлектуальнай уласнасці мае права перадаць гэта права іншай асобе поўнасцю ці часткова, дазволіць іншай асобе выкарыстоўваць аб'ект інтэлектуальнай уласнасці і мае права распарадзіцца ім іншым чынам, калі гэта не супярэчыць гэтаму Кодэксу ці іншаму закону.

3. Абмежаванні выключных правоў, у тым ліку шляхам давання магчымасці выкарыстання аб'екта інтэлектуальнай уласнасці іншым асобам, прызнанне гэтых

правоў несапраўднымі і іх спыненне (ануляванне) дапускаюцца ў выпадках, межах і парадку, устаноўленых гэтым Кодэксам ці іншым законам.

Абмежаванні выключных правоў дапускаюцца пры ўмове, што такія абмежаванні не наносяць урону нармальнаму выкарыстанню аб'екта інтэлектуальнай уласнасці і не ўшчамляюць неабгрунтаваным чынам законных інтарэсаў праваўладальнікаў.

Артыкул 984. Пераход выключных правоў да іншай асобы

1. Маёмасныя правы, якія належаць уладальніку выключных правоў на аб'ект інтэлектуальнай уласнасці, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам ці іншым законам, могуць быць перададзены праваўладальнікам поўнасцю ці часткова іншай асобе паводле дагавора, а таксама пераходзяць па спадчыне і ў парадку праваперaемства пры рэарганізацыі юрыдычнай асобы – праваўладальніка.

Перадача маёмасных правоў паводле дагавора або іх пераход у парадку ўніверсальнага праваперaемства не цягне за сабой перадачы ці абмежавання права аўтарства і іншых асабістых немаёмасных правоў. Умовы дагавора аб перадачы ці абмежаванні такіх правоў нікчэмныя.

2. Выключныя правы, якія перадаюцца паводле дагавора, павінны быць у ім вызначаны. Правы, якія не ўказаны ў дагаворы ў якасці правоў, якія перадаюцца, лічацца неперададзенымі, паколькі не даказана іншае.

3. Да дагавора, які прадугледжвае даванне выключных правоў у перыяд яго дзеяння іншай асобе на абмежаваны час, прымяняюцца правілы аб ліцэнзійным дагаворы (артыкул 985), калі іншае не прадугледжана законам.

Да дагавора, які прадугледжвае перадачу выключных правоў іншай асобе ў поўным аб'ёме на ўвесь тэрмін дзеяння выключнага права, прымяняюцца правілы аб дагаворы ўступкі выключнага права (артыкул 984[1]).

Артыкул 984[1]. Дагавор уступкі выключнага права

1. Паводле дагавора ўступкі выключнага права адзін бок (праваўладальнік) перадае належнае яму выключнае права на вынік інтэлектуальнай дзейнасці ці сродак індывідуалізацыі ўдзельнікаў грамадзянскага абароту, тавараў, работ ці паслуг у поўным аб'ёме другому боку.

2. Дагавор уступкі выключнага права павінен утрымліваць умову аб памеры ўзнагароды ці парадку яе вызначэння або прамое ўказанне на бязвыплатнасць гэтага дагавора.

3. Дагавор уступкі выключнага права заключаецца ў пісьмовай форме і падлягае рэгістрацыі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі. Незахаванне пісьмовай формы ці патрабавання аб рэгістрацыі цягне за сабой несапраўднасць дагавора.

4. Выключнае права на вынік інтэлектуальнай дзейнасці ці сродак індывідуалізацыі ўдзельнікаў грамадзянскага абароту, тавараў, работ ці паслуг пераходзіць ад праваўладальніка да другога боку з моманту заключэння дагавора ўступкі выключнага права, калі гэтым дагаворам не прадугледжана іншае. Выключнае права на вынік інтэлектуальнай дзейнасці ці сродак індывідуалізацыі ўдзельнікаў грамадзянскага абароту, тавараў, работ ці паслуг паводле дагавора ўступкі выключнага права, які падлягае рэгістрацыі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі, пераходзіць ад праваўладальніка да другога боку з моманту рэгістрацыі гэтага дагавора.

Артыкул 985. Ліцэнзійны дагавор

1. Па ліцэнзійным дагаворы бок, які валодае выключным правам выкарыстання аб'екта інтэлектуальнай уласнасці (ліцэнзіяр), дае іншаму боку (ліцэнзіяту) дазвол выкарыстоўваць адпаведны аб'ект інтэлектуальнай уласнасці.

Не дапускаецца бязвыплатнае даванне права выкарыстання аб'екта інтэлектуальнай уласнасці ў адносінах паміж камерцыйнымі арганізацыямі, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

Ліцэнзійны дагавор і змяненні ў ліцэнзійны дагавор рэгіструюцца ў патэнтным органе ў выпадках і парадку, які вызначаецца заканадаўствам.

2. Ліцэнзійны дагавор можа прадугледжваць даванне ліцэнзіяту:

1) права выкарыстання аб'екта інтэлектуальнай уласнасці з захаваннем за ліцэнзіярам права яго выкарыстання і права выдачы ліцэнзіі іншым асобам (простая, невыключная ліцэнзія);

2) права выкарыстання аб'екта інтэлектуальнай уласнасці з захаваннем за ліцэнзіярам права яго выкарыстання ў частцы, якая не перадаецца ліцэнзіяту, але без права выдачы ліцэнзіі іншым асобам (выключная ліцэнзія);

3) іншых відаў ліцэнзій, якія дапускаюцца заканадаўчымі актамі.

Калі ў ліцэнзійным дагаворы не прадугледжана іншае, ліцэнзія лічыцца простай (невыключнай).

3. Дагавор аб даванні ліцэнзіятам права выкарыстання аб'екта інтэлектуальнай уласнасці іншай асобе ў межах, якія вызначаюцца ліцэнзійным дагаворам, прызнаецца субліцэнзійным дагаворам. Ліцэнзіят мае права заключыць субліцэнзійны дагавор толькі ў выпадках, прадугледжаных ліцэнзійным дагаворам.

Адказнасць перад ліцэнзіярам за дзеянні субліцэнзіята нясе ліцэнзіят, калі ліцэнзійным дагаворам не прадугледжана іншае.

Артыкул 986. Дагавор аб стварэнні і выкарыстанні вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці

1. Аўтар можа прыняць на сябе паводле дагавора абавязацельства стварыць у будучыні твор, вынаходку ці іншы вынік інтэлектуальнай дзейнасці і даць заказчыку, які не з'яўляецца яго работадаўцам, выключныя правы на выкарыстанне гэтага выніку.

2. Дагавор, прадугледжаны ў пункце 1 гэтага артыкула, павінен вызначаць характар падлеглага стварэнню выніку інтэлектуальнай дзейнасці, а таксама мэты або спосабы яго выкарыстання.

3. Дагаворы, якія абавязваюць аўтара даваць якой-небудзь асобе выключныя правы на выкарыстанне любых вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці, якія гэты аўтар створыць у будучыні, нікчэмныя.

4. Умовы дагавора, якія абмяжоўваюць аўтара ў стварэнні ў будучыні вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці пэўнага роду або ў пэўнай галіне, прызнаюцца несапраўднымі.

Артыкул 987. Выключнае права і права ўласнасці

Выключнае права на вынік інтэлектуальнай дзейнасці ці сродак індывідуалізацыі існуе незалежна ад права ўласнасці на матэрыяльны аб'ект, у якім такі вынік ці сродак індывідуалізацыі выражаны.

Артыкул 988. Тэрмін дзеяння выключных правоў

1. Выключнае права на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці дзейнічае на працягу тэрміну, прадугледжанага гэтым Кодэксам ці іншым законам.

Закон можа прадугледжваць магчымасць працягвання такога тэрміну.

2. Асабістыя немаёмасныя правы ў адносінах да аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці ахоўваюцца бестэрмінова.

3. У выпадках, прадугледжаных законам, дзеянне выключнага права можа спыняцца ў выніку яго невыкарыстання на працягу пэўнага часу.

Артыкул 989. Спосабы абароны выключных правоў

1. Абарона выключных правоў ажыццяўляецца спосабамі, прадугледжанымі артыкулам 11 гэтага Кодэкса. Абарона выключных правоў можа ажыццяўляцца таксама шляхам:

1) адабрання матэрыяльных аб'ектаў, з дапамогай якіх парушаны выключныя правы, і матэрыяльных аб'ектаў, створаных у выніку такога парушэння;

2) абавязковай публікацыі аб дапушчаным парушэнні з уключэннем у яе звестак аб тым, каму належыць парушанае права;

3) іншымі спосабамі, прадугледжанымі законам.

2. Пры парушэнні дагавораў аб выкарыстанні вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці і сродкаў індывідуалізацыі прымяняюцца агульныя правілы аб адказнасці за парушэнне абавязацельстваў (глава 25).

ГЛАВА 61
АЎТАРСКАЕ ПРАВА І СУМЕЖНЫЯ ПРАВЫ

Артыкул 990. Прадмет рэгулявання

Гэты Кодэкс і прынятыя ў адпаведнасці з ім закон аб аўтарскім праве і сумежных правах і іншыя акты заканадаўства рэгулююць адносіны, якія ўзнікаюць у сувязі са стварэннем і выкарыстаннем твораў навукі, літаратуры, мастацтва (аўтарскае права), выканання, фанаграм, перадач арганізацый эфірнага ці кабельнага вяшчання (сумежныя правы).

Артыкул 991. Сфера дзеяння аўтарскага права

1. У адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства аўтарскае права распаўсюджваецца на творы навукі, літаратуры і мастацтва, якія існуюць у якой-небудзь аб'ектыўнай форме:

1) на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь незалежна ад грамадзянства (падданства) аўтараў і іх праваперaемнікаў;

2) за межамі Рэспублікі Беларусь, і прызнаецца за аўтарамі – грамадзянамі Рэспублікі Беларусь і іх праваперaемнікамі;

3) за межамі Рэспублікі Беларусь, і прызнаецца за аўтарамі – грамадзянамі (падданымі) іншых дзяржаў і іх праваперaемнікамі ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

2. Твор лічыцца апублікаваным у Рэспубліцы Беларусь, калі на працягу трыццаці дзён пасля даты першага апублікавання за межамі Рэспублікі Беларусь ён быў апублікаваны на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

3. Пры даванні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь аховы твора ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь уладальнік аўтарскіх правоў твора вызначаецца па заканадаўстве дзяржавы, на тэрыторыі якой мела месца дзеянне ці падзея, якая паслужыла падставай для валодання аўтарскім правам.

Артыкул 992. Аб'екты аўтарскага права

1. Аўтарскае права распаўсюджваецца на творы навукі, літаратуры і мастацтва, якія з'яўляюцца вынікам творчай дзейнасці, незалежна ад прызначэння і вартасці твора, а таксама ад спосабу яго выражэння.

2. Аўтарскае права распаўсюджваецца як на абнародаваныя, так і на неабнародаваныя творы, якія існуюць у якой-небудзь аб'ектыўнай форме:

1) пісьмовай (рукапіс, машынапіс, нотны запіс і г. д.);

2) вуснай (публічнае абвяшчэнне, публічнае выкананне і г. д.);

3) гука- ці відэазапісу (механічнага, магнітнага, лічбавага, аптычнага і г. д.);

4) адлюстравання (малюнак, эскіз, карціна, карта, план, чарцёж, кіна-, тэле-, відэа-, фотакадр і г. д.);

5) аб'ёмна-прасторавай (скульптура, мадэль, макет, збудаванне і г. д.);

6) у іншых формах.

3. Частка твора (уключаючы яго назву), якая задавальняе патрабаванням пункта 1 гэтага артыкула і можа выкарыстоўвацца самастойна, з'яўляецца аб'ектам аўтарскага права.

4. Аўтарскае права не распаўсюджваецца на ўласна ідэі, метады, працэсы, сістэмы, спосабы, канцэпцыі, прынцыпы, адкрыцці, факты.

5. Аўтарскае права на твор не звязана з правам уласнасці на матэрыяльны аб'ект, у якім твор выражаны.

Перадача права ўласнасці на матэрыяльны аб'ект ці права валодання матэрыяльным аб'ектам сама па сабе не цягне за сабой перадачы якіх-небудзь аўтарскіх правоў на твор, выражаны ў гэтым аб'екце, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам аб аўтарскіх і сумежных правах.

Артыкул 993. Творы, якія з'яўляюцца аб'ектамі аўтарскага права

1. Аб'ектамі аўтарскага права з'яўляюцца:

1) літаратурныя творы (кнігі, брашуры, артыкулы і інш.);

2) драматычныя і музычна-драматычныя творы, творы харэаграфіі і пантамімы і іншыя сцэнарныя творы;

3) музычныя творы з тэкстам і без тэксту;

4) аўдыёвізуальныя творы (кіна-, тэле-, відэафільмы, дыяфільмы і іншыя кіна- і тэлетворы);

5) творы скульптуры, жывапісу, графікі, літаграфіі і іншыя творы выяўленчага мастацтва;

6) творы прыкладнога мастацтва і дызайну;

7) творы архітэктуры, горадабудаўніцтва і садова-паркавага мастацтва;

8) фатаграфічныя творы, у тым ліку творы, атрыманыя спосабамі, аналагічнымі фатаграфіі;

9) карты, планы, эскізы, ілюстрацыі і пластычныя творы, якія адносяцца да геаграфіі, картаграфіі і іншых навук;

10) камп’ютарныя праграмы;

101) манаграфіі, артыкулы, справаздачы, навуковыя лекцыі і даклады, дысертацыі, канструктарская дакументацыя і іншыя творы навукі;

11) іншыя творы.

2. Ахова камп’ютарных праграм распаўсюджваецца на ўсе віды камп’ютарных праграм (у тым ліку аперацыйныя сістэмы), якія могуць быць выражаны на любой мове і ў любой форме, уключаючы зыходны тэкст і аб'ектны код.

3. Да аб'ектаў аўтарскага права таксама адносяцца:

1) вытворныя творы (пераклады, апрацоўкі, анатацыі, рэфераты, рэзюмэ, агляды, інсцэніроўкі, музычныя аранжыроўкі і іншыя перапрацоўкі твораў навукі, літаратуры і мастацтва);

2) зборнікі (энцыклапедыі, анталогіі, базы даных) і іншыя састаўныя творы, якія ўяўляюць сабой па падборы ці размяшчэнні матэрыялаў вынік творчай працы.

Вытворныя і састаўныя творы ахоўваюцца аўтарскім правам незалежна ад таго, ці з'яўляюцца аб'ектам аўтарскага права творы, на якіх яны заснаваны ці якія яны ўключаюць.

Артыкул 994. Аб'екты сумежных правоў

Сумежныя правы распаўсюджваюцца на выкананні, фанаграмы, перадачы арганізацый эфірнага і кабельнага вяшчання.

Для ўзнікнення і ажыццяўлення сумежных правоў не патрабуецца захавання якіх-небудзь фармальнасцей.

Артыкул 995. Сфера дзеяння сумежных правоў

1. Правы выканаўцы прызнаюцца за ім у адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства аб аўтарскіх і сумежных правах, калі:

1) выканаўца з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь;

2) выкананне ўпершыню мела месца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

3) выкананне запісана на фанаграму ў адпаведнасці з пунктам 2 гэтага артыкула;

4) выкананне, не запісанае на фанаграму, уключана ў перадачу ў эфір ці па кабелі ў адпаведнасці з пунктам 3 гэтага артыкула;

5) у іншых выпадках, прадугледжаных міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

2. Правы вытворцы фанаграмы прызнаюцца за ім у адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства аб аўтарскіх і сумежных правах, калі:

1) вытворца фанаграмы з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь ці юрыдычнай асобай, якая мае афіцыйнае месцазнаходжанне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

2) фанаграма ўпершыню апублікавана на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

3) у іншых выпадках, прадугледжаных міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

3. Правы арганізацыі эфірнага ці кабельнага вяшчання прызнаюцца за ёй у адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства аб аўтарскіх і сумежных правах у выпадку, калі арганізацыя мае афіцыйнае месцазнаходжанне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і ажыццяўляе перадачы з перадатчыкаў, размешчаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

ГЛАВА 62
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ АБ ПРАВЕ ПРАМЫСЛОВАЙ УЛАСНАСЦІ

Артыкул 996. Прадмет рэгулявання

Гэты Кодэкс і прынятыя ў адпаведнасці з ім законы рэгулююць адносіны, якія ўзнікаюць у сувязі са стварэннем і выкарыстаннем вынаходак, карысных мадэляў, прамысловых узораў, селекцыйных дасягненняў і з аховай сакрэтаў вытворчасці (ноу-хау), сродкаў індывідуалізацыі ўдзельнікаў грамадзянскага абароту, тавараў, работ, паслуг (фірменных найменняў, таварных знакаў і знакаў абслугоўвання, геаграфічных указанняў).

Артыкул 997. Заканадаўства аб праве прамысловай уласнасці

Заканадаўства аб праве прамысловай уласнасці складаецца з гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства.

Артыкул 998. Аб'екты права прамысловай уласнасці

Права прамысловай уласнасці распаўсюджваецца на:

1) вынаходкі;
2) карысныя мадэлі;
3) прамысловыя ўзоры;
4) селекцыйныя дасягненні;
5) тапалогіі інтэгральных мікрасхем;
6) сакрэты вытворчасці (ноу-хау);
7) фірменныя найменні;
8) таварныя знакі і знакі абслугоўвання;
9) геаграфічныя ўказанні;
10) іншыя аб'екты прамысловай уласнасці і сродкі індывідуалізацыі ўдзельнікаў грамадзянскага абароту, тавараў, работ ці паслуг у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

ГЛАВА 63
ПРАВА НА ВЫНАХОДКУ, КАРЫСНУЮ МАДЭЛЬ, ПРАМЫСЛОВЫ УЗОР

Артыкул 999. Прававая ахова вынаходкі, карыснай мадэлі, прамысловага ўзору

Права на вынаходку, карысную мадэль, прамысловы ўзор ахоўваецца дзяржавай і сведчыцца патэнтам.

Артыкул 1000. Умовы прававой аховы вынаходкі, карыснай мадэлі, прамысловага ўзору

1. Правы на вынаходку, карысную мадэль і прамысловы ўзор ахоўваюцца пры ўмове выдачы патэнта.

2. Вынаходкай, якой даецца прававая ахова, прызнаецца тэхнічнае рашэнне ў любой галіне, якое датычыцца прадукту ці спосабу, а таксама прымянення прадукту ці спосабу па пэўным прызначэнні, якое з'яўляецца новым, мае вынаходніцкі ўзровень і прамыслова прымянімае.

3. Карыснай мадэллю, якой даецца прававая ахова, прызнаецца тэхнічнае рашэнне, якое датычыцца прылад і з'яўляецца новым і прамыслова прыдатным.

4. Прамысловым узорам, якому даецца прававая ахова, прызнаецца мастацкае ці мастацка-канструктарскае рашэнне вырабу, якое вызначае яго знешні выгляд і з'яўляецца новым і арыгінальным.

5. Патрабаванні, што прад'яўляюцца да вынаходкі, карыснай мадэлі, прамысловага ўзору, пры якіх узнікае права на атрыманне патэнта, і парадак яго выдачы патэнтным органам устанаўліваюцца заканадаўствам.

Артыкул 1001. Выключнае права на вынаходку, карысную мадэль, прамысловы ўзор

1. Патэнтаўладальніку належыць выключнае права на вынаходку, карысную мадэль, прамысловы ўзор.

Выключнае права на вынаходку, карысную мадэль, прамысловы ўзор уключае права выкарыстоўваць іх па сваім меркаванні, калі гэта не парушае правоў іншых асоб, дазваляць ці забараняць іх выкарыстанне іншым асобам.

2. Іншыя асобы не маюць права выкарыстоўваць вынаходку, карысную мадэль, прамысловы ўзор без дазволу патэнтаўладальніка, за выключэннем выпадкаў, калі выкарыстанне ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам ці іншым законам не прызнаецца парушэннем выключнага права патэнтаўладальніка.

3. Парушэннем выключнага права патэнтаўладальніка прызнаюцца ажыццёўленыя без яго згоды:

выраб, прымяненне, увоз, прапанова да продажу, продаж, іншае ўвядзенне ў грамадзянскі абарот ці захоўванне для гэтых мэт прадукту, у якім прыменена вынаходка, прылады, у якой прыменена карысная мадэль, вырабу, які ўтрымлівае прамысловы ўзор, а таксама здзяйсненне названых дзеянняў у адносінах да прылады, пры функцыянаванні ці эксплуатацыі якой у адпаведнасці з яе прызначэннем аўтаматычна ажыццяўляецца спосаб, які ахоўваецца патэнтам на вынаходку;

прымяненне спосабу, які ахоўваецца патэнтам на вынаходку, ці ўвядзенне ў грамадзянскі абарот або захоўванне для гэтых мэт прадукту, выробленага непасрэдна спосабам, які ахоўваецца патэнтам на вынаходку. Пры гэтым, калі ўказаны прадукт з'яўляецца новым, любы ідэнтычны продукт лічыцца атрыманым запатэнтаваным спосабам, пакуль не даказана адваротнае.

Артыкул 1002. Тэрмін дзеяння патэнта

1. Тэрмін дзеяння патэнта лічыцца з даты падачы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходку, карысную мадэль, прамысловы ўзор у патэнтны орган і пры ўмове захавання патрабаванняў, устаноўленых заканадаўствам, складае:

1) на вынаходку – дваццаць гадоў. Калі з даты падачы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходку, якая адносіцца да лекавага сродку, пестыцыду ці аграхімікату, для прымянення якіх у адпаведнасці з заканадаўствам патрабуецца іх дзяржаўная рэгістрацыя, да даты першапачатковай дзяржаўнай рэгістрацыі прайшло больш пяці гадоў, тэрмін дзеяння патэнта на гэту вынаходку працягваецца патэнтным органам паводле хадайніцтве патэнтаўладальніка. Тэрмін дзеяння патэнта працягваецца на час, які прайшоў з даты падачы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходку да даты першапачатковай дзяржаўнай рэгістрацыі лекавага сродку, пестыцыду ці аграхімікату, у якіх выкарыстана вынаходка, за вылікам пяці гадоў. Пры гэтым тэрмін дзеяння патэнта не можа быць працягнуты больш чым на пяць гадоў. Хадайніцтва аб працягванні тэрміну дзеяння патэнта падаецца ў перыяд дзеяння патэнта да сканчэння шасці месяцаў з даты першапачатковай дзяржаўнай рэгістрацыі лекавага сродку, пестыцыду ці аграхімікату, у якіх выкарыстана

вынаходка, ці даты публікацыі звестак аб патэнце ў афіцыйным бюлетэні патэнтнага органа ў залежнасці ад таго, які з гэтых тэрмінаў канчаецца пазней;

2) на карысную мадэль – пяць гадоў з магчымым працягваннем гэтага тэрміну патэнтным органам па хадайніцтве патэнтаўладальніка, але не больш чым на пяць гадоў. Хадайніцтва аб працягванні тэрміну дзеяння патэнта на карысную мадэль падаецца ў патэнтны орган да сканчэння тэрміну дзеяння патэнта;

3) на прамысловы ўзор – дзесяць гадоў з магчымым працягваннем гэтага тэрміну патэнтным органам па хадайніцтве патэнтаўладальніка, але не больш чым на пяць гадоў. Хадайніцтва аб працягванні тэрміну дзеяння патэнта на прамысловы ўзор падаецца ў патэнтны орган да сканчэння тэрміну дзеяння патэнта.

2. Ахова вынаходкі, карыснай мадэлі, прамысловага ўзору дзейнічае з даты падачы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходку, карысную мадэль, прамысловы ўзор у патэнтны орган. Абарона правоў можа быць ажыццёўлена толькі пасля выдачы патэнта. У выпадку адмовы ў выдачы патэнта лічыцца, што ахова не пачалася.

3. Прыярытэт вынаходкі, карыснай мадэлі, прамысловага ўзору вызначаецца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам.

ГЛАВА 64
ПРАВЫ НА САРТЫ РАСЛІН І ПАРОДЫ ЖЫВЁЛ

Артыкул 1003. Умовы аховы правоў на сарты раслін і пароды жывёл

1. Правы на сарты раслін і пароды жывёл (селекцыйныя дасягненні) ахоўваюцца пры ўмове выдачы патэнта.

Селекцыйным дасягненнем у раслінаводстве прызнаецца сорт расліны, гэта значыць група раслін у рамках найніжэйшага з вядомых батанічных таксонаў, якая можа быць вызначана ступенню праяўлення прыкмет, якая з’яўляецца вынікам рэалізацыі гэтага генатыпу ці камбінацыі генатыпаў, адрозніваецца ад любой іншай групы раслін ступенню выражанасці прынамсі адной з гэтых прыкмет і можа разглядацца як адзінае цэлае з пункта гледжання яе прыдатнасці для ўзнаўлення ў нязменным выглядзе цэлых раслін гэтай групы.

Селекцыйным дасягненнем у жывёлаводстве прызнаецца парода, гэта значыць цэласная шматлікая група жывёл агульнага паходжання, якая створана чалавекам і мае генеалагічную структуру і ўласцівасці, якія дазваляюць адрозніць яе ад іншых пародаў жывёл гэтага ж віду, і колькасна дастатковая для размнажэння ў якасці адной пароды.

2. Патрабаванні, пры якіх узнікае права на атрыманне патэнта на селекцыйнае дасягненне, і парадак выдачы такога патэнта ўстанаўліваюцца заканадаўствам.

Артыкул 1004. Права аўтара вызначаць найменне селекцыйнага дасягнення

1. Аўтар селекцыйнага дасягнення мае права вызначыць яго найменне, якое павінна адпавядаць патрабаванням, устаноўленым заканадаўствам аб селекцыйных дасягненнях.

2. Пры вытворчасці, узнаўленні, прапанове да продажу, продажы і іншых відах збыту селекцыйных дасягненняў, якія ахоўваюцца, прымяненне зарэгістраваных для іх найменняў абавязковае. Прысваенне выробленаму і (ці) прадаванаму насенню,

племянному матэрыялу наймення, якое адрозніваецца ад зарэгістраванага, не дапускаецца.

3. Прысваенне наймення зарэгістраванага селекцыйнага дасягнення выробленаму і прадаванаму насенню і племянному матэрыялу, якія не адносяцца да яго, з'яўляецца парушэннем правоў патэнтаўладальніка і аўтара селекцыйнага дасягнення.

Артыкул 1005. Правы ўладальніка патэнта на селекцыйнае дасягненне

Уладальніку патэнта на селекцыйнае дасягненне належыць выключнае права на гэта дасягненне ў межах, устаноўленых законам.

Артыкул 1006. Тэрмін дзеяння патэнта на селекцыйнае дасягненне

Дзеянне патэнта на селекцыйнае дасягненне пачынаецца з даты рэгістрацыі дасягнення ў дзяржаўным рэестры селекцыйных дасягненняў, якія ахоўваюцца, і доўжыцца дваццаць гадоў.

Законам могуць быць устаноўлены больш працяглыя тэрміны дзеяння патэнта для асобных відаў селекцыйных дасягненняў.

ГЛАВА 65
ПРАВА НА ТАПАЛОГІЮ ІНТЭГРАЛЬНАЙ МІКРАСХЕМЫ

Артыкул 1007. Паняцце тапалогіі інтэгральнай мікрасхемы

Тапалогіяй інтэгральнай мікрасхемы з'яўляецца зафіксаванае на матэрыяльным носьбіце прасторава-геаметрычнае размяшчэнне сукупнасці элементаў інтэгральнай схемы і сувязяў паміж імі.

Артыкул 1008. Умовы прававой аховы тапалогій інтэгральных мікрасхем

1. Прававая ахова распаўсюджваецца толькі на арыгінальную тапалогію інтэгральнай мікрасхемы.

Арыгінальнай з'яўляецца тапалогія інтэгральнай мікрасхемы, створаная ў выніку творчай працы аўтара. Тапалогія прызнаецца арыгінальнай да таго часу, пакуль не даказана адваротнае.

2. Тапалогіі інтэгральнай мікрасхемы, сукупнасць элементаў якой вядомая аўтару і (ці) спецыялістам у галіне распрацоўкі тапалогій на дату яе стварэння, прававая ахова не даецца, калі іншае не ўстаноўлена пунктам 3 гэтага артыкула.

3. Тапалогіі інтэгральнай мікрасхемы, якая складаецца з элементаў, што вядомыя аўтару і (ці) спецыялістам у галіне распрацоўкі тапалогій на дату яе стварэння, даецца прававая ахова толькі ў тым выпадку, калі прасторава-геаметрычнае распалажэнне сукупнасці такіх элементаў і сувязяў паміж імі ў цэлым адпавядае ўмове арыгінальнасці.

Артыкул 1009. Рэгуляванне адносін, звязаных са стварэннем і выкарыстаннем тапалогій інтэгральных мікрасхем

Адносіны, звязаныя са стварэннем, аховай і выкарыстаннем тапалогій інтэгральных мікрасхем, рэгулююцца гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства аб прававой ахове тапалогій інтэгральных мікрасхем.

ГЛАВА 66
ПРАВА НА АБАРОНУ САКРЭТУ ВЫТВОРЧАСЦІ (НОУ-ХАУ) АД НЕЗАКОННАГА ВЫКАРЫСТАННЯ

Артыкул 1010. Умовы прававой аховы сакрэту вытворчасці (ноу-хау)

1. Асоба, якая правамерна валодае звесткамі, што складаюць сакрэт вытворчасці (ноу-хау), мае права на абарону гэтых звестак ад незаконнага выкарыстання.

2. Звесткі, якія складаюць сакрэт вытворчасці (ноу-хау), ахоўваюцца ў рэжыме камерцыйнай тайны ў выпадку, калі яны адпавядаюць патрабаванням, вызначаным пунктам 2 артыкула 140 гэтага Кодэкса. Права на абарону такіх звестак узнікае незалежна ад выканання ў адносінах да гэтых звестак якіх-небудзь фармальнасцей (рэгістрацыі, атрымання пасведчання і да т. п.).

Артыкул 1011. Адказнасць за незаконнае выкарыстанне сакрэту вытворчасці (ноу-хау)

1. Асоба, якая правамерна валодае сакрэтам вытворчасці (ноу-хау), мае права запатрабаваць ад асобы, якая незаконна яго выкарыстоўвае, неадкладнага спынення такога выкарыстання, а таксама мае права выкарыстоўваць іншыя спосабы абароны, прадугледжаныя заканадаўствам.

2. У выпадку выкарыстання сакрэту вытворчасці (ноу-хау) асобай, якая ў адпаведнасці з заканадаўствам з'яўляецца добрасумленным пакупніком, суд з улікам сродкаў, зрасходаваных такой асобай на выкарыстанне сакрэту вытворчасці (ноу-хау), можа дазволіць яго далейшае выкарыстанне на ўмовах платнасці.

3. Асоба, якая самастойна і правамерна атрымала звесткі, што складаюць сакрэт вытворчасці (ноу-хау), мае права выкарыстоўваць гэтыя звесткі незалежна ад правоў уладальніка адпаведнага сакрэту вытворчасці (ноу-хау) і не адказвае перад ім за такое выкарыстанне.

Артыкул 1012. Распараджэнне сакрэтам вытворчасці (ноу-хау)

Асоба, якая валодае сакрэтам вытворчасці (ноу-хау), можа перадаць усё ці частку звестак, якія складаюць яго, іншай асобе паводле дагавора.

ГЛАВА 67
СРОДКІ ІНДЫВІДУАЛІЗАЦЫІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ГРАМАДЗЯНСКАГА АБАРОТУ, ТАВАРАЎ, РАБОТ ЦІ ПАСЛУГ

§ 1. Фірменнае найменне

Артыкул 1013. Права на фірменнае найменне

1. Юрыдычная асоба мае выключнае права выкарыстоўваць фірменнае найменне на таварах, іх упакоўцы, у рэкламе, шыльдах, праспектах, рахунках, друкаваных выданнях, афіцыйных бланках і іншай дакументацыі, звязанай з яе дзейнасцю, а таксама пры дэманстрацыі тавараў на выстаўках і кірмашах, якія праводзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

2. Фірменнае найменне юрыдычнай асобы вызначаецца пры зацвярджэнні яе статута і падлягае рэгістрацыі шляхам уключэння ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў.

3. Не можа быць зарэгістравана фірменнае найменне юрыдычнай асобы, падобнае на ўжо зарэгістраванае настолькі, што гэта можа прывесці да атаясамлення адпаведных юрыдычных асоб.

Артыкул 1014. Выкарыстанне фірменнага наймення юрыдычнай асобы ў таварным знаку

Фірменнае найменне юрыдычнай асобы можа быць выкарыстана ў належным ёй таварным знаку.

Артыкул 1015. Дзеянне права на фірменнае найменне

1. На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дзейнічае выключнае права на найменне, зарэгістраванае ў Рэспубліцы Беларусь у якасці знака юрыдычнай асобы.

На найменне, зарэгістраванае ці агульнапрызнанае ў замежнай дзяржаве, выключнае права на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дзейнічае ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

2. Дзеянне права на фірменнае найменне спыняецца з ліквідацыяй юрыдычнай асобы ці са змяненнем яе фірменнага наймення.

Артыкул 1016. Адчужэнне права на фірменнае найменне

1. Адчужэнне і пераход права на фірменнае найменне юрыдычнай асобы не дапускаецца, акрамя выпадкаў рэарганізацыі юрыдычнай асобы ці адчужэння прадпрыемства ў цэлым.

2. Уладальнік права на фірменнае найменне можа дазволіць іншай асобе выкарыстанне свайго наймення (выдаць ліцэнзію). Аднак пры гэтым у ліцэнзійным дагаворы павінны быць абумоўлены меры, якія выключаюць увядзенне спажыўца ў зман.

§ 2. Таварны знак і знак абслугоўвання

Артыкул 1017. Паняцце таварнага знака і знака абслугоўвання

1. Таварным знакам і знакам абслугоўвання (далей – таварны знак) прызнаецца знак, якая спрыяе адрозненню тавараў, работ і (ці) паслуг адной асобы ад аднародных тавараў, работ і (ці) паслуг іншых асоб.

2. У якасці таварных знакаў могуць быць зарэгістраваны слоўныя абазначэнні, уключаючы імёны ўласныя, спалучэнні колераў, літарныя, лічбавыя, выяўленчыя, аб'ёмныя адзнакі, уключаючы форму тавару ці яго ўпакоўку, а таксама камбінацыі такіх знакаў. Іншыя абазначэнні могуць быць зарэгістраваны ў якасці таварных знакаў у выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

3. Таварны знак можа быць зарэгістраваны ў любым колеры ці колеравым спалучэнні.

Артыкул 1018. Прававая ахова таварнага знака

1. Прававая ахова таварнага знака на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца на падставе яго рэгістрацыі ў патэнтным органе ў парадку, устаноўленым заканадаўствам аб таварных знаках, ці паводле міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

2. Права на таварны знак ахоўваецца дзяржавай і сведчыцца пасведчаннем.

3. Пасведчанне на таварны знак сведчыць прыярытэт таварнага знака, выключнае права ўладальніка на таварны знак у адносінах да тавараў, работ і (ці) паслуг, указаных у пасведчанні, і ўтрымлівае адлюстраванне таварнага знака.

Артыкул 1019. Выключнае права на таварны знак

1. Уладальнік таварнага знака мае выключнае права выкарыстоўваць таварны знак і распараджацца гэтым выключным правам, а таксама права забараняць выкарыстанне таварнага знака іншым асобам.

2. Ніхто не можа выкарыстоўваць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь таварны знак, які ахоўваецца, без дазволу яго ўладальніка.

Артыкул 1020. Тэрмін дзеяння рэгістрацыі

1. Рэгістрацыя таварнага знака дзейнічае на працягу дзесяці гадоў з даты паступлення заяўкі ў патэнтны орган.

2. Тэрмін дзеяння рэгістрацыі таварнага знака можа быць працягнуты неабмежаваную колькасць разоў па заяве ўладальніка, пададзенай на працягу апошняга года яе дзеяння, штораз на дзесяць гадоў.

Артыкул 1021. Калектыўны знак

1. Аб'яднанне асоб, стварэнне і дзейнасць якога не супярэчаць заканадаўству дзяржавы, у якой яно створана, мае права зарэгістраваць у Рэспубліцы Беларусь калектыўны знак, прызначаны для абазначэння тавараў, якія вырабляюцца і (ці) рэалізуюцца гэтымі асобамі, работ, якія выконваюцца, і (ці) паслуг, якія аказваюцца, што валодаюць адзінымі якаснымі ці іншымі агульнымі характарыстыкамі.

2. Калектыўны знак і права яго выкарыстання не могуць быць перададзены.

Артыкул 1022. Уступка выключнага права на таварны знак, заклад маёмасных правоў, якія сведчацца пасведчаннем на таварны знак

Выключнае права на таварны знак можа быць уступлена ўладальнікам таварнага знака паводле дагавора іншай асобе ў адносінах да ўсіх ці часткі тавараў, работ і (ці) паслуг, для якіх зарэгістраваны таварны знак.

Уступка выключнага права на таварны знак не дапускаецца, калі яна можа з’явіцца прычынай увядзення ў зман спажыўца адносна тавару, работы і (ці) паслугі або вытворцы тавару, выканаўцы работы і (ці) паслугі.

Маёмасныя правы, якія сведчацца пасведчаннем на таварны знак, могуць быць прадметам закладу.

Дагавор уступкі выключнага права на таварны знак, дагавор аб закладзе маёмасных правоў, якія сведчацца пасведчаннем на таварны знак, а таксама змяненні ва ўказаныя дагаворы рэгіструюцца ў патэнтным органе ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Артыкул 1023. Даванне ліцэнзіі на выкарыстанне таварнага знака

Уладальнік таварнага знака (ліцэнзіяр) можа даць права на выкарыстанне таварнага знака іншай асобе (ліцэнзіяту) паводле ліцэнзійнага дагавора ў адносінах да ўсіх ці часткі тавараў, работ і (ці) паслуг, для якіх зарэгістраваны таварны знак.

Ліцэнзійны дагавор павінен утрымліваць значэнні паказчыкаў якасці тавараў, работ і (ці) паслуг ліцэнзіята ці ўмову аб тым, што якасць тавараў, работ і (ці) паслуг ліцэнзіята будзе не ніжэйшай за якасць тавараў, работ і (ці) паслуг ліцэнзіяра, а таксама ўмову аб ажыццяўленні ліцэнзіярам кантролю якасці тавараў, работ і (ці) паслуг ліцэнзіята.

Па патрабаваннях, што прад'яўляюцца да якасці тавараў, работ і (ці) паслуг ліцэнзіята, на якія (у адносінах да якіх) прымяняецца таварны знак ліцэнзіяра, ліцэнзіяр нясе субсідыярную адказнасць.

§ 3. Геаграфічнае ўказанне

Артыкул 1024. Умовы прававой аховы геаграфічнага ўказання

1. Геаграфічным указаннем прызнаецца знак, які ідэнтыфікуе тавар як тавар, што паходзіць з тэрыторыі краіны або з рэгіёну ці мясцовасці на гэтай тэрыторыі, дзе пэўныя якасць, рэпутацыя ці іншыя характарыстыкі тавару ў значнай ступені звязваюцца з яго геаграфічным паходжаннем.

Паняцце «геаграфічнае ўказанне» ўключае ў сябе паняцце «найменне месца паходжання тавару» і «ўказанне паходжання тавару».

2. Найменнем месца паходжання тавару, якому даецца прававая ахова, з'яўляюцца абазначэнне, якое ўяўляе сабой або ўтрымлівае сучаснае ці гістарычнае, афіцыйнае ці неафіцыйнае, поўнае ці скарочанае найменне геаграфічнага аб'екта, а таксама абазначэнне, вытворнае ад такога наймення, якое стала вядомым у выніку яго выкарыстання ў адносінах да тавару, асаблівыя ўласцівасці якога выключна ці галоўным чынам вызначаюцца адметнымі для гэтага геаграфічнага аб'екта прыроднымі ўмовамі і (ці) людскімі фактарамі.

Указаныя палажэнні прымяняюцца да абазначэння, якое дазваляе ідэнтыфікаваць тавар як тавар, што паходзіць з тэрыторыі пэўнага геаграфічнага аб'екта і, хоць не ўтрымлівае наймення гэтага аб'екта, стала вядомай у выніку выкарыстання названага абазначэння ў адносінах да тавару, асаблівыя ўласцівасці якога адпавядаюць патрабаванням, указаным у частцы першай гэтага пункта.

Не прызнаецца найменнем месца паходжання тавару абазначэнне, якое хоць і ўяўляе сабой найменне геаграфічнага аб'екта ці ўтрымлівае найменне геаграфічнага аб'екта, але ўвайшло ў Рэспубліцы Беларусь ва ўсеагульнае выкарыстанне як абазначэнне тавару пэўнага віду, не звязанае з месцам яго вырабу.

3. Указаннем паходжання тавару прызнаецца абазначэнне, якое прама ці ўскосна ўказвае на месца сапраўднага паходжання ці вырабу тавару.

Указанне паходжання тавару можа быць прадстаўлена ў выглядзе наймення геаграфічнага аб'екта ці выявы.

4. Прававая ахова наймення месца паходжання тавару ў Рэспубліцы Беларусь даецца на падставе яго рэгістрацыі ў патэнтным органе ці паводле міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

На падставе рэгістрацыі выдаецца пасведчанне на права карыстання найменнем месца паходжання тавару.

Парадак і ўмовы рэгістрацыі і выдачы пасведчання на права карыстання найменнем месца паходжання тавару, прызнання несапраўднымі і спынення дзеяння рэгістрацыі і пасведчання вызначаюцца заканадаўствам аб найменнях месцаў паходжання тавараў.

5. Прававая ахова ўказання паходжання тавару ажыццяўляецца на падставе выкарыстання гэтага ўказання.

Прававая ахова ўказання паходжання тавару заключаецца ў недапушчэнні выкарыстання ілжывых (фальшывых) указанняў паходжання тавару, а таксама тых, якія ўводзяць спажыўца ў зман у адносінах да сапраўднага месца паходжання тавару. Указанне паходжання тавару не падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі.

Артыкул 1025. Права карыстання геаграфічным указаннем

1. Асоба, якая валодае правам карыстання геаграфічным указаннем, мае права змяшчаць яго на тавары, упакоўцы, у рэкламе, праспектах, рахунках і выкарыстоўваць іншым чынам у сувязі з увядзеннем тавару ў грамадзянскі абарот.

2. Найменне месца паходжання тавару можа быць зарэгістравана некалькімі асобамі сумесна для абазначэння тавару, які яны вырабляюць на тэрыторыі пэўнага геаграфічнага аб'екта, асаблівыя ўласцівасці якога выключна ці галоўным чынам

вызначаюцца адметнымі для гэтага геаграфічнага аб'екта прыроднымі ўмовамі і (ці) людскімі фактарамі. Права карыстання найменнем месца паходжання тавару належыць кожнай з гэтых асоб.

Права карыстання найменнем месца паходжання тавару, зарэгістраваным ва ўстаноўленым парадку, можа быць дадзена любой юрыдычнай ці фізічнай асобе, якая знаходзіцца на тэрыторыі таго ж геаграфічнага аб'екта і вырабляе тавар з тымі ж уласцівасцямі.

3. Асоба, якая добрасумленна выкарыстала найменне геаграфічнага аб'екта, тоеснае ці падобнае да зарэгістраванага наймення месца паходжання тавару, не менш чым за шэсць месяцаў да даты яго першай рэгістрацыі, захоўвае права на яго далейшае выкарыстанне на працягу тэрміну, устаноўленага патэнтным органам, але не больш за два гады лічачы з даты ўказанай рэгістрацыі.

4. Уступка права карыстання геаграфічным указаннем і даванне права карыстання ім на падставе ліцэнзіі не дапускаюцца.

Артыкул 1026. Сфера дзеяння прававой аховы геаграфічных указанняў

1. У Рэспубліцы Беларусь даецца прававая ахова геаграфічнаму ўказанню, якое знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

2. Прававая ахова наймення месца паходжання тавару, якое знаходзіцца ў іншай дзяржаве, даецца ў Рэспубліцы Беларусь, калі гэта найменне месца паходжання тавару зарэгістравана ў краіне паходжання тавару і ў Рэспубліцы Беларусь у адпаведнасці з гэтым Кодэксам і заканадаўствам аб найменнях месцаў паходжання тавараў.

3. Прававая ахова ўказання паходжання тавару, які знаходзіцца ў іншай дзяржаве, даецца ў Рэспубліцы Беларусь, калі гэта ўказанне выкарыстоўваецца ў краіне паходжання тавару.

Артыкул 1027. Тэрмін дзеяння пасведчання на права карыстання найменнем месца паходжання тавару

1. Пасведчанне на права карыстання найменнем месца паходжання тавару дзейнічае на працягу дзесяці гадоў лічачы з даты падачы заяўкі ў патэнтны орган.

2. Тэрмін дзеяння пасведчання на права карыстання найменнем месца паходжання тавару можа быць працягнуты па заяве яго ўладальніка, пададзенай на працягу апошняга года дзеяння пасведчання, на дзесяць гадоў пры захаванні ўмоў, якія даюць права на карыстанне найменнем месца паходжання тавару. Працягванне тэрміну дзеяння пасведчання магчымае неабмежаваную колькасць разоў.

Артыкул 1028. Адказнасць за парушэнне заканадаўства аб геаграфічных указаннях

1. Асоба, якая мае права карыстання геаграфічным указаннем, можа запатрабаваць ад таго, хто незаконна выкарыстоўвае гэта ўказанне, спынення яго выкарыстання, выдалення з тавару, яго ўпакоўкі, бланкаў і да таго падобнай дакументацыі геаграфічнага ўказання ці абазначэння, якое незаконна выкарыстоўваецца, падобнага(й) да яго да ступені блытаніны, знішчэння вырабленых выяў геаграфічнага ўказання ці абазначэння, падобнага да яго да ступені блытаніны, а калі гэта немагчыма, – канфіскацыі і знішчэння тавару і (ці) упакоўкі.

2. Асоба, якая валодае правам карыстання геаграфічным указаннем, мае права запатрабаваць ад парушальніка гэтага права пакрыцця панесеных страт.

ГЛАВА 68
НЯДОБРАСУМЛЕННАЯ КАНКУРЭНЦЫЯ

Артыкул 1029. Недапушчэнне нядобрасумленнай канкурэнцыі

Нядобрасумленная канкурэнцыя ў Рэспубліцы Беларусь не дапускаецца.

Нядобрасумленнай канкурэнцыяй прызнаюцца:

1) усе дзеянні, здольныя якім бы там ні было чынам выклікаць блытаніну ў адносінах да юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, тавараў, работ, паслуг ці прадпрымальніцкай дзейнасці канкурэнтаў;

2) ілжывыя сцверджанні пры ажыццяўленні прадпрымальніцкай дзейнасці, здольныя дыскрэдытаваць юрыдычную асобу, індывідуальнага прадпрымальніка, тавары, работы, паслугі ці прадпрымальніцкую дзейнасць канкурэнта;

3) указанні ці сцверджанні, выкарыстанне якіх пры ажыццяўленні прадпрымальніцкай дзейнасці можа ўвесці ў зман адносна характару, уласцівасцей, прыдатнасці да прымянення ці колькасці тавараў, работ, паслуг канкурэнта;

4) іншыя дзеянні, якія супярэчаць патрабаванням гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства аб канкурэнцыі, пры ажыццяўленні прадпрымальніцкай дзейнасці.

Артыкул 1030. Адказнасць за ажыццяўленне нядобрасумленнай канкурэнцыі

1. Асоба, якая ажыццяўляе нядобрасумленную канкурэнцыю, абавязана спыніць проціпраўныя дзеянні і апублікаваць абвяржэнне распаўсюджаных звестак і дзеянняў, якія складаюць змест нядобрасумленнай канкурэнцыі.

2. Асоба, пацярпелая ад нядобрасумленнай канкурэнцыі, мае права патрабаваць ад нядобрасумленнага канкурэнта пакрыцця прычыненых страт.

РАЗДЗЕЛ VI
СПАДЧЫННАЕ ПРАВА

ГЛАВА 69
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ АБ успадкаванні

Артыкул 1031. Успадкаванне

1. Пры атрыманні ў спадчыну маёмасць памерлага (спадчына, спадчынная маёмасць) пераходзіць да іншых асоб у нязменным выглядзе як адзінае цэлае і ў адзін і той жа момант (універсальнае праваперaемства), калі з гэтага Кодэкса і іншых законаў не вынікае іншае.

2. Права атрымання ў спадчыну гарантуецца. Права на спадчыну рэгулюецца гэтым Кодэксам і прынятымі ў адпаведнасці з ім іншымі актамі заканадаўства.

Артыкул 1032. Падставы атрымання ў спадчыну

1. Атрыманне ў спадчыну ажыццяўляецца паводле завяшчання і закона.

2. Атрыманне ў спадчыну паводле закона мае месца, калі завяшчанне адсутнічае або вызначае лёс не ўсёй спадчыны, а таксама ў іншых выпадках, устаноўленых гэтым Кодэксам і прынятымі ў адпаведнасці з ім іншымі актамі заканадаўства.

Артыкул 1033. Склад спадчыны

1. У склад спадчыны ўваходзяць усе правы і абавязкі, якія належалі спадчынадаўцу на момант адкрыцця спадчыны, існаванне якіх не спыняецца яго смерцю.

2. Не ўваходзяць у склад спадчыны правы і абавязкі, неразрыўна звязаныя з асобай спадчынадаўца:

1) правы членства (удзелу) у камерцыйных і іншых арганізацыях, якія з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, калі іншае не ўстаноўлена законам ці ўстаноўчымі дакументамі;

2) права на пакрыццё шкоды, прычыненай жыццю ці здароўю;

3) правы і абавязкі па аліментных абавязацельствах;

4) правы на пенсіі, дапамогі і іншыя выплаты на падставе заканадаўства аб працы і сацыяльным забеспячэнні;

5) асабістыя немаёмасныя правы, не звязаныя з маёмаснымі.

3. Асабістыя немаёмасныя правы і іншыя нематэрыяльныя даброты, якія належалі спадчынадаўцу, могуць ажыццяўляцца і абараняцца спадчыннікамі, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

4. У склад спадчыны ўваходзяць паенакапленні ў жыллёвым, жыллёва-будаўнічым, дачным, гаражным ці іншым спажывецкім кааператыве, маёмасныя правы і абавязкі спадчынадаўца, заснаваныя на дагаворы стварэння аб'екта долевага будаўніцтва, або кватэра, дача, гараж, іншае памяшканне, машына-месца, пай за якія поўнасцю выплачаны і дадзеная маёмасць афармлена за спадчынадаўцам на праве ўласнасці ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку. Калі воля спадчынадаўца на афармленне ўказанай маёмасці на праве ўласнасці была выказана ў пісьмовай заяве, накіраванай у кампетэнтныя органы, але працэдура афармлення не была завершана ў сувязі з яго смерцю, такая маёмасць можа быць судом прызнана спадчыннай па патрабаванні зацікаўленых асоб.

Артыкул 1034. Атрыманне ў спадчыну маёмасці, якая з'яўляецца агульнай сумеснай уласнасцю

1. Смерць удзельніка агульнай сумеснай уласнасці з'яўляецца падставай для вызначэння яго долі ў такой уласнасці і падзелу агульнай маёмасці або выдзелу з яе долі памерлага ўдзельніка ў парадку, устаноўленым артыкулам 255 гэтага Кодэкса. У гэтым выпадку спадчына адкрываецца ў адносінах да агульнай маёмасці, якая прыпадае на долю памерлага ўдзельніка, а пры немагчымасці падзелу маёмасці ў натуры – у адносінах да кошту такой долі.

2. Удзельнік агульнай сумеснай уласнасці мае права завяшчаць сваю долю ў агульнай маёмасці, якая будзе вызначана пасля яго смерці ў адпаведнасці з пунктам 1 гэтага артыкула.

Артыкул 1035. Адкрыццё спадчыны

1. Спадчына адкрываецца ў выніку смерці грамадзяніна ці аб’яўлення яго судом памерлым.

2. Часам адкрыцця спадчыны з'яўляецца дзень смерці грамадзяніна, а пры аб’яўленні яго памерлым – дзень, устаноўлены ў адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 41 гэтага Кодэкса.

3. Асобы, памерлыя ў адзін і той жа дзень, лічацца ў мэтах спадчыннага праваперaемства памерлымі адначасова і не атрымліваюць спадчыну адзін пасля аднаго. Права на спадчыну адкрываецца пасля кожнага з іх, і да атрымання ў спадчыну выклікаюцца спадчыннікі кожнага з іх.

Артыкул 1036. Месца адкрыцця спадчыны

Месцам адкрыцця спадчыны з'яўляецца апошняе месца жыхарства спадчынадаўца, якое вызначаецца па рэгістрацыі спадчынадаўца па месцы жыхарства (пры яе адсутнасці – месцы знаходжання) на дзень адкрыцця спадчыны,

а калі яно невядомае, – месца знаходжання нерухомай маёмасці ці асноўнай яе часткі, а пры адсутнасці нерухомай маёмасці – месца знаходжання асноўнай часткі рухомай маёмасці.

Артыкул 1037. Спадчыннікі

1. Спадчыннікамі паводле завяшчання і закона могуць быць грамадзяне, якія знаходзяцца ў жывых у момант адкрыцця спадчыны, а таксама зачатыя пры жыцці спадчынадаўца і народжаныя жывымі пасля адкрыцця спадчыны.

2. Спадчыннікамі паводле завяшчання могуць быць таксама юрыдычныя асобы, якія з'яўляліся створанымі ў момант адкрыцця спадчыны, Рэспубліка Беларусь і адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі.

Артыкул 1038. Нявартыя спадчыннікі

1. Адхіляюцца ад успадкавання як паводле завяшчання, так і паводле закона асобы, якія наўмысна пазбавілі жыцця спадчынадаўца ці зрабілі замах на яго жыццё. Выключэнне складаюць асобы, у адносінах да якіх завяшчальнік зрабіў завяшчанне ўжо пасля замаху на яго жыццё.

2. Адхіляюцца ад успадкавання як паводле завяшчання, так і паводле закона асобы, якія шляхам складання падложнага завяшчання, стварэннем наўмыснай перашкоды ажыццяўленню спадчынадаўцам апошняй волі ці іншымі наўмыснымі процізаконнымі дзеяннямі спрыялі таму, каб выклікаць іх саміх ці блізкіх ім асоб да ўспадкавання або павелічэння ім долі належнай спадчыны.

3. Пры ўспадкаванні паводле закона адхіляюцца ад успадкавання бацькі пасля дзяцей, у адносінах да якіх яны былі пазбаўлены бацькоўскіх правоў і не адноўлены ў гэтых правах да часу адкрыцця спадчыны, а таксама грамадзяне, якія злосна адхіляліся ад выканання абавязкаў па ўтрыманні спадчынадаўца, якія ляжалі на іх паводле акта заканадаўства, калі гэта акалічнасць пацверджана ў судовым парадку.

4. Няварты спадчыннік можа быць на падставе гэтага артыкула адхілены ад успадкавання судом паводле патрабавання асобы, для якой такое адхіленне параджае звязаныя з успадкаваннем маёмасныя наступствы.

5. Правілы гэтага артыкула распаўсюджваюцца на спадчыннікаў, якія маюць права на абавязковую долю ў спадчыне.

6. Правілы, якія ўтрымліваюцца ў пунктах 1, 2 і 4 гэтага артыкула, адпаведна прымяняюцца да завяшчальнага адпісання(артыкул 1054).

Артыкул 1039. Вымарачная спадчына

1. Калі няма спадчыннікаў ні паводле закона, ні паводле завяшчання, або ніхто са спадчыннікаў не мае права атрымліваць спадчыну (артыкул 1038), або ўсе яны адмовіліся ад спадчыны, спадчына прызнаецца вымарачнай.

2. Вымарачная спадчына пераходзіць ва ўласнасць адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі па месцы знаходжання адпаведнай маёмасці, якая ўваходзіць у склад спадчыны.

3. Спадчына можа быць прызнана вымарачнай судом на падставе заявы органа мясцовага кіравання і самакіравання па месцы адкрыцця спадчыны пасля сканчэння аднаго года з дня адкрыцця спадчыны. Спадчына можа быць прызнана вымарачнай да сканчэння ўказанага тэрміну, калі расходы, звязаныя з аховай спадчыны і кіраваннем ёй, перавышаюць яе кошт.

4. Ахова вымарачнай спадчыны і кіраванне ёй ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з артыкуламі 1066–1068 гэтага Кодэкса.

ГЛАВА 70
АТРЫМАННЕ СПАДЧЫНЫ паводле ЗАВЯШЧАННЯ

Артыкул 1040. Агульныя палажэнні

1. Завяшчаннем прызнаецца волевыяўленне грамадзяніна аб распараджэнні належнай яму маёмасцю ў выпадку смерці.

2. Завяшчанне можа скласці грамадзянін, які валодае дзеяздольнасцю ў поўным аб'ёме.

3. Завяшчанне павінна быць складзена асабіста. Складанне завяшчання праз прадстаўніка не дапускаецца.

4. У завяшчанні могуць утрымлівацца распараджэнні толькі адной асобы. Складанне завяшчання дзвюма ці больш асобамі не дапускаецца.

5. Завяшчанне з'яўляецца аднабаковай здзелкай, сапраўднасць якой вызначаецца на момант складання завяшчання.

Артыкул 1041. Воля завяшчання

1. Грамадзянін можа завяшчаць усю сваю маёмасць ці частку яе адной або некалькім асобам, якія як уваходзяць, так і не ўваходзяць у кола спадчыннікаў паводле закона, а таксама Рэспубліцы Беларусь і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльным адзінкам.

2. Завяшчальнік мае права без тлумачэння прычын пазбавіць спадчыны аднаго, некалькіх ці ўсіх спадчыннікаў паводле закона. Пазбаўленне спадчыны спадчынніка паводле закона не распаўсюджваецца на яго нашчадкаў, якія атрымліваюць спадчыну па праве прадстаўлення, калі з завяшчання не вынікае іншае.

3. Спадчынадавец мае права скласці завяшчанне, якое ўтрымлівае распараджэнне аб любой маёмасці, у тым ліку аб маёмасці, уласнікам якой ён можа стаць на дзень адкрыцця спадчыны.

4. Завяшчальнік мае права абумовіць атрыманне спадчыны пэўнай правамернай умовай адносна характару паводзін спадчынніка, адмяніць і змяніць складзенае завяшчанне ў любы момант пасля яго складання і не абавязаны пры гэтым указваць ці паведамляць каму-небудзь аб прычынах адмены ці змянення ім завяшчання.

5. Воля завяшчання абмяжоўваецца правіламі аб абавязковай долі ў спадчыне (артыкул 1064), аб недапушчэнні ўскладання на асоб, прызначаных спадчыннікамі ў завяшчанні, абавязку ў сваю чаргу распарадзіцца пэўным чынам завешчанай ім маёмасцю на выпадак іх смерці, уключэння ў завяшчанне проціпраўных ці невыканальных для спадчынніка паводле аб'ектыўных прычын умоў яго паводзін для атрымання спадчыны.

Артыкул 1042. Падпрызначэнне спадчыннікаў

1. Завяшчальнік можа на выпадак, калі ўказаны ў завяшчанні спадчыннік памрэ да адкрыцця спадчыны, не прыме яго або адмовіцца ад яго ці будзе адхілены ад успадкавання як няварты спадчыннік у парадку, прадугледжаным артыкулам 1038, а таксама на выпадак невыканання спадчыннікам паводле завяшчання правамерных умоў спадчынадаўца прызначыць іншага спадчынніка (падпрызначэнне спадчынніка).

2. Падпрызначаным спадчыннікам можа быць любая асоба, якая ў адпаведнасці з артыкулам 1037 гэтага Кодэкса можа быць спадчыннікам.

3. Адмова спадчынніка паводле завяшчання не на карысць падпрызначанага спадчынніка не дапускаецца.

Артыкул 1043. Долі спадчыннікаў у маёмасці. Атрыманне ў спадчыну часткі маёмасці, якая засталася незавешчанай

1. Маёмасць, завешчаная двум ці некалькім спадчыннікам без указання іх долей у спадчыне і без указання таго, якія рэчы ці правы, што ўваходзяць у склад спадчыны, каму са спадчыннікаў прызначаюцца, лічыцца завешчанай спадчыннікам у роўных долях.

2. Непадзельная рэч (артыкул 133), завешчаная двум ці некалькім спадчыннікам, лічыцца завешчанай у долях, якія адпавядаюць кошту завешчаных ім частак гэтай рэчы.

3. Частка маёмасці, якая засталася незавешчанай, размяркоўваецца паміж спадчыннікамі паводле закона, якія выклікаюцца да атрымання спадчыны ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 1056–1065 гэтага Кодэкса. У лік гэтых спадчыннікаў уваходзяць і тыя спадчыннікі паводле закона, якім іншая частка маёмасці была пакінута паводле завяшчання.

Артыкул 1044. Агульныя правілы аб форме завяшчання

1. Завяшчанне павінна быць складзена ў пісьмовай форме і засведчана натарыусам. Пасведчанне завяшчання іншымі асобамі дапускаецца ў выпадках, прадугледжаных пунктам 6 артыкула 1045, артыкулам 1047 і пунктам 2 артыкула 1048 гэтага Кодэкса. Незахаванне правілаў гэтага Кодэкса аб пісьмовай форме завяшчання і яго пасведчання цягне за сабой несапраўднасць завяшчання.

2. Завяшчальнік павінен уласнаручна падпісаць завяшчанне . Калі завяшчальнік з прычыны фізічных недахопаў, хваробы ці непісьменнасці не можа ўласнаручна падпісаць завяшчанне, яно па яго просьбе можа быць падпісана ў прысутнасці натарыуса ці іншай асобы, якая сведчыць завяшчанне ў адпаведнасці з законам, іншым грамадзянінам з указаннем прычын, паводле якіх завяшчальнік не мог падпісаць завяшчанне ўласнаручна. У завяшчанні павінны быць указаны прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку і месца жыхарства гэтага грамадзяніна.

3. У выпадках, калі ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам пры складанні, падпісанні ці пасведчанні завяшчання павінны прысутнічаць сведкі, не могуць быць такімі сведкамі, а таксама не могуць падпісваць завяшчанне замест завяшчальніка:

1) натарыус ці іншая асоба, якая сведчыць завяшчанне;

2) асоба, на карысць якой складзена завяшчанне ці зроблена завяшчальнае адпісанне, сужэнец такой асобы, яе дзеці, бацькі, унукі і праўнукі;

2^1) спадчыннікі паводле завяшчання ці паводле закона;

3) грамадзяне, якія не валодаюць поўнай дзеяздольнасцю;

4) непісьменныя;

5) асобы, якія маюць судзімасць за дачу ілжывых паказанняў;

6) грамадзяне з такімі фізічнымі недахопамі, якія не дазваляюць ім у поўнай меры ўсведамляць сутнасць таго, што адбываецца;

7) асобы, якія не валодаюць у дастатковай ступені мовай, за выключэннем выпадкаў, калі натарыусам прымаецца закрытае завяшчанне.

4. У завяшчанні павінны быць указаны месца і дата яго пасведчання, за выключэннем выпадку, прадугледжанага артыкулам 1046 гэтага Кодэкса.

Артыкул 1045. Натарыяльна пасведчанае завяшчанне

1. Натарыяльна пасведчанае завяшчанне павінна быць напісана завяшчальнікам або запісана з яго слоў у прысутнасці сведкі натарыусам. Пры запісе завяшчання са слоў завяшчальніка натарыусам могуць быць выкарыстаны

агульнапрынятыя тэхнічныя сродкі (пішучая машынка, персанальны камп'ютар і да т. п.).

2. Завяшчанне, запісанае натарыусам са слоў завяшчальніка, павінна быць поўнасцю прачытана завяшчальнікам у прысутнасці натарыуса і сведкі да падпісання завяшчання. Калі завяшчальнік з прычыны фізічных недахопаў, хваробы ці непісьменнасці не ў стане асабіста прачытаць завяшчанне, яго тэкст чытацца ўголас для яго сведкаў у прысутнасці натарыуса, аб чым у завяшчанні робіцца адпаведны запіс з указаннем прычын, па якіх завяшчальнік не змог асабіста прачытаць завяшчанне.

3. Калі натарыяльна пасведчанае завяшчанне складаецца ў прысутнасці сведкі, у завяшчанні павінны быць указаны прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку і месца жыхарства сведкі.

4. Натарыус абавязаны папярэдзіць сведку і асобу, якая падпісвае завяшчанне замест завяшчальніка, аб неабходнасці захоўваць тайну завяшчання (артыкул 1050).

5. Пры пасведчанні завяшчання натарыус абавязаны растлумачыць завяшчальніку змест артыкула 1064 гэтага Кодэкса.

6. У выпадках, калі права здзяйснення натарыяльных дзеянняў дадзена законам упаўнаважаным службовым асобам мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, дыпламатычным агентам дыпламатычных прадстаўніцтваў Рэспублікі Беларусь і консульскім службовым асобам консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь, завяшчанне можа быць засведчана замест натарыуса адпаведнай службовай асобай з выкананнем патрабаванняў гэтага Кодэкса аб форме завяшчання і парадку яго натарыяльнага пасведчання.

Артыкул 1046. Закрытае завяшчанне

1. Паводле жадання завяшчальніка натарыус сведчыць завяшчанне без азнаямлення з яго зместам (закрытае завяшчанне).

2. Закрытае завяшчанне павінна быць уласнаручна напісана і падпісана завяшчальнікам. Невыкананне гэтых правіл цягне за сабой несапраўднасць завяшчання, аб чым натарыус абавязаны папярэдзіць завяшчальніка.

3. Закрытае завяшчанне перадаецца ў прысутнасці двух сведак, якія ставяць на канверце свае подпісы. Затым канверт, падпісаны сведкамі і завяшчальнікам з указаннем аб растлумачэнні завяшчальніку патрабаванняў, устаноўленых пунктам 2 гэтага артыкула, запячатваецца ў прысутнасці завяшчальніка і сведак у іншы канверт, на якім натарыус учыняе надпіс, што ўтрымлівае звесткі аб асобе, ад якой ім прынята закрытае завяшчанне, аб месцы і даце яго прыняцця, аб прозвішчы, уласным імені, імені па бацьку і месцы жыхарства кожнага сведкі. Прымаючы ад завяшчальніка канверт з завяшчаннем, натарыус абавязаны растлумачыць завяшчальніку змест артыкула 1064 гэтага Кодэкса.

4. Пры паступленні звестак аб смерці асобы, якая склала закрытае завяшчанне, натарыус абавязаны праверыць такія звесткі праз органы, якія рэгіструюць акты грамадзянскага стану. Пры паступленні копіі актавага запісу аб смерці ці прадстаўленні пасведчання аб смерці такой асобы зацікаўленымі асобамі натарыус не пазней за пятнаццаць дзён робіць ускрыццё канверта з завяшчаннем з абавязковай прысутнасцю двух сведак. Пры ўскрыцці канверта маюць права прысутнічаць і зацікаўленыя асобы.

5. Аб ускрыцці канверта з завяшчаннем натарыус складае пратакол, у якім павінны быць адлюстраваны месца, дата і час ускрыцця канверта, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку натарыуса, сведак і прысутных зацікаўленых асоб, месца

іх пастаяннага пражывання, стан канвертаў і змест учыненых на іх запісаў, факт абвяшчэння натарыусам дакумента, які ўтрымліваецца ў канверце, поўны тэкст гэтага дакумента, подпісы натарыуса і сведак.

6. Не пазней наступнага дня пасля ўскрыцця канверта з завяшчаннем натарыус абавязаны накіраваць паведамленні зацікаўленым асобам аб іх праве атрымання спадчыны.

Артыкул 1047. Завяшчанні, якія прыраўноўваюцца да натарыяльна пасведчаных

1. Прыраўноўваюцца да натарыяльна пасведчаных завяшчанняў:

1) завяшчанні грамадзян, якія знаходзяцца на лячэнні ў бальніцах, шпіталях, іншых арганізацыях аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах, ці якія пражываюць у дамах-інтэрнатах для састарэлых і інвалідаў, пасведчаныя галоўнымі ўрачамі, іх намеснікамі па медыцынскай частцы ці дзяжурнымі ўрачамі гэтых бальніц, шпіталяў і іншых арганізацый аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах, а таксама начальнікамі шпіталяў, кіраўнікамі дамоў-інтэрнатаў для састарэлых і інвалідаў;

2) завяшчанні грамадзян, якія знаходзяцца ў час плавання на суднах, што ходзяць пад Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь, пасведчаныя капітанамі гэтых суднаў;

3) завяшчанні грамадзян, якія знаходзяцца ў разведачных, арктычных ці іншых падобных экспедыцыях, пасведчаныя начальнікамі гэтых экспедыцый;

4) завяшчанні ваеннаслужачых у пунктах дыслакацыі воінскіх часцей, дзе няма натарыусаў, а таксама завяшчанні грамадзянскіх асоб, якія працуюць у гэтых часцях, членаў іх сямей і членаў сямей ваеннаслужачых, пасведчаныя камандзірамі гэтых часцей;

5) завяшчанні асоб, якія знаходзяцца ва ўстановах, што выконваюць пакаранне ў выглядзе арышту, абмежавання волі, пазбаўлення волі, пажыццёвага заключэння, ці месцах утрымання пад вартай, пасведчаныя начальнікамі адпаведных устаноў, якія выконваюць пакаранне, ці кіраўнікамі адміністрацый месцаў утрымання пад вартай.

2. Завяшчанні, прадугледжаныя ў пункце 1 гэтага артыкула, павінны быць падпісаны завяшчальнікам у прысутнасці сведкі, які таксама падпісвае завяшчанне.

У астатнім да такіх завяшчанняў адпаведна прымяняюцца правілы артыкула 1045 гэтага Кодэкса, за выключэннем патрабавання аб натарыяльным пасведчанні завяшчання.

3. Завяшчанне, пасведчанае ў адпаведнасці з гэтым артыкулам, павінна быць, як толькі для гэтага з’явіцца магчымасць, накіравана асобай, якая засведчыла завяшчанне, праз орган юстыцыі натарыусу па месцы жыхарства завяшчальніка.

4. Парадак пасведчання завяшчанняў і здзяйснення звязаных з гэтым іншых дзеянняў асобамі, якім права пасведчання завяшчанняў даецца ў адпаведнасці з гэтым артыкулам, устанаўліваецца заканадаўствам.

Артыкул 1048. Завяшчальныя распараджэнні грашовымі сродкамі ў банках ці нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацыях

1. Правы на грашовыя сродкі, якія ўнесены грамадзянінам у банкаўскі ўклад (дэпазіт) ці знаходзяцца на банкаўскім рахунку грамадзяніна, могуць быць ім завешчаны па яго меркаванні, або ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 1044–1047 гэтага Кодэкса, або шляхам здзяйснення завяшчальнага распараджэння непасрэдна ў тым банку ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі, у якіх

адкрыты банкаўскі рахунак або размешчаны банкаўскі ўклад (дэпазіт). У адносінах да сродкаў на рахунку такое завяшчальнае распараджэнне мае сілу натарыяльна пасведчанага завяшчання.

2. Завяшчальнае распараджэнне правамі на сродкі ў банку ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі павінна быць уласнаручна напісана і падпісана завяшчальнікам з указаннем даты яго складання і павінна быць засведчана служачым банка ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі, які мае права прымаць да выканання распараджэнне кліента ў адносінах да сродкаў на яго рахунку ў парадку, які вызначаецца заканадаўствам.

3. Правы на грашовыя сродкі, у адносінах да якіх у банку ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі здзейснена завяшчальнае распараджэнне, уваходзяць у склад спадчыны і атрымліваюцца ў спадчыну на агульных падставах у адпаведнасці з гэтым Кодэксам. Гэтыя сродкі выдаюцца спадчыннікам на падставе пасведчання аб праве на спадчыну і ў адпаведнасці з ім. Да прадстаўлення банку ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі пасведчання аб праве на спадчыну спадчыннік, указаны ў завяшчальным распараджэнні, можа выдаць з рахунку спадчынадаўца сродкі, якія не перавышаюць у сто разоў устаноўлены заканадаўствам памер базавай велічыні.

Артыкул 1049. Адмена і змяненне завяшчання

1. Завяшчальнік мае права ў любы час адмяніць зробленае ім завяшчанне ў цэлым або змяніць яго шляхам адмены, змянення ці дапаўнення асобных завяшчальных распараджэнняў, якія ўтрымліваюцца ў ім, зрабіўшы новае завяшчанне.

Завяшчанне можа быць адменена шляхам знішчэння ўсіх яго экзэмпляраў завяшчальнікам ці па пісьмовым распараджэнні завяшчальніка – натарыусам.

2. Завяшчанне, складзенае раней, адмяняецца наступным завяшчаннем поўнасцю ці ў частцы, у якой яно яму супярэчыць.

3. Раней зробленае завяшчанне, адмененае поўнасцю ці часткова наступным завяшчаннем, не аднаўляецца, калі апошняе будзе ў сваю чаргу адменена ці зменена завяшчальнікам.

Артыкул 1050. Тайна завяшчання

Натарыус, іншая асоба, якая сведчыць завяшчанне, сведкі, а таксама грамадзянін, які падпісвае завяшчанне замест завяшчальніка, не мае права да адкрыцця спадчыны выдаваць звесткі, якія датычацца зместу завяшчання, яго складання, адмены ці змянення.

Артыкул 1051. Тлумачэнне завяшчання

Пры тлумачэнні завяшчання натарыусам, выканаўцам завяшчання ці судом прымаецца на ўвагу літаральнае значэнне слоў і выразаў, якія ў ім утрымліваюцца. Пры няяснасці літаральнага сэнсу якога-небудзь палажэння завяшчання ён вызначаецца шляхам параўнання гэтага палажэння з іншымі палажэннямі і сэнсам завяшчання ў цэлым. Пры гэтым павінна быць забяспечана найбольш поўнае ажыццяўленне меркаванай волі завяшчальніка.

Артыкул 1052. Несапраўднасць завяшчання

1. Завяшчанне можа быць прызнана судом несапраўдным па іску асобы, правы ці інтарэсы якой парушаны гэтым завяшчаннем. Аспрэчванне завяшчання да адкрыцця спадчыны не дапускаецца.

2. Завяшчанне прызнаецца несапраўдным пры парушэнні правілаў аб форме завяшчання, іншых палажэнняў гэтага Кодэкса, якія цягнуць за сабой несапраўднасць завяшчання ці несапраўднасць здзелак (параграф 2 главы 9). Не могуць служыць падставай прызнання завяшчання несапраўдным апіскі і іншыя нязначныя парушэнні парадку яго складання, падпісання ці пасведчання, калі даказана, што яны не могуць уплываць на разуменне волевыяўлення завяшчальніка.

3. Несапраўдным могуць быць прызнаны як завяшчанне ў цэлым, так і асобныя завяшчальныя распараджэнні, якія ўтрымліваюцца ў ім.

Несапраўднасць асобных завяшчальных распараджэнняў не закранае астатняй часткі завяшчання, калі можна дапусціць, што яна была б уключана ў завяшчанне і пры адсутнасці распараджэнняў, якія прызнаюцца несапраўднымі.

4. Прызнанне завяшчання несапраўдным не пазбаўляе асоб, указаных у ім у якасці спадчыннікаў ці адпісаннеатрымальнікаў, права атрымліваць у спадчыну паводле закона ці на падставе іншага, сапраўднага завяшчання.

Артыкул 1053. Выкананне завяшчання

1. Завяшчальнік можа даручыць выкананне завяшчання ўказанай ім у завяшчанні асобе, якая не з'яўляецца спадчыннікам (выканаўцу завяшчання, душапрыказчыку). Згода гэтай асобы быць выканаўцам завяшчання павінна быць выказана ёй або ў яе ўласнаручным надпісе на самім завяшчанні, або ў заяве, прыкладзенай да завяшчання. Калі выканаўца завяшчання завяшчальнікам не прызначаны, то па пагадненні паміж сабой спадчыннікі маюць права даручыць выкананне завяшчання аднаму са спадчыннікаў або іншай асобе. Пры недасягненні такога пагаднення выканаўца завяшчання можа быць прызначаны судом па патрабаванні аднаго ці некалькіх спадчыннікаў з прапанаваных імі суду асоб.

Выканаўца завяшчання мае права ў любы час адмовіцца ад выканання ўскладзеных на яго завяшчальнікам абавязкаў, загадзя паведаміўшы аб гэтым спадчыннікам паводле завяшчання. Вызваленне выканаўцы завяшчання ад яго абавязкаў магчымае таксама паводле рашэння суда згодна заяве спадчыннікаў.

2. Паколькі ў завяшчанні не ўстаноўлена іншае, выканаўца завяшчання павінен прыняць меры, неабходныя для выканання завяшчання, у тым ліку:

1) забяспечыць пераход да спадчыннікаў належнай ім маёмасці ў адпаведнасці з воляй спадчынадаўца і законам;

2) прыняць самастойна ці праз натарыуса меры па ахове спадчыны і кіраванні ёй у інтарэсах спадчыннікаў;

3) атрымаць належныя спадчынадаўцу сумы і іншую маёмасць для перадачы іх спадчыннікам, калі гэтыя сумы не падлягаюць перадачы іншым асобам (пункт 1 артыкула 1090);

4) выканаць завяшчальнае ўскладанне або патрабаваць ад спадчыннікаў паводле завяшчання выканання завяшчальнага адпісання (артыкул 1054) ці завяшчальнага ўскладання (артыкул 1055).

3. У мэтах выканання волі спадчынадаўца выканаўца завяшчання мае права ад свайго імя весці справы, звязаныя з кіраваннем спадчынай і выкананнем завяшчання, у тым ліку ў судзе, іншых дзяржаўных органах.

4. Выканаўца завяшчання мае права на пакрыццё за кошт спадчыны неабходных расходаў, звязаных з выкананнем завяшчання, а таксама на атрыманне звыш расходаў узнагароды за кошт спадчыны, калі гэта прадугледжана завяшчаннем.

Артыкул 1054. Завяшчальнае адпісанне

1. Завяшчальнік мае права ўскласці на спадчынніка паводле завяшчання выкананне за кошт спадчыны якога-небудзь абавязацельства (завяшчальнае адпісанне) на карысць адной ці некалькіх асоб (адпісанне атрымальнікаў), якія набываюць права патрабаваць выканання завяшчальнага адпісання.

Адпісаннеатрымальнікамі могуць быць асобы, якія як уваходзяць, так і не ўваходзяць у лік спадчыннікаў паводле закона.

2. Прадметам завяшчальнага адпісання можа быць перадача адпісання атрымальніку ва ўласнасць ці на іншым рэчавым праве, а таксама ў карыстанне рэчы, якая ўваходзіць у склад спадчыны, набыццё і перадача яму маёмасці, якая не ўваходзіць у склад спадчыны, выкананне для яго пэўнай работы, аказанне яму пэўнай паслугі і г. д.

3. Спадчыннік, на якога завяшчальнік усклаў завяшчальнае адпісанне, павінен выканаць яго толькі ў межах сапраўднага кошту спадчыны, якая перайшла да яго, за вылікам часткі даўгоў спадчынадаўца, што на яго прыпадае.

Калі спадчыннік, на якога ўскладзена завяшчальнае адпісанне, мае права на абавязковую долю ў спадчыне, яго абавязак выканаць адпісанне абмяжоўваецца межамі кошту спадчыны, якая перайшла да яго і перавышае памер яго абавязковай долі.

Калі завяшчальнае адпісанне ўскладзена на ўсіх ці некалькіх спадчыннікаў, адпісанне абцяжарвае кожнага з іх адпаведна з яго доляй у спадчыне, паколькі завяшчаннем не прадугледжана іншае.

4. На спадчынніка, да якога пераходзяць жылы дом, кватэра ці іншае жылое памяшканне, завяшчальнік мае права ўскласці абавязак даць іншай асобе пажыццёвае карыстанне гэтым памяшканнем ці пэўнай яго часткай. Пры наступным пераходзе права ўласнасці на жылое памяшканне права пажыццёвага карыстання захоўвае сілу.

Права пажыццёвага карыстання неадчужальнае, неперадавальнае і не пераходзіць да спадчыннікаў адпісаннеатрымальніка.

Права пажыццёвага карыстання, дадзенае адпісаннеатрымальніку, не з'яўляецца падставай для пражывання членаў яго сям'і, калі ў завяшчанні не ўказана іншае.

5. У выпадку смерці спадчынніка, на якога была ўскладзена завяшчальнае адпісанне, ці ў выпадку непрыняцця ім спадчыны выкананне завяшчальнага адпісання пераходзіць на іншых спадчыннікаў, якія атрымалі яго долю, або да адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, калі маёмасць стала вымарачнай.

Завяшчальнае адпісанне не выконваецца ў выпадку смерці адпісаннеатрымальніка да адкрыцця спадчыны ці пасля адкрыцця, але да таго моманту, калі спадчыннік паводле завяшчання паспеў прыняць яе.

6. Адпісаннеатрымальнік не адказвае па даўгах спадчынадаўца.

Артыкул 1055. Ускладанне

1. Завяшчальнік можа ўскласці на аднаго ці некалькіх спадчыннікаў паводле завяшчання абавязак зрабіць якое-небудзь дзеянне маёмаснага або немаёмаснага характару, накіраванае на ажыццяўленне агульнакарыснай мэты. Такі ж абавязак можа быць ускладзены на выканаўцу завяшчання пры вылучэнні спадчынадаўцам часткі маёмасці для выканання ім ускладання.

Прадметам ускладання можа быць таксама ўтрыманне належных спадчынадаўцу жывёл, нагляд і догляд за імі.

2. Да ўскладання, прадметам якога з'яўляюцца дзеянні, што маюць маёмасны характар, адпаведна прымяняюцца правілы, якія ўтрымліваюцца ў артыкуле 1054 гэтага Кодэкса.

3. Выканання ўскладання маюць права патрабаваць у судзе зацікаўленыя асобы, а таксама выканаўца завяшчання і любы са спадчыннікаў, паколькі ў завяшчанні не прадугледжана іншае.

ГЛАВА 71
АТРЫМАННЕ СПАДЧЫНЫ ПАВОДЛЕ ЗАКОНА

Артыкул 1056. Агульныя палажэнні

1. Спадчыннікі паводле закона выклікаюцца да атрымання спадчыны ў парадку чарговасці, прадугледжанай артыкуламі 1057–1063 гэтага Кодэкса.

Спадчыннікі адной чаргі атрымліваць спадчыну ў роўных долях, за выключэннем спадчыннікаў, якія атрымліваюць спадчыну па праве прадстаўлення (артыкул 1062).

2. Пры атрыманні спадчыны паводле закона ўсыноўлены і яго нашчадкі, з аднаго боку, і ўсынавіцель і яго сваякі – з другога, у поўнай меры прыраўноўваюцца да сваякоў па паходжанні (кроўных сваякоў).

3. Усыноўлены і яго нашчадкі не атрымліваць спадчыну паводле законе пасля смерці бацькоў усыноўленага і іншых яго сваякоў па паходжанні, а бацькі ўсыноўленага і іншыя яго сваякі па паходжанні не атрымліваць спадчыну паводле закона пасля смерці ўсыноўленага і яго нашчадкаў, за выключэннем выпадкаў, указаных у пункце 4 гэтага артыкула.

4. У выпадках, калі ў адпаведнасці з Кодэксам аб шлюбе і сям'і Рэспублікі Беларусь усыноўлены паводле рашэння суда захоўвае правы і абавязкі ў адносінах да аднаго з бацькоў і іншых сваякоў па паходжанні, усыноўлены і яго нашчадкі атрымліваць у спадчыну паводле закона пасля смерці гэтых сваякоў, а апошнія атрымліваць у спадчыну паводле закона пасля смерці ўсыноўленага і яго нашчадкаў.

5. Спадчыннікі паводле закона кожнай наступнай чаргі атрымліваюць права на атрыманне спадчыны ў выпадку адсутнасці спадчыннікаў папярэдняй чаргі, устаранення іх ад спадчыны, непрыняцця імі спадчыны або адмовы ад яе.

6. Правілы гэтага Кодэкса аб чарговасці выклікання спадчыннікаў паводле законе да ўспадкавання і аб памеры іх долей у спадчыне могуць быць зменены натарыяльна пасведчаным пагадненнем зацікаўленых спадчыннікаў, заключаным пасля адкрыцця спадчыны. Такое пагадненне не павінна закранаць правоў спадчыннікаў, якія не ўдзельнічаюць у ім, а таксама спадчыннікаў, якія маюць права на абавязковую долю.

Артыкул 1057. Спадчыннікі першай чаргі

1. Спадчыннікамі паводле закона першай чаргі з'яўляюцца дзеці, сужэнец і бацькі памерлага.

2. Унукі спадчынадаўца і іх прамыя нашчадкі атрымліваць спадчыну па праве прадстаўлення.

Артыкул 1058. Спадчыннікі другой чаргі

1. Пры адсутнасці ў памерлага спадчыннікаў першай чаргі спадчыннікамі паводле закона другой чаргі з'яўляюцца паўнародныя і непаўнародныя браты і сёстры спадчынадаўца.

2. Дзеці братоў і сясцёр спадчынадаўца – яго пляменнікі і пляменніцы атрымліваць спадчыну паводле права прадстаўлення.

Артыкул 1059. Спадчыннікі трэцяй чаргі

Пры адсутнасці ў памерлага спадчыннікаў першай і другой чаргі спадчыннікамі паводле закона трэцяй чаргі з'яўляюцца дзед і бабка памерлага як з боку бацькі, так і з боку маці.

Артыкул 1060. Спадчыннікі чацвёртай чаргі

1. Пры адсутнасці ў памерлага спадчыннікаў першай, другой і трэцяй чаргі спадчыннікамі паводле закона чацвёртай чаргі з'яўляюцца паўнародныя і непаўнародныя браты і сёстры бацькоў спадчынадаўца (дзядзькі і цёткі спадчынадаўца).

2. Стрыечныя браты і сёстры спадчынадаўца атрымліваць спадчыну паводле права прадстаўлення.

Артыкул 1061. Спадчыннікі наступных чэргаў

1. Пры адсутнасці ў памерлага спадчыннікаў першай, другой, трэцяй і чацвёртай чаргі (артыкулы 1057–1060) права атрымліваць у спадчыну паводле закона атрымліваюць сваякі спадчынадаўца трэцяй, чацвёртай, пятай і шостай ступені роднасці, якія не адносяцца да спадчыннікаў папярэдніх чэргаў, прычым сваякі больш блізкай ступені роднасці ўстараняюць ад успадкавання сваякоў далейшай ступені роднасці.

2. Ступень роднасці вызначаецца колькасцю нараджэнняў, якія аддзяляюць сваякоў адзін ад аднаго. Нараджэнне самога спадчынадаўца ў гэту колькасць не ўваходзіць.

3. У адпаведнасці з гэтым артыкулам выклікаюцца да атрымання спадчыны ў якасці:

1) сваякоў трэцяй ступені роднасці – прадзеды і прабабкі спадчынадаўца;

2) сваякоў чацвёртай ступені роднасці – дзеці родных пляменнікаў і пляменніц спадчынадаўца (стрыечныя ўнукі і ўнучкі) і родныя браты і сёстры яго дзядоў і бабак (стрыечныя дзяды і бабкі);

3) сваякоў пятай ступені роднасці – дзеці яго стрыечных унукаў і ўнучак (стрыечныя праўнукі і праўнучкі), дзеці яго стрыечных братоў і сясцёр (стрыечныя пляменнікі і пляменніцы) і дзеці яго стрыечных дзядоў і бабак (стрыечныя дзядзькі і цёткі);

4) сваякоў шостай ступені роднасці – дзеці яго стрыечных праўнукаў і праўнучак (стрыечныя прапраўнукі і прапраўнучкі), дзеці яго стрыечных пляменнікаў і пляменніц (траюрадныя ўнукі і ўнучкі) і дзеці яго стрыечных дзядзькаў і цётак (траюрадныя браты і сёстры).

4. Спадчыннікі адной ступені роднасці, якія выклікаюцца да атрымання спадчыны, атрымліваць спадчыну ў роўных долях.

Артыкул 1062. Атрыманне спадчыны паводле права прадстаўлення

1. У выпадках, прадугледжаных пунктам 2 артыкула 1057, пунктам 2 артыкула 1058 і пунктам 2 артыкула 1060 гэтага Кодэкса, доля спадчынніка паводле закона, памерлага да адкрыцця спадчыны ці адначасова са спадчынадаўцам, пераходзіць па праве прадстаўлення да яго адпаведных нашчадкаў і дзеліцца паміж імі пароўну.

2. Не атрымліваюць спадчыну па праве прадстаўлення нашчадкі спадчынніка паводле закона, пазбаўленага спадчынадаўцам спадчыны, калі аб гэтым указана ў завяшчанні (пункт 2 артыкула 1041).

3. Нашчадкі памерлага да адкрыцця спадчыны ці адначасова са спадчынадаўцам спадчынніка, які мог быць адхілены ад успадкавання на падставах, указаных у артыкуле 1038 гэтага Кодэкса, могуць быць адхілены судом ад успадкавання паводле права прадстаўлення, калі суд палічыць, што выкліканне іх да ўспадкавання супярэчыць асновам маралі.

Артыкул 1063. Непрацаздольныя ўтрыманцы спадчынадаўца

1. Грамадзяне, якія адносяцца да ліку спадчыннікаў паводле закона, указаных у артыкулах 1058–1061 гэтага Кодэкса, і непрацаздольныя да моманту адкрыцця спадчыны, але не ўваходзяць у кола спадчыннікаў той чаргі, якая выклікаецца да атрымання спадчыны, атрымліваюць спадчыну разам са спадчыннікамі гэтай чаргі, калі не менш за год да смерці спадчынадаўца знаходзіліся на яго забеспячэнні незалежна ад таго, ці пражывалі яны сумесна са спадчынадаўцам. Непрацаздольныя ўтрыманцы, якія выклікаюцца да атрымання спадчыны на падставе гэтага пункта разам са спадчыннікамі адной з папярэдніх чэргаў, атрымліваюць спадчыну не больш за адну чацвёртую частку спадчыны, аднак, калі спадчынадавец быў абавязаны паводле закона іх утрымліваць, яны атрымліваюць у спадчыну нароўні са спадчыннікамі гэтай чаргі.

2. Да ліку спадчыннікаў паводле закона адносяцца грамадзяне, якія не ўваходзяць у кола спадчыннікаў, указаных у артыкулах 1057–1061 гэтага Кодэкса, але да моманту адкрыцця спадчыны з'яўляліся непрацаздольнымі і не менш за адзін год знаходзіліся на забеспячэнні спадчынадаўца і пражывалі сумесна з ім. Пры наяўнасці іншых спадчыннікаў паводле закона яны атрымліваюць спадчыну разам са спадчыннікамі той чаргі, якая выклікаецца да атрымання спадчыны, аднак не больш за адну чацвёртую частку спадчыны. Пры адсутнасці ў памерлага іншых спадчыннікаў указаныя непрацаздольныя ўтрыманцы спадчынадаўца атрымліваць спадчыну самастойна ў роўных долях.

Артыкул 1064. Права на абавязковую долю ў спадчыне

1. Непаўналетнія ці непрацаздольныя дзеці спадчынадаўца, а таксама яго непрацаздольныя сужэнец і бацькі атрымліваюць спадчыну незалежна ад зместу завяшчання не менш за палову долі, якая належала б кожнаму з іх пры атрыманні спадчыны паводле закона (абавязковая доля).

2. У абавязковую долю залічваецца ўсё, што спадчыннік, які мае права на такую долю, атрымлівае са спадчыны па якой-небудзь падставе, у тым ліку кошт маёмасці, якая складаецца з прадметаў звычайнага хатняга абсталявання і ўжытку, і кошт устаноўленага на карысць такога спадчынніка завяшчальнага адпісання.

Абавязковая доля вылучаецца з незавешчанай часткі маёмасці, а калі яе недастаткова, то і за кошт завешчанай маёмасці.

Калі ажыццяўленне права на абавязковую долю ў спадчыне пацягне за сабой немагчымасць перадаць спадчынніку паводле завяшчання маёмасць, якой спадчыннік, што мае права на абавязковую долю, пры жыцці спадчынадаўца не карыстаўся, а спадчыннік паводле завяшчання карыстаўся для пражывання (жылы дом, кватэра, іншае жылое памяшканне, дача і да т. п.) ці выкарыстоўваў у якасці асноўнай крыніцы атрымання сродкаў да існавання (прылады працы, творчая майстэрня і да т. п.), суд можа з улікам маёмаснага становішча спадчыннікаў, якія маюць права на абавязковую долю, зменшыць памер абавязковай долі.

3. Любыя абмежаванні і абцяжарванні, устаноўленыя ў завяшчанні для спадчынніка, які мае права на абавязковую долю ў спадчыне, сапраўдныя толькі ў

адносінах да той часткі спадчыны, якая пераходзіць да яго і перавышае абавязковую долю.

Артыкул 1065. Правы сужэнца пры атрыманні спадчыны

1. Права атрымання спадчыны, якое належыць сужэнцу паводле завяшчання ці закона, не закранае іншых яго маёмасных правоў, звязаных са знаходжаннем у шлюбе са спадчынадаўцам, у тым ліку права ўласнасці на частку маёмасці, сумесна нажытай у шлюбе.

2. Паводле рашэння суда сужэнец можа быць адхілены ад успадкавання паводле закона, за выключэннем успадкавання на падставе артыкула 1064 гэтага Кодэкса, калі будзе даказана, што шлюб са спадчынадаўцам фактычна спыніўся да адкрыцця спадчыны і сужэнцы на працягу не менш пяці гадоў да адкрыцця спадчыны пражывалі асобна і не вялі агульную гаспадарку.

Артыкул 1066. Ахова спадчыны і кіраванне ёй

1. Для абароны правоў спадчыннікаў, адпісаннеатрымальнікаў і іншых зацікаўленых асоб натарыус па месцы адкрыцця спадчыны прымае ўказаныя ў артыкулах 1067 і 1068 гэтага Кодэкса і іншыя неабходныя меры па ахове спадчыны і кіраванні ёй.

2. Меры па ахове спадчыны ці кіраванні ёй прымаюцца натарыусам па заяве аднаго ці некалькіх спадчыннікаў, выканаўцы завяшчання, органа мясцовага кіравання і самакіравання ці іншых асоб, якія дзейнічаюць у інтарэсах захавання спадчыннай маёмасці. Натарыус мае права па ўласнай ініцыятыве прыняць меры па ахове спадчыны ці кіраванні ёй.

3. У мэтах выяўлення складу спадчыны і яе аховы натарыус мае права запытваць у банкаў і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый звесткі аб грашах (валюце), валютных і іншых каштоўнасцях, якія маюцца ў іх ва ўкладах (дэпазітах), на рахунках ці перададзеных ім на ўтрыманне і якія належаць спадчынадаўцу. Атрыманыя звесткі натарыус можа паведамляць толькі выканаўцу завяшчання і спадчыннікам.

4. Меры па ахове спадчыны і кіраванні ёй ажыццяўляюцца з дня складання вопісу ў адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 1067 гэтага Кодэкса на працягу тэрміну, які вызначаецца натарыусам з улікам характару і каштоўнасці спадчыны і часу, неабходнага спадчыннікам, але не больш чым на працягу аднаго года.

5. Ахова спадчыны і кіраванне ёй ажыццяўляюцца платна (артыкул 1085), калі заканадаўствам не ўстаноўлена іншае.

6. У выпадку, калі спадчынная маёмасць знаходзіцца ў розных месцах, натарыус па месцы адкрыцця спадчыны накіроўвае праз органы юстыцыі натарыусу ці службовай асобе, упаўнаважанай учыняць натарыяльныя дзеянні, па месцы знаходжання адпаведнай часткі спадчыннай маёмасці абавязковае для выканання даручэнне аб ахове гэтай маёмасці ці кіраванні ёй.

Артыкул 1067. Меры па ахове спадчыны

1. Для аховы спадчыны натарыус робіць вопіс спадчыннай маёмасці пры ўдзеле двух сведак, якія адпавядаюць патрабаванням, устаноўленым пунктам 3 артыкула 1044 гэтага Кодэкса, а таксама зацікаўленых асоб, якія пажадалі прысутнічаць пры вопісе маёмасці.

2. Наяўныя грошы (валюта), якія ўваходзяць у склад спадчыны, уносяцца ў дэпазіт натарыуса, дыпламатычнага агента дыпламатычнага прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь і консульскай службовай асобы консульскай установы

Рэспублікі Беларусь, а валютныя каштоўнасці, вырабы з каштоўных камянёў і металаў і каштоўныя паперы, якія не патрабуюць кіравання імі, перадаюцца банку ці нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі для захоўвання паводле дагавора ў парадку, прадугледжаным артыкулам 811 гэтага Кодэкса.

3. Зброя, якая ўваходзіць у склад спадчыны, перадаецца натарыусам на захоўванне органам унутраных спраў.

4. Маёмасць, якая ўваходзіць у склад спадчыны, не ўказаная ў пунктах 2 і 3 гэтага артыкула, калі яна не патрабуе кіравання, перадаецца натарыусам паводле дагавора на захоўванне каму-небудзь са спадчыннікаў, а пры немагчымасці перадаць яго спадчыннікам – іншай асобе па меркаванні натарыуса.

5. Парадак вопісу натарыусам спадчыннай маёмасці і прыняцця ім мер да аховы гэтай маёмасці, у тым ліку абавязковыя і іншыя ўмовы дагавораў яе ўтрымання, а таксама парадак вызначэння ўзнагароды за яе ўтрыманне ўстанаўліваюцца заканадаўствам.

Артыкул 1068. Меры па кіраванні спадчынай

1. Калі ў складзе спадчыны маецца маёмасць, якая патрабуе не толькі аховы, але і кіравання (прадпрыемства, доля ў статутным фондзе гаспадарчай суполкі ці таварыства, каштоўныя паперы, выключныя правы і да т. п.), натарыус у адпаведнасці з артыкулам 909 гэтага Кодэкса ў якасці даверніка заключае дагавор давернага кіравання гэтай маёмасцю.

2. Абавязковыя і іншыя ўмовы дагавора давернага кіравання спадчыннай маёмасцю, парадак яго заключэння і вызначэння памеру ўзнагароды давернаму кіраўніку ўстанаўліваюцца заканадаўствам у адпаведнасці з правіламі главы 52 гэтага Кодэкса, калі іншае не вынікае з сутнасці адносін па даверным кіраванні спадчынай.

ГЛАВА 72
НАБЫЦЦЁ СПАДЧЫНЫ

Артыкул 1069. Прыняцце спадчыны

1. Для набыцця спадчыны спадчыннік павінен яе прыняць.

Для набыцця вымарачнай спадчыны (артыкул 1039) прыняцце спадчыны не патрабуецца. Такая спадчына пераходзіць ва ўласнасць адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі на падставе рашэння суда, якім спадчына прызнаецца вымарачнай.

2. Прыняцце спадчыннікам часткі спадчыны азначае прыняцце ўсёй належнай яму спадчыны, у чым бы яна ні заключалася і дзе б ні знаходзілася.

Не дапускаецца прыняцце спадчыны пад умовай ці з агаворкамі.

3. Прыняцце спадчыны адным ці некалькімі спадчыннікамі не азначае прыняцця спадчыны астатнімі спадчыннікамі.

4. Прынятая спадчына прызнаецца належнай спадчынніку з часу адкрыцця спадчыны незалежна ад моманту дзяржаўнай рэгістрацыі права спадчынніка на гэту маёмасць, калі права падлягае рэгістрацыі.

5. Непрыняцце спадчыннікам спадчыны цягне за сабой тыя ж наступствы, што і яго адмова ад спадчыны без указання асобы, на карысць якой ён адмовіўся ад спадчыны, паколькі іншае не ўстаноўлена законам.

Артыкул 1070. Спосабы прыняцця спадчыны

1. Прыняцце спадчыны ажыццяўляецца падачай натарыусу па месцы адкрыцця спадчыны заявы спадчынніка аб прыняцці спадчыны або яго заявы аб выдачы пасведчання аб праве на спадчыну.

Прыняцце спадчыны праз прадстаўніка магчымае, калі ў даверанасці спецыяльна прадугледжана паўнамоцтва на яе прыняцце.

2. Прызнаецца, калі не даказана іншае, што спадчыннік прыняў спадчыну, калі ён фактычна ўступіў у валоданне ці кіраванне спадчыннай маёмасцю, у прыватнасці, калі спадчыннік:

1) прыняў меры да захавання маёмасці, да абароны яе ад замахаў ці прэтэнзій трэціх асоб;

2) правёў за свой кошт расходы на ўтрыманне маёмасці;

3) аплаціў за свой кошт даўгі спадчынадаўца ці атрымаў ад трэціх асоб належныя яму сумы.

Артыкул 1071. Тэрмін для прыняцця спадчыны

1. Спадчына можа быць прынята на працягу шасці месяцаў з дня адкрыцця спадчыны.

2. Калі права атрымання спадчыны ўзнікае для іншых асоб у выпадку адмовы спадчынніка ад спадчыны, яны могуць прыняць спадчыну на працягу астатняй часткі тэрміну, указанага ў пункце 1 гэтага артыкула, а калі яна меншая за тры месяцы, то на працягу трох месяцаў.

3. Асобы, для якіх права атрымання спадчыны ўзнікае толькі ў выпадку непрыняцця спадчыны іншым спадчыннікам, могуць прыняць спадчыну да сканчэння трох месяцаў з дня заканчэння тэрміну, указанага ў пункце 1 гэтага артыкула.

Артыкул 1072. Прыняцце спадчыны пасля сканчэння ўстаноўленага тэрміну

1. Па заяве спадчынніка, які прапусціў тэрмін для прыняцця спадчыны (артыкул 1071), суд можа прызнаць, што ён прыняў спадчыну, калі палічыць прычыны пропуску тэрміну ўважлівымі, у прыватнасці, калі ўстановіць, што гэты тэрмін быў прапушчаны таму, што спадчыннік не ведаў і не павінен быў ведаць аб адкрыцці спадчыны, і пры ўмове, што спадчыннік, які прапусціў тэрмін для прыняцця спадчыны, звярнуўся ў суд на працягу шасці месяцаў пасля таго, як прычыны пропуску гэтага тэрміну адпалі.

Прызнаўшы, што спадчыннік прыняў спадчыну, суд вырашае вынікаючыя з гэтага пытанні правоў іншых спадчыннікаў на спадчынную маёмасць, а таксама прызнае несапраўднымі выдадзеныя раней пасведчанні аб праве на спадчыну. У гэтым выпадку выдача новага пасведчання аб праве на спадчыну не патрабуецца.

2. Спадчына можа быць прынята спадчыннікам пасля сканчэння тэрміну, устаноўленага для яго прыняцця, без звароту ў суд пры ўмове згоды на гэта ўсіх астатніх спадчыннікаў, якія прынялі спадчыну. Подпісы гэтых спадчыннікаў пад дакументамі, якія ўтрымліваюць такую згоду, павінны быць засведчаны ў парадку, указаным у пункце 2 артыкула 1083 гэтага Кодэкса. Такое пагадненне спадчыннікаў з'яўляецца падставай для анулявання натарыусам выдадзенага раней пасведчання аб праве на спадчыну і выдачы новага пасведчання.

Калі на падставе раней выдадзенага пасведчання аб праве на спадчыну, пасля ануляванага натарыусам, была ажыццёўлена дзяржаўная рэгістрацыя правоў на нерухомую маёмасць, то выдадзенае натарыусам новае пасведчанне з'яўляецца падставай для ўнясення адпаведных змяненняў у запіс аб дзяржаўнай рэгістрацыі.

3. Спадчыннік, які прыняў спадчыну ў адпаведнасці з гэтым артыкулам пасля сканчэння ўстаноўленага для гэтага тэрміну, мае права на атрыманне належнай яму спадчыны ў адпаведнасці з правіламі артыкулаў 973, 974, 976 і 977 гэтага Кодэкса.

У выпадку, указаным у частцы першай пункта 2 гэтага артыкула, гэтыя правілы прымяняюцца пастолькі, паколькі натарыяльна пасведчаным пагадненнем паміж спадчыннікамі не прадугледжана іншае.

Артыкул 1073. Пераход права на прыняцце спадчыны (спадчынная трансмісія)

1. Калі спадчыннік, выкліканы да атрымання спадчыны паводле завяшчання ці паводле закона, памёр пасля адкрыцця спадчыны, не паспеўшы яе прыняць, права на прыняцце належнай яму спадчыны пераходзіць да яго спадчыннікаў. Права на прыняцце спадчыны ў парадку спадчыннай трансмісіі не ўваходзіць у склад спадчыны, якая адкрылася пасля смерці такога спадчынніка.

2. Права прыняць спадчыну, якая належыць памерламу спадчынніку, можа быць ажыццёўлена яго спадчыннікамі на агульных падставах у адпаведнасці з артыкуламі 1069–1072 гэтага Кодэкса.

Калі пасля смерці спадчынніка частка астатняга тэрміну для прыняцця спадчыны складае менш за тры месяцы, яна падаўжаецца да трох месяцаў.

Пасля сканчэння тэрміну для прыняцця спадчыны спадчыннікі памерлага спадчынніка могуць быць прызнаны судом прыняўшымі спадчыну ў адпаведнасці з артыкулам 1072 гэтага Кодэкса, калі суд знойдзе ўважлівымі прычыны пропуску гэтага тэрміну спадчыннікамі памерлага.

3. Права спадчынніка прыняць частку спадчыны ў якасці абавязковай долі (артыкул 1064) не пераходзіць да яго спадчыннікаў.

Артыкул 1074. Права адмовіцца ад спадчыны

1. Спадчыннік мае права адмовіцца ад спадчыны на працягу тэрміну, устаноўленага для прыняцця спадчыны (артыкул 1071), у тым ліку і ў выпадку, калі ён ужо прыняў спадчыну.

Калі спадчыннік прыняў спадчыну, фактычна ўступіў у валоданне ці кіраванне спадчыннай маёмасцю (пункт 2 артыкула 1070), суд можа па заяве гэтага спадчынніка прызнаць, што ён адмовіўся ад спадчыны, і пасля сканчэння ўстаноўленага тэрміну, калі знойдзе прычыны яго пропуску ўважлівымі.

2. Адмова ад спадчыны не можа быць пасля зменена ці ўзята назад.

3. Адмова ад спадчыны здзяйсняецца падачай заявы спадчынніка натарыусу па месцы адкрыцця спадчыны.

У выпадку, калі заява падаецца натарыусу не самім спадчыннікам, подпіс спадчынніка на такой заяве павінен быць засведчаны натарыусам ці службовай асобай, упаўнаважанай здзяйсняць натарыяльныя дзеянні (пункт 6 артыкула 1045).

Адмова ад спадчыны праз прадстаўніка магчымая, калі ў даверанасці спецыяльна прадугледжана паўнамоцтва на такую адмову.

4. Адмова ад спадчыны ў выпадках, калі спадчыннікам з'яўляецца непаўналетні або грамадзянін, прызнаны недзеяздольным ці абмежавана дзеяздольным, дапускаецца з папярэдняга дазволу органа апекі і папячыцельства.

Артыкул 1075. Адмова ад спадчыны на карысць іншай асобы, адмова ад часткі спадчыны ці пад умовай

1. Пры адмове ад спадчыны спадчыннік мае права ўказаць, што ён адмовіўся ад яго на карысць іншых асоб з ліку спадчыннікаў паводле завяшчання ці

спадчыннікаў паводле закона любой чаргі, у тым ліку тых, якія атрымліваць спадчыну па праве прадстаўлення.

Не дапускаецца адмова на карысць іншай асобы:

1) ад маёмасці, якая атрымліваецца ў спадчыну паводле завяшчання, калі ўся маёмасць спадчынадаўца завешчана прызначаным ім спадчыннікам;

2) ад абавязковай долі ў спадчыне (артыкул 1064);

3) калі спадчынніку падпрызначаны спадчыннік (артыкул 1042).

2. Адмова ад спадчыны з агаворкамі ці пад умовай не дапускаецца.

3. Адмова ад часткі належнай спадчынніку спадчыны не дапускаецца. Але калі спадчыннік выклікаецца да атрымання спадчыны і паводле завяшчання, і паводле закона, ён мае права адмовіцца ад спадчыны, належнай яму на адной з гэтых падстаў або на абедзвюх падставах.

Артыкул 1076. Права адмовіцца ад атрымання завяшчальнага адпісання

1. Адпісаннеатрымальнік мае права адмовіцца ад атрымання завяшчальнага адпісання.

Адмова ад часткі належнай адпісаннеатрымальніку маёмасці, адмова на карысць іншай асобы, з агаворкамі ці пад умовай не дапускаецца.

2. У выпадку, калі адпісаннеатрымальнік з'яўляецца адначасова спадчыннікам, яго права, прадугледжанае гэтым артыкулам, не залежыць ад яго права прыняць спадчыну ці адмовіцца ад яе.

3. Калі адпісаннеатрымальнік адмовіўся ад завяшчальнага адпісання, спадчыннік, які абавязаны выканаць завяшчальнае адпісанне, вызваляецца ад абавязку яго выканання.

Артыкул 1077. Прырашчэнне спадчынных долей

1. Калі спадчыннік не прыме спадчыну, адмовіцца ад спадчыны без указання іншага спадчынніка, на карысць якога ён адмаўляецца, будзе адхілены ад успадкавання на падставах, указаных у артыкуле 1038 гэтага Кодэкса, або ў выніку прызнання завяшчання несапраўдным, то частка спадчыны, якая належала б такому спадчынніку, які адпаў, паступае да спадчыннікаў паводле закона, выкліканым да ўспадкавання, і размяркоўваецца паміж імі прапарцыянальна іх спадчынным долям.

Калі спадчынадавец завяшчаў усю маёмасць прызначаным ім спадчыннікам, частка спадчыны, што належала спадчынніку, які адмовіўся ад спадчыны ці адпаў з-за іншых указаных вышэй прычын, паступае да астатніх спадчыннікаў паводле завяшчання і размяркоўваецца паміж імі прапарцыянальна іх спадчынным долям, паколькі іншае не прадугледжана завяшчаннем.

2. Правілы, якія ўтрымліваюцца ў пункце 1 гэтага артыкула, не прымяняюцца, калі спадчынніку, які адмовіўся ці адпаў з-за іншых прычын, падпрызначаны спадчыннік (пункт 2 артыкула 1042).

Артыкул 1078. Агульная ўласнасць спадчыннікаў на спадчыну

Пры атрыманні спадчыны паводле закона, калі спадчынная маёмасць пераходзіць да двух ці некалькіх спадчыннікаў, і пры атрыманні спадчыны паводле завяшчання, калі яно завешчана двум ці некалькім спадчыннікам без указання канкрэтных рэчаў і правоў, якія атрымліваюцца ў спадчыну кожным з іх, маёмасць паступае з дня адкрыцця спадчыны ў агульную долевую ўласнасць спадчыннікаў. Да агульнай уласнасці спадчыннікаў на спадчынную маёмасць прымяняюцца правілы главы 16 гэтага Кодэкса аб агульнай долевай уласнасці, калі іншае не ўстаноўлена правіламі гэтага Кодэкса аб атрыманні спадчыны.

Артыкул 1079. Падзел спадчыны па пагадненні паміж спадчыннікамі

1. Маёмасць, якая ўваходзіць у склад спадчыны і знаходзіцца ў агульнай долевай уласнасці двух ці некалькіх спадчыннікаў, можа быць падзелена па пагадненні паміж імі.

2. Пагадненне аб падзеле спадчыны, у тым ліку аб выдзеле з яе долі аднаго са спадчыннікаў, калі яно заключана да выдачы пасведчання аб праве на спадчыну і натарыяльна засведчана, з'яўляецца падставай для выдачы спадчыннікам пасведчання аб праве на спадчыну (артыкул 1083) з указаннем у пасведчанні канкрэтных рэчаў.

3. Пагадненне спадчыннікаў аб падзеле спадчыны, калі яно заключана на працягу шасці месяцаў пасля выдачы пасведчання аб праве на спадчыну і натарыяльна засведчана, з'яўляецца падставай для дзяржаўнай рэгістрацыі спадчыннікамі іх права на нерухомую маёмасць у адпаведнасці з гэтым пагадненнем.

4. Выключаны.

Артыкул 1080. Падзел спадчыны судом

Пры недасягненні спадчыннікамі пагаднення аб падзеле спадчыны, у тым ліку аб выдзеле з яе долі аднаго са спадчыннікаў, падзел праводзіцца ў судовым парадку ў адпаведнасці з артыкулам 255 гэтага Кодэкса.

Артыкул 1081. Ахова інтарэсаў дзіцяці пры падзеле спадчыны

1. Пры наяўнасці спадчынніка, які зачаты, але яшчэ не нарадзіўся, падзел спадчыны можа быць праведзены толькі пасля нараджэння такога спадчынніка.

2. Для аховы інтарэсаў непаўналетніх да ўдзелу ў складанні пагаднення аб падзеле спадчыны (артыкул 1079) і да разгляду ў судзе справы аб падзеле спадчыны (артыкул 1080) павінен быць запрошаны прадстаўнік органа апекі і папячыцельства .

Артыкул 1082. Пераважнае права на пэўныя аб'екты са складу спадчыны пры яе падзеле

1. Спадчыннік, які валодае сумесна са спадчынадаўцам правам агульнай уласнасці на непадзельную рэч (артыкул 133), доля ў праве на якую ўваходзіць у склад спадчыны, мае пры падзеле спадчыны пераважнае права на атрыманне ў кошт сваёй спадчыннай долі рэчы, якая знаходзіцца ў агульнай уласнасці.

2. Спадчыннік, які пастаянна карыстаўся сумесна са спадчынадаўцам ці самастойна непадзельнай рэччу (артыкул 133), якая ўваходзіць у склад спадчыны, мае пры падзеле спадчыны пераважнае права на атрыманне ў кошт сваёй спадчыннай долі гэтай рэчы. Спадчыннікі, для якіх належныя спадчынадаўцу жылы дом, кватэра ці іншае жылое памяшканне на працягу года да адкрыцця спадчыны з'яўляліся адзіным месцам пастаяннага пражывання, маюць пры падзеле спадчыны пераважнае права на атрыманне ў кошт іх спадчынных долей гэтага жылога памяшкання, а таксама хатняга начыння і прадметаў хатняга ўжытку, якія знаходзяцца ў гэтым памяшканні.

3. Неадпаведнасць маёмасці, аб пераважным праве на атрыманне якой заяўляе спадчыннік на падставе гэтага артыкула, яго спадчыннай долі ўстараняецца перадачай астатнім спадчыннікам іншай маёмасці са складу спадчыны або іншай кампенсацыяй, у тым ліку выплатай адпаведнай грашовай сумы. Калі пагадненнем паміж усімі спадчыннікамі не ўстаноўлена іншае, ажыццяўленне кім-небудзь з іх пераважнага права магчымае пасля перадачы адпаведнай кампенсацыі іншым спадчыннікам.

Артыкул 1083. Пасведчанне аб праве на спадчыну

1. Пасведчанне аб праве на спадчыну выдаецца па месцы адкрыцця спадчыны натарыусам ці службовай асобай, якой дадзена права здзяйснення такога натарыяльнага дзеяння.

2. Пасведчанне аб праве на спадчыну выдаецца па заяве спадчыннікa, які прыняў спадчыну ці прымае яе, падачай гэтай заявы (артыкул 1070). У выпадку, калі заява аб выдачы пасведчання аб праве на спадчыну пададзена натарыусу не самім спадчыннікам, подпіс спадчынніка на заяве павінен быць засведчаны натарыусам ці службовай асобай, упаўнаважанай здзяйсняць натарыяльныя дзеянні (пункт 6 артыкула 1045). Па жаданні спадчыннікаў пасведчанне можа быць выдадзена ўсім спадчыннікам разам ці кожнаму спадчынніку паасобку.

3. У выпадку выяўлення пасля выдачы пасведчання аб праве на спадчыну спадчыннай маёмасці, на якую пасведчанне не было выдадзена, выдаецца дадатковае пасведчанне аб праве на спадчыну.

Артыкул 1084. Тэрміны выдачы пасведчання аб праве на спадчыну

1. Пасведчанне аб праве на спадчыну выдаецца спадчыннікам пасля сканчэння шасці месяцаў з дня адкрыцця спадчыны, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

2. Пры атрымання спадчыны як паводле закона, так і паводле завяшчання пасведчанне аб праве на спадчыну можа быць выдадзена раней сканчэння шасці месяцаў з дня адкрыцця спадчыны, калі маюцца верагодныя даныя аб тым, што акрамя асоб, якія звярнуліся за выдачай пасведчання, іншых спадчыннікаў у адносінах да спадчыны ці яго адпаведнай часткі не маецца.

3. Выдача пасведчання аб праве на спадчыну можа быць прыпынена па пастанове суда ў выпадку спрэчкі аб праве ўласнасці на спадчынную маёмасць.

Артыкул 1085. Пакрыццё расходаў, выкліканых смерцю спадчынадаўца, аховай спадчыны і кіраваннем ёй

1. Неабходныя расходы, выкліканыя перадсмяротнай хваробай спадчынадаўца, расходы на пахаванне спадчынадаўца, а таксама расходы, звязаныя з аховай ці кіраваннем спадчыннай маёмасцю, кампенсуюцца за кошт спадчыны ў межах яе кошту.

2. Да атрымання спадчыннікамі пасведчання аб праве на спадчыну патрабаванні аб пакрыцці расходаў, указаных у пункце 1 гэтага артыкула, могуць быць прад'яўлены да спадчынніка, які прыняў спадчыну, ці да выканаўцы завяшчання. Пры адсутнасці ўказаных асоб выплата неабходных сум, у тым ліку з укладу (дэпазіту) ці з рахунку спадчынадаўца, можа быць праведзена паводле рашэння натарыуса. У выпадку адмовы ў задавальненні патрабаванняў спрэчка вырашаецца судом.

3. Пасля атрымання спадчыннікамі пасведчання аб праве на спадчыну расходы, указаныя ў пункце 1 гэтага артыкула, пакрываюць спадчыннікі ў межах кошту спадчыннай маёмасці, якая перайшла да кожнага з іх, да пагашэння патрабаванняў па даўгах спадчынадаўцы.

Артыкул 1086. Адказнасць спадчыннікаў па даўгах спадчынадаўца

1. Кожны са спадчыннікаў, якія прынялі спадчыну, адказвае па даўгах спадчынадаўцы ў межах кошту спадчыннай маёмасці, якая перайшла да яго.

2. Спадчыннік, які прыняў спадчыну ў выніку спадчыннай трансмісіі (артыкул 1073), адказвае ў межах кошту гэтай спадчыннай маёмасці па даўгах спадчынадаўца, якому гэта маёмасць належала, і не адказвае гэтай маёмасцю па даўгах спадчынніка, ад якога да яго перайшло права на прыняцце спадчыны.

Спадчыннік, які атрымаў спадчынную маёмасць як непасрэдна ў выніку адкрыцця спадчыны, так і ў выніку спадчыннай трансмісіі (артыкул 1073), не адказвае па даўгах спадчынніка, ад якога да яго перайшло права на прыняцце спадчыны, а па даўгах спадчынадаўца адказвае ў межах кошту спадчыннай маёмасці, атрыманай на абедзвюх падставах.

3. Спадчыннікі адказваюць па даўгах спадчынадаўца салідарна (артыкул 304), але кожны з іх адказвае ў межах, указаных у пункце 1 гэтага артыкула.

4. Крэдыторы спадчынадаўца маюць права на працягу тэрміну іскавай даўнасці прад'явіць свае патрабаванні спадчыннікам, якія прынялі спадчыну. Да прыняцця спадчыны патрабаванні крэдытораў могуць быць прад'яўлены да выканаўцы завяшчання ці заяўлены да спадчыннай маёмасці. У апошнім выпадку разгляд іску прыпыняецца да прыняцця спадчыны спадчыннікамі ці пераходу яе як вымарачнай да адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі.

ГЛАВА 73
АСАБЛІВАСЦІ ЎСПАДКАВАННЯ АСОБНЫХ ВІДАЎ МАЁМАСЦІ

Артыкул 1087. Атрыманне ў спадчыну права на кошт долі ў гаспадарчай суполцы і на кошт паю ў вытворчым кааператыве

1. У склад спадчыны ўдзельніка поўнай суполкі ці поўнага супольніка ў камандытнай суполцы ўваходзіць права на кошт долі гэтага ўдзельніка ў статутным фондзе суполкі, калі іншае не прадугледжана ўстаноўчым дагаворам. У выпадку прыняцця спадчынніка ў лік удзельнікаў поўнай суполкі (пункт 1 артыкула 78) або ў якасці поўнага супольніка ў камандытную суполку кошт долі яму не выплачваецца. Спадчыннікі ўдзельніка поўнай суполкі ці поўнага супольніка ў камандытнай суполцы нясуць адказнасць па абавязацельствах суполкі перад трэцімі асобамі ў парадку, прадугледжаным артыкулам 72 гэтага Кодэкса.

2. У склад спадчыны члена вытворчага кааператыва ўваходзіць права на кошт паю памерлага члена кааператыва. У выпадку прыняцця спадчынніка ў члены кааператыва (пункт 4 артыкула 111) кошт паю яму не выплачваецца.

Артыкул 1088. Атрыманне ў спадчыну долі (паю) укладчыка ў камандытнай суполцы, удзельніка (акцыянера) гаспадарчага таварыства і члена спажывецкага кааператыва

1. У склад спадчыны ўдзельніка камандытнай суполкі, які з'яўляўся ўкладчыкам, уваходзіць доля гэтага ўкладчыка ў статутным фондзе суполкі.

2. У склад спадчыны ўдзельніка таварыства з абмежаванай адказнасцю ці таварыства з дадатковай адказнасцю ўваходзіць доля гэтага ўдзельніка ў статутным фондзе таварыства, калі статутам таварыства не прадугледжана, што такі пераход долі да спадчыннікаў дапускаецца толькі са згоды астатніх удзельнікаў таварыства. Адмова ў згодзе на пераход долі цягне за сабой абавязак таварыства выплаціць спадчыннікам яе кошт у парадку, прадугледжаным пунктам 6 артыкула 92 гэтага Кодэкса і статутам таварыства.

3. У склад спадчыны ўдзельніка акцыянернага таварыства (акцыянера) уваходзяць належныя яму акцыі.

4. У склад спадчыны члена спажывецкага кааператыва ўваходзіць пай памерлага члена кааператыва.

5. Спадчыннік удзельніка камандытнай суполкі, які з'яўляўся ўкладчыкам, удзельніка таварыства з абмежаванай адказнасцю ці таварыства з дадатковай адказнасцю або акцыянера ў акцыянерным таварыстве становіцца ўдзельнікам

(акцыянерам) адпаведнай суполкі ці таварыства , за выключэннем выпадку, калі па статуце таварыства з абмежаванай адказнасцю ці таварыства з дадатковай адказнасцю для гэтага патрабуецца згода ўдзельнікаў таварыства і ў такой згодзе адмоўлена.

6. Спадчыннік члена спажывецкага кааператыва валодае правам быць прынятым у члены адпаведнага кааператыва.

7. Рашэнне пытання аб тым, хто са спадчыннікаў можа быць прыняты ў гаспадарчую суполку ці таварыства або ў спажывецкі кааператыў у выпадку, калі правы спадчынадаўца да адпаведнай юрыдычнай асобы перайшлі да некалькіх спадчыннікаў, а таксама парадак, спосабы і тэрміны выплаты спадчыннікам, якія не сталі ўдзельнікамі таварыства, суполкі ці кааператыва, належных ім сум ці выдачы замест іх маёмасці ў натуры вызначаюцца заканадаўствам аб гаспадарчых суполках і таварыствах , аб спажывецкіх кааператывах і ўстаноўчымі дакументамі адпаведнай юрыдычнай асобы.

Артыкул 1089. Атрыманне ў спадчыну рэчаў, абмежавана здольных да абарачэння

Прыналежныя на праве ўласнасці памерламу рэчы, знаходжанне якіх у абарачэнні дапускаецца па спецыяльным дазволе (грамадзянская зброя і інш.), уваходзяць у склад спадчыны і атрымліваюцца ў спадчыну ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам з захаваннем устаноўленага заканадаўствам парадку абарачэння адпаведнай маёмасці.

Указаныя рэчы, якія ўваходзяць у склад спадчыны, забіраюцца і бяруцца на адказнае захоўванне ўпаўнаважанымі органамі дзяржаўнага кіравання (службовымі асобамі) у парадку, устаноўленым заканадаўствам.

На прыняцце спадчыны, у склад якой уваходзяць указаныя рэчы, не патрабуецца спецыяльнага дазволу. Пры гэтым не дапускаецца прыняцце спадчыны спосабамі, якія парушаюць устаноўлены заканадаўствам парадак абарачэння адпаведнай маёмасці.

Спадчыннік, які не мае спецыяльнага дазволу, не можа валодаць і карыстацца абмежавана здольнымі да абарачэння рэчамі, а таксама распараджацца імі інакш, чым гэта прадугледжана артыкулам 239 гэтага Кодэкса.

Калі спадчыннік не звярнуўся за атрыманнем спецыяльнага дазволу на працягу тэрміну, прадугледжанага заканадаўствам, або яму адмоўлена ў выдачы такога дазволу, яго права ўласнасці на ўказаныя рэчы падлягае спыненню ў адпаведнасці з артыкулам 239 гэтага Кодэкса.

Артыкул 1090. Атрыманне ў спадчыну нявыплачаных сум заработнай платы, пенсій, дапамог і выплат у пакрыццё шкоды

1. Права на атрыманне падлеглых выплаце грамадзяніну, але не атрыманых ім пры жыцці па якой-небудзь прычыне сум заработнай платы і прыраўнаваных да яе выплат, пенсій, дапамог па сацыяльным страхаванні, іншых дапамог і выплат у пакрыццё шкоды жыццю ці здароўю належыць членам сям'і, якія пражывала сумесна з памерлым, а таксама яго непрацаздольным утрыманцам незалежна ад таго, ці пражывалі яны сумесна з памерлым.

2. Патрабаванні аб выплаце сум на падставе пункта 1 гэтага артыкула могуць быць прад'яўлены да абавязаных асоб на працягу шасці месяцаў з дня адкрыцця спадчыны.

3. Калі асоб, якія мелі б на падставе пункта 1 гэтага артыкула права на атрыманне сум, не выплачаных памерламу, няма або яны не прад'явілі

патрабаванняў аб выплаце гэтых сум ва ўстаноўлены тэрмін, адпаведныя сумы ўключаюцца ў склад спадчыны і атрымліваюцца ў спадчыну на агульных падставах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

Артыкул 1091. Атрыманне ў спадчыну маёмасці, дадзенай Рэспублікай Беларусь ці адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай бязвыплатна ці на льготных умовах

Сродкі транспарту і іншая маёмасць, дадзеныя грамадзяніну Рэспублікай Беларусь ці адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай бязвыплатна ці на льготных умовах у сувязі з яго інваліднасцю ці іншымі падобнымі абставінамі, уваходзяць у склад спадчыны і атрымліваюцца ў спадчыну на агульных падставах, устаноўленых гэтым Кодэксам, за выключэннем выпадкаў, калі з устаноўленых заканадаўствам умоў давання гэтай маёмасці вынікае, што яна перадаецца толькі ў карыстанне.

Артыкул 1092. Атрыманне ў спадчыну дзяржаўных узнагарод і ганаровых знакаў

1. Дзяржаўныя ўзнагароды, якімі быў уганараваны грамадзянін і на якія распаўсюджваецца заканадаўства аб дзяржаўных узнагародах Рэспублікі Беларусь, не ўваходзяць у склад спадчыны. Перадача гэтых узнагарод пасля смерці ўзнагароджанага іншым асобам ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам аб дзяржаўных узнагародах Рэспублікі Беларусь.

2. Належныя спадчынадаўцу дзяржаўныя ўзнагароды, на якія не распаўсюджваецца заканадаўства аб дзяржаўных узнагародах Рэспублікі Беларусь, ганаровыя, памятныя і іншыя знакі, у тым ліку ўзнагароды і знакі ў складзе калекцый, уваходзяць у склад спадчыны і атрымліваюцца ў спадчыну на агульных падставах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

РАЗДЗЕЛ VII
МІЖНАРОДНАЕ ПРЫВАТНАЕ ПРАВА
ГЛАВА 74
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1093. Вызначэнне права, якое падлягае прымяненню да грамадзянска-прававых адносін, ускладненых замежным элементам

1. Права, якое падлягае прымяненню да грамадзянска-прававых адносін з удзелам замежных грамадзян ці замежных юрыдычных асоб або ўскладненых іншым замежным элементам, вызначаецца на падставе Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, гэтага Кодэкса, іншых заканадаўчых актаў, міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь і міжнародных звычаяў, якія не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

2. Пагадненне бакоў аб выбары права павінна быць яўна выказана ці прама вынікаць з умоў дагавора і абставін справы, якія разглядаюцца ў іх сукупнасці.

3. Калі ў адпаведнасці з пунктам 1 гэтага артыкула немагчыма вызначыць права, якое падлягае прымяненню, прымяняецца права, найбольш цесна звязанае з грамадзянска-прававымі адносінамі, ускладненымі замежным элементам.

4. Правілы гэтага раздзела аб вызначэнні права, якое падлягае прымяненню судом, адпаведна прымяняюцца іншымі органамі, надзеленымі правамоцтвамі вырашаць пытанне аб праве, якое падлягае прымяненню.

Артыкул 1094. Кваліфікацыя юрыдычных паняццяў

1. Пры вызначэнні права, якое падлягае прымяненню, суд грунтуецца на тлумачэнні юрыдычных паняццяў у адпаведнасці з правам краіны суда, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі.

2. Калі юрыдычныя паняцці, якія патрабуюць прававой кваліфікацыі, не вядомыя праву краіны суда ці вядомыя пад іншай назвай ці з іншым зместам і не могуць быць вызначаны шляхам тлумачэння па праве краіны суда, то пры іх кваліфікацыі можа прымяняцца права замежнай дзяржавы.

Артыкул 1095. Устанаўленне зместу нормаў замежнага права

1. Пры прымяненні замежнага права суд ці іншы дзяржаўны орган устанаўлівае змест яго нормаў у адпаведнасці з іх афіцыйным тлумачэннем, практыкай прымянення і дактрынай у адпаведнай замежнай дзяржаве.

2. У мэтах устанаўлення зместу нормаў замежнага права суд можа звярнуцца ва ўстаноўленым парадку за садзейнічаннем і растлумачэннем да Міністэрства юстыцыі, іншых кампетэнтных дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь, у тым ліку да тых, якія знаходзяцца за мяжой, або прыцягнуць экспертаў.

3. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, маюць права прадстаўляць дакументы, якія пацвярджаюць змест нормаў замежнага права, на якія яны спасылаюцца ў абгрунтаванне сваіх патрабаванняў ці пярэчанняў, і іншым чынам садзейнічаць суду ва ўстанаўленні зместу гэтых нормаў.

4. Калі змест нормаў замежнага права, нягледзячы на прынятыя ў адпаведнасці з гэтым артыкулам меры ў разумныя тэрміны, не ўстаноўлены, прымяняецца права Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 1096. Адваротная адсылка і адсылка да права трэцяй краіны

1. Любая адсылка да замежнага права ў адпаведнасці з правіламі гэтага раздзела, акрамя выпадкаў, прадугледжаных гэтым артыкулам, павінна разглядацца як адсылка да матэрыяльнага, а не калізійнага права адпаведнай краіны.

2. Адваротная адсылка да права Рэспублікі Беларусь і адсылка да права трэцяй краіны прымяняюцца ў выпадках прымянення замежнага права згодна з артыкулам 1103, пунктам 1, 3, 5 артыкула 1104, артыкулам 1106 і 1109 гэтага Кодэкса.

Артыкул 1097. Наступствы абходу акта заканадаўства

Несапраўднымі з’яўляюцца пагадненні і іншыя дзеянні ўдзельнікаў адносін, якія рэгулююцца грамадзянскім заканадаўствам, накіраваныя на тое, каб у абход правілаў гэтага раздзела аб праве, якое падлягае прымяненню, падпарадкаваць адпаведныя адносіны іншаму праву. У гэтым выпадку прымяняецца права адпаведнай дзяржавы, якое падлягае прымяненню ў адпаведнасці з гэтым раздзелам.

Артыкул 1098. Узаемнасць

1. Суд прымяняе замежнае права незалежна ад таго, ці прымяняецца ў адпаведнай замежнай дзяржаве да аналагічных адносін права Рэспублікі Беларусь, за выключэннем выпадкаў, калі прымяненне замежнага права на пачатках узаемнасці прадугледжана заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

2. Калі прымяненне замежнага права залежыць ад узаемнасці, лічыцца, што яна існуе, паколькі не даказана іншае.

Артыкул 1099. Агаворка аб публічным парадку

Замежнае права не прымяняецца ў выпадках, калі яго прымяненне супярэчыла б асновам правапарадку (публічнаму парадку) Рэспублікі Беларусь, а таксама ў іншых выпадках, прама прадугледжаных заканадаўчымі актамі. У гэтых выпадках прымяняецца права Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 1100. Прымяненне імператыўных нормаў

1. Правілы гэтага раздзела не закранаюць дзеянні імператыўных нормаў права Рэспублікі Беларусь, якія рэгулююць адпаведныя адносіны незалежна ад права, якое падлягае прымяненню.

2. Пры прымяненні права якой-небудзь краіны (акрамя Рэспублікі Беларусь), згодна з правіламі гэтага раздзела, суд можа прымяніць імператыўныя нормы права іншай краіны, якія маюць цесную сувязь з адносінамі, якія разглядаюцца, калі, згодна з правам гэтай краіны, такія нормы павінны рэгуляваць адпаведныя адносіны незалежна ад права, якое падлягае прымяненню. Пры гэтым суд павінен прымаць пад увагу прызначэнне і характар такіх нормаў, а таксама наступствы іх прымянення.

Артыкул 1101. Прымяненне права краіны з множнасцю прававых сістэм

У выпадках, калі падлягае прымяненню права краіны, у якой дзейнічаюць некалькі тэрытарыяльных ці іншых прававых сістэм, прымяняецца прававая сістэма ў адпаведнасці з правам гэтай краіны.

Артыкул 1102. Рэторсіі

Урадам Рэспублікі Беларусь могуць быць устаноўлены абмежаванні ў адказ (рэторсіі) у адносінах да правоў грамадзян і арганізацый тых дзяржаў, у якіх маюцца спецыяльныя абмежаванні правоў грамадзян і арганізацый Рэспублікі Беларусь.

ГЛАВА 75
КАЛІЗІЙНЫЯ НОРМЫ

§ 1. Асобы

Артыкул 1103. Асабісты закон фізічнай асобы

1. Асабістым законам фізічнай асобы лічыцца права краіны, грамадзянства (падданства) якой гэта асоба мае. Пры наяўнасці ў асобы грамадзянства (падданства) дзвюх ці больш дзяржаў асабістым законам лічыцца права краіны, з якой асоба найбольш цесна звязана. Калі асоба нароўні з грамадзянствам Рэспублікі Беларусь мае грамадзянства (падданства) дзвюх ці больш замежных дзяржаў, яго асабістым законам лічыцца права Рэспублікі Беларусь.

2. Асабістым законам фізічнай асобы, якая не мае доказаў сваёй прыналежнасці да грамадзянства (падданства) якой-небудзь дзяржавы, лічыцца права краіны, у якой гэта асоба пастаянна пражывае.

3. Асабістым законам фізічнай асобы, якой дадзены статус бежанца ці іншыя формы абароны, у дзяржаве, якая не з'яўляецца дзяржавай яго грамадзянства (падданства), з'яўляецца права краіны, у якой гэта асоба пастаянна пражывае.

Артыкул 1104. Праваздольнасць і дзеяздольнасць фізічнай асобы

1. Праваздольнасць і дзеяздольнасць фізічнай асобы вызначаюцца яе асабістым законам.

2. Замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства карыстаюцца ў Рэспубліцы Беларусь грамадзянскай праваздольнасцю нароўні з грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, калі іншае не вызначана Канстытуцыяй, законамі і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

3. Грамадзянская дзеяздольнасць фізічнай асобы ў адносінах да здзелак, якія заключаюцца ў Рэспубліцы Беларусь, і абавязацельстваў, якія ўзнікаюць у выніку прычынення шкоды ў Рэспубліцы Беларусь, вызначаецца па заканадаўстве Рэспублікі Беларусь.

4. Здольнасць фізічнай асобы, якая ажыццяўляе прадпрымальніцкую дзейнасць, быць індывідуальным прадпрымальнікам і мець звязаныя з гэтым правы і абавязкі вызначаецца па праве краіны, дзе фізічная асоба зарэгістравана ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. Пры адсутнасці краіны рэгістрацыі прымяняецца права краіны асноўнага месца ажыццяўлення індывідуальнай прадпрымальніцкай дзейнасці.

5. Прызнанне фізічнай асобы недзеяздольнай ці абмежавана дзеяздольнай падпарадкоўваецца праву краіны суда.

Артыкул 1105. Прызнанне фізічнай асобы адсутнай без вестак і аб’яўленне яе памерлай

Прызнанне фізічнай асобы адсутнай без вестак і аб’яўленне яе памерлай падпарадкоўваецца праву краіны суда.

Артыкул 1106. Імя фізічнай асобы

Правы фізічнай асобы на імя, яго выкарыстанне і абарону вызначаюцца яе асабістым законам, паколькі іншае не вынікае з правілаў, прадугледжаных часткай другой пункта 2 і пунктам 4 артыкула 18, артыкуламі 1115 і 1132 гэтага Кодэкса.

Артыкул 1107. Выключаны

Артыкул 1108. Выключаны

Артыкул 1109. Апека і папячыцельства

1. Апека ці папячыцельства над непаўналетнімі, недзеяздольнымі ці абмежаванымі ў дзеяздольнасці дарослымі асобамі ўстанаўліваецца і адмяняецца па асабістым законе асобы, у адносінах да якой устанаўліваецца ці адмяняецца апека ці папячыцельства.

2. Абавязак апекуна (папячыцеля) прыняць апякунства (папячыцельства) вызначаецца па асабістым законе асобы, якая прызначаецца апекуном (папячыцелем).

3. Праваадносіны паміж апекуном (папячыцелем) і асобай, якая знаходзіцца пад апекай (папячыцельствам), вызначаюцца па праве краіны, установа якой прызначыла апекуна (папячыцеля). Аднак калі асоба, якая знаходзіцца пад апекай (папячыцельствам), пражывае ў Рэспубліцы Беларусь, прымяняецца права Рэспублікі Беларусь, калі яно больш спрыяльнае для гэтай асобы.

4. Апека (папячыцельства), устаноўленая над грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, якія пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, прызнаецца сапраўднай у Рэспубліцы Беларусь, калі супраць устанаўлення апекі (папячыцельства) ці супраць яе прызнання няма заснаваных на заканадаўстве пярэчанняў адпаведнай консульскай установы Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 1110. Праваздольнасць замежных арганізацый, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі па замежным праве

Грамадзянская праваздольнасць замежных арганізацый, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі па замежным праве, вызначаецца па праве краіны, дзе арганізацыя заснавана.

Артыкул 1111. Закон юрыдычнай асобы

Законам юрыдычнай асобы лічыцца права краіны, дзе гэта юрыдычная асоба заснавана.

Артыкул 1112. Праваздольнасць замежнай юрыдычнай асобы

1. Грамадзянская праваздольнасць замежнай юрыдычнай асобы вызначаецца па праве краіны, дзе заснавана юрыдычная асоба.

2. Замежная юрыдычная асоба не можа спасылацца на абмежаванне паўнамоцтваў яе органа ці прадстаўніка на заключэнне здзелкі, не вядомае праву краіны, у якой орган ці прадстаўнік замежнай юрыдычнай асобы заключыў здзелку.

Артыкул 1113. Нацыянальны рэжым дзейнасці замежных юрыдычных асоб у Рэспубліцы Беларусь

Замежныя юрыдычныя асобы ажыццяўляюць у Рэспубліцы Беларусь прадпрымальніцкую і іншую дзейнасць, якая рэгулюецца грамадзянскім заканадаўствам, у адпаведнасці з правіламі, устаноўленымі гэтым заканадаўствам для такой дзейнасці юрыдычных асоб Рэспублікі Беларусь, калі заканадаўствам Рэспублікі Беларусь для замежных юрыдычных асоб не прадугледжана іншае.

Артыкул 1114. Удзел дзяржавы ў грамадзянска-прававых адносінах з замежным элементам

Да грамадзянска-прававых адносін з замежным элементам з удзелам дзяржавы правілы гэтага раздзела прымяняюцца на агульных падставах, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

§ 2. Права, якое падлягае прымяненню да асабістых немаёмасных правоў

Артыкул 1115. Абарона асабістых немаёмасных правоў

Да асабістых немаёмасных правоў прымяняецца права краіны, дзе мела месца дзеянне ці іншая акалічнасць, якая паслужыла падставай для патрабавання аб абароне такіх правоў.

§ 3. Здзелкі, прадстаўніцтва, іскавая даўнасць

Артыкул 1116. Форма здзелкі

1. Форма здзелкі падпарадкоўваецца праву месца яе заключэння. Аднак здзелка, заключаная за мяжой, не можа быць прызнана несапраўднай у выніку незахавання формы, калі захаваны патрабаванні права Рэспублікі Беларусь.

2. Знешнеэканамічная здзелка, хоць бы адным з удзельнікаў якой з'яўляецца юрыдычная асоба Рэспублікі Беларусь ці грамадзянін Рэспублікі Беларусь, заключаецца незалежна ад месца заключэння здзелкі ў пісьмовай форме.

3. Форма здзелкі ў адносінах да нерухомай маёмасці падпарадкоўваецца праву краіны, дзе знаходзіцца гэта маёмасць, а ў адносінах да нерухомай маёмасці, якая зарэгістравана ў Рэспубліцы Беларусь, – праву Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 1117. Даверанасць

Форма і тэрмін дзеяння даверанасці вызначаюцца па праве краіны, дзе выдадзена даверанасць. Аднак даверанасць не можа быць прызнана несапраўднай у выніку незахавання формы, калі апошняя задавальняе патрабаванням права Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 1118. Іскавая даўнасць

1. Іскавая даўнасць вызначаецца па праве краіны, якое прымяняецца для рэгулявання адпаведных адносін.

2. Патрабаванні, на якія іскавая даўнасць не распаўсюджваецца, вызначаюцца па праве Рэспублікі Беларусь, калі хоць бы адзін з удзельнікаў адпаведных адносін з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь ці юрыдычнай асобай Рэспублікі Беларусь.

§ 4. Права ўласнасці і іншыя рэчавыя правы

Артыкул 1119. Агульныя палажэнні аб праве, якое прымяняецца да права ўласнасці і іншых рэчавых правоў

1. Права ўласнасці і іншыя рэчавыя правы на нерухомую і рухомую маёмасць вызначаюцца па праве краіны, дзе гэта маёмасць знаходзіцца, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі.

2. Прыналежнасць маёмасці да нерухомых ці рухомых рэчаў, а таксама іншая юрыдычная кваліфікацыя маёмасці вызначаюцца па праве краіны, дзе гэта маёмасць знаходзіцца.

Артыкул 1120. Узнікненне і спыненне права ўласнасці і іншых рэчавых правоў

1. Узнікненне і спыненне права ўласнасці і іншых рэчавых правоў на маёмасць, якая з'яўляецца прадметам здзелкі, вызначаюцца па праве месца заключэння здзелкі, калі іншае не ўстаноўлена пагадненнем бакоў.

2. Узнікненне і спыненне права ўласнасці і іншых рэчавых правоў на маёмасць не па здзелцы вызначаюцца па праве краіны, дзе гэта маёмасць знаходзілася ў момант, калі мела месца дзеянне ці іншая акалічнасць, якая паслужыла падставай для ўзнікнення або спынення права ўласнасці і іншых рэчавых правоў, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Узнікненне права ўласнасці і іншых рэчавых правоў на маёмасць у выніку набыўной даўнасці вызначаецца правам краіны, дзе маёмасць знаходзілася ў момант заканчэння тэрміну набыўной даўнасці.

Артыкул 1121. Права ўласнасці і іншыя рэчавыя правы на транспартныя сродкі і іншую маёмасць, якія падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі

Права ўласнасці і іншыя рэчавыя правы на транспартныя сродкі і іншую маёмасць, якія падлягаюць унясенню ў дзяржаўныя рэестры, вызначаюцца па праве краіны, дзе гэтыя транспартныя сродкі ці маёмасць зарэгістраваны.

Артыкул 1122. Права ўласнасці і іншыя рэчавыя правы на рухомую маёмасць у дарозе

Права ўласнасці і іншыя рэчавыя правы на рухомую маёмасць, якая знаходзіцца ў дарозе па здзелцы, вызначаюцца па праве краіны, з якой гэта маёмасць адпраўлена, калі іншае не ўстаноўлена пагадненнем бакоў.

Артыкул 1123. Абарона права ўласнасці і іншых рэчавых правоў

1. Да абароны права ўласнасці і іншых рэчавых правоў прымяняецца па выбары заяўніка права краіны, дзе знаходзіцца маёмасць, ці права краіны суда.

2. Да абароны права ўласнасці і іншых рэчавых правоў на нерухомую маёмасць прымяняецца права краіны, у якой гэта маёмасць знаходзіцца. У адносінах да маёмасці, якая зарэгістравана ў Рэспубліцы Беларусь, прымяняецца права Рэспублікі Беларусь.

§ 5. Дагаворныя абавязацельствы

Артыкул 1124. Выбар права бакамі дагавора

1. Бакі дагавора могуць пры заключэнні дагавора ці пазней выбраць па пагадненні паміж сабой права, якое падлягае прымяненню да іх правоў і абавязкаў па гэтым дагаворы, калі гэта не супярэчыць заканадаўству.

2. Пагадненне бакоў аб выбары падлеглага прымяненню права павінна быць яўна выказана ці павінна прама вынікаць з умоў дагавора і абставін справы, якія разглядаюцца ў іх сукупнасці.

3. Выбар бакамі паводле дагавора права, якое падлягае прымяненню, зроблены пасля заключэння дагавора, мае адваротную сілу і лічыцца сапраўдным з моманту яго заключэння без урону для правоў трэціх асоб.

4. Бакі дагавора могуць выбраць права, якое падлягае прымяненню, як для дагавора ў цэлым, так і для асобных яго частак.

Артыкул 1125. Права, якое прымяняецца да дагавора пры адсутнасці пагаднення бакоў

1. Пры адсутнасці пагаднення бакоў дагавора аб праве якое падлягае прымяненню, да гэтага дагавора прымяняецца права краіны, дзе мае асноўнае месца дзейнасці бок, які з'яўляецца:

1) прадаўцом – у дагаворы куплі-продажу;

2) дарыльшчыкам – у дагаворы дарэння;

3) арэндадаўцам (наймадаўцам) – у дагаворы арэнды (маёмаснага найму);

4) пазыкадавальнікам – у дагаворы бязвыплатнага карыстання маёмасцю (пазыкі);

5) падрадчыкам – у дагаворы падраду;

6) перавозчыкам – у дагаворы перавозкі;

7) экспедытарам – у дагаворы транспартнай экспедыцыі;

8) пазыкадаўцам (крэдытадавальнікам) – у дагаворы пазыкі (крэдытным дагаворы);

9) паверaным – у дагаворы даручэння;

10) камісіянерам – у дагаворы камісіі;

11) захавальнікам – у дагаворы захоўвання;

12) страхоўшчыкам – у дагаворы страхавання;

13) паручыцелем – у дагаворы паручыцельства;

14) заклададавальнікам – у дагаворы закладу;

15) ліцэнзіярам – у ліцэнзійным дагаворы аб карыстанні выключнымі правамі.

Пры немагчымасці вызначыць асноўнае месца дзейнасці боку, указанага ў падпунктах 1–15 гэтага пункта, прымяняецца права краіны, дзе ён заснаваны, мае месца пастаяннага жыхарства.

2. Да правоў і абавязкаў паводле дагавора, прадметам якога з'яўляецца нерухомасць, а таксама паводле дагавора аб даверным кіраванні маёмасцю прымяняецца права краіны, дзе гэта маёмасць знаходзіцца, а ў адносінах да маёмасці, якая зарэгістравана ў Рэспубліцы Беларусь, – заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

3. Пры адсутнасці пагаднення бакоў дагавора аб праве, якое падлягае прымяненню, прымяняецца незалежна ад палажэнняў пункта 1 гэтага артыкула:

1) да дагавораў аб сумеснай дзейнасці і да дагавораў аб выкананні будаўнічых, мантажных і іншых работ па капітальным будаўніцтве – права краіны, дзе такая дзейнасць ажыццяўляецца ці ствараюцца прадугледжаныя дагаворам вынікі;

2) да дагавора, заключанага на аўкцыёне, па конкурсе ці на біржы, – права краіны, дзе праводзіцца аўкцыён, конкурс ці знаходзіцца біржа.

4. Да дагавораў, не пералічаных у пунктах 1-3 гэтага артыкула, пры адсутнасці пагаднення бакоў аб праве, якое падлягае прымяненню, прымяняецца права краіны, дзе мае асноўнае месца дзейнасці бок, які ажыццяўляе выкананне, што мае вырашальнае значэнне для зместу такога дагавора. Пры немагчымасці вызначыць асноўнае месца дзейнасці боку, які ажыццяўляе выкананне, што мае вырашальнае значэнне для зместу такога дагавора, прымяняецца права краіны, дзе гэты бок заснаваны, мае месца пастаяннага жыхарства. Пры немагчымасці вызначыць выкананне, што мае вырашальнае значэнне для зместу дагавора, прымяняецца права краіны, з якой дагавор найбольш цесна звязаны.

5. У адносінах да прыёмкі выканання паводле дагавора прымаецца пад увагу права месца правядзення такой прыёмкі, паколькі бакамі не ўзгоднена іншае.

6. Калі ў дагаворы выкарыстаны прынятыя ў міжнародным абароце гандлёвыя тэрміны, то пры адсутнасці ў дагаворы іншых указанняў лічыцца, што бакамі ўзгоднена прымяненне да іх адносін звычайных значэнняў адпаведных тэрмінаў.

Артыкул 1126. Права, якое прымяняецца да дагавора аб стварэнні юрыдычнай асобы з замежным удзелам

Да дагавора аб стварэнні юрыдычнай асобы з замежным удзелам прымяняецца права краіны, дзе заснавана юрыдычная асоба.

Артыкул 1127. Сфера дзеяння прымяняльнага права

1. Права, якое прымяняецца да дагавора паводле палажэнняў гэтага параграфа, ахоплівае, у прыватнасці:

1) тлумачэнне дагавора;

2) правы і абавязкі бакоў;

3) выкананне дагавора;

4) наступствы невыканання ці неналежнага выканання дагавора;

5) спыненне дагавора;

6) наступствы мізэрнасці ці несапраўднасці дагавора;

7) уступку патрабаванняў і перавод доўгу ў сувязі з дагаворам.

2. У адносінах да спосабаў і працэдуры выканання, а таксама мер, якія павінны быць прыняты ў выпадку неналежнага выканання, акрамя прымяняльнага права, прымаецца пад увагу і права краіны, у якой адбываецца выкананне.

§ 6. Пазадагаворныя абавязацельствы

Артыкул 1128. Абавязацельствы з аднабаковых дзеянняў

Да здзелак з аднабаковых дзеянняў (публічнае абяцанне ўзнагароды, дзейнасць у чужым інтарэсе без даручэння і інш.) прымяняецца права месца заключэння здзелкі. Месца заключэння здзелкі вызначаецца па праве Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 1129. Абавязацельствы ў выніку прычынення шкоды

1. Правы і абавязкі па абавязацельствах, якія ўзнікаюць у выніку прычынення шкоды, вызначаюцца па праве краіны, дзе мела месца дзеянне ці іншая акалічнасць, якая паслужыла падставай для патрабавання аб пакрыцці шкоды.

2. Правы і абавязкі па абавязацельствах, якія ўзнікаюць у выніку прычынення шкоды за мяжой, калі бакі з'яўляюцца грамадзянамі ці юрыдычнымі асобамі адной і той жа дзяржавы, вызначаюцца па праве гэтай дзяржавы.

3. Замежнае права не прымяняецца, калі дзеянне ці іншая акалічнасць, якая служыць падставай для патрабавання аб пакрыцці шкоды, па заканадаўстве Рэспублікі Беларусь не з'яўляецца проціпраўным(ай).

Артыкул 1130. Адказнасць за ўрон, прычынены спажыўцу

Да патрабавання аб пакрыцці ўрону, які ўзнік у спажыўца ў сувязі з пакупкай тавару ці аказаннем паслугі, па выбары спажыўца прымяняецца права краіны, дзе:

1) знаходзіцца месца жыхарства спажыўца;

2) знаходзіцца месца жыхарства ці месца знаходжання вытворцы ці асобы, якая аказала паслугу;

3) спажывец набыў тавар ці яму была аказана паслуга.

Артыкул 1131. Беспадстаўнае абагачэнне

1. Да абавязацельстваў, якія ўзнікаюць у выніку беспадстаўнага абагачэння, прымяняецца права краіны, дзе абагачэнне мела месца.

2. Калі беспадстаўнае абагачэнне ўзнікае ў выніку адпадзення падставы, па якой набыта ці захавана маёмасць, прымяняльнае права вызначаецца па праве краіны, якому была падпарадкавана гэта падстава.

3. Паняцце беспадстаўнага абагачэння вызначаецца па праве Рэспублікі Беларусь.

§ 7. Інтэлектуальная ўласнасць

Артыкул 1132. Правы на інтэлектуальную ўласнасць

1. Да правоў на інтэлектуальную ўласнасць прымяняецца права краіны, куды звяртаюцца па абарону гэтых правоў.

2. Дагаворы, якія маюць сваім прадметам права на інтэлектуальную ўласнасць, рэгулююцца правам, якое вызначаецца палажэннямі гэтага раздзела аб дагаворных абавязацельствах.

§ 8. Спадчыннае права

Артыкул 1133. Адносіны па праве на спадчыну

Адносіны па ўспадкаванні вызначаюцца паводле права краіны, дзе спадчынадавец мае апошняе месца жыхарства, паколькі іншае не прадугледжана артыкуламі 1134 і 1135, калі спадчынадаўца не выбраў у завяшчанні права краіны, грамадзянінам якой ён з'яўляецца.

Артыкул 1134. Права на спадчыну нерухомай маёмасці і маёмасці, якая падлягае рэгістрацыі

Права на спадчыну нерухомай маёмасці вызначаецца па праве краіны, дзе знаходзіцца гэта маёмасць, а маёмасці, якая зарэгістравана ў Рэспубліцы Беларусь, – па праве Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 1135. Здольнасць асоб да складання і адмены завяшчання, форма завяшчання і акта яго адмены

Здольнасць асобы да складання і адмены завяшчання, а таксама форма завяшчання і акта яго адмены вызначаюцца паводле права краіны, дзе спадчынадавец меў месца жыхарства ў момант складання акта, калі спадчынадавец не выбраў у завяшчанні права краіны, грамадзянінам якой ён з'яўляецца. Аднак завяшчанне ці яго адмена не могуць быць прызнаны несапраўднымі ў выніку незахавання формы, калі апошняя задавальняе патрабаванням права месца складання акта ці патрабаванням права Рэспублікі Беларусь.

РАЗДЗЕЛ VIII
ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1136. Гэты Кодэкс уступае ў сілу з 1 ліпеня 1999 года, за выключэннем палажэнняў, для якіх у гэтым раздзеле Кодэкса ўстаноўлены іншыя тэрміны ўступлення іх у сілу. Па меры ўступлення ў сілу нормаў гэтага Кодэкса лічыцца, што страцілі сілу адпаведныя нормы Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, зацверджанага **Законам Рэспублікі Беларусь ад 11 чэрвеня 1964 года** (з адпаведнымі змяненнямі і дапаўненнямі).

Гэты раздзел уступае ў сілу з дня афіцыйнага апублікавання гэтага Кодэкса.

Артыкул 1137. Надалей да прывядзення заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Кодэксам законы і пастановы Урада прымяняюцца ў той частцы, у якой яны не супярэчаць Кодэксу**.**

Указанае правіла дзейнічае і ў адносінах да прынятых да ўступлення ў сілу Кодэкса актаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання па пытаннях, якія, згодна Кодэксу, могуць рэгулявацца адпаведна толькі законамі Рэспублікі Беларусь або актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ці пастановамі Урада Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 1138. Гэты Кодэкс прымяняецца да адносін, якія ўзніклі пасля 1 ліпеня 1999 года.

Па грамадзянскіх праваадносінах, якія ўзніклі да 1 ліпеня 1999 года, Кодэкс прымяняецца да тых правоў і абавязкаў, якія ўзнікнуць пасля ўступлення яго ў сілу.

Артыкул 1139. Па грамадзянскіх праваадносінах, якія ўзніклі да 1 ліпеня 1999 года, але не ўрэгуляваны заканадаўствам, якое дзейнічала ў той момант, прымяняюцца правілы гэтага Кодэкса**.**

Артыкул 1140. Выключаны

Артыкул 1141. Глава 4 («Юрыдычныя асобы») гэтага Кодэкса ўступае ў сілу з дня афіцыйнага апублікавання Кодэкса. З гэтага дня камерцыйныя арганізацыі могуць ствараца выключна ў тых формах, якія прадугледжаны ўказанай главой.

Юрыдычныя асобы, створаныя да афіцыйнага апублікавання гэтага Кодэкса, калі іх віды адпавядаюць прадугледжаным Кодэксам, да 1 ліпеня 1999 года абавязаны прывесці свае ўстаноўчыя дакументы ў адпаведнасць з Кодэксам.

Калектыўныя прадпрыемствы, а таксама прадпрыемствы, маёмасць якіх з'яўляецца ўласнасцю іншых юрыдычных і (ці) фізічных асоб, а ўказаным прадпрыемствам належыць на праве поўнага гаспадарчага распараджэння, да 1 ліпеня 2000 года, а арэндныя прадпрыемствы – не пазней месяца пасля сканчэння дагавораў арэнды, заключаных да дня афіцыйнага апублікавання Кодэкса, павінны быць пераўтвораны ў іншыя прадугледжаныя Кодэксам віды юрыдычных асоб або ліквідаваны. Пасля сканчэння ўказанага тэрміну гэтыя юрыдычныя асобы падлягаюць ліквідацыі ў судовым парадку па патрабаванні органа, які ажыццяўляе дзяржаўную рэгістрацыю, або пракурора.

Юрыдычныя асобы, указаныя ў гэтым артыкуле, вызваляюцца ад выплаты рэгістрацыйнага збору пры рэгістрацыі змяненняў іх прававога статусу або ўнясенні змяненняў у іх устаноўчыя дакументы ў сувязі з іх прывядзеннем у адпаведнасць з нормамі Кодэкса.

Артыкул 1142. Нормы гэтага Кодэкса аб падставах і наступствах несапраўднасці здзелак (артыкулы 163, **166-181**) прымяняюцца да здзелак, патрабаванні аб прызнанні несапраўднымі і наступствах несапраўднасці якіх разглядаюцца судом пасля 1 ліпеня 1999 года незалежна ад часу заключэння адпаведных здзелак.

Артыкул 1143. Устаноўленыя гэтым Кодэксам тэрміны іскавай даўнасці прымяняюцца да тых іскаў, тэрміны прад'яўлення якіх, прадугледжаныя заканадаўствам, якое раней дзейнічала, не скончыліся да 1 ліпеня 1999 года.

Да прадугледжанага пунктам 2 артыкула 182 Кодэкса іску аб прызнанні спрэчнай здзелкі несапраўднай і аб прымяненні наступстваў яе несапраўднасці, права на прад'яўленне якога ўзнікла да 1 ліпеня 1999 года, прымяняецца тэрмін іскавай даўнасці, устаноўлены для адпаведных іскаў заканадаўствам, якое раней дзейнічала.

Артыкул 1144. Дзеянне артыкула 235 гэтага Кодэкса (набыўная даўнасць) распаўсюджваецца і на выпадкі, калі валоданне маёмасцю пачалося да 1 ліпеня 1999 года і працягваецца ў момант уступлення ў сілу Кодэкса.

Артыкул 1145. Парадак заключэння дагавораў, устаноўлены главой 28 гэтага Кодэкса, прымяняецца да дагавораў, прапановы заключыць якія накіраваны пасля 1 ліпеня 1999 года.

Артыкул 1146. Да дагавораў, прапановы заключыць якія накіраваны да 1 ліпеня 1999 года, але якія заключаны пасля 1 ліпеня 1999 года, прымяняюцца нормы гэтага Кодэкса аб форме дагавораў асобных відаў, а таксама аб іх дзяржаўнай рэгістрацыі.

Нормы Кодэкса, якія вызначаюць змест дагавораў асобных відаў, прымяняюцца да дагавораў, заключаных пасля ўступлення яго ў сілу, а таксама да дагавораў, заключаных да ўступлення ў сілу гэтага Кодэкса, у частцы правоў і абавязкаў, якія ўзніклі пасля ўвядзення яго ў дзеянне.

Заключаныя да ўступлення ў сілу гэтага Кодэкса дагаворы франчайзінгу, а таксама іншыя дагаворы, падставы, парадак заключэння (скасавання) і змест якіх у адпаведнасці з гэтым Кодэксам павінны рэгулявацца іншымі актамі заканадаўства, пры адсутнасці такіх актаў на 1 ліпеня 1999 года дзейнічаюць да іх выдання, але не больш за адзін год пасля ўступлення ў сілу гэтага Кодэкса. У выпадку прыняцця

адпаведных актаў заканадаўства такія дагаворы павінны быць прыведзены ў адпаведнасць з нормамі гэтых актаў у парадку, устаноўленым гэтымі актамі. Калі пасля сканчэння ўказанага тэрміну адпаведныя акты не будуць прыняты, то дзеянне ўказаных дагавораў спыняецца.

Артыкул 1147. Надалей да ўступлення ў сілу акта заканадаўства аб рэгістрацыі правоў на нерухомую маёмасць і здзелак з ім для дагавораў, прадугледжаных артыкуламі 522, 531 і пунктам 3 артыкула 545 гэтага Кодэкса, захоўваюць сілу правілы аб абавязковым натарыяльным пасведчанні такіх дагавораў, устаноўленыя заканадаўствам, якое дзейнічала да ўступлення ў сілу Кодэкса.

Артыкул 1148. Абавязковыя для бакоў дагавора нормы гэтага Кодэкса аб падставах, аб парадку і наступствах скасавання дагавораў асобных відаў прымяняюцца таксама да дагавораў, якія працягваюць дзейнічаць пасля ўступлення ў сілу Кодэкса незалежна ад даты іх заключэння.

Абавязковыя для бакоў дагавора нормы Кодэкса аб адказнасці за парушэнне дагаворных абавязацельстваў прымяняюцца, калі адпаведныя парушэнні былі дапушчаны пасля ўступлення ў сілу Кодэкса, за выключэннем выпадкаў, калі ў дагаворах, заключаных да 1 ліпеня 1999 года, прадугледжвалася іншая адказнасць за такія парушэнні.

Артыкул 1149. Дзеянне артыкулаў 938 і 939 гэтага Кодэкса распаўсюджваецца таксама на выпадкі, калі прычыненне шкоды пацярпеламу мела месца да 1 ліпеня 1999 года, але не раней 1 ліпеня 1996 года і прычыненая шкода засталася некампенсаванай.

Дзеянне артыкулаў 954–963 Кодэкса распаўсюджваецца таксама на выпадкі, калі прычыненне шкоды жыццю і здароўю грамадзяніна мела месца да 1 ліпеня 1999 года, але не раней 1 ліпеня 1996 года і прычыненая шкода засталася некампенсаванай.

Артыкул 1150. Нормы гэтага Кодэкса ў частцы, якая датычыцца здзелак з зямельнымі ўчасткамі, прымяняюцца ў той меры, у якой іх абарот дапускаецца заканадаўствам аб ахове і выкарыстанні зямель.

Артыкул 1151. Устанавіць, што на творы, якія заканадаўствам, што раней дзейнічала, не прызнаваліся аб'ектамі аўтарскага права, дзеянне главы 60 гэтага Кодэкса распаўсюджваецца, калі твор выпушчаны ў свет пасля 1 ліпеня 1999 года.

Артыкул 1152. Нормы гэтага Кодэкса прымяняюцца таксама да спадчын, якія адкрыліся да ўступлення ў сілу ўказанага Кодэкса, але не прыняты нікім са спадчыннікаў і не перайшлі згодна з правам успадкавання ва ўласнасць дзяржавы да 1 ліпеня 1999 года.

Артыкул 1153. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у тэрмін да 1 ліпеня 1999 года прыняць меры па прывядзенні заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Кодэксам.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь **А. Лукашэнка**